# ЯЎГЕН ВАСІЛЁНАК

ВЫБРАНЫЯ
ТВОРЫ
Ў ДВУХ
ТАМАХ

ТОМ
1

ЯЎГЕН
ВАСІЛЁНАК

# ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

# Яўген Васілёнак

АПАВЯДАННІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1977

Бел 2
В 19

В $\frac{70303\text{-}063}{М\ 302(05)\text{-}77}$ 93-77



# ВЫПАДКОВЫ ПРЫПЫНАК

Скоры поезд не прыпыняўся на гэтай невялічкай палявой станцыі, і машыніст Барыс Холад мінаў яе без якіх бы там ні было душэўных зрухаў. Седзячы на сваім утульным крэсле за правым крылом паравоза, ён з самым абыякавым выглядам пазіраў на будынак вакзала, на прадаўгаваты барак побач з ім і на доміkі, што стаялі крышку воддаль ад станцыі, за выхадным семафорам. Барыс ніколі не задумваўся над тым, якія тут людзі, як яны жывуць. Нікольkі не цікавіла яго нават і тое, што адзін з домікаў наводшыбе меў трохі дзіўны выгляд: яго вокны заўсёды былі завешаны фіранкамі, нібы той, хто жыў там, старанна хаваў ад чужога вока сваё шчасце або сваё гора.

Паравоз, на якім ездзіў Барыс Холад, за час рэйса двойчы мінаў гэтую ціхую непрыкметную станцыю — апоўдні, калі ехаў на Мінск, і позна ўвечары, калі вяртаўся назад, у сваё дэпо. У першым выпадку станцыя і яе нешматлікія пабудовы былі з левага боку ад паравоза, і машыніст амаль не бачыў іх, у другім — усё знаходзілася якраз перад яго вачыма. Аднак ні пры яркім сонечным святле, ні пры бледным ззянні месяца нішто тут ні разу не ўсхвалявала Барыса, нішто не вывела яго са звычайнай раўнавагі.

— Ну і мясціна ж тут! — гаварыў намочнік машыніста Саша Налецька, з захапленнем пазіраючы наўкола.— Проста не налюбуешся! Тут павінны жыць вельмі шчаслівыя людзі.

Холад не звяртаў і самай малой увагі на гэтыя ўзнёслыя тырады свайго памочніка, бо лічыў іх вынікам Сашынай маладосці і неўраўнаважанасці яго характару. Сам Холад быў не здатны на такую ўзнёсласць — яму зда-

валася, што, калі чалавеку пераваліла за трыццаць, ён ужо не мае па яе права.

— Вось калі прыйдзе тая пара, што трэба будзе жаніцца,— гаварыў далей Налецька,— я замест вясельнага падарожжа абавязкова сюды прыеду, на цэлы месяц. От жа даў бог прыгажосць мясціне, ну што ты скажаш!..

— Гэтая мясціна толькі дарэмна месца займае,— нездаволена бурчаў Холад.— Вунь, бачыш, яр.

— Раскошны яр! — усклікваў Саша.

— Раско-ошны!..— перадражніваў Сашу Барыс.— Карысці з яго, як з казла: ні воўны, ні малака.

— Але ж прыгажосці колькі! — не сунімаўся Налецька.

Барыс Холад не лічыў патрэбным далей весці гаворку на гэтую бяссэнсавую тэму і змаўкаў. Аднойчы, праўда, ён сказаў быў яшчэ:

— А што датычыцца тваёй будучай жаніцьбы...

Аднак гэтая фраза так і асталася няскончанай: Холад неяк неакрэслена правёў рукой у паветры, і Саша так і не даведаўся, што меў сказаць наконт яго будучай жаніцьбы машыніст.

Барыс Холад быў халасцяком. Ніхто дакладна не ведаў, чаму ён дагэтуль не жанаты, ды і сам Барыс не мог толкам вытлумачыць, як яно сталася, што ён у такія гады ходзіць, па трапнаму слову аднаго паравозніка, пустапасам. Лічылася, што Холад заядлы «службіст», да самазабыцця аддадзены пяцістам сарака васьмі параграфам «Правіл тэхнічнай эксплуатацыі чыгунак», што ён страшэнны «сухар». Калі ж ягонаму сэрцу і даступна такое пачуццё, як каханне, дык хіба толькі ў дачыненні да адзінай у свеце істоты — да лакаматыва.

— А бярозкі якія! — зноў пачынаў захапляцца Саша Налецька.— А сосны!..

— Рэчка! — глуха гаварыў Холад.

Аднак гэта зусім не азначала, што ён таксама пачынаў падзяляць захапленне свайго памочніка. Проста яго заўвага была папярэджаннем аб тым, што наперадзе, метраў праз сто будзе мост і што адпаведны параграф службовай інструкцыі патрабуе ў такіх выпадках зачыніць паддувала.

— Зачыні! — строга дадаваў машыніст і торгаў за рычаг гудка.

Поезд ляцеў далей, станцыя аставалася ззаду, і ніколі ў машыніста не ўзнікала жадання павярнуцца і паглядзець на яе яшчэ раз.

Бег час, праходзілі сваім парадкам дні і месяцы, і нішто не рабіла колькі-небудзь прыкметных змен у мерным і спакойным жыцці Барыса Холада. І па-ранейшаму на поўнай хуткасці праносіліся праз невялічкую палявую станцыю скорыя паязды, што вадзіў ён,— усё міма і міма...

Але вось аднаго разу, калі Барыс Холад рабіў свой звычайны рэйс і па даўняй звычцы абыякава пазіраў на ўсё, што знаходзілася па-за межамі чыгуначнага палатна, яго ўвагу раптам усё ж прыцягнуў домік наводшыбе, той самы, вокны якога былі заўсёды завешаны фіранкамі. Здарылася гэта напэўна таму, што на гэты раз адно акно, сярэдняе, было расчынена насцеж і з яго лілася музыка.

Не было сумненняў, што ў доміку з'явіўся новы жыхар, ды не адзін, а з патэфонам ці мо нават з радыёлай.

У наступны момант Холад убачыў і самога навасельца: у акне паказалася постаць маладой дзяўчыны ў яркай малінавай сукенцы; дзяўчына абаперлася левай рукой на падаконнік, а правай стала махаць поезду...

Толькі адно вельмі кароткае імгненне бачыў машыніст гэтае расчыненае насцеж акно і постаць дзяўчыны, што махала рукою, бо ў наступную хвіліну паравоз са страшэннай хуткасцю пранёсся міма і засланіў сабою нечаканае відовішча. І яно проста не павінна было пакінуць і самага малога следу ў душы машыніста, тым больш, што перад вачыма знаходзіўся ўжо слупок з шыльдай-загадам — «Зачыні паддувала і не сіфонь!» — на якім іменна і трэба было сканцэнтраваць усю ўвагу. Але машыніст чамусьці раптам хутка павярнуўся да памочніка, і той убачыў, што вочы ў Барыса Холада дзіўна ўспыхнулі, а на твары з'явілася збянтэжаная ўсмешка.

Памочнік чакаў ад машыніста прывычных слоў наконт паравознай топкі і падрыхтаваўся ўжо быў націснуць на адпаведны рычаг, але тут адбылося нечаканае: Холад сам спрытна ўправіўся з паддувалам, а тады, усё гэтак жа дзіўна ўсміхаючыся, неспадзявана сказаў:

— А дзянёк сёння, уласна кажучы, нішто сабе, праўда?

— Ага, ага, выдатны дзянёк! — заспяшаўся падтрымаць гаворку Саша Палецька.— Даўно такога не было. Я нават і не помню, калі ў апошні раз было такое сонца.

Машыніст высунуўся з будкі і нейкі час пільна глядзеў назад.

— І дажджу, напэўна, не будзе,— прамовіў ён.

— Не, не, не будзе! Што датычыцца дажджу, дык тут усё абсалютна ясна: яго цяпер, ура, колькі не будзе!

Поезд імчаў наперад, лёгка цягнучы за сабою дзесяць цёмна-сініх вагонаў, і машыніст са здзіўленнем пачаў заўважаць, што акрамя перастуку колаў паветра нібы напоўнена яшчэ і шчабятаннем птушак і што наўсцяж чыгункі стаяць не адны толькі тэлеграфныя слупы,— у надзвычай прыемным суседстве з імі мірна жывуць пахучыя белыя акацыі.

На паравозе ў Барыса Холада быў надзвычай моцны гудок, мацнейшы за ўсе на ўчастку. Ён роў да таго аглушальна, што нават прызвычаеныя да розных гукаў стрэлачнікі спалохана закрывалі далонямі вушы, пачуўшы яго трубны голас. А ў гэты дзень, падлятаючы к станцыям, паравоз гудзеў, здавалася, яшчэ больш аглушальна, і людзі кідаліся ад яго, як апантаныя.

Назад паравознікі вярталіся позна ўвечары. Было цёмна. Месяц не паказваўся, на небе толькі сям-там цьмяна гарэлі адзінокія зоркі. Абрысаў наваколля не было відно, яны толькі ўгадваліся.

— Пад'язджаем! — сказаў Саша Налецька.

Машыніст уздрыгнуў і, хутка павярнуўшыся, пільна паглядзеў на памочніка. Але Саша стаяў спіною да Холада, і машыніст так і не зразумеў, чаму яго памочнік палічыў патрэбным сказаць гэтае кароткае і зусім не абавязковае ў дадзеным выпадку слова.

Прамень паравознага пражэктара, імкліва сунучыся ўперад, асвятляў не толькі рэйкавую каляю, але нават і тое, што стаяла паабапал чыгункі. Вось ён намацаў вежу семафора, потым слізгануў па сценах домікаў і пабег далей.

Домікі былі цёмныя і ціхія. Ніводнага агеньчыка не гарэла ў вокнах, ніводнага гуку не чулася з іх. «Але, але, цяпер жа позна ўжо»,— сказаў сам сабе Барыс Холад.

Абмінаючы станцыю, машыніст даў працяглы развітальны гудок. Дзяжурны, што стаяў на пероне, аж перасмыкнуўся ад гэтага неймавернага лямапту.

— Ведаеш, пра што я хачу спытаць у цябе? — сказаў Холад, кінуўшы на Сашу хуткі позірк.

«Напэўна пра двухсот саракавы параграф, на якім я

ў мінулы раз зрэзаўся»,— падумаў Саша. І, не чакаючы, пакуль машыніст пачне гаварыць далей, памочнік стаў бойка рапартаваць:

— Тэхнічны стан лакаматываў выяўляецца шляхам агляду, які праводзіцца...

— Пачакай, сакатун,— перапыніў яго Холад.— Скажы... ты быў у Траццякоўскай галерэі?

— У Траццякоўскай? Не, не быў,— шчыра прызнаўся Саша.— А што? Рэпрадукцый я многа бачыў.

Машыніст памаўчаў крыху, пасля сумна сказаў:

— Я таксама не быў...— Ён зноў памаўчаў.— Многа, аказваецца, мы з табой страцілі ў жыцці, Саша.

— А гэта ў залежнасці ад таго, з якога боку падысці да жыцця,— па-філасофску зазначыў Налецька.— І калі падысці з пэўнага боку, дык выявіцца, што знайшлі мы больш, чым страцілі. Ды і наперадзе будзе яшчэ багата знаходак.

— Мне ўжо трыццаць два, Саша.

— Гэта яшчэ не сто, і нават не пяцьдзесят. Дарэчы, мой бацька ажаніўся, калі яму было трыццаць тры.

— Праўда? — Холад уважліва паглядзеў на Сашу, нібы ўпершыню бачыў яго. Потым, сумеўшыся, роўна сказаў: — Уключы левы інжэктар.

А наступным разам, калі яны ехалі тут удзень, машыніст зноў бачыў дзяўчыну ў малінавай сукенцы, і зноў яна махала рукою поезду. А поезд праляцеў міма, не спыняючыся і нават не памяншаючы хуткасці.

«Падобна на тое, што яна чакае некага»,— сказаў сам сабе Барыс Холад і ўздыхнуў.

А далей ён паглядзеў перад сабою і раптам усклікнуў:

— Глядзі, глядзі!

— Што? — спалохаўся Саша Налецька.

— Бярозка!

— Чаму? — не зразумеў Саша.

— Вунь, вунь, глядзі! Бачыш? — выцягваючы руку, радасна гаварыў Холад.— Дзіўна... Адкуль яна ўзялася? Яе ж тут, здаецца, ніколі не было!..

Разгалістая бяроза стаяла трошкі воддаль ад чыгуначнага палатна, пасярод нейкага бляклага хмызняку. Шчодра залітая сонцам, яна далікатна варушыла сваёю ярка-зялёнай лістотаю і аж зіхацела; верхавінка яе злёгку пагойдвалася, і было такое ўражанне, быццам бяроза камусьці кланяецца.

— Я тут з вамі восем месяцаў езджу. Магу паручыцца, што яна і да нас была.

— Дзіўна...

Між тым поезд імчаў далей, і перад вачыма мільгалі ўжо новыя малюнкі. Імкліва пранёсся міма невялікі сасновы лес, праплыло жытняе поле, потым праскочылі хаткі нейкай вёскі. На гарызонце паказалася сядзіба машынна-трактарнай станцыі. На ўзгорку побач з чыгункай вырасла будка пуцявога абходчыка з высокім флюгерам над дахам; імгненне — і будка асталася далёка ззаду, і перад вачыма зноў распасціралася раўніна. Уздоўж чыгункі пабегла вузенькая, у калдобінах, дарога; па дарозе панура тупала белая карова з адным рогам, а за ёю, з доўгім пруткам у руках, паважна крочыў галалобы і басаногі хлапчук...

А ў небе зырка палала сонца і, шчодра азораныя ім, асляпляльна блішчалі далягляды.

— Слова гонару, яна дужа прывабная,— нечакана сказаў Саша Налецька.— У ёй ёсць нешта ад гэтай незвычайнай мясціны. Нешта такое... гэткае...— Саша падумаў і ўпэўнена скончыў: — Такую абавязкова павінна напаткаць шчасце.

«Гэта ён пра тую дзяўчыну»,— здагадаўся Барыс Холад.

Скасіўшы вочы налева машыніст убачыў, што памочнік крадком назірае за ім і што па вуснах яго блукае спагадлівая ўсмешка.

Нейкае дзіўнае, незразумелае хваляванне ўзнялося раптам у душы Барыса Холада. Яму нясцерпна захацелася падысці да Сашы і моцна абняць яго...

Праз дзень машыніст зноў убачыў дзяўчыну ў акне доміка наводшыбе. Сам не разумеючы, як ён адважыўся на гэта, Барыс узняў і памахаў ёй рукою... Ён не ведаў, ці заўважыла дзяўчына яго міжвольны жэст, бо паравоз у адно імгненне праскочыў міма; аднак Барысу хацелася верыць, што ад увагі дзяўчыны нічога не ўнікла.

Потым аднаго разу Холаду пашанцавала і ўвечары ўбачыць незнаёмку. Нягледзячы на позні час, яе акно ў той дзень было ярка асветлена і расчынена насцеж. Дзяўчына сядзела за сталом у глыбіні пакоя і чытала. Шум поезда зусім не прыцягнуў яе ўвагі, яна нават не варухнулася. Хоць паравоз праскочыў міма акна са сваёй звычайнай імгненнасцю, Холад паспеў заўважыць, што ў па-

кої, акрамя незнаёмкі, нікога не было. Значыцца, яна жыла тут адна.

Станцыя праляцела і знікла. Машыністу трэба было глядзець перад сабою, толькі наперад, аднак ён раз за разам паварочваўся і кідаў хуткія позіркі назад. І доўгі час, аж да наступнай станцыі, яму здавалася, што далёка ў цемры незгасальна мігціць агеньчык таго адзінокага акна.

...А пасля дзяўчына прапала. Невядома было, ці то яна з'ехала са станцыі назусім, ці то знікла часова. Аднак яе акно болей не расчынялася, і за апушчанымі фіранкамі, здавалася, не было ўжо ніякага жыцця.

Так прайшло два тыдні.

Пралятаючы паўз станцыю, трывожна і сумна гудзеў паравоз, журботна і нездаволена стукалі на стыках вагонныя колы.

Лета канчалася. Наставала восень. Бляклі фарбы наваколля, нават і неба, здавалася, пачало выцвітаць пад пякучымі праменнямі сонца, якое сёлета добра-такі пастаралася!..

Невялічкая палявая станцыя стала нібыта яшчэ меншай.

Але дні стаялі яшчэ пагодныя. І тая бярозка, якую нечакана для сябе выявіў Барыс Холад, па-ранейшаму была смарагдава-зялёнай, як і тады, яна гэтак жа старанна кланялася машыністу.

Па нейкаму ўзаемнаму маўкліваму ўгавору Барыс Холад і Саша Налецька не ўспаміналі ўголас пра незнаёмку. Ні адзін, ні другі не пачынаў першы размовы на гэтую тэму. Праўда, у дарозе яны цяпер гаварылі шмат аб чым, тэм для размоў знайшлося ў іх багата, але, як толькі паравоз набліжаўся да тае палявое станцыі, абодва змаўкалі і праязджалі міма яе моўчкі.

У самым пачатку верасня, калі Барыс Холад рабіў апошні рэйс перад тым, як паставіць свой паравоз у пад'ёмачны рамонт, яму давялося весці не скоры, а звычайны пасажырскі поезд. Быў ціхі лагодны вечар. Поезд шпарка імчаў па рэйках, а на небе навыперадкі з ім каціўся збляднелы месяц. Недзе далёка наперадзе прамільгнула знічка, праз некаторы час упала другая...

Поезд набліжаўся да станцыі, дзе скоры ніколі не затрымліваўся, але дзе пасажырскаму быў вызначаны па графіку пяціхвілінны прыпынак. Барыс Холад пачаў

стрымліваць бег поезда. Паступова ўсё павольней круціліся колы, усё цішэй пыхкала пара ў трубе.

Заўтра Барыс Холад з СашамНалецькам будуць ужо ў адпачынку. У кішэнях у іх — турысцкія пуцёўкі. Заўтра паравознікі рушаць у падарожжа. Спачатку яны паедуць у Маскву, пабываюць там у Крамлі, на сельскагаспадарчай выстаўцы (Траццякоўка маецца на ўвазе сама сабою), потым уладзяцца на параход, праплывуць па каналу і — гайда ўніз па матушцы па Волзе!..

Падарожжа мае быць дужа цікавым.

Але думкі аб ім па меры наблiжэння да станцыі, дзе Барысу Холаду прыйдзецца зрабіць першы за час язды на гэтым участку прыпынак, пачалі раптам засланяцца якімсьці незразумелым трывожным пачуццём неспакою і смутку. Вочы нечага шукалі ў цемры, яны старанна сачылі за промнем паравознага пражэктара. А той, як і звычайна, абыякава намацваў шлях наперадзе, закранаючы сваім святлом і тое, што стаяла паабапал чыгункі.

Цяпер поезд ужо ледзь-ледзь сунуўся.

І вось ён стаў, і проста перад паравозам быў домік наводшыбе, і ў ім ярка свяцілася расчыненае насцеж сярэдняе акно.

— Монна Ліза! Джаконда! — пачуў Барыс голас Сашы Налецькі за спіною.— Нібы з карціны Леанарда да Вінчы сышла!..

На твары ў дзяўчыны, якая стаяла пасярод пакоя каля круглага стала і да нечага прыслухоўвалася і якую добра відаць з паравознай будкі, блукала ціхая ясная ўсмешка. Гэтая ўсмешка стварала ўражанне, нібыта дзяўчына ведае штосьці такое, чаго не ведаюць другія, і іменна таму яна не можа не ўсміхацца. Замест звычайнай маліінавай сукенкі на дзяўчыне быў цяпер гарнітур — ружовая блузка і цёмная плісіраваная спадніца, і ўсё гэта было ёй вельмі да твару.

Да акна ад паравоза было зусім блізка, мо крокаў трыццаць ці нават менш. Барыс Холад выразна бачыў і саму дзяўчыну, і абсталяванне яе пакоя. Усё тут было простае. Вялікі аранжавы абажур з кутасікамі змякчаў святло яркай электрычнай лямпы, афарбоўваючы сцены пакоя і рэчы ў ім у прыемныя спакойныя тоны. Вось дзяўчына нахілілася над букетам чырвоных вяргінь, што стаяў на стале ў фігурнай шклянай вазе, пераставіла некалькі кветак з аднаго месца на другое. Потым пады-

шла да прыёмніка, уключыла яго, адпак тут жа і выключыла. А тады направіла падушачку на канапе...

У пакоі панаваў той своеасаблівы дух чысціні і ўтульнасці, які гэтак характэрны для дзявочага жытла. Барыс Холад з тугою падумаў аб тым, што ён не здолеў бы пераступіць парог гэтай святыні.

І якраз у тую хвіліну, як ён падумаў гэта, у дзверы пакоя хтосьці пастукаў. Дзяўчына імкліва падалася да дзвярэй, адчыніла іх і адступіла на крок назад.

На парозе стаяў высокі малады мужчына ў вайсковай форме, але без пагон. Дзяўчына ўскрыкнула і кінулася да яго. Яна павісла на шыі ў яго, а ён, забыўшыся выпусціць чамаданчык з левай рукі, імкліва абняў яе абедзвюма рукамі і прыціснуў да сябе.

Барысу Холаду здалося, што за яго спіною ціха ўздыхнуў Саша Налецька. Але машыніст не павярнуўся, ён апусціў вочы долу і ўвесь неяк сціснуўся.

«Гэта ж я сам і прывёз яго,— падумаў Барыс.— Ён прыехаў на маім поездзе».

Машыніст паглядзеў перад сабою. Там, у акне, двое ўсё яшчэ стаялі на ранейшым месцы і ў ранейшай паставе. Не было ніякага сумнення: яны былі ўпэўнены, што на свеце, акрамя іх, нікога не існуе.

— На семафоры — зялёны! — сказаў Саша Налецька.— Паехалі!

Барыс узяўся за ручку, каб даць сігнал адпраўлення... І яму раптам выразна ўявілася, як зараве зараз гудок і як, аглушаныя і перапалоханыя гэтым страшэнным ровам, скалануцца тыя двое і міжвольна адскочаць адно ад аднаго...

А ім гэтак хораша быць разам!..

Рука машыніста саслізнула з сігнала і лягла на рэверс ходу. Пасля асцярожна пасунула яго ўлева. Барыс паспрабаваў успомніць, які гэта параграф — упершыню ў жыцці! — ён парушае, але думкі ў галаве ішлі нейкім іншым парадкам.

Машыністу нечакана зрабілася і сумна і неяк дзіўна лёгка. Ён высунуўся з будкі і рашуча паглядзеў наперад. Там зіхацела вабная зорная далячынь.

Поезд плаўна скрануўся з месца і, набіраючы хуткасць, паляцеў насустрач зорам.

*1956*

# ЗАБЫТЫ ВЕНЗЕЛЬ

Яны стаялі на ўзгорку і глядзелі проста перад сабой, у адным і тым жа кірунку.

Адзін з іх быў мужчына год пад сорак, другі — зусім яшчэ юнак.

На мужчыне быў светла-шэры, свабоднага крою гарнітур з ледзь прыкметнай сіняватай палоскай, на юнаку — вузкія і караткаватыя штаны нейкага няпэўнага колеру і жоўтая спартыўная куртка з рознымі «маланкамі».

Абуты яны былі таксама па-рознаму: старэйшы — у лёгкія светлыя сандалеты, малодшы — у фундаментальныя карычневыя чаравікі на таўшчэзнай фігурнай падэшве.

Мелі яны і нешта агульнае: вельмі падобныя адзін на аднаго твары. Падабенства гэтых людзей, нягледзячы на розніцу ва ўзросце і ў адзенні было да таго вялікае, што хацелася адразу сказаць: гэта бацька і сын.

Так яно і было.

На ўзгорку стаялі Канстанцін Сцяпанавіч Шулікаў, загадчык кафедры апрацоўкі металаў, член вучонага савета інстытута, і яго нашчадак Валодзя,— пакуль што проста Валодзя, бо жыццё не паспела яшчэ даць яму ніякіх тытулаў.

Праўда, аднакласнікі ў свой час прычапілі былі да яго мянушку «Буля», значэння якой не ведаў і сам яе пасьбіт, аднак яна асталася ў мінулым, бо Валодзя сёлета скончыў дзесяцігодку і нават вытрымаў ужо конкурс на планава-эканамічны факультэт,— апошні экзамен ён здаў якраз пяць дзён таму назад.

Яны стаялі на ўзгорку. Проста перад імі быў невысокі чыгуначны насып з двума парамі бліскучых, гладка ад-

паліраваных рэек. За насыпам стаяла невялічкая, але вельмі акуратненькая хатка, абшаляваная дошкамі і пафарбаваная ў жоўты колер. Хатка была абгароджана штыкетамі, таксама жоўтымі. З левага боку ад хаткі і крыху далей за ёю туліліся такія ж невялічкія пуњка і хлеўчык, а з правага — студня з жураўлём.

А болей тут убачыць нічога і нельга было,— гэтую адзінокую сялібу абкружала з усіх бакоў адно толькі поле. Затрымацца воку тут не было на чым; хіба ўжо калі толькі надта пільна прыгледзішся, дык заўважыш на самым небасхіле тоненькую палоску лесу.

На гэтую адзінокую сялібу і глядзелі абодва Шулікавы.

— Запамінай, отрак,— сказаў Канстанцін Сцяпанавіч.— З гэтага вось палаца пачаў у свой час крочыць па жыцці твой радзіцель. Прыглядайся і запамінай.

— Кхм! — азваўся малодшы Шулікаў.— Палац раскошны. Праўда, на замак венецыянскага дожа ён не вельмі падобен, але таксама... у ім ёсць нешта велічнае. Я сказаў бы нават, што ён мае большую гістарычную каштоўнасць, чымся абіталішча самага вяльможнага з дожаў. З тых харомін, паводле навейшых звестак, не выйшла нiводнага члена вучонага савета, а з гэтай... вось ён, у наяўнасці!

— От бачыш! — усміхнуўся Канстанцін Сцяпанавіч, і ў вачах у яго ўспалыхнулі зялёныя агеньчыкі.— Тады пойдзем і пакажамся перад продкамі. Несці чамадан твая чарга.

Ад самай станцыі, на якой Шулікавы злезлі з поезда, яны ішлі сюды пешa. Канстанціну Сцяпанавічу захацелася прайсціся па тых мясцінах, дзе ён бегаў некалі басанож і дзе з тае пары не быў ніводнага разу. Валодзя, хоць і з неахвотай, надпарадкаваўся бацьку. Чамадан яны неслі па чарзе. Цяпер, лёгка падхапіўшы яго, Валодзя жартаўліва прамовіў:

— Нагружаць адзінае сваё дзіцятка ты майстар. Пачакай, вось вырасту вялікі, разлічуся з табой за ўсё.

Валодзя паглядзеў на бацьку і раптам сумеўся. Канстанцін Сцяпанавіч задуменна глядзеў некуды ўбок, туды, дзе ўдалечыні, дасягнуўшы небасхілу, знікалі стужкі рэек. Бровы ў бацькі насупіліся, на лбе выразаліся дзве глыбокія маршчыны. Было такое ўражанне, быццам Канстанцін Сцяпанавіч, выпадкова зірнуўшы налева, нечакана для сябе нешта ўспомніў, і гэты ўспамін засмуціў яго і прымусіў цяжка задумацца.

— Што ты там убачыў? Вывяржэнне вулкана? — у тым жа жартаўлівым тоне спытаў Валодзя; яму хацелася адцягнуць бацькаву ўвагу, вярнуць яго ў ранейшы бесклапотны настрой.

— Што я там убачыў?..— пасля даволі доўгага маўчання перапытаў Канстанцін Сцяпанавіч.— Сваё мінулае. Далёкае і ўжо забытае.— Ён яшчэ крыху памаўчаў, а потым, нібы страсануўшы з сябе нешта, рашуча прамовіў: — Аднак пойдзем. Узяў чамадан?

Будыніна, якую Канстанцін Сцяпанавіч з жартаўліва-іранічнай узнёсласцю назваў палацам і да якой ён з Валодзем падышоў нарэшце, была звычайная хатка пуцявога абходчыка. Тут вось ужо амаль трыццаць год жыў стары чыгунапчнік Сцяпан Шулікаў і яго жонка Тэкля. Адсюль і сапраўды зрабіў у свой час першы крок у самастойнае жыццё іх старэйшы сын Кастусь. Зрэшты, зрабілі такія ж крокі потым і астатнія дзеці старых Шулікавых — Фёдар, Вольга і Мікалай. Паразляталіся птушаняты з роднага гнязда, і не сабраць ужо, не звесці іх разам. А гняздо асталося, і асталіся пільнаваць яго двое старых, тыя, што і звілі яго некалі.

Мінуўшы сенцы, а потым і пярэдні пакой, які быў адначасова і за кухню, Канстанцін Сцяпанавіч і Валодзя апынуліся ў сталовай, якая з'яўлялася таксама і спальняй. Уласна кажучы, хатка і складалася толькі з гэтых двух пакояў. Шулікавых ніхто не сустрэў, ніхто не падаў голасу, ніхто не азваўся. Валодзя падумаў, што ў хаце, напэўна, нікога няма.

— Мір гэтаму дому! — гучна сказаў Канстанцін Сцяпанавіч, уваходзячы ў пярэдні пакой. Вочы яго зноў загарэліся жартаўлівым зялёным агнём.— Аркестр, туш! — дадаў ён і сам пачаў іграць губамі: — Трум-ту-ру-рум, трум-тум-тум!..

Не ставячы чамадана, Валодзя падняў вольную руку ўгору.

— Адстаўіць туш! Відаць, тут трэба іграць нешта.

Але не скончыў і асекся. Ён заўважыў праз дзверы ў другім пакоі, што на ложку, які стаяў там у куце, нехта заварушыўся. Там было трохі цемнавата, туды слаба даходзіла святло з адзінага акна, і Валодзя не мог зразумець, хто варушыцца. Ён спалохана зірнуў на бацьку, потым зноў перавёў позірк на ложак. Канстанцін Сцяпанавіч таксама глядзеў туды. Але калі ў вачах у Валодзі адбівалася

адна толькі разгубленасць, дык вочы Канстанціна Сцяпанавіча свяціліся нейкай цеплынёй і разам з тым трывогаю. Мусіць, старэйшы Шулікаў бачыў тое, чаго зусім не бачыў малодшы.

Так было мо цэлую хвіліну. А ў наступны момант Канстанцін Сцяпанавіч зрабіў хуткі крок да ложка і, апусціўшыся на калені, прыпаў да яго. І амаль адначасова пачуўся нямоцны старэчы голас:

— Хто гэта тут? Хто тут, га?

Голас быў усхваляваны і крыху рэзкаваты, такі, які заўсёды бывае ў людзей, калі яны прачынаюцца і спрасонку не могуць яшчэ даўмецца, дзе яны і што з імі. Пачуўшы гэты голас, Валодзя ўздрыгнуў і ледзь не выпусціў чамадана.

— Мама! — сказаў Канстанцін Сцяпанавіч.— Мама, што з вамі?..

Цяпер у ім і следу не асталося тае вытанчанае напышлівасці, з якою ён падыходзіў да роднае хаты, з якою пераступаў яе парог. Паважны і немалады ўжо вучоны муж, якому захацелася было пагуляць у зняважлівасць да дзён далёкай мінуўшчыны, раптам стаў проста сынам свае мацеры. Ён схапіў яе жылістую, натруджаную доўгімі гадамі працы, старую руку, прыпаў да яе губамі, а вочы яго глядзелі ў яе вочы, і былі ў гэтым поглядзе і даўняя прага да ні з чым не параўнаных матчыных пяшчот, і туга аб беззваротным ужо, але незабыўным маленстве.

Гэта перамена, што адбылася з Канстанцінам Сцяпанавічам, таксама збянтэжыла і здзівіла Валодзю. Ён зусім пахлапечы пераступіў з нагі на нагу і раптам адчуў, што і сам нейк мяняецца — не то вяртаецца ў сваё дзяцінства, не то — наадварот — сталее. Яму пачало рабіцца неяк незвычайна тужліва, а разам з тым і святочна ў гэтай нізкай, абклеенай простымі і вельмі таннымі шпалерамі, хаціне. І немаведама чаму ў Валодзі заказытала ў горле, а павекі самі сабою заморгалі часта-часта.

— Не хвалюйся, Кастусёк, не хвалюйся,— гаварыла тым часам старая, якая пазнала ўжо сына.— Што ж нам і рабіць старым. Адно толькі пролежні набываць асталося. А ты гэта прыехаў, а мы і не чакалі. От жа даў бог радасці пад канец дзён. А і ўнучка ж ты прывёз з сабою, га? — спытала Тэкля Казіміраўна, пачуўшы Валодзін кашаль.— Валодзечка, а які ж ты вырас ужо, хай табе расці і дужэць. То дай цябе пацалую, гэткага майго харошанькага.

Яна скінула з сябе посцілку, якой была накрытая, і тады адразу ясна стала, што старая клалася толькі па хвілінаачку, бо нават і не раздзявалася. І яшчэ стала ясна, што Тэкля Казіміраўна, хоць і мае за плячыма нямалы век, аднак трымаецца на зямлі яшчэ моцна. Устаўшы з ложка, яна цвёрда ступіла да Валодзі. Але Валодзя апярэдзіў яе. Ён кінуўся да бабулі і, неяк сарамліва ўсміхаючыся, няўмела прытуліўся шчакою да яе шчакі. Тады Тэкля Казіміраўна абняла яго і тройчы пацалавала ў лоб.

— Добры дзень, бабуся! — асмялеўшы крыху, сказаў Валодзя.— Гэта мы, а як жа. Надумаліся наведаць вас, пабыць на вашай прыродзе.

— А чаму ж мама не прыехала з вамі?

— Не пашанцавала ёй: пладце каторы раз у швачкі перарабляе.

Апошні раз Тэкля Казіміраўна была ў іх у гасцях два гады таму назад. Цяпер, гледзячы на яе, і Канстанцін Сцяпанавіч, і Валодзя з прыемным здзіўленнем адзначылі, што яна зусім не пастарэла за гэты час. Тэкля Казіміраўна была такая ж рухавая, як і пазалетась, і гаворка яе лілася гэтак жа гладка і безупынна, як і тады.

— А то хіба мала з імі марокі, з гэтымі швачкамі? Такімі агрэйсэ шышкамі парабіліся, што куды там!.. Ёсць у нас у мястэчку адна, дык гэта ж не швачка, а цэлы асэсар. Напэўна, да міністра і то лягчэй падступіцца, чым да яе. Шыла я сабе вясною сукенку... помніш, Кастусёк, набраў ты мне быў штапелю сіняга такога з беленькімі бобачкамі? Ну дык от надумалася я вясною — трэба будзе, мусіць, пашыць, а то на смерць нічога такога падхадзяшчага няма...

— Ну што вы, мама... па смерць...— паморшчыўся Канстанцін Сцяпанавіч.

— Ды не, ты не крыўдуй, Кастусёк, гэта я праўду кажу. Яно, канешне, штапель спатрэбіўся б і так, бо ён такі добра ноські, але ж калі ёсць такая завядзёнка, не намі выдуманая, дык што ты зробіш... Вось, значыцца, падалася я да Трындычыхі, да гэтай самай швачкі нашай. Адно імя чаго варта, га? Але так яе толькі за вочы завуць, а чаму, па праўдзе сказаць, і не ведаю. Скажу толькі, што вельмі неяк ужо ёмка яно прыстае да яе, гэтае імя. А ў вочы мы ёй кажам іначай: Фаня Маркаўна, і нават дадаем яшчэ «шаноўная» або «дарагая».

— Так завецца адна асоба ў аперэце «Вяселле ў Ма-

ліпаўцы»,— уставіў Валодзя. Ён зручна ўладзіўся на драўлянай канапе, што стаяла каля акна, і з асалодаю выцягнуў ногі, бо яны ў яго парадкам такі здарожыліся.— Ох, і меле ж языком!

— Не, наша Трындычыха не такая. Я ж кажу, яна як той асэсар. А ходзіць як пава. Быццам па шкле ступае. Дык от ці ведаеш, як яна паздзеквалася з мяне? Разоў, мабыць, з дзесяць прымусіла схадзіць да яе. А свет жа не блізкі, да мястэчка кіламетраў чатыры з гакам будзе, ты ж ведаеш, Кастусёк.

— Роўна шэсць. Сам вымераў некалі. На ігрышчы давялося ў свой час уга колькі пахадзіць! А ў школу ж таксама, бывала, кожны дзень шкандыбаў па гэтай дарожцы.

Расказваючы, Тэкля Казіміраўна ўвішна тупала па хаце, неўпрыкметку прыбіраючы ў ёй. Яна прывяла ў парадак ложак, паслала на стол новы вышываны абрус, расхінула фіранкі на вокнах. Канстанцін Сцяпанавіч таксама хадзіў па хаце, прыглядаючыся да рэчаў, нават мацаючы іх. На камодзе яго ўвагу прыцягнула скарбонка, зробленая ў выглядзе прыгожага белага сабачкі з чырвоным банцікам на шыі. Канстанцін Сцяпанавіч усміхнуўся, відаць, нешта ўспомніўшы. Ён узяў скарбонку ў рукі і памахаў ёю. Усярэдзіне нешта забрынкала,— ці не тыя самыя пятакі і грыўні, што кідаў некалі ў скарбонку малады Кастусь?.. Асцярожна паставіўшы сабачку на камоду, Канстанцін Сцяпанавіч дастаў з кішэні нейкую манету і з самым дзелавым выглядам апусціў яе ў прорезь на сабачкавым карку. Потым ён пачаў разглядаць фотакарткі, што віселі над камодай у зашклёнай рамцы.

— Ведаеш, хто гэта? — спытаў Канстанцін Сцяпанавіч у Валодзі, паказваючы на адну з картак у рамцы.— А ну, паглядзі.

На сцяне была такая картка: два маладыя хлопцы, праглынуўшы аршыны, сядзелі на лаўцы і елі вачыма аб'ектыў фотаапарата. Адзін з хлопцаў, відаць, не вытрымаў і паварушыўся, і таму на фота выйшаў не твар, а нейкая пляма.

— Вось гэты хто будзе, га? — дапытваўся Шулікаў, пстрыкаючы пальцам па невыразным твары.

Разгледзець рысаў твару было немагчыма, як немагчыма разгледзець спіцаў на колах драбін, калі яны хутка нясуцца па дарозе, і таму Валодзя сказаў наўздагад:

— Ты!

— Правільна! — ухваліў Канстанцін Сцяпанавіч. Потым падазрона паглядзеў на Валодзю.— А як ты пазнаў? Няўжо ёсць нешта... агульнае?

— Нешта ёсць,— жартаўліва ўсміхнуўся Валодзя.

— А хочаш ведаць, калі гэта было? Дваццаць пяць гадоў таму назад, во калі!.. Заязджаў тут да нас адзін пстрыкун. Прыехаў, пстрыкнуў, узяў грошы, даў квіток і — будзь здароў. Потым прыслаў вось гэтую мазню. Я хацеў выкінуць, але маці не дала: грошы заплачаны!.. А гэты, другі — мой сябар. З суседняга абходу, з двухсотдзесятага кіламетра.— Канстанцін Сцяпанавіч уздыхнуў і пасля паўзы дадаў: — Загінуў у вайну. Танкіст быў. У танку і згарэў.

Шулікаў змоўк і адвярнуўся да акна. Маўчалі некаторы час і астатнія. Першая парушыла маўчанне Тэкля Казіміраўна.

— А што ж гэта я! Вы ж з дарогі выгаладаліся, напэўна. То пайду, прыгатую сёе-тое. А вы ідзіце да студні, памыйцеся. Ды не баўцеся, я адным махам упраўлюся.

— Бацька хутка прыйдзе? Ён дзе — у абходзе? — спытаў Канстанцін Сцяпанавіч.

— У абходзе, дзе ж яму яшчэ быць. Але хутка ўжо будзе. От пройдзе пасажырскі на Мінск, ён і заявіцца.

І Тэкля Казіміраўна была наважыла ісці на кухню.

— А ведаеш, чаму яе завуць Трындычыхай? — сказаў раптам Канстанцін Сцяпанавіч.

— Ну? — запытаўся Валодзя.

Тэкля Казіміраўна спынілася ў дзвярах і з цікаўнасцю паглядзела на сына.

— Ты яе ведаеш?..

— Мы ж з ёю гадкі. У адну школу хадзілі. Яна сядзела на трэцяй парце, а я на чацвёртай. Я нават быў адзін час закаханы ў яе. Здаецца, у дзевятым класе. Не, у восьмым. Яна якраз у восьмым асталася на другі год і болей у школу не пайшла. Дык вось, у маленстве, казалі, любіла яна спяваць адну песеньку. У той песеньцы былі такія словы: «Трынды-баба, трынды-дзед, заварожаны білет». Здарава, а? Трынды-баба, трынды-дзед! Што да чаго — ліха яго ведае. Болей я слоў не помню, а гэтыя вось затрымаліся ў памяці. От праз гэтыя самыя нейкія там «трынды» і стала яна Трындычыхай. Яшчэ ў тыя часы.

— Скажы ты, а! — здзіўлена прамовіла Тэкля Казіміраўна.— Гэта ж трэба!

Яна пайшла на кухню, і Валодзя так і не зразумеў, з чаго Тэкля Казіміраўна гэтак здзівілася,— ці то з таго, што яе сын ведае паходжанне мянушкі мясцовай славутасці, ці то з таго, што ён быў закаханы ў яе.

— Чорт, а і сапраўды было гэта — кахаў я яе,— нібы разважаючы сам з сабою, задумена прамовіў Канстанцін Сцяпанавіч.— Нават раўнаваў да Толіка Маханька. Дзіўна!

Ён памаўчаў крыху.

— Але самае моцнае маё юнацкае каханне было не гэтае. То было другое. Яно прыйшло крыху пазней, але таксама ў школе. У дзесятым класе.

Ён зноў памаўчаў, крадком пазіраючы на фотакарткі над камодай. Была там сярод іншых картка маладой дзяўчыны з раскошнымі косамі, спушчанымі на грудзі, і з пушыстымі вейкамі,— на яе, здаецца, якраз і пазіраў употай ад сына Канстанцін Сцяпанавіч. А гаварыў ён не тоячыся, не падбіраючы слоў, так, каб толькі трошкі ўгадваўся сэнс. Было падобна на тое, што ўспаміны, якія нахлынулі раптам на яго, прасіліся вонкі і ён не меў сілы, проста не мог не падпарадкавацца іх настойліваму покліччу.

— Нэля — вось як звалі яе. Нэля... Імя, вядома, самае звычайнае. А сама яна... сама была вельмі незвычайная. Зрэшты, можа, гэта толькі мне так здавалася. Яна жыла тут непадалёку, на дзвесце шаснаццатым кіламетры. Яе бацька таксама быў пуцявы абходчык.

Канстанцін Сцяпанавіч раптам павярнуўся да дзвярэй і крыкнуў:

— Мама! Вы не ведаеце, дзе цяпер Нэля? Ну, тая, помніце, з двухсот шаснаццатага?

— Пра Трындычыху дык ён ведае...— пачуўся за дзвярыма голас Тэклі Казіміраўны.— А от пра Нэлю...

Яна чамусьці ўздыхнула і дадала:

— Тут яна, дзе ж ёй быць.

— Тут?..— зусім ціха, амаль шэптам сказаў Канстанцін Сцяпанавіч і адступіў на крок.

— Яе ж бацька памёр... даўно, яшчэ перад вайной... от яна і стала на яго месца. Пуцявой абходчыцай. Так з таго часу і працуе тут.

На кухні забразгалі каструлі, тонка дзынкнула шклянка.

— Вядома, дзяўчо яна была,— гаварыла далей Тэкля

Казіміраўна,— нясмелае, някемнае, свету белага баялася як чорт ладану, бо вырасла сярод стэпу, а наклікаць яе ніхто нікуды не паклікаў, от яна і асталася... Пад час вайны ў партызанах была, з нашым старым у адным атрадзе, а скончылася вайна — ізноў сюды.

Канстанцін Сцяпанавіч стаяў каля самай сцяны, паміж камодай і ложкам, прытуліўшыся спіною да шпалераў. На фоне белых шпалераў твар яго здаваўся цяпер больш цёмны, чым звычайна, асабліва пад вачыма, яшчэ выразней на носе выступіла гарбінка, а па падбародку ямачка. Ён пацёр падбародак пальцамі, потым апусціў руку і гучна забарабаніў па камодзе.

— Ну, бацька, выходзіць, я безнадзейна адстаю ад цябе,— жартаўліва сказаў Валодзя.— Гэта ж думаць — дажыў да атэстата сталасці і яшчэ ні ў кога не закахаўся. Ты ў мае гады, выходзіць, быў больш увішны.

— Ну, ну!..— строга буркнуў Канстанцін Сцяпанавіч.— Ты... не вельмі, гэта самае...

І, перастаўшы барабаніць, ён зрабіў у паветры нейкі няпэўны жэст.

—Што ж вы мыцца не ідзяце? — гукнула з кухні Тэкля Казіміраўна.— А то ў мяне амаль усё гатова. І пасажырскі вунь просіцца ўжо да нас. Чуеце — гудзе.

— Пайшлі! — скамандаваў Канстанцін Сцяпанавіч.

Калі яны выходзілі з сенцаў, міма хаткі на поўнай скорасці пранёсся пасажырскі поезд. Грукат яго на момант аглушыў абодвух, асабліва Валодзю, ды нават і тады, калі поезд знік ужо ўдалечыні, у вушах доўга яшчэ стаяў непрыемны густы шум.

— Прывыкай, отрак,— сказаў Канстанцін Сцяпанавіч і па-блазенску падкінуў высока ўгору мыльніцу.

— Навошта? У пуцявыя абходчыкі ісці я не збіраюся, сам ведаеш.

Канстанцін Сцяпанавіч злавіў мыльніцу, паглядзеў на Валодзю, але нічога не адказаў. Ён і сам не ведаў, чаму сказаў гэтае «прывыкай».

Было горача, нават душна. У шэрым бязвоблачным небе сонца паліла так моцна, быццам ведала, што старацца ў гэтым годзе яму асталося небагата ўжо часу, бо верасень не за гарамі, а там пойдуць дажджы, паляцяць з поўначы сіберныя вятры, і змагацца з гэтай навалаю будзе цяжка. Таму яно, хоць кацілася ўжо на гэтую хвіліну па другой палавіне свае дзённае дарогі, пякло і пякло, і было такое

адчуванне, што чым бліжэй да небасхілу апускаецца яно, тым мацней прыпякае.

Каля студні яны паскідалі з сябе адзежу, астаўшыся ў адных трусах. Валодзя выцягнуў вядро сцюдзёнай, як з іхняга хатняга халадзільніка, вады, і, палівагочы адзін аднаму з конаўкі, яны тут жа пачалі мыцца, вохкаючы і нават стогнучы, калі хто-небудзь з іх незнарок або наўмысна выліваў на шыю другому значна больш вады, чым было патрэбна і магло трываць цела.

— У-а-ах!.. — крактаў Канстанцін Сцяпанавіч, ухіляючыся ад струменяў вады і б'ючы сябе рукамі па лапатках.

— Вой-вой-вой!..— енчыў Валодзя і, адштурхоўваючы ад сябе конаўку, цаляў выліць яе на бацьку.

Яны і не заўважылі, як падышоў да іх старэйшы Шулікаў. І таму абодва аж сумеліся, калі пачулі раптам моцны раскацісты бас:

— Давай, давай, а ну, давай! Хто — каго, га? А ну, а ну!..

Адчувалася, што Сцяпан Харытонавіч прывык заўсёды гаварыць гучна і што рукі яго пры гэтым абавязкова павінны рабіць парывістыя жэсты. Высокі, шыракаплечы, ён, як і Тэкля Казіміраўна, быў яшчэ даволі моцны.

— От гэта мне падабаецца! Люблю, калі дарослыя дурэюць, як дзеці.

Энергічна і моцна абняўшы і пацалаваўшы сына і ўнука, Сцяпан Харытонавіч і сам зняў кашулю і таксама пачаў абліваццца вадою. Цела яго не мела і следу тае старэчае лядашчасці, якая павінна была быць у ягоным узросце,— яно было загарэлае, мускулістае.

Утрох яны доўга яшчэ прыскаліся, лілі ваду адзін на аднаго, і паналівалі каля студні столькі, што сухая вытаптаная зямля ператварылася ў ліпкую калатушу.

Але выйшла Тэкля Казіміраўна і пагнала іх у хату. Вясёлыя, прыемна ўзбуджаныя, з пасінелымі, але шчаслівымі тварамі, не перастаючы смяяцца і пакепліваць адзін з аднаго, Шулікавы паселі нарэшце за стол, дзе ўжо дыміліся талеркі з пахучым баршчом і стаяла яшчэ багата іншага, таксама не пустога, посуду самага рознага памеру і канфігурацыі. Канстанцін Сцяпанавіч загадаў Валодзю далучыць да стала іх гарадскія прыпасы — кансервы, яраслаўскі сыр, каўбасу цвёрдага вэнджання, сёмгу. А пакуль стары Шулікаў хадзіў у сенцы, дзе ў патаемным месцы была ў яго прыхавана па ўсякі непрадбачаны выпадак паўлітэр-

ка, з чамадана былі выняты яшчэ бутэлька каньяку і бутэлька мадэры.

— Ну, будзьма! — сказаў Сцяпан Харытонавіч, падымаючы чарку.— Гэта добра, Кастусёк, што ты завітаў нарэшце на дзвесце трыццаты кіламетр. Бо мы са старой часта наязджаем да вас у горад, а вы от... Адпак, як той казаў, хто старое ўспомніць, таму гэтае самае... Будзьма!

Спрытна, адным махам, перакуліўшы ў рот чарку з каньяком, Сцяпан Харытонавіч падчапіў відэльцам скрылёк каўбасы, панюхаў яго і нечакана ўсміхнуўся.

— От успомніў... У нас у партызанскім атрадзе ў часе блакады, калі не было чаго есці, кухар казаў: «Ешце, браткі, часнок. Ведаеце — ён дужа пахне каўбасой!»

Усе таксама выпілі свае чаркі,— Канстанцін Сцяпанавіч бацькавай гарэлкі, якая мела нейкі дзіўны колер і смак, Тэкля Казіміраўна з Валодзем — мадэры. І пацякла пад час закускі гаворка, якая не спынялася потым да самае начы.

Канстанцін Сцяпанавіч назіраў за бацькам і шчыра радаваўся з яго бадзёрасці, якая аж бурліла ў ім. Стары, у сваю чаргу, употай назіраў за ўнукам і з прыемнасцю адзначаў яго манеру трымацца і гаварыць з пэўнай дасціпнасцю, з вострымі, але ў той жа час і сціплымі жартамі. І яшчэ адно з прыемнасцю выявіў стары — Валодзя палка, нават з нейкім замілаваннем, любіць свайго бацьку і з непасрэднай юнацкай успрымальнасцю імкнецца быць ва ўсім падобным на яго, а часам і проста пераймае яго характар, паводзіны. А Тэкля Казіміраўна завіхалася з талеркамі і, шчаслівая, падкладвала і падкладвала мужчынам закуску.

Налівалі і спаражнялі новыя чаркі, гаварылі тосты за прысутных і адсутных членаў сям'і. Калі дайшла чарга выпіць за здароўе малодшага сына Сцяпана Харытонавіча — Мікалая, які служыў цяпер у арміі, стары пахваліўся ўнуку:

— Мікалай, ці ведаеш, пісьмо прыслаў нядаўна. Хутка, кажа, дэмабілізуецца. І тады сюды прыедзе. На змену бацьку. Я — на пенсію, а ён — на маё месца.

— Пасля арміі і сюды? У гэтую глушэчу? — асцярожна спытаў Валодзя.— Ён жа, здаецца, перад арміяй дзесяцігодку скончыў?

— Ага, скончыў,— пацвердзіў Сцяпан Харытонавіч.— Ну і што ж? Хіба яго веды будуць тут замінаць каму-не-

будзь? Тут жа ў нас, братка, не абы-што, а — чыгунка, транспарт. А на транспарце нават у качагары і то не бяруць без дзесяцігодкі. Бо — тэхніка!

— Дык то на паравоз,— не пагаджаўся Валодзя.— Там сапраўды патрэбны веды. А тут... якая тут тэхніка? Малаток, гаечны ключ, ну там пара запасных кастылёў, пара балтоў... яшчэ, здаецца, скрэбла для ачысткі рэек... вось і ўся «тэхніка» пуцявіка. Каб управіцца з ёю, зусім не абавязкова сядзець дзесяць гадоў за партай. Правільна я гавару? — звярнуўся Валодзя да бацькі.

Канстанцін Сцяпанавіч не палічыў патрэбным умешвацца ў гаворку. Яму цікава было паслухаць, што адкажа Валодзю стары. А Сцяпан Харытонавіч палажыў відэлец і пільна паглядзеў на ўнука.

— Скрэбла, кажаш? Пара запасных кастылёў? — яшчэ гучней, чым звычайна, прамовіў стары.— Так, лічылася некалі, што на чыгунцы ёсць прадуха для малапісьменных — пуцявая гаспадарка. Але гэта было, ды быллём парасло. Ты прыехаў бы сюды вясною, калі ў нас тут ішоў капітальны рамонт пуці, ды паглядзеў, якія «скрэблы» ў нашых пуцявікоў. І ўбачыў бы ты тут і шпалападбойную машыну, і рэйкарэзны станок, і маторную дрызіну. Я ўжо не кажу пра перасоўную электрастанцыю, пра механічны пуцеўкладчык, які сам цэлымі звеннямі кладзе рэйкі на насып разам са шпаламі. А пра такую прыладу ты чуў — дэфектаскоп? Не чуў? А гэта такая штукенцыя, што калі ў цябе і ёсць, скажам, толькі тых ведаў, што два на два — чатыры, дык ты і не падступішся да яе.

Пачало цямнець. Тэкля Казіміраўна зняла са сцяны вялікую лямпу, запаліла яе і паставіла пасярэдзіне стала.

— Можа, яно і так, але ўсё ж... — не здаваўся Валодзя.— Мне неяк дзіўна чуць, што Мікалай будзе тут працаваць і жыць... Я ж ведаю яго,— помніце, вы прыязджалі да нас неяк летам разам з ім. Ён быў тады ўжо ў дзевятым, а я ў шостым. Ён такі начытаны, разумны, дапытлівы... і наогул. Я нават, помню, зайздросціў яму тады, што ён — такі.

— Ага, яго ты ведаеш. А мяне, выходзіць, не ведаеш?

— Чаму... што вы гаворыце...— сумеўся Валодзя і пачырванеў.

— Ведаеш, значыцца і мяне? А чаму ж ты тады забыўся на тое, што я тут, от на гэтым самым дзвесце трынаццатым кіламетры, раўнютка, лічы, трыццаць год прарабіў? І

што — загінуў я тут, у гэтай, як ты кажаш, глушэчы? Ці, можа, здзічэў? Не, не загінуў і не здзічэў, а — наадварот — жыў-здароў, чаго і кожнаму жадаю, як той казаў. І дзяржаўны хлеб я тут еў недарма, зірні ў працоўную кніжку — пабачыш. Падзяк там ды прэмій не адзін дзесятак знойдзеш. Аднаго разу нават катастрофу папярэдзіў. Не, я не выхваляюся, але каб не мае рукі ды вочы — грымнуў бы кур'ерскі пад адхон так, што толькі адно ламачча і асталося б, а пра людзей дык і казаць няма чаго... Або — дзяцей от выгадаваў, ды і не благіх, здаецца. Адзін — во, ён тут сядзіць — член вучонага савета. Другі, Фёдар, афіцэрам быў, радзіму ад фашыстаў бараніў, там і галаву сваю злажыў. Трэцяя, Вольга, настаўнічае ў школе, таксама каля добрай справы стаіць. Ну, а чацвёрты, падскрэбак наш... чацвёрты будзе маю справу далей весці. Каб не загінуў рабочы род Шулікавых, старацца будзе. А ён, рабочы наш род, здалёк ідзе. Бо і бацька мой таксама чыгунку пільнаваў, каб ты гэта ведаў.

— Ну, ну, хопіць,— сказала Тэкля Казіміраўна, хоць ёй, па ўсім было відаць, і прыемна было слухаць мужа.

— Гэта я што хачу давесці,— узяў цішэйшы тон Сцяпан Харытонавіч.— Абы чалавек пры сваім месцы быў, пры сваёй справе, ды каб любіў ён гэту справу — тады і шчасце будзе яму. Абы, значыцца, душа гарнулася ў яго да чыстага кірунку ў жыцці.

Сцяпан Харытонавіч наліў яшчэ чаркі, плюхнуў трошкі і ў Валодзеву, хоць двойчы перад гэтым прамінаў яе.

— А ну, старая, уключы-тка там прыёмнік, можа, музыку якую знойдзеш. А то Валодзя, бачу, зусім засмуткаваў з мае ка́зані.

Валодзя хацеў адказаць нешта, але не паспеў,— з невялічкага прыёмніка, які стаяў на тумбачцы каля акна, пачулася раптам яго любімая «Венгерская рапсодыя». Музыка гучала мякка, крыху прыглушана, бо Тэкля Казіміраўна ўключыла прыёмнік не на поўную моц, і гэта надавала музыцы нейкую асаблівую цеплыню і сардэчнасць.

— Так бы і паехаў ён сюды,— сказала Тэкля Казіміраўна, усё яшчэ поўная думамі пра Мікалая,— так бы і паехаў ён, каб ты ў кожным пісьме не зваў яго, не маліў стаць на свае месца.

— А што ж — і зваў. Так і трэба: калі сам выправіўся ў дарогу, дык і другіх заві. Калі ў добрую, вядома, дарогу. Заві і вядзі!

Ахмылеўшы крыху, Сцяпан Харытонавіч пачаў гаварыць значна цішэй, чым заўсёды, часам пераходзіў ледзь не на шэпт, і тады ствараліся ўражанне, што ён вось-вось скажа нешта вельмі таямнічае. Але гаварыў Сцяпан Харытонавіч пра звычайнае, пра тое, у чым быў цвёрда пераканаш.

— Справа не ў тым, дзе і кім працаваць. А ў тым уся пятрушка, каб з душой рабіць тое, да чаго прыстаўлены. Можна і міністрам быць, а працаваць толькі для прыліку. Хіба няма ў нас гэткіх? От чытаў я нядаўна ў газеце — знялі аднаго. Да такіх высокіх чыноў далез, а нічога з сабою не прынёс — ні душы, ні сэрца. А можна, наадварот, дворнікам служыць, і так прыбіраць вуліцу, што людзям адна радасць будзе хадзіць па ёй.

Цяпер у пакоі гучала ўверцюра да «Лебядзінага возера», і Валодзя ўспомніў нядаўнюю паездку Вялікага тэатра ў Лондан, трыумфальны поспех Галіны Уланавай у гэтым балеце. Ён ні разу не быў у Вялікім тэатры, ні разу не бачыў Галіны Уланавай і зайздросціў кожнаму, хто мог хоць што-небудзь расказаць пра тэатр і пра артыстку. Цікава, а дзед быў калі-небудзь у гэтым храме мастацтва?..

Валодзя паглядзеў на бацьку. Канстанцін Сцяпанавіч сядзеў моўчкі. Вочы яго былі злёгку прыжмураны. І невядома было, ці то ён заслухаўся музыкай, ці то аб нечым задумаўся.

Маўчаў нейкі час і стары Шулікаў. Потым пачаў гаварыць зноў.

— І от прыкмеціў я даўно — любіць Мікалай чыгунку. І менавіта — пуцявую гаспадарку. Горнецца ў яго да яе сэрца. Я табе вось што скажу,— Сцяпан Харытонавіч падсунуўся бліжэй да Валодзі.— Сапраўднага пуцявіка, ведаеш, як пазнаць можна? Па тым, як ён забівае кастыль у шпалу. От рамантуюць, скажам, чыгунку. Кастылёў тут трэба пазабіваць уга колькі! Дык вось... Возьме чалавек кастыль, прыставіць яго да шпалы і — пайшоў гвоздаць малатком. І раз гвоздане, і два, і пяць. То не ўцэліць па плешцы ўдарыць, то збоку па ёй пляспе, ды так, што кастыль і гатоў, сагнуўся. Глядзець моташна на такога рабацягу, а не тое што... А яшчэ, бывае, б'юць і так. Становяцца два чалавекі насупраць адзін аднаго і пачынаюць лупіць па чарзе — раз-раз, раз-раз! Гэта ўжо значна вышэйшы клас, тут патрэбна спрацаванасць, трэба мець адчуванне рытму, бо саб'ешся з рытму — і замест таго, каб па кас-

тылю ўдарыць, возьмеш ды і стукнеш па малатку свайго напарніка.

Сцяпан Харытонавіч узяў з сынавага партсігара папяросу, закурыў — упершыню за ўвесь вечар.

— А сапраўдны пуцявік, з тых людзей, каго ў народзе завуць умельцамі, робіць так. Паставіць кастыль, паплюе на рукі, возьме дзяржальна малатка за самы край... а малаток, братка, важкі, двухканцовы... а тады размахнецца, ускіне малаток над галавою і — гах! — Сцяпан Харытонавіч і сам у гэты момант зрабіў рукамі рэзкі ўзмах, нібы забіваў кастыль у шпалу.— Адзін толькі раз і цюкне, а кастыль гатоў ужо, увесь у шпале, па самую макаўку, і так трымае рэйку, як зліўся з ёю!

Закашляўшыся, Сцяпан Харытонавіч акуратна пагасіў папяросу і паклаў яе на стол — не ў попельніцу, а побач, на карабок з запалкамі.

— І справа тут зусім не ў сіле. Сіла тут ні пры чым. Бо пуцявік кожны сёе-тое ў руках мае, слабенькія ды нядошлыя да нас не ідуць, а вось рубаць так не кожны можа. Тут патрэбна ўмельства, тое асаблівае ўмельства, якое даецца чалавеку, калі ён стаіць пры сваёй справе з душою.

Нахіліўшыся зусім блізка да Валодзі, Сцяпан Харытонавіч дадаў:

— От і мой Мікалай гэтак кастылі забівае. Раз — і гатова!

— Хопіць табе ўжо выхваляцца! — сказала Тэкля Казіміраўна.— Сеў на свайго канька, дык гатоў да раніцы ехаць. А другому і слова не дасць сказаць.

— А я што... Я ж праўдзе... — Сцяпан Харытонавіч зноў узяўся за бутэльку.— А і то сказаць, музыка вунь якая прыгожая. Пад такую музыку можна цэлага бусла спаражніць, га, Кастусь?

Яны яшчэ доўга сядзелі за сталом. Успаміналі мінулае. Распытвалі адзін у аднаго пра даўніх знаёмых, пра сваякоў. Расказвалі розныя гісторыі, што адбываліся або з імі самімі, або з тымі знаёмымі ці сваякамі. Мужчыны спелі нават «А ў полі вярба...».

Ляглі спаць вельмі позна. Тэкля Казіміраўна паслала сыну і ўнуку ў пуныцы,— гэта яны самі прасілі. Валодзя першы раз у жыцці ляжаў на сухім духмяным сене, і яму тут новым і незвычайным было ўсё: і тое, як шамаціць сена пры кожны руху, і што ад яго ідзе такі моцны і надзвычай прыемны водар, і само паветра — нейкае асаблі-

вас, бо і дыхаецца табе інакш, і настрой у цябе інакшы, і сам ты нібы стаў іншы.

Канстанцін Сцяпанавіч думаў, што Валодзя заснуў адразу ж, як толькі лёг. А таму ён вельмі здзівіўся, калі праз некаторы час пачуў сынаў голас.

— Тата,— ціха сказаў Валодзя.— А чаму ты памогся, каб я пайшоў іменна ў твой інстытут? Ты ўпэўнен, што з мяне выйдзе добры эканаміст?

— Спі, Валодзя, спі,— мякка прамовіў Канстанцін Сцяпанавіч.— І давай не будзем вяртацца да гэтага пытання.

Хоць і не адразу пасля гэтых слоў, але Валодзя ўсё ж заснуў нарэшце. Канстанцін Сцяпанавіч пачуў неўзабаве яго мернае спакойнае дыханне. А сам Канстанцін Сцяпанавіч заснуць ніяк не мог. То лезлі ў галаву розныя ўспаміны, галоўным чынам з маленства, то перад заплюшчанымі вачыма праносіліся нейкія малюнкі невядома з якіх часоў, і былі яны нейкія неакрэсленыя, невыразныя, так што і сэнс іх амаль не ўгадваўся. А то раптам пачынала здавацца, што недзе вось тут, зусім побач, стаіць нечая постаць, стаіць нерухома, з паніклай галавою...

«Бяссонніца — маці прывідаў,— падумаў Канстанцін Сцяпанавіч.— Чые гэта словы? Адкуль?»

Пачуўся далёкі гудок паравоза. Потым пунька пачала дробна дрыжаць, а на даху, над самай галавой, тонка зазвінеў бляшаны ліст. Праз момант поезд наблізіўся, і грукат яго паглынуў усе іншыя гукі. Канстанцін Сцяпанавіч беспамылкова вызначыў, што гэта быў таварны састаў і меў ён сорак шэсць вагонаў,— іменна столькі ўдалося налічыць, услухоўваючыся ў перастук колаў па стыках рэек.

Поезд прамчаў, грукат сціх, а бляха на даху яшчэ доўга звінела. Пасля і гэты гук прапаў, і зноў стала ціха.

А заснуць, як і раней, не ўдавалася.

Прыгадаліся бацькавы словы, тыя, што гаварыў ён за вячэраю,— простыя і крыху наіўныя, але вельмі правільныя словы пра месца ў жыцці... Вось ён, Канстанцін Сцяпанавіч Шулікаў,— ён знайшоў сваё месца. І ён шчаслівы. Шчаслівы будзе і Мікалай,— Канстанцін Сцяпанавіч упэўнены ў гэтым. Па-свойму, але таксама шчаслівы. «Яго шчасце тут, а маё — там. Шчасце рознае, але аднолькава моцнае, трывалае». А вось Валодзя... ці будзе шчаслівы Валодзя? І чаму раптам прыйшло яму ў галаву гэтае пытанне?..

«Тата, а ты ўпэўнен, што з мяне выйдзе добры эканаміст?»

Павінен выйсці, Валодзя, павінен! Я прыкладу ўсе намаганні, я памагу табе, Валодзя! Толькі не задавай сабе, калі ласка, непатрэбных пытанняў.

Яшчэ адзін поезд пранёсся па пуцях. І зноў доўга звінела бляха над галавой. Значыцца, зноў быў таварны.

Невядома па якой асацыяцыі, але без усякай сувязі з папярэднімі думкамі, Канстанцін Сцяпанавіч раптам выразна ўспомніў адзін выпадак з далёкага мінулага. «Пачакай, колькі гэта было мне тады гадоў?.. Ага, я тады якраз у дзесяты клас хадзіў. Не, нават здаваў ужо экзамены на атэстат. Іменна тады я зрабіў той вензель. Іменна ў тыя дні. Э-э, вунь колькі часу мінула з тае пары!..»

Даўно, вельмі даўно гэта было. Але чаму ж той вензель, той даўні і зусім ужо забыты вензель раптам паўстаў у памяці? І чаму іменна цяпер?..

...Калі вы ездзілі поездам па чыгунцы, дык, напэўна, заўважалі адну рэч. Там, дзе чыгунка праходзіць па выемцы і дзе абапал палатна ўзвышаюцца адхоны, можна ўбачыць на фоне зялёнай траўкі або жоўтага пяску беленькія, старанна зробленыя рысункі ці надпісы. Бывае гэта або пяціканцовая зорка з промнямі, што разыходзяцца ва ўсе бакі ад яе, або складзеныя крыж-накрыж малаток і гаечны ключ — эмблема чыгуначнікаў, або што-небудзь яшчэ. Сустракаюцца нават цэлыя лозунгі, якія заклікаюць да барацьбы за мір, да новых поспехаў у працы. Усё гэта робіцца з невялічкіх каменьчыкаў і афарбоўваецца звычайна ў белы колер, а таму абавязкова прыцягвае ўвагу пасажыраў, што едуць міма.

Такія надпісы ці рысункі ствараюць на адхонах пуцявыя абходчыкі. Вядома, у іх абавязкі гэта не ўваходзіць, робяць яны іх па сваёй добрай ахвоце, кіруючыся зразумелым жаданнем неяк упрыгожыць свой участак чыгункі, зрабіць яго больш прывабным...

Аздабляў рысункамі свае кіламетры і стары Шулікаў. Непадалёк ад яго хаціны быў якраз узгорак, і чыгунка там ішла па выемцы. Шулікаў выклаў на адхоне з каменьчыкаў алення, які стаяў на высокай скале і пільна глядзеў туды, куды беглі паязды.

Далей была яшчэ адна выемка. Там якраз канчаўся ўчастак Сцяпана Харытонавіча і пачынаўся другі — Кузьмы Барэйкі, Нэліната бацькі. Вось тут, на мяжы двух уча-

сткаў, Кастусь Шулікаў употай ад усіх зрабіў адпойчы свой рысунак. Цэлы тыдзень збіраў ён каменьчыкі, зносіў і складваў іх на ўзгорку, а на досвітку аднаго вясенняга дня выклаў з іх вялізны круг, вакол яго — васьмікапцовую зорку, а ў сярэдзіне — сплеценыя між сабою літары «К» і «Н».

Кастусь і Нэля...

Пуцявыя абходчыкі-суседзі даведаліся, чыіх рук гэта была праца, але не здагадваліся, а мо рабілі выгляд, што не здагадваюцца, які змест тоіць у сабе гэты твор. Затое Кастусь не сумняваўся ў тым, што Нэля разгадала сэнс вензеля. Калі назаўтра Кастусь сустрэў у школе Нэлю, яна раптам зачырванелася і паглядзела на яго неяк зусім не так, як глядзела дагэтуль...

Дык чаму ж той даўні вензель паўстаў нечакана ў памяці?.. Канстанцін Сцяпанавіч успомніў яго цяпер ва ўсіх дэталях, ва ўсіх дробязях. Навошта?..

Зноў пачала тоненька звінець бляха. Ледзь улоўна задрыжалі сцены пунькі. «Пасажырскі»,— зазначыў Канстанцін Сцяпанавіч.

Поезд праляцеў хутка, і грукату ён нарабіў менш, чым папярэднія.

Канстанцін Сцяпанавіч ведаў ужо, што сёння ён не засне. Трэба, відаць, устаць і пахадзіць па двары.

Было даволі светла — у небе, бліжэй да паўднёвага краю, вісеў рог месяца, а над галавой мігцелі бледныя зоркі. Канстанцін Сцяпанавіч паглядзеў на ўсход — там, нібы дарагі дыямент, зіхцела самая буйная зорка. Канстанцін Сцяпанавіч падумаў, што гэта, напэўна, Венера.

Сцежкаю ён сышоў на чыгунку і, не задумваючыся, павярнуў направа. Па шпалах ісці было пяёмка, і ён скіраваў на міжпуцце. Ішоў Шулікаў шпарка, не азіраючыся ні назад, ні ў бакі, а ўсё гледзячы толькі наперад, туды, дзе пачаў ужо святлець край неба.

Аднекуль збоку, відаць адтуль, дзе быў далёкі лес, пацягнула лёгкім халадком. Канстанцін Сцяпанавіч перасмыкнуў плячыма, аднак не павярнуў назад, а пайшоў далей.

Думкі зноў вярнуліся да бацькі. Што там ні кажы, а пастарэў ён усё ж парадкам. Хоць і голас яшчэ моцны, хоць і позірк цвёрды, а няма ўжо таго спрыту ў руках, тае бадзёрасці ў хадзе, што былі пекалі. А вось галава ў яго

па-ранейшаму светлая. Ён цвяроза і разумна глядзіць на свет, гаворыць разважліва і талкова.

І зусім правільна гаварыў стары наконт таго, што, маўляў, трэба з в а ц ь. Так, калі ты пайшоў куды і калі ведаеш, упэўніўся, што ў добрую дарогу выправіўся, дык і другіх заві з сабою. І не стамляйся зваць! Каб і яны ішлі. І не спыняйся ўжо ніколі. Заўсёды будзь у дарозе. У вялікай дарозе.

Канстанцін Сцяпанавіч раптам нечакана для сябе прыпыніўся. Адна думка, імгненная, як удар электрычнага току, працяла яго, і ён адчуў, што ў адзін момант успацеў. Ён выняў з кішэні хустачку і старанна выцер лоб і шыю.

...А і ён жа зваў некалі. Зваў горача, палка. Гаварыў цёплыя, сардэчныя словы. Пераконваў, што разам ім будзе добра ў дарозе, што яны не павінны быць асобна адно ад аднаго... Але, ён зваў. Ды неяк так яно сталася, што пайшоў толькі сам. Ён пайшоў, а яна асталася. Тут асталася, на сваім дзвесце шаснаццатым кіламетры. І немагчыма цяпер ужо сказаць пэўна, чаму яно так сталася...

Месячыкава святло паступова зблякла. Вузкая няясная палоска на самым краі неба на ўсходзе ўсё шырэла, і вось ужо яна пачала зелянець, потым жаўцець. Канстанцін Сцяпанавіч зноў падаўся наперад, у ранейшым кірунку.

...Ды не, калі быць зусім шчырым самому з сабой, дык можна сёе-тое і ўдакладніць. Уласна кажучы, ён не столькі зваў, колькі абяцаў пазваць потым, пасля. Спярша яму трэба было пайсці самому, аднаму, бо яна тады не магла яшчэ пайсці следам. А потым, пасля, і яна павінна была рушыць. Сама болей — праз год, калі скончыць дзесяцігодку.

Так, ён абяцаў пазваць, гэта праўда. Пільна абяцаў.

А потым... што ж адбылося потым? Няўжо ён забыўся на сваё абяцанне? І калі гэта здарылася?

Сапраўды, калі гэта здарылася?..

У інстытуце яму прыйшлося нялёгка. Даводзілася ахвяраваць і адпачынкам, і нават сном, каб толькі не адстаць ад другіх, бо выявілася, што вясковая школа дала яму малавата ведаў і трэба было самому папоўніць іх. Аднак і тады, у тыя шалёныя дні першага семестра, ён усё помніў. Помніў, і нават умудраўся з дваццаці чатырох абсалютна занятых гадзін выкройваць нейкі час на тое, каб напісаць пісьмо на дзвесце шаснаццаты кіламетр. На кожнае сваё пісьмо ён атрымліваў адказ. Словы з тых адказаў можна і

цяпер прыгадаць,— яны былі як прысяга, як клятва: «Я буду чакаць, Кастусь. Колькі трэба будзе, столькі і буду чакаць. У мяне хопіць цярплівасці. На ўвесь час хопіць. Можа, і цяжка будзе, але я стрываю. Ты верыш мне?..» Ён і не сумняваўся. Верыў і помніў. Але вось як пачалася зімовая экзаменацыйная сесія... Няўжо тады?.. Не, гэта, напэўна, адбылося пазней. Бо і ў той час ён яшчэ помніў і пісьмы яшчэ слаў, хоць, здаецца, і радзей крыху. Гэта адбылося пазней, значна пазней, а іменна — на канцэрце ў філармоніі, калі са сцэны аглушальна рванулíся ў залу тры фортэ ў хоры пілігрымаў з вагнераўскага «Тангейзера», а ў зале, зусім побач, суладна музыцы закалацілася сэрца ў Валі Зайцавай, ягонай аднакурсніцы, якая і зацягнула Канстанціна на канцэрт... Але, якраз тады яно і пачалося. І праз некалькі хвілін канчаткова замацавалася,— тады, калі скрыпкі ў аркестры заспявалі «Песню сэрцаў» Яна Сібеліуса. На той час два сэрцы, што былі побач, зусім блізка адно ад аднаго, таксама заспявалі сваю песню, якая нечакана заглушыла ўсё — і той покліч, і самую веру ў ягэ шчырасць.

Валя Зайцава, гэта ты, выходзіць, ва ўсім вінаватая! Гэта ты, якая носіш цяпер імя Валянціны Паўлаўны Шулікавай...

А мо хто іншы?.. Бо ты ж такі добры, такі сардэчны чалавек — і была такою, і асталася.

Зоркі на небе пагаслі, толькі на ўсходзе ўсё яшчэ зіхцела Венера, далёкая і вабная. З левага боку ад чыгункі, у лагчыне, курыўся туман. Ён нагадваў клубы дыму, што вылецелі з трубы паравоза, апусціліся ў зацішнае месцейка ды так і асталіся там.

Шулікаў ішоў і ішоў, не прыпыняючыся, адно мерна ступаючы са шпалы на шпалу; ён і не заўважыў, як збочыў з міжпуцця і зноў узышоў на рэйкавую каляю. Рабілася ўсё больш халаднавата, але Шулікаў не зважаў на гэта.

І раптам ён спыніўся. Цяпер ён цвёрда ведаў, што прайшоў роўна паўтара кіламетра і што якраз тут знаходзіцца нябачная мяжа двух абходаў. Іменна тут, на гэтым месцы канчаўся абход яго бацькі і пачынаўся другі — Нэліпага бацькі... Дакладней кажучы, цяпер ужо яе, Нэліп абход.

Абапал чыгункі ўзвышаліся адхоны. На правым адхоне Канстанцін Сцяпанавіч узлез наверх, сеў проста на тра-

ву і закурыў. Прагна зацягнуўся дымам адзін раз, другі і трэці запар.

...Вось тут недзе, на супрацьлеглым баку, зрабіў ён тады запаветны вензель — сплеценыя між сабою літары «К» і «Н», а вакол іх круг і васьміканцовую зорку. Багата, ой як багата часу мінула з тае пары! Праносіліся над гэтай незразумелай эмблемай гады, шумелі вятры, лілі дажджы, падаў і зноў раставаў снег,— і нічога, вядома, не засталося ад яе, аніякага следу. Сцерлася з памяці і тое, у імя чаго было зроблена ўсё гэта...

Ды от у тым і ўся рэч, што не сцерлася... Хоць і праз столькі гадоў, а вось напомніла аб сабе, дало знак.

Ён паглядзеў направа, туды, куды беглі гладкія, адпаліраваныя многімі тысячамі вагонных колаў рэйкі, і дзе цяпер нават і Венеры не было ўжо відаць. І тады ён убачыў на пуцях адзінокую постаць. Было яшчэ не надта відно, і Шулікаў не мог вызначыць пэўна, хто ідзе — мужчына ці жанчына. Але ён неяк падсвядома адчуваў, што гэта ідзе яна, Нэля.

Потым да слыху Шулікава праз роўныя прамежкі часу пачало далятаць ціхае пастукванне жалеза аб жалеза. Было яно кароткае, адрывістае, такое знаёмае з маленства, і даўно ўжо, вельмі даўно нячутае. Так стукаў па рэйках сваім лёгкім малатком з даўжэзным дзяржальнам бацька Канстанціна Сцяпанавіча ў час абходу ўчастка, так рабіла цяпер і Нэля, несучы сваю службу.

То была яна, цяпер Шулікаў ведаў гэта пэўна.

Удалечыні блiснуў пражэктар паравоза. Нэля сышла з каляі, стала на абочыне. Поезд хутка наблізіўся, і Шулікаў бачыў, як Нэля падняла ўгору сцяжок, даючы знаць машыністу, што пуць спраўны, што ехаць можна на поўнай скорасці.

Поезд праляцеў міма і знік. Нэля зрабіла яшчэ некалькі крокаў у кірунку да Шулікава. Хутка яна павінна была падысці зусім блізка да яго. І тады яна абавязкова яго ўбачыць. Шулікаў сядзеў, не варушачыся, і чакаў.

Нэля ступіла яшчэ два ці тры крокі. І раптам зусім нечакана для Шулікава перайшла на другую каляю, павярнулася і рушыла назад. Стук яе малатка паступова стаў далятаць цішэй і цішэй.

Шулікаў кінуў на зямлю папяросу, якая даўно пагасла ўжо, і падняўся. Выходзіла, што ён усё ж памыліўся. Мяжа ўчасткаў была не тут, а трошкі далей. Да яе было ад-

сюль метраў семдзесят, а мо нават і сто. Шулікаў пільна паглядзеў у той бок, шукаючы яе вачыма.

І тады на левым адхоне ён убачыў белы круг, а вакол яго васьміканцовую зорку. Здаецца, і ў сярэдзіне круга таксама нешта было...

Ён збег з адхону і хутка пакрочыў наперад. Нэля была ўжо далёка, яе постаць ледзь угадвалася ўдалечыні. А потым і зусім знікла.

Наперадзе запалаў заранак. Ён быў спачатку чырвоны, потым стаў залацісты, пасля пачаў набываць нейкія новыя адценні, якія і назваць было ўжо цяжка. Недзе далёка крычалі жоравы, а над галавой гарэзліва папісквалі дзве ластаўкі,— яны то апускаліся ледзь не да самай зямлі, а то ўзвіваліся ў неба і знікалі там.

Канстанцін Сцяпанавіч прыпыніўся і ўзяўся рукою за лоб. Лоб быў гарачы, а з левага боку, бліжэй да скроні, выразна дрыжала нейкая жылка...

Гэта быў, безумоўна, той самы вензель. І ўсё тут было такое ж, як і зрабіў ён некалі,— і круг той самы, і васьміканцовая зорка вакол яго, і сплеценыя між сабою дзве літары ў сярэдзіне.

І не аставалася ніякага сумнення ў тым, што за вензелем добра глядзяць, што ён знаходзіцца пад пастаяннай увагай. Відаць, мо толькі ўчора ці пазаўчора падфарбоўвалі тут каменьчыкі,— фарба была свежая, белая-белая.

Вензель увесь быў у нейкім незвычайным ззянні. Яно ўтваралася безліччу расінак на траве, у якіх вясёлкавымі іскрынкамі адбіваліся першыя промні сонца.

Нейкае невядомае дагэтуль хваляванне сціснула Шулікаву грудзі, і ён адчуў, што на сэрца яму раптам лёг якісьці страшэнны цяжар. Ён пачаў ціснуць усё мацней, і Канстанцін Сцяпанавіч зразумеў, што гэтага цяжару яму ніколі ўжо не пазбавіцца.

А сонца ўзнімалася ўсё вышэй і вышэй, і было так светла і зырка вакол, як бывае толькі ў самым канцы лета, перад пачаткам восені.

*1957*

# КАНЕЦ БЕЛАЙ МАГІЛЫ

Вы чулі пра Джабаева? Ага, пра Джамбула Джабаева. Ну дык вось, калі хочаце ведаць, колькі шкандыбае па гэтым свеце стары Ісмамбек, зазірніце ў каляндар і адшукайце там лісток, дзе гаворыцца пра нашага славутага акына. Мы аднагодкі з ім, а як жа. Якраз тады, калі з'явіўся на свет Джабаеў, пачаў адмерваць свой жыццёвы шлях і я. Уся розніца ў тым, што Джабаеў нарадзіўся ля падножжа гары Джамбул, на поўдні, а маёй радзімай была поўнач нашага краю, а дакладней кажучы — Белая магіла.

Але, але, першую сотню гадоў я ўжо адмераў, пачаў мераць другую. Разлічваю і яе прашкандыбаць гэтак жа спраўна. Мы, казахі, сябруем з беркутамі, а беркуты жывуць па трыста год.

Але ж я збіраўся расказваць вам не пра сябе, а пра свайго праўнука. Вы прабачце ўжо маю старэчую балбатлівасць. Не, цяпер я не сыду з тропу і раскажу вам пра Мухтара ўсё па парадку. Хто-хто, а Ісмамбек ведае, як яно здарылася, што Мухтар уліп у гэтую неверагодную гісторыю.

Ды толькі каб вам усё было зразумела, трэба сказаць яшчэ сёе-тое пра нашых продкаў. Два словы, не больш.

Майго прадзеда разарваў тыгр. Прадзед быў смелы паляўнічы і хадзіў на звяроў амаль што з голымі рукамі. Мой дзед ездзіў на ловы ўжо з беркутам, а бацька, удасканаліўшы промысел продкаў, акрамя беркута меў ганчака. Таму не дзіўна, што яшчэ з дзяцінства я марыў толькі аб тым, каб памножыць славу свайго роду.

У спадчыну ад бацькі я атрымаў старога беркута з адным вокам, другое вока беркут страціў у паядынку з ваў-

ком. Але ў мяне не было аргамака. А хіба можна лічыць чалавека паляўнічым, калі ў яго няма каня? Каб зарабіць на аргамака, я пайшоў да бая Даўлетгірэя і стаў у яго за чабана.

Многа разоў выпадаў пасля таго снег, многа разоў цвіў стэпавы кавыль, а Даўлетгірэй усё казаў, што я яшчэ не зарабіў на каня. А тады аднаго разу здарылася так, што, ратуючы статак гаспадара, я даволі блізка пазнаёміўся з ваўком. Той воўк, відаць, быў дужа галодны, бо іначай з якой бы рады ён замест тлустага і смачнага барановага курдзюка ўчапіўся ў маю худую жылістую лытку?

Так нечакана прыйшоў канец маёй мары памножыць славу свайго роду новымі паляўнічымі подзвігамі.

Цяпер мне заставалася спадзявацца толькі на сына. Але, як на тое ліха, у мяне нараджаліся чамусьці адны дочкі. Чатыры з іх, старэйшыя, памерлі, нават не дасягнуўшы таго ўзросту, калі дзецям прыходзіць пара мець сваіх дзяцей. Вы павінны зразумець мяне, у якім быў я адчаі. Бо нават і на ўнука я не мог спадзявацца...

Нарэшце Аміна, малодшая мая дачка, вырасла здаровай і, як гэта і павінна быць, у прызначаны час выйшла замуж... Ды бяда не прыходзіць адна. І ў Аміны немаведама чаму нараджаліся дзеці, якім можна было даць толькі жаночае імя...

Абмінала наш род удача на джыгітаў, ды і годзе. А мне на той час было ўжо за семдзесят...

І вось неўзаметку неяк здарылася так, што выгадавалася ўнучка, Зульфія. Чую — а яна ўжо і замужам. І што б вы думалі? Першынцам у яе быў хлопчык, во як!

Цяпер, калі я вам расказаў у двух словах радаслоўную Мухтара аж да шостага калена, вы мусіце зразумець, кім ён павінен быў стаць. Паляўнічым, во кім павінен быў стаць Мухтар! Іменна яму выпадаў лёс памножыць славу старога казахскага роду.

У той дзень, калі ён нарадзіўся, я сказаў сабе: трэба здабыць Мухтару беркута. І я здабыў яго, хоць мне прыйшлося спусціцца ў цясніну, дзе было гняздо, на вяроўцы, і я рызыкаваў стаць кульгавым і на другую нагу. Я назваў беркута Кара-Гык, што азначае Чорнае плячо. Ён быў зусім малады, нават лятаць не ўмеў. Праз тры гады, калі беркуцянё прывыкла да мяне і пачало лятаць, я стаў прывучаць яго браць здабычу. Робіцца гэта так. Бярэцца кавалак мяса і закідваецца куды-небудзь, з кожным разам

усё далей і далей. Беркут павінен злятаць па мяса і вярнуцца да гаспадара. Тады яму дазваляецца з'есці мяса. Праз год я навучыў Кара-Гыка нападаць на лісіцу. Лавіць жа ваўка павінен быў навучыць беркута сам Мухтар.

Ведаеце, колькі цяпер год Кара-Гыку? Дваццаць, во колькі! А лавіць ваўка ён усё яшчэ не ўмее...

Не, я не кажу, што партыя і наш урад зрабілі няправільна, калі пастанавілі ўзараць Белую магілу, каб вырошчваць тут хлеб. Яшчэ нашы продкі казалі: багаты народ, калі ў яго багатая зямля. Але свайго багацця мы не ведалі і не ўмелі карыстацца ім. Мы, стэпавікі, заўсёды былі бедныя. Па хлеб мы ездзілі за край свету, у благаславёны Ала-Тау. Таму я наконт таго і не кажу нічога. Але я кажу, што правільную пастанову няправільна зразумеў Мухтар.

Вось як яно ўсё было.

Пра тое, што ў стэп прыехалі новыя людзі, у нашым ауле стала вядома адразу. Народны погалас, або, як кажуць казахі, узун кулак, што азначае «доўгае вуха», хутчэй за вецер даносіць навіны ў самыя далёкія аулы і паселішчы. Пра тое, што гэтыя людзі стварылі саўгас з прыгожай назвай «Гвардзейскі», мы таксама даведаліся ў адзін момант. Я не буду расказваць, як сустрэлі гэтыя чуткі ў ауле, бо зноў адхілюся ўбок. Скажу, як паставіўся да гэтага Мухтар.

Прыходзіць да мяне ў юрту Зульфія. Сядае на кашму, маўчыць спачатку, а потым гаворыць:

— Мухтар перадае вам паклон, ата.

— Джаксы, кажу. Добра, кажу. Але чаму ён прыслаў з паклонам цябе, а не прыйшоў сам?

— Яму дужа некалі! Ён шые новы бурдзюк.

— Навошта,— пытаюся,— спатрэбіўся яму той бурдзюк і што ён збіраецца туды класці?

Тут Зульфія не стрымалася і пачала галасіць. Ну, думаю, справа дрэнь, трэба ісці на выручку.

Сапраўды, гляджу — Мухтар ладзіць бурдзюк.

— Да тых людзей,— пытаюся,— надумаўся бегчы?

— Не,— адказвае Мухтар,— не бегчы, а скакаць на аргамаку, бо бегчы туды ног не хопіць.

Ён у мяне такі,— за словам у кішэню не лезе.

І хоць не да твару чалавеку ў маім узросце хваляваццца перад маладзёнам, але я не стрымаўся і ўскіпеў.

— Ты,— крычу,— скарпіёпава сваё джала схавай, а то вырву яго ў цябе і шакалам выкіну! Дай сюды бурдзюк, ён мне ў юрце спатрэбіцца. А сам ідзі да Кара-Гыка, ён сёння яшчэ галодны. Не шкодзіла б даць яму пакаштаваць воўчую лытку, я купіў тушу ў Аскара, ён учора дзвюх ваўчыц прывалок са стэпу.

— З Кара-Гыкам я ўжо развітаўся, ата,— спакойна гаворыць да мяне Мухтар.— І ведаеце, ата, нешта не заўважыў я, каб ён быў вельмі засмучоны з повада таго, што я пакідаю яго.

Сказаў так, а сам зноў за бурдзюк узяўся. І бачу я — ну ўвесь чыста ён выліты я, такі ж самы ўпарты і незалежны. Што наважыўся, тое і зробіць.

— Не сярдуйце, ата,— гаворыць далей Мухтар.— Паляўнічае шчасце — не для мяне. Я пайду руйнаваць Белую магілу.

Відаць, тут трэба расказаць вам, чаму наш край завецца Белай магілай. Я кораценька, у двух словах.

Адкуль, вы думаеце, паходзіць назва горада Акмолінска? А Акмолінскага стэпу? Ад казахскага слова Акмола, што якраз і азначае — Белая магіла.

Існуе ў нас такое паданне.

Даўно-даўно, калі яшчэ не было ў казахскіх стэпах гарадоў і наш народ быў качэўны, у тутэйшых месцах праходзіў вярблюджы гасцінец. Па ім якраз і ішлі караваны ў той благаславёны Ала-Тау. Цяжка было прабівацца караванам праз пустыню. Улетку гасцінец заносіла пяском, узімку — снегам. І вось адзін такі караван заспеў у дарозе буран. Караван збіўся з гасцінцу і вымушан быў прыпыніцца. А снегу ўсё большала, і вецер усё мацнеў. Некалькі дзён змагаліся людзі з непагаддзю, але яна так расхадзілася, што ўсё было дарэмна.

Доўга чакалі казахі таго каравана, а ён усё не вяртаўся. Тады пайшлі шукаць яго. І праз некаторы час натрапілі на вялікі снежны пагорак. З яго там і сям тарчалі галовы вярблюдаў, рукі людзей...

Акмола!..— шапталі ў жаху казахі.— Белая магіла...

Шмат часу прайшло з тае пары, шмат вятроў пранеслася над казахскай зямлёй, а страшнае слова «Акмола», «Белая магіла», не выветрывалася з памяці людзей. Стэп, дзе разыгралася жудасная трагедыя, стаў называцца Акмолінскім. І, нібы апраўдваючы сваю назву, вякамі ляжаў ён змярцвелы, пазбаўлены жыцця.

Не, я не кажу, што партыя і наш урад зрабілі няправільна, калі пастанавілі ўсё ў нашым краі перайначыць, каб не кавыль і палын, а жыта і пшаніца красавалі ў ім. І зусім правільна прыслалі яны ў стэп людзей. Тыя людзі,— сцвярджаў узун кулак,— усё ўмеюць, у іх многа розных машын, і самі яны проста батыры, проста асілкі. І зусім не патрэбен ім мой Мухтар, гэта ж кожнаму падшывальцу зразумела.

— Не,— упіраецца Мухтар,— яны без мяне ніяк не могуць абысціся. Многа яны ведаюць, але не ўсё. Яны прышлыя, а я тутэйшы. Напрыклад, калі разліваецца Ішым — хіба вядома ім? Наўрад. Зноў жа, што рабіць, калі табе ноччу забярэцца пад кашулю скарпіён,— ведаюць яны? Эге, без Мухтара ім ніяк не абысціся.

І паехаў, і не ўтрымаў я яго, чарцяку, хоць напаследак паабяцаў нават, што калі яму і сапраўды забярэцца ноччу пад кашулю скарпіён, а ён спрасонку забудзецца, што трэба рабіць у такім выпадку,— я не прыеду ратаваць яго ад укусу.

Гэта было летась, напрадвесні. Мінуў тыдзень, другі, і я ўсё цешыў сябе надзеяй, што Мухтару не спадабаецца там, сярод тых прышлых людзей, або што ён прыйдзецца ім не да спадобы.

Але калі да мяне аднойчы завітала Зульфія і па яе вачах я беспамылкова ўведаў, што яна атрымала пісьмо ад сына, я зразумеў, што Кара-Гык ніколі ўжо не навучыцца лавіць ваўкоў.

Далікатнасць — найпершы закон стэпу, і я спытаў у Зульфіі, ці праўда, што Мухтар зрабіўся дужа вялікім начальнікам.

— О, чыстая праўда! — і вокам не маргнуўшы, сказала Зульфія.— Ён там самы вялікі начальнік. Пад яго ўладаю ходзіць столькі джыгітаў, столькі... о, дужа многа джыгітаў, я нават не магу перадаць вам, колькі іх многа. Можа, нават сорак ці нават пяцьдзесят. Сам таварыш Верашчака і яшчэ таварыш Маладзічын падначальваюцца Мухтару.

— Ну, калі ўжо сам таварыш Верашчака...— прамовіў я такім тонам, быццам мне вельмі добра было вядома, якая гэта значная птушка — Верашчака.

Зульфія пайшла да суседак расказаць пра Мухтара, а я накіраваўся да настаўніка. Ён у нас вельмі разумны чалавек, ён усё чыста ведае, і нават тое, ці быў пачатак свету і ці будзе канец. Пра гэта ён нам аднойчы тры гадзіны

распінаўся, і мы цяпер таксама ведаем, што дзякуючы алаху нічога не было і нічога не будзе.

— Верашчака? Маладзічын?— перапытаў настаўнік.— Гэта мы ў адзін момант высветлім.— І ён пачаў корпацца ў кнігах. Іх у яго мо цэлы пуд, а мо і ўсіх два пуды. Корпаўся ён нешта доўга, а тады кажа: — Ёсць! Верашчака — гэта страва такая, нацыянальная беларуская страва. Ну, напрыклад, як у казахаў — бешбармак, а ва ўзбекаў — плоў. Можа, толькі не такая тлустая. Зразумела? А наконт Маладзічына... тут справа больш складаная. Паняцце гэта вельмі неакрэсленае, я нават сказаў бы — туманнае. Ні тлумачальны слоўнік, ні слоўнік замежных і нават лацінскіх выразаў нічога пэўнага нам не дае. Але я здагадваюся, што гэта слова не простае, а складанае, яно складаецца з двух слоў. Першае слова — мала. Што яно азначае, зразумела і без слоўніка замежных выразаў. Мала! А другое слова — дзічына. Яго таксама можна тлумачыць толькі ў адным напрамку. Падышоўшы да вырашэння справы з гэтага боку, мы можам вельмі проста расшыфраваць гэтае туманнае на першы погляд пытанне. Яно азначае: мала дзічыны! Вы зразумелі, ата? Вы задаволены?

Я сказаў, што ўсё зразумеў і вельмі задаволены, бо далікатнасць — найпершы закон стэпу. А сам сабе падумаў: «Дрэнныя справы, Мухтар. Дзічыны табе там зусім не даюць, а прымушаюць каўтаць нейкую посную верашчаку».

І яшчэ я падумаў: «Мусіць, Кара-Гыка выпускаць на волю не варта. Ён яшчэ павучыцца лавіць ваўкоў».

Месяцы праз два зноў завітала да мяне Зульфія. Вочы ў яе, бачу, сумныя, але словы яна гаворыць вясёлыя:

— Мухтар? О, джаксы! Добра! Усе сто джыгітаў, якія ходзяць пад яго ўладаю...

Я не стаў слухаць, што робяць сто джыгітаў, якія ходзяць пад уладаю Мухтара, і ў двух словах расказаў Зульфіі пра поспехі Кара-Гыка, які беспамылкова пачаў ужо адрозніваць ваўчынае мяса ад лісінага, аддаючы перавагу іменна ваўчынаму.

Мінула вясна, прайшло і лета. Зульфія да мяне больш не прыходзіла, і я сам падаўся да яе.

— Якія навіны, Зульфія? — пытаюся.

— О, джаксы, бік джаксы! Вельмі добра! Усе дзвесце джыгітаў Мухтара шлюць вам прывітанне.

«Усё зразумела,— сказаў я тады сабе.— Наш магутны род даў слабасільных патомкаў. Але хіба самі патомкі ві-

наватыя ў гэтым? Не прападаць жа Мухтару ні за нюх табакі...»

Дзён якіх праз тры я быў ужо ў дарозе. Мой ішак панура плёўся па стэпу, час ад часу агалошваючы наваколле немым іржаннем, на плячы ў мяне сядзеў Кара-Гык, сумнымі вачыма пазіраючы наўкола, а я спяваў. Мы, казахі, любім спяваць у дарозе. Мы спяваем пра ўсё, што трапляе нам на вока. Так хутчэй бяжыць час. Чатыры разы ўзыходзіла сонца, пакуль я не ўбачыў возера Інды-Куль. Недзе тут, паводле узун кулака, павінен быў быць Мухтар.

Знайшоў я яго позна ўвечары ў невялікім доміку на самым беразе возера. Там з ім было яшчэ некалькі джыгітаў, я не ведаю дакладна колькі, але дзвесце іх не было, не было і пяцьдзесят, гэта я магу сказаць пэўна. Свой домік яны называлі вагончыкам. Раніцой я разгледзеў, што ён і сапраўды быў на калёсах. Тут у іх быў палявы стан, як яны растлумачылі мне.

Я не скажу, што Мухтар не ўзрадаваўся майму прыезду. Сказаць так было б несправядліва. Але я заўважыў, што радасць сустрэчы праўнука з прадзедам была чымсьці нібы азмрочана.

Яны клаліся спаць ужо. Відаць, павячэралі перад маім прыходам, таму я не бачыў той дзіўнай стравы, якой марылі тут Мухтара.

— Ну як, паддаецца Акмола? — з намёкам спытаў я ў Мухтара, помсцячы яму за яго напышлівасць перад ад'ездам з аула.— Мабыць, ад яе нічога ўжо і не засталося, усю зруйнавалі.

— Не, засталося яшчэ многа,— адказаў Мухтар.— Але мы яе ўсё ж дакончым.

Тады я сказаў:

— Я ўсё разумею, Мухтар. Ты ўпарты, як і ўсе ў нашым родзе. Тваіх пісем я не бачыў, але Зульфія мне сёетое гаварыла, і я ўсё разумею. Я абяцаў, што не прыеду ратаваць цябе, але гэта датычылася толькі скарпіёнаў. Мы можам паехаць заўтра на досвітку, я ані не стаміўся, хоць дарога была нялёгкая. Кара-Гык ведае ўжо, што такое ваўчынае мяса.

— Заўтра я хачу паспрабаваць апярэдзіць Сямёна Бандарэнку,— адказаў задуменна Мухтар.

— На чым? — не зразумеў я.

— На трактары. Мы заключылі з ім умову на спаборніцтва.

З ахвотаю папіваючы халодны кумыс, які я прывёз з сабою, Мухтар паведаміў мне, што гэтыя паўгода ён тут не сядзеў, склаўшы рукі, а ліквідаваў сваю, як ён сказаў, тэхнічную адсталасць. Аказалася, што ён цяпер не чабан, а трактарыст, і што яго мэта — даць сто пяцьдзесят працэнтаў.

Прызнацца сабе ў тым, што я не разумею Мухтара, было тое самае, што адрачыся ад самога сябе, таму я сказаў:

— Добра, мы заўтра не паедзем. Я пагляджу, як джыгітуюць трактарысты.

Ну, не буду вам расказваць пра тыя дзівы, якія я ўбачыў назаўтра, бо тады я адхілюся ўбок ад галоўнага. Заўважу толькі, што, назіраючы за Мухтарам і яго сталёвым аргамакам, я сказаў сабе: калі Мухтар тут і не вельмі вялікі начальнік, ён усё роўна вельмі вялікі ўмека. За якіх дзве гадзіны ён узараў столькі, што майму ішаку трэба было б цэлы дзень трушком бегчы, каб усё аб'ехаць. Я не маню, далібог!

Пад поўдзень я так стаміўся, ходзячы па раллі, што і ног не чуў. Прысеў сабе проста на зямлю, а тады раптам бачу, што да Мухтаравага трактара падыходзіць нейкая жанчына. Вочы ў мяне яшчэ добра відучыя, і я адразу ўгледзеў, што яна зусім яшчэ маладзенькая, проста дзяўчо. Я нават усміхнуўся сабе, бо надта ўжо незвычайнай для нашага суровага стэпу выглядала яе танюсенькая постаць і гэтыя яе гарадскія чаравікі, даволі ўжо стаптаныя. Валасы ў дзяўчыны выцвілі, твар загарэў, аж чорны стаў, а нос аблупіўся. Проста смешна было глядзець на яе.

Дзяўчына падышла да Мухтара. І раптам яна пачала крычаць на яго. Відаць, яна была дужа злосная, бо нават рукамі махала... Я аж дыхаць перастаў. Дзе гэта бачана, каб дзяўчо на джыгіта крычала? Няма такога закону ў казахскіх стэпах!

Мне не было чуваць, што яна там крычала, але калі я ўсхапіўся і наклыпаў да Мухтара, яна перастала ўжо сварыцца і, акінуўшы мяне цікаўным позіркам, хутка пайшла прэч.

— Хто гэта? — з абурэннем пытаюся я ў Мухтара.

— Таварыш Верашчака,— адказвае Мухтар, а сам — гляджу,— робіцца чырвоны-чырвоны, як самы спелы алма-ацінскі апорт.

«Вось табе і страва...» — сказаў я сабе, і дадаў у адрас

настаўніка нешта такое, ад чаго яму абавязкова павінна было ікнуцца.

— Адкуль яна такая ўзялася?

— З Маладзечна,— гаворыць Мухтар.— Гэта горад такі, у Беларусі.

Тут, відаць, нашаму настаўніку зноў ікнулася, не іначай. І дзе толькі ён набраў тых недарэчных кніг?..

— То чаго ёй ад цябе трэба?

— Сто шэсцьдзесят працэнтаў. Яна працуе ўчотчыкам. Учора я даў сто сорак.

— Народная прыказка,— заўважыў я Мухтару,— гаворыць: «Аб'язджай балота як найдалей, хавайся ад благога чалавека як найглыбей». Табе трэба было мець гэта на ўвазе. Але калі ўжо ты ўліп у гэтую гісторыю, дык чаму б табе не даць ёй тых сто шэсцьдзесят працэнтаў?

Мухтар рушыў на сваім аргамаку хутчэй за мяне, і я пачаў адставаць. Я толькі пачуў, як ён з сумам сказаў:

— Трактар — гэта ёсць машына. Жаданні чалавека і магчымасці машыны не супадаюць.

Цяпер я ведаў, што мне трэба было рабіць. Я абавязкова павінен быў знайсці таварыш Верашчаку.

Удалечыні быў відзён яшчэ адзін трактар, і я пайшоў напярэймы яму. На ім араў высокі чарнабровы юнак.

— Яна толькі што была тут,— сказаў юнак.— Зараз яна пайшла да Івана Сініцына.

— На цябе яна таксама крычала? — пацікавіўся я.

— Не, мы пагутарылі з ёю вельмі хораша. Мы ж землякі. Мяне завуць Сямён Бандарэнка.

Я знайшоў яе толькі каля трэцяга трактара. Трактар стаяў, а яна сядзела ў яго цяньку з нейкім рыжым чалавекам і апетытна распраўлялася з гусінаю ножкаю.

Далікатнасць — перш за ўсё, і я сказаў:

— Добры дзень, о найпрыгажэйшая з кабецін у гэтым стэпе! Я прыйшоў да цябе наконт трактара.

— Вельмі добра, ата,— адказала таварыш Верашчака.— Калі хочаце пазнаёміцца з трактарам — вось ён, калі са мною — вось я.

І яна засмяялася, і ў яе смеху чамусьці зусім не было злосці. Але я гавару сваё.

— Трактар,— сказаў я,— гэта ёсць машына. Жаданні чалавека і магчымасці машыны не супадаюць. Навошта ты лаеш Мухтара, о найцудоўнейшая з ружаў, якія цвілі калі-небудзь на свеце?

— Ружы заўсёды бываюць з калючкамі, ата,— зноў засмяялася таварыш Верашчака.— Вы не хочаце паабедаць з намі? Гусяціна яшчэ не астыла, яе толькі што прывезлі са сталовай. І, акрамя таго, у маім тэрмасе засталася яшчэ шклянка кампоту, ён усю ноч стаяў у крынічнай вадзе.

«Цікава,— гледзячы на яе, думаў я,— колькі працэнтаў яна патрабуе ад гэтага маўклівага джыгіта, які за час нашай далікатнай гутаркі не прамовіў ні аднаго слова?»

Вечарам, калі мы з Мухтарам дапівалі мой кумыс, ён задуменна сказаў:

— Ведаеш, дарагі ата, трактар — надзвычай разумная штука.

— Ты даў сто шэсцьдзесят працэнтаў? — здагадаўся я.

— Сто шэсцьдзесят пяць.

— Цяпер таварыш Верашчака пакіне цябе,— заявіў я.— Яна больш не будзе крычаць!

— Будзе,— уздыхнуў Мухтар.— Сямён Бандарэнка даў сто семдзесят. А Іван Сініцын... ведаеш, рыжы такі? — ажно сто восемдзесят.

— То ты павінен даць заўтра дзвесце! — узлаваўся я на Мухтара.— І няхай таварыш Верашчака сасніць сёння дзвесце самых рыжых гусакоў, і два разы па дзвесце паламаных трактараў, і яшчэ вавілонскае стоўпатварэнне. А я пакуль што пайду ў суседні вагончык, я там бачыў аднаго слаўнага хлапчука. Ці не падараваць яму Кара-Гыка?

Было, відаць, дужа позна ўжо, калі мне захацелася прайсціся па стэпе. Сцежка, што цягнулася ад возера проста на ўсход, вяла мяне ўсё далей і далей. Наабапал сцежкі чорнымі пластамі ляжалі скібы тлустай зямлі. Я ішоў і ішоў, а гэтым скібам усё не было канца і краю... А заўтра іх будзе яшчэ болей, а паслязаўтра яшчэ. А потым закрасуе тут збажына — рослая, дужая, самім золатам налітая...

Край неба на ўсходзе пачаў ружавець. Я прысеў адпачыць. Стэп быў маўклівы і задуменны. Толькі чуліся зрэдку сумныя крыкі птушак, што адляталі на поўдзень...

І раптам я ўбачыў, што па сцежцы нехта ідзе. Іх было двое. Я іх бачыў, а яны мяне не. Я мог бы хоць на што закласціся, што адзін з гэтых начных бадзяг — таварыш Верашчака. Другога я не пазнаваў, але здагадаўся, хто ён. «Сто восемдзесят працэнтаў ёй, бясспрэчна, мала»,— ска-

заў я сабе, і надпяўся, каб пайсці назад. І тады нечакана я пачуў:

— Вы любіце начныя нагулянкі, мой шаноўны прадзед? А ці не шкодны яны вам пры вашым узросце?

— Нораў майго каня ведаю я сам! — адказаў я Мухтару. І дадаў, звяртаючыся да таварыш Верашчакі: — А ведаеце што? Я заўсёды быў той думкі, што колькі б ні было ў ружы калючак, яна вельмі цудоўная і пяшчотная.

*1955*

# ПРЫЗВАННЕ

І вось, нарэшце, гэта здзейснілася. Яшчэ ўчора Антон Стрыжак быў памочнікам машыніста, гэта значыць, асобай хоць і важнай на паравозе, але ўсё ж не самай галоўнай, а сёння ён ужо сам — фігура першай велічыні. Цяпер Антон будзе стаяць не за левым крылом, як раней, а за правым, і менавіта яму паслухмяна будзе падпачальвацца вось гэтая складаная і на дзіва разумная істота, што ў побыту завецца таварным паравозам.

Машына стаяла ля кантрольнага слупіка, чакаючы загаду пайсці на станцыю, пад поезд. Стрыжак саскочыў на зямлю, адышоў крыху ўбок і залюбаваўся сваёй «трыццаць дзевяткай», як звычайна называлі яго лакаматыў, маючы на ўвазе дзве апошнія лічбы нумара. Машына проста зіхацела. Старанна дагледжаная, начышчаная, змазаная, яна, на думку Антона, усім сваім выглядам павінна была сведчыць, што новы гаспадар яе — чалавек дбайны і руплівы.

У хуткім часе прыйдзе загад, і тады Антон нетаропка падыдзе да свайго прыгажуна, паважна возьмецца за поручні, павольна паставіць нагу на ніжнюю папярочку лесвіцы, зірне налева, потым направа, а пасля падхопіцца і ў адзін момант апынецца ў будцы. Тут усё ўжо напагатове, тут ужо зачакаліся дотыку ягоных рук рэверс ходу, рэгулятар хуткасці, кран машыніста. І ён, Антон, зробіць дзіва: удыхне жыццё ў гэтую харэміну з жалеза і сталі, і тая рушыць з месца. Рушыць і паляціць. Уперад і ўперад! Насустрач самому шчасцю!

Трэба быць, напэўна, сапраўды паравознікам, каб ведаць, што адчувае машыніст перад адпраўкай лакаматыва ў рэйс!..

— Са скразным паедзеце? Ці са зборным?

Антон уздрыгнуў ад нечаканасці. Побач стаяў невысокі хлопец у форме навучэнца чыгуначнага вучылішча. Форма была старанна адпрасавана, аднак нельга было не заўважыць, што хлопец ужо вырас з яе.

— Напэўна, са скразным? — гаварыў далей хлопец, адкрыта любуючыся Стрыжаковай машынай.— Там на станцыі якраз рыхтуецца маршрут на захад. Топ, відаць, тысячы на дзве будзе!

— Са скразным, а як жа! — не стрымаўся, каб не пахваліцца, Стрыжак і ў сваю чаргу спытаў: — На ўсякі выпадак, ты на каго, хлопча, рыхтуешся — на рамонтніка ці на эксплуатацыйніка? Калі не сакрэт, вядома.

— На эксплуатацыйніка, які ж тут сакрэт,— з пачуццём уласнай годнасці ў голасе адказаў хлопец. Увесь выгляд яго быццам гаварыў: хіба гэта і без таго не зразумела?..

— Правільна,— ухваліў Антон і ўсміхнуўся.

Не ўсміхнуцца ў гэтую хвіліну ён проста такі не мог. Бо дагодлівая памяць ахвотна паказала Антону яго самога ў стане вось такога ж хлапчыны. Ды толькі Антон быў тады ніякі не рамеснік, ён быў просты вясковец, і маючы столькі ж прыкладна гадоў, колькі і гэты вось зялёны юнак, не толькі не ведаў, што самая значная на свеце прафесія — паравознік-эксплуатацыйнік, як гэта зусім пэўна ведае рамеснік, а нават і не падазраваў, што такая прафесія існуе ў прыродзе.

Так, ён быў тады звычайны вясковец, бо хоць іхняя Вядомля і лічылася гарадскім пасёлкам, але пра горад тут нішто, бадай, не гаварыла. Тут не было нават чыгункі,— яна праходзіла недзе міма, кіламетраў нешта за трыццаць ад пасёлка.

Аднойчы ўвосень Антонаваму бацьку спатрэбілася паехаць нечага на станцыю, і ён узяў з сабою сына. Хлопец ніколі раней не быў на станцыі, для яго свет абмяжоўваўся адной драўлянай Вядомляй, і таму паехаў ён з вялікай ахвотай. Дарога, па якой трухаў іх пядушлы Гнядок, ішла некаторы час уздоўж чыгункі. Як зачараваны, глядзеў Антон на дзве роўныя бліскучыя стужкі, што цягнуліся некуды далёка-далёка, аж да самага небасхілу. Вось наставіць бы на гэтыя стужкі іхнія калёсы — ох і хвацка можна было б праехацца!..

Раптам недзе ззаду пачуўся дзіўны, ніколі не чуты

Антонам гук. Было падобна на тое, што раве нейкі страшэнна вялікі звер, якога ламанулі даўбнёй. Антон пабляднеў і палахліва прыціснуўся да бацькі. А ззаду чуліся ўжо новыя гукі. Там нешта пыхкала, гуло, грукацела, ды ўсё мацней і мацней. Гнядок стрыгануў вушамі, збочыў з дарогі і панёсся проста па раллі. І дзе толькі тая сіла ўзялася! Калёсы падскаквалі, тарахцелі, і Антон, каб не зваліцца, абедзвюма рукамі схапіўся за бацьку. Бацька ледзь-ледзь управіўся з канём. Але канчаткова той супакоіўся толькі тады, калі ўсё сцішылася.

— Гэта і ёсць поезд, тата?— ашаломлены ўсім убачаным і пачутым, ціха спытаў Антон.

Тузаючы за лейцы, бацька накіраваў Гнядка на дарогу.

— Ага.

Бацька быў негаваркі чалавек і на запытанні Антона адказваў з неахвотай.

— А куды ён паехаў?

— Можа, у Мінск.

— Людзей павёз?

— Можа, людзей.

— А многа іх там? І ўсе ў Мінск едуць? А хто павёз поезд?

Адказаць на ўсе гэтыя пытанні было цяжка і не такому маўкліваму чалавеку, як Антонаў бацька. Антон жа, не дачакаўшыся, сыпануў новую жменю пытанняў...

Удалечыні паказаліся нейкія пабудовы. Але Антон глядзеў не на іх, яго затуманены позірк усё яшчэ бачыў поезд, адзін толькі поезд, а сэрца рвалася ўслед за ім...

Нечакана воз апынуўся каля невялічкай хаткі, што стаяла недалёка ад рэек. Хатка была такая маленькая, што Антон узяў пад сумненне, ці могуць тут наогул быць людзі. «Як у казцы!» — падумаў ён і вельмі здзівіўся, калі з хаткі выйшаў чалавек. На чалавеку быў сіні гарнітур, да самай шыі зашпілены на бліскучыя гузікі. На галаве неяк асабліва ёмка сядзела форменная шапка. У руцэ ён трымаў жоўты сцяжок, скручаны ў трубку. Выгляд у чалавека з казачнай хаткі быў такі важны, што Антон, гледзячы на яго, аж дыхаць перастаў. Незнаёмы ж, не звяртаючы ніякай увагі на Антона і яго бацьку, пагледзеў уздоўж чыгункі спачатку ў адзін бок, потым у другі, пасля падышоў да нейкай рагуліны і пачаў нешта корпацца там.

— Хто гэта, тата?..

Бацька паморшчыў лоб, задумаўся, праз хвіліну няўпэўнена адказаў:

— Стрэлачнік.

— А што ён робіць?

Відаць, на гэтае пытанне бацьку было адказаць цяжэй, і ён думаў даволі-такі доўга. Вымавіў з яшчэ меншай упэўненасцю:

— Дарогу дае паяздам... Н-но!

Гнядок трохі паскорыў хаду, і яны неўзабаве прыехалі на станцыю. Тут таксама было шмат чаго цікавага, аднак перад вачыма Антона чамусьці ўсё стаяў той незнаёмы і яго казачная хатка. Стрэлачнік!.. Напэўна, гэта вельмі важны на чыгунцы чалавек, мо нават самы найважны, калі ён дае дарогу паяздам. Захоча — дасць, а не захоча — і не дасць. Во ён які!

З гэтага часу вядомленскія хлапчукі ні ў што болей не гулялі, як толькі ў стрэлачнікаў...

Ішоў сваёй разважнай, нетаропкай хадою час, Антон падрос, скончыў дзесяцігодку. Ростам ён яшчэ ў дзевятым класе ледзь не па галаву абагнаў бацьку, а ведамі... у-га, ведамі ён ужо на сто галоў быў вышэй за бацьку! Таму з такой павагай узяў бацька ў рукі сынаў атэстат сталасці, таму такой вялікай надзеяй засвяціліся яго вочы.

— У каторы цяперака падасіся?— спытаў бацька, горды і шчаслівы.

— Што — у каторы?— не зразумеў сын.

— Ну, у інстытут. У каторы?

— Я, тата, на чыгунку пайду.

— Чаго?..— Цяпер ужо бацька не зразумеў сына.

— Працаваць.

Усю, мабыць, ноч уздыхаў цяжка бацька. Не менш цяжка, да рання, усхліпвала маці. А мара, што вяла юнака, у сваім імклівым руху наперад ні на што не зважала.

Дагодлівая памяць робіць сваю справу далей, паказваючы адзін кадр мінуўшчыны за другім.

...Стаіць спякотны ліпеньскі дзень. Асфальт перона нагрэўся так, што, напэўна, на ім смела можна смажыць яечню. Але Антон нічога не заўважае. Ён стаіць на пероне спіпаю да вакзала і глядзіць на поезд. Гэты поезд прывёз яго сюды, у вялікі і шумлівы Заранск, з мілай, цяпер ужо далёкай Вядомлі. Антон глядзіць на вагоны і чакае, пакуль яны крануцца з месца. Тады можна будзе

ўздыхнуць з палёгкай. Абарвецца тады апошняя нітка, якая яшчэ звязвае яго з былым. Поезд пойдзе, а ён застанецца.

І поезд, нарэшце, сапраўды пайшоў,— спачатку быццам з неахвотай, а потым нічога, паладзіўся. Праз якую хвіліну не толькі вагоны зніклі з вачэй, але і шуму нават ужо не было чуваць. Антон ускінуў на плечы чамаданчык з пяхітрымі сваімі манаткамі, азірнуўся наўкол і пайшоў проста па пуцях.

Пячэ сонца. Не прыносіць палёгкі ветрык, што час ад часу прылятае аднекуль з-за станцыі. Паветра насычана гарачым пылам: даўно не было дажджу... Антону ж хоць бы што! Высокая постаць яго шыбуе ды шыбуе сабе па шпалах, усё далей аддаляючыся ад вакзала.

Цікаўныя вочы хлопца дапытліва пазіраюць наўкола. Ён яшчэ не ведае, што вось гэты доўгі будынак з высокімі вокнамі, мноствам жалезных комінаў і шырока расчыненымі дзвярыма, падобнымі на вароты,— паравознае дэпо, а вось гэты, не менш доўгі,—вагонныя майстэрні, а тут знаходзіцца дыстанцыя пуці, а вунь там — дыстанцыя сувязі. Не ведае ён яшчэ гэтага. Значна пазней прыйдзецца даведацца яму і пра тое, што ўсе гэтыя прадпрыемствы і ўстановы прынята на мове чыгуначнікаў называць скарочана. Дэпо — гэта ТЧ. Вагонны ўчастак — ВЧ. Дыстанцыю пуці завуць ПЧ, а дыстанцыю сувязі — ШЧ. У вымаўленні гэта гучыць так: тэчэ, вэчэ, пэчэ, шачэ... Яшчэ пазней пачуе ён і прымаўку, якую склаў нейкі чыгуначнік-весялун:

— Усё ў нас ёсць: і шачэ, і пэчэ, і вэчэ, а дах на хаце ўсё роўна цячэ...

Не, не ведае ён пакуль што ўсяго гэтага. Таму такі дапытлівы яго позірк, таму такой цікаўнасцю гараць вочы.

Ён усё ідзе ды ідзе. Зніклі апошнія станцыйныя пабудовы. Абапал чыгункі цяпер цягнуліся стужкі вуліц. Дамы тут, у чыгуначным пасёлку, у большасці невялікія, з палісаднікамі пад вокнамі, толькі сям-там відаць шматпавярховыя гмахі; гэтыя нагадваюць Антону вартавых, якіх паставілі тут, каб яны пільнавалі спакой сваіх меншых братоў.

Рэйкі ўзвышаюцца над астатняй мясцовасцю — яны ляжаць на даволі высокім насыпе. А дзе ж казачная хатка, такая, як на іхняй станцыі?.. Антон ведае ўжо, што

стрэлачнікі ёсць на кожнай станцыі, ды ён і бачыў іх, пакуль ішоў па пуцях, але ж яму хочацца зірнуць на будку таго стрэлачніка, які першы дае дарогу паяздам. Ага, вунь яна!

Ён сышоў з насыпу і пакрочыў па сцежцы, што цягнулася побач з палатном чыгункі. Крокаў за дзесяць ад будкі спыніўся, пастаяў крыху. Нікога не было відаць. Ён сеў на траву і цярпліва пачаў чакаць. Уяўленне малявала чалавека, што выйшаў з хаткі ў той далёкі асенні дзень... Гарнітур на ім аж да самай шыі зашпілены на бліскучыя гузікі... На галаве ёмка сядзіць шапка... У руках — жоўты сцяжок, скручаны ў трубку...

Рыпнулі дзверы. Адчыніліся. На парозе — Антон вачам сваім не верыў — стаяла дзяўчына. Прыкрываючы рукой вочы ад сонца, яна пачала ўглядацца ўдалячынь. Пастаяўшы так, апусціла руку, павярнулася ў другі бок. Цяпер яе твар быў добра відзён Антону. «Якая маладзенькая!— падумаў ён.— Гэта ж яна маладзейшая мо нават за мяне».

Размова з ёю была кароткай і на дзіва несур'ёзнай.

— Ты што ж — хочаш быць самым вінаватым?— засмяялася яна, калі ён спытаў, дзе і якім чынам можна ўладзіцца на стрэлачніка.

— Як гэта?— здзівіўся Антон.

— Ды так. Ці ж ты не ведаеш, што калі дзе што здарыцца, а вінаватага знайсці не могуць, дык заўсёды кажуць: стрэлачнік вінаваты...

Адрас яна ўсё ж дала. Трэба было, аказваецца, ісці ў пэчэ.

Ён рашыў пайсці туды неадкладна. І пайшоў быў, але з паўдарогі вярнуўся.

— На ўсякі выпадак...— сказаў ён і пачырванеў.— Я... ведаеш хто? Я — Антон. Антон Стрыжак. А ты? На ўсякі выпадак.

— А я — Зіна...— адказала яна і таксама пачырванела.

...Хлопец у старанна адпрасаванай форме навучэнца чыгуначнага вучылішча ўсё яшчэ стаіць побач.

— Калі не сакрэт — як цябе завуць, таварыш паравознік-эксплуатацыйнік?

— Які ж тут сакрэт. Васіль Немахай, во як завуць. Можа, яшчэ і працаваць разам прыйдзецца, чым чорт не жартуе. Я якраз у тэчэ іду на прызначэнне.

— Васіль, кажаш?— зацікавіўся раптам больш як трэба Стрыжак.— Немахай? А па бацьку?

— Фёдаравіч.

— Качагарыць збіраешся?

— Спярша, вядома, качагарыць. Але і рэверс ад нас не ўцячэ.

І тут нарэшце прыходзіць загад ісці на станцыю, пад цяжкавагавы састаў да Мінска.

— Бывайце здаровы,— надаючы свайму голасу спаважнасць, гаворыць Васіль Немахай.— Калі што якое, дык я, бадай-што, буду даваць згоду на ваш паравоз. А? Падабаецца мне ваша трыццаць дзевятка.

Здаецца, гэтыя самыя словы, ці мо прыкладна гэтыя, гаварыў не надта каб ужо і даўно сам Стрыжак. А слухаў іх тады старшы машыніст Несцер Пятровіч Краўчук, Зінін бацька. Зіна ж смяялася.

— Што, надакучыла на ўсякі выпадак быць самым вінаватым?

На тую хвіліну Антон не мог або, дакладней кажучы, не ўмеў расказаць, як яно здарылася, што ён, парабіўшы за стрэлачніка, зрабіўся пасля менавіта паравознікам, і нікім іншым. Пазней Зіна сама растлумачыла яму гэта:

— Мой бацька кажа, што калі чалавек хоць адзін раз апынецца ў будцы паравоза, ён ужо ні аб чым іншым думаць не здолее.

Вядома, Несцер Пятровіч меў рацыю, але, бясспрэчна, справа яшчэ і ў тым, што ў старога машыніста была дачкой менавіта Зіна.

Тут вельмі дарэчы было б прыгадаць Антону тыя зімнія вечары, як прыходзіў ён у госці да сваёй старшай стрэлачніцы і як яму ў першы ж вечар хочаш не хочаш прыйшлося выслухаць з вуснаў Краўчука цэлую лекцыю аб тым, што такое паравозны крэйцкопф і для якой мэты ён служыць, але часу на ўспаміны ўжо няма, бо загад жа рушыць на станцыю прыйшоў. І Стрыжак сказаў Васілю:

— Дык вось што, таварыш Немахай, станавіся на сваё месца, гэта значыць, вось сюды,— Стрыжак паказаў на паравозную будку,— ды хутчэй, бо нам ужо час ехаць.

— Праўда? — аж захліпнуўся радасцю Васіль.— Прызначэнне ўжо ёсць? Вам сказалі?

— Ёсць. Сказалі. Пра Немахая Васіля, па-бацьку Фёдаравіча, якраз і сказалі. Шуруй, браток!

І тады на вачах Стрыжака зялёны юнак, пядаўні рамеснік Васіль Немахай неяк адразу перамяніўся. Здавалася, што ён нібыта нават падрос крыху. А рухі сталі якія! Васіль нетаропка падышоў да машыны, паважна ўзяўся за поручні, павольна паставіў нагу на ніжнюю папярочку лесвіцы, зірнуў налева, направа, а тады падхапіўся і ў адзін момант апынуўся ў будцы.

— Уперад, уперад! — выгукнуў ён.

— Ну і здарова!..— толькі і сказаў Стрыжак.

...На станцыі, як і звычайна перад адпраўленнем поезда, было мітусліва. Завіхаліся адглядчыкі вагонаў, аўтаматчыкі, спісчыкі. А як было зроблена ўсё, што трэба, выйшла са службовых дзвярэй вакзала Зіна. Дзяжурнаму па станцыі неабавязкова падыходзіць да машыніста, яму варта проста з перона падняць угору руку з сігналам, і гэта будзе азначаць, што трэба ехаць. Але Зіна падыходзіць да паравоза.

— Таварыш машыніст,— сур'ёзна гаворыць яна, але ў вачах яе несціхана бліскаюць вясёлыя іскрынкі,— вы маеце на ўвазе, што вас сёння чакаюць са сталіцы не з пустымі рукамі?

— Будзе зроблена, таварыш дзяжурны! — у тон Зіне адказвае Антон. І лічыць неабходным растлумачыць Васілю: — Сыну сёння ажно цэлы год споўніўся.

На паравозе між тым усё ідзе сваім парадкам. Вось пераведзен ужо рэверс, адкрыт рэгулятар. Прайшло імгненне, другое. Бразнулі лёгенечка буферныя талеркі вагонаў, прабег па саставу доўгі скрыгатлівы гук. Яшчэ праз імгненне пачуўся раптам моцны, як з гарматы, выхлап пары з трубы, і тады рэзкі штуршок здрыгануў усе шэсцьдзесят вагонаў поезда.

Уперад, уперад!

*1955*

# ІРЫНА

Мы асталіся адны — я і Алена. Я кахаў Алену і даўно збіраўся сказаць ёй пра гэта, ды ўсё не мог. За час нашага знаёмства мне неяк ні разу не выпадала астацца сам-насам. Удзень мы наогул не бачыліся — абодва працавалі на розных заводах, вечарамі яна заўсёды была з суседкаю Нінаю, а за мной, як цень, неадчэпна валачыўся Віктар Локшын. Віктар быў маім сябрам, але ў тыя хвіліны, калі мне даводзілася сустрэць Алену, ён ператвараўся ледзь не ў самага лютага майго ворага. Бываюць жа такія някемлівыя пазолы! Колькі разоў намякаў яму: ну хоць бы для выгляду заляцайся да Ніны, хадзі з ёю ліманаду выпіць ці яшчэ куды-небудзь, а мяне з Аленай пакінь аднаго. Дзе там! Ні на крок не адыдзе. Сунецца побач ды яшчэ анекдоты расказвае.

Акрамя Віктара і Ніны, было і яшчэ многа людзей, якія перашкаджалі мне выказаць Алене свае пачуцці. То зусім недарэчы паяўляўся майстар Платон Кудзеля, то пачынаў даймаць нас ігрой на расстроенай гітары левы край нашай завадской футбольнай каманды Лёнька Віхор. І кожны раз яны паяўляліся іменна тады, калі мне выпадала шчасце сустрэцца з Аленай.

І вось здарылася так, што мы асталіся адны. Лёнька быў заняты сёння ў адказным спаборніцтве на першынство горада. Платон Кудзеля адвозіў жонку на дачу, а Віктар здагадаўся нарэшце запрасіць Ніну да кіёска «Сокі-воды». Мы асталіся з Аленай зусім адны. Гэта было ў чэрвеньскі вечар на адной з цэнтральных вуліц нашага горада, ля пад'езда вялікага шматпавярховага дома, у якім жыла Алена. Час ужо быў позні, і ёй трэ было ісці дамоў. Але я не хацеў упускаць такога зручнага моманту,— ці

выпадзе яшчэ калі-небудзь шчасце астацца сам-насам?.. Або цяпер, або ніколі!

— Лена,— прамовіў я.— Мне трэба сказаць вам нешта вельмі важнае...

Відаць, у маім голасе гучалі нейкія асаблівыя ноткі, бо Алена, што дагэтуль абыякава стаяла і нешта ўважліва разглядала на сцяне процілеглага дома, раптам хутка павярнулася і ўтаропілася ў мяне сваімі вялікімі, нібы крыху спалоханымі вачыма.

Якая прыгожая яна была ў гэты момант! Яе постаць асвятлялі яркія промні вулічнага ліхтара, і мне добра была відаць кожная рысачка яе твару, кожная складка яе плацця. Мяне заўсёды прыводзіў у захапленне яе крыху кірпаты носік, а цяпер ён і наогул здаваўся мне найлепшым з усяго, што магла стварыць прырода, каб упрыгожыць дзявочы твар. А гэтыя тонкія чорныя бровы,— яны адны маглі любому ўскружыць галаву! І потым — вусны: на іх заўсёды дрыжала ледзь прыкметная, але такая добрая, такая ласкавая ўсмешка...

— Што ж вы хочаце сказаць мне, Толя? — спыталася Алена.

Толя! Яна назвала мяне Толем! Дагэтуль мне ні разу не даводзілася чуць з яе вуснаў майго памяншанага імя. Ну, смялей жа!

— Я хачу сказаць, што я вас кахаю, што я...

Але мне не далі скончыць. Яе маленькія вусны пацалункам закрылі мой рот. Не паспеў я апамятацца, як Алена знікла ў пад'ездзе вялікага шматпавярховага дома.

Я прытуліўся да вулічнага ліхтара...

А потым збоку ў мяне зашастаў аксаміт вялізнай заслоны, і напружаную цішыню ў зале ўзарвала бура апладысментаў...

І мне ўжо не трэба было прыкідвацца закаханым, не трэба было, абнімаючы вулічны ліхтар, усміхацца з выглядам самага шчаслівага ў свеце чалавека. Спектакль скончыўся. П'еса, у якой я выконваў ролю маладога слесара Анатоля, а Ірына — ролю гэткай жа маладой фрэзероўшчыцы Алены, сыграна да канца.

Зала ўсё яшчэ грыміць апладысментамі, здаволеная нашай ігрой і шчаслівым канцом п'есы.

Я іду за кулісы і бачу, як Алену-Ірыну абступаюць сяброўкі, віншуюць з найлепшай ігрою. Яна не заўважае мяне, яна нават не глядзіць у мой бок.

Не, мне ўжо не трэба мець выгляду закаханага. Аднак гэта вельмі цяжка, амаль немагчыма. Бо я і сапраўды кахаю яе, Ірыну, і ў жыцці нават мацней, чым на сцэне. Ірына стаіць перад маімі вачыма заўсёды, дзе б я ні быў і што б ні рабіў. Кахаю я Ірыну даўно, але калі на сцэне я ўрэшце асмельваюся прызнацца ў гэтым, дык у жыцці сказаць ёй слова «кахаю» — зусім непасільная для мяне справа.

Ірына ідзе здымаць грым, а я чакаю яе ў вестыбюлі нашага заводскага клуба. Дамоў мы ідзём разам. Не так, як у п'есе, у жыцці мы часта бываем сам-насам з ёю. Нам ніхто не перашкаджае гаварыць, аб чым мы хочам. Але сёння, як і заўсёды, мы больш маўчым, чым гаворым. Слоў, якія я так лёгка вымаўляю на сцэне, я ніяк не магу сказаць у жыцці.

Пазнаёміліся мы з Ірынай два гады таму назад, калі мяне запрасілі да іх у інстытут чытаць лекцыю аб скарасных метадах рэзання металу. Памятаю, я тады моцна захваляваўся: як гэта я, звычайны токар, буду чытаць лекцыю студэнтам вышэйшай навучальнай установы? Але мяне выручыў наш парторг. Ён памог мне скласці тэзісы лекцыі, падказаў яе асноўную ідэю. Пазней сябры гаварылі мне, што выйшла ў мяне няблага. Але ў той момант, калі я ўзышоў на кафедру і зірнуў у залу, я так разгубіўся, што мяне пачало калаціць, як у ліхаманцы. Зала была паўнюткая. На лекцыю прыйшлі не толькі студэнты, але і выкладчыкі інстытута, а ў маленькім танклявым дзядулі, які сядзеў у першым радзе, я пазнаў самога акадэміка Бязуглава. Цяжэй за ўсё мне было пачаць гаварыць. А потым — нічога, расхадзіўся. Вельмі ж блізкім і родным было мне тое, аб чым трэба было гаварыць. Людзі на нашым заводзе — золата, і расказваць пра іх можна бясконца.

Скончыў я лекцыю, папляскалі мне, а потым пачалі пытанні сыпаць. Ох, і цікаўны народ, гэтыя студэнты! То адно ім растлумач, то другое,— ну, проста замучылі. А больш за ўсіх даняла мяне яна, Ірына. Пытанняў з дзесяць задала, не менш. А пасля гаворыць:

— От вы, таварыш Казачонак, многа расказвалі нам пра сваіх таварышаў-скараснікоў, пра іх працу, а наконт свайго рэдуктара змаўчалі. Будзьце ласкавы, раскажыце пра сваё вынаходства.

І як гэта яна даведалася пра рэдуктар — дальбог, не ведаю! Бо к таму часу я толькі што скончыў канструяваць яго, нават і выпрабаваць яшчэ не ўправіўся.

Аднак нічога не зробіш, прыйшлося расказваць. На маю думку, з дапамогаю рэдуктара можна было, не перарабляючы станка, у шмат разоў павялічыць хуткасць рэзання. Лічбы я тады не назваў, бо яшчэ сам не мог прызвычаіцца да яе няцізначнасці.

Але ад Ірыны, аказваецца, адчапіцца было не так проста. Назаўтра яна прыйшла да нас на завод, каб прысутнічаць пры выпрабаванні рэдуктара. Ды яшчэ прывяла з сабою чалавек дваццаць з інстытута, у тым ліку і самога акадэміка Бязуглава. А калі я ўключыў станок і дэталь пачала круціцца з хуткасцю пятнаццаць тысяч абаротаў у мінуту, Ірына так заскакала з радасці, што можна было падумаць, быццам гэты рэдуктар вынайшла яна, а не я.

Мусіць, тады я і пакахаў Ірыну...

З таго дня паміж калектывам нашага завода, студэнтамі і выкладчыкамі політэхнічнага інстытута пачалося шчырае дзелавое сяброўства. Шмат чым памаглі яны нам. Ну, і мы, здаецца, сяму-таму іх навучылі.

А потым Ірына стала іграць у нашым драмгуртку. Мы тады рыхтавалі п'есу «На нашым заводзе». Напісаў яе, між іншым, наш слесар Пятрусь Салодкі, той самы, што цяпер займаецца ў літаратурным інстытуце. Пачалі мы рэпетыраваць, а ў Надзі Гарэльчанкі, кантралёркі з АТК, ніяк не ўдаецца роля фрэзероўшчыцы Алены.

— Давайце я паспрабую,— сказала Ірына, якая была ў нашага парторга і пасля размовы з ім выпадкова зайшла да нас на рэпетыцыю.

Яна адразу ўвайшла ў ролю.

Неўзабаве адбылася прэм'ера. П'еса была сустрэта вельмі добра, і потым мы ставілі яе шмат разоў. І ў іншых клубах горада выступалі з ёю, і ў падшэфную вайсковую часць ездзілі, і нават на рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці паказвалі.

Ірыну я кахаў усё мацней, але яна аб гэтым ці не здагадвалася, ці ведала, ды не паказвала выгляду.

Сёння пасля спектакль чамусьці асабліва растрывожыў мяне, і я ўсю дарогу маўчаў. Ірына нешта напявала, і гэта было вельмі дарэчы: маю маўклівасць можна было, у выпадку чаго, апраўдаць тым, што я ўважліва слухаю песню. І толькі тады, калі ўжо трэба было развітвацца, я сказаў:

— Як мне надакучыла гэтая п'еса! Мы ўжо дваццаць сем разоў ігралі яе!

— А мне п'еса падабаецца...— задумена прамовіла Ірына.— Я сваю ролю іграю з прыемнасцю... Праўда, гэта нават вельмі добрая п'еса.

І, не сказаўшы больш ні слова, толькі злёгку кіўнуўшы мне галавою на развітанне, яна знікла ў цемені двара свайго дома.

Самотны, я паваloкся да сябе па Першую Партызанскую. Дома доўга не мог заснуць. Гэта праўда, што ўсе закаханыя хварэюць на бяссонніцу?..

У наступную суботу наш драмгурток ставіў «Ягора Булычова». У гэтым спектаклі я не быў заняты і, забраўшыся ў час першага акта на галёрку, з сумам назіраў, як Званцоў націху падыходзіць да Шуры-Ірыны, абнімае яе і гаворыць: «Аб чым задумалася, рыжая каза?»

Не, я ўсё ж дарэмна ганіў п'есу «На нашым заводзе». Не такая яна ўжо і дрэнная. А канец проста цудоўны! І як добра, што мы заўтра едзем у падшэфны калгас і будзем ставіць іменна яе...

І вось зноў я — закаханы слесар Анатоль, і зноў мне ніяк не даюць выказаць фрэзероўшчыцы Алене сваіх пачуццяў. То зусім недарэчы з'яўляецца майстар Платон Кудзеля, то левы край Лёнька Віхор пачынае даймаць нас ігрой на сваёй злашчаснай гітары. А гэтая някемлівая суседка Ніна! Ці адыдзе яна хоць на хвілінку ад Алены? Ці здагадаецца Віктар пайсці з ёю да кіёска «Сокі-воды»?

Але ўсё ідзе сваім парадкам. Пайшоў на стадыён і больш не вяртаецца на сцэну Лёнька Віхор, павёз у вызначаны час Платон Кудзеля жонку на дачу, і Віктар з Нінай прыйшлі да лагічнага вываду, што газіраваная вада — цудоўнейшы напітак і што ім варта пайсці ў бліжэйшы кіёск.

Мы астаёмся з Аленай адны.

— Лена,— кажу я.— Мне трэба сказаць вам нешта вельмі важнае...

Я ведаю,— зараз яна павінна павярнуцца да мяне і спытаць: «Што ж вы хочаце сказаць мне, Толя?»

Яна павярнулася і нечакана сказала зусім другое.

— Не трэба, нічога не трэба гаварыць, мілы...

І перш чым я паспеў апамятацца ад гэтых нечаканых слоў, яна гучна пацалавала мяне і знікла ў пад'ездзе вялікага шматпавярховага дома.

Я забыўся на тое, што мне трэба было прыхінуцца да вулічнага ліхтара, і кінуўся ў пад'езд, дзе знікла Алена. Вядома, пад'езд выглядаў пад'ездам толькі з глядзельнай

залы, і ледзь я зрабіў крок за дзвярыма, як наляцеў на бутафорскі танк. Ля фанерных гусеніц сядзела, абхапіўшы рукамі галаву, Алена.

— Што вы зрабілі! — ускрыкнуў я.— Што гэта вам прыйшло ў галаву на дваццаць восьмым пацалунку?

Яна адняла рукі ад галавы і насцярожылася. Яна да нечага прыслухоўвалася. Але да чаго? Ці да маіх слоў, ці да апладысментаў, што далятала з залы? Гул апладысментаў усё нарастаў і нарастаў. Гледачы, выходзіць, нічога не заўважылі. А можа, такі варыянт канцоўкі п'есы падабаўся ім нават больш?

— Які ты някемлівы, Віця,— ціха сказала раптам Ірына.— Дваццаць восьмы, гаворыш? Не, гэта мой першы... першы сапраўдны пацалунак...

*1950*

# АСЕННІ ТРАМВАЙ

Праз сетку дробнага асенняга дажджу, які імжыў за вокнамі трамвая, амаль немагчыма было ўбачыць што-небудзь на вуліцы. Заміналі разглядаць навакольнае яшчэ і тапюткія струменьчыкі вады, што ўлукаткі беглі па шкле са знадворнага боку. Таму ўсё на вуліцы — і дамы, і дрэвы, і слупы — было нейкае дрыготкае, нібы яно раптам страціла ўстойлівасць і раўнавагу.

Здавалася, што трамвай ідзе вельмі марудна, значна марудней, чымся звычайна. Часам яго пачынала кідаць у бакі, потым ён нервова калаціўся, быццам яму рабілася ніякавата ад подыху восені, што прыйшла гэтак знячэўку. І адным голасам бясконца звінела нейкая тужлівая нота. Маршрут трамвая быў далёкі, ён цягнуўся праз увесь горад, з аднаго канца ў другі.

Людзей у вагоне было небагата. Насупраць мяне сядзеў пажылы чыгуначнік з худым, у зморшчынах, тварам і чытаў нейкую тоўстую патрапаную кнігу. Спіпаю да чыгуначніка стаяў юнак у расхрыстанай кашулі і ў ссунутай набакір маленькай кепачцы; надыхаўшы на шкло пары, ён раз за разам выводзіў пальцам адзін і той жа малюнак, які можна было палічыць і за планету Сатурн з кольцам, і за жаночы капялюш. Яшчэ далей сядзела светлавалосая дзяўчына ў акулярах; яна пільна глядзела на сваю сумачку, якая ляжала на каленях, і было такое ўражанне, быццам дзяўчына старалася ўспомніць, што там знаходзіцца,— і не магла. Былі ў трамваі яшчэ жанчына з дзіцем на руках, малады мужчына ў сінім камбінезоне, чалавек няпэўнага веку ў чорным бліскучым плашчы і чатыры ці пяць хлопцаў відавочна студэнцкага выгляду.

Астатніх пасажыраў я не бачыў — яны былі за маёю спінаю.

— Грамадзяне,— няветліва сказала кандуктарка,— грамадзяне пасажыры, хто за вас білеты будзе браць, га? Думаеце, Пушкін возьме, га?

— Пушкін, да вашага ведама, памёр ужо,— сказаў чалавек у плашчы.— У адна тысяча восемсот... восемсот...— Ён падумаў крыху і прамовіў: — Гэта было, да вашага ведама, яшчэ за царом Гарохам.

— Грамадзяне пасажыры, не перашкаджайце працаваць! — Кандуктарка злосна тарганула вяровачку, што вацягнулася пад столлю ўздоўж вагона, і недзе ў другім вагоне гэтак жа злосна плямкнуў званок.— А што тычыцца Пушкіна, дык ён не памёр, а быў забіты на дуэлі. Мо нават гэткім во тыпам. Я ў вас пытаюся: вы будзеце браць білет? І наогул трэба зачыняць дзверы, бо на вуліцы халадэча.

— А калі зачыню, хіба на вуліцы пацяплее?

— Я каму кажу!..— яшчэ болей узлавалася кандуктарка і рушыла да пасажыра.

— Калі ласка! — Чалавек у плашчы працягнуў кандуктарцы старую зашмальцаваную сторублёўку і хітравата ўсміхнуўся.— Адзін білет. Калі ласка, плацкартны.

Кандуктарка схапіла сторублёўку і не спяшаючыся пачала выцягваць са свае сумкі рублі, траячкі, пяцёркі. Твар у пасажыра выцягнуўся, смешна адкрыўся рот, але ніхто на гэта не ўсміхнуўся, ніхто нават не звярнуў увагі. Застаўся неацэненым і жарт наконт плацкартнага трамвайнага білета.

Сумна, тужліва ездзіць у такія вось дажджлівыя асеннія дні. Надвор'е неяк давіць на цябе, псуе настрой, выклікае жаданне схавацца дзе-небудзь далей ад людскога вока. На душу кладзецца нейкі незразумелы асадак.

Людзі сядзяць ціха, ні аб чым не размаўляюць і нават не скардзяцца на дождж, быццам баяцца, што калі пачнуць скардзіцца, дык ён возьме і зацурбоніць яшчэ спарней. І таму ўсе, відаць, скардзяцца на яго толькі ў думках.

На чарговым прыпынку ў вагон увайшло некалькі новых пасажыраў. Адзін з іх, стары, склаўшы парасон, ласкава прывітаўся з кандуктаркай.

— Дзень добры, дачушка!

— Дзень добры! — кандуктарка раптам зусім нечака-

на лагодна ўсміхнулася старому, так, як усміхаюцца пры сустрэчы з даўнім прыемным знаёмым.

— Бач, Баталевіч прыйшоў!— пакідаючы чытаць кнігу, прамовіў чыгуначнік і таксама ўсміхнуўся. Відаць, і ён ведаў старога.

Дзіўная справа: як увайшоў стары, ажывіўся не адзін толькі чыгуначнік. У вагоне многія заварушыліся, пачалі ўсміхацца, позіркі ўсіх скіраваліся на пляцоўку, дзе стаяў, страсаючы кроплі дажджу са свайго не новага ўжо, але яшчэ прыстойнага цёмна-сіняга драпавага паліто, новы пасажыр. Пры ім была нейкая скрынка даволі значнага памеру, якую ён паставіў каля сябе на падлогу. Прыгледзеўшыся, я зразумеў, што гэта футарал ад баяна.

— Сядайце, калі ласка! — узнімаючыся са свайго месца, сказала да старога дзяўчына ў акулярах.

— Дзякую, ясачка, я са сваім крэслам,— адказаў стары.

Неспадзявана кандуктарка сунула назад у сумку жменю сваіх траячак і пяцёрак і голасам, які адразу неяк прыемна палагаднеў, сказала чалавеку ў плашчы:

— Не варта, бадай-што, разменьваць сто рублёў з-за трыццаці капеек, таварыш. Возьмеце як-небудзь іншым разам два білеты.

— Хто гэта? — спытаў я ў чыгуначніка, паказваючы вачыма на старога.

— Гэта? — здзіўлена паглядзеў на мяне чыгуначнік, як глядзяць звычайна на тых дзівакоў, што не ведаюць самых простых рэчаў.— Ды гэта ж Баталевіч!

Мабыць, старога вельмі добра ведалі ў гэтым горадзе. Таму, відаць, чыгуначнік і быў упэўнены, што імя яго адразу растлумачыць мне ўсё. А я толькі нядаўна прыехаў сюды і, вядома, меў пра горад і справы яго жыхароў самае прыблізнае ўяўленне. «Баталевіч?..— напружваў я сваю памяць.— Хто ж гэта такі?..» І як ні стараўся я, але нічога пэўнага прыгадаць не мог. Такога прозвішча я не сустракаў ні ў газетах, ні ў часопісах. Ды і невядома было, ці гэта прозвішча, ці імя. А мо проста мянушка?..

Тым часам стары падняў вечка сваёй скрынкі і выняў адтуль баян. Інструмент быў з тых, што мелі час багата пабачыць на сваім вяку і якім даводзілася даваць уцеху шмат і шмат каму з людзей. Стары сеў на скрынку, нетаропка перакінуў цераз плячо рамень, усміхнуўся якойсьці сваёй думцы і раптам хуткім рухам шырока расцягнуў мяхі. І тады нібыта вецер уварваўся ў вагон,— дзіўна прыем-

пы, падбадзёрваючы вецер, якога ты даўно чакаў і па якім дужа знудзіўся... Ды не, гэта не вецер; гэта далёкі Амур-бацька прыгнаў сюды свае ўспененыя хвалі, і яны ўзрушана загаманілі, адкрываючы табе таямніцы сваіх сівых глыбінь... Здавалася, што ў старэнькім, неважнецкім на выгляд баяне схаваны цэлы аркестр, бо ў вагоне гучалі то разважлівы фагот, то далікатная флейта, а то сардэчная скрыпка. І гукі, што ліліся з іх, то раптам паніжаліся да ніжняга соль і амаль зпікалі, то нечакана ўзляталі да верхняга фа дыез. У гэтых гуках быў пляск хваль і гоман тайгі, шамаценне ніцай лазы і крык чаек, а над усім гэтым лунаў дух неўміручага рускага матроса.

Не адрываючыся, я глядзеў на падцягнуты, сухаваты твар старога. Яго глыбока запалыя вочы летуценніка, хоць і пазіралі на людзей, але, здаецца, нікога на бачылі; густыя калматыя бровы амаль сышліся ля пераносся, а адтуль па лбе пабеглі ўгору дзве шырокія зморшчыны; сівыя доўгія вусы з загнутымі ўніз канцамі натапыршчыліся і ледзь прыкметна варушыліся ў такт музыцы... У жылістых, учэпістых руках старога ўгадвалася немалая сіла, якую не здолеў, ды мо і не здолее зламаць час. Гэта былі рукі рабочага, з тых, што ўмеюць усё — узводзіць гмахі і шыць боты, пракладваць каналы ў пустыні і апрацоўваць дэталі з дакладнасцю да мікрона, вадзіць паязды і рабіць цацкі. Наогул музыка быў дужа багаты на тую высакародную старэчую прыгажосць, якая міжвольна выклікае павагу і зачараванне.

— От бо хараство! — усклікнуў у захапленні чыгуначнік.— Такое і ў тэатры не заўсёды пачуеш... Што, вы не згодны?

Чыгуначнік звяртаўся адразу да ўсіх, хто быў побач, але ўсе не маглі адказаць яму, ды ён, відаць, і не чакаў адказу, бо, мяркуючы па ўсім, цвёрда быў перакананы, што яго захапленне не можа не падзяляць кожны з прысутных.

Так яно і было.

— Відаць, добры заробак мае стары са свайго баяна? — прамовіў я.

— Што вы! — узрушана выгукнуў чыгуначнік і кінуў на мяне знішчальны позірк. У голасе яго гучала крыўда.— Хіба Баталевіч, вы думаеце, дзеля заробку іграе?! Дрэнна ж вы ведаеце яго, калі так гаворыце!

Тады я прызнаўся, што зусім не ведаю старога і нават бачу яго ўпершыню.

— Ён... як бы гэта сказаць вам дакладней... аматар, адным словам. Ён даўней токарам рабіў... Ого, якім токарам быў Баталевіч! Хто-хто, а я ўжо ведаю... А цяпер на пенсіі, бо недабачваць пачаў. Не, грошы яму навошта! У яго тры сыны, масцеравыя першай рукі, ды яшчэ дачка замужам за галоўным інжынерам. Пры ёй і жыве стары.

Чыгуначнік памаўчаў крыху, з замілаваннем прыслухоўваючыся да мелодыі, што запалапіла сабою вагон, потым зноў пачаў давяральна расказваць:

— У яго дружбак ёсць, на другім канцы горада жыве. Такі ж самы, як і ён, стары, таксама пенсіянер. І яшчэ, можа, большы аматар музыкі, на скрыпцы грае. Вось яны і наведваюць адзін аднаго. То Баталевіч едзе да таго, а то той да Баталевіча. Часцей за ўсё Баталевіч ездзіць, бо ён больш рухавы. А як збяруцца разам, дык такую канцэрціну даюць, што ўся вуліца, дальбог, збягаецца слухаць. І тэатра таго не трэба... А дарогаю, бачыце от, таксама не можа стрымацца, каб не пусціць душу пад баян.

Трамвай гушкаўся, уздрыгваў, хістаўся ў бакі, людзей усё большала, станавілася ўжо цесна, але ў вагоне не было звычайнай у такіх выпадках штурханіны, незадаволенасці адно адным — усе пасажыры былі ціхманыя, далікатныя, і на тварах ва ўсіх блукала ясная задуменнасць.

А стары музыка, узяўшы апошні акорд, раптам перавёў мелодыю ў іншы тэмп, і тады панесліся па вагоне, ударылі ў вокны, шуганулі пад столь нястрымныя рускія скокі. Яны ўсё набіралі і набіралі тэмп, і, слухаючы іх, амаль ужо немагчыма было ўседзець на месцы... Пад такую вось разудалую музыку выходзяць за весніцы хлопцы, каб памерацца сілаю і вырашыць нарэшце, каму быць на сяле першым танцорам, хто з іх здольны пераскакаць астатніх, здзівіць усіх спрытам і майстэрствам... І калі б гэта не ў трамваі, дык вунь тыя хлопцы, што так прагна слухаюць пералівы баяна, нізавошта б, напэўна, не стрымаліся. Адзін бы з іх раптам трасянуў русымі кучарамі, тупнуў нагою, прайшоўся, кідаючы выклік. Другі, у сіняй кашулі з вышытым каўняром, сарваўся б з месца, адбіў чачотку. Трэці, з быстрымі вочкамі, узняўся б птахам, панёсся ў нястрымных скоках. І ўсе трое закружыліся б у шалёным віхоры. Яны то ўздымаліся б угору, застываючы ў паветры, то падалі ўніз, на адно калена, то пускаліся ўпрысядкі. І круціліся, бясконца круціліся б хлопцы ваўчком... Ох, як цяжка ім стрымацца!

Са свайго месца падняўся юнак у расхрыстанай кашулі; відаць, яму трэба было выходзіць з трамвая. Пастаяўшы ў нерашучасці якую хвіліну, ён зашпіліў на ўсе гузікі кашулю, паправіў на галаве сваю кепачку і зноў сеў на лаўку. Цяпер я добра разгледзеў — тое, што ён намаляваў пальцам на шкле, было не Сатурн і не капялюш, а жаночае вока.

Заплакала было дзіця на руках у жанчыны, але, быццам перадумаўшы, адразу і сцішылася.

Да мяне нахіліўся чыгуначнік.

— Іду гэта я ўчора па Маскоўскай...— гаварыў ён мне,— а ўчора ж, самі ведаеце, таксама было непагодліва. Хоць і без дажджу, праўда, але гэткая, каб на яе ліха, стыль усхадзілася, што аж да касцей бярэ. Ну, іду, значыцца. А там у адным месцы камяніцу будаваць сталі, недалёка ад гастранома, можа ведаеце? Будаваць, праўда, яшчэ не зачыналі, толькі катлаван пакуль што пад фундамент капаюць. Экскаватарам, вядома. А на дварэ стыль, золь. Хіба тут да работы будзе таму экскаватаршчыку? Затрымаўся я, гляджу — не ліпнуць у яго рукі да справы, не ліпнуць, дый годзе! Зачэрпне, небарака, каўшом зямлі, а коўш той, можа, толькі напалавіну і поўны, падвядзе яго быццам з неахвотай да машыны, пачакае, спарожніць, зноў пачакае і зноў з той жа неахвотай паварочвае назад. Сарамаццё адно, а не работа!.. А тут бачу раптам — адкуль ні вазьміся — Баталевіч. Пастаяў, падзіваваў на таго работнічка, а потым выняў са скрынкі свой неразлучны баян ды як урэжа з усіх ладоў!.. Нешта вясёлае такое, бадзёрае. І што б вы думалі? Загудзеў той экскаватар, зароў, ды так, што аж зямля дрыжыць! Нібыта новага экскаватаршчыка на яго пасадзілі. Як птушка, залётаў у паветры коўш, толькі паспявай адвозіць машынамі зямлю. Вось — зачарпнуў, вось — высыпаў, вось ужо ляціць назад... А людзей сабралася! І ўсе гукаюць: «Давай, давай, братка!» — «Весялей хадзі, а ну, хадзі!» Любата адна, ліха яго не бяры, глядзець было!..

Тут да кандуктаркі падышоў чалавек у чорным плашчы. Зачырванеўшыся, ён працягнуў ёй дзве манеты.

— Знайшоў вось, бачыце, дробязь... завалілася была за падкладку, а я і не заўважыў. Якраз на білет.

— Дык тут жа толькі па беспляцкартны,— засмяялася кандуктарка.

— Не пярэчу і супроць такога...

Між тым адна мелодыя старога музыкі змяняла другую, і кожная з іх нашырала кола слухачоў. У вагон заходзілі ўсё новыя і новыя пасажыры. Неўзабаве ён ужо быў паўнюткі людзей. Ды толькі не заўважалася нешта, каб хто выходзіў на прыпынках...

Зняўшы акуляры, светлавалосая дзяўчына бліснула сваімі шэрымі, надзвычай жывымі вачыма і сказала, ні да каго ў прыватнасці не звяртаючыся:

— А мая сяброўка... Тома Грушэцкая, яна гістфак канчае... дык яна пад баян Баталевіча шлюб свой рэгістравала, во як было.— Спяшаючыся, каб яе абавязкова выслухалі, дзяўчына хутка гаварыла далей: — Падыходзяць яны з Сямёнам Карпяковым да загса, а насустрач ім Баталевіч. «Жаніцца, пытае, надумаліся, галубкі мае? — А сам жа іх першы раз у вочы бачыць.— Давайце, кажа, я вам сыграю ды за адным рыпам пажадаю, каб жылі вы ў злагадзе і ў шчасці, каб не ведалі журбы, а зналіся з адною толькі радасцю».

— Вось і ходзіць, і ездзіць так чалавек па горадзе, і бярэ людзей за жывое, калі дзе трэба,— уставіла свае слоса жанчына з дзіцем на руках.

— А яшчэ...— усхвалявана пачаў быў нехта ззаду мяне; здаецца, голас належаў чалавеку ў чорным плашчы. Але абарваўся ўжо апошні акорд баяна старога музыкі. Нейкі момант у вагоне панавала цішыня, а тады на змену ёй грымнулі дружныя, хоць вушы затыкай, апладысменты. Такіх апладысментаў і ў такой абстаноўцы мне, прызнацца, яшчэ не даводзілася чуць.

— Вось я і прыехаў. Да пабачэння! — проста сказаў стары і, хуценька схаваўшы свой баян у скрынку, пайшоў да дзвярэй.

Людзі пачціва сунуліся ў бакі, уступаючы яму дарогу. Каля дзвярэй стары прыўзняў свой шэры, пацямнелы ад дажджу капялюш, падміргнуў усяму вагону і, не па гадах жвава, саскочыў долу.

Мы былі ў нейкай незнаёмай мясціне. Відаць, час бег надзвычай хутка, бо я і не заўважыў, як праехаў свой прыпынак...

Я накіраваўся да выхада. За маёй спіною чуўся ўзбуджаны гоман, бадзёры смех, вясёлыя жарты...

Я крочыў па вуліцы і не заўважаў, ці ёсць дождж, ці няма яго.

*1955*

# УСПАМІН НА ВЯСЕЛЛІ

Вяселле было людпае і шумнае. Яно ўвайшло ў тую пару, калі ўжо былі сказаны ўсе тосты — і за маладых, і за іхніх сваякоў, і за кожнага з гасцей. Цяпер гаманілі ўсе разам, і ніхто нікога не слухаў. Толькі наш сусед Карп Іванавіч, лінуўшы ў чарку кубінскага каньяку, разпораз крычаў на ўвесь пакой:

— Горка-а-а!..

Падняўшы чарку і ікнуўшы, ён ставіў яе на месца, і тады чарку хуценька падхоплівала яго жонка Тацяна Пятроўна і пералівала каньяк у свой фужэр. Фужэр быў ужо напоўнены ледзь не да верху. Карп Іванавіч, ужо ладна падпіты, не заўважаў жончыных хітрыкаў; ён праз нейкі час зноў наліваў сабе чарку, зноў крычаў «горка-а-а!..» і, ікнуўшы, зноў ставіў чарку на стол.

Выходзіла замуж мая меншая сястра Зіна, або, як мы яе звалі, Зінчык. Я сядзеў за вясельным сталом поруч з ёю, і мне ўсё неяк не верылася, што гэта іменна Зіна, наша маленькая Зінчык, выходзіць замуж, а значыць — яна ўжо вялікая, дарослая, сталая. І яшчэ мне думалася, што я ўжо, выходзіць, стары, бо добра памятаю, калі яна нарадзілася — мне было тады дванаццаць год. А цяпер у мяне ўжо трое сваіх дзяцей, і большы пайшоў сёлета ў пяты клас — яму таксама дванаццаць...

Зіна, Зінчык, як жа хутка ты выгадавалася, насталела. Усё адбывалася неяк непрыкметку — вось у школу пайшла, вось скончыла яе, вось экзамены на гістфак вытрымала, вось ужо і дыплом атрымала. А ўжо і за вясельным сталом сядзіш, а побач з табою шчасліва лыпае вачыма твой суджаны Васька Корзун, таленавіцейшы чалавек, фрэзероўшчык-віртуоз з маёй брыгады.

Ды ці ж гэтак ужо і неўзаметку ўсё адбывалася?.. Можа, гэта толькі цяпер яно так здаецца?..

— Горка-а-а!..— выгукнуў Карп Іванавіч і падняў чарку.

Зінчык грацыёзна падставіла губкі Ваську Корзуну.

Павярнуўшыся ўсім корпусам, Васька, нібы да іконы, асцярожна прыклаўся да іх сваімі сцятымі губамі.

Наўздзіў Таццяне Пятроўне, Карп Іванавіч не ікнуў і не паставіў свае чаркі на стол. Прымерыўшыся, ён спрытна кульнуў яе ў рот. Тады, паблажліва ўсміхаючыся, пачаў старанна заядаць віно антонаўскім яблыкам.

Я таксама выпіў сваю чарку. Я ўвесь вечар піў мала. На душы было неяк журботна, і не хацелася, каб да гэтай ціхай журботнасці прымешваўся алкагольны тлум.

Выпіў і наш бацька. Ён сядзеў поруч з жаніхом — адзіны тут родны чалавек і мне, і Зінчыку. Маці ў нас даўно ўжо няма, ён і гадаваў нас адзін, не пажадаўшы пасля яе смерці прывесці ў хату мачаху. Ён быў нам і за бацьку, і за маці... Цяпер ён сядзеў увесь вечар маўклівы, уважліва слухаў тосты, ківаў галавой, калі пагаджаўся з імі, і ўсё зыркаў на Зінчыка. Я адчуваў, пра што ён думаў у гэтыя хвіліны, што перажываў. Яму і радасна было, і тужліва адначасна. Радасна з таго, што вось і апошняе малое выбілася ўжо на сваю дарогу, а тужліва... таксама з таго самага, што малое выбілася на сваю, асобную ад ягонай, дарогу і ніколі ўжо не вернецца назад.

Стары ўжо ён, наш бацька, добра такі стары. Шэсць дзесяткаў з ладным гакам мае. І калі ўлічыць, што жыццё даволі панамяла яму бакі, што яно ніколі не песціла яго, дык гадкі тыя сёе-тое значаць. Нешта ад самага маленства не шэнціла яму. Яшчэ як толькі пачынаў хадзіць — зваліўся з лаўкі і зламаў нагу. Сёлавыя эскулапы так злажылі косткі, што ён назаўсёды астаўся кульгавым. У дваццатыя гады яго, сельскага актывіста, схапілі бандзюкі Булак-Балаховіча і адсеклі яму правую руку — каб не галасаваў болей за Савецкую ўладу. Няўцям было балахоўцам, што ён галасаваў за Савецкую ўладу сэрцам, а то і яго выразалі б. Урабляць зямлю аднарукаму ды яшчэ і кульгаваму не было як, і ён падаўся ў горад шукаць якое лягчэйшае работы. Быў і за кур'ера, і за швейцара, і за вартаўніка, а пасля ўладзіўся на хлебазавод, дзе і працаваў экспедытарам аж да пенсіі. Ажаніўся ён позна, ужо на чацвёртым дзесятку, таксама з немаладою жанчынай, гэт-

кай жа няўдачніцай, як і ён сам. Яна была стрэлачніцай на станцыі, аднаго разу схібіла, неасцярожна аступілася, папала пад паравоз і асталася без нагі. Не ведаю ўжо, як яно так сталася, што іхнія сцежкі сышліся ў адну. Затое потым людзі гаварылі, што на свеце не было больш дружных мужа і жонкі, як яны. Я і сам ведаў гэта. Малы яшчэ быў, не ўсё разумеў, але бачыў, як бацька і маці шануюць адно аднаго, якія яны чуйныя, уважныя, клапатлівыя.

Бацька адчуў мой позірк і сам паглядзеў на мяне. Зразумеў, мабыць, што я думаю ў гэтую хвіліну менавіта пра яго, і лагодна заўсміхаўся. Не згаворваючыся, мы налілі свае чаркі, падпялі іх. І ў гэты момант да нас далучылася Зінчык. Яна таксама паківала нам — спачатку бацьку, потым мне — і, упершыню за вечар, усё да каліва выпіла сваё віно.

— Душна ў нас,— сказала пасля, павярнуўшыся да мяне, Зінчык.— Адчыні, калі ласка, фортачку.

Я паслухмяна ўстаў і пайшоў да акна. Фортачка ў нас была тугая, і мне давялося паваждацца, пакуль адчыніў яе. У пакой рынула ядранае марознае паветра — на дварэ папавала зіма, быў пачатак снежня.

І я раптам успомніў...

...Тады таксама была зіма, сама што пачаўся снежань. Ды зіма была не наша беларуская — лагодная і мяккая, а чужая, сібірская — лютая і пякельная. Была ваенная зіма сорак першага года.

Мы эвакуіраваліся ў Сібір на самым пачатку вайны ўсёй сям'ёй — бацька, маці, я і Зінчык. Мне тады ішоў трынаццаты год, Зінчыку толькі што споўніўся годзік. Бацька і тут уладзіўся на хлебазавод, пачаў гэтак жа працаваць экспедытарам, а маці, якая ўжо добра асвойталася хадзіць на пратэзе, стала прыбіральшчыцай у нейкай канторы. А я быў дома і за гаспадара і за няньку.

Нас пасялілі ў доўгім напаўразбураным бараку. Той барак быў зляплены яшчэ на першым годзе першай пяцігодкі як часовы прытулак для будаўнікоў. Апошнім часам у ім ніхто не жыў, ён выкарыстоўваўся як складское памяшканне. Ды панаехалі эвакуіраваныя, і мясцовыя ўлады зноў успомнілі пра барак, зноў ператварылі яго ў жытло. Ён ужо ледзь ліпеў. Адну камору ў ім далі і нам.

Камора была невялічкая, з адным акном. Ды пакуль стаяла лета, было нічога. А як надышлі халады — от тут і пачалося!.. Камору прадзімала літаральна наскрозь. Груб-

ка ніяк не магла нагрэць яе, як ні палі, ды і дровы былі сырыя, проста нікуды не вартыя.

Што далей, то горай. Пачаліся маразы, і зрабілася зусім нязносна. Самае страшнае было тое, што наша акно мела адну толькі раму. Ад яе так і патыхала холадам. Куды ні хадзіў бацька, да якіх начальнікаў ні стукаўся, нічога не памагала. Ніхто нават не абяцаў нічога, усе адно разводзілі рукамі. Тады ўсё было на вагу золата, і аконныя рамы таксама.

— Эх, была б у нас дубальтовая рама, мы б і гора не ведалі,— цяжка ўздыхаючы, гаварыў бацька.— Дзе былі мае вочы раней, каб іх высмаліла...

Бацька прыходзіў з работы позна. Ад яго пахла хлебам — свежым, духмяным. Можна было падумаць, што ў яго ў кожнай кішэні схавана па бохану хлеба, або, прынамсі, хоць па скібачцы. Але хлеба бацька ніколі не прыносіў. Прыносіў хлеб у хату я,— з магазіна, дзе яго давалі па картачкі, давалі так мала, што можна было адным махам з'есці дарогаю, пакуль ідзеш дамоў.

У тыя дні два жаданні валодалі мною — каб хоць раз наесціся хлеба «ад пуза» і хоць раз пагрэцца так, каб аж пара пайшла ад цела.

— І дзе толькі былі мае вочы раней, каб іх высмаліла,— гаварыў бацька, засоўваючы ў грубку мёрзлае палена. Яно сіпела, страляла, але цяпла амаль не давала.— У людзей вунь ва ўсіх па дубальтовай раме, і толькі ў адных нас адзіночная!..

— Нічога не паробіш, Кастусёк,— суцяшала яго наша маці.— Можа, як-небудзь перазімуем, а там, можа, і вайна скончыцца, і мы дамоў вернемся. Не трэба гэтак мучыць сябе, ты ж не вінаваты, што нам папалася гэтая камора, а не якая другая. А што, каб наша ды выпала Гарэцкім, у іх жа шасцёра дзяцей, і ўсе малыя, і ўсе хваравітыя. Нашы хаця, дзякаваць богу, здаровенькія.

Нас і папраўдзе не брала ніякая трасца — ні мяне, ні Зінчыка. Мы мерзлі, галадалі, але ніякая хвораасць да нас не ліпла.

А вось сама маці ўсё ж захварэла. Прастудзілася неяк і злягла. Вядома, якая там адзежына была на ёй... Злягла вечарам, а раніцой і не паднялася. І без градусніка відаць было, што ў яе высокая тэмпература.

Паслаў мяне бацька ў паліклініку, збегаў я, прывёў доктарку, старэнькую і маленькую. Яна і сама, як ішла да

нас, ледзь перастаўляла ногі. Таксама, напэўна, была галодная. Агледзела яна маці, паслухала і сумна ўздыхнула. Сказала, што яе трэба было б пакласці ў бальніцу, але ў бальніцы зараз няма месц, нават у калідорах хворыя ляжаць, трэба перачакаць. І яшчэ сказала, каб бацька пастараўся наконт цяпла ў хаце. Бо хворай патрэбна цяпло, шмат цяпла.

Я збегаў у аптэку, купіў па рэцэпту лякарства. І з таго дня перастаў хадзіць у школу.

А маразы ўсё мацнелі. І наша вядро пад раніцу пакрывалася лёдам; і каб зачэрпнуць вады, трэба было спачатку прабіць дзірку.

Заходзілі суседкі. Ахкалі, вохкалі, давалі розныя парады. Ды ад тых парад цяплей у нас не рабілася. Праўда, адна старэнькая бабуля прыцягла нейкую зашмальцаваную хламідзіну і паклала на маці паверсе таго рыззя, што ўжо ляжала на ёй.

— Во цяпер будзе табе цёпленька, мая ты галубанька, цяпер будзе цёпленька,— шамкала яна бяззубым ротам, ухутваючы маці.— І ты адразачку паправішся, во і паправішся, і пабяжыш сабе, куды трэба і не трэба.

— Каб жа ў нас дубальтовая рама была...— уздыхаў бацька,— мы б і гора не ведалі...

Нехта — не помню ўжо хто — параіў бацьку звярнуцца да нейкага Шульгі, і нават сам падахвоціўся перагаварыць з тым Шульгой. Маўляў, Шульга не тое што аконную раму, а што хочаш дастаць можа, нават птушынага малака.

Назаўтра, калі бацька быў на рабоце, а я ўжо другую гадзіну марна стараўся распаліць нашу грубку, да нас сапраўды завітаў невысокі тоўсценькі мужчына ў доўгім скураным паліто з настаўленым каўняром і ў белых пягнуткіх валёнках, усунутых у чырвоныя галёшы з аўтамабільных камер. Увайшоўшы без стуку — а можа, заняты сваёй акаяннай справай, я не пачуў яго стуку,— чалавек пацягнуў носам, паморшчыўся і сіпатым голасам сказаў:

— Гэта вы, значыць, будзеце Макавейчыкі, га?

Я адразу здагадаўся, што незнаёмы і ёсць той самы ўсемагутны Шульга, які не тое што аконную раму, а нават ніколі не пітае мною птушынае малако дастаць можа.

— Ага,— пачціва адказаў я,— мы Макавейчыкі якраз і ёсць.

— Халаднавата ў вас, халаднавата,— зазначыў Шульга.— Можна сказаць, проста сабачы холад, ядрона корань.

— Ага, сабачы,— пагадзіўся я.— От каб нам займець дубальтовую раму, мы б і гора не ведалі. А то што ж!..

— Будзе вам дубальтовая рама, будзе! — весела заявіў Шульга і пацёр рукі адна аб адну.

— Мы вам век дзякаваць будзем, таварышок...— слаба азвалася з ложка маці.— Малое ў нас...— І яна натужліва закашлялася.

— Шульга не трапач. Шульга сказаў — будзе, значыць — будзе, ядрона корань.

Ён пахукаў на рукі, зноў пацёр імі адна аб адну.

— Начальства цяперака якое? Начальства цяперака глядзіць, абы самому цёпла ды сытна было. А на трудзяшчага чалавека яму напляваць з высокай званіцы. А Шульга чалавек не такі, не. Між іншым,— зноў звярнуўся да мяне Шульга,— гэта праўдачка, што твой паха́н робіць на хлебазаводзе?

— Ага, на хлебазаводзе,— сказаў я і пракаўтнуў слінкі.

— Парадачак, ядрона корань. Шульга не трапач. Вось я зараз зраблю мерачку, і будзь здароў. Заўтра рамачка загрыміць да вас як піць даць.

— Нават заўтра?..— аж захлынуўся я ад шчасця.— Дзядзечка, няўжо заўтра?..

— Адклад не ідзе ў лад, гэта яшчэ сам Леў Талстой сказаў. Хоць і з граф'ёў быў, а трудзяшчаму чалавеку, кажуць, дужа спачуваў, не тое што некаторыя цяперашнія. Дык я з вашага дазволу зраблю мерачку, каб усё было чып чыпам.

Ён выняў з кішэні тоненькую вяровачку і сапраўды пачаў абмерваць акно. І ўшыркі памераў, і ўдаўжкі, і вузельчыкі завязаў па вяровачцы.

— Паха́н калі прыходзіць з работы, позна? — спытаў Шульга ўжо ля дзвярэй.

— Калі ў восем, а калі і ў дзевяць.

— Няхай заўтра раней прыйдзе, няхай адпросіцца. Я ў сем буду.

— Ён адпросіцца, вы не сумнявайцеся,— запэўніў я Шульгу.— Ён абавязкова адпросіцца, вы прыходзьце!

Я праводзіў Шульгу аж на вуліцу, праводзіў нават не адзеты — мне раптам зрабілася цёпла ад адных ягоных слоў. І калі вярнуўся ў наш пакойчык, мне таксама здалося, што і ў ім стала цяплей. Я лашчыўся да мамы, гаварыў ёй, што ў нас цяпер заўжды будзе цёпла, што яна хутка

направіцца і ўсё будзе добра. Я гаварыў, што і Зінчыку цяпер будзе цёпла, яе не трэба будзе больш укручваць у чорт ведае якія анучы, яна зможа свабодна дрыгаць ножкамі, колькі ёй захочацца.

Гэтае ж самае я гаварыў вечарам і бацьку. І ён на другі дзень сапраўды адпрасіўся з работы і прыйшоў дамоў нават не ў сем, а ў палове сёмай.

Шульга чамусьці крыху затрымаўся, і мы пачалі ўжо былі хвалявацца, аднак у пачатку восьмай ён усё ж з'явіўся. І — дзіва — з аконнай рамай, самай сапраўднай, якую ён урачыста нёс перад сабою. І хоць яна была загорнута ў рагожу і яе не было відаць, я адразу зразумеў, што гэта яна і ёсць, наша рама, наша збавіцелька.

— Шульга не трапач, ядрона корань,— сказаў гэты незвычайны чалавек, разгортваючы рагожу.— Глядзіце, прымайце, цаніце!

Рама была новенькая, нават яшчэ не пафарбаваная, з усімі чатырма шыбамі. Шыбы адразу запацелі, і я, схапіўшы ручнік, пачаў старанна выціраць іх.

— Добрая рамачка, га? — сам любуючыся рамай, гаварыў тым часам Шульга.— Нібы сабе зроблена, навечна. Ды ёй зносу не будзе, ядрона корань! А што непафарбаваная — ерунда. Летам пафарбуеце, я вам тады і фарбы дастану, нават цынкавых бялілаў, калі захочаце. А то цяпер пакуль пафарбуеш ды пакуль сохнуць будзе... Як той казаў, куй жалеза, покі гарачае!

— Нічога, нічога, абыдзецца і так,— расчулена гаварыў бацька, пяшчотна дакранаючыся да рамы рукою.— Пафарбуем і пасля, а пакуль і так пастаіць.

— Пастаіць, яшчэ і як пастаіць! — у тон бацьку гаварыў Шульга і таксама пяшчотна вадзіў рукамі па раме. Выціраючы шыбы, я з захапленнем пазіраў на Шульгу. У маім уяўленні ён быў самым добрым, самым чулым чалавекам на свеце. І гэта проста шчасце, думаў я, што ён іспуе, бо без яго мы проста прапалі б.

— Ды не руш ты яе! — адштурхнуў мяне бацька ад рамы.— А то яшчэ незнарок паб'еш шыбы, акаянны! Давай вунь лепш пазбівай лёд з падаконніка.

— Давай, давай, праўда,— сказаў Шульга.— А мы яе зараз возьмем і прыладзім. Возьмем, ядрона корань, і прыладзім нашу рамачку, я нават і гваздочкі захапіў, і будзеце вы адгэтуль пачуваць сабе як у бога за пазухай. Але...— Ён раптам шматзначна падняў указальны палец угору.—

Але, як той казаў, дружба дружбай, а табачок урозь. Давай спярша, міл чалавек, дамовімся аб аплаце.

— Вядома, вядома, а як жа,— паспешліва сказаў бацька.—Я заплачу, а як жа. Колькі скажаце, столькі і заплачу. Хоць і небагата я палучаю, вы ж самі ведаеце, якія ў мяне могуць быць грошы, аднак калі трэба, то трэба. Не хопіць сваіх, то я ў суседзяў пазычу. Разлічуся да капеечкі, вы не турбуйцеся...

— А хто турбуецца, міл чалавек, ніхто і не турбуецца...

— Колькі з мяне будзе?

— Мне многа не трэба. Навошта мне лупіць лішняе са свайго брата-трудзягі? Лішняга я не вазьму. Калі гаварыць без запросу... адных два боханы хлеба, і ўдарым па руках.

— Хлеба?..— перапытаў бацька.— Два боханы?..

Рука яго саслізнула з рамы, і тая ледзь не бразнулася на падлогу, ды Шульга ў час падхапіў яе.

— А што, думаеце — многа? Ані не многа, дальбог не многа.

— Але дзе ж я вазьму гэтулькі хлеба?.. На картачкі, самі ведаеце, колькі даюць...

— Гы, па картачкі...— паморшчыўся Шульга.— Не дурыце мне галавы, міл чалавек. Хіба я не ведаю, дзе вы працуеце?

— Але, я працую на хлебазаводзе. Аднак жа...

— Што — аднак жа? — ужо раздражнёна пачаў гаварыць Шульга.— Можа, вы скажаце, што спажываеце толькі той хлеб, які вам даюць у магазіне па картачках? Чорта з два, так я вам і паверыў. Не стройце з сябе анёла, мы ж свае людзі.

— Вы... вы нешта не тое гаворыце...— разгублена прамовіў бацька.

Прачнуўшыся, заплакала Зінчык. Я кінуўся супакойваць яе.

— Не тое? Як сабе хочаце,— гаварыў далей Шульга.— Я дзеля вас жа стараўся. Дзеля вашай хворай жонкі... і гэтага малога, што таксама можа захварэць. Не хочаце мець дубальтовую раму, дык і не трэба. Замярзайце сабе на здароўечка, дубейце, а я тут ні пры чым.

— Ды дзе ж я вам вазьму гэтулькі хлеба? Не красці ж мне яго!

— А я дзе ўзяў гэтую праклятую раму? Гасподзь бог мне яе паслаў, ці што? А можа, Леў Талстой? Дык жа ён

хоць і дбаў пра трудзяшчы народ, але свае рамы, кажуць, не дужа раздаваў, гы-гы-гы...

Бацька маўчаў і на вачах чарнеў.

— Тожа мне пакупацель...— бурчаў Шульга.— Мы на свой тавар заўсёды знойдзем ахвотніка. Строіць з сябе немаведама каго.

Заходзілася плачам Зінчык... Цяжка, з хрыпам, дыхала маці...

— А ну,— сказаў бацька,— загортвай назад сваё паскудства!

— І загарну, а што ты думаеш,— Шульга пачаў завіхацца з рагожай.— Дужа мне патрэбен гэткі гандаль.

— А цяпер хадзем! — устаючы з табурэткі, глуха сказаў бацька; ён, як прыйшоў з работы, яшчэ не распранаўся.— Хадзем. Бяры сваё паскудства і пойдзем.

Шульга насцярожана зірнуў на бацьку. Сказаў з напускной абыякавасцю:

— І пайду, а што ты думаеш. Дзякаваць богу, дарогу я тут добра ведаю.

— Можа, ты яе ўсё ж не вельмі ведаеш, дык я пакажу. Хадзем.

— Я сам пайду, навошта ты мне. Я цябе не знаю, і ты мяне не знаеш.

— Мы разам пойдзем.— Бацька паклаў сваю руку на ягонае плячо. Я ведаў, якая ў бацькі важкая і дужая рука...— Бяры сваю раму. Ну!

— Куды?.. —угнуўшыся, прамовіў Шульга.

— Туды, дзе разбяруцца, скуль у цябе гэтая рама. Адчыняй дзверы!

Вярнуўся бацька гадзіны праз паўтары. Вярнуўся адзін, без Шульгі і без рамы. У нас быў проста нязносны холад. Бацька ўзяў сякеру і моўчкі стаў сячы наш адзіны стол. Пашчапаныя дошкі гарэлі потым у грубцы зырка і весела. Праўда, вячэраць нам давялося, трымаючы міскі і кубкі проста ў руках. Затое ноччу было цёпла, амаль да самае раніцы. Удзень, вядома, зноў усё выдзьмула...

А праз тыдзень мама памерла...

Тую зіму я болей не хадзіў у школу.

А маразы стаялі — нават і цяпер успомніць страшна. Кожнае ночы вада ў нашым вядры пакрывалася лёдам. Вядома, дзе ж тое цяпло брацца будзе без дубальтовай рамы. Днём я саграваў Зінчыка сваім цяплом, а ноччу нас абаіх

саграваў сваім целам бацька. Так і зімавалі мы ў нашай каморы...

— ...Адыдзіся ад акна, а то прастудзішся,— сказала Зінчык.— Ды і наогул можна ўжо зачыніць фортку.

Я падышоў да бацькі, абняў яго і прытуліўся шчакою да ягонай маршчыністай шурпатай шчакі.

— Горка-а-а! — закрычаў Карп Іванавіч.

І я пацалаваў бацьку. Ён слабенька правёў па маёй шчацэ сваёй рукою — некалі такой важкай і дужай.

— Горка-а-а! — яшчэ раз сказаў Карп Іванавіч і ікнуў. Таццяна Пятроўна адабрала ў яго чарку і нечакана выпіла яе сама.

Вяселле ішло сваім парадкам.

*1965*

# САРТАВАЛЬНАЯ ГОРКА

Першым выявіў гэта счэпшчык Федзя Цімафееў. Увайшоўшы ў дзяжурку, дзе сабралася перад зменай уся саставіцельская брыгада, ён з абурэннем сказаў:

— Бачылі? Віталя Шчупака нехта ўкраў!

— Як украў?.. Дзе?.. — пачуліся галасы.

— А вось так, выкралі нашага саставіцеля, і ўсё тут. Быў Віталь — і няма Віталя.

У пакоі стала ціха-ціха. Паведамленне Федзі Цімафеева было да таго неверагоднае, што ўсе разгубіліся. Хутчэй за ўсё — думалі многія — гэта быў жарт, бо Федзя лічыўся ў брыгадзе чалавекам, у якога заўсёды свярбіць язык. Але цяпер ён гаварыў сур'ёзна, і выгляд у яго быў надзьмуты. Таму, уражаныя Федзевымі словамі, сказанымі ў такім катэгарычным тоне, усе здзіўлена маўчалі, зусім забыўшыся на тое, што Віталь Шчупак у гэтую хвіліну сядзіць тут жа, у дзяжурцы...

. — Цікава ведаць, хто гэта мог зрабіць? — пытаўся далей Федзя Цімафееў, чухаючы патыліцу. Вочы яго, звычайна вострыя і смяшлівыя, пацямнелі і пасуровелі, бровы насупіліся.— Гэта проста хуліганства, вось што я вам скажу!

Маўчанне зацягвалася. Пятнаццаць ці мо дваццаць чалавек, што знаходзіліся ў гэты ранішні час у дзяжурцы, збянтэжана пазіралі на Федзю і ўсё яшчэ не ведалі, як успрымаць яго словы.

— Што ты чаўпеш?! — прамовіў нарэшце сам Віталь Шчупак. Ён усхапіўся з табурэткі і пагрозліва ступіў да Федзі.— Хто мяне ўкраў?

У дзяжурцы грымнуў смех. Толькі цяпер, пачуўшы голас Шчупака, чыгуначнікі апамяталіся.

— А-а, ты тут...— Федзя працягнуў руку брыгадзіру.— Хіба ты нічога не ведаеш?

— Хто мяне ўкраў? — не беручы рукі счэпшчыка, паўтарыў Віталь і яшчэ больш грозна паглядзеў на Федзю.

— Напэўна, хуліган нейкі, хто ж яшчэ мог зрабіць такое. Проста жывасілам выдраў цябе.

Чыгуначнікі аж упокат клаліся. Не стрымаўшыся, засмяяўся і Віталь Шчупак. Яго каштанавы чуб, які заўсёды тарчаў з-пад заламанай набакір шапкі і якім Віталь дужа ганарыўся, затросся і эфектна рассыпаўся на лбе славутага саставіцеля.

— Рагачы, рагачы,— злосна сказаў тады Федзя і бліснуў вачыма.— Можа, табе і напляваць на тое, як абыходзяцца з тваёй фізіяноміяй, але я на тваім месцы паставіўся б да гэтага інакш.

Тут усе зразумелі, што Федзя не жартуе, што ён і сапраўды чымсьці абураны. Смех адразу ацiх. Усе насцярожыліся.

— Ды кажы ты толкам, што здарылася? Не тамі! — узмаліўся Шчупак.

— А хіба я кажу не толкам? Я ж табе чалавечай мовай, а не якой іншай, тлумачу: сцібрылі тваю фізіяномію. Проста жывасілам выдралі!

— З дошкі Гонару? — здагадаўся нарэшце Віталь і пабялеў з твару.

— Учора сам бачыў — была. А сёння іду міма, зірнуў — няма. Я нават вачам спярша не паверыў. Галюцынацыя, думаю, падман зроку. Ажно бачу, і сапраўды няма. І вось што я табе скажу: тут справа не абышлася без рук альшанаўскай брыгады.

І тады загаварылі ўсе адразу. У брыгадзе любілі свайго важака, і здарэнне гэтае палічылі за асабістую крыўду. Кожнаму хацелася выказаць сваю думку, і ў пакоі ўзняўся страшэнны гоман.

— Гэта агіднасць! Гэта нахабства! — крычаў башмачнік Сцяпан Стукаў.

Яму энергічна падтакваў стрэлачнік Пятро Гуляеў:

— Але, але! Нахабства! Але, але!

Абураліся і гневаліся ўсе члены брыгады. Маўчала, здаецца, адна толькі стрэлачніца Люся Шапавалава — ціхая, непрыкметная дзяўчына з кірпатым носікам і з шэрымі лятуценнымі вачыма. Сціплая, сарамлівая, яна заўсёды трымалася ў баку ад усіх.

Думка Федзі Цімафеева пра тое, што дзіўная прапажа фотакарткі з дошкі Гонару не абышлася без удзелу каго-небудзь з брыгады Сяргея Альшанава, была небеспадстаўная. Брыгады саставіцеляў паяздоў Шчупака і Альшанава даўно спаборнічаюць паміж сабой, і ў апошнія месяцы на першае месца выходзілі шчупакоўцы. Заўтра будуць падводзіцца чарговыя вынікі спаборніцтва, і падобна на тое, што на гэты раз выйдуць наперад альшанаўцы. Нехта з іх, відаць, і паспяшаўся скінуць Віталя Шчупака з дошкі Гонару.

Да пачатку змены заставалася яшчэ паўгадзіны. Віталь Шчупак напраставаў цераз пуці да чырвонага кутка. Яму хацелася самому пераканацца ў тым, што яго фотакарткі і сапраўды няма на дошцы Гонару.

За Шчупаком, амаль не адстаючы ад яго, крочыў Федзя Цімафееў. Следам ішлі астатнія члены брыгады. Самай апошняй была Люся Шапавалава. За тры месяцы, што Люся працуе ў брыгадзе, яна ні з кім не паспела пасябраваць і заўжды прыходзіла на дзяжурства і вярталася дадому адна.

Быў канец ліпеня, стаяла звычайная для гэтай пары гарачыня. У сінім бясхмарным небе зырка палала сонца. І хоць час быў яшчэ ранні, усё вакол паспела ладна нагрэцца. Асабліва распаліліся рэйкі — гэта адчувалася нават праз абутак.

Дошка Гонару знаходзілася на двары каля памяшкання чырвонага кутка. Яна была невялікая памерам, і фотакарткі на ёй таксама былі невялікія — звычайныя паштоўкі. Яшчэ ўчора тут на самай сярэдзіне знаходзіўся партрэт Віталя Шчупака. А цяпер на яго месцы была пустая пляма. Прыпыніўшыся каля дошкі, Віталь з хвіліну моўчкі глядзеў на гэтую пляму, потым павярнуўся ў бок сартавальнай горкі, дзе пачынала дзяжурства брыгада Альшанава.

— Няўжо гэта яны?..

— Напэўна, Пятро Стахоўскі! — аўтарытэтна заявіў Федзя Цімафееў. Потым падумаў і гэтак жа аўтарытэтна сказаў другое: — Або, магчыма, Сашка Бабровіч!

— А можа, сам Альшанаў? — выказаў сваю думку стрэлачнік Гуляеў.

— Наўрад...— Федзя таксама паглядзеў у бок сартавальнай горкі.— Ну, даведацца б мне толькі, хто гэта зрабіў! Я яму паказаў бы, пачым фунт ліха!

— А што яму было б, а? — нечакана спытала Люся Шапавалава і пачырванела.

— Яму?.. Ды я...— Федзя павярнуўся да Люсі і акінуў яе позіркам з галавы да ног.— Ды я яму... ведаеце, што я зрабіў бы? Ды я яго... О, вы проста не можаце ўявіць сабе, што я зрабіў бы!

— А ўсё ж?

— Ну, я... я яму... А ўвогуле, якая вам справа да таго, што б я зрабіў? Будзьце пэўны, цалавацца-мілавацца з ім я не стаў бы!..

Тут да шчупакоўцаў падышла спісчыца вагонаў Тамара Яблонская, пра якую гаварылі, што яна падобна на артыстку Марыну Ладыніну. Усе ў брыгадзе ведалі, што Віталь заляцаецца да Тамары, але ці карыстаецца ён поспехам у яе, пра гэта нічога пэўнага вядома не было. Убачыўшы Тамару, Шчупак міжвольна хутка абцягнуў пінжак.

— Нашаму шаноўнаму саставіцелю далі адстаўку? — з усмешкаю прамовіла Тамара Яблонская.— Яму адмоўлена ў славе?

— Славы нашай вы на чапайце,— сказаў Федзя Цімафееў.— Таварыша Шчупака знялі выпадкова.

— Відаць, не зарабіў, каб заставацца на дошцы Гонару,— уедліва абвясціла Тамара і, не кінуўшы ні на Федзю, ні на Шчупака нават самага нязначнага позірку, паважна пайшла ўздоўж пуцей.

Федзя памкнуўся быў сказаць ёй нешта паўздагон, але перадумаў, чакаючы, што Тамары адкажа сам брыгадзір. Але Шчупак не адказаў нічога, ён толькі крэкнуў і схаваў свой чуб пад шапку.

А праз некалькі хвілін прыйшоў старшыня мясцкома і паздымаў з дошкі ўсе фатаграфіі.

— Будзем мяняць,— растлумачыў ён.— Заўтра павесім новыя. Паглядзім, што пакажуць вынікі спаборніцтва.

Усе ў брыгадзе павесялелі і гатовы былі забыцца на тое, што партрэт іхняга брыгадзіра знік з дошкі раней за астатнія партрэты. Не забываўся на гэта толькі сам Віталь Шчупак. На сэрцы ў яго застаўся нейкі трывожны асадак. Не знікаў гэты асадак і ў час работы, хоць сёння ўсё ішло як быццам бы і добра.

Віталь Шчупак быў віртуозам сваёй справы. Варта было паглядзець на яго ў тыя хвіліны, калі ён фарміраваў ці расфарміроўваў таварныя саставы, што бесперапынна прыбывалі на вузел! Федзя Цімафееў параўнаў аднойчы Шчу-

нака з дырыжорам аркестра. Ён і сапраўды падобен быў на дырыжора. Толькі замест палачкі ў руках у яго сігнальны флажок. Але да гэтага флажка чыгуначнікі на пуцях прыглядаюцца, мабыць, куды больш уважліва, чым музыканты ў аркестры да дырыжорскай прылады.

Вось стаіць ён на міжпуцці — высокі, рукасты, са славутым сваім чубам над ілбом, і пільна глядзіць уперад. Перад ім веерам разыходзяцца пуці, на якія ён павінен расфарміраваць цяжкавагавы састаў, што прыбыў нядаўна з Масквы. Шчупак паварочваецца тварам да манеўровага паравоза і ўзмахвае флажком. Гэты ўзмах заўважылі ўсе — машыніст, стрэлачнікі, счэпшчыкі, башмачнікі. Састаў уздрыгвае і паслухмяна рушыць за паравозам. Міма Шчупака праплываюць цяжкія платформы з кантэйнерамі, вагоны з вугалем, цыстэрны з гаручым, лядоўні з прадуктамі... Віталь уважліва прыглядаецца да кожнага вагона, зчытаючы крэйдавую разметку на сценках. Калі састаў заходзіць за стрэлку, Віталь зноў узмахвае флажком. У адказ чуецца ражок стрэлачніцы і следам за ім гудок паравоза. Счэпшчык ляскае ручкай аўтасчэпкі, машыніст пераводзіць рэверс, і састаў ідзе назад. Але частка вагонаў, што адчапіў счэпшчык, адрываецца ад саставу і з гулам і грукатам коціцца ўперад, бо рэйкі маюць пакат. Там вагоны чакае башмачнік: ён спрытным рухам кладзе на рэйку тармазны башмак, і вагоны спыняюцца.

А саставіцель тым часам зноў узмахнуў флажком, на гэты раз трошкі інакш. Машыніст адразу зразумеў гэты нерасцерагальны сігнал і прытармазіў састаў. Рыпяць тармазныя калодкі. Потым зноў узмах флажка, і паравоз штурхае новую групу вагонаў. Яны накіроўваюцца на другі пуць, куды стрэлачніца паспела перавесці ўжо стрэлкі і куды хутка перабег башмачнік.

Яшчэ і яшчэ пасылае Шчупак уперад адчэпы, і кожны з іх ідзе на свой, загадзя вызначаны, пуць. Адтуль дыспетчару лёгка будзе накіраваць іх у пункты выгрузкі.

Так, сёння ўсё ідзе вельмі добра. Ва ўсякім разе, добра ішло да поўдня, і Віталь збіраўся ўжо быў з радасці нічога дараваць невядомаму падбухторшчыку ранішняй трывогі ягоны незразумелы ўчынак, але раптам машыніст манёўравага паравоза Карпюк, чалавек ужо немаладога веку, сказаў:

— Усё! Паліва скончылася!..

Паравоз даў гудок і прыпыніўся.

Гэта было поўнай нечаканасцю. Шчупак у першы момант настолькі разгубіўся, што нават не знайшоўся што сказаць, і задаў зусім недарэчнае пытанне:

— Чаму скончылася?

— А таму, што ўсё ў свой час канчаецца.

— Дык едзьце на склад, чаго ж вы сталі?!

— Эге, мяне нават і раніцой туды не пусцілі, не тое што цяпер. Трэба было раней, кажуць.

Паравоз стаяў якраз недалёка ад стрэлкі Люсі Шапавалавай. Выслухаўшы гэтую размову, дзяўчына нерашуча спытала:

— Хіба на складзе няма паліва? Там жа яго цэлыя горы.

— Паліва, вядома, ёсць. Але людзям там цяпер не да нас. Яны з паязнымі машынамі ледзь-ледзь упраўляюцца. З маняўрушкай і не суньса, усё адно стаяць будзеш. Кранаў жа на складзе ўсяго толькі два, ды і на тых адны дзяўчаткі працуюць...— Машыніст скоса зірнуў на Люсю і дадаў: — Во такія самыя...

Люся нахмурыла бровы, задумалася. Потым неўзаметку паглядзела на Віталя Шчупака. Твар у яго быў усё яшчэ разгублены.

— А што, каб нам самім паехаць?..— нясмела прамовіла Люся.— Няўжо мы не здолеем накарміць гэтай няшчаснай «авечкі»!

— А і сапраўды! — усклікнуў Шчупак.— Бліскучая ідэя! Што вы на гэта скажаце, таварыш Карнюк?

Машыніст не паспеў адказаць,— Люся хутка гаварыла далей, развіваючы сваю думку і сама радуючыся ёй:

— У нас жа ўсе вунь якія малайцы. Стрэлачнікаў, глядзіце, чатыры. Два застануцца, а два паедуць, праўда? Возьмем яшчэ башмачніка ды счэпшчыка. У момант управімся!

Даведаўшыся пра Люсін план, Федзя Цімафееў з самым сур'ёзным выглядам заявіў:

—А я што вам казаў? Я даўно казаў, што нам абавязкова трэба мець на брыгаду хоць адну разумную галаву.

— Паехалі! — даў каманду тады машыніст.

— На конях! — дадаў Федзя.

Віталь Шчупак хутка дамовіўся з дыспетчарам, каб паравоз прапусцілі на вугальны склад. І там яны самі, без дапамогі крана, за якія паўгадзіны насыпалі поўны тэндар вугалю.

А калі вярталіся назад і Люся крыху адстала, каб па сваёй звычцы прайсціся адной, ёй насустрач папалася спісчыца вагонаў Тамара Яблонская. Тая хацела была прайсці міма, але стрэлачніца прыпыніла яе і з выклікам сказала:

— А гэта яшчэ невядома, ці спраўдзяцца вашы словы наконт таварыша Шчупака.

— Якія словы?

— А тое, што ён не зарабіў, каб заставацца на дошцы Гонару.

Тамара Яблонская перасмыкнула плячыма. Сказала абыякава:

— Вы думаеце, мяне гэта хвалюе? Ані во столечкі!

І, перасмыкнуўшы яшчэ раз плячыма, Тамара пайшла ад Люсі сваёй паважнай роўнай хадою.

«А ўсё ж яна вельмі прыгожая...» — уздыхнуўшы, падумала Люся і пабегла да сваёй стрэлкі.

Там яе чакаў Віталь Шчупак. Люся сумелася.

— Вось вы якая...— прамовіў Віталь і ўсміхнуўся.— А я і не думаў... Вы мяне выручылі, Люся. Дзякую вам.

— Вас выручыла? Я мела на ўвазе брыгаду. Значыцца, і сябе таксама.

— Ну, пэўна. Але хто адказвае за брыгаду? Я. А хіба згадаўся б я паехаць самім на склад? Гэтага ў нас ніколі не было заведзена. І думка такая нават не ўзнікала, хоць праз вугаль прыходзілася-такі сяды-тады стаяць. А вы падказалі. Выходзіць — выручылі ўсё ж мяне, бо іменна брыгадзіру трэба было шукаць выйсця. Таму дзякую яшчэ раз.

— Няма за што. Я нават і сама не ведаю, як гэта мне прыйшло ў галаву...— прызналася Люся.

Віталь Шчупак зноў усталяваўся на міжпуцці — высокі, рукасты, з раскошным чубам над ілбом. І, паслухмяныя яго волі, зноў пабеглі па рэйках вагоны — кожны на сваё, загадзя вызначанае месца. І да самага канца дзяжурства несціхана гучалі ў паветры гудкі паравоза, спявалі ражкі стрэлачнікаў, рыпелі тармазныя башмакі.

Сонца зайшло якраз у тую хвіліну, калі шчупакоўцы расфарміравалі трэці за дзень звышпланавы састаў.

З дзяжуркі выйшла новая брыгада. Месца Віталя Шчупака заняў яго зменшчык.

Шчупакоўцы накіраваліся ў дзяжурку, на планёрку. Люся, як і звычайна, ішла апошняй. Неўзабаве яна заўва-

жыла, што Федзя Цімафееў пачаў адставаць, а потым і зусім прыпыніўся. Калі дзяўчына параўнялася з ім, Федзя сказаў:

— Даю галаву на адсячэнне, што мы наставілі сёння нос альшанаўцам. Як вы думаеце?

— Заўтра будзе відаць.

— Дарэчы, я даўно хацеў спытаць...— гаварыў далей Федзя.— Чаму гэта вы пасля дзесяцігодкі падаліся ў стрэлачніцы? Конкурсу ў інстытут не вытрымалі?

— Не, на конкурс я і не падавала.

— Надумалі, што стрэлачніцай быць лепей, чым інжынерам?

— Не, надумала, што спачатку трэба пабыць стрэлачніцай, а потым ужо ў інстытут падавацца. Бо які ж з мяне інжынер будзе, калі я не ўведаю, як стрэлкі пераводзяцца.— Люся стрымана ўсміхнулася.— А пасля інстытута нялоўка было б ісці ў стрэлачніцы.

— Слушна...— згадзіўся Федзя.

Заўважыўшы ў Люсіных руках кнігу, ён спытаў:

— А што вы чытаеце? Дазвольце паглядзець?

Федзя дакрануўся да кнігі, але Люся нечакана рэзка схавала руку за спіну. У гэты момант кніга выслізнула з рукі і ўпала на зямлю. З кнігі нешта вывалілася.

Яны адначасова нагнуліся над кнігай. Але Федзя паспеў першы ўзяць тое, што вывалілася з яе. Гэта быў белы кардонны чатырохвугольнік памерам у звычайную паштоўку.

— Аддайце! — крыкнула Люся, вырываючы ў яго з рук кардонку.

На адваротным баку кардонкі Федзя ўбачыў фатаграфічны партрэт, на якім перш за ўсё кідаўся ў вочы раскошны мужчынскі чуб.

— Даруйце...— вінавата сказаў Федзя і накрыў партрэт кнігай.

Дзяжурка была ўжо блізка. Нейкі час Федзя і Люся ішлі моўчкі. Потым, невядома чаго, Федзя паспешліва пачаў расказваць, што ў горад прыязджае балгарская эстрада, затым паведаміў, што ў яго ёсць сястра, якую таксама завуць Люся.

Каля ўвахода ў дзяжурку стаяў Віталь Шчупак.

— Вось што, таварыш брыгадзір,— сказаў Федзя, калі яны з Люсяй падышлі да Шчупака,— мне трэба паведаміць табе адну навіну.

— Цікавую?

Люся адвярнулася і пачала ўважліва разглядаць свае басаножкі...

— У нас сёння на які сеанс білеты? На дзесяць трыццаць? Ну дык вось, я не здолею пайсці. Я і забыўся, што ў мяне адна тэрміновая справа ёсць. Білеты, здаецца, у мяне? Ага, вось яны. На, вазьмі. А каб мой білет не прапаў, я дамовіўся з Люсяй, яна можа пайсці, у яе якраз свабодны вечар.

— Федзя, што вы...— здзіўлена пачала Люся. Але Федзя не даў ёй дагаварыць.

— Віталь, ты не будзеш пярэчыць? Нашай стрэлачніцы дужа хочацца паглядзець гэты фільм.

Віталь Шчупак не зводзіў вачэй з Люсі. І Федзя мог бы паклясціся, што яго брыгадзір раптам убачыў на твары стрэлачніцы тое, чаго раней ніколі не заўважаў: дзве чароўныя ямачкі на шчаках і вялікія трапяткія вейкі над пышнымі бровамі.

*1955*

# СЕМСОТ ДВАЦЦАТЫ КІЛАМЕТР

Паабапал чыгункі тырчаў рэдкі жухлы хмызняк, толькі сям-там у неба шугалі велічныя ў сваёй адзіноце гонкія сосны. Было бязветрана, і навокал панаваў спакой.

Мінуўшы закругленне, поезд выйшаў на гладкую мясціну і пачаў імкліва набіраць хуткасць. І хоць было ў ім тон на трыста болей, чым належала па норме, і хоць састаў быў з гэтай прычыны незвычайна доўгі, Аляксей Гарачун вёў яго дакладна па графіку. На папярэдняй станцыі тэндэр паравоза напоўнілі вадою і вугалем, і цяпер у топцы заўзята бушавала полымя, хутка падымаючы ціск пары ў катле. Стрэлка манометра пасоўвалася ўправа, набліжаючыся да чырвонай рыскі.

— Пад'ём праскочым як мае быць! — прамовіў памочнік машыніста Васіль Малюк і зірнуў на Гарачуна. Позірк яго, здавалася, гаварыў: «Ну як,— ухваляеш? Вунь колькі пары я нагнаў!»

Аляксей нічога не адказаў памочніку. Ён пільна глядзеў наперад, туды, дзе бліскучыя стужкі рэек, дасягнуўшы гарызонта, упіраліся ў неба. Нішто не затрымлівала ўвагі машыніста, але ён не пакідаў глядзець удалячынь.

Агніста-чырвонае сонца хутка кацілася за небасхіл. А на поўначы раптам пачала гэтак жа хутка расці бурашэрая хмара. Яна ўздымалася ўсё вышэй і вышэй і неўзабаве заняла сабою ледзь не палову неба. Гарачыня стала спадаць. Прыкметна пахаладзела паветра, і Гарачун ахвотна падстаўляў твар пад яго струмені.

Аляксея Гарачуна, чалавека сярэдніх год, з тонкімі правільнымі рысамі твару, з глыбока запалымі шэрымі вачыма і з вялікімі залысінамі на высокім ілбе, лічылі ў Са-

рынскім дэпо асобай з «цяжкім» характарам. Маўклівы, панура, ён чамусьці стараўся быць як мага менш на людзях, праводзячы ўвесь свой вольны час у садочку, што рос каля яго невялічкага доміка ў чыгуначным пасёлку. Праўда, маўклівасць і замкнёнасць Гарачуна нікога асабліва не турбавала, бо машыністам ён быў вопытным, справу сваю ведаў дасканала і за ўсе восем гадоў работы ў дэпо не толькі не дапусціў ніводнай аварыі, але нават і спазненняў у дарозе не меў. І хоць асаблівых подзвігаў або гучных рэкордаў ніхто ад яго не чакаў, але адно ўсе ведалі цвёрда: што да графіка руху, дык Гарачун не парушыць яго нават і ў тым выпадку, калі б на галаву яму раптам пасыпалася каменне з неба.

— А ўчора не абышлося-такі без здарэння,— зноў пачаў гаварыць Малюк.— Машыніст Плешавеня парваў састаў.

— На семсот дваццатым? — хутка спытаў Гарачун.

— На семсот дваццатым, дзе ж яшчэ. Ажно на дзве гадзіны быў спынены рух на ўчастку. Пакуль выцягвалі па частках вагоны, ды пакуль...

Не дагаварыўшы сваёй думкі, памочнік раптам выгукнуў:

— Уваходны зялёны!

— Бачу зялёны! — паўтарыў звычайную фразу Аляксей Гарачун і даў працяглы гудок.

Раз'езд Белы Кут поезд мінуў, не прыпыняючыся і не зніжаючы хуткасці. Гайдануўшы злёгку на выхадных стрэлках, паравоз гэтак жа імкліва паляцеў далей, лёгка цягнучы за сабою састаў.

Цяпер на небе была ўжо не адна хмара, іх з'явілася шмат. Запаланёнае імі неба стала медна-чырвоным, падобным на нутро распаленай паравознай топкі.

Прамільгнуў чарговы кіламетровы слупік. На ім стаяла лічба 708.

— Навальніца будзе,— зазначыў Васіль.— Але, можа, паспеем праскочыць семсот дваццаты, трасца яму ў бок,— дадаў ён, з трывогаю зірнуўшы на машыніста.

Пра гэта самае — «Можа, праскочым!» — думаў у гэту хвіліну і Гарачун. Наперадзе быў славуты семсот дваццаты кіламетр — граза машыністаў Сарынскага дэпо. Там знаходзіўся доўгі пад'ём, адольваць які было заўсёды вельмі цяжка. Толькі абсалютна спраўная, старанна дагледжаная машына, кіруемая вопытным і уважлівым машы-

пістам, магла ўсцягнуць на гэты пад'ём поезд. Таму маладыя машыністы доўгі час ездзілі на гэтым участку з інструктарамі. Але і тады, калі яны набывалі ўжо вопыт і пачыналі вадзіць паязды самастойна, кожны раз на семсот дваццатым кіламетры ў іх зноў і зноў пачынала моцна калаціцца сэрца, а на лбе выступалі буйныя пацеркі поту...

Але за апошні час непрыемных выпадкаў на семсот дваццатым кіламетры ўжо амаль не здаралася. Машыністы навучыліся папярэджваць нечаканыя прыпынкі на пад'ёме, а прыпыняцца там па добрай ахвоце магло прыйсці ў галаву хіба толькі вар'яту, таму пра разрывы паяздоў тут даўно ўжо не было чуваць.

Ды ўчора семсот дваццаты зноў напомніў аб сабе.

— Як жа яно здарылася ў Плешавені? — спытаў Гарачун, не адводзячы позірку ад глядзельнага шкла.

— Цяжкавагавы быў у яго. Відаць, не разлічыў... Цяпер перавядуць у памочнікі. А мо нават і ў слесары...— з сумам закончыў Васіль.

Сонца сплыло за край неба. Злавеснае агніста-чырвонае зарыва знікла, і тады адразу пачаў гусцець прыцемак. Узняўся вецер. Ён наляцеў раптоўна, і вось ужо залётала, закружылася ў паветры лісце, на насыпе ўзвіхурыўся пыл.

— Пачынаецца, трасца яму ў бок! — злосна сказаў Малюк, насоўваючы на лоб шапку. Праз хвіліну, высунуўшыся з акна, ён гучна крыкнуў: — Мінулі семсот чатырнаццаты!

— Падкінь, Васіль, вугалю ў топку! — загадаў Гарачун. І дадаў, назіраючы за работай памочніка: — Раўней, раўней кідай, не загружай у адно месца.

Поезд ішоў усё з той жа высокай хуткасцю.

І раптам зырка бліснула маланка. Потым гэтак жа нечакана са страшэннай сілаю ўдарыў гром. Здавалася, усё вакол задрыжала, і нават сама зямля скаланулася. Гарачуну на нейкі міг уявілася, што паравоз адарваўся ад рэек і павіс у паветры...

За першай маланкай бліснула другая, за ёю трэцяя. І раз за разам біў і біў гром.

З тэндэра кулём скаціўся ў будку качагар Юрка Лунец.

— Ух!..— гучна выдыхнуў ён.— От смаліць, дык смаліць! Нават страшна, далібог!

Відаць, Юрка і сапраўды напалохаўся. Ён быў самы

малады ў брыгадзе, і такая паездка ў павальніцу была яму ўпершыню. Шапкі на галаве ў яго не аказалася,— напэўна, яе змахнула ветрам — і пасмы чорных нераблытаных валасоў павіслі на самыя вочы. Рот быў разяўлены, губы ўздрыгвалі.

— Назад! — не паварочваючыся, коратка сказаў Гарачун.— Вугаль!

Качагар з неахвотай падаўся з будкі. На падлогу паляцелі кавалкі вугалю. Васіль Малюк зноў адчыніў топку і з нейкай упартай метадычнасцю пачаў кідаць у яе непажэрнае чэрава паліва. Заняўшы потым сваё ранейшае месца ля левага крыла, ён праз момант крыкнуў:

— Семсот васемнаццаты!

Аляксей Гарачун і сам ведаў гэта. Нават і не глядзячы на кіламетровыя ўказальнікі, ён беспамылкова вызначыў, дзе знаходзіцца ў гэтую хвіліну поезд, бо паравоз стаў раптам паводзіць сябе крыху інакш, чым дагэтуль. Машына пачала нібыта задыхацца, яна наступова, але прыкметна прыцішвала свой бег. А ўсё праз тое, што іменна адсюль, ад указальніка семсот васемнаццатага кіламетра, пачынаўся той самы славуты пад'ём, які праз два кіламетры, на семсот дваццатым, дасягаў сваёй грознай вяршыні.

Машыніст пасунуў рэгулятар уперад. Паравоз уздрыгнуў і некаторы час ішоў у ранейшым тэмпе, пасля ізноў пачаў выбівацца з яго. І зноў машыніст пасунуў рэгулятар уперад...

Удары грому рабіліся ўсё мацней. У паветры яшчэ стаяла рэха папярэдняга ўдару, а ўжо раздаваўся новы. Неба раўло, ракатала, стагнала. У зыркіх успышках маланак то выхопліваліся з цемры пахмурныя дрыгатлівыя сосны, то пачыналі дзіўна ззяць блакітнымі адценнямі сенажаці.

У святле чарговай маланкі Гарачун убачыў на насыпе, каля броўкі, постаць чалавека. Машыніст адразу пазнаў яго — гэта быў пуцявы абходчык Казімір Пятровіч Буцько, што жыў недалёка адсюль, амаль на самай вяршыні пад'ёму,— там каля насыпу стаяў яго невялічкі чысценькі домік з палісаднікам. Стары пуцявы абходчык і ў непагадзь быў на пасту — ён рабіў чарговы абход свайго ўчастка. Гарачун ветліва памахаў яму рукою і ўбачыў, што Казімір Пятровіч гэтак жа ветліва прыўзняў угору свой флажок.

Поезд ішоў усё павольней і павольней. Радзей і радзей чуліся выхлапы пары. Часамі Гарачупу пачынала здавацца, што паравоз ужо спыніўся і толькі круцяцца на адным месцы... Але машына ўсё ж цягнула састаў,— марудна, але цягнула. Ды толькі сілы ў яе было зусім ужо мала. Стрэлка манометра пяўхільна паўзла ўніз...

Зноў ударыў гром, і адразу ж бліснула маланка, і тое, і другое было настолькі моцнае, што Гарачуп міжвольна заплюшчыў вочы. А калі праз момант расплюшчыў іх, дык убачыў, што наперадзе, зусім блізка, раптам ускінуўся ўгору слуп полымя. Там, куды ўдарыла маланка, нешта загарэлася.

«Ці не дом пуцявога абходчыка?» — мільганула думка. І ў наступнае імгненне страшную здагадку пацвердзіў Васіль Малюк.

— Дом Буцько гарыць! — нема крыкнуў ён.

Качагар Юрка Лунец, які здолеў перамагчы ўжо свой нядаўні страх, высунуўся з дзвярэй і таксама закрычаў:

— Але, але, гарыць... Толькі, здаецца, гэта трошкі далей...

Паравоз соп, пыхцеў і скрыгатаў, метр за метрам адольваючы пад'ём. Вось ён параўняўся нарэшце з домам пуцявога абходчыка. І тады паравознікі ўбачылі, што гарыць не сам домік, а павець, якая стаяла крышку воддаль. Але вецер дзьмуў у напрамку дома, і полымя з хвіліны на хвіліну магло перакінуцца і на яго.

Вакол не было ні душы. Гаспадар знаходзіўся даволі далёка, і пакуль ён прыбяжыць, агонь, напэўна, пачне лізаць дах і сцены жылля. А хоць і прыбяжыць Буцько,— што ён можа зрабіць адзін?..

— Падрыхтаваць шланг! — выгукнуў Гарачуп і левай рукой хутка перавёў рэгулятар назад; амаль адначасова яго правая рука ўключыла тармазны кран.

Не прайшло і секунды, як поезд спыніўся.

— Што ты робіш? — разгублена ўсклікнуў Васіль.

— Шланг! — рэзка паўтарыў Аляксей і саскочыў на зямлю. Схапіўшы брызентавы пажарны рукаў, які падаў яму з будкі Васіль, Аляксей ступіў да палаючай павеці.— Уключай помпу! — не паварочваючыся, загадаў ён памочніку.

З брандспойта вырваўся моцны струмень вады. Гарачуп накіраваў яго проста ў агонь. За дымам і парою нешта зашыпела, засычала, затрашчала. Машыніст біў і біў

струменем у агонь, і той з кожнай секундай усё меншаў і меншаў. Неўзабаве побач з Гарачуном апынуўся Юрка Лунец з вогнетушыцелем. Потым падбеглі галоўны кандуктар і паязны майстар.

— Усё! — канстатаваў праз некалькі хвілін Юрка.— Канец!

І толькі тады прыбег Казімір Пятровіч. Ён задыхаўся, абвялікая чорная барада яго зліплася ад поту. Пуцявы абходчык моўчкі кінуўся да машыніста і моцна абняў яго.

— А дзе вашы? — спытаў машыніст.— Нешта не відаць нікога.

— У горадзе...— перарывістым ад хвалявання голасам прамовіў Буцько.— У госці паехалі... жонка і дачка... Якраз дарэчы...— Ён сумна паглядзеў на пажарышча, потым перавёў позірк на паравоз, на вагоны.— А вы... як жа вы цяпер?..

— А мы... што ж мы! Мы паедзем! — прыўзняўшы голас, сказаў Гарачун. І ва ўсіх склалася ўражанне, што машыніст проста падбадзёрвае сябе, бо становішча яго было не з лёгкіх.

— А як жа, паедзем...— прабурчаў Васіль Малюк і пачаў скручваць пажарны рукаў.— Цяперака мы тут да скончэння свету прыпухаць будзем. Калі, вядома, тармазы вытрымаюць. А не вытрымаюць — паляцім да самога д'ябла ў пашчу. Загрымім так, што толькі трымайся!..

Аляксей Гарачун задуменна паглядзеў уздоўж саставу. Канец яго губляўся недзе ў цемры... Цяжка, з надрывам, уздыхаў паравоз. З гучнымі выхлапамі працавала помпа. Гула топка, на шпалах пад паддувалам зявесна трымцелі зарніцы... Маланка цяпер успыхвала радзей, паступова аддаляўся і гул грому. Затое неба, абложанае скрозь хмарамі, навісала ўсё ніжэй і ніжэй... І ўсё мацнеў вецер,— ён дзьмуў ужо не парывамі, а амаль безупынна.

— Д'ябла мы падманім,— сказаў Гарачун.— На свае месцы!

Ён першы ўскочыў у паравозную будку. За ім кінуўся Юрка. Потым з незадаволеным выглядам узабраўся на прыступках зусім засмутканы Малюк.

Машыніст паглядзеў на манометр — ціск пары быў дастатковы; пасля ўважліва праверыў пясочніцу... Ён ведаў: уся надзея цяпер на пясок. Толькі з яго дапамогаю можна пазбегнуць буксавання і паспрабаваць узабрацца на пад'ём.

Над наваколлем залунаў гудок. Аляксей Гарачун адпусціў тармазы і адразу ж адкрыў рэгулятар. Паравоз здрыгануўся і ў тую ж хвіліну імкліва закруціліся колы; пяць, дзесяць абаротаў зрабілі яны, і ўсё на адным месцы. Буксаванне было настолькі моцнае, што з-пад колаў феерверкам пасыпаліся іскры. Машыніст уключыў пясочніцу. На нейкі момант колы спынілі сваё шалёнае вярчэнне, паравоз зноў здрыгануўся, але ўжо ў наступную секунду буксаванне пачалося з новай сілай...

Зноў і зноў сыпаў машыніст пясок на рэйкі, зноў і зноў адкрываў рэгулятар, але ўсё было дарэмна. Колы круціліся, а паравоз не пасоўваўся наперад ні на метр, быццам нейкая неадольная сцяна вырасла раптам перад ім.

Сосны, што раслі недалёка ад доміка пуцявога абходчыка, не разгойдваліся на ветры, але, сагнуўшыся пад яго напорам, ужо не разгіналіся і толькі дрыжалі і гулі, як нацягнутыя струны. І тады машыніст зразумеў, што робіцца. Пры такім страшэнным ветры пясок нічога не памагаў: ён не паспяваў нават далятаць да рэек, як яго здзімала прэч...

«Вось табе і падмануў д'ябла...» — нявесела падумаў Гарачун. Ён выключыў пясочніцу, закрыў рэгулятар, узяў састаў на тармазы і ў знямозе апусціўся на крэсла.

Маўчалі Васіль і Юрка. Памочнік машыніста нейкімі дзіўна пустымі вачыма глядзеў на бліскучую арматуру катла, качагар нервова гладзіў рукою чорны метал шуфля. Потым Васіль панура сказаў:

— Мінут праз дзесяць тут па графіку павінен прайсці наступны поезд...

— А? — скалануўся Гарачун.

— Поезд, кажу, на хвасце ў нас сядзіць.

Па абшыўцы будкі ўдарылі дзве ці тры важкія кроплі. Гарачун з трывогаю прыслухаўся да гэтых удараў, але яны не паўтарыліся. «Хоць бы не было дажджу, хоць бы ён прайшоў старанаю»,— тужліва падумаў машыніст. Бо на мокрых рэйках ніякімі ўжо тармазамі не ўдасца стрымаць састаў, ён няспынна папаўзе назад пад ухіл, імкліва набіраючы хуткасць...

— Ці жывыя хаця вы тут? — пачуў раптам Гарачун чыйсьці глухі голас, які ішоў нібыта з-пад зямлі. У дзвярах будкі без шапкі, з раскудлачанымі валасамі, у расхі-

нутай паросхрыст ватоўцы стаяў пуцявы абходчык Буцько.

— Можна смела лічыць, што нас няма,— па-ранейшаму панура пажартаваў Васіль Малюк.— Мы ў пашчы д'ябла, во мы дзе!

— Тады вылазь адтуль хутчэй, няма там чаго табе рабіць,— глухім, нібы прастуджаным, голасам спакойна прамовіў Казімір Пятровіч.— І скачы ўніз, на зямлю. І ты таксама,— звярнуўся ён да качагара.— Ну, хутчэй!

Потым, павярнуўшыся да Гарачуна, пуцявы абходчык сказаў:

— Будзем рукамі сыпаць пясок пад колы. Так больш надзейна. Мы ўтрох ды яшчэ галоўны кандуктар з паязным майстрам. Пяцёра чалавек — гэта дзесяць рук. Пайшлі!

Гарачун адчуў, што па целе ў яго хваляю разлілася цеплыня. Часта-часта закалацілася сэрца. А ў руках з'явілася раней страчаная ўпэўненасць рухаў.

— Паехалі! — выгукнуў ён і паклаў руку на рэгулятар.

Вецер шалеў, збіваў з ног, але людзі не паддаваліся. Васіль і Юрка сталі на калені з левага боку паравоза, Казімір Пятровіч з кандуктарам і майстрам гэткім жа манерам з правага. Набіраючы поўныя прыгаршчы пяску, яны з сілаю кідалі яго на рэйкі пад самыя колы.

Аляксей Гарачун адкрыў рэгулятар. Вось ён адчуў, як усёй сваёй махінай здрыгануўся паравоз, як крутнуліся колы; яны зрабілі мо толькі адзін абарот і замерлі. Гарачун яшчэ болей адкрыў рэгулятар.

— А ну, а ну, міленькі! А ну, давай, родненькі! — праз аглушальны шум ветру данёсся да машыніста голас Юркі.

Паравоз зноў здрыгануўся і раптам паволька скрануўся з месца. Заскрыгаталі сцяжкі ў вагонах, зазвінелі буферы.

— Пайшоў, пайшоў! — крычаў Юрка, перамагаючы шум ветру.

Памалу, метр за метрам, пасоўваўся ўперад паравоз, насілу цягнучы за сабою вагоны. А побач з ім паўзлі па зямлі людзі, кідаючы і кідаючы пад колы пясок. Вецер не сціхаў, ён проста лютаваў, але людзі былі тут мацней за яго. Хоць з прыгаршч толькі нязначная частка пяску трапляла пад колы, але і яна рабіла сваю справу. Буксаванне

спынілася. Паравоз павольна, але ўпарта ўзбіраўся на пад'ём.

Домік Буцько застаўся ззаду, да яго было ўжо метраў восемдзесят. Цяпер заставалася ўсцягнуць на пад'ём вагоны, бо сам паравоз ужо ішоў па роўнай мясціне.

Хуткасць пачала ўзрастаць. Людзі, што сунуліся побач з паравозам і ўсё кідалі і кідалі пад колы пясок, сталі заўважаць, што яны адстаюць. Метраў яшчэ праз пяцьдзесят ім прыйшлося ўзняцца на ногі і ўжо не ісці, а бегчы трушком. А неўзабаве яны зразумелі, што патрэба ў іх дапамозе ўжо адпала.

Васіль Малюк і Юрка Лунец вярнуліся на паравоз. Занялі свае месцы на тармазных пляцоўках галоўны кандуктар і паязны майстар. Застаўся на насыпе толькі адзін Казімір Пятровіч. У цемры доўга яшчэ набліскваў святло ягонага ліхтара.

Машыніст даў працяглы развітальны гудок. А памочнік высунуўся з акна і пагразіў некаму кулаком.

— Што, з'еў кукіш, пане д'ябал?..

І раптам лінуў дождж. Ды цяпер ён быў ужо не страшны. Поезд борзда набіраў хуткасць. Колы вагонаў весела пастуквалі на стыках рэек.

*1956*

# НАРАДЖЭННЕ ЧАЛАВЕКА

Вось ён нарэшце і настаў — рэдакцыйны дзень свяшчэннадзейства.

У кулуарах рэдакцыі абласной газеты «днём свяшчэннадзейства» называлі дзень выплаты ганарару. Дзіўная гэтая назва ўвайшла ва ўжытак з лёгкай рукі фельетаніста Сямёна Лазавіка, які давёў, што яна самая прыдатная для такога дня. Лазавік нават працытаваў адпаведнае месца з тлумачальнага слоўніка Ушакова, дзе сказана: «Свяшчэннадзейства — выкананне якой-небудзь справы, якіх-небудзь абавязкаў з важным, урачыстым выглядам».

— Вы толькі паглядзіце,— гаварыў Сямён,— з якім выглядам распісваецца ў ганарарнай ведамасці Васіль Агнёў! Хіба ж ён не свяшчэннадзейнічае?

Звычайна ў гэты дзень з самае раніцы ў пакоях і калідорах рэдакцыі панавала своеасаблівае ажыўленне. У супрацоўнікаў быў прыўзняты настрой. Рэпарцёры, нарысісты, фельетаністы, фотакарэспандэнты — штатныя і пазаштатныя — збіраліся ў кулкі і горача абмяркоўвалі, дзе і як яны скончаць гэты дзень. Ва ўсіх дэталях абмяркоўваліся планы на вечар. То там то тут узнікалі спрэчкі. І ўсе час ад часу пазіралі на гадзіннікі,— ці хутка прыйдзе з банка касірка?

У некаторых, найбольш песімістычна настроеных супрацоўнікаў, якія прывыклі заўсёды і ва ўсім сумнявацца, к тром гадзінам рабілася неспакойна на сэрцы. У тры гадзіны заканчваліся аперацыі ў банку. А раптам банк па якой-небудзь прычыне адмовіў?..

Аднак банк амаль ніколі не адмаўляў, і ў пачатку чац-

вёртай гадзіны па калідорах прапосілася кароткае, але шматзначнае:

— Прыйшла!

Касірка — высокая, поўная, маладжавая жанчына — з непахісным усведамленнем сваёй высокай годнасці паважна крочыла ў бухгалтэрыю, нікога не ўдастойваючы позіркам. І па гэтай, даўно праверанай прыкмеце ўсе беспамылкова вызначалі: грошы атрыманы.

Неўзабаве з бухгалтэрыі выскакваў галоўны бухгалтар Іван Іванавіч Крык. Ён на хаду папраўляў акуляры, тузаў свае сінія нарукаўнікі і імкліва, ледзь не подбегам, нёсся па калідоры з ганарарнай ведамасцю ў кабінет рэдактара.

У іншы час няўклюдная постаць галоўнага бухгалтара абавязкова выклікала б у супрацоўнікаў рэдакцыі розныя жартачкі і кпіны. На Івану Іванавічу быў шырокі і доўгі паласаты пінжак, вузкія і кароткія штаны; хадзіў ён так шпарка, што ўгнацца за ім было немагчыма, хоць Іван Іванавіч заўсёды скардзіўся на сваё слабае сэрца. Галоўны бухгалтар, між іншым, славіўся тым, што мог выпіць за адзін прысест цэлы тузін шклянак чаю.

Карацей кажучы, для вострых на язык газетчыкаў заўсёды знаходзілася багата прычын, каб пажартаваць з Івана Іванавіча. Нават і мянушка «абзац», якую ён насіў, давала для гэтага падставы. Між іншым, узнікла яна таксама цікава. Аднойчы ў рэдакцыі ішоў прафсаюзны сход. Іван Іванавіч папрасіў слова. Гаварыў ён доўга і ніяк не мог спыніцца.

— Закругляйцеся, Іван Іванавіч,— перапыніў яго старшыня сходу.

— Адну хвіліначку! — сказаў той.— Застаўся яшчэ адзін абзац.

Сход грымнуў смехам. З таго дня гэтая незласлівая мянушка трывала прыліпла да галоўнага бухгалтара.

Праходзячы назаўтра паўз бухгалтэрыю, жартаўнікі з сур'ёзным выглядам заўважалі: «Цс-с!.. Іван Іванавіч дапісвае ў ганарарную ведамасць апошні «абзац»...

Словам, у іншы дзень з'яўленне на калідоры Івана Іванавіча, безумоўна, выклікала б жарты, але ў дзень выплаты ганарару ён праходзіў, адчуваючы патыліцай адно маўклівыя позіркі супрацоўнікаў рэдакцыі. Калі ён знікаў за дзвярыма рэдактарскага кабінета, Сямён Лазавік абвяшчаў:

— Яшчэ адно апошняе падпісанне, і ведамасць закончыцца твая!

Усе ведалі, што рэдактар Жылевіч падпісвае ведамасць страшэнна доўга. Ён прымусіць Крыка выслухаць некалькі тэрміновых размоў па тэлефоне, потым пакліча сакратарку Маю Пальчык, папросіць яе падліць чарніла ў прыбор, перамяніць пяро ў ручцы. Калі сакратарка пойдзе, Жылевіч некалькі хвілін будзе вывучаць кожную літару, кожную лічбу ў ведамасці, нібы жадаючы на ўсё жыццё запомніць, хто і колькі атрымае на гэты раз ганарару. І толькі пасля таго, як Іван Іванавіч з выразам пакутніка на твары разоў восем узнімецца з крэсла і зноў сядзе ў яго, рэдактар возьме ручку, пільна агледзіць пяро, абмакне яго ў чарніла і выведзе на ведамасці даўжэзны, са мноствам завіткоў подпіс.

Тады Іван Іванавіч хутка выйдзе з кабінета і, падаўшыся ўсім тулавам наперад, памчыцца ў бухгалтэрыю.

Цяпер застанецца толькі пачакаць, пакуль ён зноў выйдзе адтуль і, агледзеўшы скрозь акуляры калідор, скажа:

— Ну, петыты-нанпарэлі, заходзьце!..

Такіх «дзён свяшчэннадзействаў» кожны месяц было два: пятага і дваццатага, калі плацілі ганарар за першую палову месяца і за другую. І гэтыя дні, як дзве кроплі вады, былі падобны адзін на другі.

Але сёння ўсё зыначылася, усё пайшло іншым парадкам. І на гэта была вельмі важная прычына: у фельетаніста Сямёна Лазавіка памірала ў бальніцы жонка... Уласна кажучы, думка пра тое, што яна памірае, убілася ў галаву аднаму толькі Сямёну. Усе астатнія супрацоўнікі рэдакцыі ведалі іншае, а іменна тое, што ў Ліды проста цяжкія роды. Але ад родаў, як вядома, паміраць зусім неабавязкова. Кожны, хто як умеў, даводзіў гэтую акалічнасць Сямёну, але Лазавік на ўсе ўгаворы адказваў у роспачы сваё:

— Што вы ведаеце! Дзе вам зразумець!

Рэдакцыйны кур'ер, стары Хвядос Сапега, у адказ на гэты роспачны выкрык Лазавіка толькі рукамі развёў: «А і сапраўды, што мы разумеем. Дажылі да ўнукаў і нічагуткі не цямім...»

Шчыра кажучы, Сямён і сам адчуваў, што становішча Ліды не такое ўжо небяспечнае, але супакоіцца не мог.

А на тэлефонныя званкі з бальніцы адказвалі адно і тое ж:

— Не, яшчэ не нарадзіла...

— Дваццатая гадзіна! — хапаўся за галаву Сямён.

Супрацоўнікі спачувальна ўздыхалі. А Хвядос Сапега сказаў:

— І нічога тут дзіўнага няма, Сямёнка. Маладзён ты яшчэ, вопыту ў цябе не хапае.

Сямён Лазавік толькі год як ажаніўся. Узяў ён за жонку тэлетайпістку з пошты Лідачку Ястрабаву, найпрыгажэйшую ў горадзе дзяўчыну, прадмет тайнага захаплення шмат каго з заранскіх хлопцаў. Чароўная Лідачка не паглядзела, што ў Сямёна было далёка не паэтычнае аблічча (адсутнічаў рымскі нос, прысутнічаў кірпаты), што ён быў чалавекам не першай ужо маладосці (Лазавіку каля трыццаці) і што наогул ёсць на свеце людзі куды больш вартыя яе рукі, як сцвярджаў нарысіст Васіль Агнёў. Не паглядзела на ўсё гэта, бо прыйшла да непахіснага пераканання: залаты ён чалавек, Сямён Лазавік!

Рабочы дзень у рэдакцыі толькі пачынаўся. Сямён сядзеў за сваім сталом у пакоі, дзе акрамя яго працавалі яшчэ рэпарцёр Пятро Шахрай і нарысіст Васіль Агнёў. Шахрай — той, вядома, і быў Шахраем, бо навошта рэпарцёру псеўданім, яго дваццацірадковыя інфармацыі ідуць на газетнай паласе без подпісу. Агнёў жа быў па пашпарту Куманьком, але хіба ж гэта прозвішча для журналіста, нарысы якога займаюць на газетнай паласе поўны падвал, а подпіс выносіцца наверх і набіраецца загаловачным курсівам?.. Куманёк ператварыўся ў Агнёва.

Зараз у пакоі не было ні Пятра, ні Васіля. Сямён сядзеў адзін. Перад ім на стале ляжаў ліст паперы, на якім уверсе дробным почыркам было напісана адно толькі слова: «Фельетон». Слова гэтае было падкрэслена два разы. Крыху ніжэй падкрэслены быў уяўны загаловак, але самога загалоўка не было.

Сямён зняў тэлефонную трубку, нервова набраў нумар. Нечы абыякава спакойны голас сказаў:

— Не, яшчэ не...

Сямён кінуў трубку на апарат. У гэты час у пакой завітала Мая Пальчык, смуглатварая дзяўчына з чорнымі валасамі і зыркімі блакітнымі вачыма. Яна ўрачыста паведаміла:

— Пайшла!

— Хто? Куды? — падхапіўся Сямён.

— Касірка,— сказала Мая.— У банк.

Сямён расчаравана махнуў рукой. Мая сумелася, зразумела, што яму цяпер не да касіркі, і ціхенька адступіла ў калідор.

У рэдакцыі хадзілі чуткі, што ў Маю закаханы рэпарцёр Шахрай. Сам Пятро, калі яму хто намякаў на гэта, рабіў выгляд, што не ведае, пра што ідзе гаворка. А Мая на ўсмешкі і розныя жартачкі супрацоўнікаў адказвала:

— Вось яшчэ! Патрэбны ён мне, ваш Шахрай!

У доўгім калідоры было ціха. Каля адзінага акна ў самым канцы калідора стаялі і курылі франтаваты Куманёк-Агнёў і Шахрай. Мая моўчкі, з горда ўзнятай галавой прайшла міма іх у прыёмную рэдактара.

Шахрай праводзіў яе задуменным позіркам, потым сказаў:

— Мне чамусьці стала нявесела. Ты не ведаеш, Вася, чаму?

— Не,— абыякава сказаў Куманёк.

— Усё жыццё бегаў я ў пошуках розных цікавых інфармацый, незвычайных навін. Браты-газетчыкі празвалі мяне каралём інфармацыі. А гэты кароль празяваў самую вялікую сенсацыю.

— Якую?

— Аднаму чалавеку грукнула трыццаць пяць гадоў, а ён усё яшчэ нежанаты.

— Сенсацыя гэтая — ты сам?

— Ну, вядома...

Да іх падышоў кур'ер Хвядос Сапега. Быў ён даволі пажылы чалавек, але, як і многія іншыя старыя, любіў пакідваць сабе гады. Зімой ён сцвярджаў, што мае поўных пяцьдзесят восем. Вясной пераконваў усіх, што яму пайшоў ужо шасцідзесяты. А цяпер, у верасні, пачаў даводзіць, што мае шэсцьдзесят з гакам.

Наогул гэта быў цікавы і своеасаблівы чалавек. Можа, ні адна рэдакцыя ў свеце не магла пахваліцца такім кур'ерам. Хвядос Сапега сам аб сабе гаварыў:

— Я кур'ер не па пасадзе, а па прызванню.

Пачаў Сапега працаваць кур'ерам больш за сорак год таму назад, яшчэ падлеткам. Шмат пабачыў ён па сваім вяку, бо перамяніў не адну рэдакцыю — і ў Маскве працаваў, і ў Адэсе, і ў Сярэдняй Азіі, і нават на Далёкім Усходзе.

Быў асабіста знаёмы з Ільфам і Пятровым, насіў карэктуру самому Горкаму. Пасля вайны ён вярнуўся ў родны горад і з таго часу беспярэрыша працуе ў заранскай газеце.

Сапега любіў расказваць пра сябе. Многія ў рэдакцыі падазравалі, што ў яго расказах было больш выдуманага, чым сапраўднага, але слухалі яго ахвотна.

Асабліва запомніўся ўсім яго расказ пра тое, як ён пачынаў некалі сваю дзейнасць у якасці кур'ера.

— Блазан я тады быў,— гаварыў Сапега,— зусім яшчэ хлапчо. Самі мяркуйце, які ў чалавека розум, калі яму ўсяго дванаццаць гадоў. Прывезла мяне маці ў горад, да дзядзькі, ён асенізатарам працаваў. «Ты,— кажа яму,— у людзі выбіўся, дык і Хвядоску майго цягні. Ён у мяне кемлівы, не глядзі, што кволы. Ды, можа, на гарадскіх харчах падужэе».

Спярша дзядзька і мяне хацеў пусціць па сваёй спецыяльнасці, але потым усё ж перадумаў. Ужо і не ведаю, як там яно было, але ўдалося яму прыладзіць мяне ў рэдакцыю, на пасаду «хто куды пашле»... Дзядзька, вядома, і не падазраваў, што зробіць мяне самым шчаслівым чалавекам у свеце.

Па сваёй натуры Сапега быў вялікі аптыміст. І цяпер, пачуўшы размову Шахрая і Куманька-Агнёва, ён упэўнена заявіў:

— Яшчэ старажытныя грэкі казалі: часы мяняюцца, і мы мяняемся разам з імі.

— Што вы маеце на ўвазе? — асцярожна спытаў Шахрай.

— А тое, што я не я буду, калі не вып'ю чарку на тваім вяселлі.

— Ну, магчыма, гэта тады будзе, калі рак свісне,— заўважыў Куманёк-Агнёў.

Шахрай, як і звычайна ў такіх выпадках, змаўчаў. Зірнуўшы на дзверы пакоя, дзе сядзеў Сямён Лазавік, ён нялоўка пераступіў з нагі на нагу, папрасіў у Куманька-Агнёва новую папяросу. Хвядос Сапега таксама паглядзеў на дзверы.

— З якой гэта рады вы Сямёна аднаго пакінулі?

— Думаем, можа, яму аднаму лягчэй,— адказаў Куманёк-Агнёў.

— Чалавеку, калі ён адзін, ніколі не бывае лягчэй. Пойдзем.

Хвядос рашуча пайшоў у пакой. За ім рушыў Пятро. Пасля падаўся туды і Васіль.

— Пішаш? — сядаючы непадалёк ад Сямёна, бадзёра прамовіў Сапега.— Пішы, браце, пішы. Яшчэ старажытныя грэкі вельмі тонка заўважылі: словы адлятаюць, напісанае застаецца. Зноў жа і сучасныя газетчыкі таксама вельмі слушна сцвярджаюць: пад ляжачае пяро ганарар не бяжыць.

Недзе раней Сямён абавязкова адказаў бы Сапегу якім-небудзь жартам ці дасціпнай прымаўкай, але зараз ён толькі паціснуў плячыма, згорбіўся і пакутліва ўтаропіў вочы ў паперу.

— Не вярэдзь сэрца, дзядзька Хвядос!

— Нявыспаны ты сёння, Сямёнка! Да цябе людзі з чуласцю... Вось і гэты, бачыш,— дадаў Сапега, угледзеўшы ў дзвярах загадчыка аддзела пісем Мацюша.

Той увайшоў у пакой непрыкметна, ціхай, нячутнай хадою. Хада ў Мацюша была ўсім на дзіва: нібы не ён ступаў па зямлі, а зямля падсцілалася яму пад ногі. Пра яго казалі, што ён і вады не замуціць, такі ціхман. Ці праўда гэта была, ці не, але Куманёк-Агнёў бажыўся, што на ўласныя вочы бачыў, як Мацюш пасля прафсаюзнага ці якога іншага сходу старанна здзіраў са сцяны аб'яву і хаваў у кішэню,— каб перад жонкай апраўдацца, дзе гэтак позна быў.

Мацюш моўчкі спыніўся каля Сямёнавага стала. Памкнуўся быў нешта сказаць, ды не сказаў нічога. Адно перавёў позірк на стол. На стале быў вялікі шыза-сіні пацёк ад дажджу. Мацюш засяроджана пачаў разглядаць яго.

— Зробім, Сямён Іванавіч,— нарэшце сказаў ён, загадкава бліснуўшы вачыма, і паспешліва падаўся з пакоя.

— Дзівак-чалавек,— усміхнуўся Куманёк-Агнёў.— Што такое ён надумаўся зрабіць? Ці не паслаць для рэагавання пісьмо загадчыку гаспадаркі наконт гэтай плямы на стале?

— Калі душу чалавека асвятляе высокая ідэя, усякія плямы знікаюць самі па сабе,— па-філасофску зазначыў Сапега.

Сёння ў дванаццаць гадзін мелася быць лятучка, або, як яе называлі ў рэдакцыі, «цягнучка». Але без пяці мінут дванаццаць увайшла Мая Пальчык і паведаміла:

— «Цягнучкі» не будзе. Адмяняецца. З выпадку...— яна непрыкметна кінула позірк на Сямёна Лазавіка.— Невядома, з якога выпадку.

Паведаміўшы гэтую нечаканую навіну, Мая павай выйшла за дзверы. Тады Пятро падхапіўся і падышоў да Куманька-Агнёва.

— Пазыч сто рублёў.

— А аддасі калі? На грэцкія календы?

— Ды сёння ж аддам, скнара ты праклятьі! — ускіпеў Шахрай і грымнуў далоняй па стале.

Франтаваты, з бліскучымі ад вежэталю валасамі, са стракатым гальштукам, Куманёк-Агнёў хуценька адшпіліў унутраную кішэню пінжака, выцягнуў бліскучы натапыраны бумажнік і выняў адтуль дзве новенькія паўсоценныя паперкі.

— Можа яшчэ трэба?

Пятро падумаў і прымірэнча сказаў:

— Напэўна, хопіць... Па інфармацыю на шклозавод пайду,— дадаў ён, звяртаючыся чамусьці да Сапегі.

Гучна зазваніў тэлефон. Ад нечаканасці Сямён уздрыгнуў.

— Слухаю, слухаю... Гэта бальніца?

Але гаварылі, відаць, не з бальніцы, бо твар Сямёна праз момант адлюстраваў поўнае расчараванне.

— Цябе клічуць,— кінуў ён Куманьку-Агнёву.

Заходзілі і выходзілі літработнікі, карэктары, загадчыкі аддзелаў, фотакарэспандэнты. І ў кожнага — адно:

— Ну як, Сеня? Ну што?

Сямён паціскаў плячыма, разводзіў рукамі, моршчыўся, нібы ад зубнога болю.

— Дакапаюць яны яе там...

Адказны сакратар рэдакцыі Панцюхін, заўсёды злосны і крыклівы, на гэты раз увайшоў спакойна, быў лагодны.

— Калі сын — з мяне, лічы, паўлітра. А калі дачка — з мяне таксама паўлітра. Давай звані, як яно там і што, а то я званіў ды трапіў на кватэру да начальніка міліцыі.

Але і на гэты раз усё той жа абыякава спакойны голас у трубцы адказаў:

— Не, яшчэ не...

Абцягваючы на хаду свае нарукаўнікі, у пакой забег бухгалтар Крык.

— А скажыце, Сеня, гэта каторае ў вас будзе?.. Пер-

шае?.. Адразу ж вазьміце даведачку. Будзеце мець ільготу па бяздзетнаму падатку. А як жа!

І Крык асцярожна, каб лішне не турбаваць будучага бацьку, адразу ж і выйшаў.

— От што робіць каханне,— глыбакадумна прамовіў Куманёк-Агнёў.

— Га? — не зразумеў Сапега.

— Звер люты, а не чалавек.

— Хто?

— Ды Шахрай, хто ж.

— А-а... Звер, кажаце? А я вам пра гэтага звера лютага адну гісторыйку раскажу. Вось паслухайце...

Сапега звяртаўся як быццам да аднаго Куманька-Агнёва, але вачыма ўвесь час сачыў за Сямёнам. Мастак расказваць розныя вясёлыя гісторыі, Сапега сядзеў у пакоі з адзінай мэтай — разважыць Лазавіка. Праз гэта яго ніхто сёння і не пасылаў нікуды па службе...

Між тым па-за сценамі пакоя ўсё ішло так, як і ў звычайныя дні. Друкаваліся ў машынапісным бюро карэспандэнцыі. Здаваліся арыгіналы ў набор. Вычытвалася карэктура. Вярсталіся газетныя палосы... Не было толькі аднаго: фельетона Сямёна Лазавіка...

— Дарэчы, вы не любіце парыцца? — спытаў Сапега.— Не?.. А ты, Сямён? Таксама не?.. Ну, вось...

І Хвядос Сапега пачаў расказваць даўжэзную і вельмі смешную гісторыю пра тое, як ён з Пятром Шахраем парыліся ў лазні і не маглі аніяк дабраць добрага веніка, каб палупцаваць адзін аднаго па спіне.

Сапега яшчэ не паспеў скончыць сваёй вясёлай гісторыі, як у пакой зноў завітаў нячутнай хадою Мацюш. Скоса кінуўшы позірк на стол Лазавіка і заўважыўшы, што на лістку паперы, акрамя слова «фельетон», так нічога больш і не з'явілася, Мацюш нечакана для ўсіх усміхнуўся. Усмешка яго адлюстроўвала разам і радасць і затоеную надзею. Пачырванеўшы, Мацюш працягнуў Сямёну некалькі надрукаваных на машынцы лісткоў.

— Ніколі не пісаў фельетонаў... Нам пядаўна пісьмо адно прыйшло. Аб злоўжываннях на шклозаводзе. Праверылі мы яго, і вось... Ну, напісаў, адным словам. Не ўпэўнены толькі, ці добра. Паглядзіце. Можа і не атрымалася.

За два гады працы ў рэдакцыі Мацюш яшчэ ні разу не вымаўляў адразу столькі слоў. Аж пацеркі поту выступілі ў яго на лбе.

Углёдзеўшы ўверсе першай старонкі надпіс: «фельетон», Хвядос Сапега хутка выхапіў з рук Мацюша лісточкі і паклаў іх на стол Лазавіку.

— Атрымалася, не мела ніякага поўнага права не атрымацца! А калі што якое, дык і падправіць можна...— Сапега падміргнуў у бок Лазавіка.— Мы гэта ўжо самі. Раз-два — і гатова. Нам не пазычаць.

Дзынкнуў тэлефон, потым яшчэ і яшчэ — настойліва, патрабавальна. Сямён кінуўся да апарата, але трубка была ўжо ў Сапегавых руках.

— Алё, алё! — не аддаючы Сямёну трубкі, крыкнуў Хвядос.— Што, што?.. Ага, слухаем... Вось жа мы якраз і слухаем, а як жа... Што? Ага, ага, гэтага якраз і чакалі!.. Ну, вядома, хто цяпер найшчаслівейшы папаня, як не мы. Шчыра дзякуем вам, даражэнькая! Ад усіх нас. І дай жа вам бог ладнага жанішка прыдбаць... Што, ужо ўнукаў маеце? Тон няхай сабе растуць здаровенькія, а як жа!

— Скачы, чарцяка! — загадаў збялеламу Лазавіку Хвядос Сапега.

Сямён Лазавік стаяў нерухома, усхваляваны, разгублены. У гэты час у пакоі нечакана, нібы з неба зваліўшыся, з'явілася касірка.

— Дачка?..— затаіўшы дыханне, спытала яна і прыціснула да грудзей свой раздуты партфель.

Сапега пагрозліва паківаў пальцам.

— Ну, ну! Сын у нас!

— Няўжо?..— захлынуўся ад шчасця Лазавік.

Касірка з палёгкай уздыхнула:

— Я так і ведала.

І паляцела па рэдакцыі вестка аб нараджэнні на зямлі новага чалавека. З усіх пакояў да Лазавіка беглі газетчыкі вітаць з першынцам.

Ніхто цяпер і не заўважыў, як па доўгім калідоры з бухгалтэрыі ў рэдактарскі кабінет пашыбаваў з ганарарнай ведамасцю Іван Іванавіч Крык. Ведамасць чамусьці дрыжала ў яговых руках. Ля самага кабінета рэдактара Крык азірнуўся. Толькі адзін чалавек сёння, як і заўсёды, сачыў за ім. Пазнаўшы Куманька-Агнёва, бухгалтар крэкнуў.

Вярнуўшыся з горада, Шахрай адразу ўсё зразумеў. Ён тут жа ўрачыста паклаў на стол Лазавіка вялізную кардонную скрынку. Распакаваўшы яе, Пятро выняў

агромністую лялыку. Лялька смешна запішчала, потым расплюшчыла вочы. Усе зарагаталі. А Сапега сказаў:

— І які ж ты непуцёвы, Шахраюшка. У нас жа сын нарадзіўся, гэта значыць, мужчына, а ты яму жаночую цацку цягнеш.

Лялька пайшла па руках. Шахрай, скарыстаўшы зручны момант, выйшаў у калідор.

Мая Пальчык была на сваім месцы, у прыёмнай. Яна перабірала на стале нейкія паперкі.

— Мая,— сказаў Пятро, з адчаем пазіраючы на дзяўчыну,— Мая, у мяне сабралася дваццаць сем тэатральных білетаў, якія прызначаліся для...— Ён выняў з пінжака пачак вузенькіх доўгіх папяровых лісточкаў — зялёных, белых, сініх, ружовых.— Ну, словам, для аднаго чалавека. А месца таго чалавека заўсёды было пустое. Яно было з правага боку ад мяне...

Сумна ўздыхнуўшы, Пятро ступіў крок да Маі і, сам здзіўляючыся, адкуль у яго раптам узялася гэткая рашучасць, сказаў:

— Сёння ў драме ідзе «Даходнае месца»...

— Астроўскага?

— Астроўскага.

Мая капрызна сказала:

— Калі не далей пятага рада...

Шахраю стала цёмна ў вачах. Ён зразумеў, што загінуў, бо ад тае сотні, што ён пазычаў у Куманька-Агнёва, пасля пакупкі лялькі хапіла толькі на білеты ў амфітэатр.

— Чакайце мяне на трамвайным прыпынку,— сказала Мая.— Дзе пяты нумар ходзіць.

Гэтая размова адбывалася пры зачыненых дзвярах, без сведкаў, і таму вострым на язык газетчыкам яна не дала тэмы для жартаў. Затое назаўтра ўся рэдакцыя ведала, што Пятро Шахрай і Мая Пальчык былі ў тэатры разам, сядзелі ў амфітэатры і ніяк не рэагавалі на насмешлівыя позіркі Куманька-Агнёва, якія той кідаў на іх з ложы.

З гэтага нагоду Сапега пусціўся быў у філасофію:

— Яшчэ старажытныя грэкі...

Але што менавіта гаварылі ў такіх выпадках грэкі, ён забыўся, а можа, і наогул не ведаў, а таму скончыў так:

— Я ж казаў: я не я буду, калі не згуляю на сваім веку яшчэ аднаго вяселля.

*1951*

# МОЙ СУСЕД

Пакой наш у інтэрнаце быў на тры ложкі, але жылі мы ўдвух — я і Іван Мацвеевіч. Трэцяга жыхара да нас не падсялялі ўжо месяцы са два, і мы, вядома ж, не крыўдавалі за гэта на каменданта. Іван Мацвеевіч працаваў машыністам на цеплавозе, я — памочнікам машыніста. Ён вадзіў пасажырскія паязды, я ездзіў на таварным лакаматыве. І вось ужо трэці год жылі разам з таго часу, як мяне пасля чыгуначнай школы паслалі працаваць сюды, у Заранскае дэпо.

Мы сябравалі, хоць агульнага ў нас, прызнацца шчырасці, было мала. Іван Мацвеевіч, напрыклад, быў аж на васемнаццаць гадоў старэйшы за мяне. І характары ў нас розныя. Яднала ж нас хіба тое, што мы абодва былі халасцякі. Я яшчэ не паспеў ажаніцца, а ён... ён, відаць, спазніўся: яму было ўжо далёка за сорак. Як яно так сталася, што ён дагэтуль векаваў свой век адзін, я добра не ведаў. Сам Іван Мацвеевіч не крапаў гэтай тэмы, а я лічыў за лепшае не лезці ў чужую душу.

Ён наогул быў адзінокі, мой сусед па інтэрнацкім пакоі. Праўда, недзе была ў яго старэнькая маці, якой ён штомесяц, атрымаўшы зарплату, пасылаў грашовыя пераводы, і немалыя: роўна палавіну заробку. Аднойчы я спытаў у яго, чаму ён не возьме маці да сябе, чаму не дамагаецца кватэры. Ён адказаў, што маці хворая і не можа прыехаць, а жыць яму добра і ў інтэрнаце — ён ужо прывык да такога свайго становішча і нічога мяняць не хоча. Неўзабаве пасля таго мне выпадкова трапіў у шуфлядзе на вочы цэлы жмут квітанцый, і я ўведаў, што Іван Мацвеевіч ужо амаль дваццаць гадоў пасылае свае грашовыя пераводы — на адзін і той жа адрас, на адно і тое ж імя.

Нам выпадала не так ужо часта быць дома разам. То ён у паездцы, то я. Але калі мы былі вольныя ад работы абодва, мы тады ўжо не разлучаліся. Хадзілі ў кіно або ў тэатр. Летам ездзілі на возера купацца, а зімою — з лыжамі за горад. Іван Мацвеевіч быў заўзятым лыжнікам і мяне прывучыў да гэтага занятку.

Збіраліся мы паехаць за горад і ў той аўторак. Я якраз ноччу вярнуўся з паездкі, паспеў да раніцы збольшага выспацца, а Івану Мацвеевічу заступаць на цеплавоз трэба было толькі ў другой палове дня, у пятнаццаць трыццаць.

— Махапём? — сказаў Іван Мацвеевіч, калі я прачнуўся.

— А не зашкодзіла б,— адказаў я, пацягваючыся.— Як там надвор'е?

— Самае лыжнае. Марозік на шэсць градусаў, ветру няма, а сонейка — вунь, сам паглядзі! Любата, дый годзе!

Сапраўды, за акном аж зіхцела ўсё, аж прамянілася.

Я падхапіўся і памкнуўся бегчы ва ўмывальнік. Ды мяне спыніў голас Івана Мацвеевіча:

— Спачатку — гімнастыка!

Да штодзённай гімнастыкі мяне прывучыў таксама ён, Іван Мацвеевіч.

Потым мы галіліся, умываліся, снедалі і ўвесь час гаманілі толькі пра адно — пра нашу лыжную вылазку. Мы радаваліся і смяяліся, як дзеці, якім паабяцалі купіць самы любімы іхні ласунак.

Я збегаў у падвал і прынёс лыжы. Іван Мацвеевіч узяўся змазваць іх — гэтае работы ён мне не давяраў. У яго была мазь, прыгатаваная па нейкіх аднаму яму вядомых рэцэптах, але такая, што лыжы нібыта самі беглі па снезе.

Калі Іван Мацвеевіч, змазаўшы спачатку мае лыжы, узяўся потым за свае, у дзверы нечакана пастукалі — ціхенька, асцярожна.

— Каго там нясе нялёгкая не ў пару! — сказаў я.— Ну, ну, давайце!

Дзверы прачыніліся, і я ўбачыў незнаёмую жанчыну. Яна была ў чорным коцікавым футры, з такім жа чорным капялюшыкам на галаве і ў боціках — таксама чорных. Было ўражанне, быццам жанчына ў жалобе, таму і апранулася ва ўсё чорнае. Нават і сумачку ў руцэ яна трымала аспідна-чорную.

— Можна? — нясмелым, бы нават прабачлівым голасам прамовіла яна.

Мы чамусьці нічога не адказалі ёй. Адно на ўсе вочы глядзелі на жанчыну.

— Добры дзень,— сказала яна тады, зрабіла крок наперад і зачыніла за сабою дзверы.

— Калі ласка, праходзьце,— сказаў нарэшце я і ўскочыў з крэсла. Іван Мацвеевіч таксама ўзняўся — раптоўна збялелы, з ліхаманкавым бляскам у вачах. У гэты момант у яго з рук выслізнула лыжа і з грукатам бразнулася на падлогу.

— Прабачце...— разгублена сказаў я і кінуўся падпімаць лыжу.

— Гэта, Коля, да мяне,— падаў тады голас і Іван Мацвеевіч; голас быў непрывычна глухі, нейкі тужлівы.— Пакінь гэту злашчасную лыжу і памажы лепей госці распрануцца.

Я падпарадкаваўся. І тут высветлілася, што паліто на жанчыне таксама цёмнага колеру. А яшчэ высветлілася, што цёмны колер ёй наогул вельмі да твару, ніякі іншы проста не пасаваў бы да яе.

Зрэшты, можа, гэта мне толькі падалося. Можа, я і памыляўся. Бо прыгожым жанчынам, здаецца, усё чыста да твару. Нават і немаладым.

— Знаёмцеся, калі ласка,— гаварыў далей Іван Мацвеевіч.— Гэта Людміла Міхайлаўна. А гэта мой найлепшы друг Коля. Будучы машыніст.

— Вельмі прыемна,— строга, няўсмешліва сказала Людміла Міхайлаўна і працягнула мне руку. Я з паспешлівасцю дакрануўся да яе сваёю рукою і таксама сказаў:

— Вельмі прыемна!

А тады ўсталявалася няёмкая зацяглая маўклівасць. І невядома было, калі яна скончыцца. Мне зрабілася чамусьці вельмі горача, і я пачаў расшпільваць каўнер.

— Што ж мы стаім...— нібы ачнуўшыся, прамовіў Іван Мацвеевіч.— Людміла, сядай, калі ласка.

— Дзякую, Ваня.

Яна села на крэсла каля стала з левага боку. Іван Мацвеевіч таксама сеў — насупраць яе, з правага боку. А я ўсё стаяў і зусім не ведаў, што мне рабіць і як паводзіць сябе.

— Што ж, Коля, лыжная вылазка адмяняецца,— сказаў Іван Мацвеевіч.— Давай будзем частаваць госцю.

— Вы не турбуйцеся, калі ласка,— ужо больш мякка прамовіла Людміла Міхайлаўна.— Нічога не трэба.

— Я зараз! — сказаў я і, схапіўшы авоську, куляю вылецеў за дзверы.

У магазіне, што быў якраз непадалёк ад нашага інтэрната, я купіў віна, фруктовай вады, дзве бляшанкі кансерваў, мясных і рыбных, галандскага сыру, кракаўскай каўбасы. Ужо на вуліцы спахапіўся і, вярнуўшыся, узяў яшчэ цукерак «Цытрон» — даражэйшых не было — і торт «Казка».

Калі я вярнуўся ў інтэрнат, яны сядзелі на ранейшых месцах і ў ранейшых паставах — Людміла Міхайлаўна з левага боку ад стала, а Іван Мацвеевіч насупраць, з правага. У гэтую хвіліну мне падумалася, што яны вельмі падобныя адно на аднаго,— не рысамі твару, а нечым яшчэ, што не кідалася адразу ў вочы, але ўсё ж існавала, нават вярэдзіла душу. Што гэта было такое, я не мог даўмецца.

Сервіравалі наш стол мы ўдваіх — я і Людміла Міхайлаўна. Іван Мацвеевіч хадзіў па пакоі і курыў — цыгарэту за цыгарэтай, хоць дагэтуль я не заўважаў, каб ён злоўжываў курывам.

Нарэшце ўсё было гатова, і мы паселі за стол. Іван Мацвеевіч і Людміла Міхайлаўна зноў былі насупраць адзін аднаго, і так атрымалася, што я апынуўся між іх.

Ніколі яшчэ наш стол не выглядаў так прыгожа, так святочна, нават урачыста. Ды і ўвесь пакой зрабіўся раптам інакшым — надзвычай утульным, нібыта сямейным.

Іван Мацвеевіч наліў Людміле Міхайлаўне і мне віна ў шклянкі — чарак у нас не было,— а сабе фруктовай вады.

— Мне сёння ў паездку,— сказаў ён да Людмілы Міхайлаўны,— ты прабач...

— Канечне, канечне,— кіўнула Людміла Міхайлаўна і ўпершыню злёгку ўсміхнулася — адным і куточкамі вуснаў.— Перад паездкай табе піць нельга, хто ж гэтага не разумее. Мы будзем піць з Колем — і за сябе, і за цябе. Праўда, Коля?

— Ага,— сказаў я і кульнуў сваё віно ў рот. Людміла Міхайлаўна таксама адпіла трошкі.

Потым мы закусвалі. Потым Іван Мацвеевіч яшчэ ліпуў у шклянкі — віна ў нашы і фруктовае вады ў сваю. Мы зноў выпілі і зноў узяліся есці.

Ніякіх тостаў не было. І наогул гаворкі не атрымлівалася. Я больш маўчаў, а яны перакідваліся кароткімі агульнымі фразамі, накшталт такіх: «Як твае здароўе, Ваня?» — «Дзякую, Людміла, нішто сабе. А тваё?» — «І маё, дзякую, нішто. А працуецца як?» — «І працуецца добра. А табе?» — «І мне таксама».

Відаць было, што я тут лішні, што ім трэба астацца сам-насам. І, зрабіўшы выгляд, быццам нешта ўспомніў, я сказаў, што мне трэба пайсці па вельмі тэрміновай справе, і пачаў развітвацца.

— Не выдумляй,— сказаў для прыліку Іван Мацвеевіч.— Нікуды табе не трэба ісці. Давай во лепей выпі яшчэ з Людмілай Міхайлаўнай. Здаецца, віно добрае, га?

Ды я ўжо быў за дзвярыма.

Апынуўшыся на вуліцы, пайшоў проста так, сам не ведаючы куды. Потым узяў білет у кіно, хоць ішла карціна, якую я ўжо бачыў. А думкі мае зноў і зноў вярталіся да Івана Мацвеевіча і Людмілы Міхайлаўны. Хто яна такая? Кім даводзіцца Івану Мацвеевічу? І чаму гэткаю была іх сустрэча — халодная, насцярожаная?.. Відаць, знаёмы яны даўно, нават вельмі даўно. Але што адбылося між імі?..

І тут я раптам зразумеў, што́ іменна ў іх агульнае, падобнае. Гэта — вочы. Не, не таму, што яны і ў яе, і ў яго цёмна-шэрыя, з доўгімі густымі вейкамі,— а таму, што ў іх блукаў адзін і той жа выраз смутку ці мо нават тугі. Але, але, вочы ў іх былі аднолькавыя — з зацятай тугою ў зрэнках.

Пасля кіно я яшчэ колькі часу бадзяўся па вуліцах. Зайшоў у сталовую, павячэраў. Завітаў у парадную, якую мы, чыгуначнікі, называем «брахалаўкай», пагаманіў пра тое пра сёе з хлопцамі. І нарэшце падаўся дамоў, у інтэрнат.

Тое, што Івана Мацвеевіча не магло ўжо быць дома, гэта я ведаў пэўна. А Людміла Міхайлаўна? Можа, яна скуль-небудзь прыехала, можа, ёй няма дзе начаваць, і яна асталася ў нас?..

Калі я па ўсякі выпадак пастукаўся, мне ніхто не адказаў. Я адчыніў дзверы — у пакоі было цёмна. Уключыў святло і агледзеўся... Не, нікога. І на стале ўсё прыбрана, быццам і не сядзелі мы нядаўна за ім. І наогул — нідзе ніякага знаку, нібы і не было тут, у гэтым пакоі, ніколі ніякае Людмілы Міхайлаўны.

Дзён са тры пасля таго мы з Іванам Мацвеевічам амаль не бачыліся. То я ў паездцы, то ён. Нарэшце зноў сабраліся разам. Голячыся, умываючыся і потым снедаючы, мы абодва рабілі выгляд, што нічога не здарылася, нічога не адбылося.

Паехаць на лыжную прагулку ён мне чамусьці не прапанаваў. Замест гэтага сказаў:

— Можа піўка сходзім дзе вып'ем?

Я з ахвотаю згадзіўся.

Мы ведалі адно зацішнае кафэ, дзе заўжды было свежае піва. Узялі па куфлю. Выпілі, пахвалілі. Заказалі яшчэ.

— Што ж ты нічога не пытаешся? — сказаў потым Іван Мацвеевіч.

— А што пытацца... Не мая гэта справа...

Ён укінуў у куфель дробку солі, зрабіў некалькі глыткоў.

— Так, гэта былая мая жонка. Мая афіцыйная жонка.— Іван Мацвеевіч зрабіў яшчэ некалькі глыткоў.— Мы зарэгістраваліся дваццаць другога чэрвеня сорак першага. Калі нам уручылі пасведчанне аб шлюбе, па радыё перадалі: вайна!.. Адтуль, з загса, я пайшоў проста ў ваенкамат. Потым збегаў дамоў па рэчы і болей не вярнуўся. У нас з Людмілай не было нават шлюбнае начы...

У маім некранутым куфлі апала пена, і піва зрабілася светлае, празрыстае. Было відаць, як са дна ўзнімаюцца ўгору маленечанькія бурбалачкі і лопаюцца на паверхні.

— Вярнуўся я толькі ў канцы сорак пятага. Давялося і нямецкіх фашыстаў біць, і японскіх самураяў... Усю вайну яна была са мною, вось тут, у маім сэрцы. Я любіў яе так моцна, што не ўяўляў сабе жыцця без яе. Мне здавалася, што толькі любоў да яе і ратуе мяне на вайне.

Але, Людміла Міхайлаўна і цяпер яшчэ была прыгожая. Я разумеў Івана Мацвеевіча, разумеў ягоную любоў.

— Дык вось, вярнуўся я дамоў... Вярнуўся — і дведаўся: мая Людміла не зберагла вернасць мне. Тады ўжо, праўда, у яе нікога не было, але... Адным словам, я не здолеў дараваць ёй. І з'ехаў. Назаўсёды.

Іван Мацвеевіч дапіў сваё піва і папрасіў афіцыянтку прынесці яшчэ куфель.

— Магчыма, я і дараваў бы ёй, калі б... меней любіў яе. А так — не змог. Бо я любіў яе, як нешта святое, высокае... і чыстае.

— А можа,— узрушана сказаў я,— а можа, у яе і не было нічога... тады? Можа, гэта ўсё наплявузгалі на яе? Колькі, кажуць, было такіх выпадкаў!..

— Яна сама прызналася мне, у той жа дзень, калі я вярнуўся. Я, як цяпер помню, прывёз з сабою бутэльку французскага каньяку, у Порт-Артуры прыдбаў быў. Прыйшлі знаёмыя, мы пасядзелі за бяседаю, паспявалі, а потым, калі ўсе разышліся, яна і сказала... Пра ўсё сказала... і пра дзіця таксама... пра дачку... Плакала, праклінала тую слабую сваю хвіліну, клялася, што любіць толькі мяне аднаго, маліла дараваць...— Ён цяжка перадыхнуў.— Але дараваць я не змог...

Ён раптам усім корпусам павярнуўся да мяне.

— Скажы, а ты дараваў бы?

Я сумеўся.

— Не ведаю...

У горле ў мяне перасохла, і я нагбом спаражніў куфель.

— Я дапускаю, што сотні, тысячы на маім месцы зрабілі б інакш,— гаварыў далей Іван Мацвеевіч.— Ну, калі б і не даравалі цалкам, то зрабілі б выгляд, што даравалі. І пастараліся б забыцца на ўсё. Яшчэ ў адным варыянце — усё жыццё плацілі б няверпай такою ж манетай. А я не магу. Я задужа, мілы мой Коля, люблю... задужа любіў яе... Зрэшты, я не абмовіўся. Я і цяпер люблю яе.

І ён рашуча ўзяў свой куфель і паднёс да рота.

Я спытаў:

— Яна і дагэтуль адна?

— Адна... Гэтак жа, бачыш, як і я... У мяне наогул нікога на свеце няма. Пра маці я табе выдумаў, усе мае родныя загінулі ў вайну... Што ж ты не п'еш піва? А, ты ўжо выпіў. То закажы яшчэ, сёння піва проста цудоўнае.

Нейкі час мы моўчкі цягнулі піва, цягнулі павольна, глыток за глытком.

Потым я спытаў яшчэ:

— То чаму ж вы... прабачце мне, Іван Мацвеевіч, за такое пытанне... чаму ж вы не ажаніліся з другою?

— Таму, мой юны друг, што не сустрэў жанчыны такой, як яна. Відаць, другой Людмілы няма.

Ён паклікаў афіцыянтку, мы разлічыліся і пайшлі.

На вуліцы ўжо добра ўцямнела. Я зірнуў на неба. Проста пада мною тужліва-цьмяным святлом зіхцела самотная зорка.

— Табе калі ў рэйс? — спытаў Іван Мацвеевіч.

— Заўтра а дзевятай. А вам?

— Маю машыну паставілі ў планавы рамонт. Прыйдзецца загараць.

Калі я вярнуўся назаўтра з паездкі, нам якраз выдавалі зарплату. І я бачыў, як Іван Мацвеевіч, атрымаўшы грошы, пашыбаваў на пошту...

*1967*

# САМАЕ ВАЖНАЕ АДКРЫЦЦЁ

Прафесар Кузьма Захаравіч Ігнатоўскі не збіраўся так доўга быць у камандзіроўцы. Паехаць назад у Маскву ён думаў яшчэ на мінулым тыдні. Але справы нечакана затрымалі яго ў Мінску. Праўда, Кузьма Захаравіч надта і не шкадаваў, што гэтак затрымаўся. Камандзіроўка была вельмі ўдалая, ён нават і не спадзяваўся, што здолее зрабіць столькі.

Цяпер ужо ўсё ўладжана, і заўтра прафесар паедзе дамоў. Нават білет ужо ляжыць у кішэні. Адно толькі трохі засмучае: чым заняць сённяшні вечар? Усе гэтыя дні прафесар быў да таго заняты, што ў яго не было і хвіліны вольнага часу. А тут раптам цэлы вольны вечар!..

У гасцініцы было цёпла, нумар Ігнатоўскаму трапіўся добры, утульны, і ісці нікуды не хацелася. Ігнатоўскі надумаў пачытаць апошнюю кніжку «Нового мира». Але, уладжваючыся з часопісам у мяккім ёмкім крэсле, ён раптам успомніў, што збіраўся названіць інжынеру Сцяпану Максімавічу Карпілаву. З Карпілавым ён не быў знаёмы, нават не бачыў яго ніколі, але чуў пра яго як пра выдатнага спецыяліста якраз у той галіне, у якой працаваў і сам. Незадоўга да свайго ад'езду з Масквы прафесар вычытаў у адным навуковым выданні, што інжынеру Карпілаву ўдалося выпайсці надзвычай арыгінальную рэч — першы ў гісторыі тэхнікі двухдугавы электразварачны аўтамат. Над надобнай праблемай працаваў адпоічы і сам Ігнатоўскі, але тады на шляху да стварэння аўтамата стаяла шмат не вырашаных яшчэ праблем, і прафесару прыйшлося на пэўны час адкласці працу. І вось гэтую працу, аказваецца, зрабіў нехта другі, якісьці інжынер

Карпілаў з Мінска... Хто ён? Адкуль узяў ён веды і спрыт, якіх не хапіла тады прафесару?..

Напэўна, гэта быў малады, але, безумоўна, вельмі талепавіты вучоны. І таму Ігнатоўскаму дужа хацелася сустрэцца са сваёй раўнёй. У першы ж дзень пасля прыезду ў Мінск Кузьма Захаравіч разведаў тэлефон Карпілава і пазваніў яму. Аднак, як на тое, інжынера ў горадзе не аказалася, ён па нейкіх службовых справах выехаў у Гомель і павінен быў вярнуцца толькі сёння.

Сёння, значыцца, ён меўся быць дома. Згадаўшы гэта, Кузьма Захаравіч надумаў зараз жа дамовіцца з ім аб сустрэчы на заўтрашнюю раніцу. «Запрашу яго да сябе ў нумар,— падумаў Кузьма Захаравіч.— Або, яшчэ лепш, на снеданне ў рэстаран».

Па тэлефоне адказалі адразу. Даведаўшыся, хто гэта і адкуль звоніць, Карпілаў відавочна ўзрадаваўся. У трубцы загучаў яго прыемны энергічны голас:

— То чаго ж вы, дарагі прафесар, сядзіце там у адзіноце? Прыходзьце, калі ласка, да мяне. Пагаворым, павячэраем разам. Далібог, прыходзьце! Вялікую ласку зробіце!

Відаць было, што Карпілаў запрашае ад шчырага сэрца, што ён рад бачыць у сябе ў гасцях Кузьму Захаравіча, і таму прафесар не пасмеў адмовіцца.

Карпілаў жыў у цэнтры горада, недалёка ад універмага. «Другі пад'езд, чацвёрты паверх, налева»,— удакладніў ён адрас.

«Можа гэта і к лепшаму,— разважаў прафесар, збіраючыся ў дарогу.— Не трэба будзе заўтра, у нядзелю, адрываць чалавека ад сям'і».

Вечар быў марозны, але ціхі, бязветраны. Горад зіхацеў безліччу агнёў. Яны гарэлі ў вокнах дамоў, палалі рэкламамі ўгары над дахамі. Вакол чуліся ўзбуджаныя галасы людзей, недзе гучала музыка, па бруку імкліва несліся машыны...

Кузьма Захаравіч надумаў прайсціся да кватэры Карпілава пеша,— балазе ісці было недалёка. Хацелася падумаць, памарыць...

У сваім жыцці прафесар зрабіў нямала адкрыццяў. Адны з іх былі больш значныя, другія менш. Але Ігнатоўскага ніколі не пакідала пачуццё незадаволенасці сабою. Яму ўвесь час здавалася, што самага важнага, самага неабходнага адкрыцця ён так і не зрабіў. Ён не ўяўляў сабе, якое

яно павінна было быць, але ведаў, што без гэтага адкрыцця жыццё прафесара будзе непаўнацэнным. «Я яшчэ прыйду да яго, яшчэ прыйду»,— запэўніваў ён сябе.

Але гады міналі, надышла ўжо і старасць, а тое, дзеля чаго толькі і варта было, здаецца, жыць, не прыходзіла. І прафесару пачынала ўжо здавацца падчас, што ён нейкім чынам прапусціў той момант, калі гэта можна было ажыццявіць, што ён сам недаравальна пазбавіў сябе магчымасці зрабіць самае галоўнае ў сваім жыцці.

Ды сёння пра гэта не хацелася думаць. Кузьма Захаравіч паспрабаваў уявіць сабе аўтамат Карпілава. І тут прафесар раптам усміхнуўся сам сабе. Рэч у тым, што аўтарам аўтамата афіцыйна лічыўся не Карпілаў, а другі чалавек. У паведамленні было сказана, што сканструяваў яго электразваршчык М. С. Макарчук. І было яшчэ сказана ў канцы, што кансультаваў гэтага электразваршчыка інжынер С. М. Карпілаў. Аднак Ігнатоўскі ні на хвіліну не сумняваўся, што іменна Карпілаў зрабіў усё ад пачатку да канца. Магчыма, што першапачатковую ідэю і сапраўды даў той рабочы, але ажыццявіць гэтую ідэю мог, вядома, толькі чалавек тэхнічнай думкі.

«Даніна часу,— зноў усміхнуўся Кузьма Захаравіч.— Гэта цяпер самае моднае захапленне — шэфства людзей навукі над работнікамі вытворчасці. Даніна часу!..»

Пра Кузьму Захаравіча нельга было сказаць, што ён не верыць у шэфства. Але ён шчыра лічыў, што ў гэтай справе больш паказнога, чым сапраўднага. Самому яму не даводзілася ажыццяўляць гэтага самага шэфства, і ён не вельмі шкадаваў аб гэтым.

«Вось і інжынер Карпілаў аддае даніну часу,— разважаў Кузьма Захаравіч.— Але са мною ён не будзе гуляць у хованкі. Бо я адразу выведу яго на чыстую ваду».

У гэтую хвіліну прафесар якраз апынуўся перад домам, у якім жыў Карпілаў. Дом быў вялікі, на пяць паверхаў, і займаў сабою ледзь не паўквартала. «Другі пад'езд, чацвёрты паверх, налева»,— успомніў прафесар словы гасціннага інжынера. Вось тут!

І ён рашуча адчыніў тугія, на спружыне, дзверы і гэтак жа рашуча пачаў узбірацца па прыступках. Але гэтай рашучасці хапіла толькі на два маршы лесвіцы, а потым Кузьма Захаравіч вымушаны быў ледзь не праз кожныя дзве-тры прыступкі спыняцца, каб адпачыць і набрацца новых сіл. «Старэеш, бацюхна, старэеш!..» —

з тугою гаварыў сам сабе Кузьма Захаравіч, прыслухоўваючыся, як гучна стукае ў грудзях сэрца.

Да патрэбнай пляцоўкі ён ледзь дацёгся, увесь час лаячы мінскіх будаўнікоў за тое, што яны не робяць у жылых дамах ліфтаў.

На званок прафесара дзверы адчыніў хлопчык гадоў дзесяці-адзінаццаці.

— Вы да нас? — запытаўся ён, з цікаўнасцю разглядаючы доўгую бараду Кузьмы Захаравіча.

— Да вас, калі тут жывуць такія цудоўныя хлопчыкі,— жартаўліва адказаў Кузьма Захаравіч.— Твой тата якраз і запрасіў мяне, каб я паглядзеў, які ў яго цудоўны сын. Ты нічога не маеш супраць?

— Не, я нічога не маю супраць. А хто вы?

— Давай пазнаёмімся,— сказаў Кузьма Захаравіч, уваходзячы ў пярэднюю.— Я прафесар Ігнатоўскі, з Масквы, завуць мяне Кузьма Захаравіч. А цябе?

— А я Косця... Канстанцін,— паправіўся хлопчык. Ён падумаў крыху, быццам нешта ўспамінаючы. Потым узрадавана загаварыў:— Гэта вы напісалі тую тоўстую кнігу, што ляжыць у таты на стале? Там на вокладцы якраз і надрукавана: «Прафесар К. З. Ігнатоўскі».

— Яна табе не спадабалася?

— Чаму, спадабалася,— не маргнуўшы і вокам, храбра схлусіў Косця.— Але там малюнкаў мала.

— Твая праўда, мала. Каюся, вінаваты. І пастараюся як-небудзь паправіць сваю памылку.

— Тады вы распранайцеся, а я пайду скажу тату, што вы прыйшлі.

Косця знік у пакоях.

Распранаючыся, Кузьма Захаравіч чуў праз дзверы, як у адказ на Косцева паведамленне нечы мужчынскі голас усхвалявана сказаў:

— Прафесар Ігнатоўскі? Сам прафесар? З Масквы?

«Напэўна, у Карпілава сабраліся госці,— падумаў Кузьма Захаравіч.— А гаспадар, відаць, не папярэдзіў, што я прыйду».

Потым пачуўся жаночы голас, потым яшчэ мужчынскі. І ўсе паўтаралі яго імя, і ва ўсіх галасы былі, як здалося прафесару, чамусьці не то ўстрывожаныя, не то разгубленыя.

Дзверы з пакояў адчыніліся, і прафесар убачыў перад сабою надзвычай высокага мужчыну ў чорным двухборт-

ным гарнітуры. Кузьма Захаравіч зразумеў, што гэта і ёсць гаспадар кватэры, канструктар аўтамата.

Яму было, відаць, гадоў трыццаць пяць ці мо трошкі болей. Прафесару перш за ўсё кінулася ў вочы яго вялікая галава з высокім ілбом, над якім дыбка стаяла капа цёмных кучаравых валасоў. У канструктара былі рэзкія рысы твару, буйны нос, поўныя губы. Ён неяк нязграбна адтапырваў локці, што тлумачылася, напэўна, вялізнымі памерамі яго рук. Кузьма Захаравіч міжвольна зірнуў на яго пальцы: яны былі важкія і доўгія, як цвікі-пяціцалёвікі.

Ад усяе постаці канструктара павявала зайздросным здароўем і дужаю сілаю. І разам з тым выгляд у яго быў засаромлены, нават збянтэжаны.

«А і здаравяка ж ты, бацюхна! — з захапленнем падумаў Кузьма Захаравіч.— Асілак!»

— Добры вечар,— сказаў ён, працягваючы асілку руку.— Прыйшоў вось пазнаёміцца з вашым аўтаматам і павіншаваць вас. Выдатную рэч зрабілі вы, паважаны калега!

— Дзякую,— грымнуў актаваю канструктар.— Я чуў, што вы ў Мінску... але я не думаў, што вы... Я вельмі рад бачыць...

Ён відавочна хваляваўся.

— Я, канешне, не стаў бы турбаваць вас сёння, каб не гэты ваш аўтамат,— перапыніў яго прафесар.— Што каму руціць, той тое і жупіць. Мне вельмі хацелася пазнаёміцца з аўтаматам, хоць бы ў чарцяжах. Таму я і дазволіў сабе ўварвацца да вас. Заўтра я ад'язджаю. А ў вас, здаецца, госці?

— Ды тут такая рэч... Жонка сёння імяніннііца.

Яны ўсё яшчэ стаялі ў пярэдняй. Нарэшце гаспадар спахапіўся і запрасіў госця ў пакоі.

Зала, куды трапіў потым Кузьма Захаравіч, была параўнальна невялікая, і ўсё тут было надзвычай сціплае, простае, але надабранае і размешчанае з густам. Пасярэдзіне стаяў даўгаваты стол, засланы белым узорыстым абрусам. Адразу направа былі дзверы ў другі пакой, а далей каля сцяны стаяла канапа з чахлом, таксама белым, і мноствам вышываных падушачак. У куце на століку-праігрывальніку знаходзіўся прыёмнік; Кузьма Захаравіч, які быў заўзятым радыёаматарам, з ухвалаю адзначыў марку прыёмніка: «Т-689». Сярэдзіну левай сцяны зай-

маў масіўны строгі буфет, прыбраны ажурнымі карункавымі сурвэткамі. Побач на нейкім арыгінальным трохногім збудаванні красаваўся бліщчасты пузаты самавар. На сценах, на самых бачных месцах, віселі ўдалыя копіі з шышкінскай «Раніцы ў сасновым бары» і «Дзевятага вала» Айвазоўскага.

На ўсім, што было ў пакоі, адчуваўся прыкметны адбітак клапатлівай і ўмелай рукі гаспадыні. Цяпер яна стаяла каля стала, злёгку абапіраючыся на яго левай рукой, і глядзела на прафесара адкрытым светлым позіркам.

— Мая жонка Людміла Фёдараўна,— адрэкамендаваў яе канструктар прафесару.

У процівагу мужу Людміла Фёдараўна стварала ўражанне асобы надта далікатнай, нават кволай. Яна была тоненькая, як дзяўчынка, і, відаць, вельмі рухавая.

Трошкі зачырванеўшыся, Людміла Фёдараўна гасцінна запрасіла прафесара пабыць на яе свяце. Затым яна пазнаёміла Кузьму Захаравіча з гасцямі. Іх было няшмат: пажылы майстар з жонкай, малады токар і яшчэ дзяўчына, студэнтка медінстытута, якая даводзілася пляменніцай гаспадарам. Гэта былі простыя сімпатычныя людзі, яны адразу спадабаліся прафесару.

Косця таксама быў тут. Ён проста вачэй не зводзіў з прафесара. Кузьма Захаравіч пашкадаваў, што не ведаў пра існаванне гэтага мілага хлапчука зараней і таму не прынёс яму ніякага гасцінца. Каб хоць у якой меры згладзіць гэты свой міжвольны промах, Кузьма Захаравіч выняў з кішэні аўтаручку, якую прывёз некалі з Англіі, і даў яе Косцю. Той быў на сёмым небе ад радасці.

Відаць, перад тым, як прыйшоў Кузьма Захаравіч, госці вялі нейкую вясёлую размову, бо і цяпер хто-ніхто з іх кідаў рэплікі, якія выклікалі агульны смех. Прафесару не цярпелася пагаварыць з гаспадаром, таму ён, выбраўшы зручны момант, адразу звярнуўся да яго з просьбай расказаць яму пра аўтамат.

Яны перайшлі ў пакой, што быў побач з залай. Канструктар пазбавіўся ўжо сваёй нядаўняй збянтэжанасці і трымаўся амаль што натуральна, без нацягнутасці.

— Гэта наш з Кастусём кабінет,— сказаў, усміхаючыся, гаспадар.— Адзін стол на двух. Другога, як бачыце, ставіць няма дзе. Але мы не сварымся. Строга пільнуемся чаргі.

Пакой быў і сапраўды вельмі маленькі. Аднак і тут панавалі чысціня і парадак. Кузьма Захаравіч прабег вачыма па паліцы з кнігамі. «Здаецца, тут больш белетрыстыкі, чым тэхнічнай літаратуры»,— здзівіўся ён.

Гаспадар дастаў з шуфляды стала пухлую папку зялёнага колеру, развязаў матузкі, любоўна падраўняў і без таго акуратна складзеныя паперы.

— Ну, вось. Глядзіце і судзіце.

Прафесар узяў папку ў рукі, злёгку патрос яе, нібы ўзважваючы.

— Гэта, значыцца, і ёсць ваш аўтамат? — паасобна вымаўляючы кожнае слова, выразна спытаў Кузьма Захаравіч.

— Гэта і ёсць мой аўтамат,— проста адказаў гаспадар.

Непрыкметна для канструктара прафесар усміхнуўся. «От бачыш, бацюхна, са мною не мае сэнсу гуляць у хованкі!» — гаварыла гэтая ўсмешка.

А далей прафесар з цікавасцю пачаў разглядаць матэрыялы папкі. Перш за ўсё яму трапіўся фотаздымак аўтамата. Прыкладна такім і ўяўляў яго сабе Ігнатоўскі. Надзвычай цікавая і разам з тым вельмі простая канструкцыя.

— Па гэтых трубах,— прафесар паказаў на апушчаныя ўніз і выгнутыя, як хобаты, дзве трубы,— да дуг аўтаматычна падаецца электродны дрот?

— І флюс таксама.

— І флюс? Арыгінальна.

Прафесар задаваў адно пытанне за другім. Яго цікавіла ўсё — электрычныя і хадавыя дадзеныя аўтамата, лінейная хуткасць, расход зварачных матэрыялаў. Канструктар даваў падрабязныя і грунтоўныя тлумачэнні. Гаварыў ён проста, не злоўжываючы тэхнічнымі тэрмінамі, і гэта прыйшлося Кузьму Захаравічу вельмі да спадобы.

Але, гэты чалавек быў раўня яму, прафесару Ігнатоўскаму.

— Ну што ж,— сказаў Кузьма Захаравіч,— вельмі рад за вас, Сцяпан Максімавіч. Вельмі рад. Прыміце маё самае шчырае віншаванне. Выдатную штуку змайстравалі вы!

— Дзякую, Кузьма Захаравіч,— расчулена адказаў канструктар.— Сардэчна дзякую. Ваша пахвала для мяне значыць вельмі многа.

У пакой увайшла Людміла Фёдараўна і запрасіла Кузьму Захаравіча і мужа да стала.

— Папярэджваю, я магу напіцца,— жартаўліва сказаў Кузьма Захаравіч.— Бо буду піць і ў ваш гонар, і ў гонар вашага мужа, Сцяпана Максімавіча.

Канструктар раптам пачырванеў і зусім па-дзіцячы пераступіў з нагі на нагу.

— Прабачце мне, Кузьма Захаравіч...— запінаючыся і адчуваючы сябе, відаць, вельмі няёмка, вымавіў ён.— Я хацеў сказаць... Гэта, вядома, дробязь, але...

Прафесар хутка павярнуўся да канструктара.

— Што?

— Я хацеў сказаць... Мяне завуць не Сцяпанам Максімавічам, а наадварот — Максімам Сцяпанавічам. Вы некалькі разоў паўтарылі...

— Ну вось бачыце, я ўжо п'яны,— засмяяўся Кузьма Захаравіч. Потым ён паглядзеў на канструктара і пасур'ёзнеў.— Дзіўна. Я дагэтуль ніколі не скардзіўся на сваю памяць, асабліва на зрокавую. Між тым, я ўпэўнены, што ў часопісе было надрукавана іменна так: С. М. Карпілаў. Хіба там была памылка?

— Не, там памылкі не было. Інжынера Карпілава сапраўды завуць Сцяпанам Максімавічам. Там было правільна.

Прафесар ссунуў бровы, па твары яго прабег цень.

— Нічога не разумею,— пахмура сказаў ён.— Вы жартуеце, ці што?.. Гм, Карпілава завуць Сцяпанам Максімавічам, а вас Максімам Сцяпанавічам. Гм! Можа, вы яшчэ скажаце, што не маеце ніякага дачынення да інжынера Карпілава?

— Не, чаму, гэтага я не скажу. Ён вельмі памог мне. Сцяпан Максімавіч дужа добры чалавек. Я яму шмат чым абавязаны.

Вочы прафесара пашырыліся, ён утаропіўся на Максіма Сцяпанавіча нейкім дзіўным, нібы спалоханым, позіркам. Потым ён раптам пляснуў сябе рукою па лбе і гучна, на ўсю кватэру, рассмяяўся.

— Скажыце,— давячыся смехам, спытаў ён.— Гэта каторы паверх? На якім паверсе вы жывяце?

— На трэцім...— чамусьці шэптам адказаў Максім Сцяпанавіч.— А што? Высока?

— А над вамі жыве Карпілаў, так?

— Але, ён.

Прафесар усё яшчэ смяяўся. І ўсё глядзеў на Максіма Сцяпанавіча, глядзеў так, быццам толькі цяпер упершыню ўбачыў яго.

— Адбылася грандыёзная, неймаверная памылка, дарагі Максім Сцяпанавіч,— весела прамовіў прафесар.— Але я не шкадую. Будзем спадзявацца, што інжынер Карпілаў даруе мне. Не, я не шкадую. Сёння, у гэтым пакоі, я зрабіў важнае адкрыццё. Самае важнае ў сваім жыцці. Дык пойдзем і падымем чаркі за гэтае адкрыццё!

Прафесар Ігнатоўскі ўзяў пад рукі зваршчыка Макарчука і яго жонку Людмілу Фёдараўну, і яны пайшлі ў залу. Там за сервіраваным па-святочнаму сталом рассаджваліся госці.

*1956*

# СНЕЖКІ

Вера ішла па вуліцы і ўсміхалася — ледзь прыкметна, аднымі вуснамі ды хіба толькі яшчэ светлымі сваімі вачыма. Усміхалася, не заўважаючы нікога навокал. А людзей на вуліцы было многа, бо дзень выдаўся надзвычай харошы. Было не вельмі горача, хоць лета ўвабралася ўжо ў сілу. У такія дні грэх спяшацца, і людзі хадзілі павольна.

— О!..— раптам пачула Вера нечы голас.— Гэтак можа ўсміхацца толькі шчаслівы чалавек!

Вера здрыганулася, зірнула направа. Побач з ёю ішоў невысокі падцягнуты малады чалавек ў форме чыгуначніка. Крочыў ён цвёрда, важна, і Вера, міжвольна патрапляючы пад яго хаду, прыцішыла свой дробны крок.

Малады чалавек напэўна зразумеў, што словы яго сказаны не да ладу, бо ён тут жа паспяшыў апраўдацца:

— Выбачайце... Я не тое хацеў сказаць. Гэта ў мяне проста так, нечакана вырвалася.

— Я не крыўдую...

Усмешка зноў з'явілася на Верыным твары.

Чыгуначнік, між тым, гаварыў далей:

— Вось я ішоў і ўсміхаўся сам сабе. Гляджу — і вы таксама ўсміхаецеся. Эге, думаю, не толькі ў аднаго мяне радасць на сэрцы...

«Нашто ён усё гэта гаворыць? — падумала Вера.— Каб пачаць знаёмства?..»

— Ну, мне направа,— прамовіў чыгуначнік.— Да пабачэння. Выбачайце і не крыўдуйце, калі ласка.

Ён прыклаў руку да казырка шапкі, злёгку нахіліў галаву і пайшоў у завулак сваёй цвёрдай, важнай хадою.

Вера знікла ў натоўпе.

...Ніна з нецярплівасцю чакала сяброўкі. Ёй хацелася даведацца, што сказалі Веры ў камісіі: пашлюць яе куды-небудзь на лінію ці пакінуць тут, у Мінску?

— Еду! — уварваўшыся ў пакой, выгукнула Вера.— Радасць, Ніна, якая радасць!

Яна абняла сяброўку, прыціснула яе да грудзей — моцна, па-хлапечы,— пасля замітусілася па пакоі, хапаючы адну за другой розныя дробязі і прыгаворваючы:

— Гэта мне не трэба будзе... Гэта не трэба... Там мне шмат чаго будзе не трэба!..

Ніна села на крэсла і палахліва паглядзела на сяброўку.

— Што ж ты не радуешся, Ніначка? Чаму ў цябе гэткія будзённыя вочы?

— Дзяўчо ты неразумнае!..— уздыхнула Ніна.— І ты гэтаму радуешся?

Ніна лічыла сябе больш сталай і разважлівай за Веру і таму заўсёды размаўляла з ёю, як старэйшая з маладзейшай, хоць былі яны аднагодкі.

— А ты паслухай,— растлумачыла сваю радасць Вера.— Еду я не назусім, а па некалькі месяцаў. Мяне запэўнілі, што праз кароткі час мне прышлюць змену.

— І ты згадзілася?

— А што ж было рабіць? Другіх пасылаюць назаўсёды. А я праз якія паўгода зноў буду хадзіць у кіно, у тэатры... Так што сумаваць няма чаго, Ніначка.

— І куды ж цябе запіхваюць?

— Не запіхваюць, а пасылаюць.

— Іменна запіхваюць! — не згадзілася Ніна.— І каго? Цябе, першую красуню на курсах!

— Пры чым тут красуня? Тым больш, што на кароткі час я сама згадзілася паехаць.

— Ну, няхай сама... І куды?

— На раз'езд Снежкі. Прыслухайся, як прыгожа гэта будзе гучаць: «Дзяжурная па раз'езду Снежкі Вера Зубок!» Хіба не прыгожа, а? — Гаворачы гэта, Вера стала па камандзе «смірна», падняла выцягнутую далонь рукі да сваіх пышных каштанавых валасоў і па-маладзецку цокнула абцасікамі чаравікаў.

— Снежкі... Фі! — паморшчылася Ніна.— І дзе толькі яны знаходзяцца гэтыя Снежкі? Ці не ў чорта ў зубах?

— Сто сорак сем кіламетраў ад Мінска,— удакладніла Вера.

— Уяўляю. Ні людзей там, ні кіно, ні танцаў... Адна ўцеха — чакай, пакуль прыйдзе пасажырскі поезд. А тады бяжы на перон ды на ўсе вочы глядзі на чужое шчасце. А калі адыдзе поезд, валачыся ў сваю каморку і грызі пазногці ад суму і зайздрасці.

— Ну, пазногці астануцца цэлыя,— засмяялася Вера.— Справа ў тым, што пасажырскія паязды там не прыпыняюцца.

— А бацюхны! — пляснула рукамі Ніна.— Гэткая глушэча!

— Не палохайся, Ніначка,— заспяшалася супакоіць сяброўку Вера.— Паўтараю, што я туды — ненадоўга.

— Ой, глядзі, каб...— пачала Ніна, але не скончыла свае думкі, перайшла на другое.— А калі трэба ехаць табе?

— Заўтра.

— Шкада. Я дастала на заўтрашні спектакль два білеты. Ведаеш, паравознікі паладжваюць калектыўны паход у тэатр. Можа, і ён там будзе.

Веры не трэба было пытацца, хто гэта «ён». Вось ужо тыдзень, як Ніна трызніць нейкім Цімафеем Баршчэўскім. Яна выпадкова пазнаёмілася з ім на адным вечары ў чыгуначным клубе. Праўда, хлопец адразу ж, відаць, забыўся пра гэтае знаёмства, бо, паводле Ніііных слоў, назаўтра нават не прывітаўся з ёю, калі яны сустрэліся на вуліцы. Ну, а яна... яна проста месца сабе не знаходзіць.

— Шкада...— яшчэ раз паўтарыла Ніна, але асаблівага жалю ў яе словах Вера не адчула. Наадварот, Ніна як быццам была нават рада, што заўтра будзе ў тэатры без Веры.

«І што там за такі Цімафей Баршчэўскі? — падумала Вера.— Хто ён? Хоць бы глянуць на яго...»

Нечакана Вера ўспомніла чыгуначніка, што загаварыў сёння з ёю на вуліцы. «Дзівак нейкі»,— усміхнулася яна. І аднак жа думаць пра яго ёй чамусьці было прыемна. Было ў ім нешта такое прывабнае, шчырае. «Відаць, гэта добры чалавек»,— падумала Вера, і ёй раптам зрабілася шкада, што яна не пазнаёмілася з ім бліжэй. «Як гэта крыўдна — прамільгнуў і няма, і можа ўжо больш ніколі не сустрэну яго...»

Вера заснула толькі на досвітку. Сон яе быў трывожны, неспакойны.

Раніцай яны з Нінай развіталіся.

— Калі не замерзнеш у гэтых сваіх Ільдзінках... ці як іх... Снежках — пішы! — правёўшы Веру на станцыю, па-

спрабавала пажартаваць Ніна. Але жарт не выйшаў, і Ніна, злёгку дакрануўшыся сваёй шчакой да Верынай, паспешліва пайшла дамоў.

Пасажырскія паязды сапраўды не спыняліся ў Снежках, і Веры прыйшлося ехаць на таварным.

Раніца была хмарная. Шэрае неба нізка вісела над зямлёй. Збіралася на дождж.

На адкрытай тармазной пляцоўцы вялікага, цяжка нагружанага вагона ехаць было далёка не прыемна. Ад працізлівага ветру стылі не толькі рукі і ногі, але, здавалася, і сама кроў у целе. Седзячы на чамаданчыку, Вера круцілася і так і гэтак, спрабавала закрыць твар далонямі рук, але нічога не памагала.

Поезд быў зборны, ішоў ён марудна, на кожнай станцыі і нават на кожным раз'ездзе прастойваў па гадзіне, а то і больш. Чыгуначнікі адчаплялі ад яго вагоны з так званым мясцовым грузам, прычаплялі парожнія,— усё гэта займала шмат часу.

На прыпынках Вера саскоквала з вагона, хуценька тупала па шпалах уздоўж састава спачатку ў адзін бок, потым у другі. Сагрэўшыся такім чынам, зноў лезла на сваю пляцоўку, баючыся адстаць ад поезда.

На станцыі Сенніца міма зборнага, як віхор, прамчаўся доўгі таварны эшалон. Вера ўздрыгнула. Незнарок глянуўшы на паравоз, яна ўбачыла, што машыністам на ім быў той самы чыгуначнік, з якім яна ўчора размаўляла ў Мінску. Вера пачырванела. Ёй здалося, што і машыніст пазнаў яе, бо ён усміхнуўся і нават нешта сказаў. Але яго слоў, вядома, чуваць не было, іх заглушыў грукат поезда.

Міма пранесліся апошнія вагоны. Удалечыні паступова заміраў гул колаў. Тады пачуўся далёкі працяглы гудок. Ён прагучаў і таксама замёр. Вера ведала, што, пакідаючы станцыю, машыніст, паводле правіл, павінен даць гудок. Але ёй хацелася думаць, што ён прывітаў гудком яе, Веру...

Неба праяснілася, вакол пасвятлела; хоць зборны цягнуўся і марудна, ён усё ж здолеў уцячы ад дажджу. Хмары асталіся недзе далёка ззаду.

Праехаўшы з дзесятак кіламетраў, поезд зноў пачаў прыцішаць ход.

— Ды гэта ж Снежкі! — усклікнула Вера, угледзеўшы шыльду, што вісела на невялічкім, жоўтага колеру будынку, які стаяў воддаль ад пуцей. Метраў з паўсотні

ад яго знаходзіўся яшчэ адзін даўгаваты будынак, а больш... а больш вакол нічога і не было.

— Вось вы якія, мае Снежачкі...— прашаптала дзяўчына.

Распагодзілася. Заходзіла сонца. Павяваў над полем лёгкі ветрык. Дзесьці недалёка чувацъ быў шум аўтамашыны, мусіць, грузавой, але яе самой не было відаць — да раз'езда сцяной падступала высокае густое жыта...

Поезд ужо даўно пайшоў, а Вера ўсё яшчэ стаяла пад адхонам і задуменна пазірала вакол. Стаяла, аж пакуль не заўважыла, што з акна аднаго будынка за ёю сочаць вочы нейкага хлапчука. Вера схамянулася і пайшла да службовага памяшкання.

Начальніка раз'езда яна знайшла ў дзяжурцы. Гэта быў невысокі таўставаты чалавек з гладка паголенай галавой, але з густымі чорнымі вусамі на шырокім твары. На выгляд яму было за пяцьдзесят.

— Вельмі прыемна,— сказаў ён, зазірнуўшы ў яе дакумент.— Таварыш Зубок? Вера Кандратаўна? А мяне завуць Дзянісам Фёдаравічам. Прозвішча маю самае звычайнае: Іваноў. Вельмі, вельмі прыемна!

Апошнія словы ён прамовіў так, што Веры было незразумела, што ж яму прыемна — ці тое, што яна прыехала, ці што ён мае такое самае звычайнае прозвішча.

Відаць, Іваноў і не дачытаў да канца паперкі.

— Гэта добра,— сказаў ён, складваючы яе.— Пажывем, папрацуем. Свежы струмень, як гэта кажуць, нам патрэбен, вельмі патрэбен. Прызнацца вам, дык я не вялікі знаўца ў тэхніцы. Практык я. А вы ж вучыліся. То, можа, і паможаце мне. Задумаў я, між іншым, адну справу. Наконт паскарэння руху паяздоў на ўчастку.

Вочы ў Іванова заблішчалі. Ён выняў з шуфляды стала сшытак, разгарнуў яго.

— Б'юся вось, б'юся. Зрабіў сякія-такія разлікі. Але, як кажуць, вучэнне — святло, а невучэнне — цемра... Выбачайце, што вы скончылі?

Дзяніс Фёдаравіч зноў зазірнуў у Верыну паперку. Нечакана ён спахмурнеў, на пераносся ляглі дзве глыбокія зморшчыны.

— Дык вы не пазусім? Часова?

— Але... Потым вам прышлюць...

— Яно вядома...— ужо зусім другім голасам сказаў Іваноў і загарнуў свой сшытак. Ён доўга моўчкі шукаў нечага ў шуфлядах стала.

Маўчала і Вера. У яе было такое адчуванне, быццам яна нечым моцна пакрыўдзіла гэтага крыху смешнага, але такога сімпатычнага і, відаць, добрага чалавека. Яна збянтэжана адвяла свой позірк ад Іванова, утаропілася ў акно. Пад самым акном раслі нейкія прыгожыя чырвоныя кветкі. Вера не ведала, як гэтыя кветкі завуцца, але яны ёй вельмі спадабаліся. Ад іх у пакой ішоў прыемны густы водар.

Не ўзнімаў вачэй на Веру і Дзяніс Фёдаравіч. Так і не знайшоўшы, чаго шукаў, ён нездаволена сказаў:

— Ключы ад вашага пакоя, ліха па іх, некуды зніклі. Але гэта нічога, пойдзем, ён не замкнуты. Хавацца тут у нас няма ад каго. Пойдзем. Ложак там ёсць, стол, крэсла. Коўдру і падушку дасць мая жонка, Таццяна Паўлаўна. Яна ў нас накшталт каменданта.

Па дарозе да дома, дзе жылі работнікі раз'езда, Іваноў і Вера не прамовілі ні слова. Пачуццё нездаволенасці сабою ўсё больш і больш расло ў душы Веры.

Прызначаны для яе пакой быў невялічкі, але ўтульны. Адно акно выходзіла на пуці, з другога адкрываўся прыгожы краявід: жытняе поле, паўз якое бегла кудысьці вузенькая сцежка, далей — малады бярозавы лясок, улева ад якога сінеў на гарызонце сасновы бор.

— Я зараз жонку прышлю. Уладжвайцеся.

Дзяніс Фёдаравіч пайшоў, а неўзабаве з'явілася Таццяна Паўлаўна. Энергічная, рухавая жанчына, яна выглядала яшчэ зусім не старой. «Відаць, прыгожая была ў маладосці»,— падумала Вера.

— Дзень добры! — скорагаворкай прамовіла яна і пачала засцілаць ложак.— Вы з Мінска?.. Скончылі там курсы?.. А цяпер да нас?..

Вера не ўпраўлялася адказваць на адно пытанне, як Таццяна Паўлаўна задавала ўжо новае. Яе цікавіла ўсё: і колькі дзяўчыне год, і дзе яна нарадзілася, і ці замужам, і які крэндэлькі болей любіць: гладкі ці квяцістыя?

— А прывакзальную плошчу ў Мінску ўжо забудавалі? — сыпала яна пытанні.— Кажуць, начальніка службы руху скора здымуць — гэта праўда? А ў цырку вы былі? Не?..

Убачыўшы кагосьці ў акне, яна гукнула:

— Пятро! Што ж не ідзеш знаёміцца?

І дадала, звяртаючыся да Веры:

— Гэта наш стрэлачнік. Пятро Гулецкі. Не чулі?

Пятро на выгляд быў зусім малады хлапец. Ён відавочна саромеўся Веры. Прыйшоў ён не з пустымі рукамі — прынёс нейкую невялічкую скрыначку.

— Вось... можна будзе слухаць,— ставячы скрынку на тумбачку каля ложка, нясмела прамовіў Пятро.— Прыёмнік. І навушнікі да яго.

— Сам змайстраваў! — з гордасцю сказала Тацяна Паўлаўна.— Ён тут усім нам парабіў прыёмнікі. Такі аматар!

Потым, калі Пятро пайшоў, Тацяна Паўлаўна горача сказала:

— Далёка пойдзе! Разумны — проста жах! Дзесяцігодку скончыў, ва універсітэце завочна вучыцца. Далёка пойдзе!

І такая ўпэўненасць была ў яе словах, што не паверыць ёй было проста немагчыма.

— За вячэрай я пазнаёмлю вас з нашым бібліятэкарам Сямёнам Лірай. Чуеце?.. Сямён Ліра... Гэта не сапраўднае яго прозвішча, гэта ён так прыдумаў. О, галава! Гэты яшчэ далей пойдзе! — І ціха, нібы паведамляючы надзвычайны сакрэт, Тацяна Паўлаўна дадала: — Вершы піша. О, што гэта за вершы, дзіцятка ты маё! І наплачашся, і нарагочашся слухаючы. Талент!

Тацяна Паўлаўна нечым няўлоўным напомніла Веры яе маці, добрую старую маці... Яна жыве ў Оршы, жыве адна, бо дзеці даўно павырасталі і раз'ехаліся па свеце...

Вера яшчэ раз агледзела пакой. «Вунь там, каля сцяны, якраз стаў бы яшчэ адзін ложак, для маці»,— мільганула думка...

— А мы тут з Дзянісам Фёдаравічам трыццаць пяць гадкоў працуем ужо,— гаварыла далей Тацяна Паўлаўна.— Як ажаніліся, дык адразу і прыехалі сюды... Ну, уладжвайцеся, адпачывайце. Вячэраць я вас паклічу. А заўтра ў кіно пойдзем. Кажуць «Тараса Шаўчэнку» будуць паказваць.

— Куды ў кіно?

— Вагон-клуб прыедзе. Ён да нас кожны тыдзень наведваецца.

У гэты час у пакой, смешна ступаючы нагамі, на якіх былі вялікія жаночыя чаравікі, увайшла дзяўчынка гадоў

чатырох. Яна была пухленькая, кругленькая, з расчырванелымі шчочкамі, апрапутая ў кароценькую ружовую сукеначку. Па баках яе галавы тарчалі дзве невялікія косачкі з сінімі шаўковымі стужкамі.

— Бабуля! — радасна выгукнула дзяўчынка.— Ты сказала, што табе чаравікі ціснуць. А мне яны ані сколечкі не ціснуць. Паглядзі!

Таццяна Паўлаўна з замілаваннем пляснула ў далоні.

— А ўпучачка ж ты мая! А сонейка ты маё!

Яна падхапіла дзяўчынку на рукі, паднесла яе да Веры.

— А да нас цётачка прыехала. Харошая-харошая цётачка! Ну, пазнаёмся. Скажы, як цябе завуць.

Дзяўчынка скоса агледзела Веру, потым смела працягнула руку і выразна сказала:

— Наталка.

...Надышла ноч — цёплая, зорная. Вецер супакоіўся, на дварэ стала ціха-ціха. Паветра было насычана нейкімі дзіўнымі незнаёмымі для Веры пахамі. Седзячы каля расчыненага акна, Вера зусім і забылася на тое, што ўжо вельмі позна і даўно час класціся спаць. Перад ёю быў зусім новы свет, і сэрца прагна цягнулася пазнаць яго.

У цішыні дзесьці далёка-далёка пачуўся працяглы паравозны гудок. Вера пазнала, што гэта ідзе пасажырскі поезд. Праз некаторы час чуцён стаў глухі, невыразны гул. Паступова ён мацнеў, пашыраўся...

Поезд набліжаўся да раз'езда.

Вера ўзлезла на падаконнік, азірнулася вакол. «Дзяўчо ты неразумнае!» — успомніла яна раптам Ніпіны словы. Ціхенька засмяяўшыся, Вера саскочыла з падаконніка ў мяккую росную траву і пабегла да пуцей.

Дзяжурыў у гэтую ноч Павел Вяхотка, сярэдніх год чалавек, бацька чатырох дачок. Вяхотка выйшаў з дзяжуркі сустракаць поезд.

— Не спіцца,— спытаў ён у Веры.

— Не спіцца.

— Ну, ну...— няпэўна сказаў Вяхотка.

Гул поезда ўсё мацнеў. Налева ўдалечыні раптам паказаўся прамень святла. Ён хутка набліжаўся. Вось ён слізгануў па Веры, па Вяхотку. Перад вачыма з грукатам прамчаўся паравоз, а за ім, паблісквагочы асветленымі вокнамі, руплівa прастукалі вагоны. Вера міжвольна ад-

хінулася, але тут жа злосна папракнула сама сябе: «Дзяўчо!»

Поезд быў ужо далёка. Мільгацеў, аддаляючыся, чырвоны агеньчык хваставога вагона. Вось і ён знік. Некаторы яшчэ час чуўся далёкі гул, але і ён нарэшце сціх.

— Боязна? — з усмешкай у голасе спытаў Вяхотка.

— Трошачкі,— прызналася Вера.

— Гэта нічога. Жыць можна...— І Вяхотка дабрадушна засмяяўся.

Ён пайшоў у дзяжурку, а Вера, астаўшыся адна, нерухома стаяла і глядзела ў той бок, дзе знік чырвоны агеньчык пасажырскага поезда.

Дзіўная рэч: ёй не было сумна тут, на гэтым далёкім паўстанку. Вера села на рэйку, успомніла школу, сяброў. Успомніла чамусьці аднакласніка Ваську Бохана, самага непаседлівага ў 19-й школе хлапчука, гарэзу і свавольніка. І ёй раптам самой захацелася зрабіць што-небудзь незвычайнае, ну, хоць бы пакласці ў рот два пальцы і засвістаць... Але яна ў час адумалася.

Ісці Веры нікуды не хацелася, і яна так і сядзела на рэйцы.

«Сёння я ўсё роўна не засну»,— падумала яна.

А да раніцы было ўжо недалёка. Святлела неба, гаснулі зоркі. Праляцеў па-над пуцямі ветрык-свавольнік і, не знайшоўшы, чым забавіцца тут, шугануў на поле, у збажыну. Жыта калыхнулася, зашумела, нібыта ўзрадавалася магчымасці сагнаць з сябе дрымоту.

Веры хацелася заспяваць. Голас у яе быў не вельмі моцны, але чысты і свежы. Песня, спачатку ціхая, неўзабаве гучна зазвінела ў гулкай перадраніпняй цішыні...

— Цудоўненька! — раптам прагучаў за спіной у Веры ўсхваляваны голас.— Цудоўненька, каб я жыў!

Вера здрыганулася, азірнулася. Ззаду стаяў Вяхотка. Ён схапіў яе за руку, моцна пацісну ў.

— Такая знаходка! — узрушана гаварыў Вяхотка.— Проста з неба звалілася.

Не адпускаючы Веры, Вяхотка за руку павёў яе ў дзяжурку. Там ён пасадзіў яе ў крэсла і, прыпяваючы «трум-бум-бум, трум-бум-бум», пачаў спрытна пстрыкаць пальцамі ў паветры. Потым ён падышоў да сцяны, зняў з цвіка скрыпку. Не паспела Вера здзівіцца, чаму ў дзяжурцы знаходзіцца такая пабочная рэч, як Вяхотка, увесь асвет-

лены нейкім унутраным святлом, крануў ужо струну смычком, падкруціў калок і папрасіў:

— А што, калі мы разам нешта выканаем? Вы будзеце спяваць, а я — акампаніраваць... А? Напрыклад, «Тонкую рабіну»?..

— Навошта ж такое сумнае? — Вера падумала хвілінку і, злёгку трасянуўшы кучаравымі валасамі, пачала:

Легко на сердце от песни веселой...

Вяхотка адразу падхапіў мелодыю. Адбіваючы нагою такт, ён спрытна вадзіў смычком па струнах.

— Не, гэта ж проста цудоўненька! — узрадавана гаварыў Вяхотка.— Нам якраз не хапала сапрана.

— Каму гэта «нам»?

— Нашаму хору.

— Хору? — перапытала Вера.— Які ж у вас тут хор, калі на раз'ездзе ўсяго толькі сем дарослых.

— А ў нас тут калгас недалёчка. «Чырвоная зорка» завецца. Клуб там у іх — замілаванне! Там і драмгурток ёсць, і струнны аркестр, і духавы. А галоўнае — хор. Першакласны! На ўсю вобласць, далібог, не перабольшваю! Паслязаўтра самі пераканаецеся, спеўка ў нас там будзе.

Заглядаючы ў вочы Веры, Вяхотка з нейкай асаблівай даверлівасцю паведаміў:

— У мяне, ведаеце, ёсць мара. Хачу паставіць оперу. «Наталку-Палтаўку». А што? — сам сабе задаў ён пытанне, і сам жа адказаў: — Паставім!

Зазваніў тэлефон.

— Вось толькі вас і не хапала, Наталка! — Твар Вяхоткаў расплыўся ва ўсмешцы. Ён узяў трубку.— Дыспетчар? Слухаю... Добра, будзем сустракаць.

Ён, відаць, і не заўважыў, што гаварыў з дыспетчарам ад імя дваіх.

— Цяжкавагавы ідзе ў Мінск,— паведаміў Вяхотка Веры.— Цімафей Баршчэўскі вядзе яго. Ведаеце такога машыніста?

— Цімафей?.. Баршчэўскі?.. Недзе чула...

Вера задумалася. Сапраўды, дзе яна чула гэтае імя і прозвішча?.. Здаецца, зусім нядаўна нехта ўспамінаў пра яго. Але хто? Дзе?..

«Ніна!» — раптам успомніла яна.

Запавольваючы ход, да раз'езда набліжаўся доўгі эшалон. На дварэ ўжо святлела.

— Першакласны машыніст! — выходзячы з дзяжуркі, гаварыў Вяхотка.— Ініцыятар вадзіць цяжкавагавыя паязды, майстар высокіх прабегаў лакаматыва, і ўсё такое іншае.

— Гэта вы пра Баршчэўскага?

— Ну, але, пра яго. Малады, а такі...— Вяхотка на момант змоўк, падшукваючы слова.— Такі хвацкі!

Поезд з грукатам набліжаўся. Вера зацікаўлена, не адрываючыся, глядзела на акно паравоза...

«Цімафей Баршчэўскі?! Ды гэта ж ён, яе незнаёмы чыгуначнік!..»

Ад нечаканасці Вера ўздрыгнула. На нейкі міг погляды іх стрэліся, і Вера адчула, як немаведама чаму ў яе часта-часта застукала сэрца.

Цімафей Баршчэўскі вяртаўся з рэйса назад у Мінск. У Снежках поезду па графіку быў назначаны невялікі прыпынак. Трэба было пачысціць топку, агледзець машыну. Спыніўшы поезд, Баршчэўскі паспешна кінуў памочніку і качагару:

— Вы тут займіцеся... А я хуценька...

І ледзь не бягом рушыў да Веры.

Дзяўчына стаяла на вузенькім драўляным перончыку адна: Вяхотка пайшоў у дзяжурку дакладваць дыспетчару, што прыбыў поезд.

Яшчэ на хаду Цімафей гукнуў:

— Вы тут?.. Якім чынам?..

Вера збянтэжана маўчала, шчокі дзяўчыны пачырванелі.

— Выбачайце...— сумеўся Цімафей.— Вы мяне, можа, і не помніце.

— Помню,— ціха сказала Вера і дадала: — Я тут працаваць буду. Доўга-доўга!

— Разумею. Пазаўчора вы гэтаму і радаваліся?

Вера прамаўчала.

— А ў мяне тады таксама была радасць. Мяне прызначылі на пасажырскі паравоз. Заўтра ён выходзіць з рамонту, буду прымаць.

— А-а-а... — працягнула Вера.— На пасажырскі!..

Цімафею трэба было вяртацца на паравоз, але ён чамусьці марудзіў.

— Слухайце,— раптам сказаў ён.— Тут у вас, у Снежках, так хораша... Калі вы дазволіце, я ў нядзелю прыеду сюды адпачываць. На цэлы дзень!

— На чым? — засмяялася Вера.— Пасажырскія паязды тут не спыняюцца.

— На «Масквічы». Дарма, ці што, купляў я яго?

Да іх ішоў Вяхотка. Відаць, ужо набліжаўся час адыходу поезда.

— Можна? — зазіраючы ў Верыны вочы, запытаў Цімафей.

— Прыязджайце... Ды не стойце, бяжыце хутчэй на паравоз! А то вы нам графік парушыце!..— хутка прамовіла Вера.

Яна сама здзівілася, як цвёрда і ўпэўнена вымавіла гэтае слова «нам». Веры было так прыемна, як ніколі раней. Нейкая своеасаблівая, незнаёмая ёй дагэтуль усхваляванасць апанавала ўсю яе істоту.

Павольна адыходзіў ад Снежкаў поезд. Узляцеў, залунаў над прасторамі ягоны голас — моцны, зазыўны.

— Ча-кай-це-е-е!..— спяваў, здавалася, паравозны гудок.

*1953*

# ДЗЯЎЧЫНА І СТЭП

Ніхто не думаў, што паштальён Ілья Цыбін гэтак забавіцца ў трэцяй брыгадзе. Адсюль, з цэнтральнай сядзібы саўгаса «Гвардзейскі», да трэцяй брыгады было дваццаць кіламетраў, і Ілья звычайна вяртаўся на пошту сама позна ў дзве гадзіны. А цяпер пайшла ўжо чацвёртая гадзіна, а яго і почуту не было. Між тым, трэба было везці пошту ў другую брыгаду. Акрамя звычайнай карэспандэнцыі сёння былі туды дзве тэлеграмы, і адна з іх, тэрміновая,— трактарысту Леаніду Анікіну.

Адсунуўшы ад сябе лічыльнікі, начальнік паштовага аддзялення Шылыкоўскі злосна сказаў:

— Аднак, дзе ж гэта ён бадзяецца, ёлкі-палкі! Відаць, для яго зусім перастала існаваць такое паняцце, як працоўная дысцыпліна. От закачу яму вымову, тады будзе ведаць начым фунт ліха!

Ніхто з супрацоўнікаў нічога не адказаў Шылыкоўскаму. Адна толькі прыёмшчыца Тамара Славікава, бялявая дзяўчына з яснымі шэра-блакітнымі вачыма і пухленькімі шчочкамі, ціха прамовіла:

— Можа, з ім у дарозе што здарылася. Конь жа ў яго стары, ледзь ногі цягае. Не конь, а адна пакута.

— Гм, конь стары! — Шылыкоўскі яшчэ далей адсунуў лічыльнікі.— На такім кані можна яшчэ сто разоў на Марс з'ездзіць і назад вярнуцца, а не тое, што...

Падумаўшы, Шылыкоўскі дадаў:

— А хоць і стары, дык што? Дагэтуль можна было і неша дацягціся, ёлкі-палкі!

Пачакалі яшчэ хвілін пятнаццаць. Тамара выйшла на вуліцу, паглядзела ў той бок, адкуль павінен быў пры-

ехаць Ілья Цыбін. Вуліца была пустая, нічога падобнага на фурманку не было відно.

Дзень быў марозны. Мяла лёгкая замець. Па небе плылі пёрыстыя воблакі; яны здаваліся пеннымі хвалямі на неабсяжным сцюдзёным моры.

Пацепваючыся ад холаду, Тамара хутка вярнулася ў кантору.

— Ну?..— сустрэў яе пытаннем Шылыкоўскі. У голасе яго было столькі надзеі, што Тамара не адважылася сказаць яму «няма».

— Дайце я занясу,— нечакана прамовіла яна, і сама спалохалася гэтых сваіх слоў.

— Што? — не зразумеў Шылыкоўскі.— Куды?

— У другую брыгаду.

— Пеша? Гэтага яшчэ не хапала!

— Тут жа недалёка, адных толькі сем кіламетраў,— хутка стала гаварыць Тамара, пераконваючы галоўным чынам самую сябе.— Гэта зусім недалёка, я летам хадзіла туды.

— То ж летам. А цяпер зіма, ёлкі-палкі. І на вечар вунь ужо бярэцца.

— Пакуль сцямнее, я дабягу. Я дарогу добра ведаю. А начаваць астануся там. Мне не будзе страшна, не.

Начальнік строга паглядзеў на Тамару, памаўчаў крыху, потым няўпэўнена сказаў:

— Можа, той лайдак яшчэ вернецца. Пачакаем.

Тамара стала запаўняць рэестр, штохвіліны пазіраючы на гадзіннік. А палове пятай яна сказала:

— Ну, я пайду. У торбу ўсё паклалі? Давайце тэлеграмы, я іх асобна пакладу.

Шылыкоўскі чамусьці ўздыхнуў. Але ні пярэчыць ёй, ні адгаворваць яе ён не стаў.

— То вазьміце з сабою хоць Чыжыка. Усё ж весялей будзе.

Пачуўшы сваю мянушку, высокі брылясты сабака, помесь сетэра з дварняком, які сядзеў каля грубкі, заляпаў хвастом па падлозе і павярнуў галаву да Шылыкоўскага. Потым, нібы зразумеўшы, пра што ідзе гаворка, перавёў позірк на Тамару. Дзяўчына дала яму ірыску «Залаты ключык». Чыжык лізнуў ёй руку і мацней заляпаў хвастом.

Нехта з дзяўчат ледзь не сілаю прымусіў Тамару скінуць шарсцяную хустку і надзець вушанку. Прыбіраль-

шчыца Наталля сцягнула з яе паліто і апранула ў свой кажух. Цяпер, у кажуху і валёнках, з шапкаю-вушанкаю на галаве, Тамара стала падобна на хлапчука-падлетка.

— Пайшлі, Чыжык,— весела сказала Тамара.— У другую брыгаду, ведаеш? Гэта зусім блізка. Мы з табою як бачыш дойдзем. Гэта зусім, зусім блізенька.

Яна перакінула цераз плячо рэмень вялікай і даволі-такі цяжкай торбы, адчыніла дзверы. Чыжык праціснуўся першы і, апынуўшыся на волі, для парадку брахнуў разы са два.

Шылыкоўскі выйшаў праводзіць яе. Вецер за гэтыя паўгадзіны стаў мацнейшы. Замець падпялася вышэй, снег белай муццю круціўся ўздоўж вуліцы. Шылыкоўскі паглядзеў на неба, нахмурыўся.

— Не падабаюцца мне гэтыя аблокі... А мо перадумаеце?

— Пошта не мае права спазняцца, вы самі вучылі нас гэтаму. Да пабачэння, Сцяпан Васільевіч! — ужо на хаду крыкнула Тамара.

Чыжык трухаў наперадзе. Ён падкурчыў хвост, апусціў галаву і цяпер не здаваўся ўжо такі высокі і дужы, як раней.

— Смялей, Чыжык-пыжык,— сказала Тамара. Але, як і тады, яна гэтымі словамі падбадзёрвала галоўным чынам самую сябе.

Торба ўвесь час ссоўвалася са спіны на бок, і ледзь ні штохвіліны прыходзілася папраўляць яе, каб яна не перашкаджала ісці. Пакуль быў пасёлак, ісці было даволі лёгка. Вецер не паспеў яшчэ намесці вялікіх сумётаў, яны толькі дзе-нідзе перагароджвалі дарогу спічастымі пагорачкамі, цераз якія зусім не цяжка было пераступіць. Але, як толькі скончылася вуліца і перад вачыма распасцёрся бязмежны сцюдзёны стэп, Тамара адразу пашкадавала, што наважылася рушыць у такую дарогу. Тут, у стэпе, вецер быў значна мацнейшы, і здавалася, што ён мацнее з кожнай хвілінай.

Тамара прыпынілася і паглядзела назад. Домікі пасёлка, нават самыя апошнія з іх, якія яна толькі што мінула, былі ўжо амаль не відны — іх схавала ад вачэй суцэльная снежная заслона.

— Удзень было дваццаць два градусы,— падумала Тамара.— А цяпер, мусіць, і ўсіх трыццаць набярэцца.

Чыжык таксама прыпыніўся. Нездаволена вільнуўшы хвастом, ён павярнуў галаву да Тамары і стаў глядзець ёй проста ў вочы.

— Я зараз, Чыжык,— вінавата прамовіла Тамара.— Гэта я проста так. Я ўжо іду, вось бачыш. Гэта я проста так.

Між тым, вецер і сапраўды мацнеў. Замець паднімалася ўсё вышэй, яна пагражала ператварыцца ў завею. Усё часцей пачалі трапляцца па дарозе сумёты, і ногі правальваліся ўжо ў іх да забарсняў.

«Абы толькі не буран,— падумала Тамара.— Бо бурана я не вынесу. Яго ў стэпе ніхто не вынесе. А завея не страшная. Яна нават для мяне не страшная».

Стала значна цямней, бо змяркалася хутка. Дарога ўжо толькі ўгадвалася, ісці было ўсё цяжэй. Сумёты раслі і раслі, ператвараліся ў вялікія гурбы.

«Абы толькі не буран,— зноў падумала Тамара, закідваючы ў каторы раз торбу за спіну.— Бо тэлеграму Анікіну трэба занесці абавязкова. Напэўна, у ёй што-небудзь важнае. Магчыма, да яго хто-небудзь едзе. Да мяне ж таксама нядаўна прыязджала мама, паглядзець, як мы тут жывём на цаліне. Вось, напэўна, і да яго сабралася старая. То трэба будзе яму ехаць заўтра на станцыю сустракаць. Я ж таксама ездзіла сустракаць маму».

Думкі пра матку, пра славутага трактарыста з другой брыгады Леаніда Анікіна цалкам завалодалі дзяўчынаю, і ёй нават пачало здавацца, што вецер стаў цішэйшы і мароз цяпер не такі ўжо моцны, як раней. І яна не прыкмячала, што ідзе ўсё марудней і марудней і што Чыжык усё часцей неспакойна азіраецца на яе.

— Ведаеш, Чыжык, мы ідзём да Лёні Анікіна,— нечакана сказала Тамара.— Да таго самага, што дужа прыгожы, што самы прыгажэйшы ў нас у саўгасе. Ведаеш? І мне зусім не страшна ў стэпе. І наогул, якое цудоўнае жыццё, Чыжык!

Тамара Славікава была даўно і безнадзейна закахана ў Леаніда Анікіна, першага трактарыста саўгаса «Гвардзейскі». Прыехаў у саўгас ён летам, перад жнівом, і адразу стаў славутасцю. Анікін лёгка апярэдзіў усіх механізатараў, і імя яго пачало з таго моманту грымець ва ўсіх радыёперадачах, друкавацца ва ўсіх газетах, і фатаграфія яго не сыходзіла з дошкі Гонару, што стаяла на цэнтральнай сядзібе, якраз насупраць паштовага аддзялення. Тама-

ра бачыла яго ўсяго толькі два разы. Аднойчы ён завітаў на пошту і папрасіў у яе дзесяць канвертаў. Яна паглядзела на яго і раптам уся зачырванелася. «Ён!» — сказала яна сабе, апускаючы вочы і ўжо не маючы больш сілы паглядзець на яго яшчэ раз. А Анікін тым часам нетаропка ўзяў свае канверты, асцярожна паклаў іх у кішэню і спакойна пайшоў да выхада. І дзе там было ведаць яму, якую буру ўнёс ён у душу дзяўчыны сваім прыходам!.. Другі раз Тамара ўбачыла Леаніда на навагоднім вечарынцы. Трактарыст быў у гэты вечар чамусьці сумны, ён ні з кім не танцаваў, ды і размаўляў мала з кім. Тамары таксама стала сумна, яна гатова была расплакацца.

За ўвесь гэты час ёй так і не выпала пазнаёміцца з Анікіным...

Цяпер яна нясе яму тэлеграму. Яна нясе і другім весткі — пісьмы, паштоўкі, бандэролі, паведамленні на пасылкі,— так, яна шмат каго ўзрадуе сёння тым, што паявіцца ў другой брыгадзе; аднак самаму першаму Тамара аддасць пасланне яму, Леаніду Анікіну. І няважна, што ў стэпе лютуе непагадзь, што вецер так і стараецца збіць з ног, што сумёты на дарозе ўсё растуць і растуць,— яна ўсё адно дойдзе!.. Вось толькі перадыхне крышачку, трошкі аддыхаецца і тады зноў пойдзе, зноў будзе прабівацца наперад.

Апусціўшыся на снег, Тамара адчула адразу, да чаго яна стамілася. Нылі ногі, ламала паясніцу, звінела ў вушах. А яна ж, напэўна, яшчэ і паўдарогі не прайшла...

Побач стаяў Чыжык. Ён пацёрся галавою аб яе бок, потым зазірнуў ёй у твар. Яна ўбачыла яго вочы зусім блізка — яны былі трывожныя, неспакойныя.

— Я зараз, Чыжык, я зараз,— прамовіла Тамара.— Вось адпачну кропельку і зноў пайду. Я пайду, ты не думай. Мне абавязкова трэба пайсці, мяне там чакаюць.

І яна пайшла. І адразу ж спатыкнулася і ўпала, але хутка ўстала і, папраўіўшы торбу, зноў пачала крок за крокам прабівацца наперад.

Ёй успомніліся словы Шылыкоўскага, калі ён сказаў, што яму не падабаюцца гэтыя сённяшнія аблокі. Тамары яны таксама не падабаліся — яны былі нейкія злавесныя і займалі сабою ўсё неба ад гарызонта да гарызонта. Але цяпер іх не відаць, цяпер ужо наогул нічога не відаць, акрамя снегу, які ўсюды — і ўнізе, і наверсе, і перад вачыма, і ззаду — усюды толькі ён адзін. Цікава, ліха на

яго, колькі гэтага снегу ў стэпе?.. Потым яна ўспомніла паштальёна Ілью Цыбіна і яго каня, старую клячу з маленькімі капыткамі, з рэдкаю лінючаю грываю і вялікай шурпатай ніжняй губою. Але, неважнецкага далі ім на пошту каня, і, відаць, ён ужо адвазіў сваё, бо іначай чаго б затрымаўся Цыбін?

Дыхаць было ўсё цяжэй. Густым інеем укрыліся бровы, на завязаных пад падбародкам вушках шапкі нараслі ледзякі. А торба ўсё ссоўвалася і ссоўвалася са спіны, і папраўляць яе нескавала ўжо сілы.

Дарога перастала існаваць. Быў толькі снег, усюды аднолькава глыбокі, і невядома ўжо было, куды ісці. Але Чыжык упарта трымаўся нейкага свайго кірунку, ён ішоў наперадзе, і Тамара паслухмяна цягнулася за ім.

Раптам ёй здалося, што яны ідуць не ў той бок. У яе з'явілася такое адчуванне, быццам Чыжык непрыкметна для яе павярнуў назад і цяпер яны ідуць не ў другую брыгаду, а дамоў, у пасёлак. Яна прыпынілася і паклікала Чыжыка. Ён падбег да яе, падняўся на заднія лапы, упёрся пярэднімі ёй у грудзі і ласкава пацёрся мордай аб яе шчаку. Паціху паскуголіўшы, Чыжык асцярожна зняў лапы з яе грудзей і зноў падаўся ў ранейшым сваім кірунку.

Калі яны ішлі правільна, дык да брыгады аставалася яшчэ сама меней кіламетры два.

— Пачакаем, Чыжык,— папрасіла Тамара.— Давай трошкі перачакаем. Калі б не гэтая торба...

Але Чыжык не слухаўся. Грузнучы ў снезе па самы жывот, ён упарта ішоў наперад, і сілы ў яго было, відаць, усё яшчэ значна больш, чым у Тамары.

...Крутая хваля бурану наляцела аднекуль збоку, і Тамара так добра і не зразумела, адкуль імення — справа ці злева. Напор яе быў да таго моцны, і накінулася яна гэтак нечакана, што Тамара нічога не паспела разабраць. Яна толькі адчула, як штосьці падхапіла яе, нібыта нават падняло ад зямлі, але ногі зачапіліся за нешта, і яна з усяе сілы некуды плюхнулася ўсім целам. Вакол ўсё стагнала, кіпела, клекатала, нешта секла па твары, і нейкі цяжар усё мацней душыў яе.

Адразу стала цёмна. Здавалася, што ўся неабсяжнасць аблокаў раптам рушыла на зямлю, а насустрач ім шалёны вецер узняў залежы снегу — і ўсё змяшалася, усё злілося ў адзін суцэльны кіпецень.

Сумёт, каля якога апынулася Тамара, быў, відаць, вялікі. Дзяўчына ўся сціснулася, замерла. Стала ныць левае плячо. Потым нешта кальнула ў калене. Напэўна, яна здорава такі ўдарылася, калі падала.

Раптам яна адчула: пачало шчыпаць за нос. «Адмерзне і тады адваліцца»,— спалохана падумала Тамара. Нягнуткай, быццам не сваёй рукою яна пачала церці нос. Кажушная рукавіца задубела, і церці было вельмі няёмка...

І Тамара застагнала. Застагнала не ад болю,— ад усведамлення безнадзейнасці і безвыходнасці свайго становішча. Яна добра ведала, што такое буран у Акмолінскім стэпе. Гора чалавеку, якога засцігне ён у дарозе! Адзінокаму падарожніку нізавошта не прабіцца праз суцэльную калатушу з ветру, снегу і марозу. Усё вакол яго, як штармавое мора, і ён — бездапаможная трэска ў гэтым моры.

Тамару пачало калаціць. Цяпер не памагалі ўжо ні кажух, ні ватовыя штаны, ні шапка-вушанка. Здавалася, што яны перасталі грэць і холад бесперашкодна пранікае скрозь іх.

Невядома было, дзе Чыжык і што з ім. Калі б ён знаходзіўся побач, усё ж было б лягчэй. Усё ж не такая была б адзінота.

Вецер шалеў. Ён выў, стагнаў, роў. Ісці было немагчыма, а аставацца на адным месцы — нельга. Тамара ведала: гэткі мароз у буран — верная смерць для таго, хто спыніцца, хто перастане варушыцца.

Яна паспрабавала падняцца. Але вецер адразу збіў яе з ног, і яна зноў упала на балючае плячо. Войкнуўшы, Тамара перавалілася на правы бок і замерла. Не было сэнсу змагацца з гэтай навалаю. Усё роўна яна адолее Тамару — слабую, безабаронную дзяўчыну.

Нечакана Тамара адчула каля свайго твару нешта шурпатае і цёплае. У той жа момант пачулася лёгкае скавытанне.

— Чыжык, мілы,— шэптам сказала Тамара.— Ты тут... Мілы мой Чыжык!

Чыжык заскуголіў мацней і ўваткнуўся сваёй мордай у самы твар ёй. Тамара прытулілася шчакою да шурпатай заінелай морды сабакі, абняла яго рукою і заплакала.

— Мілы мой Чыжык!..— зноў і зноў паўтарала яна.— Мілы мой Чыжык!

Больш у яе не было слоў, але і гэтыя выказвалі ўсё, чым было цяпер поўна яе сэрца.

Між тым, Чыжык стаў на ногі, і Тамара адчула, што ён падаецца ўсім тулавам наперад. Яна зразумела, што Чыжык заклікае яе рушыць далей.

— Але, але, я зараз,— сказала Тамара.— Зараз мы з табою пойдзем. Мы абавязкова пойдзем!

Стаўшы на калені і абапіраючыся рукамі на снег, Тамара паспрабавала скрануцца з месца. Так, гэтакім манерам, здаецца, можна патрошкі падавацца наперад. Вецер больш ужо не паваліць яе,— не, цяпер ён ужо яе не паваліць!

Чыжык зноў быў наперадзе. Ён браўся павольна, прыціскаючыся амаль усім тулавам долу, і Тамара не адставала ад яго ні на крок. Яны былі блізка адно ад аднаго, Тамара ўвесь час адчувала блізкасць Чыжыка.

Яна пачала лічыць крокі, але хутка зблыталася. «Шэсцьдзесят,— сказала яна сабе, але ёй здалося, што папраўдзе дык яна прапаўзла толькі пяцьдзесят.— Ну, няхай будзе пяцьдзесят... Цяпер вось пяцьдзесят адзін, пяцьдзесят два...»

Раптам Тамара страпянулася і ледзь не ўскрыкнула.

— Торба! Дзе мая торба?!.

Ні на спіне, ні на баку торбы не было. Значыцца, яна згубіла яе. Напэўна, парваўся неяк рэмень або адшпілілася спражка, а яна і не адчула. Калі ж гэта здарылася? Можа, тады, калі яна трапіла ў сумёт? А можа, яшчэ раней?.. Яна так стамілася, што неяк зусім забылася на торбу.

Што рабіць далей, яна не ведала. Ісці назад не мела ніякага сэнсу: знайсці торбу ўсё адно не ўдасца, яе даўно замяло снегам; ісці ж без пошты далей таксама недарэчна. Што яна скажа Апікіну? А астатнім — што скажа? «Расцяпа!» — скажуць яны ёй.— «Разявака!» І яны будуць мець рацыю.

Тамара ляжала, не варушачыся, і з тугою прыслухоўвалася да надрыўнага выцця бурану. Праз хвіліну яна адчула, што яе пачало заносіць снегам. І тады побач зноў апынуўся Чыжык. Ён штурхануў яе ў бок, потым у плячо.

— Я расцяпа, Чыжык, вось я хто,— безнадзейна сказала Тамара.— І не варта было табе звязвацца са мною, з такою разявакаю.

Яна падняла руку, каб пагладзіць Чыжыка. Нечакана рука яе наткнулася на нешта пруткае, што зусім не было падобна на сабачую шэрсць. Тамара хутка падняла галаву

і абедзвюма рукамі схапілася за гэтую невядомую рэч. Тады сэрца яе ёкнула, на нейкі момант спынілася, а потым закалацілася часта-часта.

У руках Тамары быў рэмень ад паштовай торбы. Яго трымаў у зубах Чыжык. Правёўшы рукою далей, Тамара намацала і самую торбу. Значыцца, Чыжык знайшоў яе і валок за сабою па снезе, валок, напэўна, даўно. Тамара прыхінулася да Чыжыка і пацалавала яго ў цёплы дрыготкі нос. Сабака ціхенька заскуголіў.

Яна сабрала ўсе свае сілы і паспрабавала падняцца на ногі. Гэта ўдалося ёй не адразу. Суставы нібы замерзлі, і сагнуць або разагнуць іх каштавала нямалых намаганняў. Калі яна нарэшце паднялася, ёй спатрэбілася яшчэ багата часу, каб выпрастацца.

Магчыма, вецер паслабеў, а можа, Тамара стала раптам дужэйшая, толькі цяпер яна ўжо не давала зваліць сябе. І яны зноў пайшлі — Чыжык, як і раней, наперадзе, Тамара ззаду, хістаючыся і грузнучы ў снезе па самыя калені.

Ішлі яны марудна, вельмі марудна. Вецер налятаў то спераду, то збоку, але ні разу не падзьмуў ён ззаду. Ісці было неймаверна цяжка, аднак Тамара не дазваляла сабе спыніцца ні на хвіліну. Яна ўпарта перастаўляла ногі, нібы пазычыўшы ўпартасці ў Чыжыка, хоць іншы раз ёй пачынала здавацца, што яна топчацца на адным месцы. Нервы яе прытупіліся, быццам і яны замерзлі. Часамі перад вачыма праносіліся нейкія здані, але яны не палохалі Тамары, яна стала абыякавая да ўсяго.

Усё цяжэй было дыхаць. Ёй ужо ледзьве ўдавалася выцягваць ногі са снегу. І ўсё часцей цягнула яе легчы на зямлю. Легчы і заснуць. Ці нават не заснуць, а хоць бы проста паляжаць трошкі. Зямля была — як магніт. Яна прыцягвала да сябе і з кожным крокам усё мацней.

Сілы, здаецца, зусім пакінулі яе. І, напэўна, яна вось-вось упадзе і тады ўжо больш не падымецца. Адчуваючы гэта, Тамара з нейкім дзёрзкім выклікам усё ступала і ступала ў снег, хоць раз за разам правальвалася, і, баючыся страціць раўнавагу, аж да крыві прыкусвала губы.

Але вось снежная заслона нібы прарвалася на нейкі момант, і недзе наперадзе мільгануў далёкі агеньчык. Ён адразу ж пагаснуў, але потым мільгануў яшчэ раз і яшчэ.

— Чыжык,— паклікала Тамара, прыпыняючыся.— Бачыш, Чыжык?

Сабака радасна забрахаў. Ён падбег да Тамары, пакруціўся каля яе, а потым зноў рушыў наперад.

Аддыхаўшыся трохі, Тамара падалася за ім. Але ёй прыходзілася ўжо ледзь не праз кожную хвіліну спыняцца, каб хоць крыху адпачыць. Ногі зусім не хацелі слухацца, яны падгіналіся на кожным кроку. І, як на тое, агеньчык знік і болей не запальваўся.

Калі яна спынялася надоўга, да яе падыходзіў Чыжык і нецярпліва і трывожна штурхаў у бок.

Яна амаль не помніла, як дацягнулася да першага вагончыка. У галаве ў яе быў нейкі туман, думкі блыталіся. І ўсё мацней авалодвала ёю пачуццё млосці, яно захліствала яе, засціла розум. У памяці і асталося толькі адно — змаганне яе з гэтай млосцю, імкненне не паддацца ёй.

Вокны ў вагончыку былі цёмныя, людзі там ужо спалі. Тамара звалілася, не дацягнуўшыся пяці крокаў да дзвярэй. І, падаючы, чула ў апошняй успышцы прытомнасці, як заўзята брахаў пад акном Чыжык.

Ачнулася Тамара ў цёплым светлым пакойчыку, які быў поўны людзей. Яна ляжала на тапчане, і нечыя рукі асцярожна здымалі з яе шапку, а яшчэ нечыя расшпільвалі кажух, а нехта сцягваў валёнкі. Вусаты мужчына падносіў да яе рота конаўку духмянага гарачага чаю. Была цішыня, і людзі гаварылі шэптам.

— Я не стамілася...— слабым голасам прамовіла Тамара.— Я зусім не стамілася, вы не думайце. От зараз разбяру газеты і пісьмы і пайду іх разносіць. Дзе мая торба, вы не ведаеце? Мы прынеслі яе з Чыжыкам. Чыжык, дзе ты?

На грудзі ёй мякка апусціліся вялікія, яшчэ ў снезе, Чыжыкавы лапы, а морда яго прысунулася да яе твару, і доўгі шорсткі язык два разы лізнуў яе па шчацэ.

Нехта цёр ужо ёй ногі, а два хлопцы старанна адхуквалі яе рукі, далікатна трымаючы іх у сваіх загрубелых, пахнучых мазутам, руках. У адным з гэтых хлопцаў Тамара раптам пазнала Леаніда Анікіна і пачырванела.

— А вам тэлеграма, таварыш Анікін,— ціха сказала Тамара, спрабуючы ўсміхнуцца.— Тэрміновая. І... і яшчэ некаму.

Анікін нецярпліва пацягнуўся рукою да торбы, другой па-ранейшаму адаграваючы яе руку.

— Дайце торбу, я сама знайду. Я ведаю, дзе яна.

Але Анікін ужо сам паспешліва корпаўся ў торбе.

— Ляжыце, ляжыце, я сам.

— Яна там з краю,— падказала Тамара.— Во, во, там.

Ён знайшоў тэлеграму і хутка разгарнуў яе. Твар у яго быў бледны, вочы свяціліся незатоенай надзеяй. І Тамара таксама пабляднела, і вочы яе гэтак жа засвяціліся, як і ў яго.

Прачытаўшы і шумна, з палёгкай, уздыхнуўшы, Анікін заўсміхаўся і зноў узяў яе руку ў свае.

Да торбы пацягнуліся другія.

— Дзякую вам, мілая дзяўчына,— шчасліва сказаў Анікін.— Шчыра дзякую. Вельмі добрую вестачку вы мне прынеслі.

— Добрую? — перапытала Тамара, шчаслівая яго шчасцем.— То я рада, калі добрую.

— Ведаеце, хто прыедзе да мяне? — Анікін вытрымаў паўзу і ўрачыста паведаміў: — Сын!

— А?..— ціха ўскрыкнула Тамара і заплюшчыла вочы.

— Ён ужо вялікі ў мяне. Яму ажно цэлых шэсць месяцаў споўнілася.

Чыжык раптам натапырыўся і забурчаў.

— Цішэй, Чыжык,— не расплюшчваючы вачэй, амаль бязгучна прамовіла Тамара.— Цішэй, мілы мой Чыжык. Я хачу спаць. Мне трэба хутчэй заснуць. Спі і ты, Чыжык.

У вагончыку стала зусім ціха. Анікін і яшчэ другі трактарыст пяшчотна гладзілі Тамарыны рукі, трэці саграваў ёй ногі, астатнія нячутна разбіралі пошту.

Чыжык скруціўся на падлозе ў клубок і таксама сцішыўся.

*1956*

# ВЯЧЭРНЯЯ РАЗМОВА

Не скажу, што да Галчапавых я заходжу часта, але ўсё ж заходжу. То Галіна запросіць мяне на якое сямейнае свята, то я сам завітаю проста так, па агеньчык.

З Галінай мы знаёмы цэлую вечнасць, ад самых дзён малецства,— мы некалі жылі побач, па адной вуліцы. Потым яе мужам стаў мой колішні школьны прыяцель Аляксей, і на іхнім вяселлі я быў за шафера. Калі перад самай вайной у іх нарадзіўся Толік, яны, вядома, хросным бацькам выбралі мяне. На вайну мы з Аляксеем Галчанавым пайшлі праз месяц пасля тых хрэсьбін. Папалі ў адну часць, ваявалі разам. З вайны я вярнуўся адзін, Аляксей навечна астаўся ля адной з тых незлічоных вёсак, што мы гэтулькі папакідалі за сабою ў сорак першым.

Галіна болей замуж не выйшла, яна гадавала Толіка і берагла памяць мужа.

Так, я заходжу да Галчапавых, я проста не маю права не заходзіць. Толік даўно ўжо не маленькі, ён скончыў інстытут, працуе інжынерам на машынабудаўнічым заводзе. «Увесь чыста ў бацьку ўдаўся,— кажа Галіна, не ўтойваючы радасці за сына.— Такі ж смелы, адважны, прынцыповы. Ён жа, ці ведаеш, дружыннік і рознае хуліганнё наогул усялякая погань баіцца яго як агню».

Першы час Галіна ўсё распытвала ў мяне пра Аляксея, пра яго апошнія дні, апошнюю разведку. Бо ў той разведцы я быў разам з Аляксеем. Мы былі з ім толькі ўдвух. Ён і я. Ён загінуў, я астаўся жывы. І я, каторы раз, расказваў зноў і зноў з усімі падрабязнасцямі пра падзеі той ночы...

...Напярэдадні Аляксея Галчанава выклікаў да сябе камбат і загадаў пайсці ў разведку. Выконваць гэтае заданне Галчанаў павінен быў не адзін, яму давалася права самому выбраць сабе памочніка. Галчанаў назваў камбату мяне. Маўляў, ён ведае мяне, як самога сябе, мы вучыліся ў адной школе і наогул сябры. Камбат не пярэчыў. Пра ўсё гэта мне расказаў потым сам Галчанаў.

Мы ведалі, якая адказнасць ускладаецца на нас. Дзён колькі таму назад удалося нарэшце перапыніць наступленне немцаў на нашым участку, замацавацца і, як здавалася, самім пачаць падрыхтоўку для рашучага контрнаступлення. Між тым, паступілі звесткі, што немцы восьвось зноў пойдуць у новы наступ, бо да іх прыйшло падмацаванне. Ці праўда гэта, а калі праўда, то дзе, на якім канкрэтна ўчастку яны групуюцца, было невядома.

Нам з Галчанавым было загадана перш добра выспацца, і мы сапраўды праспалі цэлы дзень. У дарогу выправіліся ў дванаццаць тры нуль-нуль. Удала адолелі нічыйную паласу, мінулі перадавы заслон немцаў і, адпачыўшы трохі, рушылі далей. І раптам — вокліч: «Хальт!» і яшчэ нейкія незразумелыя словы. Мы кінуліся назад. Грымнуў стрэл. Аляксей, бы спатыкнуўшыся, бразнуўся вобземлю. Я таксама ўпаў. Пачакаў хвілін колькі — вакол было ціха. Ні стрэлаў больш, ні галасоў. Тады я падпоўз да Аляксея. Ён быў мёртвы.

Я вярнуўся назад без сябра...

Пасля Галіна перастала распытваць пра падзеі той жудаснай ночы. Яна больш расказвала сама, і найбольш пра Толіка. Ён рос добрым хлопчыкам, старанна вучыўся, і маці адно радавалася. Радаваўся і я. Так сталася, што сваіх дзяцей у мяне не было, і я пачуваў да Толіка любасць, як да роднага сына. Тым больш, што я быў адзіны сведка смерці ягонага бацькі.

Так, я заходзіў калі-нікалі да Галчанавых. Я не мог не заходзіць.

Зайшоў да іх і сёння. Галіна сама запрасіла мяне. Яна пазваніла мне на работу і ўсхваляваным голасам сказала, што ёй абавязкова трэба пабачыць мяне. Я нават не паехаў дамоў, а адразу ж пасля работы памчаў на вуліцу Чкалава, дзе жыла Галіна з сынам.

— Барыс, прабач, што я цябе патурбавала,— уся змарнелая, асунутая, сказала Галіна, ледзь толькі я ўвайшоў у кватэру.— Але з Толікам няшчасце!..

— Што з ім?..— Здаецца, я схапіўся за сэрца; апошнім часам яно пачало ўсё часцей напамінаць аб сабе.

— Учора вечарам нейкі хуліган напаў на яго і ледзь не забіў. Божа мой, што гэта робіцца на свеце!

— А з Толікам? Што з Толікам? — дапытваўся я.

— Ён у бальніцы. Дзякаваць богу, урачы кажуць, што небяспекі для жыцця няма. Дзякаваць богу. Я была ў яго сёння, ён нават усміхаўся мне. Я таксама і смяялася і плакала. А ноччу ледзь не звар'яцела. Ён меўся прыйсці ў адзінаццаць. А першай гадзіне я ўжо месца сабе не знаходзіла. І гэтак да самай раніцы вачэй не заплюшчыла. А потым пачала званіць. Куды я толькі не званіла, пакуль даведалася, дзе Толік!.. Але што ж гэта мы стаім у дзвярах? Даруй мне, я зусім страціла розум. Праходзь, Барыс, распранайся.

Я зняў паліто, капялюш і следам за Галінай падаўся ў большы пакой іхняй кватэры, якую яны атрымалі не так даўно. Мы тады, помніцца, шумна справілі наваселле. Былі Галініны саслужыўцы, Толікавы сябры, быў, вядома, запрошаны і я з жонкаю. Галіна тады ладна надпіла і ўвесь вечар спявала то вельмі сумныя, то дужа вясёлыя песні.

Мы селі на канапу.

— Мне вельмі трудна, Барыс, таму я і паклікала цябе. Ты ж ведаеш, у мяне нікога блізкага няма, акрамя цябе. Акрамя Толіка і цябе. Толік — мой сын, мая адзіная крывіначка, а ты... ты мой харошы, верны друг, друг ад самага дзяцінства. Тады ты мяне бараніў ад вулічных хлапчукоў, а цяпер бароніш ад розных жыццёвых нягод. Ды і з Лёшам вы былі сябры, і нават у тую яго апошнюю ноч вы былі разам. Ты шануеш яго памяць гэтак жа, як шаную я. І ты мой верны, слаўны друг. Таму я і пазвала цябе. Пабудзь са мною ў гэту трудную для мяне часіну, пасядзі, пагамані. Хочаш, я цябе пачастую чаем? Пачакай, пачакай, ды ты, мабыць, і не абедаў яшчэ?.. Ну вядома, не абедаў, ты ж проста з работы. Я зараз прыгатую штонебудзь, у мяне ёсць, здаецца ўчарашні боршч, я хуценька падагрэю. І не адпеквайся, мы абавязкова паабедаем з табою, я і сама, аказваецца, галодная, як сорак тысяч ваўкоў, я зусім забылася на тое, што трэба есці. Можаш

пакуль пазванiць Люсi, скажы, што затрымаешся ў нас. Дарэчы, яна не раўнуе, што ты бываеш... у мяне?

— Здаецца не.

— Мне таксама здаецца, што не. Твая Люся — цудоўная жанчына. Разумнiца. Светлая галава. Яна ўсё разумее. Мiж iншым, Люся на колькi маладзейшая за цябе? Гадоў на восем?

— На дзесяць.

— То яна ж яшчэ зусiм маладзенькая. А мы з табою... Нам па сорак шэсць ужо, на жаль. I Лёшу было б таксама сорак шэсць...— Яна ўзяла са стала цыгарэту, прыкурыла яе, няўмела зацягнулася дымам i закашлялася.— Сёння ноччу да таго разнервавалася, што знайшла Толiкавы цыгарэты i засмалiла. Першы раз у жыццi. I ўжо выкурыла штук пяць. Не, нават шэсць, вось яны ўсе тут, акуркi, у попельнiцы. Нiшто, спадабалася. Я падумала ўжо нават, што мне, старой бабе, нiчога, мусiць, болей i не астаецца, як пачаць курыць... Ну, iдзi звані.

Яна падалася на кухню, а я выйшаў у пярэднюю, дзе на нiзенькiм столiку стаяў прыгожы тэлефон салатавага колеру, i пазванiў дамоў. Люся абазвала мяне iдыётам i заявiла, што я магу наогул, калi ўжо на тое, дадому не прыходзiць. Яшчэ яна сказала, што я — ярка выражаная паталагiчная асоба, бо нармальных мужчын у мае гады цягне да маладых жанчын, а я ўчапiўся ў спаднiцу старое бабы i анiяк не магу адчапiцца.

Я паклаў трубку i вярнуўся ў пакой. Галiны яшчэ не было, яна завiхалася на кухнi; адтуль данасiўся пах смажанай на сале яечнi.

Захацелася закурыць, але я стрымаўся. Калi ўжо кiнуў, дык трэба вытрымлiваць характар. Тым больш, што ў мяне — сэрца. I якраз цяпер яно зноў напомнiла аб сабе.

Але, нам па сорак шэсць. I Аляксею таксама было б сорак шэсць.

...Неўзабаве пасля таго, як я вярнуўся ў батальён адзiн, без Галчанава, мяне выклiкаў да сябе ў зямлянку камбат. Запрасiў сесцi, пачаставаў папяросай. Я курыў ягоную «казбечыну», i яна ўяўлялася мне нейкiм недарэчным анахранiзмам, нечым такiм, што невядома як паўстала з жыцця, якога ўжо няма, якое адышло ў нябыт.

— Гэтай папяросе тысяча гадоў,— змрочна сказаў я.— Невядома, як яна ўцалела да нашых дзён.

— Гэта яе старшына Шаплыкаў знайшоў у аналах гісторыі,— сказаў камбат.— Той, што сустрэў цябе, калі ты вярнуўся без Галчанава. Старшына Шаплыкаў наогул мае схільнасць да розных пошукаў. У яго нюх — будзь здароў. Ён можа знайсці нават і тое, што чалавек часам сам ад сябе як найдалей хавае. Зразумеў?

У вочы мне пайшоў папяросны дым, яны заслязіліся, і я вымушаны быў працерці іх тыльным бокам далоні.

Камбат сеў насупраць мяне на пастаўлены тарчма кавалак неабкоранага бервяна, строга спытаў:

— Дык што там у вас адбылося? Расказвай, Кулёнак!

Ён пільна глядзеў на мяне, падпёршы рукою падбародак. Чуваць было, як выстуквае на ягонай руцэ вялікі кіраўскі гадзіннік.

Я расказваў доўга.

Мне цяжка было гаварыць пра падзеі той ночы, і я часта перапыняўся. Але паведаміў пра ўсё, нічога не ўтойваючы.

Камбат устаў, прайшоўся па зямлянцы. Ён быў высокі, і яму прыходзілася нагінаць галаву. Таму, мабыць, постаць яго набыла пагрозлівы, нават застрашлівы выгляд. Пры кожным кроку ў застыглай, бы магільнай, цішыні зямлянкі гучна рыпелі ягоныя новыя хромавыя боты, таксама з нейкага другога, не цяперашняга жыцця.

Потым ён стаў перада мной і скрыгануў зубамі.

— Даць яшчэ адну дагістарычную «казбечыну»?

— Я лепей закуру сучаснага самасаду.

Я адарваў шматок газеты, узяў дрыготкімі пальцамі з кісета ладную дробку зялёнай крышанкі, скруціў таўшчэзную і даўжэзную, як не аглоблю, цыгарку. Камбат даў мне прыкурыць ад сваёй папяросы. Мне доўга не ўдавалася прыткнуцца да яе.

— Та-ак...— сказаў камбат і пільна зірнуў на мяне.

А ў наступную хвіліну скаланулася зямлянка, са столі пасыпаўся пясок, вакол загуло, заскрыгатала...

Немцы пачалі наступленне.

У тым баі быў забіты наш камбат. Цяжка параніла старшыну Шаплыкава, і яго адправілі ў тылавы шпіталь. Мяне таксама драпнуў асколак снарада, і я апынуўся ў медсанбаце. Пацягаўся пасля і па шпіталях. А потым трапіў у другую часць, зусім на другі фронт.

— Ніякая ты не старая баба,— сказаў я Галіне, калі яна наставіла на стол дзве талеркі духмянага чырвонага баршчу, забеленага смятанай.— І не варта табе курыць. Табе гэта не да твару.

— Хочаш, я дам табе чарачку каньяку? У нас, здаецца, недзе ёсць пляшка. Яшчэ з наваселля асталася. Толік у мяне такі піток, што пры ім яна сто гадоў прастаіць. Прынесці?

— Давай,— згадзіўся я.

Галіна прынесла ўжо адкаркаваную бутэльку малдаўскага чатырохзоркавага каньяку і дзве старамодныя чаркі на высокіх ножках.

— Шкада, няма ў хаце лімона, сказала яна.— Я таксама вазьму кроплю на язык. Я так пахвалявалася, так натамілася, то, можа, мне і палягчэе ад гэтай гáры.

Яна наліла — поўную чарку мне і на донца сабе. Мы выпілі. Больш правільна, выпіў я адзін, а яна толькі прыгубіла сваю кроплю.

Боршч быў смачны, наварысты. Я сёрбаў яго і адно хваліў.

— Дык ты лічыш, што я яшчэ не старая? — спытала раптам Галіна.

— Ані не старая,— сказаў я.— Ты яшчэ смела можаш выскачыць замуж.

Яна засмяялася і, папярхнуўшыся, закашлялася. «Пастукай па спіне»,— паказала яна рукой.

Я пастукаў. Ёй стала лепей.

— Не смяшы людзей,— сказала яна.— Як табе не сорамна.

— Ты яшчэ сто разоў можаш выскачыць замуж, а не тое што адзін раз.

— Перастань, Барыс, а то я раззлуюся. Вунь што з табою робіць каньяк.

— Гэта не каньяк, Галя.

— А што?

Я сказаў:

— Ты сама.

— Перастань, кажу.— Галіна паклала лыжку на краёчак талеркі, працягнула руку да бутэлькі.— Возьмеш яшчэ чарку?

— Яшчэ адну вазьму.

Яна наліла мне зноў да самага верху.

— А ты не будзеш болей?

— Я не буду.

Яна прынесла яечню. Я выпіў. Яечня таксама была вельмі смачная, а скваркі проста раставалі ў роце.

— А калі гаварыць сур'ёзна,— сказаў я,— дык я шчыра здзіўлены, што ты не выйшла замуж. Я разумею — ты любіла Аляксея, ты хацела застацца вернай яму. Але новае тваё замужжа зусім не азначала б, што ты здрадзіла яго памяці. Жыццё ёсць жыццё. Жывым трэба жыць. Прабач, я гавару банальныя словы. Але што паробіш. Ты напраўдзе магла яшчэ мець добрае замужжа.

— З кім? Ты ж мяне не ўзяў.

Цяпер папярхнуўся я. Але мне самому ўдалося справіцца са сваёй ліхтугай.

— У мяне была Люся,— паспешліва прамовіў я.

— Тады ў цябе Люсі яшчэ не было. Ты вярнуўся з фронту халасцяком. Я нават магу нагадаць табе, колькі ты хадзіў пустапасам. Роўна тры з палавінай гады.

— У цябе добрая памяць.

— Не блазнуй... І калі ўжо, як ты кажаш, гаварыць сур'ёзна, то я маю спытаць у цябе... тым больш, што гэта — далёкая ўжо даўнасць, як кажуць, справы даўно мінулых дзён...— Яна ўзяла з попельніцы недакураную цыгарэту, але перадумала і паклала яе назад.— Я маю спытаць... Чаму ты сапраўды не прапанаваў мне тады стаць тваёю жонкай?.. Ах, ты можаш адказаць, што Аляксей быў тваім другам і ты не мог ажаніцца са мною, бо гэтым ты здрадзіў бы дружбе, зганіў бы яго памяць. Аднак жа ты сам толькі што сказаў: жыццё ёсць жыццё. Налі мне, калі ласка, вось столечкі.

Я машынальна ліпуў ёй у чарку каньяку. Яна зноў толькі прыгубіла нейкае каліва.

— Тым больш, што ты кахаў мяне. Так-так, кахаў, не адпірайся. Кахаў яшчэ тады, да вайны. І ў школе, і пасля. І нават калі я выйшла замуж.

— Ты ап'янела, Галіна. Перастань. Вярзеш немаведама што. Перастань.

— Ну што ж, перастану. Бо ўсё роўна не дачакаюся ад цябе адказу. Ты ўвесь час штосьці тоіш ад мяне.

— Я вып'ю яшчэ, можна?

— Не трэба,— сказала яна.

Мы памаўчалі.

Ужо сцямнела, і Галіна ўключыла святло. Села потым не за стол, а на канапу.

— Табе пара ісці? Пабудзь яшчэ крыху. Недзе дзенецца твая Люся. Калі і параўнуе трошкі, нічога страшнага, абыдзецца. Прыгалубіш яе, прылашчыш, яна і забудзецца на ўсё. Усе мы, бабы, аднолькавыя.

— Ты напраўдзе п'яная.

— Ні ў адной брывіне, як кажа Толік. Ведаеш, Барыс сёння ноччу, чакаючы Толіка, я чамусьці пачала перабіраць старыя паперы. Папалася мне Лёшава паведамленне... І я разраўлася... Божа мой, за што мне выпала ў жыцці столькі пакут!..

У яе і цяпер вочы сталі вільготныя. Яна нізка апусціла галаву.

— Я самая няшчасная жанчына па свеце. Мужа ў вайну забілі немцы, а сына цяпер ледзь не забілі свае...

...Так, у тую ноч мы з ім выйшлі роўна ў дваццаць тры нуль-нуль. Удала адолелі нічыйную паласу, мінулі перадавы заслон немцаў і, адпачыўшы крыху, рушылі далей. І раптам...

Не, ніякага воклічу «хальт» не было. І нікуды мы не кідаліся бегчы. І не было нямецкага стрэлу.

Мы тады напраўдзе прыселі адпачыць. Сядзелі доўга і маўчалі. Я чакаў, пакуль Аляксей дасць каманду ісці далей. Ён быў за старшага, мне аставалася толькі падпарадкоўвацца яму. Аляксей наогул заўжды быў між нас за старшага — і тады, калі мы яшчэ бегалі басанож, і калі вучыліся ў адным класе, і калі хадзілі ў піянерскія паходы, і пазней, калі парабіліся, з нашага пункту гледжання, зусім дарослымі і зачасцілі на танцы ў чыгуначны клуб. Так ужо неяк сталася, што я заўсёды быў на ролі другога. Першы быў ён. І тут ужо нічога нельга было перайначыць.

Мы сядзелі проста на доле і маўчалі. Я чакаў, калі ён дасць каманду ісці далей.

— Ну вось што, Барыс,— сказаў нарэшце Аляксей.— Ты можаш вяртацца назад. А я пайду далей адзін. Дарогу ты цяпер ведаеш, не заблудзішся.

— Чаму адзін? — спытаў я.— Нам загадана ісці разам.

— Таго загаду больш не існуе. Цяпер загадваю я.

— Але ж... нам лепей быць разам, Аляксей. Навошта нам быць па адным?

— Дурань,— сказаў Аляксей.— Калі ты нарэшце навучышся самастойна варушыць мазгамі?! Без старонняй дапамогі! Няўжо ты дагэтуль не ўцяміў, пра што я гавару?.. Не, ты, канечне, усё зразумеў, не такі ўжо ты канчаны ёлуп. Дык навошта тады прыкідваешся?

— Не жартуй, Аляксей...— глуха прамовіў я, адчуваючы, што ўвесь пачынаю калаціцца, бы ў ліхаманцы.

— Бывай, Барыс! Ведаю — ты на такое не здатны, таму і не ўгаворваю цябе, не заву з сабою. У цябе не хопіць на гэта ні рашучасці, ні... адным словам, бывай!..

— Аляксей!..— я ўскочыў з долу.

— Не крычы, абармот.

— Куды ты хочаш пайсці?.. Што ты надумаўся?.. Аляксей!..

— Куды, куды!..— злосна перадражніў мяне Галчанаў.— Да іх! Да фрыцаў, да гансаў! Да чорта, да д'ябла! Я не хачу паміраць, як апошняя акопная вош!

— А я, ты думаеш, хачу?

— То хадзем тады, чорт пабяры, разам!

— Ты хочаш здрадзіць?

— Не трэба гучных слоў, Барыска. Колькі мы іх чулі за сваё жыццё, не такое ўжо і доўгае, дарэчы. Прыгадай... «Ни пяди своей земли не отдадим никому»...— «Мы врага разобьем малой кровью, могучим ударом»...— «Будем бить по-сталински врага!»...— Ён крыва ўсміхнуўся.— Разбілі, а як жа!.. Так разбілі, што ўжо і не ведаем, чым яшчэ падмазваць пяткі. Арміі, нашай арміі, пра непераможнасць якой мы столькі песень праспявалі, гэтай арміі няма, няўжо ты не бачыш?

— Няпраўда, Чырвоная Армія ёсць, і мы — яе байцы!

— Мы яе тленныя астанкі, Барыска... Адным словам, я іду ў палон. Пра гэта ты, вядома, не раскажаш... там. Прыдумай якую-небудзь найбольш верагодную версію. Напрыклад, што мы трапілі ў засаду і я загінуў. Расказваць праўду табе нявыгадна, май гэта на ўвазе.

— А як жа Галіна?.. А Толік?.. Ты хоць пра іх падумаў? — Як за апошнюю саломінку, ухапіўся я за гэтую думку.

— Я вярнуся да іх... калі ўсё гэта скончыцца. З палону, як вядома, вяртаюцца. Гэта толькі з таго свету дарогі няма. Вось я і не хачу апынуцца на тым свеце.

— Ты не зробіш гэтага, Аляксей!

— Можа, ты мне забаронііп? — насмешліва спытаў Галчанаў.

— Забараню. Я табе забараняю, чуеш!

Я сам не пазнаў свайго голасу. Калаціцца я перастаў ужо, мне зрабілася, наадварот, вельмі горача.

— Не крычы, ёлуп,— сказаў Галчанаў.

Ён выпрастаўся і пайшоў ад мяне.

— Галчанаў, я буду страляць!

— Ты? Страляць? Не смяшы.

Я падняў пісталет.

— Назад! — з пагрозаю сказаў я.

Ягоная постаць аддалялася. Яна — шэрая — добра была відаць на фоне фіялетавага неба. Крок... яшчэ крок... яшчэ...

Я націснуў на спускавы кручок.

Постаць захісталася. Тады, паварочваючыся назад, бразнулася вобземлю.

— ...Божухна, у мяне ж там чай, пэўне, выкіпеў! — спахапілася Галіна і пабегла на кухню.

Як ніколі, хацелася курыць. Я прагна пазіраў на пачак цыгарэт. Гэта была балгарская «Шыпка», прывабная, у цэлафанавай абгортцы. Эх, зацягнуцца б дымком, горкім і салодкім адначасна, зацягнуцца так, каб аж уваччу пацямнела!..

— Не глядзі, не глядзі на гэтае паскудства, як брыдлівы кот на курыную ножку,— сказала Галіна, стаўляючы на стол бліскучы чорны паднос з такімі ж чорнымі кубачкамі і чайнікам.— Я ведаю, там асталося чатырнаццаць штук. Калі сцягнеш хоць адну, я табе такую кару прыдумаю!..

Мы пілі чай і думалі кожны пра сваё... Не, мы думалі пра адно і тое ж. Толькі я стараўся прагнаць з галавы тыя думкі, а яна, наадварот, прагла іх. Гэта я зразумеў, калі яна спытала:

— Барыс, чаму ты мне не напісаў тады? Пасля тае ночы?

Я піў чай і не адказваў.

— Ні тады, ні пасля. Ні разу за ўсю вайну. Чаму?

— Я наогул нікому не пісаў,— нарэшце сказаў я.

— Наогул,— гэта адно, а я — гэта другое. Наогул — табе не было каму пісаць, сяброў параскідала вайна па

свеце, бацькі асталіся пад немцамі, і ты ведаў гэта, а я — я эвакуіравалася, і пра гэта ты таксама ведаў.

— Я нікому не пісаў,— зацята паўтарыў я.

І яшчэ яна спытала — я ведаў, што яна спытае і гэта:

— Ён быў добрым салдатам?

Я дапіў свой чай.

— Ты ўжо сто разоў пыталася.

— А ты скажы сто першы.

— На вайне кожны робіць тое, што яму загадваюць.

— Але загады можна выконваць па-рознаму.

Так, Галчанаў меў рацыю. Я не мог гаварыць усяе праўды. Не мог. Але не праз тое, што меў ён на ўвазе. Зусім не праз тое.

— Я пайду, Галя, позна ўжо. Ты натамілася, табе трэба адпачываць. Будзем спадзявацца, што ў Толіка ўсё будзе добра.

— Дактары абяцаюць.

— Дактары ў нас цудоўныя. Я наведаю Толіка ў нядзелю.

Галіна выйшла за мною ў пярэднюю, памагла мне апрануцца.

— Абяцай мне, што ты так не пакінеш гэтай справы. А то цяпер пайшла мода — дадуць пятнаццаць сутак, і ідзі сабе, шумі-гуляй па здароўечка. Ён жа, ведаеш, што нарабіў, гэты нягоднік? Спыніў на вуліцы Толіка і гэтак нахабна кажа: «Юнаша, вы тутэйшы? Тады ў мяне ёсць да вас адна далікатная... заўваж — далікатная!.. справа. Вось вам, кажа, пяць рублёў, арганізуйце мне паўлітэрку, а то ў магазінах чамусьці ўжо не прадаюць. А я не піў цэлую вечнасць, і мне абавязкова трэба лінуць у нутро. Можаце нават саставіць мне кампанію». Толік адказаў яму, каб ён адчапіўся і ішоў сваёй дарогай. «Дарога ў мяне адна,— сказаў той паршывец,— проста на той свет, аднак без паўлітэркі мне туды ніяк не трапіць». Тады Толік заявіў, што ён дружыннік, і загадаў незнаёмаму ісці з ім у міліцыю. Там, маўляў, праверацъ, ці правільны вы сабе выбралі маршрут. Тады незнаёмы раптам раз'юшыўся і пачаў лаяць Толіка самымі апошнімі словамі. І яшчэ сказаў, што такіх трэба давіць усіх разам і па адным. Толіку нічога не аставалася, як узяць яго пад руку і павесці. Ды той нечакана ўдарыў яго нагой у пахвіну, а як Толік упаў, яшчэ і па галаве нечым. Шчасце, што паблізу быў міліцыянер, ён пачуў валтузню і прыбег на дапамогу... Чуеш, ты па-

вінен умяшацца ў гэтую справу. Пазвані ў міліцыю, у пракуратуру, а яшчэ лепш — схадзі сам. Абяцаеш?

— Добра,— сказаў я.— Ты не ведаеш прозвішча таго тыпа?

— Нейкі Бялоў.

— Бялоў?..— хутка перапытаў я.

— Ага, Бялоў. А што? Можа, ты яго часам ведаеш?

Я на момант сумеўся, але Галіна, здаецца, гэтага не заўважыла.

— На свеце столькі Бяловых...— прамовіў я.

— Дык займіся, не забудзь. Трэба, каб яго добра правучылі. Каб не пападна было ўсялякім Бяловым кідацца на людзей.

Я развітаўся і пайшоў дадому. Знарок не паехаў аўтобусам, хоць жыву далекавата ад Галчанавых, а пашыбаваў пехатою. Галава проста пухла ад думак. І я стараўся ісці паволі, часам нават збочваў з дарогі, каб не так скора прыйсці да свае хаты.

Ды ўсё ж і яна была ўжо нарэшце перада мною.

Жыву я ў харомах, якіх мала ўжо асталося ў нашым горадзе. Скрозь павырасталі новыя высачэзныя камяніцы, а наша нізенькая старэнькая хаціна ніяк не дачакаецца бульдозера, што прыйшоў бы і забурыў яе. Будавалі яе яшчэ мой дзед з бабуляй. Пасля ў ёй жылі мае бацькі. Бацькі загінулі ў вайну, і я, адзіны іх сын, астаўся і адзіным гаспадаром гэтай парахні. Уласнік я, адным словам. Маю пры хаце яшчэ і сад, таксама невялікі і стары. Дажываюць у ім свой век дзедаўскія дзесяць яблынь, чатыры грушы і штук колькі вішань, ды яшчэ куст кіслага-пера-кіслага агрэсту. Па тым заняпадзе, які пануе тут, можна меркаваць, што садоўніцтва — не маё хобі.

У гэтыя свае джунглі я і падаўся, перш чым пайсці ў хату. Тут пад адной з груш была лавачка, на якой я любіў пасядзець, падумаць, пачытаць.

Лавачка азвалася на мой прыход ціхім скрыпам.

...Мы сядзелі ўчора вечарам якраз на гэтай самай лавачцы...

Перад тым нехта пастукаў да нас у акно. Выйшла Люся, потым адразу вярнулася і сказала, што мяне пытаецца хтосьці незнаёмы. Я ступіў на ганак, угледзеўся ў цемру. За брамкаю на вуліцы стаяў высокі худы чала-

вск у ватоўцы і ў гумавых ботах, але без нічога на галаве.

Цяпер быў кастрычнік, пагодлівы, цёплы, і мне мімаходзь падумалася, што чалавек нешта зарана надзеў ватоўку.

— Здароў, Барыс,— сказаў чалавек вельмі знаёмым — да болю ў сэрцы, да пацямнення ўваччу — голасам.

Відаць, я доўга маўчаў, бо чалавек загаварыў зноў:

— Не пазнаеш, Барыс? Няўжо не пазнаеш?

— Ты?..— прашаптаў я.— Галчанаў?..

— Як бачыш, з таго свету таксама вяртаюцца. Вось мярцвяк і прыцёгся да цябе ў госці. Прымаеш?

Я ўсё яшчэ маўчаў — ашаломлены, аглушаны, асляплены. Тое, што перада мною стаяў Галчанаў, было настолькі неверагодным, што можна было ўсумніцца, ці ў сваім я розуме. Але гэта быў ён. Пастарэлы, асунуты, з ліхаманкавымі вачыма замест ранейшых быстрых і зухаватых, але ён. Пасля хатняга святла мае вочы ўжо асвойталіся з вячэрнім змрокам, і я цяпер добра бачыў ягоны, Галчанава, твар, між іншым, старанна паголены. Ад яго нават патыхала нейкім прытарным адэкалонам.

— У хату я не пайду, не варта. Але пагаварыць мне з табою трэба. Калісьці ў вашым садзе пад бэраю была лавачка, яна цэлая?

— Там цяпер новая. Тая струхлела.

— Тым лепш, калі новая.

Ён упэўнена папраставаў па сцежцы — некалі ён часцяком бываў у нас, яму тут усё было вядома і, выходзіць, не забылася.

— Гэта твая жонка выходзіла? А я думаў, што ты... Зрэшты, няважна, што я думаў.

Ён думаў, ясней за яснюткае, што я жыву з Галінай. Ён жа ведаў, што я кахаў некалі яе,— кахаў, таячыся і ад яе, і ад яго.

— Ідыёт,— сказаў я.

— Што ж, я чуў за гэтыя гады і не такое. Слухаў і не адказваў. Не адкажу і зараз. Я, дружа ты мой няўдалы, добра навучыўся слухаць і маўчаць. Сціпаць зубы і маўчаць. Прысядзем?

Ён першы сеў на лавачку. Прымасціўся на краёчак і я.

— Куры,— сказаў ён і працягнуў пакамечаны пачак нейкіх танных папярос.

— Я не куру.

— А рапей, помніцца, курыў.

— Рапей курыў.

Мне здалося, што пачынае імжэць дождж. «То і добра,— падумаў я,— Галчанаў хутчэй пойдзе ад мяне».

— Ты сядзіш і думаеш: адкуль, маўляў, ён узяўся, гэты прывід? — Галчанаў паклаў нагу на нагу; правая, што была зверху, пачала нервова ўздрыгваць.— Каб ты залішне не натруджваў сваіх мазгоў, скажу адразу: з турмы. Вядома, з нашае. Хоць быў і ў іхніх. Ну, не ў турмах, а ў лагерах. Твая куля не дала мне тады смерці, хоць пасля я шмат разоў сам клікаў яе. Рапа была цяжкая, але не смяротная. Мяне вылечылі... Яны вылечылі... Вылечылі на пакуты, на здзекі, на ганьбу. О, яны добра пастараліся, каб зрабіць з майго жыцця суцэльнае мучэнне.

Дождж паімжэў і перастаў. Зашапацела лісце — трывожна, бы нават пагрозліва.

— І яшчэ ты думаеш: чаго ён прыйшоў?.. Не, я прыцёгся з таго свету не для таго, каб помсціць табе. Я зразумеў — ты не мог тады зрабіць інакш. Позна, але зразумеў. Мне проста не трэба было браць цябе ў разведку.— Ён пераклаў левую нагу на правую; і насок левай таксама задрыжаў.— Я толькі сёння прыехаў... Толькі сёння... Захацелася, як кажуць, хапянуць роднага паветра.— Ён раптам рэзка павярнуўся да мяне і спытаў: — Галіна тут, у горадзе?

— Тут.

— І Толік?

— І Толік.

— Яму ўжо дваццаць пяты... Хто ён? Кім стаў?

— Скончыў інстытут. Працуе.

— Ажаніўся?

— Яшчэ не.

— Політэхнічны скончыў?

— Але.

Галчанаў памаўчаў. Закурыў новую папяросу.

— Я быў на трэцім курсе... Праклятая вайна!

Ён ударыў кулаком па лазе. Пырснулі іскры з папяросы.

— Праклятая вайна! — паўтарыў ён.— Што яна зрабіла са мною! Як яна знявечыла маё жыццё, як перавярнула, перакруціла ўсяго мяне!..

— Вайна тут ні пры чым,— сказаў я.— Вайна невінаватая.

— А хто ж вінаваты?

— Ты сам. Толькі ты адзін. Вайна тут ні пры чым. Тое, што адбылося з табою — у гэтым вінаваты ты сам.

— Не, не, няпраўда! Гэта ўсё вайна... Калі б не вайна!.. Ты ўспомні. Мы ж раслі разам, вучыліся ў адным класе. Нават сядзелі побач.

— Ты сядзеў на першай парце, я — па другой.

— Ну, так. Але я быў гэткі ж, як і ўсе. Вучыўся, як і ўсе... нават лепш за іншых. Я быў піянерам... актыўным піянерам, прыкладным, ты не станеш гэтага адмаўляць. Потым уступіў у камсамол... ты ж памятаеш, мы разам уступалі. Я шмат займаўся грамадскай работай, ніколі не адмаўляўся ад даручэнняў. Я нават меўся ўступіць у партыю... Не, не, гэта вайна ва ўсім вінаватая. Калі б не вайна, усё ў мяне было б зусім іначай. Я многа думаў пра гэта. О, як у мяне было б усё здорава, каб не вайна. Ты ўяўляеш? Я скончыў бы інстытут, атрымаў дыплом, абавязкова з адзнакай. З маімі здольнасцямі, з партыйным білетам у кішэні я сігануў бы ўга куды!.. Па службовай лесвіцы не ішоў бы, а скакаў. З прыступкі на прыступку, з прыступкі на прыступку. Цяпер я быў бы па меншай меры дырэктарам завода... а можа, і яшчэ вышэй. Дарэчы, ты дзе працуеш?

— Тут... на адной фабрыцы.

— Кім?

— Майстрам.

— У партыі састаіш?

— Не састаю.

— Але, ты зорак з неба ніколі не хапаў.

Я сядзеў і думаў, што гэта і сапраўды магло здзеецца так, Галчанаў і напраўдзе мог стаць і дырэктарам завода, і можа, яшчэ кім вышэй; ён выступаў бы на сходах з абсалютна правільнымі прамовамі, нават пісаў бы ў газеты артыкулы на патрыятычныя тэмы. І ніхто, ані ніхто не ведаў бы ягонай сутнасці, ягонай душы. І я не ведаў бы таксама...

— Нават імя маё — і тое вайна адабрала,— пасля доўгага маўчання зноў пачаў гаварыць Галчанаў.— Я ж тады, як трапіў у палон, назваўся чужым прозвішчам. Я стаў Іванам Бяловым. І ў лагеры быў Бяловым, і ва ўласаўскай арміі Бяловым, і ў турме потым — Бяловым. І цяпер я — таксама Бялоў, Іван Андрэевіч Бялоў, вось хто я... Што ж ты маўчыш?

— А што тут скажаш... Ты, аказваецца, не толькі баязлівец...

— Так, я быў ва ўласаўскай арміі. Не скажу, што іменна да гэтага я імкнуўся, калі збіраўся ісці ў палон. Не, тады я разлічваў, што проста перабуду вайну ў лагеры для ваеннапалонных, і ўсё потым будзе добра. Ажно не, выйшла зусім не так. Каб выжыць, другога выйсця ў мяне там не было. Ды і наогул, калі зрабіў першы крок, немагчыма ўжо не зрабіць другога... Так я трапіў другі раз у палон. На гэты раз ужо да нашых.

— І ты... ваяваў супраць нас?

— Прымусілі...

— За гэта і атрымаў?

— Дваццаць год. І адбухаў іх, як адзін дзень. Ад званка да званка. Цяпер — якраз адтуль. Адтуль і адразу сюды, у горад нашага дзяцінства.

Усё больш трывожна, больш пагрозліва шапацела лісце. І голас Галчанава стаў грамчэйшы.

— Я праклінаю ўсё. Усё! Нават тую хвіліну, калі нарадзіўся на свет. І цябе, ведай гэта, таксама праклінаю!.. За тое, што ты шчаслівы, што маеш сваё імя, што для цябе ёсць дзённае святло...— Ён узняўся з лаўкі.— Не, не за тое. Што ты быў слабейшы за мяне, што дазволіў мне — тады, даўно, у дзяцінстве,— стаць над табою, над многімі іншымі, вось за што. Гэта ты, ты вінаваты, што я зрабіўся тым, кім зараз стаю перад табою. І за гэта я праклінаю цябе!

Гэта было ўжо занадта, і я крыкнуў яму, каб ён каціўся к чортавай матары.

— Ты нават крыкнуць як след не ўмееш,— сказаў ён.— Гэта не крык, а бездапаможны лепет. Бывай! Цяпер — назаўсёды!

І ён сапраўды памеўся пайсці. Але, ступіўшы якія два крокі, зноў прыпыніўся.

— Не хвалюйся, я да іх не пайду. Я ж для іх не існую. Мяне няма. Ёсць І. А. Бялоў. А што для іх нейкі І. А. Бялоў?!. Так, мяне няма. Ты ж не сказаў ім усяе праўды?

— Не сказаў.

— Я так і ведаў, ты не мог ім сказаць. Мабыць, ты нават выдумаў, быццам я па-геройску загінуў ад нямецкай кулі? Так? І яны паверылі?

— Паверылі.

— Табе маглі паверыць... Выходзіць, Аляксей Галчанаў для іх... ды і наогул для ўсіх — чалавек, які загінуў смерцю храбрых?.. І значыць — герой?.. Здорава, чорт вазьмі!

І ён нервова, апантана зарагатаў.

...Так, мы сядзелі з ім учора на гэтай самай лавачцы. І ён, дзіка рагочучы, пайшоў адсюль у цемру, у ноч. І я думаў, што хоць цяпер ён нарэшце знікне назаўжды.

Аж не, не знік...

Трэба было ісці дамоў. Я падняўся з лавачкі. У вокнах было цёмна — можна было падумаць, што Люся ўжо даўно заснула.

Ды я ведаў, што яна яшчэ не спіць. Яна не засне, пакуль не прыйду я. А тады будзе каяцца, будзе прасіць прабачэння за тыя свае дурныя словы па тэлефоне, што нямаведама як зляцелі з языка. Яна будзе горача шаптаць, што любіць мяне, таму во і мучаецца — і сябе мучыць, і мяне...

А заўтра мне прыйдзецца займацца Толікавай справай. Я абяцаў Галіне.

Прыйдзецца. І, канечне, пасля дваццаці гадоў зацятага маўчання давядзецца нарэшце расказаць праўду.

Лепей бы ніколі яе не расказваць. Лепей бы мерцвякі не вярталіся з таго свету...

*1966*

# АМАТАРЫ

— Сёння зноў на рыбу пойдзеш? — асцярожна спытала Лена, наліваючы ў шклянкі чай.

— А ты думала! — сказаў Ілья і ўсыпаў у сваю шклянку тры лыжкі цукру.— Сёння рыбка павінна здарава брацца. Толькі паспявай цягаць. Вечарам я табе прыпру цэлы пуд рыбы. Свежанькай, апетытненькай. Мо і шчупачкоў парачка пападзецца, як мінулым разам. А добрыя тады былі шчупачкі, праўда?

— У магазіне і не такія можна купіць,— раздражнёна сказала Лена.

— Дык то ў магазіне, а гэта свае. Сваімі ўласнымі рукамі злоўленыя, гэта ж вунь якая розніца. Эх, нічога вы, жанчыны, не цяміце ў рыбнай лоўлі! Пахадзіла б во сама, пацягала рыбачак з вадзічкі, то і не гаварыла б гэтак.

— Але ж зноў выхадны прападае...— уздыхнула Лена.— У кіно лепей бы схадзілі або так куды. У парк, напрыклад.

— У кіно мы і ў будны дзень схадзіць можам... як-небудзь пасля работы. А парк... ну што той парк! Людзей там у нядзелю — не прабіцца. Проста ступіць няма куды.

Лена адсунула свой недапіты чай, надпёрла рукамі падбародак і ўтаропілася ў акно.

— Зноў сядзі дома адна цалюткі дзень... Чакаеш гэтага выхаднога дня, чакаеш, а прыйдзе ён — адно толькі засмучэнне і маеш. Ацiраешся самотніцай дома, ходзіш з пакоя на кухню і назад з кухні ў пакой, бы непрыкаяная...

— Нічога, Ленанка, нічога, пашукай і ты сабе якога інтэрасу. Памазгуй нарэшце чаго-небудзь таго-гэтага. Знаходзяць жа другія жанкі сабе нешта-нейкае.

— А я ў выхадны дзень адпачываць хачу! — ужо са злосцю сказала Лена.— Ад-па-чы-ваць!

— То і адпачывай сабе на здароўе, хіба я што кажу?.. От мела б ты ахвоту да рыбацтва, ездзілі б разам...

— Яшчэ гэтага мне не хапала! — зыкнула Лена.— Хопіць і таго, што муж чорт ведае на што траціць час!

— Эх, нічога вы, жанчыны, не цяміце ў рыбацтве. Гэта ж спорт, высакародны спорт, а не абы там што!

Ілья дапіў свой чай, закурыў і выйшаў на балкон.

Была цудоўная чэрвеньская раніца. На небе — ні хмурынкі. Сонца яшчэ не паспела нагрэць паветра, і дыхалася лёгка, вольна, на поўныя грудзі.

— Любата!..— сказаў сам сабе Ілья і чамусьці ўздыхнуў. Пастаяўшы яшчэ хвілін колькі на балконе і дакурыўшы папяросу, ён вярнуўся ў пакой.

— Харошы дзянёк! — знарок весела і нават бадзёра сказаў Ілья.— Рыбка будзе брацца дай божа!

Жонка ляжала на канапе, дэманстратыўна адвярнуўшыся да сцяны. Ілья пастаяў каля яе, пачухаў патыліцу і цішком падаўся на кухню. Там у куточку за буфетам стаялі падрыхтаваныя яшчэ звечара рыбалоўныя прычындалы. Хуценька сабраўшы іх, Ілья яшчэ раз завітаў у пакой, нахіліўся над жонкай, пацалаваў у шчаку, вінавата прамовіў:

— Ты не сярдуй, Ленанка. Сама ведаеш, ну як жа мне не пайсці, калі такі дзянёк стаіць. От быў бы дождж, хіба я пайшоў бы. А ў кіно мы яшчэ сходзім, якія нашы гады. І ў кіно яшчэ сходзім, і ў тэатр, і нават, калі хочаш, у цырк. Скора там, кажуць, цікавая новая праграма будзе, от мы возьмем і сходзім. Праўду кажу, сходзім.

Асцярожна, каб не рабіць лішняга шуму, ён зачыніў за сабою дзверы, а тады стрымгалоў паскакаў па прыступках уніз са свайго чацвёртага паверха. Пасля спусціўся ў падвал і там сунуў за ацяпляльную батарэю і вудачку, і бляшанку з прынадаю, і наогул усе рыбалоўныя снасці. Пакінуў толькі адну пустую авоську, ды і тую засунуў і кішэню.

На прыпынку ён сеў у аўтобус і даехаў да Камароўскага рынку. Там, выкіроўваючы ў людскім віры, знайшоў патрэбны яму стол, а за ім — пажылога каржакаватага

дзядзьку ў выліняла́й салдацкай гімнасцёрцы, мусіць, з сынавага пляча, і ў гэткай жа выліняла́й зашмальцаванай фуражцы з блякла-зялёным аколышкам — дзядзьку Якуба. Дзядзька Якуб, як толькі ўгледзеў Ілью, на ўвесь рот заўсміхаўся, паказваючы рэдкія жоўтыя зубы. Тады выцер руку аб штаны і падаў яе Ільі.

— Пазнавата нешта сёння, малады чалавек, пазнавата,— гугнява сказаў дзядзька Якуб і зноў выцер руку аб штаны.— Я ўжо, сказаць гэта, думаў, што і не прыйдзеш зусім. Заспаў, мусіць, га?

— Пакуль яно тое, ведаеце, ды пакуль сёе...— прамовіў Ілья, таксама машынальна выціраючы сваю руку аб авоськай.— Аднак жа яшчэ і не дужа позна. На маім гадзінніку яшчэ толькі, ведаеце, колькі?

— Гы, калі будзеш лавіць рыбку па сваім гадзінніку, то хрэн ты яе і зловіш,— зарагатаў дзядзька Якуб.— Цяперака прымяркоўвайся во да майго, то ісць да нябеснага. А то во яшчэ прамурыжыў бы трошачкі, і будзь здароў, паплылі б твае плотачкі і акунькі ў чужыя грэбаўкі.

— А шчупачкоў хіба няма?..— з надзеяй спытаў Ілья.

— Ніводзін не ўзяўся, халера. Адзін, праўда, браўся быў, во такі, хунтаў, сказаць гэта, на пяць, а то і на ўсе шэсць, ды сарваўся, халера. Я-ак тузане, лёска трэсь, толькі яго і бачыў. Шкада было, каб ты толькі ведаў. Гэта ж ты мне за яго сама меней рублёў тры адваліў бы.

— Але, шкада шчупачка,— згадзіўся Ілья.

— Ну, то нічога, на наступную нядзелю я табе канцам штучак колькі прыцягну. Так і скажы жонцы. Дзядзька Якуб, скажы, пераказаў, што шчупакі будуць. А акунькі во і зараз ёсць, і плотачкі ёсць. Небагата, але на юшку хопіць, ды і на ладную патэльню астанецца таксама.

Ілья зазірнуў у дзядзькаву торбу, дзе ў мокрай яшчэ траве было дзесятка паўтара рыбін. Дзядзька яшчэ даўней растлумачыў Ілью, як завецца каторая рыбіна, і цяпер Ілья з выглядам сапраўднага знаўцы агледзеў кожную. Рыба была няважная, дробненькая, і ён уявіў сабе, як вечарам давядзецца важдацца з ёю, пакуль паскрабае ўсю; Лена ж і не дакранецца да яе...

— Усю возьмеш? — спытаў дзядзька Якуб.

— Давайце ўсю! — бадзёра сказаў Ілья, стараючыся не паморшчыцца.

Дзядзька пераклаў рыбу са свае торбы ў Ільёву авоську. Заплаціўшы грошы і нагадаўшы дзядзьку, што ў на-

ступную нядзелю прыйдзе таксама, Ілья зноў падаўся па прыпынак. Там ён сеў у тралейбус і хвілін праз колькі быў ужо ў раёне парка Чалюскінцаў. Яшчэ праз нейкі час ён таропка падпімаўся на пяты паверх аднаго з новых дамоў. На ягоны званок дзверы адчыніў маладжавы з твару, але ўжо прыкметна пасівелы мужчына ў піжаме і басам праспяваў:

Уж полночь близится, а Германа все нет...

— Ёсць Герман, ёсць,— гэткім жа тонам адказаў Ілья.— А от ці ёсць Мікіта?

— Тут Мікіта, тут! — азваўся аднекуль з кватэры яшчэ адзін голас.— Цэлую вечнасць чакаем цябе, проста змарнелі ўжо, чакаючы. Усё даўно падрыхтавана, усё намалявана, усё напісана, можна адразачку і пачынаць, каб не траціць дарагога часу.

— А ты і рыбкі, гляджу, налавіў ужо,— загрымеў смехам гаспадар кватэры.

— Якая там рыба, адпае драбязы прыцёг сёння мой настаўшчык,— засмяяўся і Ілья.— Давай яе, Іван Пятровіч, хутчэй у ваду кінем, а то да вечара з яе чорт ведае што будзе.

— То ідзі ў ванную і адкручвай кран. Твая рыба, ты і важдайся з ёю.

— Грошы, шкурадзёр, бярэ такія, што дзе толькі сорам той дзяе пры гэтым, а рыбу возіць, дык і глядзець няма на што,— бурчаў Ілья, ідучы ў ванную.— Тфу на яе, на такую рыбу!

— А па маю думку, дык ён проста малайчына, гэты твой дзядзька Якуб,— рагатаў ужо ў гасцінай Іван Пятровіч.— Ён жа робіць вялікую справу — адвучвае такіх лайдакоў, як ты, жыць за чужой спінай.

Ілья напусціў у ванну халоднай вады, начапіў на кран сваю авоську і старанна памыў рукі. Затым з нейкім незразумелым душэўным хваляваннем, якое заўсёды з'яўлялася ў такія хвіліны, падаўся ў гасціную.

Там за круглым сталом ужо ўрачыста сядзелі гаспадар кватэры заслужаны артыст рэспублікі Іван Пятровіч Заробкін і журналіст Мікіта Ходар. Да іх далучыўся і ён, Ілья Калетнік, інжынер упраўлення чыгункі. Перад імі на стале ляжаў вялікі аркуш паперы, счэрчаны незразумелымі для староннягa вока лініямі і лічбамі, што нагадваў нейкі таямнічы план часоў марскога піратства, а на

ім — калода новенькіх бліпчастых карт. І яшчэ перад кожным ляжаў старанна завостраны, нібы піка, аловак.

— З чаго пачнём, браткі? — абвёўшы кожнага пільным позіркам, быццам камандзір перад рашучай атакай, строга спытаў Іван Пятровіч.— З разбойніка або з распасоўкі?

— Чацвёртага ў нас сёння хіба не будзе? — націкавіўся для прыліку Ілья.— Толькі мы ўтрох?

— Усіх чыста пулькістаў абзваніў, ніводнага дома не знайшоў,— паведаміў Іван Пятровіч.— Відаць, пацягнулі настырныя жонкі на лона прыроды. Адно слабакі цяперака пайшлі, а не пулькісты. Ну то з чаго пачнём? Для праветрывання мазгоў, га? Мо з распасовачкі, га? Ваша слова, прадстаўнік другої старажытнай прафесіі.

— Давайце сёння сочынскую распішам,— прапанаваў Мікіта.— Пяцьсот у пульку — і парадачак.

— То гэта ж на якіх пару гадзін усяе работы,— сказаў Іван Пятровіч.— А куды спяшацца? Наперадзе ў нас цалюткі дзень, ды яшчэ які дзень!

— Не, сёння позна не будзем заседжвацца,— не зусім упэўнена прамовіў Мікіта.— Мне яшчэ трэба матэрыял у газету зрабіць пра ўчарашнія спаборніцтвы матацыклістаў.

— Трэба было ўчора пра іх і зрабіць, а не адкладваць на сёння. Нішто сабе аператыўнасць!

— Дык жа ішоў афіцыйны матэрыял, увесь нумар заняў. Давайце, аднак, сочынскую.

— Прападзі яна, тая ваша сочынская, цярпець яе не магу. Лепш ужо тады зробім пару кругоў распасоўкі, скажам, па дзесяць. Вось і атрымаецца добрая горачка. Якая думка наконт гэтага існуе на чыгуначным транспарце? — звярнуўся Іван Пятровіч да Ільі.

— Адкрыць семафор разбойніку,— сказаў Ілья.— Даць яму зялёную вуліцу!

— Я заўсёды падазраваў, што іменна вуснамі чыгуначнікаў глаголіць ісціна! — грымнуў Іван Пятровіч.— Тады і я — за разбойніка. Каб было з толкам, а не абы-як. Табе здаваць карты, Мікітка, у цябе першы туз. Ды яшчэ і твой, бубновы. Сёння табе будзе шанцаваць, як нікому, усе грошы — твае.

Мікіта пачаў раздаваць карты. З левай рукі ад яго сядзеў Ілья, яму і трэба было пачынаць гульню.

— Дзевяць чырвоных,— сказаў Ілья, узяўшы прыкуп.

— Правільна, сёрбай юшку, на дне гушча,— заявіў Іван Пятровіч.— Але і мы спаць у шапку не будзем, праўда,

Мікітка? Парачку ўзятак я ўжо бачу. Ды і мар'яж ваш не пройдзе, голубе, не, не пройдзе. Гэта ўжо точненька.

— Не забывайцеся, Іван Пятровіч, на дзевятую запаведзь прэферансістаў,— нездаволена сказаў Ілья.

— Гэта на якую ж? А-а, успомніў. Наконт шуму, так?

Удакладняючы, Мікіта працытаваў:

— Найзлейшыя ворагі прэферанса — гэта шум, жонка і абрус.

— Абрус са стала я зняў, жонак з намі, дзякуй богу, няма, а шум... ну што ж, тады маўчу, Ільюша, як твая рыба ў ванне.

Ды маўчаць Іван Пятровіч не ўмеў — ён увесь час каменціраваў гульню: то жарт паднусціць, то прыказку якую прыгадае, то анекдоцік раскажа. Адно і гудзеў у кватэры ягоны бас.

Як скончылі разбойніка, высветлілася, што найбольш было на горцы ў Ільі. Ён заказаў тады яшчэ адзін круг распасоўкі, але і тут яму не пашанцавала — нахапаў узятак болей за ўсіх. «Горка» ягоная зноў падскочыла.

— Набраўся, як сучка блох..— сказаў Ілья, запісваючы на паперы, у самай сярэдзіне, умовы гульні.— На старой капейчыне няхай ідзе, так? А ў пульку сто дваццаць.

— Малавата пры такой горцы,— паківаў галавою Іван Пятровіч.

— Пішы ўжо сто пяцьдзесят, дзе наша ні прападала,— сказаў Мікіта і ўзяўся зноў тасаваць карты.

— Няхай сабе будзе сто пяцьдзесят,— з панурай абыякавасцю, што найшла раптам на яго, пагадзіўся Ілья.

— А цяпер,— устаючы і пацціраючы рукі, прамовіў Іван Пятровіч,— перш чым пачаць, собсцвенна, пульку, пройдзем на кухню, там у мяне сёе-тое падрыхтавана. Для праветрывання мазгоў. Бо, як гласіць трэцяя запаведзь, пулька без ста грамаў — усё адно, што ракі без піва.

На кухні сапраўды ўсё было падрыхтавана дзеля таго, каб падмацаваць сілы перад рашучай барацьбой. Яны ўзялі па чарцы, закусілі. Пагаманілі пра цудоўнае надвор'е, пра тое, што сёлета мае быць добры ўраджай. Потым узялі па другой. Іван Пятровіч расказаў анекдот пра аднаго заўзятага прэферансіста. Той аднаго разу паехаў на курорт у Сочы і ў першы ж дзень узяўся за гульню. Калі скончыўся ў яго водпуск, ён сеў у поезд, выглянуў у акно і са здзіўленнем сказаў: «А тут, аказваецца, ёсць мора!»

Яны парагаталі для прылiку, бо кожны даўно ведаў гэты стары анекдот. Пасядзелі і пакурылі яшчэ крыху, але Іван Пятровіч болей у чаркі не наліў. Паказваючы на пляшку з рэштаю «Белавежскай», ён сказаў:

— А гэта — таму, хто падсядзе на мізэры. Як толькі хто падсядзе, мае поўнае права бегчы на кухню і кульнуць чарку. На прадмет суцяшэння, так сказаць.

Тады яны засяшаліся ў гасціную. Кожны зноў сеў на сваё ранейшае месца. Мікіта пачаў здаваць карты на гульню.

— Першы рэміз — золата! — сказаў Ілья і стукнуў кулаком па сваіх картах, што паклаў перад ім Мікіта.

— У цёмную бярэш? — ніколькі не здзівіўся Іван Пятровіч і заначыў: — Табе, собсцвенна, цяпер толькі цямніць і трэба, каб збіць горку. І для праветрывання мазгоў таксама.

Ды горка не збілася ні на ёту. Наадварот, яшчэ павялічшала. Бо карты прыйшлі такія, што гуляць апі не было з чым. Не дапамог і прыкуп.

Пасля Ілья два разы браў мізэра, і абодва разы «садзіўся» — адзін раз без дзвюх узятак, а другі нават без чатырох. Пад раскацісты рогат Івана Пятровіча бегаў на кухню, паспешліва глытаў там паложаныя яму чаркі, але абяцанага Іванам Пятровічам суцяшэння яны не прыносілі.

Яму цэлы дзень не шанцавала. К вечару толькі ў аднаго яго і асталася горка. Давялося яе распісваць. Мікіта накруціў на Ілью пяць «колаў», а Іван Пятровіч аж восем. Каб разлічыцца, Ілью ледзьве хапіла грошай, якія ён употай ад Лены прыхапіў з сабою і якія, між іншым, адкладваў, каб купіць кінакамеру.

— Дарэчы,— сказаў Іван Пятровіч, старанна запіхваючы грошы ў кашалёчак-падкоўку,— на наступную нядзелю трэба будзе шукаць нам якога другога прытулку. Паслязаўтра прыязджае з гастроляў мая дражайшая палавіна. Яна нам такую пульку накажа, што не дай ты божа!..

— Не прападзём, браточкі, не прападзём! — сказаў тады Мікіта.— Якраз у суботу я адпраўляю сваю Сімачку на поўдзень, у Сакі. Абсталюемся, значыцца, у мяне. Колька, нашчадак мой, таксама замінаць не будзе, яго заўтра ў піянерскі лагер выпраўляю.

— Благадаць, маць часная! — усклікнуў Іван Пятровіч.— Тады, можа, яшчэ па адной кульнём? У мяне ў халадзільніку прызнаюся ўжо вам як на духу, прыхавана

яшчэ пляшачка армянскага трохзоркавага. Бярог к жончынаму прыезду, але...

— Абавязкова кульнём, а хто сказаў, што не? — узрадаваўся Мікіта.— Цяпер грэх будзе не кульнуць пасля такой работы. А матэрыял у газету я заўтра зраблю, підзе ён не дзенецца. Устану трошкі раней і зраблю. На свежую галаву заўсёды лепей пішацца.

— Я не буду,— паморшчыўся Ілья.— Трэба пайсці, а то жонка... ды і наогул...

Ён выцягнуў з ванны сваю авоську з рыбай, развітаўся і пайшоў дамоў.

Ні тралейбусы, ні аўтобусы ўжо не хадзілі, а на таксі грошай не асталося. Давялося ісці пешкі.

У галаве гуло, увесь рот запаланіла нейкая прыкрая гаркота, і наогул было так моташна, што і жыць на свеце не хацелася. А яшчэ ж раніцою ў яго быў такі бадзёры настрой, так яго цягнула да гэтай пулькі!.. Верылася, што ў добрай кампаніі ён добра прабавіць час, адпачне, «праветрыць мазгі», як любіў гаварыць Іван Пятровіч. Нішто сабе праветрыў!..

І — падыходзячы ўжо да дома — Ілья адно дзёўб сабе, што ніколі і нізавошта не сядзе болей за гэты пракляты прэферанс. Не шкада было тых прайграных грошай — чорт з імі, з грашмі, на тым тыдні ён мае атрымаць прэмію за сваю рацыяналізацыю, якраз хопіць на кінакамеру,— шкада і крыўдна было, што і галава вунь як дурная, і ў роце — мо з таго, што многа курыў,— пячэ гаркота, і ўсё цела бы не сваё, бы нейкае чужое. І дзень — такі дзень! — збэйсаны чорт ведае на што!..

Падняўшыся на свой чацвёрты паверх і ўжо ўставіўшы ключ у замок, ён раптам успомніў, што не зайшоў у падвал і не ўзяў там свае рыбалоўныя прычындалы. Давялося зноў спускацца ўніз і зноў падымацца. Гэта надало яму яшчэ большай злосці на самога сябе і канчаткова вызначыла рашэнне назаўсёды скончыць адгэтуль з прэферансам.

Лена ўжо спала. Ілья ўкінуў злашчасную рыбу ў халадзільнік, праглынуў аж дзве таблеткі пірамідону, патрымаў галаву пад кранам з халоднай вадой і, не павячэраўшы, лёг спаць. Але заснуць доўга не мог. І пасля да самае раніцы спаў вельмі неспакойна, часта прачынаўся, бы ад якіх штуршкоў, і снілася яму нейкая трывожная цьмяная безладзь, і то рабілася дужа горача, а то раптам кідала яго ў халодны пот...

А ў наступную суботу яму пазваніў на работу Мікіта і паведаміў, што напраўду выправіў раніцою жонку на курорт і яны могуць распачаць пульку нават сёння звечара.

— Ёсць і чацвёрты партнёр,— таямнічым голасам гаварыў Мікіта, мабыць, прыкрываючы ад некага староннягa трубку рукою.— Пецька Худаковіч з тэлебачання просіцца ў кампанію. Слабавата, праўда, гуляе, дужа намногу думае, мізэра лавіць не ўмее, але, можа, возьмем, га? Іван Пятровіч не пярэчыць.

— Сёння я не магу,— з тугою сказаў Ілья.— Лена ўзяла білеты ў кіно. На апошні сеанс.

Ілья пачуў у трубцы, як Мікіта шумна ўздыхнуў.

Ілья міжволі і сам уздыхнуў.

— Тады давай заўтра...— нібы крыўдуючы, прасоп пасля паўзы Мікіта.— Толькі ж прыходзь раней, ты нешта заўжды позніешся.

— Бу здзелана! — падрабляючыся пад Райкіна, сказаў Ілья.

І энергічна паклаў трубку на апарат.

«Уся загвоздка ў тым, што я тады многа цямніў,— бы спрачаючыся з кімсьці ў думках, зыркнуў Ілья вачыма наўкола.— Уцёмную мне ніколі не шанцуе, гэта ж факт. Дык навошта мне тыя цёмныя, няхай другія цямняць, калі хто мае ахвоту. А я буду гуляць спакойненька, ціхенька, рахманенька...»

У нядзелю за снядапкам Лена спытала:

— Сёння зноў на рыбу збіраешся?

— А ты думала! — сказаў Ілья, намазваючы масла на хлеб.— Сёння рыбка павінна здорава лавіцца. Толькі паспявай цягаць. Мо і шчупачкоў парачка нападзецца.

— Мо і нападзецца,— сказала Лена.— Я такую вуду прыдбала, што на яе, казаў чалавек у магазіне, толькі адны шчупакі і будуць брацца.

— Ты купіла мне новую вудачку? — здзівіўся Ілья.

— Чаму табе? Я сабе купіла.

Апёкшыся чаем, Ілья ледзь не ўпусціў шклянку на падлогу.

— Як гэта — сабе? Чаму — сабе?..

— Ты ж сам казаў, што, калі б мела я ахвоту да рыбацтва, мы ездзілі б разам. От я і надумалася займець тую ахвоту. Сёння пагляджу, што з гэтага атрымаецца. Я ж цэлы тыдзень зубрыла кніжку. Спецыяльна купіла. Во,

пазываецца «Спартыўная лоўля рыбы». Там у ёй усё чыста напісана, што і як трэба рабіць.

— Пакажы-тку, што там за кніжка такая, пакажы...— Ілья і разгубіўся быў трохі, і зацікавіўся не ў меншай меры.

— Па-мойму, добрая кніжка. І занятак гэты, здаецца, таксама неблагі. Сядзі сабе на беразе і цягай рыбку з вады. Я пачынаю разумець тваё гарачае захапленне рыбнай лоўляй.

Пакуль жонка збірала харч у дарогу, Ілья паспеў збольшага пагартаць кніжку. Яму, чалавеку, які ніколі ў жыцці не быў на рыбалцы, усё тут было ў навіну — і спосабы лоўлі, і звесткі пра рыб, і якую з іх на што можна лавіць. Асабліва зацікавіў яго апошні раздзел — «Вадаёмы для рыбнай лоўлі ў ваколіцах г. Мінска». Ён жа не меў аніякага ўяўлення аб тым, куды і як ездзяць на рыбу мінскія аматары...

— Паехалі? — прамовіла Лена, напакаваўшы ежаю сумку.— Ты куды звычайна ездзіш? Сёння мы таксама туды паедзем?

«Эх, прапала сёння пулька...» — падумаў Ілья, сумна зірнуўшы на жончыну новенькую вуду.

— Не, сёння мы паедзем у якое другое месцейка,— сказаў ён.— Давай ужо, калі на тое, будзем кіравацца навукай. Навука — вялікая штука. Навошта саматужнічаць, калі ў нас цяпер такая падмога ёсць. От паглядзі, аўтар піша, што непадалёк ад вёскі Крыжоўка, у заліве, абмежаваным двума вялікімі ўзгорыстымі астраўкамі, добра бяруцца шчупакі, акуні, плотка, мянтузы і яршы. Гэта ж лепшай мясціны і не прыдумаеш. Хочаш — шчупакоў цягай, хочаш — акунёў, хочаш...

— Я хачу мянтузоў! — заявіла Лена.— Шыбуем у той благаславёны заліў!

— Шыбуем!

Яны ўціснуліся на вакзале ў электрычку і праз дваццаць мінут былі на станцыі Крыжоўка. Пасля ім давялося прайсці яшчэ пешкі колькі кіламетраў, пакуль знайшлі яны мясціну, падобную на тую, пра якую ішла гаворка ў кнізе.

— Ды тут напраўдзе павінна быць рыбы — страшэнная сіла! — сказаў Ілья і адчуў, што яго пачынае агортваць нейкае дзіўнае, ніколі раней не зазнанае пачуццё. Ён пачаў паспешліва рыхтаваць свае рыбалоўныя снасці.

Мабыць, нешта падобнае адчувала і Лена. Яна гэтак жа, як і ён, завіхалася са сваімі прычындаламі.

Штохвіліны зазіраючы ў кнігу, яны рабілі ўсё так, як там было напісана.

І вось вуды закінуты. Цяпер асталося толькі чакаць.

І яны чакалі. З хваляваннем, з трымценнем сэрцаў, прагна ўзіраючыся ў паплаўкі і ўздрыгваючы кожны раз, як здавалася, што і тыя ўздрыгваюць...

А дзень быў ясны, сонечны, ціхі,— бы знарок прыдуманы для рыбаловаў. Дзеля таго каб рыба толькі тое і рабіла, што хапала за кручкі.

Ды рыба нешта пакуль не хапала...

Яны чакалі. Цяпер ужо з большай цярплівасцю і спакоем.

«Разбойніка яны, мусіць, ужо распісалі...— падумаў Ілья.— А можа, яны пачалі сёння з распасоўкі?..»

Недзе на другой гадзіне Ілья нечакана ўбачыў, як Лена раптам спрытна выхапіла вуду, і на лёсцы затрымцела ў паветры серабрыстая рыбка.

— А мая ж ты родненькая! — засакатала Лена і, асцярожна зняўшы рыбку з кручка, цмокнула яе ў разяўлены роцік.

Ілья таксама патрымаў рыбку ў руках.

— Гэта мянтузік? — спытала Лена.

— Плотка,— аўтарытэтна сказаў Ілья.

— А як ты думаеш, яна мае чатырнаццаць сантыметраў удаўжыкі?

— Дзіўна, навошта табе іменна чатырнаццаць?

— Бо ў кнізе сказана, што калі рыба не мае чатырнаццаці сантыметраў, то яе ні ў якім разе нельга не толькі лавіць самому, але нават купляць у другіх.

«А я ж купляў...— падумаў Ілья.— Ну, то няхай мне цяпер толькі нападзецца на вочы той дзядзька Якуб!..»

— Тады пускай сваю плотку назад у раку. Яна і дзесяці не пацягне,— сказаў Ілья.

Лена ўздыхнула і, яшчэ раз пацалаваўшы рыбку, асцярожненька пусціла яе ў родную стыхію. Рыбка адразу знікла з вачэй.

«Эх, прапала сёння пулька...» — падумаў Ілья.

— Давай пакупаемся трошкі,— прапанавала Лена.— Вада цёплая, харошая.

— Давай пакупаемся,— згадзіўся Ілья.

Яны доўга дурэлі ў вадзе, хоць тая была не такая ўжо

і цёплая, пасля, нібы дзеці, бегалі берагам адно за адным да задышкі, тады доўга вылежваліся ў пяску. Спахапіўшыся, зноў закінулі вуды.

«Але, прапала пулька»,— яшчэ раз падумаў Ілья і здзівіўся, што падумалася яму пра гэта цяпер ужо без аніякага шкадавання.

Пад вечар і Ілья выхапіў сваёю вудаю з ракі рыбіну, і даволі-такі ладную, але, паколькі нічога болей так і не ўдалося злавіць, яны і гэтую ўкінулі назад у ваду.

Вярталіся дамоў стомленыя, у абаіх смылелі плечы — сонца добра надпякло іх, аднак вочы і ў яе, і ў яго адно жвавелі.

— Ат, не бядуй, Ільюша,— горнучыся да мужавага пляча, гаварыла Лена.— Наступным разам, сам пабачыш, мы возьмем аж цэлы пуд рыбы, а то нават і два. Гэта я такая няўдаліца, таму і табе не шанцавала. Але от я надзубру яшчэ кніжку...

— Трэба нам спінінг займець,— сказаў Ілья.— Спінінгам ямчэй лавіць.

— То я заўтра і куплю. Пайду зранку і вазьму.

— Бяры ўжо тады два. Найноўшай канструкцыі. Яны не дужа дарагія?

— Сэканомім на чым-небудзь іншым, нічога.

*1966*

# СУЧАСНАЯ ТЭМА

На самым пачатку вясны, у сакавіку, інжынер-планавік будаўнічага трэста Мечыслаў Станіслававіч Шугай пайшоў на пенсію...

Што ж, у жыцці кожнага рабочага, служачага і ІТР настае ўрэшце тая часіна, калі яму кажуць: «Бывай, чалавеча. Адбыў сваё — і годзе. Давай цяпер адпачні. Нацягаўся, наборсаўся за свае шэсць дзесяткаў гадкоў — то ідзі, голубе, гуляй. Бо маеш поўнае права, ты яго заслужыў. Вось так — бяры сабе і гуляй на здароўечка».

І ён пайшоў, несучы ў кішэні працоўную кніжку з апошнім у жыцці запісам, а пад пахаю — падарунак адміністрацыі: чайны сервіз на шэсць персон...

Ды гэта ж толькі сказаць лёгка — бяры і гуляй. Ну сёння пагуляеш, ну заўтра, ну паслязаўтра. А далей што?..

А далей не гуляецца. Хоць гвалт крычы, не гуляецца...

Мечыслаў Станіслававіч пачаў прыкмячаць, што ён худнее. І са сну зусім выбіўся. І толькі ўсё думае, думае. Ляжыць — думае, ходзіць — думае, сядзе — таксама думае. А што надумаеш? Ані нічога, бо ўсё — у мінулым...

І жонка, Арыядна Маркаўна, таксама пачала марнець, бо не магла спакойна глядзець на мужавы пакуты. Сама яна, вядома, ні на якую пенсію не пайшла, пасада хатняй гаспадыні пажыццёвая. Яна гэтак жа, як і раней, адно завіхалася з раніцы да позняга вечара, не даючы сабе і хвілінкі спачыну, і таму шчыра спагадала мужу, ведаючы, як цяжка жыць на свеце без поўнага якога клопату.

— Пашукаў бы ты сабе, Мечык, якога занятку,— гаварыла яна мужу.— А то зусім змарнееш, ды і я сама, не раўнуючы, раней часу ў дамавіну лягу.

А дзе возьмеш той занятак, дзе яго знойдзеш? Ды і не ўмеў Мечыслаў Станіслававіч ані нічога. Усё жыццё адно толькі планаваў, планаваў, а болей так нічога рабіць і не навучыўся. Вось тут і паспрабуй прыдумай занятак...

Завітаў ён неяк у домакіраўніцтва — ці не далі б, маўляў, яму там чаго парабіць на грамадскіх асновах. Але ў домакіраўніцтве ад яго толькі адмахнуліся: у іх па ўліку, сказалі яму, столькі пенсіянераў, што забяспечыць усіх нават часовай работай яны ніяк не могуць. Нават персанальныя пенсіянеры, аказваецца, і тыя ходзяць у іх беспрацоўнымі.

Ішлі дні, тыдні. Мінуў месяц, другі. Арыядна Маркаўна зачасціла да дактароў — у яе развілася мігрэнь праз мужавы пакуты.

І вось аднае раніцы — гэта было ўжо ў чэрвені — Мечыславу Станіслававічу прыйшла раптам у галаву адна думка, нечаканая, як бліскавіца ў ясны дзень. Спачатку Мечыслаў Станіслававіч нават спалохаўся, настолькі недарэчнай здалася яму тая думка. Ён нават пабляднеў быў, нават дыхаць яму заняло на нейкі час. Але, пахадзіўшы колькі часу па пакоі і супакоіўшыся нарэшце, ён сказаў сабе: «А чаму б і не? Чаму б і не ўзяцца мне, іменна мне, за гэта?» Яшчэ хвілін праз колькі ён ужо самаўпэўнена пераконваў сябе: «Правільна, Мечыслаў Станіслававіч! Якраз гэта ты і павінен зрабіць. Якраз гэта!»

Ён адразу павесялеў і, усміхаючыся ў вусы, нават пачаў насвістваць арыю Тарэадора. Арыядна Маркаўна, стаўляючы снядалак на стол, вельмі здзівілася з такое перамены ў мужавым настроі і асцярожна спытала:

— Мо ты ўжо табліцу праверыў? Мо выйгралі?

— Смалы мы выйграем! — весела сказаў Мечыслаў Станіслававіч.— Як той казаў, на бога і на табліцу спадзявайся, а сам маху не давай!

Арыядна Маркаўна нічога не зразумела, але распытваць болей не стала, яна рада была і з таго што ў мужа ўпершыню за апошнія месяцы быў добры настрой.

Яна стала старанна частаваць яго сваімі прысмакамі.

А Мечыславу Станіслававічу сёння ўсё было ўсмак. Ён пахваліў недасмажаную катлету, пасля зазначыў, што даўно ўжо не еў такое кашы. Тады стаў мурлыкаць «Тарэадора» і тым часам разважаць сам з сабою. Плынь ягоных думак разлівалася ўсё шырэй і шырэй.

«Так, так, я павінен зрабіць гэта. Я павінен напісаць яе, абавязкова павінен. Напісаць... кнігу. Так, так, кнігу! А чаму б і не?! Скажам, аповесць. Вялікую, салідную, важкую. Або нават раман. Так, так, іменна раман! На якую тэму? Вядома, на сучасную. У газетах вунь колькі пішуць, што ў нас мала добрых твораў па сучасную тэму. Мала пішуць пісьменнікі пра выхаванне моладзі, а калі і пішуць, дык не тое, што нам трэба. Адстаюць пісьменнікі ў гэтым сэнсе, вельмі адстаюць. Ды і што яны наогул ведаюць, тыя пісьменнікі! Жыцця не вывучаюць, ад народа адарваліся. Адно адседжваюцца, кажуць, у сваіх Дамах творчасці на беразе Чорнага мора, рэжуцца ў прэферанс, жлукцяць сухое віно напалам... бр-р-р!.. з гарэлкай, а як скончацца грошы, пачынаюць хуценька страчыць хто што: хто паэму, хто трылогію, хто п'есу. А то яшчэ, кажуць, некаторыя пачынаюць перараблянь чужыя раманы ў свае сцэнарыі. Канечне, што ж яшчэ будзеш рабіць, калі не ведаеш жыцця. А ён, Мечыслаў Станіслававіч, жыццё ўга як ведае, ад народа ніколі не адрываўся, у іхнюю кантору свабодна заходзілі і майстры, і брыгадзіры, і нават простыя рабочыя, перад імі дзверы ніхто ніколі не зачыняў. Каму ж, як не яму, Мечыславу Станіслававічу, варта пісаць раман на сучасную тэму. Канкрэтна кажучы, раман аб выхаванні моладзі. А то што ж гэта за моладзь цяперака пайшла. От раней была моладзь! Не тое, зусім не тое, што цяперашняя. Так, так, трэба напісаць раман. Прачытае яго наша моладзь — і адразу будзе ведаць, як трэба жыць на свеце».

Паснедаўшы, Мечыслаў Станіслававіч закурыў цыгарэту з фільтрам і прылёг на канапу пачытаць «Літаратурку». Здзівіўся, што ў газеце няма перадавога артыкула, дзе перад пішучай брацці ставіліся б канкрэтныя задачы на сённяшні дзень. Тады ён прачытаў рэцэнзію на новы раман Ул. Паднябеснага «Земны хлеб» і яшчэ раз пераканаўся, што народ настойліва патрабуе ад пісьменнікаў твораў пра сучаснасць. Раман «Земны хлеб», аказваецца, напісаны на гістарычную тэму, і крытык проста спляжыў яго.

«Так, так, я мушу напісаць раман на сучасную тэму,— яшчэ раз сказаў сабе Мечыслаў Станіслававіч.— І наогул я павінен цалкам аддацца літаратурнай працы. У гэтым цяпер будзе сэнс майго жыцця. Я буду пісаць, пісаць, пісаць. Кожны дзень, кожную хвіліну. Я проста не маю права не пісаць. Калі я не буду пісаць, мне гэтага ніхто не

дарус. А што, хіба святыя гаршкі лепяць? Не, не святыя, а зусім наадварот. Тарэадор, смялей у бой!»

У самым найлепшым настроі, увесь аж перапоўнены творчым свербам, Мечыслаў Станіслававіч падаўся з хаты. Яму хацелася пабыць недзе на адзіноце, усё як след абдумаць, абмазгаваць, каб ніхто не перашкаджаў. Ды і невядома яшчэ, як паставіцца да ўсяго гэтага жонка. Дзіўныя яны людзі, гэтыя жанчыны. Ніколі не ведаеш, што яны скажуць на тое або іншае тваё слова. Ты ёй будзеш, як у тым старым анекдоце, даводзіць — маўляў, стрыжана, а яна сваё: голена! І калі Арыядна Маркаўна возьме, крый божа, сабе ў галаву, што раман на сучасную тэму непатрэбен, дык хоць ты тапі яе, а толку не даб'ешся. Ды і наконт святых і гаршкоў таксама нічога не давядзеш ёй, лепш і не спрабаваць.

У скверы непадалёк ад кінатэатра ў гэты ранішні час амаль нікога не было, і Мечыслаў Станіслававіч, аблюбаваўшы лаўку, цалкам аддаўся марам. Што там ні кажы, а быць аўтарам мастацкага твора — гэта табе не абы-што! Вось ты ідзеш цяпер па горадзе, і ніхто на цябе не звяртае аніякай увагі, для ўсіх чыста ты — нішто, нуль без палачкі, нікчэмная жамяра́. А тагды — уга! Тагды ты ўжо для ўсіх — фігура, велічыня. Кожны з табой вітаецца, кожны лічыць за гонар паздароўкацца, ды не проста так, а за руку, запытацца пра здароўе, пра тое, як сёння спалася, ці не дужа дапякала творчае гарэнне.

Няблага, зусім, відаць, няблага быць аўтарам, чорт пабяры!

Раптам нехта сказаў:

— Як здароўечка, Мечыслаў Станіслававіч, як сёння спалася, ці не дужа дапякала...

Ён скалануўся і ўзняў вочы.

Цьфу, напалохалі, Сцяпан Гаўрылавіч...

— Ці не дужа, кажу, дапякала бяссонніца?

Перад ім стаяў яго добры знаёмы, былы касір «Мехбытрамонту» Сцяпан Гаўрылавіч Кудзеля. Мечыслаў Станіслававіч не бачыў яго даўнавата і шчыра ўзрадаваўся гэтай сустрэчы. Выглядаў Сцяпан Гаўрылавіч ніштавата, проста цудоўна. Ён быццам нават памаладзеў, пасвяжэў апошнім часам. «А таксама ж, нябога, на пенсіі,— з сумам падумаў Мечыслаў Станіслававіч.— Гадкі, мабыць, чатыры прахалоджваецца ўжо, а то і ўсе пяць».

— Добры дзень вам, Сцяпан Гаўрылавіч, добры дзень!

Сядайце во, пасядзім, пагамонім. А па здароўе, дзякаваць богу, не скарджуся, након бяссонніцы таксама не скажу нічога благога. А вы як маецеся, дарагі Сцяпан Гаўрылавіч?

— Вашымі малітвамі, шаноўны Мечыслаў Станіслававіч, вашымі малітвамі,— прысаджваючыся на лаўку, зарагатаў Сцяпан Гаўрылавіч.— Чуў я пра вас, чуў. Значыцца, у нашым палку прыбыло? А ці даўно ўжо адпачываеце?

— Але. Трэці ўжо месяц на пенсіі,— уздыхнуў Мечыслаў Станіслававіч.

— Цудоўненька! А хіба не? Цудоўненька!

— Ды як вам сказаць... Не прывык яшчэ... Вось якія справы, Сцяпан Гаўрылавіч.

— Нічога, прывыкнеце. Другія і не да гэтага прывыкаюць. А дазвольце пацікавіцца, чым вы цяпер займаецеся? Што parабляеце і на якой ніве?

— Ды як вам сказаць...— сумеўся Мечыслаў Станіслававіч. «А мо расказаць яму ўсё? — мільганула думка.— Расказаць мо пра свой намер? Ён павінен мяне зразумець. Ён жа не тое што баба...»

— Няўжо лынды б'яце? Нягожа гэтак, Мечыслаў Станіслававіч, нягожа. Нам цяпер самая пара працаваць. Я хачу сказаць — для душы працаваць. Ну і, вядома, на карысць таксама. А то што было раней? От возьмем да прыкладу мяне. Кім я быў усё жыццё? Вы скажаце — касірам. Правільна. Але якім касірам? Няшчасным, вось якім, проста самым разнявшчасным. Ці спытаў у мяне хто хоць калі: а ці падабаецца вам, Сцяпан Гаўрылавіч Кудзеля, быць касірам? Не, ніхто не спытаў. Як пасадзілі некалі ў маладосці ў касу, так потым і забыліся на мяне. А я, скажу вам па-шчырасці, ненавідзеў лютай нянавісцю сваю пасаду. Мне тая каса горш за турэмную камеру была. А на грошы я проста глядзець не мог! Яны мне сніліся кожнае ночы. Дзесяткі, пяцёркі, траячкі... цэлыя горы грошай. Мне трэба здаваць іх, праклятых, а як здасі, калі яны ні ў адзін банкаўскі падвал не месцяцца. Жах, проста жах!.. А то яшчэ снілася, быццам я сам — рубель, і пры тым — неразменны рубель. І от хтосьці вялізны і страшны ходзіць за мною ад адное касы да другое і нідзе не можа разняніць мяне, бо не ведае, што я — неразменны рубель.

— Папраўдзе, жах!..— згадзіўся Мечыслаў Станіслававіч.

— Затое цяпер — любата. Цяпер я раблю тое, што мне дае найвялікшую асалоду, што цалкам задавальняе мяне і не мучыць начнымі кашмарамі.

— А што ж гэта такое, Сцяпан Гаўрылавіч, калі не сакрэт? Што вы такое незвычайнае робіце?

— Пішу. Пішу, дарагі мой, пішу.

— Пі-пішаце?..— аж заікнууся Мечыслаў Станіслававіч.

— Займаюся, як казалі даўней, ізячнаи славеснасцю.

Мечыслаў Станіслававіч як разявіў быў рот, так і астаўся ў гэткім стане. Вось табе і маеш! Чаго-чаго, а гэтага ён ані не збіраўся пачуць ад Сцяпана Гаўрылавіча...

— Ну і... атрымліваецца, га?.. — нясмела спытаў ён нарэшце.

— А як жа! Прызнаюся вам, як на споведзі: я гэтыя пяць гадкоў не сядзеў склаўшы рукі, не, не сядзеў. І вынік — раман на тры часткі з пралогам і эпілогам.

— Аж на тры!.. — паблякнеў Мечыслаў Станіслававіч.

— Калі ўжо, як той казаў, пáдаць дык пàдаць з добрага каня! — І Сцяпан Гаўрылавіч, нібы шабляй, секануў паветра рукою.

То вы, значыцца, ужо скончылі свой раман?

— Паўгода таму назад скончыў, дарагі Мечыслаў Станіслававіч.

— Ну а потым? Што вы з ім зрабілі потым? — Мечыслаў Станіслававіч усім тулавам павярнуўся да Кудзелі.

— Вядома; што. Паслаў у сталічны часопіс. Між іншым, і ў рэдакцыях, аказваецца, бюракраты ёсць. Тры месяцы прымусілі мяне чакаць адказу. Давялося паслаць напамінак, нагадаць ім, як ставіўся да творчых самародкаў з народа Максім Горкі. Тагды ўжо яны борздзенька прыслалі адказ.

— Прынялі? — прашаптаў Мечыслаў Станіслававіч.

— Тэму ўхвалілі, агульны кірунак таксама. Рукапіс, кажуць, мае пэўную цікавасць. Але ёсць, кажуць, і недахопы.

— Усё-такі ёсць?

— Трэба, кажуць, яшчэ дапрацаваць раман. Напрыклад, пабіць рукапіс на абзацы, а то іх у мяне, кажуць, зусім мала.

— Дык пабіце, Сцяпан Гаўрылавіч. Калі ўся загвоздка толькі ў абзацах — парабіце ім тых абзацаў як найболей, гэта ж лягчэй лёгкага.

— Кукіш ім з трасцай. А яны там навошта сядзяць? За што ім дзяржава грошы плоціць, і прытым, кажуць, немалыя? Могуць і самі нарабіць з гатовага абзацаў. Акрамя таго, скуль я ведаю, дзе ім патрэбны тыя абзацы? Зраблю, а яны зноў скажуць: не там. Не, гэта ўсё фармальныя прыдзіркі. Таму я напісаў скаргу ў Саюз пісьменнікаў, няхай патрасуць тых тыпаў у рэдакцыі, няхай прыгледзяцца, ці на сваіх месцах сядзяць каторыя з іх.

А якая, прабачце, у вас тэма?

Сцяпан Гаўрылавіч ахвотна паведаміў:

— Гістарычная. Пра паход Антанты на нашу маладую краіну.

Мечыслаў Станіслававіч хацеў быў сказаць, што цяпер, на даным этапе, больш патрэбна чытачу, мабыць, сучасная тэма. Але, разважыўшы, не сказаў нічога.

Усё ж Сцяпан Гаўрылавіч мае вялікі вопыт, ён ужо вунека пяць гадоў працуе ў галіне мастацкай літаратуры.

Таму Мечыслаў Станіслававіч палічыў за лепшае падтакнуць.

— Правільная тэма, абсалютна правільная і патрэбная. Тут без пралога і эпілога ніяк не абыдзешся.

— А тым часам я ўзяўся за новы раман.

У Мечыслава Станіслававіча тарганулася правая шчака, запыла нешта недзе ў сярэдзіне. І зрабілася раптам вельмі маркотна.

— Пішу цяпер пра наш рабочы клас. Тэма гэтая амаль не распрацавана ў нашай літаратуры, я спецыяльна цікавіўся. Была, праўда, адна навястушка — ну яшчэ сёетое. Аднак буйнога маштабнага твора ніхто яшчэ не стварыў. От я і ўзяўся. Трэба падняць гэты некрануты цалік, грунтоўна падняць, а то што ж...

— А здолееш?

— Думаю, хопіць сіл. Паеду на буйны завод, зжывуся з людзьмі...

«Далёка, сучы сын, пойдзе,— з сумнай зайздрасцю думаў Мечыслаў Станіслававіч.— У яго хватка — ого! Мёртвая, можна сказаць, хватка. Эх, позна я надумаўся брацца за пяро, позна. Аб'ехалі мяне, абскакалі...»

— А калі зноў раптам знойдуць недахопы — што тады? — спытаў Мечыслаў Станіслававіч.— Пачнуць надпускаць, як вы трапна сказалі, фармальныя прыдзіркі, га?

Тады прыйдзецца пісаць у Вярхоўны Савет. Твардоўскі — хто? Дэпутат? Дэпутат! От і няхай выконвае свой

абавязак слугі народа. Няхай даводзіць да канцыцы твор, напісаны прадстаўніком нашага народа.

«Усё разлічыў, усё абмазгаваў,— адно здзіўляўся Мечыслаў Станіслававіч.— Дзе ўжо мне дужацца з гэткім прапырам...»

— А як скончу гэты раман, вазьмуся яшчэ за адзін,— з натхненнем гаварыў далей пра свае творчыя планы Сцяпан Гаўрылавіч.— Мяркую напісаць яшчэ твор па сучасную тэму. Аб выхаванні моладзі.

Мечыслаў Станіслававіч ікнуў. І зноў адчуў, як тарганулася шчака — цяпер ужо левая.

— Мала пішуць пісьменнікі пра выхаванне моладзі, нашай савецкай моладзі, нашай будучыні,— заявіў Сцяпан Гаўрылавіч.— Ды і што яны наогул ведаюць, тыя пісьменнікі. Жыцця не вывучаюць, ад народа адарваліся. Адно сядзяць у сваіх Дамах творчасці па беразе Чорнага мора ды заводзяць шашні з чужымі жонкамі. Яно-то, канечне, праўда — чужая жонка заўжды дзеўка, хі-хі-хі, аднак жа... Не, не дачакаецца народ ад іх добрых твораў, не дачакаецца! От таму і трэба нам, старой гвардыі, брацца, пакуль не позна, за справу. Закасаць рукавы — і за работу. Бо раман аб выхаванні моладзі, скажу я вам прама, народу вельмі патрэбен. Вы толькі зірніце наўкол — што гэта за моладзь цяперака пайшла!..

Мечыслаў Станіслававіч і сапраўды паглядзеў наўкол сябе. Але на лавачках сядзелі адны бабулі ды сівыя дзяды.

— От у нашыя гады была моладзь! Не тое, зусім не тое, што цяперашняя. Зрэшты, не вам мне пра гэта гаварыць, вы ж і самі, мабыць, сёе-тое помніце, праўда? Эх, бывала...

«Усё прапала,— сказаў сам сабе Мечыслаў Станіслававіч.— Я безнадзейна спазніўся. Аб'ехалі мяне, абскакалі...»

— Прабачце, Сцяпан Гаўрылавіч, мне трэба пайсці. Да пабачэння. Жадаю вам найлепшых творчых поспехаў.

— Дзякую, Мечыслаў Станіслававіч, шчыра дзякую,— расчулена прамовіў Сцяпан Гаўрылавіч.— Мне вельмі прыемна было пагутарыць з вамі. Вы чулы, сардэчны чалавек, я ведаю — вы мяне зразумелі. Бывайце, дарагі Мечыслаў Станіслававіч. Вы яшчэ пазнаёміцеся з маімі творамі, пабачыце на свае ўласныя вочы і, так сказаць, узважыце. Бывайце!

Ен доўга і моцна ціснуў руку Мечыславу Станіслававі-

чу, і ў таго нават выступілі слёзы на вачах. Сцяпан Гаўрылавіч палічыў іх за слёзы спагады і сам тады залыпаў пачырванелымі павекамі.

Перш чым пайсці дамоў, Мечыслаў Станіслававіч завітаў на пошту, атрымаў пенсію і потым гадзіны са дзве блукаў па магазінах, пакуль не нагрузіўся ладным дзесяткам пакупкаў і пакупачкаў.

Дома ён рашуча сказаў жонцы:

— Заўтра, ці чуеш, пайду на рэчку.

— Куды, куды? — здзівілася Арыядна Маркаўна.

— На рыбаклу, кажу. Во, пакупляў розных прычындалаў. Хопіць лынды біць.

— Твая праўда, хопіць,— пагадзілася Арыядна Маркаўна.— Але ж ты ніколі ў жыцці не хадзіў на рыбалку!..

— Некаторыя ніколі ў жыцці не пісалі раманаў, а і то цяпер пішуць. Невядома яшчэ, што лепей — пісаць раманы з пралогамі і эпілогамі альбо цягнуць з рэчкі шчупакоў без усякіх пралогаў і эпілогаў.

— А я была на рынку,— пахвалілася Арыядна Маркаўна.— Во якраз перад табою вярнулася. Свежанькай клубнічкі ўзяла. Дзве шклянкі. Дарагая, халера. Бабы дзяруць за яе тры шкуры.

Яна выцягнула з сумкі папяровы мяшочак, вытрасла ў талерку буйную крамяную клубніку і падалася мыць яе пад кранам. Мяшочак астаўся на стале, паступова ён сам па сабе развінуўся. Цяпер гэта быў ліст звычайнай паперы, спрэс спісаны фіялетавым чарнілам. Асобныя словы расплыліся, пацямнелі, ператварыліся ў рудыя плямы. А сёе-тое можна было ўсё ж прачытаць. Мечыславу Станіслававічу трапіў на вочы радок: «Раман... у... частках... і эпілогам». Мечыслаў Станіслававіч схапіў лісток, разгладзіў яго рукамі.

— Дзе ты брала... гэтую клубніку? — павярнуўся Мечыслаў Станіслававіч да жонкі.

— Я ж казала, на рынку.

— А ў каго, не ведаеш?

— Ды ў Кудзельчыхі, каб ёй добра ікнулася. Тры шкуры злупіла, жываглотка.

— Жонка Сцяпана Гаўрылавіча?

— Ну але, каб ёй...

Мечыслаў Станіслававіч доўга глядзеў на паперу.

# У НЕЗНАЁМЫМ ГОРАДЗЕ

Гэта быў чужы, незнаёмы горад, куды Рамана Ластоўскага закінуў вандроўны лёс раз'язнога карэспандэнта. Знаёмых — ні душы. Ластоўскі прыехаў сюды ўчора позна ўвечары, а сёння была нядзеля, і ён проста не ведаў, чым яму заняцца.

Зранку было непагодліва, імжыў дождж. Седзячы ў нумары гасцініцы, Ластоўскі тужліва глядзеў у акно на пустынную вуліцу і думаў аб тым, што ён самы няшчасны чалавек у свеце. Напярэдадні Раман пасварыўся з жонкай. Здаецца, гэта была першая сварка за тры гады іх сумеснага жыцця. І хоць усё здарылася праз глупства, аб якім цяпер і ўспамінаць проста сорамна, сварка нечакана набыла памеры амаль што скандалу, і Тамара ў запале гневу сказала, што пазавошта не памірыцца з ім.

Раману Ластоўскаму часта даводзілася ездзіць у камандзіроўкі,— такая ўжо непаседлівая была ў яго пасада. Выпадала яму адлучацца з дому на тыдзень, на два, а то і болей. Звычайна ўжо на другі ці на трэці дзень ён абавязкова званіў дамоў і ледзь не па цэлай гадзіне размаўляў з Тамарай. Вядома, гэтай гадзіны ім не хапала на тое, каб выказаць адзін аднаму ўсё, што трэба было, і праз некаторы час пасля размовы Раман атрымліваў ад Тамары тэлеграму і сам пасылаў паштоўку ў адказ. Цяпер ён таксама з'ехаў на даволі доўгі тэрмін, але на гэты раз не будзе ўжо ні званкоў, ні тэлеграм, ні паштовак.

Дождж не пераставаў. Калі б не ён, дык можна было б куды-небудзь пайсці, адшукаць які-ніякі занятак і пазбыцца журбы, а то лезуць і лезуць у галаву думкі аб нечаканасцях лёсу, аб зменлівасці жаночага сэрца, аб нетрыва-

ласці чалавечага шчасця і шмат яшчэ аб чым не менш крамольным.

Гадзіне а дванаццатай Ластоўскі ўспомніў, што ён яшчэ не снедаў. Пад гасцініцай, на першым паверсе, быў невялікі рэстаран, і Раман надумаў спусціцца туды. На яго здзіўленне, рэстаран быў поўны людзей, і Раман ледзь адшукаў вольны столік. Ён, праўда, быў увесь застаўлены посудам з рэшткамі ежы і пітва,— відаць, тут нядаўна гуляла вясёлая кампанія,— але цяпер за столікам сядзела толькі адна жанчына, якая, мяркуючы па ўсім, прыйшла нядаўна. Папрасіўшы дазволу, Ластоўскі сеў насупраць. Неўзабаве афіцыянтка паслала новы абрус і паклала перад жанчынай меню.

Жанчына доўга глядзела ў картку, выбіраючы сабе ежу, і тым часам Раман, які з прычыны сваёй прафесіі быў чалавекам цікаўным, паспеў як след разгледзець яе. Жанчыне можна было даць год 27 — 28, не больш. Твар у яе быў загарэлы, смуглявы, але праз загар прыкметна выступаў румянец. Светлыя валасы былі акуратна скручаны на патыліцы ў вузел. На гладкім высокім ілбе вылучаліся ў меру падфарбаваныя тонкія бровы; над правым брывом, бліжэй да скроні, прымасцілася невялічкая карычневая родзімка. Вочы жанчыны, як глядзела яна на меню, то святлелі, і тады былі блакітныя, а то раптам цямнелі і рабіліся амаль сінія. На незнаёмцы была яркая шарсцяная кофтачка, якая сваім фасонам нагадвала дзіцячую матроску і дужа пасавала жанчыне. Ластоўскі мог бы хоць на што пайсці ў заклад, што яго суседка — не тутэйшая, што яна таксама камандзіраваная.

Жанчына нарэшце выбрала сабе што трэба і паклала меню на столік.

— Дазвольце? — сказаў Раман і працягнуў руку.

— Калі ласка,— лагодна адказала жанчына і таксама працягнула руку, каб падаць яму меню. Здарылася так, што іх рукі адначасова дакрануліся да карычневай карткі з серабрыстымі літарамі на вокладцы, і на нейкае імгненне Ластоўскі адчуў яе пальцы побач са сваімі. Ён першы адхапіў сваю руку.

— Прабачце... — прамовіў, сумеўшыся, Ластоўскі.

Потым ён гэтак жа доўга глядзеў у картку, машынальна прабягаючы вачыма па радках з назвамі страў, і толькі праз некаторы час заўважыў, што большасць назваў закрэслена алоўкам.

— Ды тут ледзь не ўсё выкраслена,— са здзіўленнем прамовіў Ластоўскі.— І выбіраць няма чаго.

Ён зірнуў на жанчыну.

— Толькі дырэктар рэстарана ды шэф-повар і засталіся незакрэсленыя,— азвалася жанчына, паўтараючы даўно вядомы жарт. Але ў яе вуснах гэта прагучала неяк асабліва значна. Ластоўскаму чамусьці прыйшла думка аб тым, што і наогул, пра што б ні гаварыла яго суседка, усё ў яе абавязкова павінна выходзіць важка, значна, адмыслова. Яму раптам захацелася пагутарыць з ёю, распытаць яе аб жыцці, інтарэсах, схільнасцях. Ахвочы, зноў жа па прычыне сваёй прафесіі, да сустрэч з новымі людзьмі, да нечаканых знаёмстваў, ён не прамінаў ніводнага выпадку, каб не прыдбаць да сваіх ведаў аб людзях які-небудзь новы штрышок, хоць бы самы маленькі.

Злашчаснае меню з'явілася бяскрыўднай тэмай для пачатку гаворкі. Жанчына даволі ахвотна падтрымлівала размову. Жартуючы з поваду рэстаранных спраў, іх назваў і смаку, яны разгаварыліся і пазнаёміліся. Жанчыну звалі Лілія Віктараўна, працавала яна ў Мінску ў «Саюздруку», а тут была на справах падпіскі. Высветлілася, што тэрмін камандзіроўкі Ліліі Віктараўны скончыцца праз тры дні, але ёй ужо ўдалося ўладзіць усе справы, і яна можа вяртацца хоць сёння. Нішто яе не затрымлівае. Трэба толькі на хвіліну забегчы ў мясцовую кантору «Саюздруку», там павінны былі ўчора вечарам перадрукаваць і пакінуць для яе некаторыя матэрыялы. Але яна не вырашыла яшчэ, якім поездам ехаць — ці ноччу, ці заўтра раніцой.

— Так, так, трэба ехаць,— гаварыла яна, усміхаючыся.— Да гэтага заклікае, як бачыце, нават меню.

Даведаўшыся, дзе працуе Ластоўскі, Лілія Віктараўна сказала:

— А-а, дык гэта вы з тых самых, каторыя скажаюць жыццёвую праўду і каторых гэтак лупцуюць усёзнаючыя крытыкі?!

— Гэта ж датычыць пісьменнікаў. А я ўсяго толькі журналіст.

— Не прыбядняйцеся, не прыбядняйцеся,— зноў усміхнулася Лілія Віктараўна.— Ведаю я вашага брата, прыходзілася мець справу. Нябось раманішча старонак на тысячу таксама накрэмзалі, а?

Немаведама чаму Ластоўскаму раптам захацелася быць

зусім адкрытым з Ліліяй Віктараўнай, і ён, не таячыся, шчыра прызнаўся, што і сапраўды спрабуе свае сілы ў літаратуры, напісаў невялікую аповесць, яна надрукавана ў «Полымі».

— Не чытала, не чытала,— з жалем прамовіла Лілія Віктараўна.— «Лебядзіная песня», кажаце? Абавязкова прачытаю. Адшукаю і прачытаю.— Яна на момант задумалася, бы нешта ўспамінаючы.— А хочаце ведаць адну думку пра вас, пісьменнікаў?

— Ды ніякі я не пісьменнік! — шчыра запярэчыў Раман.

— Усё роўна, хочаце ведаць? Я чула яе ў цырульні. Была я там... ну, па нашай жаночай справе, у манікюршы, адным словам. А тады праходзіў якраз з'езд пісьменнікаў, па радыё перадавалі справаздачу аб тым, хто пра што гаварыў, і ўсё такое іншае. Вось манікюрша слухала, слухала і кажа да мяне: «Цікава быць пісьменнікам. А вы не ведаеце, як пісьменнікі пішуць? Напэўна, ездзяць, ездзяць, усё запісваюць, запісваюць, а потым прыязджаюць дамоў і апісваюць... Я б не здолела быць пісьменнікам. У мяне часта баліць галава».

Яны ад душы пасмяяліся. Раман яскрава ўявіў сабе тую манікюршу, ён убачыў перад сабой нават яе твар і той выраз на ім, з якім яна гаварыла. Лілія Віктараўна даволі эфектна перадала яе голас — праставата-самаўпэўнены, з ноткамі спагады да навакольных людзей, і гэта выйшла вельмі смешна.

Тым часам прынеслі снеданне. Ластоўскаму афіцыянтка паставіла «для апетыту» невялікі графінчык з чырвоным віном, Ліліі Віктараўне — бутэльку піва.

— Люблю піва,— нібыта апраўдваючыся, сказала Лілія Віктараўна і наліла сабе ў фужэр.— Кажуць, ад яго паўнеюць. Вось і я хачу трошкі папаўнець. Мне гэта будзе да твару, праўда?

Раман не разумеў — шчыра яна гаворыць ці хаваецца за знарок гуллівыя словы, як за сцяну, каб зручней было наглядаць адтуль, і гэта бянтэжыла яго. Ён агледзеў столік. Спрактыкаваная афіцыянтка паставіла не адну, а дзве чаркі. Спакваля наліваючы тую, што была бліжэй, Раман надумаў, ці ёмка гэта будзе, калі ён запросіць сваю суседку ўзяць з ім за кампанію чарку.

— А можа... з выпадку нашага знаёмства... Вы не супраць? — Ластоўскі нахіліў графін над другой чаркай.

— Не, не, што вы! — спалохапа сказала Лілія Віктараўна і адсунула чарку як мага далей, на самы край стала.— Хіба вы не чыталі,— дадала яна жартаўліва,— апошніх артыкулаў аб шкодзе алкаголю?.. І наогул вопытныя людзі сцвярджаюць, што змешваць піва з віном нельга, бо будзе акупь.

— Ёрш,— наіўна паправіў Раман, не зразумеўшы яе жарту.

Спедалі яны доўга, запіваючы ежу: яна — непістым рыжскім півам, ён — кіслым нясмачным віном.

Гаворка, што перапынілася была на нейкі момант, зноў увайшла ў ранейшае спакойнае рэчышча.

Пагаварылі аб распаўсюджванні друку, аб дасягненнях тэлебачання, аб праблемах міжпланетных зносін; абмяняліся думкамі пра оперу «Дзяўчына з Палесся» і накопт магчымасцей кібернетыкі. Раман злавіў сябе на тым, што ўпотай любуецца рухамі прыгожых рук Ліліі Віктараўны, якія спрытна ўхаджаліся з сасіскамі на блюдзе. Потым, калі Лілія Віктараўна нечакана паглядзела на яго рукі, ён з жахам заўважыў, што стараецца ўзяць відэлец як мага далікатней; але той якраз у гэты момант выслізнуў з пальцаў і бразнуў на талерку.

— Дождж, здаецца, перастае,— сказала Лілія Віктараўна.— Можа яшчэ і распагодзіцца.

— Гэта было б дарэчы,— узрадаваўся Ластоўскі.— Вы не ведаеце, што тут у кіно ідзе?

— «Іх было пяцёра», французскі фільм. Вы не глядзелі?

Не, ён не глядзеў гэтага фільма. Лілія Віктараўна хоць і бачыла яго, але не супраць схадзіць яшчэ раз,— «гэта вельмі, вельмі цікавая рэч!». Яны якраз могуць паспець на чарговы сеанс.

Пакуль афіцыянтка рабіла падлікі, пакуль яны разлічваліся, Раману настойліва лезла ў галаву адна думка. Хутчэй за ўсё гэта была нават не думка, а нейкая дакучлівая ідэя, і знаходзілася яна недзе па-за свядомасцю, так што і злавіць яе было цяжка. Часамі яму здавалася, што ён ужо схапіў яе, што яна яскрава акрэслілася ў галаве, але ў наступны момант усё зноў станавілася пяясным, цьмяным, і толькі душу праймала пачуццё не то трывогі, не то неспакою.

Яны выйшлі на вуліцу. Дождж і сапраўды перастаў. Блішчалі на сонцы мокрыя тратуары; сям-там яны пачалі

падсыхаць ужо, у паветра ўзнімалася ад іх дрыготкая пара.

Тратуар быў нешырокі, Раман ішоў з краю, Лілія Віктараўна бліжэй да сярэдзіны, і на іх — маладых, ладных — спыняў міжвольна свой позірк шмат хто з прахожых. Раман заўважыў гэта, і яму рабілася то прыемна на сэрцы, а то зноў нечага трывожна.

Яны ішлі ў кіно. Рабіць ім абаім усё адно не было чаго.

* * *

...Вярнуліся ў родны Парыж пяцёра баявых сяброў. Вайна скончылася. Маладыя людзі поўныя веры ў будучыню: так, яны заваявалі права на жыццё, на шчасце.

Парыж, здаецца, зусім не перамяніўся. У кафэ-шантанах грыміць музыка. Вуліцыззяюць агнямі рэклам. У магазінах прадаўцы ветліва кланяюцца пакупнікам. На Елісейскіх палях цвітуць каштаны... Не, ёсць усё ж нешта, што псуе парыжскі пейзаж, робіць родны горад амаль непазнавальным. Чаму, напрыклад, на вуліцы так многа парыжан са змарнелымі тварамі, чаму ўсюды столькі амерыканскіх «джыпаў»?..

— Вы задаволены, Раман Данілавіч? — спытала Лілія Віктараўна.

— Тым, што мы пайшлі ў кіно?

— Не, што глядзім іменна гэты фільм?

— Ён яшчэ толькі пачаўся. Невядома, як там у іх усё будзе.

— А я люблю французскія карціны. І яшчэ індыйскія, і асабліва італьянскія. А вы?

— Грамадзяне, цішэй! — злосна сказаў нехта ззаду.

Яны спалохана змоўклі.

Ластоўскі цяпер глядзеў толькі на экран. Ён усё бачыў і ўсё разумеў, але разам з тым галава яго была занята не адным толькі фільмам... Хто яна, жанчына, што сядзіць побач з ім?.. Ён нічога не ведае аб ёй, калі не лічыць тых кароткіх агульных звестак, якія яна сама паведаміла ў часе знаёмства. Напрыклад, ці замужам яна? Раман не спытаў у яе пра гэта, але, разважыўшы, вырашыў, што яна, канечне, замужам. Раман нават паспрабаваў уявіць сабе яе мужа. Гэта павінен быць сярэдніх год чалавек, абавязкова высокі і ў той жа час рухавы, аматар прэферанса, ахвотнік да вясёлых кампаній,— наогул асоба ва ўсіх

адносінах стапоўчая. З такім чалавекам ён, Ластоўскі, мог бы пасябраваць — шчыра, па ўсё жыццё...

— Які ён слаўны хлопец! — шэптам сказала Лілія Віктараўна.

— Хто, Жан?

— Не, Ражэ. Ён сапраўдны драматычны артыст.

Тым часам Ражэ, слаўны хлопец і сапраўдны драматычны артыст, у кафэ-шантане «Радасць жыцця» з сумнай іроніяй гаварыў Сімоне, жонцы свайго сябра Жана:

— Цяпер маё месца ў тэатры толькі ў глядзельнай зале.

Ён ужо не вернецца на сцэну, хоць увесь час марыў аб ёй — марыў у акопах, на полі бою, едучы дамоў пасля перамогі над нацыстамі. Яму няма месца ў тэатры: у Парыжы шмат беспрацоўных актораў. Ражэ паспрабаваў быў выступіць на эстрадзе кафэ-шантана «Радасць жыцця». Яго абсвісталі. Мастацтва Ражэ непатрэбна фешэнебельнаму Парыжу. Іншая справа — крыўлянні на эстрадзе паўголых жанчын. На гэтае відовішча гледачы не шкадуюць апладысментаў.

— Ганьба! — амаль бязгучна вымаўляе Лілія Віктараўна.— Ганьба!

Не згадзіцца з гэтым нельга. Сімона, разбэшчаная і здрадлівая Сімона спакушае Ражэ, і ён робіцца яе палюбоўнікам. А Жан нічога не ведае. Сляпак, ён хацеў бачыць Сімону верным спадарожнікам жыцця. Наіўны ты чалавек, Жан, харошы хлопец, а наіўны. Хіба ты не ведаеш, што жывеш у сучасным Парыжы?!

Іх было пяцёра, гэтых баявых сяброў. Жан і Ражэ назаўсёды зрабіліся чужымі. Загінуў на новай вайне ў Індакітаі Андрэ. Забіты ў час паліцэйскай аблавы Марсель. Пашанцавала толькі Філіпу — пятаму з некалі дружнай сям'і баявых таварышаў. Яму не трэба думаць пра кавалак хлеба, у яго досыць грошай, каб зрабіць з жыцця вясёлую пагулянку... Рассыпалася, развалілася, як картачны домік, дружба пяцярых у разбэшчаным Парыжы.

Калі Ластоўскі і Лілія Віктараўна выйшлі з кінатэатра, усё яшчэ быў дзень, хоць сонца і хілілася ўжо да небасхілу. Некаторы час яны ішлі моўчкі, знаходзячыся над уражаннем карціны. Раман нават не ведаў, куды яны ідуць, проста ён крочыў побач з Ліліяй Віктараўнай, спадзеючыся, што яна добра арыентуецца ў горадзе.

— Вельмі праўдзівая карціна, праўда? — першай загаварыла Лілія Віктараўна. І дадала, смеючыся: — А вы

дрэнны кавалер, вашу даму штурхаюць з усіх бакоў, а вы не можаце ўзяць яе пад руку.

Адчуўшы сябе няёмка, Ластоўскі прамармытаў нешта накшталт прабачэння і няслела ўзяў Лілію Віктараўну пад локаць.

— Зойдзем на хвілінку ў кантору, я толькі вазьму свае матэрыялы.

Па дарозе яны горача абмяркоўвалі фільм, ігру артыстаў, музыку: апошняе, праўда, рабіла адна Лілія Віктараўна, бо Ластоўскі лічыў сябе прафанам у гэтай галіне.

Шмат у якіх ацэнках сыпліся, у некаторых — не, і таму трошкі паспрачаліся.

У кантору Лілія Віктараўна схадзіла адна, Раман пачакаў яе на вуліцы.

А калі яна імкліва выйшла з канторы, калі ён убачыў яе ў дзвярах, то раптам здрыгануўся і адступіў на крок назад. У пастаеве галавы Ліліі Віктараўны, у позірку трошкі прыжмураных яе вачэй, а асабліва ў тым, як яна імкліва адчыніла дзверы, Ластоўскі ўбачыў столькі знаёмага і блізкага, што гатовы быў крыкнуць: «Тамара!» І тады ён адразу зразумеў, чаму гэтак прыемна было яму знаходзіцца побач з Ліліяй Віктараўнай. І зноў такой недарэчнай і непатрэбнай уявілася сварка з жонкай. Навошта, навошта гэта ўсё здарылася?

— Вось і ўсе мае справы,— весела сказала Лілія Віктараўна і ўзяла Ластоўскага пад руку. Яны пайшлі ў кірунку гасцініцы.

— А мае справы толькі пачынаюцца,— прамовіў Раман і ўздыхнуў.

Лілія Віктараўна задумалася на хвіліну, потым пачала гаварыць зноў:

— На Мінск ідуць два паязды. Адзін будзе сёння ноччу, у дванаццаць з мінутамі, другі заўтра раніцой... Не люблю ад'язджаць ноччу, у цемры. Прыйдзецца, напэўна, паехаць заўтра. Шкада толькі, што той поезд прыходзіць у Мінск вечарам.

— А гэты, начны?

— Раніцой, гадзін нешта ў восем.

Зірнуўшы на маленькі залаты гадзіннічак, Лілія Віктараўна сказала:

— Ой, трэба спяшацца! У мяне на сем гадзін заказана ванна.

Пайшлі хутчэй. Вуха Ластоўскага лавіла дробнае пастукванне абцасікаў Лілii Віктараўны па асфальце тратуара, рука адчувала яе руку, а ў душу зноў закрадалася ранейшае пачуццё не то трывогі, не то неспакою, паглынаючы ўсе думкі.

— Што б вы параілі мне? — пыталася Лілія Віктараўна.— Калі мне ехаць?

— Пытанне складанае... — пасля невялікай паўзы пачаў Ластоўскі.— З аднаго боку, дык яно лепей было б паехаць сёння. Усё ж вы прыедзеце дамоў раніцой, а не позна вечарам. А з другога боку...

Ластоўскі не дагаварыў. Яны якраз падышлі да пад'езда гасцініцы. Ён расчыніў перад ёю дзверы, прапусціў уперад. Гэткім жа манерам — яна наперадзе, ён крыху ззаду і збоку — прайшлі міма дзяжурнага адміністратара, адмералі першы марш лесвіцы, потым другі — і ўсё моўчкі, без ніводнага слова. Тая маўклівасць, што пачалася пасля яго недаказанай фразы, рабілася як быццам неабходнай.

Першым на калідоры быў нумар Лілii Віктараўны. Прыпыніўшыся каля дзвярэй, яна зноў паглядзела на гадзіннічак:

— Без пяці сем. Надзвычайная пунктуальнасць! — І дадала, адмыкаючы нумар: — Заходзьце па мяне, як будзеце ісці на вячэру.

* * *

Няясна было, чаму ён захапіў з сабой іменна гэту кнігу, а не якую-небудзь іншую. Ластоўскі ніколі не лічыў сябе асабліва гарачым паклоннікам Мапасана, і «Мілы друг» трапіў да яго ў чамадан, мусіць, выпадкова.

Прачытана, а дакладней перагорнута было за дзве гадзіны нешта каля пяцідзесяці старонак. Ластоўскі не сказаць каб надта ўважліва гартаў старонкі і часта лавіў сябе на тым, што з папярэдняга раздзела ў галаве не засталося ні радка; каб зразумець далейшае, прыходзілася вяртацца назад.

Роўна а дзевятай гадзіне Раман адчуў, што яму нечага не хапае. Ён адклаў кнігу ўбок, падняўся з канапы, выцягнуў з шафы чамадан і адчыніў яго. Рабіў ён усё гэта машынальна, не ўдумваючыся ў тое, што робіць. Гэтак жа машынальна Раман стаў перабіраць тое, што знаходзілася

ў чамадане. Тут было ўсё, што патрэбна чалавеку ў камандзіроўцы, уключаючы бяспечную брытву, запасную пару шкарпэтак і новую калоду карт для прэферанса, але Раман шукаў яшчэ нечага. Ён пераклаў рэчы з месца на месца адзін раз, потым другі...

Здагадаўшыся нарэшце, што ў чамадане нестае звычайных паштовак і што іменна іх ён шукае, Ластоўскі сумна ўсміхнуўся, уздыхнуў і паставіў чамадан на месца.

Было дваццаць мінут на дзесятую. «Напэўна, яна прыняла ўжо ванну»,— падумаў Ластоўскі і надзеў пінжак, які вісеў дагэтуль на спінцы крэсла.

«Так, відаць, пачынаюцца раманы»,— сказаў ён сам сабе.

Лілія Віктараўна была адна. У доўгім квяцістым халаце, расчырванелая, яна стаяла пад лямпай пасярод пакоя і глядзелася ў невялічкае люстэрка, уштукаванае ў пудраніцу. Відаць, яна толькі што скончыла прычэсвацца і цяпер правярала, ці ўсё ў парадку.

— З лёгкай парай! — ветліва сказаў Раман.

— Дзякую. Ванна была выдатная. А вы нябось аддаяце перамагу лазні з бярозавым венічкам? Мужчыны ўсе аднолькавыя. Мой муж ходзіць парыцца аж па два разы на тыдзень. Я падазраю, што ён ходзіць не столькі дзеля пары, колькі дзеля ста грамаў,— Лілія Віктараўна нявесела, штучна ўсміхнулася.— Ён нешта дужа ўпадабаў прыказку: «Год не пі, два не пі, а пасля лазні абавязкова выпі».

Яна здзьмухнула з крэсла налёт пудры і запрасіла Рамана сесці. Потым адшукала ў сумачцы свой гадзіннічак і стала адзяваць яго на руку. Але з ланцужком нешта здарылася, і Ліліі Віктараўне доўга не ўдавалася зашпіліць яго. Прыйшлося Раману прыйсці на дапамогу.

— Вось і вечар,— прамовіла Лілія Віктараўна.— Нейкі прыезжы чалавек спытаў аднойчы ў другога чалавека, мясцовага, што робіцца ў іхнім горадзе. Той падумаў і адказаў: «Ведаеце, тут, бадай, пасля заходу сонца нічога не робіцца». Вы не ведаеце, дзе гэта было?

Яны засмяяліся адначасова. Ластоўскі ўспомніў, што пра гэта ён чытаў у О. Генры. А Лілія Віктараўна гаварыла далей:

— Між іншым, я тут пазнаёмілася з адным вельмі цікавым чалавекам. Ён вядзе летапіс шлюбаў, што адбываюцца ў горадзе. У яго зроблены запісы за апошнія 55

год, я сама бачыла. Вялізны такі стос таўшчэзных старадаўніх кніг накшталт гросбухаў. Надзвычай цікава!

Ластоўскі падумаў, што трэба будзе пазнаёміцца з гэтым своеасаблівым летапісцам.

Ён спытаў, дзе яго можна знайсці, запісаў адрас.

— Наогул, арыгінальных людзей багата на свеце,— заўважыў Ластоўскі.— Узяць хоць бы аднаго майго рэдактара. Ведаеце, як ён прымаў мяне на працу? Было гэта, калі я скончыў універсітэт. Заходжу да яго ў кабінет, падаю анкету, а ён адклаў яе ўбок, утаропіўся на мяне і пытаецца: «Скажыце, вы пішаце вершы?» Я ажно пахаладзеў. Ну, думаю, усё прапала, зараз ён мне адмовіць. «Не, кажу, не пішу» — і працягваю руку, каб узяць назад сваю заяву. «Тады ўсё ў парадку, кажа, ідзіце афармляцца!»

— А на абед мы і забыліся,— прамовіла Лілія Віктараўна,— ды і час вячэры ўжо мінае. Вы нічога не маеце супраць рамштэксу або шніцэлю?

Ён з націскам сказаў:

— Мы зробім гэта на вакзале:

Яна хутка спытала:

— Вы так лічыце? Так будзе лепш?

— Адклад не ідзе на лад, вы ж ведаеце. Тое, што можна зрабіць сёння, не трэба адкладваць на заўтра,— банальна сказаў Раман і сам узлаваўся на сябе за гэта. Але іншыя, больш прыгожыя словы не прыходзілі ў галаву, ды відаць, і патрэбы ў іх зараз не было.

— Так, так,— падумаўшы, рашуча сказала тады Лілія Віктараўна.— Ваша праўда.

І потым проста, як гавораць звычайна даўняму, харошаму сябру, загадала:

— Адвярніцеся, калі ласка, я перапрануся.

Ён чуў за спіною шоргат шоўку, пстрыканне кнопак, наскрыпванне чаравікаў, але ўсе гэтыя гукі былі для яго дзесьці надзвычай далёка; да таго ж яны прыглушаліся ціхім мурлыканнем Лілii Віктараўны,— яна напаўголасу напявала нешта. Раман працягнуў руку да стала, зняў трубку тэлефона і выклікаў таксі.

— А цяпер памажыце мне сабрацца. Я заўсёды пакутую з гэтым замком на чамадане.

На вакзале ім не прыйшлося доўга стаяць у чарзе па білет — людзей на гэты поезд было мала. Хапіла часу і на

тое, каб зайсці ў рэстаран. Лілія Віктараўна, на здзіўленне Рамана, загадала прынесці шампанскага.

— За прыемнае знаёмства! — падымаючы бакал, сказала яна.— І яшчэ — ведаеце, за што?

— За што?

— Дакладней кажучы, за каго? Ведаеце? За вашу жонку. За Тамару.

— За Тамару? — сумеўся Раман.— Але адкуль вам вядома яе імя?

— Вы сёння двойчы назвалі мяне Тамарай.

— Няўжо? І нават двойчы? А я і не заўважыў.

— Дзіва што!

— Вы... пакрыўдзіліся тады?

— Я пазайздросціла вашай жонцы.— Лілія Віктараўна прыгубіла свой бакал.— Гэта шчырая зайздрасць, добрая, паверце мне.

Раман выпіў сваё шампанскае.

— Вы раскажаце ёй пра наша знаёмства? — спытала Лілія Віктараўна.

— Абавязкова. А вы?

— Я — не... — Лілія Віктараўна паставіла недапіты бакал на стол.— Я не здолею расказаць,— сумна прамовіла яна. Потым усміхнулася — таксама сумна.— Бо тады ён пачне хадзіць на тры разы на тыдзень парыцца.

На пероне яны моцна паціснулі адно аднаму рукі. У вагон Лілія Віктараўна ўвайшла, калі ўжо кратаўся поезд.

Тое ж самае таксі, якое прывезла Рамана на вакзал, адвезла яго і назад. У гасцініцы заспаная дзяжурная сказала яму:

— Ваша прозвішча Ластоўскі? Раман Данілавіч? Вам тэлеграма.

Раман хуценька разарваў склейку, прабег тэлеграму вачыма...

— Сёння цудоўны дзень, праўда? — весела сказаў ён потым.— Дарэчы, вы не скажаце мне, дзе міжгародні перагаворны пункт? Відаць, наштоўку там таксама можна набыць, а?

*1955*

# СЛОТА

Надвор'е сапсавалася да прыкрасці. Дні тры перад гэтым ішоў, не перастаючы, дробны халодны дождж. Ён парабіў столькі макрэчы, што здавалася — вадою набрыняла нават жалеза на дахах. А ўчора пад вечар пайшоў печакана снег. Снег пядоўга валіў з неба, але быў да таго густы і спорны, што праз якую гадзіну горад стаў белы. Чакалі марозу, але яго так і не было. Да раніцы ад прыгожай белі не засталося і следу — усё было пакрыта брудна-шэрай жыжкай з гразі і снегу.

У такую слоту, па думку Макара Шабліна, лепш нікуды не хадзіць, а сядзець дома. Ён і сядзеў бы, бо сёння ж нядзеля, але жонка паслала яго па базар, а не паслухаць Насці ён не мог. І вось Макар ідзе па вуліцы, скардзіцца некаму нябачнаму па непагадзь, лае па чым свет стаіць жонку і праклінае сябе за слабахарактарнасць.

На здзіўленне Шабліна, людзей на вуліцы было многа. Усе некуды спяшаліся, апярэджвалі адзін аднаго, і было такое ўражанне, нібыта жыхары Заранска толькі таго і чакалі, каб памясіць нагамі гэтую вось жыжку. Каля гастранома, што стаяў на рагу Першамайскай і Маскоўскай вуліц, была проста такі таўкатня. Макару Шабліну таксама трэба было зайсці сюды («дзвесце грамаў сыру не забудзь узяць, дзешавейшага!» — сказала жонка), і ён, уздыхнуўшы, накіраваўся да магазіна. У гэты момант з дзвярэй выйшла жанчына ў коцікавым футры і, адышоўшы трошкі ўбок, прыпынілася, відаць, чакаючы некага, хто затрымаўся ў магазіне. На выгіне рукі яна трымала букет жывых кветак, і кожны, хто праходзіў міма, міжвольна звяртаў увагу і на кветкі — такія незвычайныя для гэтай пары,— і на жанчыну, такую прыгожую і чароўную.

Ён адразу пазнаў яе, хоць з часу іх апошняй сустрэчы прайшло трынаццаць год. Сэрца яго скаланулася. «Падысці ці не падысці?» — падумаў Шаблін. А дзверы былі побач ужо, і трэба было або знікнуць за імі, або зрабіць тры крокі направа, насустрач мінуўшчыне.

Жанчына абыякавым позіркам глядзела на людзей, што падыходзілі да магазіна. На нейкі момант позірк яе спыніўся на твары Шабліна, і тады ён убачыў, як ледзь улоўна ўздрыгнула яе левае брыво. «Пазнала!» — у хваляванні і з трывогай падумаў ён і павярнуў ад дзвярэй.

— Зі! Зіна! — сказаў Шаблін, падыходзячы да яе і заліваючыся чырванню.— Ты тут? Якім чынам? А я, можна сказаць, і не ведаў...

Толькі на адно імгненне абыякавасць, што засцілала вочы жанчыны, знікла была кудысьці, і ў сініх, як веснавое неба, вачах яе бліснула іскрынка прыветлівасці. Толькі на адно імгненне ўбачыў Макар ранейшую Зіну, такую далёкую і блізкую, але ўжо ў наступны момант позірк яе зноў стаў халодны і непранікальны, а на твары нічога, акрамя абыякавасці, не было.

— Зі, што ж ты маўчыш?..— ціха прамовіў Шаблін, робячы адчайную спробу перакінуць мост паміж мінулым і сучасным і з гэтай мэтай называючы яе ранейшым імем Зі.

— А-а, гэта вы, Шашкін...— працягнула Зіна, пазіраючы не на яго, а кудысьці ўбок. Непранікальныя вочы яе ўтаропіліся некуды ў адну кропку і, здавалася, нічога і нікога не заўважаюць вакол.

— Але, але, гэта я, Шаблін. Памятаеце?..— збянтэжана сказаў Макар, адчуваючы, як безнадзейна валіцца мост, збудаваны ім на такой нетрывалай аснове, якой з'яўляецца памяць аб далёкім і перакрэсленым ужо мінулым. Так, мост валіўся, і не было сілы, якая здолела б падтрымаць яго. «Зіна, Зіна,— тужліва думаў Макар,— ты нават прозвішча маё забыла. Ці, можа, ты знарок сказала Шашкін замест Шаблін? Таму, напэўна, і сухое афіцыйнае «вы» ўжыла замест ранейшага «ты», такога цёплага некалі?

Ён стаяў перад ёй — нікчэмны, бледны, у старэнькім абцёрханым паліто, і, пераступаючы з нагі на нагу, збянтэжана гаварыў:

— Вось мы, можна сказаць, і сустрэліся... Сустрэліся значыцца. Хто б мог падумаць...

А яна ўсё глядзела некуды ў адну кропку і, прасачыўшы за яе позіркам, Макар убачыў, што Зіна глядзіць на дзверы магазіна. «Каго яна чакае?» — спрабаваў здагадацца ён.

— Вы даўно тут, у Зарэцку? — нерашуча спытаў Макар, міжвольна таксама пераходзячы на «вы».

— Нядаўна,— коратка адказала Зіна.

— А надоўга? Ці не? — дапытваўся Макар, і сэрца ў яго замерла ў чаканні адказу. «Відаць, яна тут выпадкова»,— прамільгнула думка ў галаве.

— Назусім,— сказала Зіна. І пасля кароткай паўзы дадала: — Мужа перавялі сюды працаваць.

Зіна відавочна спяшалася абвясціць, што яна замужам. Але Макар і не сумняваўся ў гэтым. Так, так, яна, канечне ж, замужам. У яе ёсць муж. Ён, напэўна, вельмі кахае яе, а яна — яго. І што з таго, што ён Макар Шаблін, таксама некалі кахаў яе, ды, шчыра кажучы, і цяпер яшчэ кахае? Гэта цяпер не мае ўжо ніякага значэння.

Як жа гэта здарылася, што ён страціў яе, сваю Зі? Бо гэта ж яна, і толькі адна яна,— цяпер Макар цвёрда ведаў гэта,— магла стаць яго шчасцем, яго радасцю, яго жыццём. Як жа гэта здарылася?..

Цяпер яны чужыя адзін аднаму людзі, зусім чужыя. А быў жа час, калі ён браў яе руку ў сваю і казаў ёй:

— Зі, мы будзем заўсёды разам плысці па шумлівай рацэ жыцця. Праўда, Зі?

Памятаецца, ён па тую пару быў схільны да ўзнёслых слоў і з лёгкасцю ўжываў іх, часта не задумваючыся над сэнсам. Сябры даравалі яму гэта: ён, малады мастак, быў у іх вачах чалавекам незвычайным, бо пра яго аднойчы напісалі ў газеце, што ён падае багатыя надзеі.

— Толькі не трэба кідацца ў гэтую раку на злом галавы, як той купальшчык з абрыву,— стрымана адказвала Зіна.

— А хоць бы і з абрыву,— бестурботна смяяўся Макар.— Гэта нават эфектна — ляцець з абрыву ў бездань!

Не думаў ён тады, што пасля яму прыйдзецца горка раскайвацца ў гэтых словах і праклінаць тую хвіліну, калі яны прыйшлі яму ў галаву.

Аднойчы Макар і Зіна пайшлі купацца на раку. З імі быў Пеця Зварыкін — ціхі, непрыкметны юнак з доўгімі рукамі, якіх ён вельмі саромеўся і таму заўсёды трымаў за спіной. Працаваў Пеця недзе ў вагонным дэпо, але што

ён там рабіў, Макар не ведаў, бо яго зусім не цікавілі людзі, якія не мелі хоць бы якога дачынення да святога мастацтва; вёў жа ён знаёмства з Пецем проста таму, што юнак быў гарачым паклоннікам яго таленту і, акрамя таго, умеў рабіць выдатныя рамы для Макаравых карцін.

У той дзень было вельмі горача. Яны прыйшлі на любімае Зініна месца — на высокі абрыў, з якога адкрываўся смаляўнічы від на раку і на ўсё наваколле. Зіна любіла сядзець тут, на самым краі абрыву, і глядзець уніз, на раку. Яна магла сядзець тут доўга, прыслухоўваючыся да лёгкіх аднастайных усплёскаў вады каля берага. Дзяўчына была ў гэтыя хвіліны маўклівая і задуменная, а позірк яе, здавалася, блукаў недзе ў бездані, бачачы тое, што схавана ад Макаравых вачэй. Макар усё збіраўся напісаць карціну «Дзяўчына на абрыве», але каб працаваць над ёю, яму трэба было самому прымасціцца над прадоннем, а гэта было немагчыма: ён палохаўся вышыні. Кожны раз, варта было яму толькі падысці да краю, як у яго пачынала кружыцца галава, і ён хутка адхінаўся назад.

Зіна і на гэты раз хацела была заняць сваё звычайнае месца, але тут было так спякотна, сонца паліла да таго неміласэрна, што яна перадумала і прапанавала ўладзіцца ў цяньку бярозак, што раслі трошкі збоку. Пеця распрануўся першы, і Макар са здзіўленнем убачыў, што ў гэтага пядушлага на выгляд юнака моцнае загарэлае цела з добра развітымі мускуламі. У мастака загаварыла прафесійнае пачуццё захаплення прыгажосцю чалавечага цела, і ён не мог стрымацца, каб не папрасіць Пецю папазіраваць яму як-небудзь пры выпадку.

— А цяпер давайце купацца,— тонам старэйшага сказаў Макар.— За мной!

І ён пайшоў уздоўж берага туды, дзе была лагчына, па якой можна было спусціцца ўніз, да вады. Крокі праз тры ці чатыры, адчуваючы, што ні Зіна, ні Пеця чамусьці не ідуць за ім, Макар азірнуўся, і тое, што ўбачыў ён, прымусіла яго прыпыніцца. На самым краі абрыву, нібы адлітый з бронзы, стаяў Пеця. Ён выглядаў у гэты момант значна вышэйшым, чым быў на самай справе. Ззаду і крыху воддаль ад яго знаходзілася Зіна, і было падобна на тое, што яна любуецца ім. Макар убачыў: Пеця павярнуў галаву назад, нешта сказаў Зіне, і яна таксама нешта адказала яму. А пасля Пеця ўзмахнуў рукамі, затым рэзкім рухам адвёў іх назад і, злёгку прысеўшы, раптам імгнен-

па адштурхнуўся нагамі ад зямлі, адначасова выкінуўшы рукі ўперад. Цела яго апісала ў паветры дугу і паляцела ўніз.

Зіна падбегла да краю абрыву і, прыцісnуўшы рукі да грудзей, замерла. Макар неахвотна вярнуўся назад. Ён не паспеў убачыць, як нырнуў Пеця, ён бачыў толькі кругі, што разыходзіліся па вадзе ад таго месца, дзе схаваўся юнак.

— Дзе ж ён? Што з ім? — спалохана спытала Зіна і ўся падалася ўперад. Здавалася, што яна вось-вось кінецца следам за Пецем. І калі ў наступнае імгненне Пеця нарэшце вынырнуў, Зіна шчасліва засмяялася і запляскала ў далоні.

Адфыркаўшыся, Пеця пачаў плысці сажонкамі, спрытна заграбаючы ваду рукамі. Спачатку ён плыў уверх па цячэнню, потым, зрабіўшы невялікі круг, перавярнуўся на спіну і спакойна паплыў уніз, не робячы ніводнага руху. Параўняўшыся з Макарам і Зінай, Пеця набраў вады ў рот і выпусціў яе ўгару многаструменным фантанам. У дробных, як пыл, пырсках успыхнула вясёлка...

Зіна павярнулася да Макара.

— Чаго ж ты стаіш? — здзіўлена спытала яна.

— Ды я пайшоў быў, але вы тут надумаліся фокусы вырабляць, дык я і вярнуўся паглядзець.

— Фокусы?..— з дакорам сказала Зіна, крыўдуючы, што ён не зразумеў яе пытання.— Ты жартуеш...— дадала яна праз хвіліну, беручы сябе ў рукі.— Ну, станавіся. Вось сюды.

— Навошта? — не зразумеў Макар.

— Скачы ўніз. Як Пеця. Ці мо нават яшчэ лепей за яго. Ну, станавіся! — строга загадала яна.

Макар аж адхіснуўся назад, пачуўшы гэтыя яе словы. Яму нават дух заняло ад адной думкі, што ён будзе ляцець з гэткай вышыні ў бездань. Адчуваючы, што бляднее, Макар хуценька адвярнуў твар убок.

— Чаго ж ты стаіш? — зноў спытала Зіна, і ў голасе яе загучалі нейкія незнаёмыя яму ноткі. Тут было ўсё разам — здзіўленне, патрабавальнасць, надзея і нават пагроза.

— Ты яшчэ, можна сказаць, пакуль што не жонка мне, каб камандаваць мною,— паспрабаваў аджартавацца Макар, але і сам адчуў, што выйшла гэта ў яго недарэчна.

— Не гавары глупства, Макар,— ціха прамовіла Зіна,

падыходзячы да яго і зазіраючы яму ў вочы.— Чаго ты фанабэрышся? Я ж ведаю, што зрабіць гэта табе зусім проста. Ну, давай! — І яна нецярпліва тузанула яго за руку.

— Пакінь, Зіна,— надаючы свайму голасу паважнасць, сказаў Макар.— Навошта табе гэта?

— Патрэбна, разумееш? — пранікнёна сказала Зіна.— Ну, скачы ж, скачы! Мне вельмі гэта патрэбна, вельмі! Разумееш? Ты разумееш? Гэта ж вельмі проста: падысці да самага краю і — уніз! Як Пеця. І нават яшчэ лепей, чым ён, нават яшчэ лепей. Ну, Макар, ну, зрабі гэта для мяне! Ты можаш.. ты ж можаш, праўда?

Няшчадна паліла сонца, паветра было нейкае цяжкое; яно прыціскала да зямлі, залівала цела, а галоўнае — погі нечым агідным, брыдкім, і не было ніякай сілы пазбавіцца гэтага незразумелага цяжару.

— Альбо ты не можаш? — адступіўшы на крок ад яго, амаль шэптам прамовіла Зіна.— Не можаш?.. Ну, скажы — не можаш?

Цяпер яна стаяла над самым прадоннем, спіной да ракі. Макар бачыў, як паступова мяняецца яе твар, як цямнеюць вочы. Яна ўсё чакала, што ён падыдзе і скочыць. Ён разумеў, што гэта не капрыз, не дзівацтва, ёй проста неабходна было, каб ён скочыў. «Пакажы, што ты і папраўдзе такі, за якога я цябе лічу»,— гаварыў, здавалася, яе позірк. І яна стаяла і чакала. А ён не ішоў. Той незразумелы цяжар, што аднекуль зваліўся на яго, прыціскаў да зямлі ўсё мацней і мацней.

Тады Зіна рэзка павярнулася спіной да яго і нахілілася ўперад. Яна ніколі не скакала ў ваду з такой вышыні, ды і плавала не надта ўжо і добра. Пабляднеўшы, яна заплюшчыла вочы, і, расставіўшы рукі, ступіла наперад...

Страшэнным напружаннем усіх сваіх сіл Макар прымусіў сябе падбегчы да абрыву і зірнуць уніз. У гэты момант Зіна, нібы камень, плюхнулася аб ваду; у паветры ўзняўся слуп пырскаў, хаваючы ад Макара дзяўчыну. Калі пырскі апалі, Зіны на паверхні вады ўжо не было.

Відаць, Пеця заўважыў, як Зіна скочыла з абрыву, бо ён імкліва і хутка паплыў да таго месца, дзе яна знікла пад вадой. Але Зіна ўжо сама ўсплыла, смешна борсаючы рукамі і нагамі. Агледзеўшыся, яна паплыла насустрач Пецю. Параўняўшыся, яны рушылі на цячэнню разам, усё аддаляючыся і аддаляючыся.

Макар раптам усёй сваёй істотай адчуў — гэта Зіна аддаляецца ад яго назаўсёды...

На паваротце ракі яны зніклі з вачэй.

Макар не быў упэўнены, ці кахала яго Зіна, але ведаў, што магла пакахаць у той спякотны чэрвеньскі дзень,— і не пакахала...

Шмат пасля страчалася на яго жыццёвым шляху абрываў, з якіх трэба было кідацца, не разважаючы і не хістаючыся. Але той першы абрыў быў, відаць, рубяжом, які вызначае ўсю сутнасць, усю годнасць чалавека. І Шаблін ужо не мог адолець піводнага з гэтых абрываў,— кожны раз штосьці ўсё прыціскала і прыціскала яго да зямлі.

Праз некалькі дзён пасля таго памятнага дня, у пачатку ліпеня сорак першага года, узвод, у якім служыў Макар, першы з усяго батальёна пад кулямётным агнём кінуўся адбіваць атаку гітлераўцаў, засланяючы ім шлях на Оршу. Застаўся на месцы толькі адзін чалавек — Макар Шаблін. Узвод, а за ім астатнія падраздзяленні батальёна прасунуліся за якую гадзіну далёка ўперад. Праклінаючы сябе і добра разумеючы, што з гэтага часу ён на ўсё жыццё будзе агідным сам сабе, Макар міжвольна ўсё шчыльней прыціскаўся да зямлі. Перачакаўшы, пакуль сціхне агонь бою, ён падняў галаву і агледзеўся. То там, то сям былі відны распластаныя на зямлі адзінокія фігуры байцоў. «Не адзін, выходзіць, я тут»,— супакоіў сябе Макар. Праз хвіліну ён зразумеў, што ўсе гэтыя байцы — нежывыя. Толькі ён быў жывы. Праўда, варожая куля ўсё ж зачапіла яго, падрапаўшы трохі левую руку каля локця. «Гэта рана мая ва ўсім вінаватая,— сказаў сабе Макар.— Калі б не яна...»

Ён так і не здолеў трапіць да сваіх — у той жа дзень немцы захапілі яго ў палон.

Канцэнтрацыйны лагер знаходзіўся недзе ў Польшчы, і Макар больш за год працаваў разам з іншымі палоннымі на папяровай фабрыцы, выгружаючы з вагонаў сыравіну і грузячы ў іх гатовую прадукцыю. Аднойчы яго сусед па нарах Васіль Рудак сказаў яму:

— Заўтра мы даем лататы адсюль. Нас восем чалавек. Хочаш быць дзевятым?

— А якім чынам? — насцярожана спытаў Макар.

Васіль Рудак падрабязна расказаў яму пра план уцёкаў. План быў просты, але вельмі рызыкоўны.

— Я з вамі ўсёй душой,— сказаў Макар.— Вось толькі, можна сказаць, нагу няўчасна намуляў...

І назаўтра восем зніклі з лагера. А дзевяты застаўся. «Ах, каб не гэтая нага!..» — гаварыў сам сабе Макар, не то супакойваючы сябе, не то апраўдваючы.

Былі і яшчэ ў жыцці абрывы, калі трэба было кідацца ўперад, не разважаючы і не хістаючыся. Ды ўсе яны засталіся неадоленымі. Макар Шаблін здагадваўся, што іменна таму з яго такі і не атрымалася нічога — ні значнага мастака, ні добрага служачага, ні нават прыстойнага сем'яніна.

І вось ён у шэры слотны дзень стаіць перад Зінай пасля стольківх год з часу іх апошняй сустрэчы, стаіць нікчэмны, бледны, у старэнькім абцёрханым паліто і сам увесь нейкі абцёрханы і, пераступаючы з нагі на нагу, усё імкнецца зазірнуць ёй у вочы, а яна ўпарта не хоча глядзець на яго.

Макар ведаў, аб чым яна думае цяпер. Ён абсалютна быў упэўнены ў тым, што і перад ёю паўстаў той далёкі дзень, які з'явіўся пераломным у іх адносінах, які разлучыў іх, паклаўшы для яго канец усяму — надзеям, марам, жаданням. Ён не ведаў пакуль што толькі аднаго, ці захавалася ў яе і дагэтуль пагарда да яго.

— Дык вы, можна сказаць,назусім у наш горад?..— перапытаў Макар, пачынаючы дрыжаць не то ад холаду, не то ад нейкага страху.

Зіна нічога не адказала. Яна не звяртала на яго ніякай увагі, нібы яго і не было перад ёю. Макар дрыжаў усё мацней і зусім не ведаў, што яму рабіць далей. Гаварыць ім не было аб чым.

І ўсё ж Макар адважыўся яшчэ на адзін крок, бо ён не мог, проста такі не мог пайсці ад Зіны без усялякай надзеі на магчымасць пабачыць яе яшчэ калі-небудзь. Яму здавалася, што цяпер гэта і будзе яго адзіным шчасцем — магчымасць бачыць яе, ведаць, што яна побач, у гэтым горадзе.

— Мне можна будзе калі-нікалі заходзіць да вас? — нясмела спытаў Шаблін.— Можна?

Нарэшце Зіна павярнула свой твар да Макара і паглядзела яму ў вочы. Але ён нічога не паспеў прачытаць у яе позірку, а яна нічога не паспела адказаць яму,— з магазіна ў гэтую хвіліну выйшаў вайсковы з палкоўніцкімі пагонамі і гучна сказаў:

— Прабач, Зіна, я трошкі затрымаўся. Але ты нізавошта не адгадаеш, які я табе падарунак купіў. Нізавошта!

Макар успомніў: так, сёння ў Зіны дзень нараджэння... Шаблін крадком зірнуў на вайсковага. У гэтым стройным і вельмі маладым на выгляд палкоўніку ледзь можна было пазнаць Пецю Зварыкіна. Макар настолькі разгубіўся, што нават не прывітаўся са сваім былым паклоннікам. А Зварыкін, відаць, не пазнаў Шабліна.

— Бывайце, Шашкін,— абыякава сказала Зіна.

Палкоўнік узяў яе пад руку. Зіна прыхінулася да яго, і яны хутка пайшлі па вуліцы.

Макар не помніў ужо, куды і чаго яму трэба было ісці, але міжвольна пайшоў за імі. А яны ўсё аддаляліся і аддаляліся...

Дзьмуў халодны пранізлівы вецер. Пад нагамі хлюпаў мокры шэры снег напалам з гразёю.

*1954*

# АПЛАДЫСМЕНТЫ

Руан, мой родны Руан, бывай!

Апошні раз бачу я твае цудоўныя вуліцы, твае непаўторныя плошчы... Бывай! Праз якую гадзіну я буду ў поездзе. Білет — вось ён, у кішэні. Поезд памчыць мяне на ўсход краіны, у Лонгві. Стары Бернар кажа, што праца для чысцільшчыка ботаў і там знойдзецца.

Учора прэфект Буршэ сказаў мне:

— Дваццаць чатыры гадзіны — і каб тваёй нагі тут не было!

Я паспрабаваў пажартаваць:

— Маёй нагі даўно ўжо няма ў Руане, пан прэфект. Яна засталася ў партызанскім шпіталі...— І паляпаў рукой па пратэзу.— Гэта было якраз у той дзень, калі нашы макі * ўшчэнт разбілі гітлераўскіх карнікаў.

— Пагавары ў мяне, валацуга! — зароў Буршэ.— Дваццаць чатыры гадзіны — і ні мінуты болей! Бач ты, прыдумаў: пачысціць чалавеку боты, а потым у рукі яму Адозву суне... Я табе пакажу Адозву!..

Бывай, мой Руан!

Але не таму я ад'язджаю, што напалохаўся пана Буршэ, зусім не таму. Мяне пасылае ў Лонгві партыя.

На стале перада мною стаіць люстэрка. Старое яно, ажно яшчэ з часоў партызаншчыны. Па баках скрозь пашкрэбанае, а пасярэдзіне, крыху бліжэй да левага кутка, уелася ў яго нейкая белая пляма. Таму, калі мне даводзіцца галіць перад ім бараду, я не бачу левага вока, бо

---

* Макі — французскія партызаны.

пляма непразрыстая. Але гэта і добра, што не бачу: навошта занадта часта нагамінаць сабе, што замест вока ў цябе пустая ўпадзіна...

Гадзіны з дзве таму назад я з дапамогай ляза «Бастон» паспяхова ліквідаваў густыя парасткі валасоў колеру ржавага жалеза, якія павырасталі па маіх шчоках і барадзе за якіх дзён тры, што быў я «госцем» папа Буршэ. Ліквідаваў, а люстэрка так і засталося стаяць перада мною, і я ўсё гляджуся ў яго.

Стары ты зрабіўся, Клод Лятрэз, ох і стары!.. Пашкрэбаны ўвесь чыста, як тое люстэрка. А зморшчын на твары колькі! Вунь, бачыш, на лбе іх сабралася ці не з дзесятак; а на скронях, а каля рота!.. Уга! А табе ж усяго толькі трыццаць гадкоў, Клод Лятрэз...

Старое, пашкрэбанае маё люстэрка, не трэба паказваць мне майго калецтва! Адсунься! Бо і сілы ў мяне яшчэ хопіць і жадання змагацца,— усяго хопіць.

Раніца. Толькі што ўзышло сонца. У садзе гаспадара дома перад маім акном цвіце белы бэз. Праз расчыненую фортку ягоны водар запаўняе мой невялічкі пакойчык. Дзень сёння будзе харошы, ясны. На небе ні хмарынкі, блакіт такі чысты, прывабны, што позірк не можа ад яго адарвацца.

Але трэба, мабыць, ісці. Чорная павязка ўжо насунута на вока, пратэз прышпілены. Колькі цяпер гадзін?.. Не, час яшчэ ёсць, можна пачытаць «Юманітэ». Гэты цудоўны хлапчук Андрэ прынёс ужо яе.

Цікава, вельмі цікава! Сёння ў газеце надрукавана справаздача аб рабоце сусветнай канферэнцыі прыхільнікаў міру. Я праглядаю выступленні дэлегатаў Карэі, Інданезіі, Бразіліі, Англіі, В'етнама... Пачакай, а ад нашай краіны хто-небудзь выступаў? Ага, вось: на трэцяй паласе, унізе, змешчана прамова французскай дэлегаткі. Эжэні Дзюфрыш... Што, што? Няўжо гэта яна, наша Эжэні?..

Змест прамовы пераконвае мяне: яна! Наша бясстрашная партызанка Эжэні Дзюфрыш, удзельніца руху Супраціўлення. Гэта яе сустракалі воплескамі на канферэнцыі людзі — прадстаўнікі народаў розных краін свету.

Я перачытваю прамову, і ў мяне таксама паяўляецца гарачае жаданне адказаць воплескамі на словы, з якімі звярнулася да народаў свету мая зямлячка. І я раблю гэта; чуеш, Эжэні, мае апладысменты?.. Эх, каб магла ты пачуць іх!..

Колькі ж часу не бачыліся мы з табою? Шмат, вельмі шмат, ажно цэлых дзесяць год. А сустрэчы нашы праходзяць перада мною, нібы ўсё гэта было ўчора ці пазаўчора...

Які ж дурань ты быў тады, Клод Лятрэз! Насіў, выношваў у сэрцы словы, што прыходзяць да чалавека толькі адзін раз у жыцці, а сказаць іх так і не здолеў. Помніш, ты збіраўся зрабіць гэта ў той жнівеньскі дзень сорак трэцяга года, калі прыйшлі вы з Эжэні, абхітрыўшы гітлераўцаў, у Парыж, каб наладзіць сувязь з партыйным падполлем? Не, раней, значна раней трэба было зрабіць гэта, дурная твая галава. Разышліся ў той дзень вашы дарогі. Так і не пачула дзяўчына слоў, што доўгія месяцы выношваліся ў юнацкім сэрцы.

Яшчэ ёсць час, ты яшчэ паспееш на поезд, Клод Лятрэз; прыгадай жа той дзень да дробязі. Тады таксама былі апладысменты, многа апладысментаў!

Прыгадай!..

...Ідуць па вуліцы двое — малады чалавек і дзяўчына. Ён сярэдняга росту, з чубам светлых валасоў на галаве, з тварам аперэтачнага першага любоўніка; яна крыху ніжэйшая за яго, твар яе строгі, карыя вочы глядзяць на сустрэчных з адкрытай пагардай. Не дзіва: дзяўчына ідзе побач з лейтэнантам войск СС!..

Яны ідуць па вуліцах Парыжа, гучна размаўляюць і бестурботна смяюцца. Мала людзей трапляе ім насустрач. Жыхары зняслаўленага горада лічаць за лепшае сядзець у гэтыя чорныя дні па сваіх кватэрах, а немцаў у такую спякоту хіба адарвеш ад піва ў кафэ-шантанах!..

Малады чалавек і дзяўчына мінаюць плошчу Згоды. Ад Трыумфальнай аркі ідуць усцяж Елісейскіх палёў. Потым скіроўваюць налева.

Каля руін, што ўзвышаюцца на тым месцы, дзе была да вайны антыкварная крама мадам Кан'ё, яны трохі суцішваюць крок.

— Здаецца, трэба пакінуць тут, Эжэні? — пытаецца ён.

— У вас кароткая памяць, пан афіцэр,— імгненна адказвае яна.— Маё імя...

— Цьфу, чорт, выбачайце, дарагая Мадлен! — Ён прыціснуў левую руку да грудзей, схіліў галаву ў галантным нахлоне.— Выбачайце!

Нахіліўшыся да яго, нібы ў знак таго, што — не, яна зусім не крыўдзіцца! — дзяўчына шэптам сказала:

— Пакінуць паперку трэба будзе тут. Дарэчы, дзе яна ў цябе?

— Вось тут.— Ён паклаў руку на нагрудную кішэню.— Але ж загадана пакласці вечарам. А да вечара яшчэ далёка.

— Перадай неўпрыкметку мне,— ціха прамовіла дзяўчына. І раптам загаварыла на ўвесь голас, угледзеўшы, што насустрач ім ідзе нямецкі фельдфебель: — Дык чым мы зоймемся, пан афіцэр? Мо ў кіно сходзім?

— Сапраўды! — узрадаваўся «лейтэнант», ён выцягнуў паперку з кішэні.— Вось тут у мяне запісана, што ідзе сёння ў кіно. Паглядзіце, калі ласка, дарагая Мадлен!

І на вачах у фельдфебеля, які аддаваў «лейтэнанту» чэсць, перадаў складзеную ўчацвёра паперку дзяўчыне. Тая прыгожым жэстам разгарнула яе, прабегла па ёй вачыма і, сказаўшы «то і добра, пойдзем!», схавала ў сваю сумачку.

Яны накіраваліся ў кінатэатр.

Крыху здзівіла іх, што зала была поўная людзей і што былі тут галоўным чынам не немцы, а жыхары горада, старыя і дзеці. Здагадаліся: гітлераўцы пазганялі людзей, каб паказаць ім адзін са сваіх прапагандысцкіх фільмаў пра «перамогі» над савецкімі войскамі.

Селі ў восьмым радзе, з правага боку. Святло чамусьці доўга не гасла, і яны не ведалі, пра што гаварыць ім. Думкі ішлі ў адным кірунку і ў яго, і ў яе: хутчэй бы бег час, хутчэй бы прыйшоў вечар! Паклалі б тады яны пісульку ў вызначанае месца, ды і зноў назад, да сваіх сяброў-партызанаў.

Думаў хлопец яшчэ і пра другое. «Вось пагасне святло, узяць бы рукі дзяўчыны ў свае, сціснуць іх і сказаць, што ў яго на сэрцы. Каб сказаць!..»

Пагасла святло, пачаўся фільм. «Пасля скажу, пасля,— думаў далей хлопец.— Пасля, па дарозе дамоў. Там ніхто перашкаджаць не будзе».

Ён неўпрыкметку зірнуў на дзяўчыну, потым на яе суседа з другога боку. Побач з ёю сядзеў высокі немалады год чалавек. На левай шчацэ ў яго хлопец разгледзеў глыбокі шрам.

Паказвалі хроніку пра тое, як фашысцкія самалёты робяць бандыцкія налёты на Маскву. «Ох і брэшаце ж!» — хацелася крыкнуць хлопцу. На экране самалёты ішлі суцэльнай сцяной. Беспакаранна пераляталі яны це-

раз лінію фронту, беспераціходна дабіраліся да Масквы і бамбілі; бамбілі... Падалі дамы, беглі некуды ў паніцы людзі. «Дзе гэта яны здымалі такое? Ці не ў сваім Берліне?!»

Усё ж з адным самалётам здарылася бяда. Відаць, аўтары фільма для большай «праўдзівасці» наважылі знішчыць адзін свой бамбардзіроўшчык. У той час, калі самалёты рабілі сваю брудную справу, па іх пачалі страляць зенітκі...

Хлопец зірнуў на дзяўчыну. Яна падалася наперад, вочы яе блішчалі. Пацíху, каб ніхто не заўважыў гэтага, ён сваім локцем дакрануўся да яе локця. Дзяўчына, здаецца, не адчула гэтага. Уся яе постаць нібы гаварыла: «Біце іх, гадаў, біце, любыя!»

На экране тым часам буйным планам быў паказаны велізарны бамбардзіроўшчык. Твар лётчыка здаволена ўсміхаўся. Навокал выбухі разрываў, а лётчык рагоча. Вось адзін снарад выбухнуў зусім блізка. Пасля яшчэ і яшчэ. А лётчык усё рагоча.

Аж раптам твар яго пакрывіўся. Самалёт уздрыгнуў і пачаў ахутвацца дымам.

У зале стаяла цішыня.

Хлопец зноў зірнуў на дзяўчыну. Яе рукі імкліва зрушыліся з каленяў, дзе ляжалі дагэтуль... Ён не паспеў схапіць іх. Гучны ўсплёск далоняў далёка разнёсся па зале,— разнёсся, але не сціх, бо ў той жа момант быў падхоплены тысячамі другіх воплескаў.

Пакідаючы за сабою доўгі хвост чорнага дыму, падаў на экране фашысцкі самалёт, а ў зале грымела бура воплескаў.

Самалёт не даляцеў да зямлі. Загарэлася святло, дэманстрацыя фільма была перапынена. У залу ўбеглі гестапаўцы.

— Кожнаму сядзець на сваім месцы! — зароў таўшчэзны з чырвоным каркам обер-лейтэнант.

Гестапаўцы пачалі абкружваць тыя рады, дзе сядзелі хлопец і дзяўчына. Напэўна, яны чулі, адкуль пачаліся апладысменты.

«Абодвум гінуць нельга!» — мільганула думка ў яго, і ён шапнуў дзяўчыне: — Мы незнаёмыя! Чуеш? Незнаёмыя! — Успомніўшы пра паперку, што ляжала ў яе сумачцы, паспешна дадаў: — Выкінь яе! Хутчэй!

Ды было позна ўжо.

Той незнаёмы са шрамам на шчацэ, што сядзеў з другога боку ад дзяўчыны, ужо гаварыў:

— Дазвольце сказаць, пан обер-лейтэнант! Дазвольце сказаць! Я ведаю. Гэта тут! Тут...

Гестапаўцы падбеглі да незнаёмага. Тады «лейтэнант» ускочыў з месца і, адштурхнуўшы як мага далей дзяўчыну, кінуўся на чалавека са шрамам.

— Сапраўды тут! — гукнуў ён і з усяе сілы ўчапіўся рукамі нягодніку ў горла. Той захрыпеў і паваліўся.

Паднялася калатня. Натоўп адціснуў дзяўчыну да дзвярэй, выштурхнуў яе на вуліцу, і яна не бачыла, як скруцілі фашысты хлопцу рукі, як білі яго, як валаклі ў гестапа...

Не бачыў і ён, ці паклала яна запаветную пісульку туды, куды трэба было. Толькі ведаў сэрцам — паклала!

...Вось і ўсё...

Прыгадаў? А болей і не трэба. Бо перажыць яшчэ раз тое, што перажыў потым ты, перажыць нават толькі ў думках — не так проста.

...Хіба ж дзіўна, што цэлых дзесяць год не ведаў я, дзе ты, Эжэні, і нават ці жывая ты. А пра цябе і казаць няма чаго — ты пахавала мяне ў той пякельны жнівеньскі дзень сорак трэцяга года. Ды цуды ўсё ж бываюць на свеце: бачыш — я жывы. Мне ўдалося ўцячы тады з гестапа. Зноў падаўся я ў лес. І хоць трапіў я ў другі атрад, ты ўсё роўна была са мною, у маім сэрцы.

Як бачыш, я жывы, Эжэні!.. Толькі вось у люстэрка мне не хочацца ўглядацца...

Адсунься, старое!

Мабыць, мы сустрэнемся некалі. Так, цяпер мы, напэўна, сустрэнемся. Я ведаю, дзе шукаць цябе: ты па-ранейшаму з намі! Што скажу я табе, калі ўбачу? А ты мне што?.. Сяброўка дзён маіх незабыўных, адзіная ў свеце, ці сказаў табе хто тыя словы, якіх я не паспеў сказаць?..

У садзе ўзняўся лёгкі ветрык. Пад маім акном зашамацелі лісцем кусты бэзу, ды ўсё гучней і гучней...

Я заплюшчыў вочы, прыслухаўся. І ўжо не шапаценне, а гучны грукат грому чуецца мне ў парывах ветру.

А мо гэта не гром грукоча? Прыслухайся лепей, Клод. Чуеш?..

Грымяць, усё мацней грымяць апладысменты простых людзей, што патрабуюць міру ва ўсім свеце. Чуеш — яны

грымяць і ў імя таго, каб нікому, нікому болей не перашкаджалі выказваць словы кахання.

З саду ліецца водар кветак бэзу. Я высоўваюся з акна і дыхаю, дыхаю на поўныя грудзі.

Усё вышэй падымаецца сонца. Хутка пачне прачынацца горад.

Добрай раніцы, любы Руан! Мы яшчэ пабачымся з табою!

*1953*

# ПОМНІК

А вясна, відаць, вось-вось прыйдзе. Прыкметна падаўжэлі дні. Ярчэйшым зрабіўся блакіт неба. Усё больш ласкава паглядае на зямлю сонца. Куды больш смялейшыя цяпер вераб'і: уранку яны ўзнімаюць такі гомап, што хоць вушы ад іх затыкай...

Сёння, калі Павел Лыкоўскі ішоў на вакзал, сонца грэла ўжо зусім як вясною. Каля вялікага, на пяць паверхаў, дома Павел пачуў першую веснавую мелодыю: у паветры пераможна звінеў капеж. Струменьчыкі вады ператвараліся ў лужынкі, яны рабіліся ўсё большыя, потым пабеглі па тратуары танюсенькімі раўчукамі.

Бясконца прыемны для ўсяго жывога першы вясновы капеж!

І ў вагоне поезда ўся гаворка ідзе па веснавую тэму.

— Па ўсім відаць — ох і ўраджай сёлета будзе! — прамовіў, ні да кога ў асаблівасці не звяртаючыся, сівы дзед, што з незалежным выглядам сядзеў ля акна.

— Якія ж прыкметы на тое? — жвава адгукнулася яго суседка, маладая жанчына.

Дзед, перачакаўшы трохі, спаважна адказаў:

— Народныя.

Відаць было, што меркаванне жанчыны, калі б яна і захацела выказаць яго, было для старога зусім нецікавым.

— Народныя! — самаўпэўнена паўтарыў дзед.— Народ — ён усё ведае.

— Я схільна больш верыць у навуку, чымсьці ў дзедаўскія прыкметы,— бойка сказала жанчына.

У шэрых зрэнках дзеда нешта бліснула,— хутчэй за ўсё хітрынка.

— А навука — яна адкуль? З народа! Таму і моцная яна, навука.

Яшчэ тады, калі Павел толькі ўвайшоў у вагон і кінуў вокам на пасажыраў, яму здалося, што ён ужо недзе сустракаў гэтага сівога, з хітраватым прыжмурам вачэй, дзеда. Дзе б гэта магло быць? У Мінску? Ці ў адной з тых бясконцых вёсак, у якіх пабываў ён, крочачы па доўгіх франтавых дарогах?.. Хутчэй за ўсё, што іменна недзе на вайне сустракаў ён яго. Але як ні стараўся Лыкоўскі, падрабязнасцей сустрэчы прыгадаць не мог. І вось цяпер, калі стары прамовіў апошнія словы і, усміхнуўшыся, падміргнуў раптам усяму купэ — цяпер Павел успомніў: іменна так падміргваў пасля кожнага свайго ўдалага жарту дзед Нічыпар з Сысоеўкі. З тае самае Сысоеўкі, з якою ў Лыкоўскага звязана столькі ўспамінаў і ў якую цяпер, пасля стольких год, ён едзе зноў.

...Быў не па-майску гарачы дзень. Раніцай рота трэці раз за апошні тыдзень хадзіла ў атаку і трэці раз адыходзіла назад. Гітлераўцы добра ўмацаваліся ў Сысоеўцы, ператварыўшы яе ў моцны абарончы вузел. Увесь дзень прайшоў у перастрэлцы, якая то сціхала, то распачыналася з новай сілай.

Побач з Паўлам у траншэі, як і заўсёды, быў ягоны неразлучны сябра Саша Пасмітны, шахцёр з Данбаса, ротны весялун і балака.

— Шчо б він сказився, шчо б йому пусто було, што б на нього зараза якась звалилася,— лаяўся Саша, і Павел без дадатковых тлумачэнняў разумеў, хто гэта «ён».

Саша размаўляў з Паўлам толькі на ўкраінскай мове, хоць з усімі гаварыў на рускай. І Павел адказваў яму тым жа, карыстаючыся ў гаворцы з ім сваёй роднай беларускай мовай. Спачатку, пры першай сустрэчы, гэта выйшла ў іх выпадкова, а пасля сябры прывыклі да такога спосабу гутаркі і добра разумелі адзін аднаго.

Шмат хто ў роце здзіўляўся з дружбы такіх розных абсалютна ва ўсім людзей. Павел быў высокі, стройны, маўклівы. Саша — нізкарослы, таўставаты, гаваркі. Спаважны, памяркоўны характар Лыкоўскага ніяк не стасаваўся да Сашынага — няўрымслівага. Саша хутка на ўсё рэагаваў, быў здольны імгненна загарэцца. Пасмітны быў нават гадоў на восем старэй за Лыкоўскага.

Знешне яны адрозніваліся не толькі ростам. Зусім белыя валасы і гэтакія ж белыя бровы Пасмітнага, яго кры-

ху раскосыя вочы і вялікі нос былі прычынай бясконцых жартаў салдат, у той час як, амаль класічна правільныя рысы твару Паўла выклікалі ў кожнага міжвольнае захапленне.

А здружылі іх вершы. Неяк, яшчэ ў запасной дывізіі пад Омскам, Лыкоўскі звярнуў увагу на тое, што Пасмітны, ледзь толькі знойдзецца ў яго вольная часіна, паспешліва вымае з-за пазухі тоўсты сшытак у шэрай цыратовай вокладцы і пачынае нешта запісваць. Тады яны былі яшчэ мала знаёмыя, і Павел праз сваю сарамлівасць доўга не наважваўся спытацца ў Пасмітнага, што ён увесь час піша. «Няўжо столькі пісем?» — здзіўляўся Лыкоўскі. Аднойчы яны трапілі ў нарад на кухню. Калі позна ноччу былі памыты ўсе катлы і дзяжурны дазволіў зрабіць «перакур з дрыматою», Пасмітны прыстасаваўся ў куточку, выняў запаветны сшытак і пачаў пісаць. Павел адважыўся падысці да яго.

— Пішаш? — нясмела спытаў ён.

— Пішу,— адказаў з неахвотай Пасмітны.

— Усё пісьмы?

— Усё пісьмы.

Павел сеў недалёка, заплюшчыў вочы і паспрабаваў заснуць. Ды спаць чамусьці не хацелася. Так прасядзеў ён некалькі хвілін, а калі раптоўна расплюшчыў вочы, убачыў, што Пасмітны спіць. Сшытак валіўся з ягоных рук і ляжаў на падлозе. Лыкоўскі крадком падняў яго. У сшытку былі вершаваныя радкі. «Дык вось якія гэта пісьмы!» — падумаў Павел. Перад вайной, у школе, ён і сам спрабаваў пісаць вершы. І вось цяпер яго раптам нястрымна пацягнула зноў паспрабаваць скласці штонебудзь.

Праз некалькі дзён Лыкоўскі напісаў верш, а яшчэ праз некалькі, пасля доўгіх ваганняў, прачытаў яго Пасмітнаму. Той страшэнна ўзрадаваўся. З тае пары і падружыліся яны. Перад ад'ездам на фронт яны прысвяцілі адзін аднаму свае вершы.

...Пад вечар гарачыня спала, скончылася і перастрэлка.

— Паспаць бы...— летуценна прамовіў Павел, скончыўшы няхітрую салдацкую вячэру.— Сто гадоў не спаў.

Саша больш за ўсіх ведаў пра слабасць сябра, які дужа любіў паспаць, і ўжо намерыўся быў пусціць чарговы жарт, але іх якраз паклікалі да камандзіра роты.

Ноччу сябры пайшлі ў разведку. Разведчыкаў падзялілі на дзве групы. Адной было даручана выведаць правы фланг праціўніка, другой — левы. Здарылася так, што неразлучныя сябры разлучыліся: загад ёсць загад. Саша Пасмітны пайшоў з першай групай, Павел Лыкоўскі — з другой. Абедзве навіны былі вярнуцца ў тры з паловай гадзіны.

У пачатку трэцяй гадзіны з таго боку, куды пайшла група Сашы, пачулася частая аўтаматная страляніна, ды неўзабаве заціхла. Дакладна а палове чацвёртай кіраўнік Паўлавай групы далажыў камандзіру роты аб выніках разведкі. У абароне фашыстаў было выяўлена слабае звяно. Пачалася падрыхтоўка да атакі, якая была назначана на восем гадзін раніцы.

Павел паглядзеў на гадзіннік. Ён паказваў чатыры гадзіны. Сашынай групы ўсё яшчэ не было. Паўла ахапіла трывога. Ён ледзь не праз кожную хвіліну адчыняў вечка старога бацькоўскага гадзінніка. Час ішоў марудна, вельмі марудна.

Неспакой за лёс разведчыкаў ахапіў усю роту.

Чвэртка пятай гадзіны. Палова пятай... Яшчэ дзесяць, яшчэ пятнаццаць мінут... З-за далёкага ўзгорка, з таго боку, адкуль чакалі разведчыкаў, раптам заззяў промень сонца, і тады Павел зразумеў, што больш чакаць дарэмна. З хлопцамі штосьці здарылася...

Рота пайшла ў атаку не ў восем, а ў шэсць гадзін: не, не маглі салдаты высседзець у акопах!..

Звесткі, здабытыя Паўлавай групай, далі сваю карысць. Трэці ўзвод амаль без страт прарваў абарону гітлераўцаў на левым флангу. Немцы разгубіліся, а ў гэты час справа і ў лоб ім ударылі другі і першы ўзводы, і вёска стала нашай.

Пасярэдзіне Сысоеўкі стаяў прасторны цагляны будынак. Проста незразумела было, як ён уцалеў: ад усёй вёскі, дзе раней было дзвесце, а мо нават і трыста двароў, не засталося і пяцідзесяці. Павел увярваўся ў гэты будынак і ў адным з пакояў убачыў тое, ад чаго захаланула сэрца. Пад столлю вісела цела савецкага салдата. Ён быў падвешаны за ногі... Павел не адразу пазнаў у ім Сашу Пасмітнага,— да таго быў скалечаны яго твар...

З дапамогай таварышаў Павел асцярожна зняў цела сябра і паклаў яго на пастаўленыя поруч крэслы,— ніякай іншай мэблі ў пакоі не было.

Салдаты знялі каскі...

Сашу пахавалі за аколіцай, пад маладзенькай бярозкай, што адзінока стаяла ля дарогі. Павел некалькі разоў прыходзіў на магілу сябра. Калі ён наведаўся сюды першы раз, у яго нарадзілася думка — пабудаваць Сашу помнік. У той момант Павел не ўяўляў сабе, як ён гэта зробіць — за ягонымі плячыма быў вельмі малы жыццёвы вопыт, які абарваўся на дзесятым класе сярэдняй школы.

Павел пачаў пісаць верш на смерць Сашы, але верш выходзіў невыразны, бледны. Не напісаўшы і палавіны яго, Павел шпурнуў аловак і злосна скамячыў паперу, на якой ніяк не змяшчаўся боль салдацкага сэрца.

Пасля таго Павел больш не браўся за вершы, зразумеўшы, што пісаць ён не можа і што паэт з яго не выйдзе.

Ля Сашынай магілы і пазнаёміўся Лыкоўскі з дзедам Нічыпарам. Яму першаму і расказаў ён пра сваю думку-мару.

— Добра, хлопец,— сказаў тады дзед Нічыпар,— сябар твой варты таго, каб яму помнік паставіць. Героем трымаўся. Вораг нічога не выпытаў у яго.

А праз хвіліну дадаў неяк сурова:

— Усе нашы справы павінны быць помнікам яму! Ты памятай гэта!

Стары казаў так, нібы Павел павінен быў пайсці з Сысоеўкі не разам са сваёй ротай, што з баямі прасоўвалася ўсё далей і далей на захад, а адзін у спакойную, зусім бяспечную праходку.

Ды хоць шлях ад Сысоеўкі да Берліна быў не зусім бяспечны, здарылася так, што па ўсім яго працягу Павел ні разу не быў паранены.

На рэйхстагу ён распісаўся за двух — за сябе і за Сашу.

Данецкі шахцёр Аляксандр Пасмітны і мёртвы прыйшоў у Берлін.

...А думцы-мары Паўла і надышоў ужо час здзейсніцца. Інстытут скончаны. Пачалася ўседлівая карпатлівая работа над помнікам гвардыі радавому Аляксандру Пасмітнаму. Праект помніка амаль ужо гатовы, трэба толькі дапасаваць яшчэ некаторыя дэталі. Павел падумаў, што лепш за ўсё гэта зрабіць на месцы. І вось ён едзе ў Сысоеўку.

«Не, не пазнаў мяне дзед Нічыпар,— думае пад адпастайны стук колаў вагона Павел Лыкоўскі.— Але ж,

столькі часу мінула... А Саша? Ці помніць хто ў Сысоеўцы Сашу? Ці захавалася яго магіла?..»

Поезд падыходзіў да станцыі, і па вагону захадзілі, затупалі пасажыры. Паўлу трэба было выходзіць. Ён узяў свой партфель і накіраваўся да выхада.

Станцыя была маленькая, пасажыраў з поезда сышло не многа, села ў поезд яшчэ менш. Не паспеў Лыкоўскі ўвайсці ў чысценькі ўтульны вакзальчык, як пачуўся гудок паравоза, і поезд, ляснуўшы на развітанне буферамі, рушыў далей.

Да Сысоеўкі, ведаў Павел, было кіламетраў трыццаць, не менш. Ён намерыўся перачакаць да раніцы на вакзале, а там ужо прыдумваць што-небудзь назаўтра. Аднак не ўправіўся ён нават прысесці на шырокую канапу, як адчыніліся дзверы і ў вакзал, следам за воблакам марознага паветра, увайшоў дзед Нічыпар. Лыкоўскі спярша нават не пазнаў яго: на старым быў вялізны доўгі кажух з высока настаўленым каўняром, а гэтага кажуха Павел у вагоне не бачыў. «Мусіць, па дзеда прыехалі на станцыю з калгаса»,— падумаў Павел.

— Ну, хто тут будзе мне ў дарогу? — жартаўліва загаварыў дзед, хоць у вакзале, акрамя Лыкоўскага, нікога не было.— Вам не на Сысоеўку, часам? — звярнуўся ён да Паўла.

Лыкоўскаму не хацелася, каб хто ведаў, што ён прыехаў у Сысоеўку, і таму нікому ён не хацеў быць спадарожнікам. Але адмаўляцца было няёмка, бо дзед мог убачыць яго ў вёсцы, і тое, што ён адмовіўся, вытлумачыў бы па-свойму.

— Няма, выходзіць спадарожнікаў? — перапытаў дзед Нічыпар, аглядаючы пустую залу.

— Давайце паедзем,—сказаў Павел.

— От і добра,— яўна ўзрадаваўся стары.— Адзежа толькі, гляджу, слабаватая ў вас для такога прагону.

Але, спахапіўшыся, што гэтымі словамі можа напалохаць Паўла, дзед паспешліва дадаў, забіраючы партфель Лыкоўскага:

— Але ж нічога: капяка ў мяне, як той леў, у момант дамчыць. Кажух таксама ладны — на двух хопіць. А ногі ў сена схаваеце. Паедзем. Жывы будзем — не памром!

За фурмана сядзеўружовашчокі шыракатвары хлопец гадоў чатырнаццаці — унук старога, як даведаўся неўзабаве Павел.

— А ну, пахадзі лейцамі, Пецька! — гукнуў дзед Нічыпар.

Ды каняка быў, відаць, не зусім як леў, бо «хадзіць лейцамі» хлопцу давялося як мае быць.

У санях дзед Нічыпар чамусьці прымоўкнуў. Заняты сваімі думкамі, маўчаў і Павел. Толькі Пецька ўвесь час не пераставаў паведамляць дзеду навін і падзей за ўсе два тыдні часу, што дзеда не было дома. Расказаў Пеця і пра тое, што Пралеска прывяла бычка і што Вольга ўчора двойку па арыфметыцы зарабіла і ўвесь вечар раўла, і пра тое, што, кажуць, у калгаса забяруць чырвоны сцяг, бо «Ленінскі шлях» раней падрыхтаваўся да вясны.

Апошняе паведамленне вывела дзеда з дрымоты. Ён прабурчаў нешта, на некага нават вылаяўся.

— Яшчэ пабачым, хто каго возьме,— сказаў дзед Нічыпар.— Ураджаем мы іх усё роўна аблапошым. Тады пабачым, у каго сцяг будзе.

З далейшай размовы дзеда Нічыпара з унукам Павел даведаўся, что дзед ездзіў у сельскагаспадарчую акадэмію чытаць студэнтам лекцыю пра свой вопыт, як вырошчваць высокія ўраджаі бульбы, пасля быў у навукова-даследчым інстытуце і набраўся там столькі мудрасці, што самога калгаснага агранома заткне за пояс.

— Экзамены на курсах яшчэ не пачыналіся? — спытаў дзед Нічыпар у Пецькі.

— Заўтра, кажуць, пачнуцца.

— Добра, паспеў акурат.— Павярнуўшыся да Паўла, дзед ахвотна растлумачыў: — У агратэхнічнай групе састаю, бачыце. Экзамены от буду здаваць. Хоць на старасці год, а ўсё ж хачу мець дакумент, што прайшоў навуку.

І, падумаўшы крыху, дадаў:

— Без навукі, чалавеча, цяпер у нашай сялянскай справе ані кроку.

Удалечыні паказаліся агеньчыкі.

— Вунь яна, наша Сысоеўка,— ажывіўся дзед.— Цяпераka мы бадай-што дома... А бабы ў печах ужо вунь паляць. Акурат на бліны паспеем. Эх, скажу вам, няма нічога на свеце смачней за нашы сысоеўскія бліны. А яшчэ калі, скажам, са скваркамі! Сініць гэта, скажам, патэльня мачанкі, а ты скруціш бліне у трубку, макнеш яго ў сала, дый скварачку заадно падчэпіш... Не адарвацца, у каго рот вялікі...

Твар старога расплыўся ў хітрай ухмылцы, ён нават прыцмокнуў языком.

— А кілбасы ў нас робяць — уга! — выхваляўся далей дзед Нічыпар.— Куды там гарадскім да нашых! Падсмажыць гэта табе старая скрутак, паставіць патэльню, на стол — за вушы не адцягнеш!

Пад'ехалі да вёскі. І адразу ж з розных двароў забрахалі сабакі.

— Тпру-у-у! — крыкнуў Пецька на свайго «льва».— Бач ты, разышоўся пад раніцу. Не стрымаеш.

Лыкоўскі агледзеўся. Сані стаялі каля даволі вялікай хаты з прыгожымі ўзорнымі аканіцамі і разьбяным ганкам.

— От і прыехалі,— ці то з тугою, ці то з жалем у голасе праказаў дзед Нічыпар.

— Вельмі дзякую вам,— сказаў Павел, злазячы з саней.

— Наадварот, гэта я вам дзякаваць павінен: страх не люблю адзін па дарогах ездзіць. Ад пуды можна прапасці... А вам жа куды — да нас у Сысоеўку ці далей дзе трэба?

— У Сысоеўку...— адказаў Павел.— Да старшыні вашага трэба мне па справах.

— Дык Пецька ў момант дамчыць!

— Не, не, вы ўжо не турбуйцеся, калі ласка,— заспяшаўся Лыкоўскі.— Я сам...

Даволі няўважліва выслухаўшы падрабязныя тлумачэнні дзеда Нічыпара пра тое, як дайсці да старшыні, Павел развітаўся са старым і, паабяцаўшы абавязкова наведацца на бліны са скваркамі, хутка закрочыў па вуліцы. Сабачы брэх зноў узняўся над вёскай.

Пачало світаць.

Хату старшыні Павел мінуў, толькі зірнуўшы на яе, і неўзабаве выйшаў за аколіцу. Цяпер было ўжо зусім блізка. Вунь і бярозка,— канешне ж тая самая. Але як яна вырасла! Павел прыскорыў хаду.

Ля бярозы правільным прамавугольнікам стаяла могілкавая агарожа. Можна было ўжо прыкмеціць, што яна афарбавана ў чырвоны колер. Ад дарогі да агарожы бегла роўная, старанна расчышчаная сцежка. І не далей як учора тут хадзілі людзі: на снезе відаць было мноства слядоў.

Лыкоўскі лёгка адчыніў брамку. За агарожай узвы-

шаўся магільны пагорак. Чыесьці рукі любоўна разраўнялі на ім снег, абклаўшы яго пышнымі яловымі лапкамі, зялёнымі і поўнымі жыцця.

На тым месцы, дзе Павел некалі ўкапаў простую непагабляваную дошку з кароткім надпісам, цяпер стаяў строгі каменны абеліск з пяціканцовай зоркай наверсе. Пасярэдзіне абеліска ў чорнай рамцы пад шклом быў партрэт Сашы, а пад партрэтам бронзавы надпіс: «Тут пахаваны гвардыі радавы Аляксандр Пракопавіч Пасмітны, закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў вёсцы Сысоеўцы 19 мая 1944 года». А крыху ніжэй ззялі словы: «Вечная слава героям, загінуўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы».

Павел зняў шапку і колькі хвілін нерухома стаяў ля магілы.

Ужо зусім развіднела. З-за таго самага ўзгорка, што і ў сорак чацвёртым годзе, паказалася сонца.

Ля агарожы, з аднаго і з другога боку ад магілы, стаялі дзве лаўкі. Лыкоўскі сеў на адну з іх і не заўважыў, як да яго, мякка ступаючы, падышоў дзед Нічыпар.

Стары сеў побач. Павел адразу зразумеў, што дзед Нічыпар даўно пазнаў яго, і яму стала няёмка, што ён не зачаў гаворкі са старым яшчэ там, у вагоне.

— Наведацца прыехалі?

— Але.

Памаўчалі.

— Хто гэта даглядае так магілу? — спытаў Лыкоўскі.

— Піянерыя наша,— адказаў дзед Нічыпар.— Яны сюды штодня ходзяць. І Пецька, унук мой, таксама. А сёлета надумаліся яблыні тут пасадзіць ды вішні.

Потым стары спытаў:

— А пра мару сваю не забыліся?

— Не, дзед Нічыпар. Таму і прыехаў.

— Так... Гэта добра...— Перачакаўшы нейкі час, стары сказаў: — А я вас адразу прызнаў, там, у поездзе. Бачу, і вы мяне быццам прыпомнілі. Ну што ж, думаю...

— Прашу прабачыць... Але падумалася мне, а што калі Сашу тут даўно ўжо забылі. Ведаеце, як цяжка было б тады...

— Добра, пойдзем, пакажу я табе сёе-тое.

Яны ішлі па той самай вуліцы, па якой калісьці Павел бег з аўтаматам у руках і з гранатамі за поясам. Ды тут нішто ўжо не нагадвала пра мінулае. Ад руінаў і пажа-

рышчаў не засталося і следу. Паабапал вуліцы стаялі новыя, добра зрубленыя, пад чарапіцай, дамы.

— У якой жа пасадзе ходзіце вы цяперака? — спытаў дзед Нічыпар.

— Архітэктарам буду. Будаваць збіраюся.— І Павел пачаў расказваць старому пра свае намеры на будучыню.

Падышлі да вялікага цаглянага будынка. Павел угледзеўся ў яго, і сэрца яму кальнула. Ды гэта ж той самы будынак, у адным з пакояў якога знайшоў ён свайго сябра!

Але будынак быў большы. Над ім быў надбудаваны яшчэ адзін паверх. Павел падышоў бліжэй і над уваходнымі дзвярыма зусім нечакана прачытаў: «Сярэдняя школа імя Аляксандра Пасмітнага».

Лыкоўскі павярнуўся. Дзед Нічыпар стаяў па другім баку вуліцы і чакаў Паўла. Лыкоўскі рушыў да дзеда, стаў поплеч з ім і яшчэ раз акінуў позіркам школу імя яго сябра.

Вось ён, помнік Сашу Пасмітнаму. Помнік, што стаяць будзе вечна!

Вуліца напоўнілася вясёлымі шчабяткімі галасамі. У школу ішлі дзеці.

А сонца падымалася ўжо вышэй і вышэй. І раптам зазвінеў капеж — верная адзнака таго, што хутка будзе вясна.

*1950*

# СІТУАЦЫЯ

Зняўшы трубку, Клаўдзія Пятроўна набрала нумар, пачакала, пакуль ёй адкажуць, а тады скоранька пачала гаварыць:

— Гэта ты, Хоша? Я нешта не пазнала цябе. Нейкі ў цябе зусім не твой голас. А можа гэта не ты?.. Ну што ж маўчыш, скажы што-небудзь яшчэ... Алё, алё, гэта прараб Ліпневіч?

Прыцісну́ўшы трубку мацней да вуха, Клаўдзія Пятроўна заўсміхалася.

— А-а, у цябе нарада...— Яна прыкрыла трубку рукою і сказала да дзецюка, што сядзеў на канапе з выглядам чалавека, прыкутага да яе нябачнымі ланцугамі: — У яго нарада. У яго поўны кабінет людзей.— Потым зноў пачала гаварыць у трубку: — Пасля? Навошта мне званіць пасля, калі ў мяне вельмі тэрміновая справа. І нічога з тваімі людзьмі не станецца, могуць і пачакаць хвілінку... Гэта я балбачу ўжо цэлых пяць хвілін?! Не выдумляй, навошта ты заўсёды выдумляеш! Абы я толькі пазваніла, ты заўсёды... Ну, добра, зараз скажу. Дык вось, слухай...

Клаўдзія Пятроўна зрабіла кароткую паўзу і выпаліла:

— Да нас прыехалі госці!

Дзяцюк на канапе варухнуўся, але тут жа зноў сціішыўся.

— Не ўгадаў! — гаварыла далей Клаўдзія Пятроўна.— Не мае шаноўныя сваячкі з Капыля, а твой кроўны пляменнічак з Ліпневічаў. Ага, ажно з Ліпневічаў у сталіцу прыджгаў... Не, ён ужо не падшыванец. Дзесяты клас, кажа, сёлета скончыў. Такі ладны дзяцюк, от пабачыш... Ды во пядаўна ўваліўся. Я нават і не пазнала яго,

пакуль ён сам не сказаў. Гэта ж мы калі ездзілі да іх? Гадоў таму пяць, мусіць. А то і ўсе шэсць.

— Ага, якраз шэсць,— ломкім баском сказаў Сёмка і зачырванеўся, бы дзяўчына.

— Дык гэта я чаго званю? Абед у нас ёсць, учарашні. Але ж трэба, сам ведаеш... Ага, захапі, як будзеш ісці дамоў. І бляшанку шпротаў, ты ж ведаеш, я іх дужа люблю. Можа, якраз і Сёмка ўпадабае, ён жа ў тых вашых Ліпневічах нічога такога, мусіць, і ў вочы не бачыў. Грошы ў цябе ёсць?.. Гэта ты назнарок гэтак кажаш, каб людзі чулі? Разжаліўся, падумаеш! Жопка яго крыўдзіць, нават папяросы сама яму купляе, каб не перадаць лішняй капейчыны!.. Ну, не буду. Перахапі там у каго-небудзь, а заўтра я табе дам, ты і аддасі. Во і добра. Дык жа не затрымлівайся, а то Сёмку не церпіцца пабачыць цябе.

Клаўдзія Пятроўна паклала трубку, зірнула на гадзіннік і, зноў лагодна ўсміхаючыся, сказала да Сёмкі:

— Харытон Ігнатавіч кажа, што не забавіцца, яму не церпіцца пабачыць цябе. Праз гадзіну будзе дома. То я пайду на кухню, а ты, Сенечка, пакуль яно тое, можаш пачытаць. Даць табе «Неделю»? Апошні нумар дужа цікавы. Асабліва стацейка пра мамантаў. Проста жах! А мне ты прабач.

— Нічога, цётачка Клавачка,— сказаў Сёмка і зноў зачырванеўся.— Вы рабіце, што вам трэба. А я во, праўда, пачытаю.

Дакладна праз гадзіну ў калідоры пачуўся званок, а потым і голас Харытона Ігнатавіча. Толькі тады Сёмка адважыўся ўстаць з канапы.

У пакой імклівай хадою ўвайшоў каржакаваты крыху залішне патаўсцелы мужчына ў шэрым пакамечаным гарнітуры — вельмі знаёмы, і ў той жа час нейкі не той, якога ведаў Сёмка. Дзіва што, ён жа, Сёмка, быў тады, падчас іхняе апошняе сустрэчы, зусім дзіцянё і ўсё ўспрымаў, вядома ж, іначай.

— Пакажыся, пакажыся, хлопча! — гаварыў Харытон Ігнатавіч, адступаючы на крок назад і з галавы да ног азіраючы Сёмку.— Малайчына, ну проста малайчына, нічога не скажаш. Нашае пароды, нашае! А я і не паверыў быў Клаве, калі яна сказала па тэлефоне, што ты такі ладны ды прыгожы. Ажно і праўда. Ну, то давай пацалуемся, пляменнік. Толькі ж глядзі, не задаві мяне, чарцяка гэтакі, га-га-га!..

Ён сам абняў Сёмку і пацалаваў яго ў шчаку. Хлопец яшчэ болей засаромеўся, у яго дробненька затрымцелі вейкі, а на лбе выступілі пацеркі поту.

— Добры дзень вам, дзядзька Харытон... Во я прыехаў... Да вас, значыцца...

Сёмка быў старэйшы сын меншай Харытонавай сястры Ганны, у якой гадавалася яшчэ і трое дачок. Сам жа Харытон Ігнатавіч дзяцей не прыдбаў. Праўда, на першым годзе іхняга сумеснага з Клаўдзіяй Пятроўнай жыцця мелася быць у іх дзіцятка, але яны вырашылі, што ім яшчэ зарана абзаводзіцца патомствам, і Клаўдзія Пятроўна пайшла да аднае знаёмае цёткі. Тая зрабіла сваю справу, відаць, не дужа спрытна, бо з таго часу, вось ужо больш за дваццаць год, яны вякуюць свой век бяздзетнымі. І неяк нават прывыклі ўжо да гэтага, неяк зміры́ліся з такім сваім лёсам, бо — што ж паробіш, самі вінаватыя...

Сёмка запомніўся Харытону Ігнатавічу хударлявым на выгляд, нібы нават хваравітым хлапчуком. Такім, ці прыкладна такім, меркаваў Харытон Ігнатавіч убачыць Сёмку і цяпер. А перад ім стаяў высокі плячысты юнак з загарэлым тварам, у клятчастай кашулі, якая, здавалася, вось-вось трэсне па швах.

— Прыехаў, значыцца... Да вас...

— Сядай, пляменнік, сядай. Во тут давай пасядзім на канапе, пагамонім, пакуль гаспадынька паставіць нам што якое на стол,— у шчаслівым узбуджэнні гаварыў Харытон Ігнатавіч і сам першы плюхнуўся на канапу.— Клавачка, ты нам скора дасі чаго падсілкавацца, а то мы абодва з дарогі, праўда — адзін трохі з большай, другі трохі з меншай, га-га-га...

— Ды во буду ўжо пакрываць на стол,— сказала Клаўдзія Пятроўна і адчыніла шафу, каб узяць абрус. Абрус быў габеленавы і яшчэ зусім новы, Клаўдзія Пятроўна толькі нядаўна купіла яго ў камісіёнцы і цяпер, відаць, хацела пахваліцца ім перад госцем. Ды Харытон Ігнатавіч раптам сказаў:

— Не трэба, Клавачка, залішне турбавацца. Мы ж свае людзі, дык навошта нам розная там паказуха. Паабедаем па-свойску, па-сямейнаму, на кухні.

— Хоша, ну што ты! — абурылася Клаўдзія Пятроўна.— Як гэта можна — прымаць гасцей на кухні!..

— Нічога, Клавачка, нічога. Няхай Сёмка ведае, што мы людзі простыя, што ў нас усё самае звычайнае, што

мы не лётаем у нябёсах, а ходзім па буднай зямельцы, як і ўсе грэшныя людзі. Праўда, усё найбольш трушком, трушком...

Хоць Клаўдзія Пятроўна і паморшчылася, аднак спрачацца з мужам не стала. Яна толькі ўпікнула:

— Але што гэта ты яму ўсё «Сёмка» ды «Сёмка». Ён жа Сямён, гэта значыць, у крайнім выпадку, Сеня. Чалавек можа пакрыўдзіцца або падумаць пра нас што якое.

Сёмка памкнуўся быў штосьці сказаць, але Харытон Ігнатавіч перапыніў яго.

— Для каго, мажліва, Сямён, для каго, мажліва, нават і Сеня, а то і Сенечка, а для мяне — Сёмка, і ўсё тут, бо я яго яшчэ во з такое пары ведаю, яшчэ на руках некалі гушкаў, а ты мне кажаш! Правільна я каменцірую, Сёмка?

Сёмка не ведаў, ці гушкаў яго калі на руках дзядзька Харытон, але на ўсякі выпадак сказаў:

— А няго ж.

— А ты мне кажаш...

«Цікава, аднак, чаго ён прыехаў? — думаў тым часам Харытон Ігнатавіч.— Напэўна, прасіць чаго-небудзь. Яны, гэтыя вясковыя, адно і прыязджаюць, каб выканькаць то тое, то другое...»

Хвілін праз колькі Клаўдзія Пятроўна паклікала іх на кухню. Харытон Ігнатавіч урачыста адкаркаваў бутэльку з доўгім рылам і, паказваючы на наклейку, паведаміў:

— «Фяцяска». Сухое румынскае віно. Я ўвогуле, каб ты ведаў, п'ю толькі адно сухое. І табе, як старэйшы і, вядома, больш вопытны, раю таксама. Такога хоць цэлую цыстэрну выжлукціш, ніколі дурны не будзеш, не тое што ад гарэлкі або нават ад каньяку. Трэба, племяшок, як той пехта казаў, і піць, і на вышыні быць. А то бывае каторы на капейку вып'е, а глупства на ўсю дзесятку наробіць, калі не больш, ды яшчэ потым...

— Нешта ты не з таго пачаў, Хоша,— сказала Клаўдзія Пятроўна.— Мы ад цябе чакаем тосту, а ты нешта паехаў некуды не туды.

— Што ж, можна і тост,— згадзіўся Харытон Ігнатавіч.— За сустрэчу, так сказаць! Вось ён і ўвесь тост на дадзеную хвіліну. Першую чарку трэба да дна, Сёмка. Цягні, цягні, чаго моршчышся? Віно, скажу табе, хоць і кіслае, але дужа пальзіцельнае. У ім — само сонца і жывыя вітаміны. Галава пасля яго, калі хочаш ведаць, заўсёды

светлая, чыстая, і назаўтра галава нічога не баліць. Хоць цыстэрну выпі, хоць дзве.

— Можна падумаць, што ты якраз тыя дзве цыстэрны і прывалок у хату,— сказала Клаўдзія Пятроўна.— А ты, Сенечка, закусвай, а не сядзі склаўшы ручкі. Што на цябе пазірае, тое і бяры. Можа шпротаў пакаштуеш? От гэта напраўдзе і смачная і пальзіцельная рэч. Далікатэс, адным словам. Ты ведаеш, што такое далікатэс, Сенечка?

— Не чапіся да чалавека, Клавачка, не чапіся. Што ён — з джунгляў прыехаў ці яшчэ адкуль? Ён усё чыста ведае, бо нашы Ліпневічы — вёска культурная, гэта табе не нейкія там Гімалаі. Ды і адукацыю ён атрымаў, і не малую, сама ведаеш. Большую, дарэчы, за тваю. Ты от лепей скажы мне, Сёмка, спадабалася табе «Фяцяска» або не спадабалася? Толькі шчыра, па-нашаму, па-простаму.

— Назва дужа прыгожая,— сказаў Сёмка.— Цікава, што яна азначае? Мабыць, штосьці ласкавае, пяшчотнае.

— Але, назва схавана ад нас таямніцай чужое мовы. Што яно і да чаго — адзін бог ведае. Не лічачы, вядома, румынаў. Дарэчы, ты якую мову вывучаў у школе?

— Спярша нямецкую. А потым прыслалі да нас у школу новую настаўніцу, узяліся за англійскую.

— І ні той, ні гэтай, напэўна, не навучыліся?

— Дзе там было навучыцца. Бэкаем, чытаючы, збольшага, а каб перакласці з прачытанага ці самому што якое сказаць па-іхняму — ні ў зуб нагой.

— Дзела паршывае,— зазначыў Харытон Ігнатавіч, зноў наліваючы віно ў чаркі.— Без замежнай мовы цяпер ні ў адзін інстытут не паступіш. І на парог не пусцяць.

— А я і не збіраюся нікуды паступаць,— крыху ўжо асвойтаўшыся за сталом, сказаў Сёмка.— Такога ў мяне і ў галаве не было.

— А мы думалі...— Клаўдзія Пятроўна зірнула на мужа.— Мы думалі, што ты прыехаў здаваць дакументы ў якую навучальную ўстанову. Можа, думалі, нават ва універсітэт .

— Хто гэта — мы? — строга сказаў да жонкі Харытон Ігнатавіч.— Можа, ты што якое гэткае сваімі жаночымі мазгамі і думала, за гэта я не ручаюся, а што тычыцца мяне, дык я быў упэўнены, што Сёмка нікуды з нашых Ліпневічаў не паедзе, бо ён і там патрэбен, і нават вельмі патрэбен. Для яго і там работы хопіць да самае макаўкі. Правільна я каменцірую, Сёмка?

— Ды ўжо ж...

— Таму я прапаную наступны тост за нашы Ліпневічы, за тое, каб яны жылі і красавалі, дужэлі і харашэлі!

— Сяло наша найлепшае,— сказаў Сёмка.— Пейзажы вакол — толькі карціны з іх і малюй. Ды вы ж ведаеце,— павярнуў ён твар да Клаўдзіі Пятроўны,— вы былі ў нас. Я памятаю, як вы да нас прыязджалі. Вы мне тады яшчэ складанчык падарылі. Доўга ён у мяне быў, пакуль не ўпусціў у рэчку. Каталіся мы аднаго разу на лодцы, а ён раптам слізь з рук, боўць у ваду. Да самага вечара, пакуль не сцямнела, ныралі мы, але так і не знайшлі. Глыбока на тым месцы было, і дно мулаватае.

— Паплакаў, відаць, нямала,— засмяяўся Харытон Ігнатавіч.

— Было,— прызнаўся Сёмка.

— Дзівак, напісаў бы нам, мы б табе новы прыслалі,— сказала Клаўдзія Пятроўна.— Яшчэ і лепшы.

— Няёмка было пісаць.

— Ну, пабеглі! — сказаў Харытон Ігнатавіч і пачаў патрошку каўтаць са свае чаркі.

Адсёрбнула віна і Клаўдзія Пятроўна, тады перасмыкнулася і болей піць не стала. Сёмка кульнуў сваю чарку адным махам і, каб не паморшчыцца, упіхнуў у рот шпроціну.

Клаўдзія Пятроўна наліла ў талеркі рысавага супу на курыным булёне. Упраўляліся з ім моўчкі, нібы загадзя ўмовіліся, што, пакуль не з'ядуць, не скажуць ні слова.

— Што там у цябе сёння на другое? — адставіўшы пустую талерку і адсопваючыся, спытаў Харытон Ігнатавіч.

— Катлеты, хіба ты не ведаеш? У магазіне паўфабрыкатаў учора брала, але нішто сабе. Гарнір дык дужа ўдаўся. Такая смачная бульба — пальчыкі абліжаце!

— З кубанскім соусам?

— Ну.

— Ладна, давай катлеты. У нас, Сёмка, усё па-простаму, сам бачыш. Розныя там марцыпаны і да іх падобныя прысмакі мы не ямо. А катлеты — страва, між іншым, здаровая. Давай нам, Клавачка, катлеты. Чуеш, Сёмка, які пах ад іх ідзе? Аж у носе казыча. Тут і сам бог вялеў узяць яшчэ па адной чарачцы, вунь і ў бутэльцы,

глядзі, якраз па адной яшчэ будзе. Правільна я камецірую, Сёмка?

— Дзякую, дзядзечка, але мне штосьці болей не хочацца,— умольна сказаў Сёмка.

— Не спадабалася, значыцца, «Фяцяска»? — спахмурнеў Харытон Ігнатавіч.— Да сельгаспапітку ўжо, мусіць, прылаўчыўся?

— У нас у сяле самагону не гоняць. Я дык яго і не нюхаў ніколі, і не бачыў.

— Так я табе і паверыў. Хаця...— Харытон Ігнатавіч падумаў, а тады з пераконаннем зазначыў.— Хаця яно гэтак і павінна быць. Калгаснікі жывуць цяпер заможна, грошы ім даюць, дык навошта і сапраўды важдацца з тым самагонам? Пайшоў сабе ў краму і ўзяў з белай галоўкай. А скажы, многа цяпер п'юць? Толькі шчыра скажы.

— Хто як. Каторыя многа, каторыя мала. Хто як.

— А старшыня ваш? У вас хто цяпер — усё яшчэ Супрун?

— Ага.

— П'е?

— Сам я не бачыў. Ды і людзі кажуць, што не злоўжывае.

— Так я і паверыў. Хаця... Цяпер, вядома, старшыні разумнейшымі парабіліся. Не поўзаюць болей на карачках з канца ў канец сяла, не дэманструюць перад часным народам сваё свінячае нутро. Цяпер яны, калі што якое, дык па печах вылежваюцца. Прыхварнуў, маўляў, маласць, што тут паробіш. Сэрца або, наадварот, пячонка. Паспрабуй, разбярыся фельчар у тых ягоных вантробах.

— Наш старшыня не вылежваецца. Дзень пры дні на рабоце.

— Так я і паверыў...

— Ты еш, Сенечка, еш,— сказала Клаўдзія Пятроўна.— Я табе на гарнір яшчэ і грэчневай кашы паклала. Ты любіш грэчку? У нас дык яе днём з агнём не знойдзеш. Па блату дастала.

— Трасцы б ты дастала, каб не даў я загадчыку магазіна мех цэменту,— сказаў Харытон Ігнатавіч.— Будуецца чалавек, трэба ж было памагчы,— растлумачыў ён Сёмку. І потым спытаў: — Дык ты напраўдзе не будзеш болей піць?

— Не хочацца болей, дзядзечка.

— То і я тады не буду. Няхай на другі раз астаецца.

Харытон Ігнатавіч уліў жончыну чарку назад у бутэльку і старанна закаркаваў яе.

— На той другі раз з твайго віна воцат будзе,— сказала Клаўдзія Пятроўна.

— Нічога з ім да заўтрага не зробіцца. А заўтра мы з Сёмкам яшчэ кульнём перад абедам.

Яны ўзяліся жаваць свае катлеты. І нейкі час зноў маўчалі. Потым Клаўдзія Пятроўна задумліва прамовіла:

— Усё ж я не разумею... Вучыцца дзесяць гадоў, атрымаць асвету... сярэднюю асвету!.. і астацца ў калгасе. Каб рабіць тое самае, што рабілі твае малапісьменныя бацькі і зусім непісьменныя дзяды. Дык навошта тады было тое вучэнне? Не разумею!

— Ты шмат чаго не разумееш, Клавачка,— паблажліва сказаў Харытон Ігнатавіч.— А галоўнае, ты не разумееш нашага часу. Так сказаць, сітуацыі.

— Можна падумаць, што толькі адзін ты ўсё і разумееш! — агрызнулася Клаўдзія Пятроўна.— А от я хачу сур'ёзна спытаць у Сенечкі. Няўжо ты, Сенечка, і сапраўды нікуды не хочаш паступіць вучыцца далей? Няўжо табе не хочацца стаць інжынерам, або настаўнікам, або хоць аграномам, нарэшце? Ані не хочацца? Ну скажы мне, толькі чыстую праўду?

— Я люблю машыны,— прамовіў Сёмка і зноў, ужо ў каторы раз сёння, пачырванеў.

— Во, во, я так і думала. Дык чаго ж ты не паступаеш у інстытут? У політэхнічны, напрыклад, ці яшчэ там у нейкі, я не ведаю ў які. Скончыш — і будзеш за інжынера дзе-небудзь на заводзе, або на фабрыцы, ці на якой будоўлі, там жа цяпер скрозь адны машыны...

— Вы мяне не так зразумелі, цётачка... Не, відаць, гэта я сам не зусім дакладна сказаў. Я якія машыны люблю? Трактары, камбайны, вось якія.

— І гэта таксама добра, хто ж кажа, што кепска. То якраз і можна скончыць такі факультэт, пасля якога і пашлюць інжынерам на трактарны завод альбо на камбайнавы. Я гэта і маю на ўвазе, я цябе правільна зразумела.

— Усё ж, даруйце, не зусім правільна. Бо я што хацеў сказаць? Што я сам, разумееце — сам! — люблю рабіць на машыне. На трактары. А яшчэ болей — на камбайне. Камбайн — о, гэта мая мара ад самага маленства, далібог. Я ўжо столькі кніжак прачытаў — і пра камбайны, і пра камбайнераў! І я буду ўрэшце працаваць на кам-

байне, абавязкова буду. А на трактары я ўжо і цяпер умею, нас у школе вучылі. Нават і пасведчанне далі, спецыяльная камісія з раёна прыязджала. Мяне, сказаць вам, цэлую гадзіну мурыжылі, прыдзіраліся не дай ты божа, але я ўсё на «выдатна» здаў, і тэорыю, і практыку. От праз месяц адзін наш трактарыст на пенсію пойдзе, дык я ўжо дамовіўся, што сяду на трактар замест яго.

— Але ж гэта... гразішча, пылішча, духацішча, а божа ж ты мой!..

— Не такая ўжо, скажу я вам, і гразішча, як вы думаеце. А калі нават і гразь, дык дзе без яе абыдзешся, працуючы? Нічога, гразь хоць якая адмыецца. Затое... эх, каб вы хоць разочак селі за руль трактара, ды павялі яго, ды паглядзелі, якія ён барозны за сабой пакідае, якою пасля яго зямелька робіцца, вы можа і не тое гаварылі б!

— О, я з большаю ахвотаю села б за руль аўтамашыны,— засмяялася Клаўдзія Пятроўна.— Вядома, уласнай. Ды яе, на жаль, у нас няма, і невядома, ці будзе калі. Мабыць, ужо і не будзе, хоць Харытон Ігнатавіч і эканоміць з усяе сілы на гарэлцы, на папяросах ды на запалках.

— Глупства нейкае несусветнае ты вярзеш, Клава,— шморгнуў носам Харытон Ігнатавіч.— Тут ідзе сур'ёзная гаворка, чалавек выкладае сваё жыццёвае... гэта самае... крэда, а ты сунешся са сваімі недарэчнымі жартамі. Маўчала б ужо лепей...

— То гавары тады сам.

— І скажу.— Ён зноў шморгнуў носам.— Я што маю сказаць у даным канкрэтным выпадку? А вось што. Сёмка зробіць абсалютна правільна, калі астанецца ў родным сяле. Падкрэсліваю — абсалютна правільна. За гэта я яго люблю і шаную. Трэба нам уздымаць сельскую гаспадарку ў адпаведнасці з апошнімі дырэктывамі? Безумоўна, трэба. Таму і заслугоўваюць нашага ўсебаковага ўхвалення тыя маладыя людзі, якія не пакідаюць родных сёл, не зважаюць на цяжкасці, не ідуць шукаць доўгага рубля і лёгкага жыцця ў горадзе. І мы павінны цалкам падтрымліваць такіх людзей, а з другога боку, кляйміць ганьбаю тых, хто выкарыстоўвае любую зачэпку, абы толькі ўцячы з тае хаты, дзе нарадзіўся і ўзгадаваўся. Правільна я каменціраю, Сёмка?

Сёмка чамусьці зноўку зачырванеўся і, апусціўшы вочы, пачаў старанна даядаць катлету.

— Ура-а! — выгукнула раптам Клаўдзія Пятроўна і запляскала ў далоні.

Харытон Ігнатавіч здзіўлена зірнуў на жонку. А Клаўдзія Пятроўна ўжо спакойна, але з ноткамі кпліваспі ў голасе сказала:

— Я і не ведала, што ты ў мяне такі хвацкі прамоўца. Нібы на якім сходзе выступіў... Дзіўлюся я толькі з аднаго: а чаму ты сам, не раўнуючы, некалі ўцёк... прабач, не ўцёк, а проста з'ехаў... чаму ты з'ехаў са сваіх Ліпневічаў?

— Тады быў другі час. Другая сітуацыя. Апроч таго, у мяне іншы талент,— як апраўдваючыся, гаварыў Харытон Ігнатавіч.— У мяне талент будаўніка. Я нібы нарадзіўся будаўніком, вось у чым уся загвоздка.

— То і будаваў бы на сяле,— не супакойвалася Клаўдзія Пятроўна: на яе найшоў нейкі гумор, якога зусім не ведаў дагэтуль за жонкаю Харытон Ігнатавіч.— Там жа таксама будуюць, хіба не?

Хацелася, дужа ж хацелася Харытону Ігнатавічу грукнуць кулаком па стале, каб паставіць жонку на сваё месца. Але ён стрымліваў сябе пры госцю, даўшы сабе слова абавязкова зрабіць гэта пасля, калі не будзе сведак.

— Разгарненне не тое,— сказаў Харытон Ігнатавіч, пазіраючы на аднаго толькі Сёмку.— Мне што патрэбна? Мне патрэбен маштаб, размах. А які маштаб, які размах на сяле? Я вунь цяпераха дзесяціпавярховую камяніцу адгрохаў. Гмах такі, што, як зірнеш на вільчык знізу, шапка так і валіцца з галавы. А на сяле што? Кароўнікі, стайні, птушнікі... Не, я нічога такога благога сказаць гэтым не хачу. Нам патрэбна і тое, і тое. Але, як той пехта казаў, кесарава — кесару...

— Бач ты яго, кесар-асэсар знайшоўся які,— усё падлівала масла ў агонь Клаўдзія Пятроўна.— Але ж нешта гэтага кесара-асэсара выпіхаюць са сталіцы. На перыферыю нешта гоняць. Не зважаючы на ягоны незвычайны талент.

Харытон Ігнатавіч паклаў сціснутыя ў кулакі рукі на стол перад сабою; гэты яго жэст, здавалася, гаварыў: «Ну, пачакай ты ў мяне, даражэнькая!..»

— Не выпіхаюць, а пасылаюць на ўмацаванне,— як

мага больш спакойна сказаў Харытон Ігнатавіч.— І не на перыферыю, а ў абласны цэнтр.

— Падумаеш, абласны цэнтр! Можа для каго гэта і цэнтр, а для мяне — пусты гук. Вельмі ён мне патрэбен, гэты твой цэнтр! Мне і тут, бачыць бог, зусім няблага.

— Ты і сапраўды нічога не разумееш. Ніякай, так сказаць сітуацыі не ўлічваеш.

— Ат!..— махнула рукой Клаўдзія Пятроўна.— Што з табою гаварыць!.. Пойдзем лепш цяпер глядзець тэлевізар.

Яны падаліся ў гасцінную. Апошні, пазадзе ўсіх, ішоў Сёмка, нейкі нібы згорблены, з павузелымі плячыма, і адно пільна глядзеў сабе пад ногі — мабыць, таму, што паркет быў наглянцаваны на страшэнны бляск і ён, Сёмка, баяўся пакаўзнуцца.

Па тэлевізары перадавалі футбольны матч. Клаўдзія Пятроўна пачала бурна хварэць за мінскае «Дынама». На злосць ёй Харытон Ігнатавіч стаў хварэць за алма-ацінскі «Кайрат». Адзін Сёмка сядзеў абыякавы — футбола ён не любіў.

Мінчане прайгралі, і гэта ўзняло настрой у Харытона Іванавіча. Ён доўга і ў смак пакепліваў з жонкі, а тая злавала, не ведаючы, як яшчэ дапячы мужу.

Пасля яны пілі чай. Падчас чаявання Клаўдзія Пятроўна пачала асцярожна выпытваць у Сёмкі, чаго ён усё ж прыехаў у Мінск. Сёмка сказаў, што прыехаў проста так, без аніякае асаблівае мэты. Здаў экзамены ў школе — вось і надумаўся на дзён колькі з'ездзіць у сталіцу, паглядзець-падзівіцца, што яна сабою ўяўляе, бо бачыў яе толькі на фота ў газетах ды ў кіно. Добра было б, сказаў ён, каб удалося схадзіць у які тэатр або ў цырк, ды яшчэ ў музей Айчыннай вайны. Ну і, вядома, пахадзіць па магазінах, можа, пападзецца які хвацкі ды недарагі касцюм, грошы яму матка дала.

— Гэта ўжо, Сенечка, паложыся на мяне,— узрадаваная, сказала Клаўдзія Пятроўна.— Мы табе такі касцюмчык адарвём, што ўсе дзеўкі ў Ліпневічах ніцма ўпадуць перад табою! У мяне ж поўна блату ў магазінах.

— Быў бы ён у цябе, гэты блат, калі б...— буркнуў Харытон Ігнатавіч, але болей гаварыць нічога не стаў, а пачаў старанна сёрбаць чай.

Клаўдзія Пятроўна частавала Сёмку, наліваючы яму шклянку за шклянкай, і адно запэўняла яго, што ўсё чы-

ста пакажа яму ў Мінску, абы толькі ён чаго захацеў. Сёмка дзякаваў, болей ужо не бянтэжачыся і не чырванеючы.

Напіўшыся чаю, Харытон Ігнатавіч палагаднеў, і калі яны з Сёмкам, пакінуўшы Клаўдзію Пятроўну на кухні мыць посуд, падаліся зноў у гасцінуюі паселі на канапе, ён расчулена сказаў:

— А мяне, Сёмка, папраўдзе пераводзяць. Пакідаю я матухну-сталіцу. Так, пакідаю. Сітуацыя склалася такая.

— Калі трэба, то трэба,— сказаў Сёмка.

Харытон Ігнатавіч шморгнуў носам, пракаўтнуў штосьці ў горле і гаварыў далей:

— Але гэта ненадоўга. На годзік, ну ад сілы на два. А там мяне зноў возьмуць сюды, гэта ўжо точна. I я апі не бядую.

Сёмка зірнуў на Харытона Ігнатавіча, нібы хацеў пераканацца, ці праўда, што той не бядуе. А Харытон Ігнатавіч у сваю чаргу абвёў позіркам гасцінуюі, памаўчаўшы крыху, пачаў гаварыць зноў:

— Аднаго от толькі шкада — кватэры. Гэта ж у мяне не кватэра, а рай зямны. Усе выгоды. Ліфт. Мусарапровод. Высокая столь. Гарачая вада круглыя суткі. Два балконы. Паасобны санвузел... Ды што там гаварыць, ты і сам усё бачыш, не сляпы.

— Санвузла я не бачыў, — сказаў Сёмка.

— Столькі біўся я за яе, даражэнькую, столькі здароўя паклаў, пакуль атрымаў!..— нібы і не чуючы Сёмкавых слоў, жаліўся Харытон Ігнатавіч, у каторы раз зноў абводзячы позіркам сцены, столь, дзверы, падлогу.— А потым яшчэ давялося ўсё перарабляць на свой капыл, усё перафарбоўваць, даводзіць да ладу, каб не казённа было, а, як той пехта казаў, каб лашчыла вока і цешыла сэрца. Гэта таксама і грошай, і сілы каштавала... А цяпер во трэба кідаць усё невядома каму, нейкаму, можа, нават паразіту на нашым здаровым савецкім целе. А вернешся — зноў валокі, зноў бікя. Ды ці ж такую ўжо атрымаеш?! Дадуць дзе-небудзь у чорта ў зубах маламетражку, і будзь здароў...

— Але, могуць даць і ў чорта ў зубах,— пагадзіўся Сёмка.— Вельмі проста.

— Я ж і кажу. Нічога так не шкада, як кватэры...

— Праўда, праўда, гэткія харомы!..

— От і я кажу...

— Але ж нічога не напішаш.

— Так, нічога.

Харытон Ігнатавіч устаў з канапы, прайшоўся па пакоі, угледзеў на падлозе нейкую парушынку, падняў яе і выкінуў у фортачку. Яшчэ раз прайшоўся да дзвярэй і назад. Пастаяў на сярэдзіне пакоя, пераступаючы з наскоў на пяткі. Тады раптам утаропіўся ў Сёмку, чагосьці пабляднеў і хуценька падсеў да хлопца.

— Паслухай, Сёмка, у мяне нечакана з'явілася адна геніяльная мысля. Нават звышгеніяльная! Ты толькі паслухай, Сёмачка!

Харытон Ігнатавіч увесь аж заззяў, а лоб нават узмакрэў. Ён дастаў з кішэні насоўку і, выціраючы твар, адначасна ўзрушана гаварыў:

— Ты пераязджаеш жыць да мяне! Неадкладна, не трацячы і дня лішняга. Я нават табе скажу больш — можаш лічыць, што ты пераехаў ужо. З прапіскай я ўсё ўладкую, ты можаш абсалютна не турбавацца. І наконт работы — таксама. Знайду табе рабацёнку — во! На сотню рублёў сама меней, гэта як піць даць. Ты казаў, што любіш машыны, і нават, казаў, умееш упраўляцца з трактарам, дык я цябе запраста пасаджу на бульдозер. Гэта той самы трактар, толькі з такою храновінай наперадзе. Ды ты, мабыць, і сам ведаеш, не мне табе гаварыць. Не вучы, як той пехта казаў, вучонага... А і праўда, Сенечка, гэта проста цудоўная мысля! Лепшага нічога і сам бог не прыдумае. Мы во з Клаўдзіяй Пятроўнай хутка паедзем, дык ты і займай сабе на здароўе мае апартаменты і жыві сабе ў сваё поўнае ўдавольсцвіе!..

Ён ляпнуў Сёмку па калене, зарагатаў, але потым на момант задумаўся.

— Праўда, могуць падсяліць каго-небудзь, трасца ім у бок, бо для аднаго, ды яшчэ халасцяка, двух пакояў, скажуць, задужа... Ты не збіраешся жаніцца? А, табе яшчэ рана... Тады мы вось што зробім. Мы прапішам яшчэ і тваю якую-небудзь сястру, напрыклад Маньку. Гэта няважна, што яна будзе жыць дома, абы ў дамавой кнізе значылася. Упраўдому я паўлітру пастаўлю, не «Фяцяскі», вядома, ён будзе маўчаць. І наогул усё будзе шыта-крыта, я ведаю, каму і чым трэба пазатыкаць раты. Ну, што ты на гэта скажаш, дарагі мой племяшок? І не думай, Сенечка, і не гадай, а адразачку давай згоду.

Такая лафа можа падарыцца раз у жыцці, праўду табе кажу.

Падчас гэтай доўгай і палкай казані Сёмка і аднаго слова не здолеў сказаць. Хлопца нашчэнт ашаламіў і збянтэжыў ужо сам той імпэт, з якім звяртаўся да яго Харытон Ігнатавіч, і, акрамя таго, вельмі ж ужо печаканай была сама прапанова. Такога павароту ані нельга было прадбачыць. І таму Сёмка, нават калі і скончыў гаварыць Харытон Ігнатавіч і сам ужо прагна чакаў Сёмкавых слоў, усё яшчэ маўчаў і адно стараўся не сустрэцца позіркам з дзядзькавымі вачыма. А той лісліва зазіраў у Сёмкаў твар, і ад гэтага хлопцу рабілася проста не па сабе.

А кватэра ў дзядзькі і напраўдзе была шыкоўная, Сёмка і сніць не сніў нічога такога. І столь, халера, вунь якая высачэзная, хіба параўнаеш з іхняй вясковай. І сцены, ліха на яго, незвычайныя — адна зялёная, другая ружовая, трэцяя жоўценькая, а яшчэ адна блакітная. І падлога адмысловая — з дробненькіх дошчачак, пакладзеных не роўненька, а нейкімі зігзагамі, і так яно ўсё блішчыць, што аж хадзіць боязна, здаецца — пакаўзнешся, бы па лёдзе, і бразнешся з усіх чатырох. І яшчэ ёсць, казаў дзядзька, нейкі паасобны санвузел. Хоць бы паказаў, што гэта за дзіва такое...

— І вы хочаце... хочаце аддаць... аддаць мне ўсё гэта? — спытаў нарэшце Сёмка і абвёў рукою вакол сябе. І паглядзеў затым на Харытона Ігнатавіча,— цяпер ужо проста ў вочы.

— Усё, Сенечка, усё чыста,— заківаў галавою Харытон Ігнатавіч.— Мы з Клаўдзіяй Пятроўнай нават і мэблю кратаць з месца не будзем, навошта яе вазіць туды-сюды. Там мы абыдземся чым-небудзь такім гэткім... больш простым. А ты — жыві сабе, валодай і, як той пехта казаў, наслаждайся. Гадкоў два, а магчыма, і ўсе тры. Пакуль, так сказаць, сітуацыя. А пасля, як я вярнуся назад... ну, там тое будзе відаць. Што-небудзь прыдумаем, адным словам. Мы ж свае людзі... Дык ударым па руках, га, пляменнік?.. Ну, давай сюды сваю руку!

Сёмка паволі ўзняўся з канапы. Следам за ім борздзенька ўскочыў Харытон Ігнатавіч. Яны сталі насупраць адзін аднаго, тварам у твар — абодва ўсхваляваныя, узрушаныя...

...Я не ведаю, што было далей. Справа ў тым, што я не сказаў вам пра адну акалічнасць. Сёмка прыехаў да дзядзькі Харытона не адзін, а разам са мною, ягоным аднакашнікам. І я ўвесь час быў каля іх, і абедаў з імі, і чай піў, і тэлевізар глядзеў, і прысутнічаў пры ўсёй гаворцы. Але як толькі яны ўсталі з канапы, я таксама ўскочыў са свайго крэсла і пачаў развітвацца, бо мне трэба было спяшацца на поезд. Я тым жа вечарам паехаў у Маскву, здаваць экзамены ў кансерваторыю.

Экзамены я здаў, мяне залічылі ў клас прафесара Давыда Ойстраха. Пра гэта я адразу ж напісаў пісьмо Сёмку ў Ліпневічы. Ды штосьці адказу ад яго пакуль няма.

Дзе ён цяпер, мой друг Сёмка? Я яшчэ не ведаю пра гэта. Але ж, вядома, некалі даведаюся.

*1966*

# САКРЭТ

Не заходзячы дамоў, Глеб Максімавіч проста з поезда пашыбаваў у сваю кантору. Дырэктар трэста любіў, каб супрацоўнікі, вяртаючыся з камандзіровак, адразу ішлі да яго і тут жа дакладвалі пра вынікі паездкі. Ведаючы гэта, Глеб Максімавіч заўсёды іменна так і рабіў.

Стаяла хмурная і даволі золкая раніца. Вясна сёлета прыйсці ў Мінск запазнілася, і нават цяпер, у маі, даводзілася насіць паліто. Ды яшчэ і шалік закручваць на шыю.

Ад вакзала да трэста было параўнаўча недалёка, таму Глеб Максімавіч не стаў карыстацца ні тралейбусам, ні таксі. Ён наогул не любіў ездзіць, а больш за ўсё хадзіў па горадзе пеша, лічачы, што ў сорак два гады рана адмаўляцца ад паслуг «сваіх дваіх» і спадзявацца толькі на «чужыя чацвярныя».

Але, нягледзячы на благое надвор'е, настрой у Глеба Максімавіча быў цудоўны. Матэрыялы, якія ён сабраў у камандзіроўцы, абавязкова павінны былі спадабацца дырэктару трэста. На іх аснове можна будзе распрацаваць новы, больш дасканалы графік выпуску прадукцыі, і гэта не магло не радаваць. Ідучы па вуліцы, Глеб Максімавіч нават разы са два ўсміхнуўся быў сам сабе, падумаўшы, што такой удалай камандзіроўкі за апошні час не было ні ў кога з супрацоўнікаў трэста.

— Прыйдзецца нават і водпуск перанесці на пазнейшы час,— сказаў сам сабе ў думках Глеб Максімавіч.— У чэрвені ніяк нельга ісці. Работы над новым графікам будзе ўга колькі!

Дырэктар трэста Пятро Пятровіч Нупрэеў сустрэў яго надзвычай ветліва, і гэта крыху здзівіла і нават насцяро-

жыла Глеба Максімавіча. Нупрэеў лічыўся чалавекам сухаватым, у абыходжанні са сваімі падначаленымі ён ніколі не станавіўся, як кажуць, на кароткую нагу, мог нават часам ні за што нагрубіць чалавеку. Таму цяпер, гледзячы на вясёлы, нейкі прасветлены твар дырэктара, Глеб Максімавіч адно дзівіўся. Што здарылася з гэтым чалавекам, якога адны пабойваліся, другія асцерагаліся, а трэція проста пазбягалі?..

— Сядайце, сядайце, шаноўны Глеб Максімавіч,— лагодна гаварыў тым часам Нупрэеў, важна разваліўшыся ў крэсле.— Прыехалі, значыцца? То і добра, то і добра. А ў нас, от, бачыце, надвор'ейка такое, што крый божа!.. І адкуль бы, здаецца, быць такому ліхалеццю ў маі? Проста, не раўнуючы, шаленства нейкае ў прыродзе. Вы бачылі хоць калі што-небудзь падобнае?

— Не, не бачыў,— сказаў Глеб Максімавіч і прысеў на край канапы.

— То ж і я не бачыў. І старыя, кажуць, не бачылі. А? Што вы сказалі?

— Я маўчу...— прамовіў Глеб Максімавіч, зусім не ведаючы, як яму трымацца з Пятром Пятровічам.

«Што ж адбылося? — напружана думаў Глеб Максімавіч.— Якая муха яго ўкусіла?..»

— Вы ўжо снедалі? — мякка спытаў Нупрэеў і працягнуў Глебу Максімавічу пачак «Казбеку». — Курыце, калі ласка.

— Дзякую,— сказаў Глеб Максімавіч.— Я проста з поезда. Хачу далажыць вам пра вынікі камандзіроўкі. Я там на такую залатую жылу натрапіў...

— На жылу? А-а...— пазяхнуў Пятро Пятровіч.— Ну, пра гэта мы пагаворым пасля. А цяпер ідзіце, адпачывайце. А то што ж вы... з поезда і проста на службу. Берагчы сябе трэба, шаноўны Глеб Максімавіч, берагчы трэба. Бо здароўе, як казаў Казьма Пруткоў, даражэй за ўсё. Вы ведаеце Казьму Пруткова?

— Чуў сёе-тое...— няпэўна сказаў Глеб Максімавіч.

— Разумны чалавек, далажу я вам. Вельмі разумны. От, напрыклад, ведаеце, што ён сказаў пра сэрца?

— Пра сэрца?..

— На дне кожнага сэрца, кажа, ёсць асадак!

Пятро Пятровіч задаволена зарагатаў. Нарагатаўшыся, пачаў гаварыць зноў.

— Нібы ў маё сэрца, чарцяка, глядзеў. Бо і сапраўды

адчуваю я — ёсць на дне яго нейкі асадак. Невыразны такі, але ёсць. А вы адчуваеце? Ёсць на дне вашага сэрца асадак?

Не разумеючы, куды хіліць Пятро Пятровіч, Глеб Максімавіч сказаў па-ранейшаму няпэўна:

— Ды сёе-тое... нібы і сапраўды...

Сказаўшы так, Глеб Максімавіч асцярожна паглядзеў на Пятра Пятровіча,— як пры́ме яго словы начальнік?.. Але Нупрэевым, відаць, валодала ўжо нейкая іншая думка, бо ён, старанна пагасіўшы папяросу, раптам спытаў:

— Вы былі калі-небудзь у кабінеце начальніка глаўка?

— У кабінеце таварыша Малашкі? — перапытаў Глеб Максімавіч.

— Я маю на ўвазе не Малашку, а кабінет начальніка глаўка.

— А хіба кабінет таварыша Малашкі і кабінет начальніка глаўка не адно і тое ж? — асцярожна запытаўся Глеб Максімавіч.

— Не, не адно і тое ж,— самазадаволена прамовіў Пятро Пятровіч і шматзначна прымоўк.

«Няўжо?..— мільганула нечаканая думка ў галаве ў Глеба Максімавіча.— Няўжо?..»

— Вам, як старому майму саслужыўцу, я магу сказаць...— пасля паўзы таямніча пачаў Нупрэеў.— Але прашу ўлічыць — гэта пакуль што сакрэт. Таму вельмі прашу — да пары да часу нікому ні слова.

— Магіла! — запэўніў Глеб Максімавіч і ўвесь напружыўся ад цікаўнасці.

— Малашку здымаюць. Яшчэ не знялі, але хутка здымуць. Даюць нашаму міламу начальнічку па шапцы. Быў конь, ды з'ездзіўся. Капут!

— Ну-у?..— шчыра здзівіўся Глеб Максімавіч.

— Вось вам і «ну»!

— А каго ж... каго ставяць?

Пятро Пятровіч узяў з пачка новую папяросу, не спяшаючыся распаліў яе, зацягнуўся дымам і выдыхнуў:

— Мяне.

Трэба было неадкладна ўстаць з канапы і кінуцца віншаваць. Але цела чамусьці не слухалася, Глеб Максімавіч так і астаўся сядзець на канапе, таму віншаванне выйшла не вельмі цёплае. Але Пятро Пятровіч горача падзякаваў Глебу Максімавічу.

На развітанне Нупрэеў яшчэ раз напярэдзіў Глеба Максімавіча:

— Толькі ж глядзіце — нікому ні слова. Пра гэта пакуль што ніводзін чалавек у горадзе не ведае. Я нікому яшчэ не гаварыў. От прыйдзе загад, тады іншая рэч. А пакуль — сакрэт!

«Ну што ж, сакрэт дык сакрэт»,— падумаў Глеб Максімавіч і, ідучы дамоў, вырашыў нічога не гаварыць жонцы.

Сонца схавалася, дзьмуў рэзкі вецер. Глеб Максімавіч браў свой пузаты партфель з жоўтай скуры то ў адну руку, то ў другую: рабіць гэта прыходзілася не таму, што партфель быў важкі і навярэджваў рукі, а ўсё праз тое ж надвор'е,— рукі стылі, і трэба было па чарзе грэць іх у кішэнях.

Мар'я Фёдараўна ведала, што муж прыедзе якраз сёння, і таму падрыхтавалася як след. Не паспеў Глеб Максімавіч памыцца, а на стале ўжо стаяла талерка з украінскім баршчом, а з кухні чуваць было, як на патэльні верашчыць круток сялянскай каўбасы, таксама вельмі любімай.

Глеб Максімавіч сеў з вялікім апетытам. Насупраць за сталом сядзела жонка і чагосьці загадкава ўсміхалася.

Нечакана Мар'я Фёдараўна сказала:

— А ведаеш, Малашку здымаюць.

— Што?..— папярхнуўся Глеб Максімавіч.

— Яшчэ не знялі, але хутка здымуць. Даюць нашаму міламу начальніку па шапцы. Быў конь, ды з'ездзіўся. Капут!

— А каго ж... каго ставяць? — ціха спытаў Глеб Максімавіч.

— Ды гэтага твайго... як яго... Нупрэева.

Глеб Максімавіч адчуў, што ў яго раптам зусім прапаў апетыт. Есці ані не хацелася.

*1955*

# НЕ АШУКАЙ СЯБЕ

Пятро Хведаравіч Біцюк вярнуўся з камандзіроўкі ранёнька-рана, яшчэ і сямі гадзін не было. Дзверы яму адчыніла заспаная жонка. Спачатку здзівілася, а тады, узрадаваная, кінулася яму на шыю.

— Я ж цябе чакала толькі заўтра!..— цалуючы мужа ў няголеную шчаку, расчулена сказала Марыя Міхайлаўна.

— То сёння і дамоў мяне не пусціш? — прастуджаным голасам сказаў Біцюк.— Тады, можа, мне куды да другой пайсці? — пажартаваў ён.

— Я табе пакажу — да другой! — гэтак жа жартаўліва паківала яму пальцам жонка.— Але што здарылася? Чаму ты прыехаў сёння?

— Ды от скончыў усе свае справы раней тэрміну і — гайда дамоў. Чаго, думаю, сядзець мне па тым іхнім заводзе яшчэ цэлы дзень, калі мне і так ужо ўсё чыста зразумела.

— Ты правільна зрабіў, дарагі,— памагаючы мужу зняць паліто, шчабятала Марыя Міхайлаўна.— А з горлам у цябе што?

— Ды от жа, каб яму спрахнуць, спакусіўся ўчора бочкавым півам. А яно аказалася халаднаватае. Ды гэта нічога, пройдзе. Галоўнае — я дома, з табою.

— Я дам табе чаю з малінавым варэннем, і таблеткі ў мяне ёсць, якраз нядаўна ўзяла на ўсякі выпадак.

— Дома, кажуць, і сцены памагаюць.

Пачуўшы галасы, прачнуўся іхні сын Сцёпка. Угледзеўшы бацьку, з радасным віскам кінуўся да яго. Біцюк падняў сына на выцягнутых руках, патрымаў над сабою, потым асцярожна апусціў на падлогу.

Сцёпка быў рады бяскопца.

— Я атрымаў дзве пяцёркі, па арыфметыцы і па фізкультуры,— абвясціў ён.— І ты павінен купіць мне новыя канькі!

— Будуць табе канькі, будуць! — сказаў Пятро Хведаравіч.— І новыя баціпкі да канькоў таксама!

У яго быў самы найлепшы настрой, і ён быў гатовы паабяцаць сыну, чаго той толькі захоча.

— Ура-а!..— закрычаў Сцёпка і пабег апранацца — яму трэба было а восьмай у школу, у свой трэці клас.

Марыя Міхайлаўна хуценька прыгатавала снядапак. Яны селі за стол — усе ўзбуджаныя, вясёлыя. Сцёпка раптам заявіў, што і ў яго нешта такое-гэткае з горлам, таму і яму таксама трэба выпіць чаю з маліпавым варэннем.

— Хітрун! — шчасліва засмяялася Марыя Міхайлаўна і паклала сыну варэння нават больш, як бацьку.

І Сцёпка выпіў аж дзве шклянкі. Мажліва, выпіў бы і трэцюю, ды трэба было бегчы на ўрокі.

Калі за сынам зачыніліся дзверы, Біцюк зірнуў па гадзіннік і крадком уздыхнуў; праз паўгадзіны трэба было і яму ісці на службу.

— А можа, ты сёння не хадзіў бы, га? — па-свойму зразумеўшы мужаў позірк, асцярожна прамовіла Марыя Міхайлаўна.— Скажаш, што прыехаў не ранішнім, а вячэрнім поездам. Хто там будзе цябе правяраць, калі ты прыехаў.

— Правяраць, вядома, ніхто не будзе, але...

— І горла вунь у цябе хворае,— ужо з большай настойлівасцю пачала гаварыць Марыя Міхайлаўна.— Гэта ж пойдзеш пасля гарачага чаю на вуліцу і яшчэ горш застудзіш, потым бюлетэнь прыйдзецца браць. Тыдзень можаш праваляцца.

— Ды яно канечне...— усё яшчэ вагаючыся, пачухаў патыліцу Біцюк.

— Зрэшты, я нават лічу, што тут і думаць няма чаго. Не хадзі сёння, і ўсё! Прымі лепей ванну, паляжы, адпачні.

— Ды яно і папраўдзе стаміўся я страшэнна. Гэтыя камандзіроўкі ўсе сілы выматваюць, проста спусташаюць чалавека.

— І я ж кажу, Пеценька. Яны, гэтыя праклятыя камандзіроўкі... яны ж, каб на іх...

— Давай бялізну, лезу ў ванну! — рашуча сказаў тады Біцюк.— Потым пагалюся, і на бакавую!

— Ура-а!..— якраз як сын, завішчала Марыя Міхайлаўна.

— Тсс!..— прыклаў палец да вуснаў Біцюк.— А то яшчэ хто пачуе... І наогул, калі будуць, ці мала што, званіць, пытацца мяне, адказвай, што няма дома, што я яшчэ не прыехаў з камандзіроўкі. Ясна?

— Ну вядома ж, Пецелька. Так і буду гаварыць, ты не хвалюйся, не турбуйся. От зараз пашукаю табе бялізну. Пушчай ваду ў ванну.

Біцюк, ужо ані не вагаючыся, пайшоў у ванную. Пстрыкнуў выключальнікам, але святло чамусьці не запалілася. «Мабыць, перагарэла лямпачка»,— падумаў ён і, каб пераканацца, паспрабаваў уключыць святло ў калідоры. Але і там яно не запальвалася.

— Маша, відаць, перагарэлі пробкі,— сказаў Біцюк.— Прынясі, калі ласка, табурэтку, .пагляджу на шчытку, што яно там такое здарылася.

Шчыток быў каля самых уваходных дзвярэй. Калі Марыя Міхайлаўна прынесла табурэтку, Біцюк узлез на яе і пачаў асцярожна выкручваць пробку.

Раптам у дзверы пастукалі.

— Хто там? — машынальна спытаў Біцюк.

— Гэта я,— данеслася з-за дзвярэй.— З прыездам, Пятро Хведаравіч! Мо разам пойдзем на работу, га?

— Яго няма дома! — выгукнула Марыя Міхайлаўна.— Ён яшчэ не вярнуўся з камандзіроўкі!

І тады зрабілася ціха-ціха — і тут, у калідоры, і там, на лесвічнай пляцоўцы. Пасля за дзвярыма той жа голас, але ўжо значна цішэйшы, вымавіў:

— Прабачце...

Яшчэ праз нейкі момант за дзвярыма пачуліся асцярожныя крокі — усё ніжэй, ніжэй... Тады рыпнулі дзверы на вуліцу...

З выкручанай пробкай у руцэ Біцюк саступіў на падлогу і раптам, знямоканы, апусціўся на табурэтку.

— Гэта Максім Пядзелька...— шэптам сказаў ён.

— Ага...— таксама шэптам сказала Марыя Міхайлаўна.

Максім Пядзелька быў іхнім суседам на лесвічнай пляцоўцы і, акрамя таго, працаваў разам з Біцюком у адным аддзеле.

— Нарабілі мы з табою...— зусім разгублена прамовіў Біцюк.— Паспрабуй цяпер дакажы яму, што, як быў я ў камандзіроўцы, у цябе нікога не было. Ён жа прысягаць будзе, што на свае ўласныя вушы чуў нечы сіпаты мужчынскі голас...

...Вось ужо другі год Максім Нядзелька пры сустрэчах з Пятром Хведаравічам Біцюком чырванее і апускае вочы долу. А на Марыю Міхайлаўну пазірае масляпымі вочкамі і аблізваецца.

*1966*

# ЛАНДЫШ СЕРАБРЫСТЫ

У пачатку чэрвеня я атрымаў кватэру. Кватэра была невялікая, з аднаго пакоя і кухні, але для мяне, халасцяка, лепшай і не трэба было. Тым больш, што яна мела асобны ўваход, знаходзілася амаль у цэнтры горада і акно з пакоя выходзіла на адну з галоўных вуліц, на паўднёвы ўсход. Калі да гэтага дадаць яшчэ, што чакаў я яе больш за два гады, жывучы ўвесь час пасля інстытута на правах далёкага сваяка ў аднаго добрага чалавека на ўскраіне горада, дык кожнаму стане зразумела, якім шчасцем з'явіўся для мяне невялікі, з адным акном, пакой на пятым паверсе.

На новае месца заўсёды пераязджаеш з пачуццём нейкай своеасаблівай усхваляванасці. Што яно дасць табе? Ці прынясе што-небудзь такое, чаго ты яшчэ не зведаў? Як наладзіцца тут жыццё?.. Гэтыя і шмат якія іншыя пытанні ўвесь час узнікаюць перад табою, хвалююць, прымушаюць рабіць самыя неверагодныя здагадкі, марыць, удавацца ў фантазію і нават філасофстваваць.

Мая кватэра была ўжо не новая, у ёй нехта жыў раней, але хто — я не ведаў. Калі я прыйшоў агледзець яе, папярэдні жыхар ужо з'ехаў і яна пуставала. Адна толькі рэч засталася ад ранейшага гаспадара: на акне, у шкляным слоіку з-пад кансерваў, стаяў букет ландышаў. Відаць, ён быў пастаўлены ў ваду даўно, бо некаторыя кветкі пачалі ўжо вянуць.

Акрамя водару кветак, у пакоі стаяў яшчэ ледзь улоўны пах тонкіх духоў. Па гэтых прыкметах можна было беспамылкова вызначыць, што маім папярэднікам была жанчына. Але хто яна: маладая дзяўчына альбо шчаслівая жанчына-маці, а мо старая бабуля, што дажывае ў

адзіноце свае дні?.. Кветкі не маглі даць адказу на гэтае пытанне, а распытваць домакіраўніка мне здалося няёмка. Праўда, ён сам сёе-тое сказаў мне, але з яго слоў мала чаго можна было зразумець.

— Ніна Пятроўна мела вялікую любоў да кветак,— гаварыў домакіраўнік, наліваючы ў слоік вады.— Асабліва да ландыша... Ды і то ж: райская яна кветка, гэты самы ландыш серабрысты!

Домакіраўнік нахіліўся над букетам і з асалодай пачаў удыхаць яго водар. Мне нечакана прыгадаліся словы паэта:

> Из-под куста мне ландыш серебристый
> Приветливо кивает головой...

— Між іншым, вы заўважылі, дзе ён звычайна расце, гэты самы ландыш? — гаварыў далей домакіраўнік.— У лесе. Ды не проста ў лесе, а дзе-небудзь пад кустом, каб цянёк быў, каб святла менш кідалася на яго. Другія кветкі да сонца цягнуцца, а ён, наадварот, хаваецца ад сонца. Дзіўна! І калі, скажам, высечы лес, дык ландыш на прасторы жыць не будзе — загіне. Чаму гэта?

Прыгадваючы небагатыя свае веды са школьнага курса батанікі, я пачаў блытана расказваць домакіраўніку пра звычкі ценелюбівых раслін, пра ўмовы іх жыцця, але ён, не даслухаўшы мяне, задуменна загаварыў зноў:

— Дзіўна ўсё пабудавана ў прыродзе... Вось і сярод людзей сустракаюцца такія ценялюбы, як вы кажаце. Жыве сабе чалавек у цяньку і — нічога, адчувае сябе як мае быць. Многія гады так можа пражыць — нічога з ім не здарыцца. А выцягнуць такога на святло, на сонца — і прапаў чалавек.

Відаць, домакіраўнік быў з тых людзей, якія любяць філасофстваваць абы з якога выпадку, але мне ў гэты момант было не да філасофіі, і я перавёў размову на кватэрныя справы.

Пра невядомую аматарку кветак Ніну Пятроўну я нічога больш не пачуў.

Пазней ужо, перавозячы на новае месца жыхарства нехітрыя свае халасцяцкія пажыткі, я выявіў яшчэ адну рэч, пакінутую мне маёй папярэдніцай: паштовую скрынку. Яна была прымацавана да ўваходных дзвярэй, на ёй навят вісеў невялічкі замочак, з якога тарчаў такі ж невялічкі ключык. Пасварыўшыся ў думках на Ніну Пятроўну за яе рассеянасць, я замкнуў скрынку, схаваў ключ

у кішэню, падумаўшы, што не выкідваць жа мне карыснай рэчы толькі таму, што яна трапіла да мяне не зусім звычайным шляхам.

Міналі дні. Я ўжо як след уладзіўся на кватэры, прызвычаіўся нават і да таго, што кожны раз, ідучы дамоў, прыходзілася адлічваць ажно сто сорак чатыры прыступкі, бо ліфт у нас не працаваў. Даўно завянулі ландышы, і як ні шкада было, а прыйшлося іх выкінуць. Цяпер ужо нішто ў кватэры не нагадвала мне пра маю невядомую папярэдніцу, бо другой яе рэччу, паштовай скрынкай, я не карыстаўся, маючы шматгадовую звычку атрымліваць карэспандэнцыю на паштамт. І я зусім забыў аб ёй.

Але неўзабаве яна сама напомніла аб сабе.

Неяк у нядзелю, калі я быў дома і, лежачы на канапе, чытаў апошні нумар «Огонька», нехта пастукаў у дзверы. Я пайшоў адчыняць. Гляджу — у калідоры стаіць высокая добра адзетая дзяўчына. На ёй было квяцістае крэпдэшынавае плацце, у руках яна трымала модную чырвоную сумачку. На яе бялюткім твары, які не ведаў ні вяснушак, ні маршчынак, падкрэслена вылучаліся тонкія чорныя бровы і ў меру поўныя ярка пафарбаваныя губы. Нос быў трошачкі задзёрты, але кірпатым яго нельга было назваць. Галаву дзяўчыны прыгожа абрамлялі пышныя валасы каштанавага колеру з залацістым адценнем. Шэра-блакітныя вочы яе глядзелі на мяне спакойна і паважна.

— Выбачайце...— сказала дзяўчына і какетліва дакранулася пальцам да шчакі.— Я тут жыла... Выбачайце, мне не было пісем за гэты час? На імя Ніны Закрэўскай.

Мне ні разу не прыходзіла ў галаву думка зірнуць у паштовую скрынку. Таму я нерашуча адказаў:

— Не ведаю... Зараз паглядзім.

Я настолькі разгубіўся, што забыўся запрасіць дзяўчыну ў пакой і, пакінуўшы яе ў калідоры, пабег шукаць ключа. Знайсці ключ доўга не ўдавалася, бо я забыўся, куды паклаў яго. Нарэшце я выбег у калідор і адамкнуў замок. Скрынка была пустая...

— Няма?..— спытала дзяўчына.

Мне зрабілася ніякавата, быццам гэта я быў вінаваты ў тым, што дзяўчына не можа атрымаць чаканага пісьма.

— Выбачайце яшчэ раз,— прамовіла Ніна Пятроўна.— Я зайшла выпадкова. Праездам я тут, перасадку раблю. Едзем з мужам на курорт. Чакаць поезда яшчэ

ажно дзве гадзіны, вось я і падумалася зірнуць у сваё старое гняздзечка.

— Заходзьце, заходзьце, калі ласка! — звярнуўся я да Ніны Пятроўны з запозненым запрашэннем.— Прашу!

— Дзякую вам.— Яна паглядзела на гадзіннік.— Але мне ўжо трэба спяшацца. Да пабачэння!

Прытрымліваючыся левай рукою за поручні лесвіцы, Ніна Пятроўна хутка пайшла ўніз. Вось яна мінула першы марш лесвіцы, потым другі — і постаць яе знікла з маіх вачэй. Толькі доўга яшчэ было чуваць пастукванне яе абцасікаў па прыступках. Але вось і гэты гук замёр недзе ў глыбіні лесвічнага пралёту. Я вярнуўся ў свой пакой. Акно было расчынена, я падышоў да яго і зірнуў уніз, на вуліцу. Ля пад'езда нашага дома стаяла таксі. Калі Ніна Пятроўна апынулася на тратуары, дзверцы таксі адчыніліся, і з машыны выйшаў малады, але ўжо даволі тоўсты мужчына ў дыхтоўным шэрым касцюме. Ён элегантна падаў руку Ніне Пятроўне, дапамог ёй увайсці ў машыну, потым сеў сам. Машына кранулася і паехала.

Я доўга глядзеў услед ёй. Розныя думкі, пытанні, здагадкі лезлі ў галаву. Шкада было Ніны Пятроўны, якая не змагла атрымаць чаканага пісьма, брала злосць на таго ці на тую, што павінны былі прыслаць яго, прыходзіла крыўда на сябе... а чаго — і сам не ведаў.

Увечары, калі я збіраўся пайсці ў тэатр, мне сустрэўся ў калідоры домакіраўнік.

— Бачылі вы сваю папярэдніцу?— спытаў ён. Голас яго здаўся мне чамусьці сумным.

Я адказаў, што бачыў.

— Шкада мне яе,— уздыхнуў домакіраўнік.— Гэта ж яна за Бразгаўку выскачыла.

— За Бразгаўку?— перапытаў я, сілячыся прыпомніць, дзе і з якога выпадку знаёма мне гэтае прозвішча.

— Ага, за Сцяпана Бразгаўку.

Тут я ўспомніў, што багата чуў пра гэтага Бразгаўку ад самых розных людзей, і ўсё, што гаварылася пра яго, выклікала толькі пачуццё прыкрасці.

— І дзе толькі вочы яе былі,— бедаваў домакіраўнік.— Гэта ж яна трэцяя ў яго ўжо, калі не чацвёртая. Вось тып дык тып! І чаго толькі ні нарабіў ён тут, у Саранску. А цяпер уцякае. Кажуць, некуды ў другі горад пераязджае.

Мне таксама стала сумна. Пачуццё нейкай нездаволенасці не пакідала мяне ўвесь вечар, перашкаджаючы ўспрымаць спектакль, і я пайшоў дадому, не даглядзеўшы п'есы.

Пасля таго я кожны дзень, ураннi і ўвечары, заглядваў у паштовую скрынку. Чаму я рабіў гэта?.. Не, не таму, напэўна, што спадзяваўся ўбачыць у скрынцы пісьмо,— проста ў мяне нечакана з'явілася такая патрэба, і з'явілася бадай-што падсвядома.

Скрынка па-ранейшаму была пустая...

Але аднаго разу, нешта праз месяц ці паўтара пасля таго, як прыходзіла Ніна Пятроўна, я і сапраўды знайшоў у скрынцы пісьмо. Так, яно было адрасавана ёй, маёй папярэдніцы па кватэры. Я ўзрадавана схапіў яго, але выцягваючы са скрынкі, знячэўку парваў канверт. Дома я паклаў пісьмо на стол, на самае віднае месца, каля чарнільнага прыбора. Робячы ўсё гэта, я, напэўна, меркаваў, што Ніна Пятроўна абавязкова зойдзе ці заедзе па яго.

Між тым ішлі дні, ужо і тыдзень мінуў, а яна не з'яўлялася. Я не ведаў, што мне рабіць з пісьмом. Калі б у мяне быў адрас Ніны Пятроўны — тады іншая рэч, а так дзе шукаць яе? У якім горадзе яна жыве, на які курорт паехала? Нічога гэтага мне не было вядома.

Можна было б наслаць пісьмо назад, таму, хто пісаў яго. Але, агледзеўшы канверт яшчэ раз, я са здзіўленнем выявіў, што тое месца, дзе павінна была быць назва горада, якраз мною і вырвана.

Пісьмо ўсё больш і больш непакоіла мяне. «Магчыма,— разважаў я,— у ім ёсць штосьці важнае для Ніны Пятроўны, а яно ляжыць на маім стале, і я нічога не магу зрабіць, каб яно дайшло па прызначэнню..» Між іншым, з таго дня, як пісьмо трапіла да мяне, у пакоі зноў з'явіўся тонкі, ледзь улоўны пах ландыша. Ён ішоў ад канверта. Было відавочна, што адпраўшчык пісьма ведаў густ свайго адрасата і надушыў пісьмо духамі з назвай цудоўнай лясной кветкі.

Пасля доўгага роздуму і зразумелых ваганняў я асмеліўся зірнуць у пісьмо. «Калі загінуў адрас на канверце,— разважаў я,— то, можа, ёсць ён у пісьме. Тады я здолею адправіць яго назад, зрабіўшы адпаведную прыпіску наконт таго, чаму так здарылася, што яно распячатанае».

Звычайна адрасы пішуць у канцы. Я і зірнуў на апошнюю старонку. Але ніякага адраса тут не было, стаяў толькі адзін подпіс, ды і той не вельмі разборчывы... І тады я ўсё ж паважыўся прачытаць пісьмо — «Можа, у ім я знайду адказ на тое, што мне рабіць з ім»,— стараўся я апраўдаць свой учынак.

Пісьмо было вялікае, ажно на дзесяці лістках. Почырк — буйны, размашысты, бясспрэчна мужчынскі... Змест пісьма нічым не дапамог мне ў пошуках адпраўшчыка і адрасата, затое ён пераканаў мяне ў другім: Ніна Пятроўна ніколі па яго не зойдзе. Тады яна чакала, відаць, нечага іншага.

Вось што было ў тым пісьме.

«Добрай раніцы, чароўная чарцёжніца з сонечнай усмешкай!

Я ведаю, што пісьмы на вашай вуліцы разносяць рана, таму і пішу — добрай раніцы!

А ў мяне цяпер ноч. Часу цяпер, напэўна, гадзіны дзве. Усе сціпыліся, пазасыпалі, а я прымасціўся на сваім тапчане, каб зручней было пісаць, і крэмзаю алоўкам паперу...

Вы, відаць, ужо і пасцеражыліся: пра якія гэта тапчаны ідзе гаворка?.. А пра самыя звычайныя, Ніна, пра тыя, што існуюць, напэўна, у кожным новым бараку, на кожным новым месцы. Ва ўсякім разе ў нашым бараку № 17 яны ёсць. Праўда, наш камендант Федзя Жывіца запэўнівае нас, што неўзабаве мы будзем спаць на самых сапраўдных нікеляваных ложках са спружыннымі матрацамі, але пакуль што пра такую раскошу мы можам толькі марыць.

Я ўяўляю сабе, як вы наморшчваеце лоб, чытаючы гэтыя радкі... Так, Ніна, я не ў Маскве. Я ў краі, дзе, як сведчыць казахская прыказка, і птушкі гнязда сабе не вілі, і суслікі нары не рабілі. Нічога і ніколі тут не было. А вось цяпер прыйшлі сюды мы. Прыйшлі — і гнёздаў навілі, і нор нарабілі.

Пішу я вам, як бачыце, зусім не адтуль, адкуль даклераваў напісаць, і зусім не тое, чаго вы чакалі. Але вы павінны дачытаць да канца. Мне неабходна выказацца, а вам трэба выслухаць мяне, чуеце?

Я пакахаў вас, мой Ландыш серабрысты, вы ведаеце гэта. Калі я сустрэў вас упершыню, я зазнаў дзіўнае пачуццё. Гэта было не здзіўленне, не захапленне, не тое, што завецца «як громам пабіты», мне здалося, што я ўжо бачыў вас некалі раней, што я даўно вас ведаю. У вас было штосьці роднае мне па духу. Вы былі для мяне нібыта адказам на заклік маёй душы, на адвечны, бессвядомы заклік да Надзеі, якую мы клічам праз усё жыццё. Ваша ўсмешка запальвала ў маіх вачах шалёную радасць, выклікала жаданне бегаць, скакаць, качацца па зямлі... Можа, мае пачуцці тады былі і не зусім гэткія, можа, я ўжываю цяпер не вельмі адпаведныя таму майму становішчу словы, але справа ў тым, што неўзабаве пасля нашай сустрэчы мне давялося прачытаць у аднаго французскага пісьменніка іменна гэтыя словы і мне тады здалося — вось яно, тое, што адчуваў і адчуваю я. Там, у кнізе, гэта было напісана ад трэцяй асобы, я перайначыў у думках усё на першую асобу і — запомніў station назаўсёды.

Я пакахаў вас. А вы тады часцей за ўсё праводзілі свой час не са мною, а з другім; я часта бачыў вас разам. Гэта ўяўлялася мне страшэннай несправядлівасцю, бо вы — і толькі вы — павінны былі быць адказам на заклік маёй — і толькі маёй — душы, на адвечны, бессвядомы заклік да Надзеі. З запалам, вартым самога Атэлы, я ўсклікнуў сабе: мой абавязак — заваяваць яе! Каб здзейсніць гэта, у мяне быў толькі адзін шлях: трэба было перамагчы таго, другога. Сілы нашы былі няроўныя. У яго арсенале — высокапастаўлены татуля, безліч кішанёвых грошай, уласная машына і самыя модныя макінтошы і гальштукі, у маім — студэнцкая стыпендыя, камунальны транспарт (часцей за ўсё трыццацікапеечны трамвай), далёка не першай свежасці касцюм і здубелы плашч, выгадны тым, што яго нават і пры жаданні цяжка было парваць. Так, сілы былі няроўныя. Але нездарма ж у маіх жылах, як запэўняе мая бабуля, цячэ кроў нашчадка Кастуся Каліноўскага! Я адважна рушыў у бой.

Незадоўга перад тым, як мы сустрэліся, я напісаў... літаратурны твор. Гэта было невялікае апавяданне, яно займала ў мяне каля дзесяці старонак, напісаных ад рукі, і называлася «Ландыш серабрысты». Я паслаў яго ў «Огонек», а перад гэтым чытаў сябрам, ім спадабалася, і я быў упэўнены, што яго надрукуюць.

Апавяданне і сапраўды надрукавалі. К таму часу ў мяне былі напісаны яшчэ два апавяданні, і я адразу ж таксама паслаў іх у рэдакцыю.

Вы памятаеце, вядома, той дзень, калі я спытаў у вас, ці чыталі вы апавяданне «Ландыш серабрысты», і вы адказалі, што чыталі і што яно спадабалася вам.

«Вось ён, першы прамень славы!» — узрушана сказаў я тады сам сабе.

— А вы заўважылі,— прамовілі вы,— што ў аўтара гэтага апавядання такое ж прозвішча, як і ў вас? Ён таксама Барыс Міхальчук.

— Я — гэта і ёсць той самы Барыс Міхальчук,— не стрымаўся я, каб не сазнацца.

— Вы?..— Позірк ваш слізгануў па маім плашчы, спыніўся на чаравіках.— Вы — пісьменнік?.. Не чакала...

«Цяпер,— разважаў я,— яна абавязкова павінна вылучыць мяне з усіх навакольных, аддаць мне перавагу над тым, другім. Нездарма ж хтосьці сказаў некалі, што жанчыны ацэньваюць нас у залежнасці ад заваяванай намі славы».

Першага ганарару хапіла не толькі на прыстойны касцюм, але і на неблагі капялюш. Каб набыць яшчэ і адпаведныя чаравікі, прыйшлося пазычыць грошай, але я пазычыў іх з лёгкім сэрцам: наступнага ганарару павінна было хапіць не толькі на доўг, але і на тое, каб прыдбаць яшчэ сёе-тое для свайго гарнітура.

Цэлы тыдзень я не вылазіў з бібліятэкі і ўсё пісаў, пісаў...

Гэта былі і шчаслівыя, і пакутлівыя дні.

Аднойчы вы літасціва падаравалі мне вечар. Я прапанаваў ахвяраваць гэты вечар мастацтву, і вы царственна дазволілі мне купіць білеты ў кіно. Мы былі ў зале ўдваіх, толькі ўдваіх, так здавалася мне. Я нікога больш не бачыў, я бачыў толькі адну вас. Кажуць, што цемра мае чарадзейную здольнасць зблізкаць людзей. Адчуць гэтую яе здольнасць мне ў той вечар не давялося. Нягледзячы на тое, што нас было ў зале толькі двое, мы знаходзіліся далёка адзін ад аднаго. Так, далёка: у простым сэнсе слова гэтая адлегласць вызначалася неадольнымі пятнаццаццю сантыметрамі, а ў пераносным — яшчэ больш неадольнымі сотнямі тысяч кіламетраў.

Калісьці мне давялося прачытаць у аднаго пісьменніка такія словы: «Ён узяў руку дзяўчыны ў сваю і пацала-

ваў; рука не тарганулася, толькі задрыжалі пальцы...». Я сто разоў уяўляў сабе, як зраблю гэта сам — вазьму вашу руку ў сваю і пацалую; ваша рука, напэўна, не тарганецца, толькі задрыжаць пальцы... Уяўляць гэта было лёгка, а здзейсніць — немагчыма.

Не, у той вечар цемра чамусьці не праявіла сваіх чарадзейных здольнасцей.

У сярэдзіне фільма я нечакана пачуў ваша пытанне:

— Вы напісалі што-небудзь яшчэ, акрамя таго вашага твора?

— Так, напісаў,— нерашуча адказаў я.— У мяне ёсць многа новых рэчаў.

— А дзе яны надрукаваны?

— Пакуль што нідзе. Але...

Да канца фільма мы прасядзелі моўчкі.

Развітваючыся з вамі каля вашага дома, я сказаў:

— Дазвольце спытаць... Калі я магу сустрэць вас яшчэ?

— Не ведаю,— адказалі вы.— Заўтра вяртаецца з камандзіроўкі Сцяпан...

Лепей бы не чуць мне гэтага імя!..

Між тым ішоў час, а апавяданні мае не паяўляліся ў часопісе. Я не мог чакаць,— перапісаў іх нанава і паслаў у другія рэдакцыі. А сам сеў за новыя творы. За які месяц я напісаў ажно тры апавяданні, прычым адно з іх можна было палічыць нават невялікай аповесцю. А тады, перадрукаваўшы ўсе свае рэчы на машынцы ў двух экземплярах, я прыйшоў да вас на пяты паверх і ўрачыста абвясціў:

— Бывайце, Ніна Пятроўна. Я атрымаў прызначэнне. Мяне пасылаюць настаўнічаць... Далёка адсюль, вельмі далёка. Але пакуль што я еду не туды. Я еду ў Маскву. З сталіцы я прывязу вам кнігу, на тытульным лісце якой будзе надрукавана: «Прысвячаецца Ніне Закрэўскай». Чакайце!

Гэта было парою, калі ўсё наўкол цвіце і спявае, калі ярчэй бліскаць сонца, гусцейшай робіцца сінь неба, калі з бліжэйшага саду пачынае раптам заводзіць сваю арыю непаўторны спявака майскай раніцы — салавей. Пад несціханую песню гэтага найвыдатнейшага з музыкаў я і крочыў на вакзал, шчаслівейшы ад усіх на свеце, бо на развітанне вы працягнулі мне руку, а я, паціснуўшы яе, раптам зрабіў неверагоднае: рашуча паднёс да

сваіх вуснаў і пацалаваў: рука не таргапулася, толькі здаецца, трошачкі задрыжалі пальцы...

Вам прыйшла дзіўная фантазія падараваць мне ў дарогу пачак папярос «Паўночная пальміра». Я і не ведаю ўжо, адкуль ён у вас узяўся. Ад яго ішоў тонкі прыемны водар, заглушаючы пах табакі. Гэта быў той самы водар, што адчуваў я і ў вашым пакоі — водар духоў «Ландыш серабрысты». Я асцярожна нёс папяросы ў кішэні, а ў вагоне, як толькі крануўся поезд, адкрыў пачак і... ледзьве не ўскрыкнуў, бо сустрэўся з вашымі вачыма. На адвароце фотакарткі я прачытаў: «А я еду з вамі!»

Так, вы ехалі са мною, мы былі разам у дарозе, я размаўляў з вамі, дзяліўся планамі, марамі, і вы ўважліва слухалі мяне, не перапыняючы. Вашы вочы пільна глядзелі ў мае, і мне здавалася, што я чытаю ў іх адказ на свой заклік да Надзеі. Мне было хораша ехаць з вамі, Ніна!

Але мы ехалі разам толькі да Масквы.

З Масквы я рушыў у новую дарогу, але ў той дарозе вас ужо не было са мною. Не, ваша фотакартка і цяпер у мяне, але сама вы ад мяне далёка. У той дзень, калі адзін страшэнна разумны і надзвычай прамы чалавек, імя якога з'яўляецца бясспрэчным аўтарытэтам у пытаннях літаратуры, ушчэнт раскрытыкаваў мае апавяданні за тое, што ў іх нічога не было ад жыцця, а ўсё ішло,— казаў ён,— ад літаратурнай схемы, што напісаны яны былі неахайна, у спешцы,— у той дзень я зразумеў, што прайграў бітву...

Не варта, відаць, расказваць пра тое, у якім стане я знаходзіўся пасля гутаркі з тым чалавекам...

Праз некалькі дзён поезд павёз мяне на ўсход, у край, дзе ні птушка гнязда сабе не віла, ні суслік нары сабе не рабіў,— дарэчы, іменна ад таго чалавека пачуў я ўпершыню гэтыя словы. «Вось дзе будзе для вас багатая школа жыцця,— сказаў ён мне.— А на мае жорсткія словы не крыўдуйце. Мне хочацца верыць, што яны пойдуць вам на карысць».

Трэба сказаць вам, што мая ўтрапёная натура за свой параўнаўча малы яшчэ век паспела ўведаць багата захапленняў і расчараванняў. У сёмым класе, чатырнаццацігадовым падлеткам, я быў фотакаралём і мне падуладны былі ўсе таямніцы светачуласці; мой «ФЭД» адбіў на плёнцы 426 кадраў тагачасся. Праз год яператварыўся

ў прэзідэнта радыёкарпарацыі «Сустрэнемся ў эфіры» і для мяне перасталі існаваць адлегласці і межы паміж дзяржавамі; з дапамогай уласнаручна пабудаванага кароткахвалевага апарата я пабываў у Чэхаславакіі і на Філіпінах, у Швецыі і Аргенціне, на Курыльскіх астравах і ў Балгарыі, дабраўся і да Рыо-дэ-Жанейра, куды не мог трапіць нават сам Астап Бэндэр. Дзевяты клас зрабіў мяне заўзятым філатэлістам, і ў маім альбоме з'явіліся імператары, цары, каралі, прынцы, герцагіні, славутыя палкаводцы, выдатныя дзяржаўныя дзеячы ўсіх часоў і народаў ад пары, калі была надрукавана першая паштовая марка, і да нашых дзён; не было ў маёй калекцыі, мабыць, адной толькі маркі з вострава Святога Маўрыкія, ды і то толькі таму, што іх у свой час выпусцілі ўсяго тры штукі і ніводная з іх не захавалася. Семнаццацігадовым юнаком я зрабіўся авіяканструктарам, і неба стала цалкам маім; змайстраваная мной мадэль самалёта «Лятаючае крыло» ўстанавіла сусветны рэкорд апаратаў гэтага тыпу. Былі і яшчэ захапленні, усіх не пералічыш. Ды ўсе яны адно за адным адыходзілі ў свой час у нябыт. Прыносілі паступова расчараванні і фотасправа, і радыёаматарства, і філатэлізм. Апошнім расчараваннем магло з'явіцца захапленне літаратурай. Але,— дзіўная рэч!— гэтага не здарылася, не! Той чалавек з імем сусветна вядомага дзеяча літаратуры меў рацыю: яго жорсткія, але справядлівыя словы пайшлі мне на карысць.

Але цяпер гаворка не пра гэта. Мне хочацца сказаць вам, Ніна, што з мяне атрымаўся, як сцвярджаюць мае новыя сябры, неблагі пастаўнік. Ва ўсякім разе запятак мой любы мне і ўсё мне тут люба. Адгэтуль, ідучы па жыцці, я магу адкрыта глядзець людзям у вочы. А якія тут цудоўныя людзі, Ніна!

Такім чынам, я не ў сталіцы, а ў краі, які завецца ва ўжытку цалінымі землямі. У нас тут раней нічога не было і пакуль што мала чаго ёсць, але пакрысе мы багацеем і багацеем (чуеце, ужо нават «Ландыш серабрысты» ўжываем!) і будзем усё багацець і багацець. Федзя Жывіца нават сцвярджае, што на адным заводзе пачалі ўжо вырабляць верталёты спецыяльна для нас і неўзабаве кожны будзе мець гэтую дзівосную машыну...

Вось, здаецца, і ўсё, аб чым мне хацелася расказаць вам, Ніна. Што дадаць яшчэ? Хіба вось што. Часта, як ня-

ма нікога побач, я вымаю з нагруднай кішэні вашу фотакартку і доўга і пільна гляджу на яе. Не адважваюся я толькі на тое, каб зірнуць на адваротны бок, туды, дзе, здаецца, было напісана: «А я еду з вамі...»

Вы ж не едзеце, Ніна, не?..»

На гэтым пісьмо канчалася.

Яно доўга ляжала ў мяне на стале. Ніхто па яго не заходзіў, ніхто не пытаўся...

Але здарылася так, што я яшчэ раз сустрэў Ніну Пятроўну. Гэта было праз некалькі месяцаў пасля нашай першай сустрэчы, халодным асеннім адвячоркам, у нашым жа горадзе.

Я ішоў з работы дадому, у свой пакой на пятым паверсе, які за гэты час дужа ўпадабаў. Кварталы за тры ад дома мне сустрэлася жанчына ў модным, але не па сезону лёгкім летнім паліто, і аднаго позірку на яе было дастаткова, каб пазнаць у ёй гераіню Міхальчуковага рамана. Я міжвольна прыпыніўся. Прыпынілася і яна. Нейкі момант мы моўчкі глядзелі адзін на аднаго, пасля амаль адначасова сказалі:

— Гэта вы? Добры дзень... добры вечар!

І зноў на нейкі момант настала маўчанне. Немаведама чаму я адчуваў сябе няёмка. Цяжка было зразумець, што адчувае Ніна Пятроўна,— яна глядзела на мяне спакойна, з нейкай абыякавасцю на твары. Але нельга было не заўважыць, што параўнаўча кароткі час, які прайшоў пасля нашай папярэдняй сустрэчы, паклаў на гэты твар даволі значны адбітак. Збляклі, нібы выцвілі, вочы, не ўзляталі ўжо ўгору, як даўней, вейкі, на левай шчацэ каля рота лягла ледзь прыкметная зморшчынка...

— А вы ўсё тут жывяце?— ціхім і нейкім прабачлівым тонам прамовіла Ніна Пятроўна. Размаўляючы, яна крыху прыўзнімала левае плячо, нібыта жадаючы адгарадзіцца ім ад субяседніка.

— Але, тут,— адказаў я.— А вы?

— А я ўсё там...— няпэўна сказала Ніна Пятроўна і, папярэджваючы магчымыя з майго боку роспыты, паспешліва дадала:— Я тут зноў праездам, як і ў мінулы раз... Ну, мне трэба спяшацца. Бывайце!

Яна працягнула мне сваю тонкую прыгожую руку. Паціскаючы яе, я адчуў, як здрыгануліся яе пальцы.

Прабачце мне, Барыс Міхальчук! Я не аддаў вашага пісьма Ніне Пятроўне, я нават не сказаў, што яно прыйшло...

Трапіўшы дадому і адмыкаючы ключом дзверы, я заўважыў у паштовай скрынцы нейкі часопіс. Гэта быў апошні нумар «Огонька». Разгарнуўшы яго, я звярнуў увагу на нарыс, які называўся «Мае сябры». Пад загалоўкам стаяла імя аўтара: Барыс Міхальчук...

Я доўга хадзіў з кута ў кут пакоя, думаючы аб лёсе двух людзей... Пасля позірк мой выпадкова трапіў на падаконнік. Я міжвольна прыпыніўся. На падаконніку стаяў слоік,— той самы, у якім былі некалі кветкі. Я выразна ўявіў сабе букецік духмянага ландыша... Не, цяпер яго не было там: ён завянуў, яго даўно выкінулі.

*1956*

# ГОСЦІ

Было дваццаць мінут на сёмую. Угледзеўшы гэта на вялікім насценным гадзінніку, Антаніна Арцёмаўна апусціла таўшчэзны том Рэмарка на калені і павярнула галаву да мужа.

— Тоня,— сказала яна,— можа варта ўжо збіраць на стол? Бо ўжо сёмая гадзіна. Скора госці прыйдуць.

— Зараз, зараз,— не адрываючыся ад сваёй кнігі, прамармытаў Антон Авяр'янавіч.— Яна так і не вернецца да яго? Га, Тонік?

— Хто — жонка Хасэ?

— Ну але.

— Знама дзела, не вернецца. Жанчыны не для таго пакідаюць мужоў, каб вяртацца назад.

— Ага, ага, я так і думаў, што яна пакіне Хасэ.

— Ты толькі дасюль дачытаў,— Антаніна Арцёмаўна адгартала ў сваім томе некалькі старонак назад.— У цябе семсот трыццаць дзевятая старонка? Ха, ты страшэнна адстаў, Тоня! У мяне дык ужо семсот пяцьдзесят трэцяя! І я ўжо ведаю, што ён зрабіў, гэты Хасэ.

— Маўчы!— сказаў Антон Авяр'янавіч.— Ах, якая нягодніца!

— А што ёй было рабіць? Ніводная жанчына не згадзілася б жыць з гэтым Хасэ.

Яны сядзелі ў гасцінай на канапе — Антаніна Арцёмаўна з аднаго краю, Антон Авер'янавіч з другога. І чыталі яны адно і тое ж — вялізную кнігу Рэмарка, у якой было аж тры яго раманы. За гэтай кнігай Антаніна Арцёмаўна і Антон Авяр'янавіч ганяліся па кнігарнях мо цэлы месяц, з таго самага дня, як рыжая Зюзю з суседняга пад'езда прыехала з Масквы і пахвалілася сваім на-

быткам. Нарэшце пазаўчора Антону Авяр'янавічу пашанцавала-такі натрапіць на кнігу ў магазіне, што на вуліцы Энгельса, насупраць Саюза пісьменнікаў. А як прыйшоў ён дадому, даведаўся, што гэтую кнігу купіла і жонка. Ён быў зусім разгубіўся. Але жонка сказала: «Дармо, лішняга Рэмарка ў нас з рукамі адарвуць. Нясі ў букіністычны, там уга колькі ахвотнікаў круціцца. Яшчэ і больш дадуць, чым ён каштуе». Аднак Антон Авяр'янавіч не захацеў расстацца са сваім набыткам, які дастаўся яму гэтак нялёгка. Так і сталі яны чытаць Рэмарка, кожны свайго.

Антон Авяр'янавіч і Антаніна Арцёмаўна жылі ў сваёй даволі прасторнай двухпакаёвай кватэры адны. Дзяцей з імі не было. Сын, як ажаніўся тры гады назад, толькі некалькі тыдняў пажыў з маладою жонкаю пры бацьках, а потым з'ехаў на прыватную кватэру. З таго часу ні ён, ні яго жонка не заходзяць да бацькоў. Летась пакінула бацькоўскі дом і дачка,— скончыўшы дзесяцігодку, яна падалася на будоўлю недзе ў Сібір. Зрэдку яна прысылае паштоўкі, дзе акрамя таго, што яна жывая і здаровая і жадае гэтага ж маме з татам, нічога больш не месціцца.

— Тоня, палова ўжо сёмай,— сказала Антаніна Арцёмаўна.— Ты чуеш?

— Чую, Тонік, чую,— паморшчыўшыся, сказаў Антон Авяр'янавіч.— Я зараз, зараз. Яшчэ хвіліначку. З ім нешта здарылася. У яго замкнуты дзверы з сярэдзіны.

— Ха, ты яшчэ не ведаеш, што з ім здарылася? Ён...

— Маўчы!— Антон Авяр'янавіч заткнуў пальцамі вушы.— Я сам, сам!

— Ён павесіўся!— нахіліўшыся да мужа, на ўвесь голас гукнула Антаніна Арцёмаўна.

— Не трэба, Тонік!— закрычаў тады і Антон Авяр'янавіч.— Ты ж ведаеш, я гэтага цярпець не магу! Зрэшты, я чалавек таксама пісьменны, я маю магчымасць прачытаць сам!

— Сам, сам...— перадражніла яго Антаніна Арцёмаўна.— Скора госці пачнуць збірацца, а ў нас на стале яшчэ нічога няма.

Антаніна Арцёмаўна пашукала вачыма, што можна было б скарыстаць па закладку для кнігі. Нічога такога не знайшоўшы, выняла з валасоў шпільку і сунула яе між старонак. Пакінуўшы кнігу на канапе, падалася на кухню.

Цяпер Антон Авяр'янавіч спакойна дачытаў раздзел. Потым хвілін колькі сядзеў аціхлы, ён нават прыжмурыў вочы, як бы аддаўшыся цалкам нейкім сваім думкам,— відаць, неспакойным, а мо нават і трывожным.

Сапраўды, думаць яму было аб чым. Што там ні кажы, а пяцьдзесят год — гэта табе не абы-што. А Антону Авяр'янавічу якраз пяцьдзесят сёння і споўнілася. І менавіта з гэтай прычыны запрошаны госці. Праўда, Антон Авяр'янавіч і Антаніна Арцёмаўна яшчэ некалькі дзён таму назад зусім не збіраліся запрашаць да сябе людзей, яны спадзяваліся, што ніхто гэтай падзеі і не заўважыць. Аж не. Зусім нечакана Антона Авяр'янавіча выклікалі ўчора ў заўком. Калі ён, устрывожаны, прыйшоў туды, старшыня — малады рухавы чалавек з усмешлівымі вачыма — імкліва падаўся яму насустрач і шумна павіншаваў Антона Авяр'янавіча з незабыўным, як ён сказаў, пяцідзесяцігоддзем. Пасля сказаў, што ўвесь калектыў завода вельмі добра ведае аб той дзейнасці, якой займаецца на прадпрыемстве галоўны бухгалтар. Яшчэ старшыня дадаў, што Антон Авяр'янавіч з'яўляецца прыкладам... Але якім менавіта прыкладам і для каго, Антон Авяр'янавіч так і не ўцяміў, бо настолькі быў расчуліўся, што нават слязу пусціў. Можа, праз гэта і не заўважыў іроніі, якая гучала ў словах старшыні.

— Мы вам і падаруначак нават падрыхтавалі, таварыш Казецкі,— сказаў пад канец старшыня заўкома.— Во, кішэнны прыёмнік на транзістарах, апошняя мадэль. Хацелі купіць кішэнны магнітафон, але не знайшлі. Кажуць, такіх яшчэ не робяць. А прыёмнічак — во! Сіла!

Вось так і сталася, што прыйшлося запрасіць гасцей і хочаш не хочаш адзначыць свой юбілей. «Нічога не папішаш,— сказаў Антон Авяр'янавіч жонцы.— Трэба, бо няёмка. Што людзі скажуць?» Сапраўды, за час работы на заводзе Казецкі з жонкаю багата пахадзілі ў госці — галоўнага бухгалтара часцяком запрашалі і на вяселлі, і на хрэсьбіны, і наогул мала якое свята Антон Авяр'янавіч і Антаніна Арцёмаўна сядзелі дома. Трэба і людзям плаціць такой жа гасціннасцю.

У Казецкіх мелася быць гасцей аж восем пар. Антон Авяр'янавіч сядзеў цяпер на канапе і думаў, ці дастаткова ён узяў піва, ці хопіць на ўсю гэтую хеўру тых пляшак, што стаяць пакуль што ў халадзільніку. «Калі будуць сядзець да ранія, то, вядома, не хопіць,— з тугою

надумаў Антон Авяр'янавіч.— Канечне, у такім разе не хопіць».

Антон Авяр'янавіч зусім спахмурнеў. Яму зрабілася вельмі маркотна. Але праз момант прыйшла новая думка, і яна адразу ўсцешыла яго. Ну вядома ж — жонка ніза-вошта не дасць гасцям заседжвацца. Так, так, яна не дасць ім заседжвацца. Яна абавязкова зробіць неяк так, што госці і не заўважаць, як апынуцца каля дзвярэй, дзе ім астанецца толькі адно — пачынаць апранацца.

Закусі пры такой сітуацыі, вядома, хопіць. Жонка добра набегала па магазінах. На стале будзе, як той казаў, і паранае, і варанае, і так кавалкамі.

Павесялелы, Антон Авяр'янавіч рашуча ўстаў з канапы і рассунуў стол. Потым прысунуў бліжэй да стала канапу, схадзіў у спальню і на кухню і прыцёг адтуль усё, на чым толькі можна было сесці,— крэслы, табурэткі, банкеткі. Агледзеў усё крытычным позіркам і вырашыў, што месца хопіць усім.

Тут Антаніна Арцёмаўна якраз і пачала насіць і стаўляць на стол свае прысмакі. У Антона Авяр'янавіча прыемна заказытала ў носе. Да таго прыемна, што ён нават чхнуў.

— На здароўечка!— сказаў ён сам сабе і старанна выцер нос і рот хусцінкаю.

— Навошта ты гэты белы абрус узяў? — жахнулася Антаніна Арцёмаўна.— Пазаліваюць жа так, што потым век не адмыеш. Засцялі лепш цырату.

— Што праўда, то праўда,— згадзіўся Антон Авяр'янавіч і ўзяў з шафы цырату.

— Першымі, вядома, прышкандыбаюць Мяцёлкіны,— сказала Антаніна Арцёмаўна, прымерваючыся, дзе б паставіць фаршыраваны перац.— От жа ж даў бог людзям прозвішча. Нібы ў ваду глядзеў. Ты заўважыў, як яны ядуць?

— Дома?

— Не, у гасцях. Колькі чаго ні пакладуць сабе ў талеркі, усё падмятуць, як мяцёлкай, нават яшчэ і скарынкай падбяруць, калі што якое дробнае на днечку астанецца. І толькі падахвочваюць адно аднаго: «Манечка, а ты вазьмі вунь тое», «Пецечка, а ты пакаштуй вось гэтага». Ажно прыкра глядзець.

— Што праўда, то праўда,— зноў згадзіўся Антон Авяр'янавіч.— Любяць людзі паесці на дармаўшчынку.

— Нябось, калі самі пазавуць у госці, дык сядзяць нібы на іголках і толькі тое і робяць, што зубы загаворваюць.

— Гэта яны ўмеюць.

— Вочы б мае на іх не глядзелі!— сказала Антаніна Арцёмаўна і бразнула талерку на сярэдзіну стала.— Цьфу!

— А сама ж і паважыла, каб іх запрасіць. Я ж казаў — не трэба зваць Мяцёлкіных.

— Паспрабуй не запрасі. Столькі потым гаворкі будзе, што на цэлы год хопіць слухаць. Усім чыста пратрубяць вушы — і такія, скажуць, Казецкія, і гэткія, і разгэткія.

— А што — можа і пратрубяць,— уздыхнуў Антон Авяр'янавіч.— Чаго яшчэ ад іх чакаць...

Калі жонка выйшла з пакоя, каб прынесці новыя прысмакі, Антон Авяр'янавіч узяў з этажэркі невялічкую беленькую пластмасавую скрыначку — гэта і быў кішэнны прыёмнік — і ў каторы раз пачаў разглядаць свой падарунак. Пакруціўшы ў руках, уключыў прыёмнік. З яго палілася ціхая сумная музыка. «Бач ты, тэхніка!— сказаў сабе ў думках Антон Авяр'янавіч.— Такая маленечкая штукенцыя, а вырабляе чортведама што! І адкуль толькі што бярэцца. Дзіва, дый годзе... А старшыня заўкома таксама харошы, каб яго паляруш!.. Падсунуў цацку і рад, што адчапіўся. Другім дык вунь тэлевізары даюць, або, напрыклад, залатыя гадзіннікі, ці дываны... Ну нічога, ты ў мяне яшчэ паскачаш, даражэнькі. Я на цябе столькі заявачак панапісваю, што табе і само тваё жыццё абрыдае. Пачакай, я яшчэ на свае ўласныя вочы пабачу, як цябе турнуць з завода. Ды так турнуць, што не толькі кішэннага прыёмніка, але нават і выходнай дапамогі не дадуць. І вельмі добра, што ты будзеш у мяне сёння госцем. Будзь пэўны, я табе паднясу чарачку. І не адну, і не дзве. Колькі возьмеш чарачак, столькі і атрымаеш заявачак. Вось так, шаноўны старшыня!»

Антон Авяр'янавіч глянуў на гадзіннік. Стрэлкі паказвалі без чвэрці сем. Гасцям было прызначана прыходзіць у восем. А што, як каторыя прыйдуць раней?

— Тонік!— гукнуў Антон Авяр'янавіч.— Ужо без чвэрці сем. Чуеш, Тонік?

— Чую, не глухая,— уваходзячы, прамовіла Антаніна Арцёмаўна.— Чым забаўляцца з гэтай цацкай, дык лепш памог бы стаўляць гэтыя праклятыя талеркі.

— Ат, яшчэ паб'ю каторую.

— Тады займіся бутэлькамі. Трэба ж адкаркаваць іх.

— О, гэта іншы інтэрас.— Антон Авяр'янавіч выключыў прыёмнік і паклаў яго на месца.— Тонік, а дзе наш штопар, ты не ведаеш?

— Недзе на кухні. Мабыць, у стале, у шуфлядцы.

На кухню яны падаліся разам.

— Вечна яго трэба шукаць, гэтага штопара,— бурчаў Антон Авяр'янавіч, корпаючыся ў шуфлядках стала.— Ніколі яго няма на сваім месцы.

— А дзе яно, тое месца? Штопар — гэта ж твая епархія. Дык і знайдзі сабе якое месца, ды і пільнуйся яго.

— Дапільнуешся тут...— са злосцю прамовіў Антон Авяр'янавіч і моцна бразнуў у шуфлядцы відэльцам.— Тут у цябе сам чорт ногі зломіць.

Антаніна Арцёмаўна ўзяла рукі ў бокі, прыжмурыла вочы і чамусьці шэптам працадзіла праз зубы:

— Так... Даўно не сварыліся, так? Знайшоў прычыну, так? Зноў захацелася кроў з мяне піць, так?

Антон Авяр'янавіч хацеў быў павярнуцца ад стала, каб належным чынам адказаць жонцы, але тут у рукі яму якраз трапіў злашчасны штопар. Нічога не сказаўшы, Антон Авяр'янавіч цішком пасунуўся з кухні ў пакой.

— Сам ты штопар, во ты хто!— крыкнула яму наўздагон Антаніна Арцёмаўна.

Антон Авяр'янавіч і на гэта нічога не адказаў. Прыйшоўшы ў гасцінную, ён стаў старанна адкаркоўваць бутэлькі.

Праз хвілін колькі сюды прытэпала і Антаніна Арцёмаўна і, як нічога і не было, спытала:

— Тоня, а Савіцкія абавязкова прыйдуць? Ты добра іх папрасіў?

— Прыбягуць, не тое што прыйдуць. Яны ж толькі таго і чакаюць, каб іх хто запрасіў. От жа любяць хадзіць па чужых хатах.

— Хіба гэта любяць адны толькі Савіцкія?

— Ёсць, канечне, і другія... Тонік, ты бачыш? Сем гадзін.

— Бачу, не сляпая.

— І раптам Рагулін са сваёй Рагуляй прыпрэцца раней?

— Дык памагай, чаго ж ты стаў слупам.

Яны зноў падаліся на кухню. Антон Авяр'янавіч узяў чарачкі на тонкіх высокіх ножках, а Антаніна Арцёмаўна фужэры. У гасцінай Антаніна Арцёмаўна загадкава ўсміхнулася.

— А Наўроцкім фужэраў не хопіць, бо ў нас жа іх толькі, сам ведаеш, колькі.

— Чаму менавіта Наўроцкім не хопіць?— насцярожыўся Антон Авяр'янавіч.

— А я іх во сюды пасаджу. І настаўлю перад імі шклянкі.

— То чаму ж якраз ім шклянкі?

— Быццам сам не ведаеш! — злосным голасам, але па-ранейшаму ўсміхаючыся, прамовіла Антаніна Арцёмаўна.— А помніш, як мы аднойчы былі ў іх на Восьмага сакавіка? Што яны нам паставілі, помніш? Самыя звычайныя шклянкі, гранёныя. Помніш?

— Што ўсім было, тое і нам. Бо ў іх, відаць, нават і няма фужэраў.

— Дзеля нас маглі б купіць.

Падумаўшы, Антон Авяр'янавіч сказаў:

— Але, маглі б і купіць.

— Няхай яшчэ дзякуй скажуць, што я ім не гранёныя стаўлю, а з тонкага шкла.

— Праўда, маглі б дзеля нас купіць,— задуменна паўтарыў Антон Авяр'янавіч.— Бо мы ж не нейкія там Каралёвы... Дарэчы, а дзе ты збіраешся пасадзіць Каралёвых?

— А во тутака, з левага боку. А побач з імі — Сцяпанавых. Яны ж, і тыя і гэтыя, цярпець не могуць адны другіх. То і няхай пасядзяць поплеч, няхай папсуюць сабе нервы.

— Во камедыя будзе дык камедыя,— зарагатаў Антон Авяр'янавіч.— Гэта ты здорава, Тонік, прыдумала!

Антаніна Арцёмаўна, радая, таксама зарагатала. Яна зноў схадзіла на кухню, прынесла на стол яшчэ сёе-тое. Агледзела стол і сказала:

— А тут, пасля Сцяпанавых, ведаеш, каго я пасаджу?

— Ну? — аж загарэўся Антон Авяр'янавіч.

— Гарэліка з Гарэлічыхай.

— На самы рог? Каб у іх сем гадоў было без узаемнасці? — зноў зайшоўся ад рогату Антон Авяр'янавіч.

— А то толькі і чуеш ад людзей: «Ах, як яны кахаюць адно аднаго! Ах, які цудоўны муж у Гарэлічыхі! Ах, якая слаўная жонка ў Гарэліка!» Цьфу! Вушы б мае не слухалі!

— То, можа, яны і напраўдзе кахаюцца?
— Ха, ведаю я гэтае каханне!
— Скуль ты ведаеш?
— Калі гавару, дык ведаю. Не могуць яны кахацца.
— Але чаму ж не могуць?
— А таму, што не могуць. Усё гэтае іхняе так званае каханне — адна паказуха. Разлічана на дурняў. От дурні і вераць ім, і прымаюць усё за чыстую манету. Не, мяне на мякіне не ашукаеш. Я стрэляны верабей. Я такіх гарэлікаў навылёт бачу.

Антон Авяр'янавіч намерыўся нешта сказаць, мабыць, збіраўся запярэчыць, але Антаніна Арцёмаўна і рота не дала разявіць.

— І не трэба мне пярэчыць, калі ласка, не трэба! Бо я ж даўно ведаю, што ты і сам закаханы ў гэтую Гарэлічыху. Аж да самых вушэй закаханы. І каб хоць было там што якое, а то і глядзець няма на што.

— Ат! — толькі і сказаў Антон Авяр'янавіч і ступіў да этажэркі, каб уключыць кішэнны прыёмнік.

— Не руш! — выгукнула Антаніна Арцёмаўна.— Вово госці прыйдуць, а ён чортведама чым займаецца. Чуеш, не руш! Табе нешта сёння во як хочацца пасварыцца са мною.

— Як я пагляджу, дык гэтага якраз табе і хочацца. Але ты дарэмна стараешся, нічога ў цябе не выйдзе. Бо ў мяне няма ніякай ахвоты псаваць сабе настрой перад добрай чаркай. Кажы лепш, што яшчэ трэба прынесці?

— Нажы і відэльцы. Яны ў правай шуфлядзе.

Без чвэрці восем усё да прыёму гасцей было нарэшце гатова. Антаніна Арцёмаўна астатні раз агледзела стол і, уздыхнуўшы, стомлена апусцілася на канапу. Антон Авяр'янавіч таксама сеў, толькі з другога краю канапы. Зірнуў на свайго Рэмарка, пацягнуўся ўжо, каб узяць яго, але перадумаў і не ўзяў.

Хвіліну ці дзве яны абое маўчалі.

Цікаў і цікаў на сцяне гадзіннік.

— А даўнавата не было ў нас гасцей,— чамусьці ціха, ледзь не шэптам, прамовіла Антаніна Арцёмаўна.— Тоня, ты не помніш, калі гэта апошнім разам былі ў нас госці? Я нешта ніяк не ўспомню.

— У адна тысяча дзевяцьсот сорак дзевятым годзе, дваццаць першага снежня,— з бухгалтарскай дакладна-

сцю адказаў Антон Авяр'янавіч.— Калі было сямідзесяцігоддзе Сталіна, во калі.

— Ага, праўда, праўда! — пажвавела Антаніна Арцёмаўна.— Божа ж мой, якое свята было, якая ўрачыстасць. А колькі тостаў гаварылі. Можа, сто тостаў, не менш. А найбольш ты гаварыў. Праўда, праўда.

Антон Авяр'янавіч паморшчыўся, нібы хапіў у рот лыжку гарчыцы і, каб перапыніць жонку, выдыхнуў:

— Без пяці восем!

— Зараз пачнуць званіць. Я сама пайду адчыняць дзверы. А ты сустракай тут.

Антаніна Арцёмаўна перачакала хвіліну, ўслухоўваючыся.

— Цішэй, нехта, здаецца, ужо шкандыбае,— прашаптала яна. Пасля зноў паслухала і загаварыла ўжо больш гучна: — Не, гэта на пяты паверх. Мусіць, нехта да Верачкі. Кожны дзень у яе новы кавалер.

— Быццам ты бачыла тых яе кавалераў.

— Калі і не бачыла, дык усё роўна ведаю,— сказала, бы адрэзала, Антаніна Арцёмаўна.

Антон Авяр'янавіч з нейкім страхам зірнуў на гадзіннік.

— Восем...

Яны сцішыліся. Зноў колькі хвілін сядзелі маўклівыя, насцярожаныя. Але з лесвічнай пляцоўкі не даносілася ні гуку.

Антаніна Арцёмаўна не вытрымала гэтай маўклівасці і гучна, залішне бадзёрым голасам, нібы падбадзёрваючы сама сябе, прамовіла:

— А Мяцёлкіны, відаць, не прыйдуць першыя.

— Напэўна. І скуль гэта ты ўзяла, што яны павінны прыйсці першыя?

— А помніш, як мы хадзілі летась па Новы год да Савіцкіх? Помніш? Прыйшлі, а Мяцёлкіны ўжо там. А мне ж так хацелася павіншаваць Савічыху раней за ўсіх. Яны ж тады толькі што атрымалі павышэнне.

— Але, Савіцкаму пашанцавала. Такі малады, а ўжо галоўны механік.

— Савічыха, дык тая цяпер проста ног пад сабою не чуе. А нос задзірае, проста глядзець прыкра.

— Дык і не глядзі.

Антаніна Арцёмаўна паднялася была з канапы, але ізноў села на сваё месца. Узяла Рэмарка, машынальна

пагартала яго, потым палажыла назад. Узяў быў свайго Рэмарка і Антон Авяр'янавіч. Але і яму не чыталася, і ён таксама палажыў кнігу.

А палове дзевятай твар у Антаніны Арцёмаўны паблякнеў, а лоб перарэзала ўпоперак глыбокая маршчына. Жанчына глядзела ў адну кропку перад сабою,— там, на супрацьлеглай сцяне, вісеў зімовы пейзаж, і Антаніна Арцёмаўна раптам падумала, што яна бачыць яго тут быццам упершыню, бо раней гэта быў для яе не пейзаж, а проста прыгожая залатая рамка, якая вельмі ўдала стасавалася да салатавага колеру сцен пакоя. А Антон Авяр'янавіч стомлена заплюшчыў вочы і паспрабаваў уявіць за сталом усіх тых, хто меўся прыйсці сёння ў госці. Атрымалася нешта вельмі дзіўнае: усе былі чамусьці скрозь апрануты ў адполькавыя чорныя гарнітуры, усе мелі адзін твар — твар старшыні заўкома, і ўсе пазіралі на Антона Авяр'янавіча з нейкім незразумелым усмешлівым дакорам.

Ні Антаніна Арцёмаўна, ні Антон Авяр'янавіч не гаварылі больш ні слова і нават не пазіралі адно на аднаго. Аднак ні яна, ні ён усё яшчэ не верылі — не хацелі верыць! — у тое, што званок над дзвярыма гэтым вечарам так і не зазвоніць.

Пачалі разумець гэта яны толькі ў дзевяць гадзін. А ў дзесяць канчаткова пераканаліся: ніякіх гасцей сёння не будзе.

Па вуліцы праехала грузавая машына. На стале тоненька зазвінелі фужэры. Пазвінелі і аціхлі. У кватэры ўсталявалася важкая, бы магільная, цішыня.

*1963*

# АПОШНІ ВАГОН

Канстанцін Пятровіч прыйшоў у купэ перад самым тым, як рушыць поезду. Усе пасажыры былі ўжо на месцы. Поезд нібыта толькі і чакаў Канстанціна Пятровіча,— вагон адразу ж крануўся, і ў акне багажная каса павольна паплыла ўлева.

— Добры дзень,— сказаў Канстанцін Пятровіч і паставіў свой чамаданчык на ніжнюю лаўку, з правага боку ад дзвярэй.

— Прывітанне! — бойка адказаў яму за ўсіх малады кучаравы хлопец у шэрым світэры. Ён сядзеў насупраць, каля самых дзвярэй.

Астатнія моўчкі кіўнулі галовамі.

Гэтымі астатнімі былі пажылы лысаваты падпалкоўнік і жанчына ў строгім цёмна-сінім касцюме. Падпалкоўнік нечага поркаўся ў сваім чамадане, які ляжаў на верхняй паліцы. Жанчына сядзела ля століка і задуменна глядзела ў акно.

— Не пашанцавала нам,— панура сказаў падпалкоўнік.

— Чаму? — азваўся кучаравы хлопец.

— Апошні вагон. Матляць будзе.

— Нічога, выхад ёсць.

— Які?

— Можна прабавіць час у рэстаране. Ён у сярэдзіне састава.

— Ваша праўда,— пажвавеў падпалкоўнік.— То, можа, адразу і рушым?

— А чаму б і не?

Яны падаліся з купэ.

Цямнела. Але святло чамусьці яшчэ не запальвалася.

Канстанцін Пятровіч зняў макінтош, паклаў яго на чамаданчык і прысеў на сваю лаўку ля акна, насупраць жанчыны. Яна павярнула галаву і зірнула на яго.

І тады Канстанцін Пятровіч адразу пазнаў яе. Нейкі час ён адно ўзіраўся ў яе вочы, адчуваючы, як моцна закалацілася раптам сэрца. Яна таксама глядзела яму ў вочы, і вейкі яе ледзь прыкметна затрымцелі,— тыя самыя даўгія чорныя вейкі.

Так, гэта была яна. Сумнявацца не прыходзілася.

— Добры дзень, Шура...— ціха сказаў Канстанцін Пятровіч.

— Добры дзень, Косця...— гэтак жа ціха адказала жанчына.

Яны ўсё яшчэ глядзелі адно аднаму ў вочы. Абое былі бледныя, усхваляваныя і збянтэжаныя.

Як жа яна змянілася, як змянілася!.. Але ж і не дзіва — гэта ж уга колькі год мінула!..

— Гара з гарою...— сумна прамовіў Канстанцін Пятровіч.

— Як бачыце...— праз сілу ўсміхнулася жанчына...— Людзі ўрэшце ўсё ж такі сыходзяцца.

Вагон пагойдваўся, у адчыненае акно далятаў перастук колаў на стыках рэек. Гэты перастук здаваўся нясцерпна моцным, аглушальным. Канстанцін Пятровіч устаў і апусціў фрамугу акна. Потым зноў сеў на ранейшае месца.

Невядома было, куды дзець рукі. На маленькім століку з зялёным бліскучым верхам яны здаваліся занадта вялікімі і вельмі белымі, бы ў мерцвяка. Канстанцін Пятровіч паспешліва палез у кішэню, шукаючы папяросы. Але папярос не аказалася. Ён успомніў, што ўжо месяц як кінуў курыць. «Не ў час кінуў, не ў час!» — нездаволена ўпікнуў ён сябе.

Рукі ўдалося схаваць пад столікам. Там якраз вельмі дарэчы стаяла складная лесвічка.

— Вы ў Маскву? — спытаў Канстанцін Пятровіч. Ён ніяк не мог успомніць яе імя па бацьку. А называць яе тым, ранейшым імем — Шура — было ўжо немагчыма. Яно вырвалася ў яго, калі ён толькі ўбачыў яе, але цяпер сказаць так ужо не мог.

— У Маскву, Канстанцін Пятровіч. А вы?

Дапраўды, як жа яе зваць па бацьку?.. «Шура, Шурачка, як вас цяпер зваць?..»

А яна, аказваецца, ведае. Яна адразу ўспомніла.

— Не, я не ў Маскву,— няпэўна сказаў Канстанцін Пятровіч.

— Камандзіроўка ў мяне толькі на тры дні. Шкада, мала дзе прыйдзецца пабываць.

«Няўжо яна жыве ў Мінску? — падумаў Канстанцін Пятровіч.— Чаму я ніколі не бачыў яе за ўсе гэтыя гады? Чаму ні разу не сустрэў?»

Яна машынальным рухам левай рукі паправіла прычоску, хоць тая і без гэтага была ў поўным парадку.

— Я пастарэла, праўда?

Ён адказаў не адразу.

— Крышачку.

Яна рассмяялася.

— Нічога сабе — крышачку. За чвэрць стагоддзя — і толькі крышачку?

— Няўжо мінула дваццаць пяць год?..— жахнуўся Канстанцін Пятровіч.

— Амаль што. Дваццаць чатыры.

Яна ўсё помніла. А от ён, хоць забі, не можа прыгадаць яе імя па бацьку. Гэта тым больш дзіўна, што ўвесь час, доўгія гады ён з упартасцю фанатыка штогод адзначаў дзень 19 чэрвеня. Гэта быў дзень яе нараджэння. І дзень іхняга знаёмства. Іменна 19 чэрвеня ў той далёкі цяпер год здзеялася тое, што пакінула ў яго душы след на ўсё жыццё. Запрошаны разам з адным сваім сябрам на Шурын дзень нараджэння, ён жартам купіў ёй тады ў падарунак невялікую гумавую матрошку. Шура сказала, што ёй матрошка вельмі спадабалася. На другі дзень ён пайшоў у той магазін, дзе прадаваліся матрошкі. Цяпер і яму здаліся яны вельмі арыгінальнымі і сімпатычнымі. Ён доўга любаваўся імі і нарэшце купіў яшчэ адну. А вечарам цэлую гадзіну шпацыраваў каля тэлефоннай будкі, збіраючыся пазваніць Шуры. Мо дзесяць разоў здымаў тэлефонную трубку і кожны раз вешаў яе назад. Тады сказаў сабе, што пазвоніць заўтра. А назаўтра было тое самае. І паслязаўтра таксама. Доўга, надта доўга збіраўся пазваніць ён, настолькі доўга, што калі смеласць нарэшце ўсё ж прыйшла, стала ясна: цяпер званіць проста няёмка. Смеласць, аказваецца, прыйшла роўна праз год, таксама 19 чэрвеня. Ён падумаў тады, што мо нада рыцца цуд, і Канстанціна запросяць на гэты дзень яшчэ раз. Ды цуд не адбыўся...

У купэ нарэшце запалілася святло — сіняе зверху і яшчэ лямпа на століку. Настольная лямпа гарэла вельмі ярка, і Канстанцін Пятровіч выключыў яе.

— Ведаеце, што мне сказаў пядаўна адзін мой саслужывец? Аляксандра Сцяпанаўна, кажа, у вас надзвычай маладыя валасы.— І яна горка ўсміхнулася.

Дык вось як: яна — Сцяпанаўна. І не Шура, а Аляксандра. Яна сама прыйшла яму на дапамогу.

І тут ён зразумеў: ён не мог успомніць яе імя па бацьку таму, што і не ведаў яго. Яна была для яго проста Шурай. Заўсёды толькі Шурай.

Так, яна пастарэла з тае пары. І ўсё ж яшчэ добра выглядае. І па-ранейшаму прыгожая. Прыгожая той сталай, спакойнай прыгажосцю пажылых жанчын, якая заўсёды выклікае захапленне і нават замілаванне.

На яе можна глядзець і глядзець. І згадваць у цяперашняй Аляксандры Сцяпанаўне ранейшую Шуру.

— Гэты ваш саслужывец не вельмі дасціпны чалавек,— сказаў Канстанцін Пятровіч.

— Наадварот, ён меў рацыю. У адрозненне ад душы, валасы ў мяне чамусьці зусім не сівеюць. А наогул, Канстанцін Пятровіч, я ўжо бабуля.

— Бабуля? — здзівіўся ён.

— Але. А вы, канечне, дзядуля, так?

— Амаль што...— зноў неяк няпэўна адказаў Канстанцін Пятровіч. Пасля, спяшаючыся, дадаў: — У мяне двое дзяцей. Сын і дачка. Абое ўжо дарослыя. Так, ужо дарослыя.

Аляксандра Сцяпанаўна пільна паглядзела на яго сваімі цёмнымі дапытлівымі вачыма. Шырокія бровы прыўзняліся, а вейкі ледзь прыкметна ўздрыгнулі.

— І мае дарослыя. І ў мяне, уявіце сабе, таксама двое. Таксама сын і дачка. Сын ужо ажаніўся. Лётаць. А дачка яшчэ з намі жыве. Са мною і мужам.

Потым яны доўга маўчалі. Здаецца, залішне доўга. Але ён аніяк не мог знайсці тэму для далейшай гаворкі. А яна чамусьці не хацела дапамагчы яму ў гэтым. А мо не магла?

Яна сядзела насупраць нейкая вельмі падцягнутая, сабраная і нібы нават насцярожаная. Вочы яе яшчэ больш пацямнелі і задуменна глядзелі некуды ў куток купэ.

— Вы шчаслівая? — ціха спытаў Канстанцін Пятровіч.

Яна ўсё яшчэ глядзела некуды ў ранейшым кірунку, і невядома было, пачула яна яго пытанне ці не.

Нарэшце яна прамовіла:

— Той самы мой саслужывец сказаў аднойчы так: а і добра ж, кажа, зімою на марозіку пілаваць з жонкаю дровы! Па-мойму, кажа, гэта і ёсць тое, што людзі называюць шчасцем.

— Тады дазвольце запытаць яшчэ...

— Ці пілавала я на марозіку дровы? — Яна засмяялася.— Але справа ў тым, што я жыву ў доме з цэнтральным ацяпленнем і з газавай плітою.

Унізе, пад падлогаю, пачуўся глухі шум тармазоў. Поезд пачаў прыцішваць свой імклівы бег. У акне замільгалі агеньчыкі прыстанцыйных будынкаў.

— На жаль, мне ўжо трэба выходзіць,— сказаў Канстанцін Пятровіч.— Я прыехаў. Трэба выходзіць.

— Выходзіць? — перапытала Аляксандра Сцяпанаўна.

— Так. Я прыехаў.

— Вы і напраўдзе не да Масквы?

— Не да Масквы.

— А я думала, вы таксама да Масквы.

Поезд спыніўся, а Канстанцін Пятровіч усё яшчэ сядзеў на сваім месцы.

— Не, я не да Масквы. Мне трэба тут выходзіць.

Ён разгублена зірнуў на Аляксандру Сцяпанаўну, потым на акно, пасля зноў на Аляксандру Сцяпанаўну.

— Поезд тут доўга стаіць? — невядома для чаго спытала яна.

— Не ведаю.

— Мусіць, скора пойдзе.

— Напэўна.

Канстанцін Пятровіч узяў сваё паліто, але не стаў надзяваць яго, а проста перакінуў цераз руку. А сам усё яшчэ не падымаўся.

— Бывайце, Шура,— сказаў ён.

— Бывайце, Косця,— бы аўтамат, сказала яна.

Ён пасядзеў яшчэ крыху.

— Гара з гарою...

— Канечне...

Нарэшце ён устаў з лавы і, нахіліўшыся ўсім тулавам наперад, нібы адольваючы моцны сустрэчны вецер, рушыў з купэ. Глуха бразнула за ім зашчапка ў дзвярах.

Аляксандра Сцяпанаўна нейкую хвіліну пільна глядзела на дзверы, бы ўсё яшчэ не верыла, што яны зачыніліся і болей не адчыняцца.

Яны не адчыніліся.

Тады Аляксандра Сцяпанаўна машынальна ўзяла сваю сумачку і пачала нешта шукаць у ёй. Знайшоўшы, не адразу зірнула на тое, што трымала ў руцэ. А калі зірнула,— здрыганулася. У руцэ пасміхалася дурасліваю ўсмешкаю маленькая гумавая матрошка.

Аляксандра Сцяпанаўна доўга ўзіралася ў гэтую матрошку, нібы стараючыся ў яе ўсмешцы знайсці адказ на нейкае вельмі важнае сваё пытанне. Пасля сціснула матрошку і заплакала.

Вось і ўсё, і скончылася тое, што гэтак нечакана ўварвалася раптам у яе памяць, уварвалася і ўзняло столькі ўспамінаў, думак і трывогі!.. Нічога не засталося, усё знікла.

Зрэшты, нічога і не было,— ні цяпер, ні тады. Гэта яна ўсё панавыдумляла сабе. І самога Косцю выдумала, і яго каханне. А ў сапраўднасці нічога гэтага не было.

І не трэба было хлусіць. Не трэба было несці тую неймаверную лухту пра сям'ю. Ніякае сям'і ў яе няма. Ні сям'і, ні дзяцей, ні мужа. Ніколі не было. Ёй здавалася, што яе мужам мог стаць толькі адзін чалавек. А ён, аказваецца, не мог стаць, бо яна яго цалкам прыдумала. Не, не прыдумала, а ён прысніўся ёй. Прыйшоў некалі ў сне, падарыў смешную гумавую матрошку і знік. Яна чакала, што ён прыйдзе яшчэ. А ён болей не прыходзіў. Трэба было, мабыць, паклікаць яго. Напэўна, трэба было. А яна ўсё чакала, што ён прыйдзе сам...

Поезд яшчэ стаяў на станцыі. Відаць, станцыя была невялікая, бо за акном панавала цішыня.

З калідора нехта ўзяўся за ручку дзвярэй. Аляксандра Сцяпанаўна замерла. Потым дзверы шумна адчыніліся. А, гэта вярнуліся падпалкоўнік і малады чалавек у шэрым світэры. Аляксандра Сцяпанаўна паспешліва схавала матрошку.

— Вы нешта ў адзіноце? — спытаў падпалкоўнік.— А дзе наш спадарожнік?

Аляксандра Сцяпанаўна нічога не адказала. Яна старалася ўзяць сябе ў рукі.

— Праўда, куды гэта ён дзеўся? — прамовіў малады чалавек.

— А яго і не было. Гэта я яго выдумала.

— Што вы сказалі? — не зразумеў малады чалавек.

Аляксандра Сцяпанаўна першая засмяялася.

— Не, нічога, я пажартавала. Ён знік. Прыйшоў быў і пайшоў. Праўда, ён мог застацца, трэба было толькі паклікаць яго. Але ніхто не паклікаў.

Малады чалавек зноў, відаць, нічога не зразумеў і здзіўлена паглядзеў на падпалкоўніка. Той паціснуў плячыма.

Вагон здрыгануўся, і ў акне зноў паплылі агеньчыкі. Поезд пашыбаваў далей.

А на станцыі стаяў і глядзеў яму ўслед Канстанцін Пятровіч. Станцыя была і сапраўды невялікая, і Канстанцін Пятровіч аказаўся адзіным пасажырам, які сышоў тут з поезда.

Канстанцін Пятровіч доўга стаяў на пероне, аж пакуль зусім не расталі ў цемры чырвоныя агеньчыкі апошняга вагона.

Праз паўгадзіны ён прыйшоў дадому. Яго домам быў маленькі халасцяцкі пакойчык пры школе, у якой ён настаўнічаў. Не запальваючы святла і не распранаючыся, Канстанцін Пятровіч прысеў да стала, паклаў на яго рукі і апусціў галаву.

Але праз момант ён падхапіўся. Яму здалося, што з цемры нехта пільна глядзіць на яго. Ён пастаяў хвіліну, працёр вочы далонямі, потым падышоў да этажэркі. На верхняй яе паліцы рука намацала штосьці маленькае, гладкае і падатлівае. Здагадаўся: гэта гумавая матрошка.

Некалі матрошка здавалася сімпатычнай і пацешнай. У яе была такая дураслівая ўсмешка. А цяпер? Якая яна цяпер?

Было цёмна, і разгледзець нічога не ўдавалася.

*1962*

# БУДЗЬЦЕ ЗНАЁМЫ

Бралася на вечар. Сонца сплыло за небасхіл, і цяпер было не так горача, як удзень. На лавачцы, каля невялікай будыніны, што прымасцілася ледзь не поруч з пуцямі, сядзела некалькі аглядчыкаў вагонаў. Толькі што адышоў таварны поезд на Мінск: наступны будзе пасажырскі ў напрамку Масквы, але да яго прыходу яшчэ багата часу. Маючы вольную хвіліну, аглядчыкі ўшчалі гамонку — хто пра што.

Потым размова набыла больш канкрэтны характар. У цэнтры ўвагі апынуўся пралазчык Валеры Качан, малады чалавек гадоў на дваццаць тры. У яго адрас паляцелі вясёлыя і даволі ўедлівыя жарты. Разумеючы, напэўна, што адказваць хлопцам бескарысна, бо гэтым толькі яшчэ больш падліеш масла ў агонь, Качан сядзеў моўчкі і рабіў выгляд, што ўважліва чытае «Правілы тэхнічнай эксплуатацыі чыгунак».

— Што там ні кажы, а Качану я не зайздрошчу,— сказаў слесар-аўтаматчык Шыбека, невысокі чарнявы хлопец у зашмальцаванай фуражцы з адарваным казырком.— Закахацца ў дзяўчыну, якая бывае ў Заранску толькі праездам, два разы на тыдзень, ды яшчэ ўсяго на сорак мінут — гэта, браткі мае, не вельмі салодкая жытуха.

— З пункту гледжання ўсіх пунктаў гледжання,— глыбакадумна ўставіў аглядчык Малашэнка, хударлявы юнак з доўгімі пальцамі музыканта,— хоць Валеры наш і спрытны на ўсялякія вынаходствы, на гэты раз ён зрабіў як самы апошні нецямлівец.

На Заранскім пункце агляду вагонаў здаўна павялося, што калі ўжо нападуць на чалавека, дык адчэпяцца не

хутка. Дзень дзяўбаць будуць, два дні, ды і на трэці яшчэ застанецца. Называлася гэта тут «прышабрываннем». Валерыя Качана «прышабрывалі» ўжо другі дзень,— гэта было відаць па выразу яго твару. Звычайна ў першы дзень чалавек, што трапляў у такую аперацыю, рабіўся чырвоны як рак, на другі бляднеў, а на трэці чарнеў. Па выразу твару Качана можна было беспамылкова вызначыць, што ён знаходзіцца недзе пасярэдзіне сваіх пакут.

Здавалася, што Качан па-ранейшаму не звяртае ніякай увагі на словы таварышаў. Аднак кніжачка «Правілаў» прыкметна ўздрыгвала ў яго руках.

Прыцемак гусцеў, рабіўся нібы важкім і нейкім дрыготкім. Па небе рассыпаліся мігатлівыя светлякі зорак. Усё больш халодным рабілася паветра.

— А дзяўчына яна ладная, нічога не скажаш,— прамовіў Шыбека.— І імя ў яе прыгожае: Люба! Нават куды лепш, як Валеры.

З будынiны выйшаў высокі і тонкі, як жэрдка, Мікола Лазнюк. У адной руцэ ён трымаў малаток, у другой зубіла.

— І чаго вы напусціліся на чалавека, не разумею,— хаваючы ўсмешку, сказаў Мікола і сеў на буфер, які нядаўна сам і ўкапаў у зямлю талеркай угору.— Рабіць вам болей няма чаго, як толькі кпіны з чалавека строіць.

«Бач ты яго, абаронца які знайшоўся,— падумаў Качан.— А сам жа і расказаў хлопцам пра Любу. Я давернуўся яму як другу, а ён...»

Нарэшце, калі разабрацца па справядлівасці, дык хлопцы маюць рацыю. Сапраўды, хіба гэта не смешна, што ён дагэтуль усё яшчэ не знаёмы з Любай? Трызніць аб ёй і дзень, і ноч, а сказаць што-небудзь дзяўчыне, перакінуцца хоць адным самым бяскрыўдным словам не можа...

Люба працуе праваднiцай поезда Мінск — Масква. Яна і насраўдзе бывае ў Зарэнску толькі праездам. Упершыню Валеры ўбачыў яе месяцаў тры таму назад. Убачыў і — прапаў. Ні сну не ведае з тае хвіліны, ні спакою. Аднойчы не стрымаўся, расказаў аб сваіх пакутах Міколу... Ды лепей бы не расказваў! Бо спакою яшчэ меней стала, а пра сон дык і казаць няма чаго.

— Яму, глядзі, і дома не сядзіцца,— зноў пачаў Шыбека.— Хоць і не дзяжурыць яму сёння, а ўсё адно прывалокся на станцыю. Што б гэта мела быць, хлопцы, га?

І ўсе зарагаталі, добра ведаючы, чаму не сядзіцца Ка-

чапу дома. Сёння ж будзе ехаць з семдзесят другім яна, Люба. Вось і прыйшоў хлопец, каб хоць крадком зірнуць на дзяўчыну...

«Нічога,— думае тым часам Валеры,— сёння я не жыў буду, а з Любай пазнаёмлюся. Гэта напэўна!» І Качан пачаў уяўляць сабе, як ён падыдзе да Любы, што скажа ёй і што яна яму адкажа. У яго даўно ўжо былі напагатове словы, з якімі ён звернецца да дзяўчыны. Можа, сто разоў абдумаў Валеры іх, выношваючы ўсе гэтыя тры месяцы.

Зазвінеў тэлефон у пункце агляду. Першы яго пачуў Мікола.

— А ну, якая там вестка ляціць да нас? — сказаў ён і знік за дзвярыма.

Усе змоўклі, прыціхлі. І нібы нейкі цень прабег раптам па тварах вагоннікаў.

— А Сяргея Веліхава ўсё няма,— перапыніў маўчанне Качан.— Мусіць, сур'ёзна захварэў.

Пра гэта, напэўна, думалі цяпер і другія вагоннікі. Пралазчык Веліхаў з паўгадзіны назад адчуў раптам нясцерпны боль у жываце, і прыбіральшчыца цётка Тэкля павяла яго ў медпункт. Падобна на тое, што адтуль яго не пусцяць на работу. Ва ўсякім разе да прыходу семдзесят другога ён наўрад ці вернецца. А як жа аглядаць састаў без пралазчыка?..

Мікола Лазнюк выйшаў з пункта неўзабаве. За ім крочыў майстар Красовіч — пажылы каржакаваты мужчына ў ахайным форменным гарнітуры.

— Семдзесят другі прыбывае,— паведаміў Мікола, папраўляючы для нечага шапку на галаве.— Трэба, хлопчыкі, ісці сустракаць.

— Та-а-ак...— працягнуў майстар.— Што ж будзем рабіць без Веліхава? Не ўправімся без яго. Напэўна, поезд затрымаем.

— Я пайду з вамі,— нечакана сказаў Качан.— Замест Веліхава.

Аглядчыкі моўчкі ўзялі кожны свой інструмент і накіраваліся да станцыі, дзе на галоўны пуць прымаўся пасажырскі поезд.

Апошнім ішоў Качан. Ён затрымаўся быў трохі ў памяшканні пункта, дзе надзяваў зверху святочнага гарнітура рабочы камбінезон і браў свае прыладдзе. А тое было не зусім звычайнае для слесара. Акрамя шабера і элек-

трычнага ліхтарыка, Валеры нёс з сабою лупу, лязо ад бяспечнай брытвы, кавалачак крэйды, сцізорык. Усё гэта знаходзілася ў спецыяльным брызентавым футарале.

На станцыі аглядчыкі разышліся па пероне, дзе каму было зручней, а Качан пашыбаваў далей, насустрач поезду. У яго была звычка сустракаць паязды з ходу. Так лягчэй выяўляць непаладкі, калі яны ёсць у саставе.

Усё наўкола было ярка асветлена. Лілося святло з вокнаў вакзала, на поўную моц гарэлі ліхтары, пражэктары. Відно было, нібы ўдзень. І чамусьці стаяла цішыня, незвычайная для станцыі. Толькі сюд-туд зрэдку чуліся далёкія гудкі маняўровых паравозаў ды даносіліся з захаду прыглушаныя гукі ражкоў стрэлачнікаў.

Ідучы ўздоўж пуцей, Качан маркотна думаў аб сваім злашчасным лёсе... Праз некалькі хвілін прымчыць поезд тую, каго сэрца вылучыла з многіх, вельмі многіх людзей, па кім яно тужыць і без каго не можа біцца роўна; яна прыедзе, і ён кінецца насустрач ёй... толькі ў думках, толькі адным сваім тужлівым сэрцам. А тады пройдуць кароткія і хуткаплынныя сорак мінут, якіх нельга ні павялічыць, ні расцягнуць, і скончыцца час жаданага і няздзейсненага спаткання. Поезд рушыць далей і з'едзе, знікне яна — Любоў з вялікай і з малой літары...

Разлічыўшы, дзе павінен спыніцца апошні вагон, Качан затрымаўся і агледзеўся. Але, тут будзе зручна сачыць за саставам.

Удалечыні бліснуў промень пражэктара. Поезд імкліва наближаўся. Качан лёг долу і ўвесь ператварыўся ў зрок і ў слых. Праз хвіліну на адлегласці двух метраў ад яго загрукалі колы паравоза, потым дробна пачалі выстукваць ношчак вагонныя цялежкі. Пралазчык пільна прыглядаўся да кожнага ската, да кожнай колавай пары. Нічога падазронага не відно было і не чутно.

Паступова поезд сцішаў ход. З шыпеннем выходзіла паветра з тармазной магістралі, феерверкам сыпаліся іскры з бандажоў. Вось і апошні вагон параўняўся з пралазчыкам. Параўняўся і замёр.

Зайшоўшы ў хвост саставу, Качан нырнуў пад вагон. Цяпер ён павінен заняцца сваёй справай. Другія аглядчыкі пойдуць паўз вагоны, яны будуць аглядаць вонкавыя часткі, а ён, пралазчык, павінен старанна агледзець тое, што схавана ад вока. Праменьчык электрычнага ліхтарыка слізгануў па адным скаце, потым па другім, асвят-

ліў па момант калодку, бандаж, рысору, буксавы болт. Нішто не затрымлівала тут увагі празлазчыка. Гэткім жа манерам агледзеў ён другую цялежку, пасля вылез з-пад яе і апынуўся ў паміжвагоннай прасторы.

Парадкавым нумарам наступнага вагона быў дзевяты. Качан уздыхнуў. Гэтая лічба, здаецца, ніколі ўжо не выветрыцца ў яго з памяці... Прыпыніўшыся на момант, Качан прыслухаўся. Каля ўвахода ў вагон гаманілі людзі, нехта з некім спрачаўся. Жаночы голас спакойна гаварыў:

— Не ўсе адразу, таварышы, па чарзе. Усе паспееце, нікога не пакінем.

Сэрца пралазчыка рванулася было на гэты голас, але тут жа зноў стала на месца. Не, гэта голас не Любы. Пасадку робіць яе напарніца. А дзе ж сама ты цяпер, Любоў?..

Ліхтарык зноў слізгануў праменьчыкам па адным скаце, па другім, асвятліў бандаж, калодку, пераскочыў на вось і тут раптам затрымаўся. Пралазчык убачыў, што ў адным месцы на восі фарба чамусьці падпялася, як бы ўспухла. Качан выняў з футарала лупу, уважліва агледзеў гэтае месца, потым памацаў яго пальцамі. Тут, здаецца, штосьці нядобрае. Хуценька саскробшы фарбу шаберам, Валеры ўбачыў на метале рыску, якая, прайшоўшы пэўны шлях па восі, хавалася потым пад калодку і знікала там. Яшчэ раз паглядзеўшы ў лупу, Качан сказаў сабе: гэта трэшчына, не інакш. Канчаткова пераканаўся ён у сваёй здагадцы, калі пусціў у справу лязо брытвы: тое даволі глыбока ўвайшло ў метал.

Качан абвёў небяспечнае месца крэйдай, вылез з-пад вагона.

— Таварыш Красовіч! — паклікаў ён майстра.— Паглядзіце, што тут дзеецца.

Майстар выцер хусцінкай лоб, які неведама чаму раптам узмакрэў, і ўдзячна паглядзеў на пралазчыка.

— Трэшчына, ды яшчэ якая! Каля самай калодкі!

Качан загадкава ўсміхнуўся. Вось ён, адзіны ў сваёй непаўторнасці выпадак, калі звычайныя, такія кароткія сорак мінут могуць быць падоўжаны, расцягнуты, павялічаны аж да памеру сутак. Бо існуе на транспарце закон: вагон з дэфектам, накшталт гэтага, далей ісці не павінен, яго трэба адрамантаваць. А рамонт робіцца вядома як: вагон адчапляюць ад саставу і вязуць у дэпо. І, такім

чынам, замест звычайных сарака мінут Люба будзе тут аж да наступнага поезда.

— Значыцца, рамонт! — прагаварыў майстар.— Трэба паведаміць начальству.

Валеры ўявіў сабе, што зараз будзе... Прыйдзе ў вагон Люба або яе напарніца і скажа: «Таварышы пасажыры, наш вагон «хворы», яго зараз адчэпяць ад поезда. Калі хто хоча, можа перайсці ў другія вагоны». І тут пачнецца такое, што і бацьку роднага забудзеш як зваць. Бо ўсе ж едуць не на шпацыр, у кожнага свае справы, у кожнага час абмежаваны. Заставацца тут і ацірацца да наступнага поезда нікому не хочацца. А хіба дасі ў другіх вагонах кожнаму такое месца, якое ён займаў? Ды і наогул, дзе набрацца тых месц, поезд жа не пусты ідзе...

— Так, рамонт,— хутка адказаў Качан.— Зробім яго самі, па нашаму метаду.

— Не адчапляючы?

— Але.

— Управімся? — майстар паглядзеў на гадзіннік.— Засталося трыццаць пяць мінут.

— Павінны ўправіцца,— упэўнена сказаў Качан, пільна ўглядаючыся ў дзверы вагона, адкуль выходзіла ў гэты момант Люба.— Поезда не затрымаем! — дадаў ён і палез пад наступны вагон.

Пакуль Качан упраўляўся пад вагонамі, перапаўзаючы ад аднаго да другога і ледзь не вобмацкам правяраючы кожную дэталь, манеўровы паравоз адцягнуў хвост саставу на бакавы пуць. Там «хворы» вагон падпялі дамкратамі, выкацілі з-пад яго старую цялежку, паставілі на яе месца новую. Усё рабілася хутка, спрытна. У рамонце брала ўдзел уся брыгада. На дапамогу прыйшлі паязны майстар і шмат хто з праваднікоў.

І вось ужо дамкраты апушчаны. Манеўровы паравоз зрабіў яшчэ адзін рэйс, і ўсё стала на сваё месца. Праваднікі знялі чырвоныя засцерагальныя сігналы. На перон выйшаў дзяжурны па станцыі.

Майстар паказаў рукой на вакзальны гадзіннік.

— Хвіліна ў хвіліну!

Пра гэта падумаў і Качан. Потым ён кінуў позірк уздоўж саставу... Вунь яна, Люба! «Яшчэ не ўсё страчана,— падбадзёрыў сябе Валеры,— магу яшчэ паспець. Я ўсё скажу ёй!..»

І Качан пайшоў насустрач дзяўчыне. Але толькі ён скрануўся з месца, як раптам і прыпыніўся. Тое, што ён убачыў, здзівіла і дашчэнту збянтэжыла яго. Побач з Любай стаяў Мікола Лазнюк, крышачку воддаль ад іх — Шыбека і Малашэнка. Мікола нешта жвава гаварыў, а Люба ўважліва слухала...

«Усё прапала!..— сумна ўздыхнуў Качан.— Пакуль я там упраўляўся, яны апярэдзілі мяне, самі пазнаёміліся з Любаю... Мікола вунь як увіваецца... Нягоднік! А яшчэ сябар называецца...»

Качан павярнуўся, каб пайсці прэч.

— Валеры! — пачуў ён голас Міколы.— Хадзі сюды, Валеры! Хутчэй!

— Чаго табе?..— абыякава і нехаця прамовіў Качан. «Зноў пацяшацца будуць...» — падумаў ён.

— От гэта і ёсць наш славуты пралазчык, пра якога я вам гаварыў,— звяртаючыся да Любы, прамовіў Мікола і паказаў на Качана.— Будзьце знаёмы!

Валеры працягнуў сваю руку, але спахапіўся, што рука не дужа чыстая. Ды было позна: дзяўчына ўжо ўзяла гэтую руку.

— Люба,— сказала дзяўчына і пільна паглядзела на пралазчыка.

— Вельмі прыемна! — заключыў Мікола.— А цяпер, калі я пазнаёміў вас, дазвольце і мне пазнаёміцца. Мяне завуць Мікола. А гэта нашы сябры, Шыбека і Малашэнка. Таксама, скажу я вам, найлепшыя хлопцы. А наогул, нам трэба бегчы, бо спраў у нас — процьма. Салют! — І, узняўшы ўгору сціснуты кулак, Мікола знік. За ім, фацэтна расклапяўшыся з Любай, рушылі Шыбека і Малашэнка.

Люба засмяялася. Яны памаўчалі крыху. Потым Качан сказаў:

— Вы будзеце ехаць назад у суботу. А я ў суботу якраз вольны ад дзяжурства...— Ён хацеў сказаць, што ўсё роўна прыйдзе на станцыю, але духу на гэта не хапіла.

— У мяне сёння апошні рэйс,— паведаміла Люба.— Я болей не буду ездзіць.

— Не будзеце? — сумеўся Качан.

— Але. Мяне прынялі ў тэхнікум. У ваш, у Заранскі.

Станцыйны звон ударыў адзін раз, потым другі...

*1955*

# ТУМАННАЙ РАНІЦАЙ

Нават самага малога, самага нязначнага павеву не адчувалася ў густым шэрым тумане, што вісеў над вуліцай, хаваючы ад вока абрысы хат, агарожаў, тэлефонных слупоў. І невядома было, ці збярэцца калі туман пакінуць гасцінна прытуліўшую яго зямлю, бо час ішоў, ужо і сонцу была пара заліць сваім пяшчотным святлом наваколле, а густая шэрань не радзела, не мянялася ў сваёй надакучлівай аднастайнасці.

Міхась павольна ішоў па шпалах уздоўж рэек. Наўкол зычна перакліканіся гудкамі паравозы, спявалі стрэлачныя ражкі, а з сартавальнай горкі раз-пораз далятаў узмоцнены дынамікам голас дзяжурнага: «Два вагоны на чацвёрты пуць!.. На шосты — цыстэрну!.. Астатнія платформы — па дванаццаты!» Усё тут, на таварнай станцыі, знаёма Міхасю, да ўсяго ён прызвычаіўся за два гады, якія працуе памочнікам машыніста ў дэпо. І таму, не зважаючы нават на туман, можа ісці спакойна, механічна перастаўляючы ногі,— яны самі прывядуць куды трэба.

Наперадзе паказаліся дзве постаці. Міхась угледзеўся — гэта былі жанчыны. Адна з іх сказала:

— А і шанцуе ж табе, усё адно як таму свёкру...

Другая засмяялася, і смех гэты раптам прымусіў Міхася прыпыніцца на нейкі момант. Ды тут жа хлопец супакоіў сябе: не, гэта не Люда. Проста голас здаўся знаёмы. Люда тут зараз быць не можа, яна на рабоце і зменіцца толькі ў дзевяць, амаль яшчэ праз дзве гадзіны... Але, але, яна зараз там, у нараднай. І хутка Міхась убачыць яе. Да нарадная ўжо зусім недалёка... Цікава, ці будзе там Іван Крукаў?..

Міхась збочыў, уступаючы дарогу жанчынам. Тыя прайшлі міма яго моўчкі, а як былі ўжо даволі далёка, чамусьці хіхікнулі. І зноў Міхасю здалося... Ды не, Люда ж ніколі не хіхікае, яна нават і не ўсміхаецца... прынамсі, калі ён побач. А чаго б каштавала ёй усміхнуцца для яго хоць бы разочак!..

Сур'ёзная ты дзяўчына, Люда Падбярэская!.. І чаму ты гэткая?

— У парадную, браце, шыбуеш? — прамовіў раптам нехта за спіной Міхася.— Тады нам разам. Добрай раніцы!

«Ілья Мальчэўскі!» — пазнаў голас Міхась.

На вузле добра ведалі машыніста Ілью Мальчэўскага. Ведаў яго і Міхась. Гэта быў стары спрактыкаваны паравознік, адзін з тых, пра каго кажуць: «Ну, гэты сабаку з'еў у сваёй справе!» Вось ужо гадоў дваццаць ён водзіць кур'ерскія паязды, і на ўсіх станцыях і раз'ездах участка чыгуначнікі ведаюць: калі падыходзіць да перона састаў Ільі Мальчэўскага — можаш смела правяраць па ім свой гадзіннік, памылкі не будзе. У Мальчэўскага даволі важкая постаць і разам з тым хуткая і лёгкая хада. Чорныя распушаныя вусы надаюць яго шырокаму твару сярдзіты, нават злосны выгляд. Але ўсе ў дэпо ведаюць, што выгляд гэты падманлівы.

— Добры дзень, Ілья Ільіч,— стрымана адказаў Міхась. У гэтую хвіліну ён не быў рады сустрэчы з праслаўленым машыністам, бо як толькі той паявіўся — ушчэнт разляцелася надзея прыйсці ў парадную ціха, непрыкметна, без шуму і грукату...

На пуцях рушыў вялікі таварны лакаматыў, цяжка пыхкаючы адпрацаванай парай. Параўняўшыся з Ільёй Ільічом і Міхасём, ён выпусціў з цыліндраў цэлую хмару пары, абдаўшы іх мноствам драбнюткіх пырскаў.

— Цімох, д'ябал, вушы наадрываю за такія жарты! — незласліва памахаў кулаком Мальчэўскі.

— Прывітанне Ілью-грамавяржцу-у...— данеслася ў адказ з паравоза.

Яны падыходзілі да невялікага драўлянага будынка, што стаяў недалёка ад дэпо. Відаць, туман пачаў разыходзіцца, бо абрысы навакольных прадметаў цяпер былі ўжо больш акрэсленыя.

— Прыйшлі нарэшце,— канстатаваў Міхась і расчыніў перад Мальчэўскім пругкія, на спружыне, дзверы парадпай.

Усюды нарадныя падобны адна на адну, як дзве кроплі вады. Нарадную якога-небудзь Новасібірскага ці Хабараўскага дэпо нічым не адрозніш ад нараднай аршанскай альбо, скажам, кіеўскай. І там, і тут, і яшчэ хоць дзе ў любую пару сутак заўжды бывае людна, шумліва, накурана і не сказаць каб надта чыста; страчаюцца тут людзі самыя розныя як па ўзросту, так і па характары; чуцён бывае то непасрэдны, ад душы, смех, то моцная гаворка ці нават заўзятая лаянка якога-небудзь непакорлівага машыніста з нарадчыкам або з вызывальшчыкам. Усе навіны, усе чуткі сыходзяцца сюды, каб потым асэнсаванымі і вытлумачанымі разысціся па ўсім пасёлку, па ўсім горадзе. І называюць чыгуначнікі свае нарадныя не нараднымі, а «брахалаўкамі».

— Эге, весела сёння ў «брахалаўцы»! — азваўся ад парога Мальчэўскі.— Хто тут сёння ў завадатары цаляе?

Так, заранская «брахалаўка» нічым не адрознівалася ад усіх іншых. На гэтым пагадзіўся б, напэўна, кожны.

Кожны, ды толькі не Міхась.

Як толькі расчыніў ён перад Ільёй Ільічом дзверы і скасавурыў вочы направа, дык адразу і ўбачыў тое, чаго не было і не магло быць ні ў адной нараднай, ні на адной чыгунцы... За акенцам, што было прасечана ў службовы пакой, сядзела Люда Падбярэская. Яна сядзела, як і заўсёды, строгая і халодная.

Нарадчыца Заранскага дэпо Люда Пабярэская была дзяўчына незвычайная. Гэтак, прынамсі, думаў Міхась. Ніхто ніколі не бачыў яе з хлопцамі, ніхто не мог пахваліцца тым, што праводзіў яе дадому. Строгая да сябе і да іншых, яна, здаецца, нікога ў свеце не заўважала. Прынамсі, Міхась быў у гэтым перакананы.

А яшчэ, разгледзеўшыся, Міхась убачыў у нараднай Івана Крукава, памочніка машыніста з брыгады Мальчэўскага... Міхась уздыхнуў і нераштуча пераступіў цераз парог. Да Людзінага акенца было крокаў дзесяць. Але як жа цяжка адолець гэтую дыстанцыю!..

На фоне будзённасці нараднай, на фоне людзей у простай рабочай вопратцы Люда Падбярэская рэзка вылучалася сваім надзвычайным, якімсьці святочным выглядам. Кідалася ў вочы перш за ўсё яе адзенне. Хоць і вельмі простае, яно было поўным кантрастам з ўсёй тутэйшай абстаноўкай. Кожны мог заўважыць, што Люда любіла і ўмела адзявацца. Сёння на ёй была белая блузка са звычайна-

га штапелю,— але як прыгожа яна была пашыта! Да белай блузкі ўдала насавала чорпая плісіраванная спадніца. Ды і ўсё астатняе выклікала захапленне — постаць, рысы твару, вочы...

— А скажыце...— падышоўшы да акенца, пачаў Міхась і раптам папярхнуўся словамі. Збянтэжаны, ён шумна ўдыхнуў у сябе паветра. Што ты скажаш! Такое, здаецца, звычайное пытанне, а вось паспрабуй вымаві яго.

Трэба было спытаць наконт паездкі. Калі, маўляў, заступаць на паравоз. Пытанняў гэтых нарадчыца чуе за дзяжурства дзесяткі, яны — самыя будзённыя, як і адказы на іх. Іншая справа ў Міхася. Ён і сам ведае, калі трэба заступаць на работу. Паравоз іх знаходзіцца ў прамывачным рамонце і выйдзе толькі заўтра. Звычайнае пытанне робіцца празмерна незвычайным.

— Вы наконт паездкі? — Люда падняла на Міхася свае вялікія сінія вочы. Яе мілы загарэлы тварык з прамым носікам быў на дзіва спакойны.

— Але, але, наконт паездкі,— заспяшаўся Міхась, адкідваючы рукой з ілба непакорлівую чупрыну. Пад пальцамі лоб быў чамусьці вільготны...

Ззаду грымнуў смех. Чаго гэта? Ці не Іван Крукаў расказвае што-небудзь смешнае? О, на гэта ён здатны!..

— Зараз высветлю,— роўна сказала Люда.— Пачакайце.

Ён адышоў да драўлянай канапы з высокай спінкай, што стаяла якраз насупраць акенца. Такія канапы стаялі ўздоўж усіх сцен, на іх сядзела цяпер чалавек восем ці дзесяць паравознікаў. Адны штосьці гаварылі, другія слухалі, а трэція займаліся яшчэ якой-небудзь справай — чыталі, разглядалі плакаты на сценах. Міхась сеў на вольнае месца. Здарылася так, што ён апынуўся якраз паўскасяк ад Івана Крукава. Міжвольна Міхась параўнаў сябе з ім. І вымушаны быў прызнацца, што параўнанне выходзіць не ў яго карысць. Іван быў высокі, шыракаплечы, з тварам мужнага і ўпэўненага ў сабе чалавека. Нахіліўшы крыху галаву, ён увесь час курыў і, выпускаючы дым з роту, неяк своеасабліва складваў губы. Гэта выходзіла ў яго вельмі прыгожа. Акрамя ўсяго іншага, відаць было, што прырода надзяліла Івана не абы-якой сілай. Што ж да Міхася, дык ён і ростам адстаў ад Крукава, і мужнасці тае не было ў яго на твары, і курыць ён не толькі не ўмеў прыгожа, але і наогул не ўмеў.

Так, параўнанне зусім не на Міхасёву карысць. Гэта праўда.

Заняты сваімі думкамі, Міхась у першы момант не чуў размоў, што вяліся ў парадпай. Але паступова да яго свядомасці пачаў даходзіць сэнс то адной такой размовы, то другой.

На дальняй канапе, каля ўвахода, прымасціўся стары Адам Умрэйка, былы машыніст. Ён даўно на пенсіі, але часта наведваецца ў парадную і праседжвае тут часам па паўсутак. Адам Умрэйка меў звычку, як адзін з чэхаўскіх герояў, усё і ўсіх крытыкаваць, таму і цяпер скардзіўся суседу, юнаку-качагару:

— Хіба цяперака ўмеюць рабіць гамашы? Цяперака не ўмеюць рабіць гамашаў, вось што я вам скажу!

Цалкам прафесійная гутарка ішла паміж Мальчэўскім і машыністам Акулічам, мужчынам сярэдніх год з вузенькімі рудаватымі вусікамі. Акуліч натхнёна гаварыў:

— Падлічана, што павышэнне сярэднесутачнага прабегу лакаматываў па ўсёй сетцы чыгунак толькі на адзін кіламетр дае сем мільёнаў рублёў эканоміі ў год!

Міхась зірнуў у акно. Здаецца, туман стаў радзейшы. Што ж, гэта добра. Не ўвесь жа час вісець пад светам гэтай азызлай шэрані.

Моцны выбух смеху ля супрацьлеглай сцяны зноў прыцягнуў увагу Міхася. Напэўна, гэта Іван Крукаў весяліць там народ.

— Не верыце? Кажу вам, кінуў. Каб я так жыў быў.

— І даўно? — перапытаў у Крукава нехта.

— Даўно, братка ты мой. А сталася яно так. Хапіў я аднойчы кілішкаў... ну, адным словам, колькі там было паднесена, ды і пайшоў сабе, вядомая рэч, дадому. А якраз на тую пару галалёдзіца была. Я і без таго не сказаць каб дужа ўжо моцна трымаўся на нагах, а тут такая каўзота, што калі б і цвярозы быў, дык і то, можа, не адзін раз трахнуўся б вобзем. Ну, ступлю гэта я крок, і — плясь! Толькі паднімуся — зноў плясь! Усе бакі паадбіваў сабе, жывога месца не асталося. Хоць гвалт крычы. Ледзьве, браткі мае, дакляпаў дадому... Назаўтра ўстаў, думаю: пайду апахмялюся. А бакі баляць, а ўсё цела ные... Выходжу на двор — бацюхны мае: тая ж каўзота! А бадай ты згарэла!.. Не, думаю, няма дурных. З таго часу як толькі падумаю пра гарэлку, дык бакі і пачынаюць балець. Проста ўсё цела ные, аж но страх бярэ.

Расказваў Крукаў так, што каб хто і хацеў, дык не здолеў бы стрымацца ад смеху.

Невядома, колькі б яшчэ апавядаў пра свае ці, можа, пра чужыя прыгоды Іван Крукаў, каб не Люда Падбярэзская. Нечакана яна сказала:

— Ілья Ільіч, вось вам маршрутны ліст. Таварыш Крукаў, перадайце, калі ласка!

Мальчэўскі сам памкнуўся быў пайсці да акенца, падняўся са свайго месца і Іван Крукаў, але іх апярэдзіў Міхась. Смялей, хлопча! Вось ён, твой час!.. Міхась спрытна ўзяў з рук Люды маршрутны ліст, склаў яго ў чатыры столкі і, нават не зірнуўшы на Івана, працягнуў ліст Мальчэўскаму.

— Гранд мерсі,— сказаў Міхась Людзе, ашаломліваючы прысутных набытымі толькі ўчора ў адным перакладным рамане ведамі.— Арэвуар! *

— Да пабачэння,— адказала Люда.

І Міхась убачыў: Люда адказала не яму. Некаму іншаму, таму, хто стаяў ззаду яго, былі адрасаваны яе словы. Адказала і — усміхнулася... Міхась хутка павярнуўся. Ззаду стаяў Іван Крукаў. Ён таксама ўсміхаўся, адказваючы на ўсмешку Люды.

Міхась адвярнуўся да акна... Не, туман і не збіраўся радзець. Ён зрабіўся, здаецца, яшчэ гусцейшым...

— Шкада,— сказаў машыніст Акуліч, пазіраючы на гадзіннік.— А то і я расказаў бы вам, Ілья Ільіч, цікаавую адну гісторыю.

— Ці не пра тое, як праехаць зайцам ад Уладзівастока да Адэсы?

— Не, пра тое, як адзін малады чалавек закахаўся ў адну маладую дзяўчыну і што з гэтага выйшла. Здарылася гэта, між іншым, у адной «брахалаўцы».

Міхась выразна чуў, як рыпела спружына, праводзячы з нараднай Мальчэўскага, Крукава і іхняга качагара. А бачыць ён не бачыў нічога, нават і таго, што позіркі ўсіх прысутных накіраваны былі ў гэтую хвіліну чамусьці менавіта на яго. Ён уцягнуў галаву ў плечы і шпарка накіраваўся да выхада.

Голас Люды ён усё ж пачуў. Люда кінула наўздагон яму:

---

* Вельмі ўдзячны. Да пабачэння! *(Франц.)*

— Ваш паравоз яшчэ ў рамонце. Выйдзе заўтра ў дванаццаць нуль-нуль. Прыходзьце, калі ласка!

Ён ішоў, не разбіраючы дарогі, машынальна перастаўляючы ногі па шпалах. Брала крыўда на Люду, на Крукава, на сябе і наогул на ўвесь свет... І чаго ён не бачыў у гэтай «брахалаўцы»?!

Гулі паравозы, вішчалі тармазы, ляпалі прылады аўтасчэпкі. Усе гэтыя гукі раздражнялі і нервавалі, хацелася як мага хутчэй пазбыцца іх. Міхась ледзь не пабег.

Спыніў яго чыйсьці ўсхваляваны голас, што прагучаў зусім побач:

— Вось дык нумар! Як жа гэта здарылася?.. Ай-яй-яй...

Нехта другі тлумачыў першаму:

— Іван, відаць, не дагледзеў...

— Крукаў?

— Ды ўжо ж.

Міхась насцярожыўся. Пра што гавораць гэтыя людзі? Чаму яны называюць прозвішча Івана?

Непадалёку відна была цёмная махіна паравоза. Каля яе мітусілася некалькі постацей. Міхась падаўся туды і неўзабаве пачуў, як Ілья Ільіч гнеўна сказаў:

— Усё! Дастукаліся! Ганьба на маю сівую галаву!

Каля паравоза пачалі збірацца людзі. А той, быццам незадаволены гэтым, злосна соп парай. Гэта быў стары, заслужаны лакаматыў, ветэран апошняй вайны. На яго баках, на абшыўцы катла і цяпер яшчэ можна было заўважыць сляды ўмяцін ад былых варожых абстрэлаў. Нямала паездзіў ён некалі па франтавых дарогах, нямала людзей і грузаў давялося перавезці яму ў самых складаных умовах. Увесь час тады працаваў на ім Ілья Ільіч. І цяпер ён нізашто не хоча разлучацца з ім. Можа, не кожная маці глядзела так сваё дзіця, як Мальчэўскі свой паравоз. Той заўсёды быў чысты, добра змазаны, кожная дэталь у ім старанна праверана. Здавалася, на гэтай машыне выключана ўсялякая магчымасць паломкі ці выхаду са строю нязначнай драбніцы. І вось — здарылася бяда і на ім. Міхась адразу зразумеў гэта. Падышоўшы, ён даведаўся пра вельмі непрыемную для паравозніка рэч. У топцы паравоза валіўся адзін з каласнікоў. З такім пашкоджаннем машына не магла ісці ў рэйс.

— Дастукаліся! Дажылі да ганьбы! — паўтараў Мальчэўскі, ходзячы вакол паравоза.— Усё! Канец!

Вестка пра гэтае здарэнне імгненна абляцела ўсё дэпо. Прыбег дзяжурны, машыніст-інструктар, яшчэ сёй-той, у тым ліку Адам Умрэйка. Стары прысеў каля топкі, зазірнуў у попельную скрынку, паківаў галавой.

— Хіба цяперака робяць добрыя каласнікі? Цяперака не ўмеюць рабіць добрых каласнікоў, вось што я вам скажу!

Да адыходу паравоза к саставу заставаліся лічаныя мінуты. Міхась адшукаў вачыма Івана Крукава. Памочнік Мальчэўскага, чырвоны як рак, стаяў каля старога Умрэйкі і таксама глядзеў на топку. Пра што думаў ён у гэтую хвіліну? Ці не пра тое, што вось выдала яму каханая дзяўчына, недасягальная ні для кога Люда Падбярэская, маршрут, выправадзіла ў дарогу пяшчотнай, толькі яму аднаму прызначанай усмешкай, а ён стаіць у самым пачатку шляху і нікуды не можа паехаць і нічога не можа зрабіць у адказ на яе шчырасць?..

«Што, даражэнькі, даездзіўся?» — сказаў у думках Міхась, і нешта падобнае на зларадласць заварушылася ў яго душы.— Вось і трахнуўся ты вобзем, тут ужо сапраўды трахнуўся!..»

Усё астатняе здарылася настолькі хутка, што Міхась ледзь упраўляўся асэнсоўваць тое, што адбывалася на яго вачах! Іван Крукаў падбег да Мальчэўскага і нешта сказаў яму. Твар машыніста ў першы момант асвятліўся радасцю, але тут жа зрабіўся пахмуры. «Не! Гэта рызыкоўна!» — рэзка сказаў ён. Не даслухаўшы Мальчэўскага, Крукаў кінуўся да лесвіцы і адным махам апынуўся ў паравознай будцы. Мальчэўскі — за ім. Відаць, памочнік машыніста наважыў не адступацца ад нейкага свайго намеру. І ў наступны момант усе ўбачылі, як з топкі пачало ляцець на зямлю гарачае вуголле. Крукаў і Мальчэўскі спяшаліся, ім дапамагаў качагар. Усё вуголле, да апошняга каліва, выкінулі яны з топкі, а як выкінулі, тады ўсе зразумелі, што намерваўся зрабіць Крукаў. Зразумеў гэта і Міхась. Ён і раней чуў, што некаторыя паравознікі адважваюцца на такія справы, пра адзін такі выпадак чытаў нават у газеце, дзе было падрабязна напісана, як славуты машыніст Андрэй Беражкоў ратаваў у такіх жа абставінах топку, але быць сведкам, як гэта робіцца, яму не даводзілася. Міхась адчуў, што ў яго па спіне пабеглі мурашкі...

Між тым Крукаў, усё гэтак жа завіхаючыся, спрытна накруціў на боты пакулля, надзеў на рукі брызентавыя

рукавіцы і, насунуўшы шапку на самыя вочы, крыкнуў Мальчэўскаму:

— Абліваііце!

Голас у яго быў такі, якім палкаводцы аддаюць загады на полі бою. І Мальчэўскі паслухмяна падпарадкаваўся гэтаму голасу. Ён схапіў шланг, адкруціў кран і накіраваў струмень вады на Крукава. У момант уся вопратка Івана была мокрая, але ён не пакідаў стаяць пад вадой, падстаўляючы пад шланг то левы бок, то правы, то спіну, то грудзі. Вось ужо ён пачаў калаціцца ад холаду, і тады пачулася новая яго каманда:

— Хопіць!

Мала, зусім мала часу спатрэбілася Крукаву на тое, каб праз адчыненыя дзверцы ўсунуцца ў топку, паставіць на сваё месца каласнік і зноў выскачыць назад. Часу на гэта спатрэбілася вельмі мала, але яго хапіла на тое, каб вопратка Івана зрабілася абсалютна сухая. Там, у топцы, нельга дыхаць, і, апынуўшыся на волі, Крукаў з шумам выдыхнуў з сябе паветра. Мальчэўскі ўжо быў побач. Ён абхапіў Івана рукамі і прыціснуў да сябе. Так яны стаялі моўчкі, моцна абняўшыся, адчуваючы, як б'юцца іх сэрцы. Потым Іван Крукаў сказаў:

— Ілья Ільіч, трэба вугаль назад, у топку.

— Але, але.

А на паравоз лезлі ўжо людзі. І кожны, нібы ўпершыню ўбачыўшы Івана, шырока расплюшчваў вочы, а потым ужо ціснуў яму руку або ляпаў па плячы ці проста гаварыў:

— Іван... братка... Гэта ж думаць!..

Каля паравоза, на зямлі, засталіся толькі Умрэйка і Міхась.

— Хіба раней былі такія людзі? — узбуджаным голасам гаварыў стары.— Не было раней такіх людзей, вось што я вам скажу!

А Міхась паспрабаваў уявіць сябе на месцы Крукава, там, у распаленай топцы паравоза; паспрабаваў — і яму стала млосна ад адной такой думкі...

Нейкае дзіўнае пачуццё, якога ніколі яшчэ не даводзілася яму зазнаць, ахапіла ўсю яго істоту. Міхась раптам адчуў сябе такім нікчэмным, такім маленькім і нязначным, што хоць плач.

Ён паглядзеў навокал сябе і са здзіўленнем заўважыў, што туману і следу не было. З правага боку ўзносілася ў неба вялізная пражэктарная мачта. Крыху далей стаяла

воданапорная вежа — і яна цягнулася ўгору, у блакіт. Корпус паравознага дэпо, будынак электрастанцыі, дыспетчарская вышка — усё было высокае, масіўнае, значнае. І людзі, што займаліся кожны сваёй справай, здаваліся волатамі.

Так, усё было ў гэтым свеце моцнае, трывалае, надзейнае!

Чыстае і празрыстае паветра стварала неабсяжны далягляд. Відаць было далёка-далёка. І таму Міхась яшчэ вунь адкуль убачыў дзявочую постаць у белай блузцы, што таропка ішла — не, бегла! — сюды, да месца здарэння. Штораз яна была ўсё бліжэй і бліжэй. А калі падбегла ўжо зусім блізка, не стрымалася і гукнула:

— Ілья Ільіч! Ваня! Ну, што там?.. Ваня, дзе ж ты?!

Можа, Мальчэўскі не пачуў голасу Люды, а можа, у акне паравознай кабіны не хапіла месца для двух, толькі там, высунуўшыся ледзь не да пояса, паказаўся адзін Іван Крукаў.

— Людачка...— сказаў ён. Відаць, хацеў быў і яшчэ пасказаць нешта, але тут на ўсю сваю моц зароў гудок, паглынаючы ўсе іншыя гукі. Люда прыкрыла вушы далонямі. А Іван засмяяўся і памахаў ёй рукою. Тады і Люда працягнула свае рукі наперад, нібы жадаючы затрымаць, спыніць паравоз. Але той усё прыскорваў свой бег.

Люда доўга глядзела яму ўслед. І людзі глядзелі таксама. Таму і не бачыў ніхто, як самотна шыбаваў па шпалах некуды Міхась.

З блакіту ліў і ліў дождж залатых праменняў сонца.

*1954*

# ГАСПАДЫНЯ

Лямпачка цьмяна гарэла недзе ўгары, на чацвёртым ці пятым паверсе, і таму на лесвіцы стаяў прыцемак. Марына павольна пераступала з прыступкі на прыступку, падымаючыся ўсё вышэй і вышэй, і калі б хто паглядзеў на яе ў гэтую хвіліну, напэўна сказаў бы, што дзяўчына да нечага прыслухоўваецца. Але ў калідоры панавала ціша, сюды ў гэты позні час не далятаў ніводзін гук ні з вуліцы, ні з кватэр вялікага шматпавярховага дома. Толькі высокія абцасы Марыніных чаравікаў стукалі па бетоне лесвіцы.

Дзяўчына ўзышла на першую пляцоўку і, глыбока ўздыхнуўшы, прыпынілася. Высокая зграбная постаць яе нібы замерла. І зноў можна было падумаць, што дзяўчына імкнецца штосьці пачуць у гэтай густой цішы, імкнецца — і не можа, бо адзінае, што чуваць зараз — гэта стук уласнага сэрца.

Вядома, шмат па якіх прычынах можа стукаць дзявочае сэрца, асабліва, калі ёй толькі дваццаць год. Хоць бы і па той, што ёй увесь вечар давялося танцаваць з маладым сімпатычным хлопцам, у якога такое харошае, гучнае імя — Антон...

Цікава, дзе ён зараз? Ці ўсё яшчэ стаіць там унізе, за знадворнымі дзвярыма, ці можа пайшоў ужо, насвістваючы паціху што-небудзь сам сабе?

— Ваша акно — вунь тое? — спытаў ён, калі яны падышлі да пад'езда, і паказаў рукою некуды ўгору.

— Не, не ўгадалі,— засмяялася яна.— Я жыву на трэцім паверсе. Вунь тое, цёмнае, якраз над намі.

— То я буду чакаць, пакуль яно засвеціцца,— сказаў

Антон, і Марына не магла зразумець — жартуе ён ці кажа ўсур'ёз.

Звонку па-ранейшаму не даносілася ні гуку. Марына пастаяла яшчэ крыху,— мабыць, сэрца калоціцца проста таму, што пасля танцаў цяжка ўзнімацца па лесвіцы,— і зноў пачала адлічваць прыступкі. Вось і патрэбная пляцоўка. Налева — яе кватэра. Дзяўчына выняла з сумачкі ключ, адамкнула дзверы і, стараючыся ступаць як мага цішэй, каб не патурбаваць бацькоў, прашмыгнула ў свой пакойчык.

Рука машынальна пацягнулася да выключальніка, але Марына тут жа адхапіла яе назад. Зрабіла крок наперад, пастаяла, тады яшчэ пасунулася крыху і прыпынілася пасярод пакоя. Насупраць быў шэры чатырохкутнік акна. Хацелася, вой як хацелася падысці і зірнуць уніз, на вуліцу, але для гэтага трэба было адсунуць фіранку і прыціснуцца да шыбы, а хіба ж можна адважыцца на такое?..

Рашуча павярнуўшыся, Марына рушыла да выключальніка. Той гучна цмокнуў, і пакой заліўся мяккім ружовым святлом.

І тады за акном пачуліся крокі. Хтосьці хутка прайшоў па тратуары...

Напэўна, выпадковы прахожы...

Марыне доўга не хацелася распранацца. Яна была сёння ў сваёй любімай малінавай сукенцы, якая,— казалі сяброўкі,— дужа пасавала ёй. Ды і Антону яна спадабалася — гэтага нельга было не заўважыць.

«Хто ж ён такі, гэты Антон?» — думала Марына, узіраючыся ў акно, якое цяпер, пры святле, было чорнае-чорнае. Там, у акне, нібы ў люстэрку, відзён быў яе твар. Марына бачыла свой высокі адкрыты лоб, крыху задзёрысты нос, дзве ямачкі на шчоках,— бачыла ўсё гэта, але ўяўленне малявала другі твар — ягоны, Антонаў. І ёй пачынала здавацца, што з аконнае шыбы на яе пазіраюць і нават трошачкі ўсміхаюцца цёмныя Антонавы вочы, тыя самыя, што ўвесь вечар сачылі за ёю з-пад броваў, што амаль сышліся ля пераносся...

Яна ніколі раней не бачыла яго ў клубе, хоць бывала там даволі часта і ведала амаль усіх хлопцаў і дзяўчат з чыгуначнага вузла. Сёння ён прыйшоў сюды ўпершыню. У перапынку паміж танцамі Марына выйшла з сяброўкай Аняй Тарасевіч з залы ў фае, і ў дзвярах ледзь не наско-

чыла на незнаёмага хлопца. Той папрасіў прабачэння і адступіў на крок назад, саступаючы дарогу, хоць прасіць прабачэнне трэба было, канечне, ёй, бо гэта ж яна наступіла яму на нагу. Ды Марына чамусьці разгубілася і не сказала ні слова, толькі зачырванелася.

Праз хвілін колькі зноў пачала іграць радыёла, і Марына з Аняй хуценька вярнуліся ў залу. Не паспелі яны ўвайсці, як да іх падышоў той самы хлопец і запрасіў Марыну па кракавяк. І на гэты раз Марына нічога не адказала яму, толькі моўчкі, адньмі вачыма дала згоду.

Малады чалавек вылучаўся сярод усіх, хто быў у гэты вечар на танцах. На ім быў добра пашыты светла-карычневы гарнітур, у той час як большасць з тых, каго ведала яна, насілі чорныя кіцелі або гімнасцёркі — звычайную форму чыгуначнікаў. Было ў ім і яшчэ штосьці, што рабіла яго незвычайным, але што менавіта, Марына так і не даўмелася. «Проста ён не тутэйшы, таму і здаецца мне нейкім асаблівым»,— сказала яна сабе.

Танцаваў малады чалавек вельмі хораша, Марыне было прыемна з ім — Аня нават шапнула ў перапынку, што з іх атрымалася ўдалая пара, — і таму, калі ён запрасіў яе на новы танец, яна без вагання дала згоду.

Пад час танца ён штосьці спытаў у яе, Марына адказала, потым ён зрабіў нейкую заўвагу,— здаецца, наконт музыкі,— і яны разгаварыліся, і не толькі разгаварыліся, але неяк само па сабе так атрымалася, што і пазнаёміліся.

Пасля танцаў Аня пайшла са сваім жаніхом, а Марына памкнулася была пабегчы дамоў адна, але Антон затрымаў яе і папрасіў дазволу праводзіць. Нейкі ўнутраны голас гаварыў ёй, што з гэтым чалавекам можна ісці хоць за край свету, і яна, зноў жа моўчкі, але з пачуццём нейкай усхваляванасці ў сэрцы, згадзілася...

Калі яны пераходзілі віядук праз чыгунку, Марына паспрабавала высветліць, хто ён і адкуль тут узяўся, аднак Антон адно толькі і сказаў:

— Ды так... вучыцца прыехаў...

І больш нічога не дадаў, а перавёў гаворку на іншае.

«Мабыць, у наш чыгуначны тэхнікум прыехаў паступаць,— падумала Марына.— Армію, відаць, ужо адслужыў...»

За сцяною, у бацькавым кабінеце, пачаў адбіваць час гадзіннік.

«Але чаго гэта я столькі думаю аб ім?» — схамянулася раптам Марына. Сапраўды, чаго? Хіба мала ў яе знаёмых хлопцаў, з якімі яна танцуе ў клубе?..

— Глупства ўсё гэта! — уголас сказала Марына і, распрануўшыся, нырнула пад коўдру.— Спаць, спаць!

Але ж гэта толькі сказаць лёгка — спаць. А от як заснуць, калі думкі ўзварушаны, калі сэрца не-не ды і замрэ чамусьці на нейкі момант, калі... ды ці мала ёсць яшчэ ўсялякіх «калі»!..

Прыгадалася: за ўвесь вечар ён так і не пацікавіўся, дзе яна працуе і наогул хто яна такая. А можа, гэта і лепш, што не пацікавіўся? Бо што б яна адказала яму? Што толькі тое і мае, што во ездзіць у поездзе за правадніцу?.. Ні на што болей яе не хапіла, нічога такога людскага з яе не атрымалася і ўжо не атрымаецца — ні настаўніцы, пра што марылася ў маленстве, не балерыны, аб чым снілася ў восьмым класе, ні доктара, пра белы халат якога і дагэтуль не можа спакойна гаварыць маці.

Ніхто яна. І нішто. Хоць начальнік поезда інжынер-лейтэнант Мазолін і любіць паўтараць:

— Праваднік,— кажа гэта не абы-хто, а гаспадар вагона. Чуеце? Гаспадар! І гаспадарка ў яго не з апошніх, і адказнасць на ім ляжыць аж вунь якая!

На словах «гаспадар» і «адказнасць» інжынер-лейтэнант робіць націск і яны гучаць у ягоных вуснах з асаблівай выразнасцю.

Думкі ідуць сваім парадкам. Яны ідуць, не даючы заснуць, і ўсё больш і больш хвалююць сэрца.

Вось і раніцою, чуць толькі Марына расплюшчыла вочы, яны зноў авалодалі ёю, зноў надалі нейкую ўнутраную ўзрушанасць. Так было да тае пары, пакуль не настаў час заступаць ёй на дзяжурства, а дакладней кажучы, пакуль не стала яна ля ўвахода ў вагон і не сказала нейкаму барадатаму дзядзьку:

— Грамадзянін, дазвольце ваш білет!

З гэтай хвіліны яна ўжо была не проста Марынай, мала чым прыкметнай дзяўчынай з Вакзальнай вуліцы, а таварыш Аляксюк, правадніцай восьмага вагона поезда далёкага накіравання. І ні аб чым зараз не трэба думаць, акрамя таго, што мела непасрэднае дачыненне да абавязкаў, вызначаных у службовай інструкцыі.

Замест учарашняга малінавага плацця на Марыне была цяпер чорная шарсцяная спадніца і сіняя гімнасцёрка,

перахопленая ў таліі шырокім скураным рамянём, на плячах пагончыкі з дзвюма вузенькімі беленькімі стужкамі. Кучаравыя валасы схаваны пад такі ж сіні берэт з маленькай зорачкай.

— Ваш білет! — сказала Марына, узпімаючы вочы на чарговага пасажыра, і сумелася ад нечаканасці.

Перад ёю стаяў Антон.

Відаць, Антон таксама не чакаў гэтай сустрэчы, і замест таго каб даць ёй білет, хуценька сунуў яго ў кішэню.

— Праходзьце, праходзьце! — незадаволена сказаў хтосьці ззаду Антона, і ён тады заспяшаўся, неяк нялоўка ўзяўся за поручні, гэтак жа нялоўка ўзлез на падножку і, прамовіўшы:— От гэта нумар!..— ужо больш рашуча падаўся ў тамбур.

Марына кінула наўздагон Антону кароткі збянтэжаны позірк, а тады паспешліва выхапіла білет з рук нейкай пажылай жанчыны.

Поезд крануўся. Марына выняла з футарала жоўты сцяжок і стала з ім на падножцы. Калі праехалі станцыю, яна зачыніла дзверы і падалася ў вагон.

З рэпрадуктара, што вісеў у калідоры, пачулася:

— Пачынаем канцэрт па заяўках пасажыраў дзевятага вагона. Праслухайце ў выкананні народнай артысткі СССР Ларысы Пампееўны Александроўскай беларускую народную песню «Чаму ж мне не пець». Паведамляем таксама, што радыёвузел нашага поезда ахвотна прыме і выканае заяўкі пасажыраў з другіх вагонаў.

Праз момант у вагоне загучаў голас народнай артысткі:

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець...

— А ў нашай хатачцы парадку няма,— сказаў раптам чалавек у форме артылерыйскага маёра. Ён стаяў непадалёк ад Марыны і курыў.

— Як гэта няма? — Марына падышла да яго бліжэй.— Чаму няма, скуль гэта вы ўзялі?

— От каб распісаць прэферансік ды падсадзіць каго па горачку, тады парадачак быў бы.

— Э, не, от гэта быў бы самы элементарны беспарадак,— засмяялася Марына.

Маёр прыжмурыў вочы.

— А можа ўсё ж падкажаце, дзе тут пазашываліся сапраўдныя прэферансісты, га? Бо вы ж тут гаспадыня, усё павінны ведаць.

— Партнёраў, таварыш маёр, я вам магу знайсці,— сказала Марына.— Але толькі не прэферансістаў. У шахматы вы, выпадкова, не гуляеце?

— Уявіце сабе — выпадкова не гуляю.

— А ў шашкі?

— А ў шашкі — так, выпадкова гуляю.

— Адну хвіліначку.

Марына схадзіла ў сваё службовае купэ, узяла шашкі.

— Партнёраў мы зараз знойдзем,— пераканана сказала яна. І зазірнула ў восьмае купэ, у сёмае, потым у шостае. Там уладкоўваўся на ніжняй паліцы Антон.

— Ды вось бачу па вачах гэтага маладога чалавека, што ён якраз і мае ахвоту згуляць з вамі. Я не памыляюся?

І хоць Антону, відаць, не дужа хацелася гуляць, але ў Марыніным голасе было штосьці такое, што ён адразу ж сказаў:

— З прыемнасцю згуляю.

А поезд тым часам ішоў і ішоў. Ужо былі пасланы пасцелі, пасажыры зручна размясціліся на сваіх месцах, і вагон набыў выгляд даўно абжытага памяшкання. Лілася з рэпрадуктара не дужа моцная музыка. Нібы старыя знаёмыя гамانілі суседзі па купэ. Недзе ў канцы калідора звінеў дзіцячы галасок, выразна дэкламуючы верш пра тое, што такое добра і што такое дрэнна, а з другога канца даносіўся гучны рогат аматараў даміно, якія з усяе сілы ляпалі костачкамі па чамадане. Маёр жа і Антон усё змагаліся.

У купэ да іх зноў завітала Марына. Маёр нават не зірнуў на яе — так ён быў захоплены гульнёю.

— Ці не жадаеце набыць свежыя газеты або часопісы? — стрымліваючы лёгкую ўсмешку, спытала яна.— Ёсць маскоўскія, ёсць і мясцовыя.

Маёр падняў галаву.

— Вось палюбуйцеся: прадуўся ўшчэнт! — весела паведаміў ён.— І, здаецца, апі невыпадкова. Шэсць партый запар.

— З чым вас і віншую. Цяпер можаце зрабіць перапынак.

Антон пакінуў гуляць, выйшаў у калідор і пачакаў, пакуль Марына не абышла ўсе купэ.

— Дык вы і ёсць Марына Фёдараўна Аляксюк? — запытаў ён, калі дзяўчына, ідучы назад, параўнялася з ім.

Марына здзіўлена паглядзела на яго. Учора, знаёмячыся, яна сказала яму толькі сваё імя. Адкуль жа ён уведаў яе прозвішча, ды яшчэ і па бацьку?

— Так... Але адкуль вы ведаеце?

Поезд набліжаўся да станцыі, і яны не паспелі пагутарыць: Марына заспяшалася да выхада.

Да самага вечара ў яе было многа спраў, і аж пакуль не здала яна дзяжурства Ганне Тарасевіч, ёй і словам перакінуцца з Антонам не давялося. Але як толькі яна засталася ў службовым купэ адна, у дзверы адразу пастукалі. Марына здагадалася, хто гэта стукае, але нейкі момант вагалася, не ведаючы, ці дазволіць Антону зайсці. І калі б Антон пастукаў яшчэ раз, яна напэўна адмовіла б, але за дзвярыма было ціха, і Марына міжволі ціха сказала:

— Калі ласка.

Антон увайшоў шумна, грукнуўшы дзвярыма, і ад Марынінай увагі не ўнікла, што ён робіць гэта назнарок, проста дзеля таго, каб падбадзёрыць сябе.

— Чаго гэта вам не спіцца?

— Прабачце, я на хвіліначку. Вы тут пасажырам кнігі прапаноўвалі. Я тады нічога не ўзяў, а от цяпер надумаўся спытаць, ці няма ў вас выпадкова «Рэвізора» Гогаля. У вас жа вунь колькі кніг!

— Не, Гогаля нічога няма. А калі ўжо вам так патрэбна сатыра, то вазьміце Салтыкова-Шчадрына. Ён у мяне якраз ёсць, во стаіць том... пачакайце, я зараз пагляджу, што там такое...

— Дзякую, не трэба турбавацца, мне іменна «Рэвізора» хацелася ўзяць.

— А вы і самі на нейкага рэвізора падобны,— засмяялася Марына.

— Што вы!..— нібы спалохаўшыся нечага, хутка прамовіў Антон і хацеў яшчэ штосьці сказаць, ды Марына апярэдзіла яго:

— Вельмі нават падобны. Сочыце за мною, прыглядаецеся да ўсяго.

Антон зноў нічога не паспеў сказаць. У купэ, рашуча адчыніўшы дзверы, увайшла праваднiца з суседняга ва-

гона і, крытычным позіркам агледзеўшы Антона, накінулася на Марыну:

— Табе асобнае запрашэнне патрэбна, га?

— Вой, Настачка, зусім забылася! — пляснула ў ладкі Марына.

Як высветлілася, Настачка была рэдактарам насценнай газеты іхняга поезда і вельмі не любіла, калі члены рэдкалегіі не слухалі яе. А якраз трэба было выпускаць чарговы нумар.

— Давай, давай! Усе ўжо сабраліся! — строга сказала Настачка і пацягнула Марыну з купэ.

Антону нічога болей не заставалася, як падацца на сваё месца.

Вярнулася Марына назад гадзіны праз дзве, калі ўсе ў вагоне ўжо спалі. Мякка ступаючы, яна прайшла па калідоры, прыпынілася каля апошняга акна. Адчыніла яго, падставіла твар пад халаднаватыя струмені паветра...

Вагонныя колы мерна стукалі на стыках рэек. Па небе навыперадкі беглі светлячкі зорак. Адны з іх былі зусім маленькія, ледзь прыкметныя, другія ярка гарэлі. Вось адна зорка на нейкі момант як бы спынілася, а тады паляцела ўніз...

За спіною рыпнулі дзверы. Нехта выйшаў з купэ. Але не гэта прыцягнула Марыніну ўвагу. Аднекуль з-пад вагона даносіўся лёгкі, але вельмі падазроны скрогат жалеза. Марына выскачыла ў тамбур, адчыніла знадворныя дзверы, схапілася за поручні і нахілілася ўніз.

— Марына, што з вамі? — пачула яна ўстрывожаны голас Антона.

— Зрывайце стоп-кран! Хутчэй! — крыкнула яна.

Антон ірвануў на сябе рукаятку стоп-крана. Заляпалі буферы, здрыгануўся вагон, нібы яго выцялі здаравеннай кувалдай.

— Нясіце ліхтар! — загадала Марына.

Поезд прыпыніўся. Марына саскочыла на дол. Следам за ёй саскочыў і Антон, трымаючы ў руках ліхтар.

— Што здарылася?

Марына выхапіла ў яго з рук ліхтар, пасвяціла пад колы. Так і ёсць! Паміж колаў вагоннай цялежкі вісела, крапаючыся рэйкі, тармазная калодка. Відаць, згубіўся ў дарозе шплінт, які трымаў яе, таму валікываліўся і трыангель павалокся па рэйках...

— Там, у нашым купэ, ёсць лом,— сказала Марына.— Хуценька прынясіце яго сюды!

— Навошта вам турбавацца?! Зараз прыйдзе вагонны майстар, ён і адрамантуе, і ўсё зробіць, што трэба.

— Хутчэй! — паўтарыла яна, і голас у яе быў такі, якому нельга было не падпарадкавацца.

З ломам у руках Антон палез пад вагон, а за ім і Марына. Тады і напраўдзе з'явіўся вагонны майстар. Але калодка ўжо стаяла на сваім месцы. Майстру асталося толькі зашплінтаваць валік.

Задаволеныя адно адным, яны вылезлі з-пад вагона. Марына пакруціла над галавою ліхтаром. Насцярожаную цішыню ночы прарэзаў тонкі свісток галоўнага кандуктара. Яму адразу адказаў густы гудок паравоза. Зноў заляпалі буферы вагонаў, але ўжо спакойна і разважна. Поезд рушыў далей у сваю дарогу.

Марына і Антон стаялі ў тамбуры, абое прыкметна ўзрушаныя. Стаялі моўчкі, нібы баяліся недарэчным словам спудзіць той дзіўны настрой, які валодаў цяпер імі.

Па небе зноў беглі светлячкі зорак — адны большыя, другія меншыя.

— А з вас мог бы атрымацца неблагі праваднік,— першай парушыла маўчанне Марына.— З ломам вы ўвіхаліся пад вагонам дай божа! — І яна засмяялася.

Антон таксама заўсміхаўся, але нічога на гэтыя яе словы не адказаў.

Назаўтра з самага ранку пайшоў дождж. Ён дакучліва цурбопіў па шыбах. На станцыях мала хто выходзіў з вагонаў. Ахвотнікам паспаць гэта было і добра; паснедаўшы, яны зноў завальваліся на свае паліцы. Другія ж адно бадзяліся па калідоры, не ведаючы, чым бы заняцца. За той час, што былі ўжо ў дарозе, згулялі столькі партый у шахматы і ў шашкі, забілі столькі «казлоў», што ўсё гэта абрыдала да самае макаўкі.

Як і напярэдадні, Марына зноў пачала заўважаць, што Антон уважліва сочыць за кожным яе крокам.

— Рэвізуеце? — ідучы па калідоры, усміхнулася яна, калі Антон, стоячы ля акна, рабіў выгляд, што ўважліва слухае па радыё правілы перавозкі пасажырамі багажу.

— Ну што вы, радыё слухаю. Гэта ж вельмі цікава ведаць.

— Слухайце, слухайце,— сказала Марына і пайшла была далей, але раптам вярнулася і спытала нейкім та-

ямнічым голасам:— А скажыце, вы раман «Жніво» чыталі? Галіны Нікалаевай.

— Чытаў...— разгубіўся Антон.— А што?

— Дык гэта проста здорава! — узрадавалася Марына.— Значыць, будзем лічыць, што сямёра выступаючых ужо ёсць.

Антон нічога не разумеў, а Марына, не зважаючы на яго здзіўлены твар, гаварыла далей.

— Зараз я пайду да прафесара Чыстаклетава, ён едзе ў другім купэ. Калі ўгавару яго — ох, і дыспут наладзім!

Ужо адыходзячы, яна строга дадала:

— А калі не ўгавару, тады вы пойдзеце да прафесара!

— Чаго?

— Угаварваць!

З другога купэ яна вярнулася хутка. Усё яшчэ не разумеючы нічога, Антон сустрэў яе быстрым пытаннем:

— Ну?..

— Угаварыла! Мінут праз трыццаць, як толькі мінем Белае Возера, правядзём канферэнцыю чытачоў па раману «Жніво». Даклад зробіць прафесар Чыстаклетаў. Уявіце сабе, адразу даў згоду!.. Пайду, можа, знайду яшчэ каго выступіць.

І яна знікла за дзвярыма трэцяга ці чацвёртага купэ.

...Поезд ішоў сабе і ішоў.

Даўно перастаў дождж, і на станцыях пасажыры зноў шумліва кідаліся ў атаку на ларкі з півам і марожаным, газетныя кіёскі, латошніц з бутэрбродамі і піражкамі, і толькі дзверы восьмага вагона цэлых пяць прыпынкаў заставаліся зачыненымі. Ніхто з іх не выходзіў, нібы ў вагоне і не было нікога.

Поезд ішоў сабе і ішоў...

...Пасля яны сядзелі ў яе службовым купэ, і Марына гаварыла:

— А вы, шчыра кажучы, няважна выступілі. Збіваліся, блыталі герояў...

— Дык я ж не рыхтаваўся...

— А маёр хіба рыхтаваўся?

— І чытаў «Жніво» я ведаеце калі? Яшчэ ў часопісе.

— А прафесар, прафесар! — захаплялася Марына.— Такі даклад зрабіў!

— На тое ён і прафесар.

— Так, але які прафесар! Ягоная ж спецыяльнасць — супрацўленне матэрыялаў. Гэта ж разумець трэба!

Раптам Марына спахапілася:

— Вой, зусім забылася! Сусед жа ваш, маёр, казаў, што дужа любіць хатні боршч. А на наступнай станцыі якраз смачна гатуюць яго. Там кухарам у рэстаране робіць Кузьма Захаравіч. Вялікі майстар баршчу!.. Ледзь не забылася папярэдзіць маёра.

Калі Марына вярнулася, Антон сказаў:

— І калі гэта вы ўправіліся вывучыць густы пасажыраў! Трэцяе купэ вунь вам калектыўную падзяку напісала. Там сабраліся адны аматары смажаных курэй, а вы, аказваецца, і падказалі, дзе іх можна танна купіць.

— То я ж правадніца,— засмяялася Марына.— А правадніца — гэта ведаеце хто? Гаспадыня вагона! — Марына сумелася, успомніўшы, што гаворыць не свае словы, але тут жа казала далей:— А кожная гаспадыня павінна быць чулай і ўважлівай да сваіх гасцей, праўда?

...Поезд падыходзіў да вялікага горада — свайго апошняга прыпынку. У вагоне ўзнялася тая мітусня, якая звычайна бывае перад канцом дарогі. Людзі збіралі рэчы, укладвалі чамаданы, запісвалі адрасы сваіх новых знаёмых, развітваліся.

Марына стаяла ў калідоры і глядзела ў акно. Шмат разоў даводзілася ёй пад'язджаць да гэтага горада. Многае тут было ёй знаёма: і той вунь пасёлак з беленькіх стандартных домікаў, і высокі комін цагельнага завода, і будынак электрастанцыі, і мост праз невялікую, але, відаць, быструю рэчку... Ды і ў самім горадзе была яна не раз. Перад тым, як пайсці ў зваротны рэйс, поезд некалькі гадзін стаіць у вагонным парку. За гэты час можна схадзіць у кіно, у музей, паблукаць па магазінах... Гэта быў украінскі горад, і Марына, ідучы па вуліцах, з цікавасцю прыглядалася да незнаёмых ёй людзей, чытала аб'явы і шыльды. Многія словы былі падобны на беларускія, толькі вымаўляліся крыху інакш, другія былі незразумелыя, і Марына дапытліва ўнікала ў іх сэнс. Незнаёмы і чужы некалі горад з кожным разам рабіўся ёй усё больш блізкім і нават дарагім.

Напэўна ў гэтым горадзе жыве і яе новы знаёмы Антон...

Хто ж ён такі, гэты Антон?.. Казаў, што прыехаў вучыцца, а сам тут жа і з'ехаў... Дзіўны чалавек...

Да Марыны падышоў начальнік поезда Мазолін.

— Ну, віншую вас! А таксама і сябе! Мільёнчык кіламетраў адгрохалі. Гэтым рэйсам закончылі.

Пра гэта Марына ведала і сама. Іхні састаў і напраўдзе прайшоў мільён кіламетраў без адчэпкі вагонаў на рамонт. Такога ні ў кога на чыгунцы яшчэ не было.

— А як ваш вучань? — запытаўся раптам Мазолін.

— Які вучань?

— Ды гэты самы, як яго, Антон Цяслепка.

— Антон?.. Вучань?..— разгублена перапытала Марына, на ўсе вочы ўзіраючыся ў Мазоліна.

Поезд здрыгануўся раз, потым яшчэ раз, і нарэшце спыніўся. Мазолін заспяшаўся да выхада. З тамбура насустрач яму ішоў незнаёмы Марыне высокі чалавек у такой жа, як і Мазолін, форме.

— Таварыш Мазолін? — спытаў той і падаў руку начальніку поезда.— Будзем знаёмы: начальнік тутэйшага рэзерву праваднікоў Надзявецкі.

— Вельмі прыемна,— сказаў Мазолін.— Дык гэта ваш праваднік надумаўся павучыцца ў нашых работнікаў?

— Ён у нас адзін з лепшых праваднікоў. Аднак Антон хацеў паглядзець, як працуюць вашы людзі, як абслугоўваюць пасажыраў.

Марына прыхінулася да сцяны...

— Я накіраваў яго ў восьмы вагон, да нашай лепшай праваднічы Марыны Аляксюк,— сказаў Мазолін.— Ён тут недзе і павінен быць. А можа, куды ў другі вагон падаўся.

— Чуў, чуў пра вашу Марыну. Нядрэнна было б, калі б яна выступіла сёння на нарадзе, якую мы збіраемся правесці. Поезд жа ваш пададуць у парк, часу хопіць.

У гэты час да Марыны, трымаючы ў руках свой невялічкі чамаданчык, падышоў Антон.

— Дзякую за ўсё, Марына,— прапікнёна сказаў ён.— І мы яшчэ сустрэнемся, праўда?

— Так. Праз паўгадзіны, на нарадзе,— адрэзала Марына.

— Гэта само сабою. Але я кажу пра іншае... І яшчэ я хачу спадзявацца,— жартаўліва дадаў ён,— што наступным разам вы не прымусіце мяне гэтак доўга стаяць пад акном. Я ж магу прастудзіцца, чакаючы, пакуль запаліцца святло ў вашым пакоі.

*1951*

# ТЭЛЕГРАМА

Сёння ён прыйшоў зноў. Прасунуўшы ў акенца новенькі хрусткі рубель, ён сказаў:

— Калі ласка, адзін бланк для тэлеграмы.

Таня адразу пазнала яго голас. Гэтыя словы ён гаварыў заўсёды,— адны толькі гэтыя словы. Больш ён не дадаваў нічога, забываючыся нават падзякаваць за пададзены яму трапяткою Танінай рукою бледна-шэры лісточак паперы, які хаця і каштаваў адных толькі дзве капейкі, але быў для тых, каму пасылаўся, даражэй часам за мільёны.

Чамусьці ён ніколі не меў дробязі і працягваў заўсёды рубель або траячку, ці дзесятку. Аднаго разу ён даў нават сотенную паперку, і Тані прыйшлося абегаць увесь тэлеграф, каб размяняць гэтыя грошы і выдаць яму рэшты.

Сёння, як на тое, яе блакітная талерачка для разменнай манеты была амаль пустая. Таня не магла даць рады нават ягонаму рублю. А iсці мяняць грошы ёй не было калі, бо перад акенцам стаяла доўгая чарга людзей.

— У мяне няма рэшты,— з жалем прамовіла Таня.— То, можа, у другім акне возьмеце.

— Нічога, я пачакаю,— адказаў ён і трошачкі адсунуўся ад акна, каб нікому не замінаць.

Яна дагэтуль ні разу яшчэ не зірнула на яго. Пасля, машынальна выдаючы бланкі, прымаючы тэлеграмы, пішучы квітанцыі, яна таксама старалася не глядзець у яго бок. Але і без таго яна ведала, што на маладым чалавеку цяпер мяккі цёмны капялюш, карычневае дэмісезоннае паліто, белы лёгкі шалік.

І капялюш, і паліто, і шалік былі яўна не па сезону, але ён, відаць, не адчуваў холаду сёлетняй зімы. Не заўважалася, ва ўсякім разе, каб ён курчыўся, ці каб у яго быў сіні твар, або каб яму хацелася пацерці рукі адна аб адну.

Ён амаль штодня прыходзіў на тэлеграф. Першы раз ён з'явіўся тут два тыдні таму назад. Таня нават памятае той дзень — гэта было 16 снежня. Не, яна запомніла гэта, канешне, выпадкова, проста таму, што тады здарылася ў яе маленькая непрыемнасць: перастаўляючы лічбы на штэмпелі, Таня замест «16» паставіла «17» і цэлую гадзіну штэмпелявала квітанцыі заўтрашнім днём, пакуль нейкі педантычны кліент на звярнуў на гэта яе ўвагі.

Узяўшы ў яе бланк, ён адыходзіў да століка, садзіўся на крэсла, вымаў з кішэні аўтаручку і пачынаў пісаць. Пісаў ён звычайна многа і доўга, абдумваючы, напэўна, кожнае слова. Часам ён раптам камячыў лісточак, браў у яе новы і зноў пачынаў пісаць.

Потым ён неяк загадкава знікаў. Ён ніколі не аддаваў сваіх тэлеграм ёй. Відаць, яму заўсёды выпадала аддаваць іх у другія акенцы.

Таня не лічыла сябе асобай дужа цікаўнай. Але тут яе часам пачынала разбіраць дапытлівасць. Каму і навошта ён піша столькі тэлеграм? Хто той адрасат, які атрымлівае іх? І ці адзін ён, гэты адрасат, ці мо іх некалькі?.. Дзявоцкая сарамлівасць не дазваляла ёй абысці сябровак па тэлеграфу і пацікавіцца наконт тых тэлеграм, таму пытанні яе асталіся без адказу.

Ён усё яшчэ стаяў ля акенца і ўпарта не хацеў ісці да другіх, дзе яму, можа, адразу далі б рэшты. Ат, няхай сабе пастаіць, калі ў яго гэтулькі ўжо многа вольнага часу.

Чарга амаль не меншала. Сёння было напярэдадні Новага года, і людзям абавязкова трэба было паслаць віншавальную тэлеграму. Адкладаць такой справы на заўтра ніяк нельга. Праўда, гэта можна было зрабіць і загадзя, а не таўчыся ў чарзе іменна сёння, бо датэрміновы прыём віншавальных тэлеграм адкрыты даўно. Але хіба людзі слухаюцца голасу жыццёвай мудрасці? Яны заўжды ўсё адкладваюць на самую апошнюю гадзіну, ім заўжды некалі.

Да акенца праціснуўся каржакаваты чырванатвары мужчына ў вялікай пыжыкавай шапцы. Прыязна выскаліўшыся на ўвесь рот, ён прамовіў:

— Даражэнькая, будзьце ласкавы, тэрміновую!

Тэрміновыя прымаліся без чаргі, і таму ніхто не стаў

пярэчыць яму. Але мужчына, прасунуўшы сваю тэлеграму ў акенца, палічыў неабходным пусціцца ў тлумачэнні.

— Гэта ж у Алма-Ату ажно. А там, самі ведаеце, праз паўгадзіны ўжо і Новы год будзе. Яны ж на цэлых тры гадзіны раней за нас жывуць.

Падлічваючы словы, Таня машынальна прачытала тэлеграму. Уласна кажучы, кожную тэлеграму ёй трэба было чытаць абавязкова,— каб быў правільны адрас, каб не было памылак або апісак у тэксце. Яна па абавязку свае службы павінна была прылучацца да чужых таямніц. Чырванатвары, немалады ўжо мужчына меў, аказваецца, блазенскае імя Вовік: іменна так ён падпісаўся пад тэлеграмай. Вовік паведамляў сваёй кошачцы, якая звалася Аўдоццяй Варфаламееўнай, што атрымаў кватэру з трох пакояў, і заклікаў не сумаваць без яго ў Алма-Аце на Новы год. «Падрабязнасці пісьмом»,— абяцаў ён у канцы.

А той усё стаяў ля акенца. З нейкім вінавата-прабачлівым выглядам ён стаічна чакаў, пакуль набярэцца ў яе дробязі на рэшту. Але неяк так здаралася, што плаціць людзям за тэлеграмы прыходзілася ўсё толькі круглымі сумамі. Вось і гэтаму ўжо лысаватаму Вовіку яна сказала:

— Дваццаць два рублі.

— Дзякую, даражэнькая! — зноў выскаліўся мужчына. Хуценька разлічыўшыся, ён падхапіў з падлогі сваю туга напакаваную авоську і імкліва панёсся да выхада.

З Таніных рук ва ўсе канцы краіны ляцелі тэлеграмы, у якіх людзі прапаноўвалі сэрца, патрабавалі ўзаемнасці, абяцалі вернасць да магілы. І амаль кожная тэлеграма канчалася абавязковым пацалункам... Самой Тані ніхто тэлеграм не слаў. Ніхто нічога ёй не прапаноўваў, ніхто нічога ад яе не патрабаваў, ніхто нічога не абяцаў. Чытаючы па абавязку службы чужыя тэлеграмы, Тані часта рабілася неяк сумнавата. І яна заўсёды здзіўлялася, адкуль гэта на свеце столькі шчаслівых людзей.

Сама яна была, канешне, нешчаслівая. Бо калі б справа была іначай, хіба давялося б дзяжурыць сёння за гэтым акенцам іменна ёй?!. Цяпер палова на дзесятую. Праз дзве з паловай гадзіны настане Новы год. Людзі цудоўна сустрэнуць яго. Ссунуцца разам чаркі, прагучаць тосты, зайграе музыка, закружацца ў танцы пары. Адны будуць у тую хвіліну ў цесным сямейным кругу, другія — у гасцях у сяброў, трэція пойдуць на клубную вечa-

рынку, а тыя яшчэ — на баль-маскарад. І ўсім будзе весела, бестурботна, шчасліва. Адна яна будзе сядзець тут, за сваім акенцам на цэнтральным тэлеграфе, сядзець аж да рання, бо гэта іменна ёй выпала дзяжурыць сёння, пад Новы год. Нябось яе сяброўцы Ніне Самахвалавай не прыйдзецца адмаўляцца ад свята. Яна сваё ўжо адпрацавала, цяпер яна вольная, яна сама сабе гаспадыня.

— Тады і мне зрабіце тэрміновую,— сказала жанчына з самага канца чаргі і паціху, для сябе дадала:— А то гэтак і Новы год сустрэнеш тут у чарзе.

— А і мне ж тады таксама! — заявіў высокі афіцэр-артылерыст, які стаяў у чарзе першы.— Самую тэрміновую!

Сёння ўсе спяшаліся. Цікава, аднак, чаму ён нікуды не спяшаецца? Стаіць сабе ціхенька ля акенца і хоць бы табе слова нецярплівасці выказаў, хоць бы адным рухам выявіў неспакой або хваляванне. А ён жа не можа не бачыць, што цяпер у яе досыць ужо дробязі.

— Вам адзін бланк? — звярнулася да яго Таня.

— Але, адзін! — нібыта раптам прачнуўшыся, гучна сказаў ён і зноў прасунуў у акенца свой злашчасны рубель.

Яна адлічыла яму рэшту, дала бланк. Ён павольна, быццам з неахвотай, пайшоў ад акенца, а яна ўзяла ў чарговага кліента тэлеграму і занялася сваёй справай. Аднак бакавым зрокам Таня бачыла яго. Вось ён сеў на сваё звычайнае месца за сталом, што стаяў насупраць яе акна, няспешна выняў аўтаручку, паспрабаваў пяро на лісточку паперы і пачаў запаўняць тэлеграму.

Гадзіннік, што вісеў на сцяне проста перад Таняй, паказваў дзесяць. Таня міжвольна ўздыхнула.

Праз паўгадзіны чарга амаль зусім растала, а ў адзінаццаць да акенца толькі ўжо зрэдку падыходзілі адзінокія запозненыя наведвальнікі.

Нечакана перад акенцам вырасла Ніна Самахвалава. Яна была расчырванелая ад марозу, а мо ад радаснай узрушанасці, якой поўнілася ўся яе істота. Папраўляючы адной рукой маленькую шарсцяную шапачку, якая закрывала толькі палову галавы, а другую руку працягваючы Тані, Ніна борздзенька засакатала:

— Танечка, я да цябе на хвіліначку. Віншую, і ўсё такое іншае, а сама я пабегла. Ты нізавошта не адгадаеш, куды я запрошана!

— На баль? — стаіўшы дыхапне, спытала Таня.

— Фі, на баль!..— паморшчылася Ніна. І пасля кароткай паўзы ўрачыста паведаміла: — Я запрошана да Валерыя Вітольдавіча!

Валерый Вітольдавіч быў новай зоркай на артыстычным гарызонце, і таму не дзіўна, што Ніна адчувала сябе на сёмым небе.

«І яна от шчаслівая. І ўсе наогул шчаслівыя...» — падумалася Тані. Павекі яе часта-часта заморгалі, у горле запяршыла. І неяк непрыемна пахаладзела пад лыжачкай.

— Мне так шкада цябе, мая дзевачка, так шкада! — зноў засакатала Ніна Самахвалава.— Гэта ж думаць!.. Але ты ведай, кожны бакал я буду ў думках падымаць за цябе. Ну, бывай! З Новым годам, з новым шчасцем!

Выпісваючы нейкаму чыгуначніку квітанцыю, Таня так націснула на аловак, што той моцна трэснуў, і кончык графіту скокнуў высока ўгору.

Яна і на гэты раз не заўважыла, у каторае акенца ён аддаў сваю тэлеграму і калі ён знік. Зірнуўшы крадком на столік, за якім яшчэ нядаўна сядзеў ён, Таня ўбачыла, што столік пусты.

Адна сцяна залы выходзіла сваімі вокнамі на вуліцу. Таня старалася не глядзець у той бок. Там, за вокнамі, ярка палалі ліхтары, зіхцела ілюмінацыя, у розных напрамках імкліва, ледзь не подбегам, крочылі людзі... Не, не трэба глядзець туды!

А палове дванаццатай зала была ўжо зусім пустая. Больш ніхто на тэлеграф не заходзіў. Усе тутэйшыя павіншавалі ўжо ўсіх тамашніх, і цяпер ім асталося толькі чакаць, пакуль стрэлкі гадзінніка сыдуцца разам, а тады ўжо тут віншаваць адзін аднаго.

Хутчэй, хутчэй прыходзь, Новы год!

Варта было, бадай-што, падлічыць сённяшнюю выручку. План яна, безумоўна, перавыканала, і цяпер прэмію ёй дадуць абавязкова. А вось Ніне Савахвалавай аб прэміі і думаць няма чаго. За месяц Ніна не зрабіла і паловы таго, што зрабіла яна, Таня. Ды і ў астатніх прыёмшчыц, здаецца, паказчыкі не такія багатыя, як у яе. Але брацца за падлікі цяпер Тані не хацелася. Да дванаццаці аставаліся ўжо лічаныя мінуты,— няхай хоць гэтыя мінуты будуць належаць ёй. Яна прыдумае зараз тост і ў дванаццаць скажа яго сама сабе.

— Прабачце...— пачула яна раптам нечы дужа знаёмы голас.— Вазьміце, калі ласка, тэлеграму.

Значыцца, ён прыйшоў зноў. Таня адразу пазнала яго голас. Вось дзівак! Пісаў, пісаў тэлеграмы, а самую галоўную, відаць, і забыўся напісаць.

Яна паглядзела на яго. Ён меў, як і раней, усё той жа вінавата-прабачлівы выгляд. Капялюш і паліто ў яго былі злёгку зацярушаны снегам. Некалькі іскрыстых сняжынак ляжала і на бровах; яны доўга не раставалі...

— Давайце, хутчэй! — строга сказала Таня.

Тэлеграма была кароткая, вельмі кароткая. У ёй было напісана: «Ад самага шчырага сэрца — з Новым годам вас, з новым шчасцем!»

Тэкст быў, канешне, самы звычайны, такі, які і павінен быў быць сёння. За змену яна адправіла гэткіх тэлеграм уга колькі!..

Але, адправіла яна іх многа. А сама не атрымала ніводнай...

— А дзе ж адрас? — схамянулася раптам Таня.— На тэлеграме няма адраса. Каму вы пасылаеце яе?

— Вам.

Ён паглядзеў ёй у вочы і пачырванеў.

— Вам,— паўтарыў ён. Потым, спяшаючыся, дастаў з кішэні яшчэ цэлы пук тэлеграфных бланкаў, скрозь спісаных адным і тым жа буйным мужчынскім почыркам.— І гэта — таксама вам.

— Мне?.. — ціха спытала Таня і таксама пачырванела. Аказваецца, ён нікуды не пасылаў тых сваіх тэлеграм-лістоў. Усе яны прызначаліся ёй адной...

— Але. Вы не будзеце крыўдаваць?

Яна нічога не паспела адказаць яму. Якраз у гэтую хвіліну на радыёвузле ўключылі магутны дынамік, што вісеў над уваходам у залу. З дынаміка на іх паплыў меладычны перазвон крамлёўскіх курантаў, потым гучна бумкнуў раскацісты ўдар, за ім другі, трэці...

Бум!.. Бум!.. Бум!..— велічна і ўрачыста абвяшчаў прыход новых здзяйсненняў крамлёўскі гадзіннік.

— А ведаеце, гэта добра, што вы сёння дзяжурыце,— сказаў ён.— Што вы сёння на пасту.

— Добра? Чаму — добра?

— Бо іначай хіба здолеў бы я сустрэць Новы год разам з вамі? — Ён усміхнуўся.— Таму я за тых, хто на пасту!

«А такіх сёння многа,— нечакана падумала Таня.— Напрыклад, на чыгунцы — колькі іх!»

— Бум!.. Бум!..— біў і біў гадзіннік.

А ў вокнах раптам асляпляльна заззяла дзівоснае зарыва. У ім былі самыя розныя колеры — чырвоныя, зялёныя, белыя, сінія. Гэта ў неба шугануў святочны феерверк.

Наставаў Новы год.

*1955*

# БЕЛЫ КАПЯЛЮШЫК

Гэта, ці ведаеце, дужа прыемна — купляць падарункі любімаму чалавеку. У тым Андрэй цвёрда перакананы. І не было яшчэ выпадку, каб ён прыехаў з камандзіроўкі з пустымі рукамі. А ездзіць у камандзіроўкі яму, маладому інжынеру-будаўніку, даводзіцца часта. І кожны раз ён хоць што-небудзь ды прывязе сваёй нявесце Святлане. Нядаўна, калі быў у Віцебску, купіў прыгожы дыванок. Раней з Баранавіч прывёз цудоўны хрусталёвы сервіз. Ну і цяпер з Мінска што-небудзь прывязе, гэта ўжо напэўна! Тут універмаг такі, што ажно вочы разбягаюцца...

Да універмага было яшчэ два ці тры кварталы. Андрэй крочыў не спяшаючыся, пазіраючы навокал цікаўнымі вачыма. Якім прыгожым за апошнія гады стаў Мінск, як ён вырас! Колькі вясёлых, прыгожа апранутых людзей на вуліцах!

Вось насустрач па праспекце ідзе прыгожая дзяўчына ў квяцістым плацці. На галаве ў яе белы капялюшык. Левай рукой яна прыціскае да грудзей белую з залацістым абадком сумачку, на якой зверху ляжыць загорнуты ў шэрую паперу невялічкі пакуначак, а ў правай трымае дарожны чамаданчык. На твары ў дзяўчыны — шчаслівая ўсмешка.

Калі дзяўчына прайшла міма, Андрэй павярнуўся і паглядзеў ёй услед. «От бы натрапіць на такі капялюшык!» — падумаў ён. І тут раптам зразумеў, чаго так усміхалася дзяўчына. «Гэта ж яна, відаць, купіла сабе абноўку. І, напэўна, якраз па густу. А капялюшык, сапраўды, прыгожы: белы, з шырокімі палямі, перавязаны чорнай істужкай, а з правага боку гарацьмаленькія кветачкі... От бы Святлане такі купіць!»

Па праспекце ідуць і ідуць людзі. Быццам увесь горад выйшаў сёння на вуліцы. Каля ўвахода ва універмаг асабліва мнагалюдна. Адны заходзяць туды, другія выходзяць з пакункамі ў руках...

Шырокія масіўныя дзверы гасцінна ўпусцілі Андрэя ва універмаг. Ён рашыў спачатку абысці ўсе паверхі і ўсё паглядзець, а потым ужо купіць, што яму дзе спадабаецца.

Так і зрабіў. Прайшоўся па ўсіх аддзелах першага паверха, падняўся на другі, потым на трэці.

Можна было б купіць сумачку. Тая цёмна-карычневая акурат пасавала б да Святланінага плацця, якое яна пашыла сабе нядаўна. А можа ўзяць вунь таго блакітнага крэпдэшыну? Цудоўная блузка атрымалася б! Белыя скураныя пальчаткі — таксама рэч, якраз да сезона!.. А туфлі! Чорныя лакіраваныя лодачкі?..

Не, лепш за ўсё — пярсцёнак. Вось гэты, залаты, з ярка чырвоным рубінам, які ўвесь аж гарыць агнём!

Андрэй выпісаў чэк, заплаціў у касу грошы, папрасіў прадаўшчыцу прымераць пярсцёнак. Прадаўшчыца нават пачырванела ад прыемнасці, калі надзела яго на палец. Потым яна асцярожна паклала пярсцёнак у невялічкую аксамітную каробачку і ўрачыста падала яе Андрэю.

Задаволены Андрэй адышоў ад прылаўка. Спяшацца яму не было куды, бо да адыходу поезда па Оршу заставалася амаль тры гадзіны, а спраў больш няма ніякіх. Праўда, трэба было яшчэ паабедаць на дарогу, але гэта ён паспее зрабіць на вакзале. І Андрэй пайшоў далей па універмагу — проста так, без усялякай мэты, абы хутчэй мінаў час.

Падышоў да аддзела, дзе прадаваліся галаўныя ўборы, зірнуў на паліцы... і вочы яго заблішчалі. На паліцы горкай ляжалі жаночыя капялюшыкі, акурат такія, як у тае дзяўчыны на вуліцы: белыя, з шырокімі палямі, з чорнай істужкай і з маленькім букецікам кветачак па правым баку. Нейкая жанчына прымярала сабе такі капялюшык, круцячыся каля люстэрка. А яшчэ тры ці чатыры жанчыны глядзелі на яе і, ухваляючы,ківалі галовамі.

Андрэй выцягнуў з кішэні бумажнік. Пералічыў грошы і ўздыхнуў... Капялюшык каштаваў семдзесят шэсць рублёў, а ў бумажніку было роўна восемдзесят. Наперадзе ж немалая дарога. Праўда, білет ужо куплены, але ж трэба харчавацца. Раніцой ён паснедаў слабавата, толькі выпіў

пару шклянак чаю са здобай. Есці і зараз ужо хочацца, а схаць трэба аж да ночы...

Але ж і капялюшыкі — лепшых не прыдумаеш! Мусіць, вялікі знаўца сваёй справы рабіў іх. Вачэй не адвесці!

Жанчына яшчэ крышку пакруцілася каля люстэрка і пайшла, урачыста несучы на галаве белую мару. Андрэй па натуры не быў зайздроснікам, але цяпер у яго душы заварушылася нешта падобнае на зайздрасць...

«Эт, даеду як-небудзь. На папяросы застанецца, і добра. Купляю!»

Капялюш загарнулі ў тонкую ружовую паперу, паклалі ў кардонку, перавязалі шпагатам, зрабілі вузельчык, каб зручней было несці. Андрэй падхапіў кардонку і з лёгкім сэрцам пакрочыў уніз па лесвіцы...

Невысокі, з простым адкрытым тварам, апрануты ў цёмна-шэры касцюм, Андрэй нічым не вылучаўся сярод іншых прахожых. Але яму здавалася, што сёння ўсе павінны былі звяртаць на яго ўвагу: ён жа валодае дзвюма такімі цудоўнымі рэчамі, прызначанымі ў падарунак найпрыгажэйшай у свеце дзяўчыне, настаўніцы Святлане Куліні́ч.

Тым часам людзі ішлі кожны сваёй дарогай, і ніхто не заўважаў яго асаблівага, прыўзнятага настрою. Андрэй і не крыўдзіўся. Нічога! Ёсць на свеце чалавек, для якога ён — фігура першай велічыні! Ёсць такі чалавек!

Пачку «Нёмана» і карабок запалак Андрэй купіў на пероне. Заставаўся яшчэ рубель з капейкамі. Выпіў бутэльку напітку з журавін. Выпіў і ўзрадаваўся: перастала хацецца есці... Але перастала ненадоўга. Увайшоўшы ў сваё купэ, Андрэй аж паморшчыўся: так засмактала пад лыжачкай!

У купэ яшчэ нікога не было. Андрэева месца аказалася на верхняй лаўцы.

— Вось і добра,— падумаў ён.— Забяруся і буду спаць да самай Оршы.

Увайшла бабуля ў старамоднай, з мноствам фальбон, шырачэзнай спадніцы і гэткай жа старамоднай кофце. За ёй насільшчык прынёс цэлую гару чамаданаў і клункаў.

— Дзень добры, сынку! — ласкава прывіталася бабуля і пачала рассоўваць па купэ свае пажыткі. Гаспадарыла яна, нібы ў сваёй хаце.

— Ці далёка, бабуля, сабраліся? — запытаўся Андрэй, паклаўшы ў багажнік сваю кардонку.

— І не кажы — махнула рукой бабуля.— Не ведаю ўжо нават, ці давязу свае косці. Ва Уладзівасток ажно!

Бабуля расказала Андрэю, што ва Уладзівастоку жыве яе старэйшы сын, капітан далёкага плавання. Сын гэты і настаяў, каб яна пераехала да яго жыць.

Дзверы зноў адчыніліся.

«Вось дык цуд! — здзівіўся Андрэй.— Тая самая дзяўчына!»

— Э, да мы з вамі, аказваецца, спадарожнікі!.. — вевесела прамовіў Андрэй.

Дзяўчына, не разумеючы, паглядзела на Андрэя.

—Хіба мы знаёмыя? Нешта не прыпамінаю...

«Вось дзівак я! — упікнуў сябе Андрэй.— Дзе ж ёй ведаць мяне?»

— Ды не, гэта я проста так,— сумеўся ён.— Едзем у адным купэ, ну дык і спадарожнікі.

— А-а-а,— працягнула дзяўчына.— Вядома...

На галаве ў яе быў той самы цудоўны белы капялюшык. Агледзеўшы купэ, дзяўчына аблюбавала кручок каля дзвярэй і асцярожна павесіла на яго свой неацэнны скарб. Пасля зірнула на білет і ўздыхнула:

— Шкада... Верхняя лаўка.

— Маліцеся, каб чацвёртым пасажырам быў мужчына,— жартаўліва сказаў Андрэй.— Тады памяняецеся.

— Буду маліцца! — у тон яму сказала дзяўчына.— А пакуль што сяду тут.

Калі поезд ужо кратаўся з месца, у купэ ўбег запыханы мужчына,— нізкага росту, шыракаплечы, рухавы. Дзяўчына адразу ж пайшла ў атаку:

— А ваша месца — вунь! — паказала яна рукой на верхнюю лаўку.

— Правільна! — здагадаўшыся ў чым справа, згадзіўся новы пасажыр.— Толькі дазвольце аддыхацца. Ух!.. Ведаеце, ледзь не спазніўся.

Поезд рушыў. У купэ зайшла правадніца. Яна забрала білеты, прапанавала пасцельную бялізну. У бабулі ўсё было сваё, а мужчына і дзяўчына ўзялі пасцелі.

Андрэй жа толькі буркнуў:

— Мне недалёка...

Закінуўшы на лаўку плашч і кепку і паклаўшы туды тоўсты партфель з жоўтай скуры, мужчына весела прамовіў:

— Давайце, суседзейкі, пазнаёмімся. Згода? — І, не

чакаючы адказу, ён адрэкамендаваўся: — Мяне завуць Паўлам Данілавічам. Еду ў Маскву, у камандзіроўку. Увесь да вашых паслуг.— І ён прыціснуў руку да грудзей.

Павел Данілавіч быў, відаць, адным з тых людзей, якія ўсюды адчуваюць сябе, як кажуць, у сваёй талерцы.

— Уладзівасток? — узрушана сказаў ён, калі бабуля першая адгукнулася на яго прапанову.— Дык у мяне ж там брат. Стрыечны брат. Майстрам на хлебазаводзе працуе. Э-э, дык мы з вамі выходзіць, амаль сваякі.

— Ды ўжо ж, сваякі,— засмяялася бабуля.

— Я пашлю яму тэлеграму, ён зойдзе да вас. Абавязкова зойдзе. А вы яму раскажаце пра мяне, усё чыста раскажаце.

— Што ж я яму раскажу? — здзівілася бабуля.— Я ж цябе першы раз у жыцці бачу.

— Гэта нічога, нічога. Даведаецеся пра мяне ўсё. Да Масквы я ўпраўлюся расказаць вам усё да дробязі. А вы — яму. А то, ці ведаеце, другі год збіраюся пісьмо напісаць і ніяк не збяруся. А тут — жывое пісьмо. Цудоўна!

Дзяўчына паведаміла, што яе завуць Людміла, едзе яна ў Асінаўку, працуе на Асінторфе гідраманіторшчыцай, а акрамя таго — завочніца політэхнічнага інстытута і якраз цяпер была на заліковай сесіі. Здала ўсё на «выдатна».

— З чым і віншую! — сардэчна сказаў Павел Данілавіч і, выняўшы з партфеля, падаў ёй плітку шакаладу.— Няхай ваш шлях у навуку будзе такі ж салодкі, як гэты шакалад.

Расказваючы, дзяўчына час ад часу замілавана пазірала на свой капялюшык.

Андрэй таксама расказаў што-кольвечы аб сабе.

— А жанаты? Ці не? — цікаўна дапытваўся Павел Данілавіч.— Э-э, можаце не адказваць, яно і так відаць. Вунь на лбе напісана: жаніх. Так?.. Канешне, так. І вязе нявесце падарункі. Так?

— Вязу,— прызнаўся Андрэй.

Набліжалася станцыя Барысаў.

— Я ж тут некалі жыла,— сказала дзяўчына.— Калі была малая. Бацька тады на шклозаводзе працаваў. Выйду, можа каго знаёмага сустрэну на вакзале.

Яна зняла з кручка капялюшык, надзела яго і выйшла з купэ. Павел Данілавіч таксама выйшаў. Андрэй і бабуля засталіся.

Прастаяўшы свае хвіліны, поезд пайшоў далей.

— Не, нікога не сустрэла,— вярнуўшыся ў купэ, расчаравана прамовіла дзяўчына.

— Не сустрэлі? — перапытаў, ідучы следам за ёй, Павел Данілавіч.— Ну, гэта нічога. А паштоўку аднаму маладому чалавеку, відаць, мы ўсё ж управіліся напісаць? — хітра спытаў ён, падміргваючы не то Андрэю, не то бабульцы.

Дзяўчына, пачырванеўшы, падышла да акна. Мусіць не хацелася ёй верыць, што на вакзале няма нікога з яе знаёмых. Поезд пайшоў, а яна ўсё глядзела на перон. За акном праплылі станцыйныя пабудовы, пачалося поле...

— Ой! — ускрыкнула раптам дзяўчына і аберуч схапілася за галаву. Андрэй зірнуў і таксама ледзь не ўскрыкнуў: хваляй ветру з акна ў дзяўчыны сарвала з галавы запаветны капялюшык і панесла... Андрэй хутка высунуўся ў акно... Вось капялюшык дакрануўся да зямлі і пакаціўся — усё далей і далей... Праз якую хвіліну ён ператварыўся ў маленькую белую кропачку, а яшчэ праз хвіліну і зусім знік з вачэй...

Андрэй паглядзеў на дзяўчыну. Светлыя вочы яе пацямнелі, сталі вільготныя. Яна ледзь стрымлівалася, каб не заплакаць.

— Вось табе і маеш... — толькі змог прамовіць Андрэй і азірнуўся назад. Ні бабуля, ні Павел Данілавіч нічога не заўважылі, а можа не хацелі падаваць выгляду, што заўважылі. Бабуля сядзела ў куточку і аб нечым засяроджана думала. Павел Данілавіч вымаў з партфеля нейкія пакуначкі.

— Ёсць прапанова, сябры мае,— сказаў нарэшце Павел Данілавіч.— Пакінем усе іншыя заняткі і прыступім да самага галоўнага ў кожнай дарозе. Падсілкуемся! Тым больш, што нейкі мудрэц даўно зазначыў, што голад — не цётка.

Павел Данілавіч паклаў свае пакункі на столік, разгарнуў іх. У Андрэя аж слінкі пацяклі. На століку ляжалі яйкі, сала, курыца, дамашнія булачкі. Стаяў слоік з маслам, і другі — з кетавай ікрой. А Павел Данілавіч злазіў яшчэ ў свой пухлы партфель і паставіў на столік бутэльку сталовага віна. Пасля збегаў да праваднікоў і прынёс шклянкі.

— Апетыт нагоняе — ага! — гаварыў ён, разліваючы віно.— Ну, прашу да стала, пакаштуйце, што мне тут

Ніна Іванаўна нагатавала. Яна хваліла, што ўсё тут вельмі смачнае, але я адзін наўрад ці разбяруся. І Павел Данілавіч яшчэ раз гасцінна запрасіў бабулю, дзяўчыну, Андрэя.

— Дзякую,— сказаў Андрэй, злазячы з лаўкі, каб пайсці ў калідор.— Я ў Мінску на вакзале падсілкаваўся так, што да заўтра есці не захочацца...

— Э-э, не-не, крэўна пакрыўдзіце! — горача загаварыў Павел Данілавіч.— І мяне пакрыўдзіце і Ніну Іванаўну, жонку маю. Калі ласка, сядайце.

Як не аднекваўся Андрэй, а сесці прыйшлося. Бабуля і дзяўчына далучылі да прыпасаў Паўла Данілавіча свае пачастункі. І пачалася трапеза, якая можа толькі быць у вагоне, сярод выпадковых спадарожнікаў, якія некалькі гадзін назад нават і не падазравалі аб існаванні адзін другога, а цяпер нібыта былі звязаны даўнім трывалым сяброўствам. Павел Данілавіч увесь час сыпаў жарты, расказваў анекдоты, бабуля і Андрэй таксама сёе-тое ўстаўлялі ў размову, а на долю дзяўчыны заставалася толькі смяяцца. Але час ад часу Людміла, успомніўшы пра свой капялюшык, станавілася сумнай, задуменнай. Відаць, тады ёй было не да смеху.

...Сцямнела. Запалілі электрычнасць. Андрэй і Павел Данілавіч падаліся ў калідор пакурыць.

— Як бы гэта мне даведацца яе адрас? — распаліўшы папяросу, задуменна прагаварыў Павел Данілавіч.

— Чый адрас?

— Ды Людмілы нашай... З Масквы можна было б прыслаць ёй такі самы капялюшык.

Андрэй прамаўчаў.

За акном прамільгнуў нейкі паўстанак. Поезд ішоў, набіраючы хуткасць. Плаўна пагойдваўся вагон.

— Ну, нічога, у Асінаўцы я знайду прычыну. Прыдумаю што-небудзь.— Павел Данілавіч затушыў акурак, выкінуў яго ў акно і, накіроўваючыся ў купэ, сказаў:— Прыемна, ці ведаеце, рабіць людзям прыемнае!

Бабуля ўжо спала. Павярнуўшыся тварам да сцяны, ляжала і дзяўчына. Можа, і яна спала. Павел Данілавіч па-гаспадарску выключыў святло, запаліў сіняе начное і, пажадаўшы Андрэю добрай ночы, таксама лёг. Неўзабаве ён ужо салодка спаў спакойным сном закаханага ў жыццё чалавека. Андрэю трэба было ехаць яшчэ больш за гадзіну, і ён прылёг на лаўку.

Але спаць не хацелася, розныя дзіўныя-дзіўныя думкі круціліся ў галаве... Вось добра было б, калі б Святлана здагадалася, што ён прыедзе не заўтра, як збіраўся, а сёння, і прыйшла яго сустракаць... Або няхай здарылася б так, што яму, інжынеру трэста Сіўцову Андрэю Якаўлевічу, далі чарговы адпачынак не ў кастрычніку, як вызначана па графіку, а цяпер, у жніўні... Ці вось здарылася б такое: узняўся б каля Барысава незвычайнай сілы віхор, узняўся, ды і памчаўся наўздагон поезду; а ў тым віхры быў бы дзяўчынін капялюшык, даляцеў бы ён да вагона, а тут — скок у акно, гоп на столік...

Андрэй прыўзняўся на лаўцы, зірнуў уніз. Дзяўчына па-ранейшаму ляжала, павярнуўшыся да сцяны. Андрэю пачулася, нібы яна ўздыхнула.

Не, няма такой сілы, якая здолела б вярнуць дзяўчынін капялюшык!..

Поезд прыцішваў ход. Зараз будзе Орша.

Андрэй дастаў з багажніка сваю кардонку, злез з лаўкі. У купэ было ціха і спакойна. Толькі чуваць было, як недзе пад падлогай прыглушана рыпяць тармазы. Потым загаварыла нешта спрасонку бабуля.

Раптам Андрэй усміхнуўся нейкай сваёй думцы. Ён хутка выняў з кішэні складаны ножык, разрэзаў шпагат на кардонцы, разгарнуў паперу. Капялюш заняў амаль увесь столік...

Ціхенька, па дыбачках, Андрэй выйшаў з купэ, асцярожна зачыніў за сабою дзверы. Па дарозе ў тамбур выкінуў за акно кардонку і паперу.

Поезд спыніўся. Андрэй саскочыў з вагона і хутка пайшоў да яркіх агнёў вакзала.

Насустрач яму з вакзала бегла дзяўчына.

*1952*

# ЗЯЛЁНЫЯ АГНІ

## 1

Сёння ў машыніста Васіля Артамонава незвычайны рэйс. Яго камсамольска-маладзёжная брыгада паедзе па новаму ўшчыльненаму графіку. Гэты графік распрацаваны самім жа Артамонавым разам з дыспетчарамі. На паперы ўсё выглядала як нельга лепш. А як будзе на справе?..

На перон выходзіць дзяжурны па станцыі. Яго чырвоную фуражку Васіль бачыць здалёк. Дзяжурны падымае ўгору руку са сцяжком. Гэта ён дае сігнал галоўнаму кандуктару. Той падносіць к роту свісток, і да Васіля далятае прарэзлівая трэль. Гэта ўжо сігнал яму, машыністу. Васіль цягне за рычаг, і раніпшюю цішыню абуджае зычны паравозны гудок. Здрыгануўшыся ўсім сваім магутным целам, паравоз крануўся і пайшоў.

Як прыемна адчуваць нарастанне хуткасці! Вось насустрач плыве будынак вагоннага дэпо. Вось набліжаецца вежа вадакачкі. Нібы спяшаючыся па спатканне з паравозам, яна ўсё шпарчэй і шпарчэй бяжыць насустрач. Секунда — і вежа праляцела ўжо, знікла... А будка стрэлачніка прамільгнула ў адзін момант! Хутчэй і хутчэй круцяцца колы паравоза, і поезд ляціць, ляціць... Вось ён прагрукацеў на выхадных стрэлках, вось і светафор, падміргнуўшы зялёным вокам, застаўся ззаду, а стрэлка, што паказвае хуткасць, усё паўзе ды паўзе ўгору. Васіль задаволена ўсміхнуўся.

У расчыненае акно паравознай будкі ўляцеў промень узыходзячага сонца. Васіль высунуўся з акна. У твар ударыў халодны струмень ранішняга паветра. Імкліва прабег міма невялічкі лясок. Бліснула і знікла рэчка. Прамчаліся хаткі вёскі. І вось перад вачыма распасцёрся неабсяж-

ны прастор палёў. Куды ні паглядзіш — усюды мора рослай збажыны...

— Вось хараство! — чуе Артамонаў за спіной.

Ён азіраецца. У супрацьлеглае акно паравознай будкі высунуўся яго памочнік Фёдар Прасмак і таксама захапляецца відовішчам калгаснага багацця.

А на тэндэры заняты сваёй справай качагар Паўлюк Бярозкін. Ён з выгляду і падобны на маладзенькую бярозку: танклявы, гонкі, на галаве — капа кучаравых белых валасоў, якія не хочуць прызнаваць аніякай прычоскі. Ружовыя шчокі Паўлюка ў чорных плямах,— мусіць хлопец забыўся, што яго рукі ў вугальным пыле, і пэцнуў сябе. Ну як тут стрымацца ад смеху, гледзячы на яго!..

Паўлюк жа, не разумеючы, чаго ўсміхаецца Артамонаў, пытаецца ў яго:

— Васіль Пятровіч, ці не намачыць вугалёк?

Так, вугаль трэба было б намачыць. Але апальваць паравоз, сачыць за якасцю вугаля — справа памочніка машыніста, і Артамонаў гаворыць:

— Паглядзі, Фёдар, як яно там...

І глядзіць уперад, туды, дзе ў блакітнай далечыні павінен хутка паказацца ўваходны светафор станцыі Палядзічы.

Тым часам Фёдар з важным выглядам падыходзіць да Паўлюка, хвіліну ці дзве пільна ўглядаецца ў гару вугалю, быццам рашае складанейшую задачу, і гаворыць:

— Дробненькі, бач, сёння вугаль. А што выходзіць, калі мы кідаем у топку дробнае паліва? Выходзіць вось што. Часцінкі яго падхопліваюцца цягай паветра і, не паспеўшы згарэць, вылятаюць у трубу. Каб папярэдзіць такое марнатраўства, трэба абліць вугаль вадой.— Фёдар выцягвае перад носам Паўлюка ўказальны палец.— Часцінкі вугалю намокнуць, робяцца цяжэйшымі, і тады іх не так ужо лёгка выдзьмухнуць з топкі. Жадаюць яны ці не жадаюць, а гарэць ім прыйдзецца!

Па твары Паўлюка відаць, што ён і сам добра ведае, навошта змачваюць вугаль, але ён цярпліва выслухоўвае ўсю прамову.

— Змачвай! — загадвае нарэшце Прасмак.

Паўлюк схапіў шланг, адкруціў кран. З шланга вырваўся струмень вады і, ударыўшыся аб вугаль, срабрыстымі пырскамі рассыпаўся па тэндэры. У пырсках на нейкі міг успыхнула вясёлка.

— Э-гэ-гэ-эй-й!..— узбуджана зарагатаў Паўлюк.

«З хлопца выйдзе заўзяты паравознік,— адзначае ў думках Васіль Артамонаў.— Бач, як завіхаецца!..»

Сонца паднялося над гарызонтам, прыкметна пацяплела. Паравоз, рассякаючы паветра сваімі магутнымі грудзьмі, усё ляціць і ляціць. За паравозам цягнецца доўгі, можа на цэлы кіламетр, састаў платформ.

Васіль на хвілінку азіраецца назад, потым зноў накіроўвае позірк уперад. Паказаўся апавяшчальны шчыт з трыма чорнымі палоскамі. Ён хутка наблізіўся, прамільгнуў міма, а за ім праз роўныя прамежкі часу праляцелі яшчэ два шчыты.

Зараз будзе відзён уваходны светафор станцыі Палядзічы... Вунь і ён. Але што гэта?.. Вока светафора гарыць не зялёным, а жоўтым агнём: значыць, выхадны сігнал — чырвоны, і далей ехаць нельга, трэба спыняцца на станцыі... А дыспетчар жа абяцаў прапусціць поезд праз Палядзічы без прыпынку!..

Васіль хоча ўзяць трубку мікрафона, каб пагаварыць па радыё з дзяжурным па станцыі, але раптам бачыць: жоўты агеньчык патух, запаліўся зялёны. «Дыспетчар трымае слова!» — з прыемнасцю думае машыніст і дае кароткі гудок.

Не змяншаючы хуткасці, поезд падлятае да Палядзічаў. Станцыя ў гэты ранішні час бязлюдная. На пероне — толькі дзяжурны, што сустракае поезд, высока ўзняўшы скручаны ў трубку сцяжок. Дзяжурны — прыгожая дзяўчына — ветліва ўсміхаецца. З-за пляча Артамонава высоўваецца Паўлюк і махае ёй рукою. Дзяўчына смяецца. Але голасу яе не чуваць, бо ўсе гукі заглушае працяглы гудок паравоза.

— Гу-гу-у-у-у...— разносіцца навокал.

Поезд імчыць далей.

Радасна на душы ў Васіля.

Але не толькі таму радасна, што ўдала складваецца паездка. Ёсць на гэта і яшчэ адна прычына, бадай, больш важная.

Ён увесь час думае аб гэтым. Забудзецца на якую хвіліну, потым зноў пачынае думаць аб тым, што чакае яго ўвечары, калі ён вернецца з паездкі. Вось і зараз. Ледзь толькі прамільгнуў агеньчык выхаднога светафора Палядзічаў і перад вачыма распасцёрлася залітая сонцам далячынь, думкі Васіля вярнуліся да ранейшага... Успомніўся

яму ўвесь апошні год, а выразней за ўсё дзень, з якога ўсё пачалося...

О, гэта быў незабыўны дзень!.. І між іншым, ён шмат чым нагадваў сённяшні.

## 2

Тады, як і сёння, ён вёў цяжкавагавы састаў. Поезд ішоў хутка, але Васілю, як і цяпер, хацелася, каб ён бег яшчэ хутчэй. І тады, як сёння, ён думаў аб ёй, аб Лізе, спадарожніцы свайго дзяцінства і мары юнацтва. Вось толькі тады не свяціла сонца, а, наадварот, ішоў зацяжны дождж. Цёмнае неба нізка вісела над зямлёй, і з яго ліло і ліло, як з вядра.

— Эх, прарвала, ліха на яго! — гаварыў Прасмак, незадаволена круцячы галавой.

Прасмак быў тады яшчэ не Фёдар, а проста Федзя, бо спяцоўка нядаўняга выхаванца рамесніцкага вучылішча ніяк не дазваляла зваць яго інакш. Гэта цяпер ён памочнік машыніста, а тады быў яшчэ качагарам. І Васіль Артамонаў бурчаў на яго:

— Федзя, змоўкні, і без цябе моташна.

Хлопец лез на тэндэр і пачынаў пералапачваць вугаль.

А Васіль стаяў каля акна і ўсё думаў аб ёй, аб Лізе.

...Была ў яго ў дзяцінстве адна знаёмая дзяўчына, Ліза Глушкевіч. Гэта было ў 1938 годзе. Лізе тады мінула дванаццаць год, Васілю — чатырнаццаць. Жылі яны бедна,— ведама ж, як жылося працоўным у заходніх абласцях Беларусі пры панах. Бацька Лізы быў беспрацоўным. Васілёў бацька таксама перабіваўся выпадковымі заработкамі. Іх сем'і жылі побач, на адной вуліцы. Агульнае гора і нястачы зблізілі іх. Бацькі, чым маглі, па суседству дапамагалі адзін аднаму. А Васіль і Ліза былі проста неразлучныя. Разам гулялі, нікуды з вуліцы не хадзілі адзін без аднаго. Васілю, як старэйшаму і больш дужаму, не раз даводзілася абараняць Лізу ад розных крыўдзіцеляў, і ён ахвотна накладаў ім у каршэнь.

А пасля Ліза паехала. Ашуканы казкамі пра заакіянскі рай, яе бацька прадаў свою хаціну і падаўся ўсёй сям'ёй у Амерыку...

Як сустрэла іх чужына, ніхто не ведаў, аднак вясной трыццаць дзевятага года Лізіна маці прыслала пісьмо, якое Васіль запомніў на ўсё жыццё. «А яшчэ паведамляю

вам, мае дарагія суседзі, што засталася я горкай удавою. Трапіў наш карміцель у пілу, што бярвенні пілілі...»

Ліза, Ліза, чаго ты паехала ў тую далёкую чужую краіну? Чаго?..

Мінула яшчэ некалькі месяцаў. З-за акіяна прыйшло другое пісьмо, такое ж бязрадаснае, поўнае адчаю і роспачы...

А над іх горадам, над усімі «ўсходнімі крэсамі» доўгачаканай шчаслівай зарою ўзышоў верасень 1939 года. І тое, у пошуках чаго загінуў Лізін бацька, прынесла ў хаты жыхароў заходніх абласцей Беларусі Савецкая Армія-вызваліцельніца.

Ішоў час. Пачалася вайна з фашысцкай Германіяй. Восенню 1941 года Васіль стаў сувязным партызанскага атрада, а зімой і наогул застаўся з партызанамі. Яны тады здорава грамілі фашыстаў!

Доўгачаканае пісьмо ад Лізы прыйшло неўзабаве пасля Перамогі. У Васіля дрыжалі рукі, калі ён раскрываў канверт. З канверта выпала фотакартка. Васілю ўсміхалася прыгожая пышнавалосая дзяўчына. «Гэта ты, Ліза? — шаптаў Васіль.— Ты, вядома, ты... Але чаму ў цябе такія сумныя вочы? Чаму столькі смутку ў тваёй усмешцы?..»

«Кідай усё і прыязджай дамоў, на Радзіму! — пісаў ён Лізе.— У нас тут цяпер такое жыццё!..»

Але Ліза не магла прыехаць. У яе хварэла маці. «Маці доўга не пражыве,— пісала ў наступным пісьме Ліза,— і гэта вельмі страшна. Што чакае мяне пасля яе смерці?.. Ты ж многага не ведаеш...»

Васіль не разумеў, на што намякала Ліза. Здзівіла яго толькі, што почырк на гэты раз быў незнаёмы, чужы. У канцы пісьма было прыпісана, што ў Лізы захварэла рука і пісьмо напісала пад яе дыктоўку суседка.

Маці яе памерла ў маі сорак восьмага. А Ліза ўсё не ехала. Васіль падумаў, што, можа, у яе няма за што купіць білет, і паслаў ёй грошы. Два пісьмы прыйшло пасля таго ад Лізы, і ў кожным яна пісала, што вярнуцца на Радзіму, пацалаваць родную зямлю ёсць яе самая найшчаслівейшая мара.

Васіль напісаў пісьмо ў «Праўду», у міністэрства замежных спраў. І раптам яму прынеслі тэлеграму: Ліза адплыла з Нью-Йорка.

Так, гэта быў незабыўны дзень!..

Поезд, у якім ехала Ліза, павінен быў прыйсці ў дзесяць сорак раніцы. А Васіль акурат быў на рабоце, у паездцы, і вярнуцца з рэйса павінен быў толькі каля дванаццаці гадзін дня. Лізу сустракалі на вакзале яго бацькі. А ён у гэты час вёў цяжкавагавы састаў. Ліў дождж, неба было зацягнута свінцовымі хмарамі, але на сэрцы ў Васіля было светла і радасна.

Федзя моўчкі peралапачваў вугаль. Ён ведаў усю гісторыю Лізы і добра разумеў, як зараз хвалюецца яго друг.

Як толькі яны закончылі рэйс і вярнуліся, Васіль адразу ж здаў паравоз напарніку і падміргнуў Федзю:

— Ну, пойдзем!

— Пойдзем...

Яны памыліся ў дэпоўскім душы, пераапрануліся. Дождж на двары нечакана перастаў, і яны ледзь не подбежкі заспяшаліся да Васіля. Вось і дом. Васіль нецярпліва ўскочыў на ганак, уляцеў у хату. Але тут яму перагарадзіла дарогу маці. Яна нешта міргала яму, шаптала, але Васіль не чуў яе, не разумеў. Позіркам ён адшукаў дзяўчыну, што сядзела на канапе.

— Гэта Вася? — пачуўся ціхі, знаёмы голас.

Васіль працягнуў рукі і пайшоў да яе. Ліза павярнулася да яго і парывіста ўстала. Але вочы дзяўчыны глядзелі чамусьці не на яго. Іх позірк усё яшчэ быў накіраваны на дзверы...

— Дзе ж ты, Вася?..— ціха сказала Ліза і зрабіла нецярплівы рух рукою.

Пальцы Лізы, уздрыгваючы ад хвалявання, дакрануліся да Васілёвага пінжака... На Васіля глядзелі не сінія, а белыя нежывыя вочы, і буйныя слёзы адна за другой каціліся з іх...

І тады Васіль усё зразумеў: яна была сляпая.

Ён абняў яе, прыціснуў да грудзей.

— Добры дзень,— пачуўся нерашучы голас Федзі.

Ліза ўздрыгнула.

— Хто гэта?

— Заходзь, заходзь, Федзя,— ціха сказаў Васіль.— Гэта Федзя Прасмак, мой качагар.

Федзя збянтэжана сеў на крэсла.

Васіль асцярожна пасадзіў Лізу на канапу, сам сеў насупраць.

— Вось я і прыехала... вось...— амаль бязгучна шаптала Ліза.

— Ну і добра... і добра...— нейкім не сваім, сіплым ад хваляваиня голасам гаварыў Васіль.

У пакоі стала ціха-ціха, чуваць было толькі, як у куце ўсхліпвала маці Васіля.

— А што з табою, Ліза? — спытаў Васіль.— Магчыма, табе можна вярнуць зрок...

— Нашы ўрачы хоць якую аперацыю зробяць! — ціха, але пераканана сказаў Федзя.

— Праўда? — спахапілася Ліза.— Гэта праўда?

— Так, так, Ліза, праўда! — гаварыў Васіль, сціскаючы яе рукі.

— Як хораша тут, на Радзіме,— ужо іншым голасам загаварыла Ліза.— Быццам і паветра другое... Ведаеш, Вася, калі я сышла з парахода, здарыўся цуд. Мне на момант здалося, што я зноў бачу. Раптам зрабілася так светла-светла, што я міжвольна зажмурылася...

Маці сядзела поплеч з Лізай і пяшчотна гладзіла рукой яе пышнавалосую галаву.

За акном зноў забарабаніў дождж.

### 3

Васіль выразна памятае ўсе падрабязнасці таго хвалюючага дня.

Увечары Ліза расказвала аб сабе. Яна працавала на хімічным заводзе. Там было цяжка, але другой работы яна знайсці не магла. Зімой 1945 года на заводзе адбыўся выбух. Загінула шмат людзей. А Ліза аслепла... Яна спрабавала скончыць жыццё самагубствам, але перашкодзіла суседка, тая самая, што пісала за яе пісьмы.

— Мне ўсё не верыцца, што я зноў дома,— усхвалявана гаварыла Ліза, і на яе вачах выступалі слёзы.— Як гэта радасна: дома!

Яна засталася жыць у іх. Бацькі Васіля ставіліся да Лізы, як да роднай дачкі. Дзён праз колькі пасля яе прыезду маці павяла дзяўчыну ў бальніцу. Урач доўга аглядаў яе вочы, незадаволена круціў галавой і, не сказаўшы нічога пэўнага, папрасіў прыйсці яшчэ. У другі раз ён выпісаў нейкіх лекаў і сказаў, што аперацыю зрабіць можна, але не адразу, прыйдзецца пачакаць. Спярша трэба было ўмацаваць агульны стан здароўя хворай, бо падарванае

шматгадовым недаяданнем і цяжкай працай здароўе магло не вытрымаць аперацыі.

Як і ў дзяцінстве, Лізу цяпер заўсёды можна было бачыць разам з Васілём. У дні, калі Васіль быў вольны ад паездак, яны ўвечары хадзілі ў парк. Разы тры наведалі тэатр: яны садзіліся ў ложу, і Васіль шэптам падрабязна тлумачыў Лізе ўсё, што робіцца на сцэне. Яна ўдзячна націскала Васілёву руку.

Часта яны хадзілі на раку, купаліся. Берагі былі неглыбокія, і Ліза, нават не ўмеючы плаваць, смела заходзіла ў ваду і, смеючыся, з усяе сілы малаціла нагамі і рукамі.

Да Артамонавых часта прыходзілі людзі. У кожнага была якая-небудзь справа да Лізы. Прадстаўнік мясцкома дэпо прынёс ёй у падарунак радыёпрыёмнік. Вучаніцы прыбягалі чытаць Лізе газеты і кнігі...

...Зараз Ліза ў бальніцы. Ёй ужо зрабілі аперацыю. Сёння ўрачы павінны былі зняць павязку. «У тры гадзіны дня»,— сказаў урач.

Што будзе? Ці адкрыецца для Лізы сонечны дзень, ці застанецца тая ж непраглядная ноч?..

...Імчыцца поезд. Эх, здаецца, каб прычапіць да паравоза крылы і паляцець, паляцець!..

Васіль вымае з кішэні гадзіннік. Графік ужо апярэджаны на шэсць мінут... Пасля Палядзіч яны павінны паехаць яшчэ хутчэй — там пачынаецца ўхіл.

— Бываюць выпадкі, што першая аперацыя не дае станоўчых вынікаў,— нечакана гаворыць Фёдар Прасмак, пазіраючы некуды паверх Васілёвай галавы.— Але, кажуць, праз некаторы час можна зрабіць другую.

«Ён таксама думае аб Лізе,— усхвалявана адзначае ў думках Васіль.— І на ўсякі выпадак падрыхтоўвае мяне да горшага...»

— Не, Федзя, так не бывае...

— Бывае, бывае! — горача ўступае ў размову Паўлюк Бярозкін.— Я чытаў недзе, здаецца, у часопісе «Знание — сила».

«Мілыя мае сябры! — думае Васіль.— Як мне добра з вамі!»

Першы прыпынак зрабілі толькі на станцыі Панцялееўск. Папоўнілі тэндэр вадой, пачысцілі топку, агледзелі машыну. І зноў — у дарогу.

Сонца віссла амаль над галавой, калі яны прыбылі ў пункт абароту лакаматываў. Далей поезд павядзе нехта з машыністаў суседняга аддзялення. А ім — у зваротны шлях.

Вугалем, змазкай і вадой запасліся мінут на сорак раней, чым прадугледжвалася па норме. Пад'ехалі да кантрольнага слупіка і пачалі чакаць загаду рухацца да поезда.

— Эх, марудзіць нешта дзяжурны,— у нецярплівасці прамовіў Паўлюк.

Праз паўгадзіны загаварыў рэпрадуктар: паравозу дазвалялася ісці да састава, падрыхтаванага на захад. Васіль паглядзеў на гадзіннік. Было роўна тры гадзіны...

Да састава Васіль падвёў паравоз па ўсіх правілах, асцярожна. Ляснула аўтасчэпка. Зачасціла помпа, нагнятаючы ў тармазную магістраль сціснутае паветра. А наперадзе клікаў ужо да сябе зялёны агеньчык выхаднога светафора.

І поезд пайшоў.

Прамільгнулі апошнія пабудовы станцыі. Бягуць міма тэлеграфныя слупы... Застаюцца ззаду пуцявыя будкі, раз'езды, станцыі. То набяжыць і знікне лясок, то праплыве вёска, а то і цэлы горад прабяжыць, нібы на экране ў кіно.

Але думкі Васіля бягуць яшчэ хутчэй... Зараз шостая гадзіна. Лізе даўно знялі павязку. Вочы яе адкрыты. Але ці бачыць яна?.. Ці бачыць?..

Зноў набліжаецца станцыя Палядзічы.

— Шэсцьсот сорак кіламетраў з пачатку сутак! — паведамляе Фёдар Паўлюку.— Амаль удвая больш нормы. Разумееце, юнак?

Паўлюк хацеў нешта адказаць Фёдару, але ў гэты час Васіль нечакана рвануў рычаг сігнала. Паравоз загудзеў.

— Што здарылася? — крыкнуў Фёдар. Ён кінуўся да акна і ўсё зразумеў... Уваходны светафор станцыі Палядзічы гарэў двума жоўтымі агнямі! Гэта азначала, што іх поезд прымалі не на галоўны пуць, а на бакавы. Значыцца, поезд паставяць пад абгон, каб прапусціць уперад нейкі другі, што ідзе ззаду іх...

— Нахабства! — крычыць Фёдар.— Якое яны маюць права так абыходзіцца з намі!

— Ціпэй, Фёдар, зараз усё высветлім!

Голас у Васіля спакойны, але гэты спакой даецца яму нялёгка. Прыцішыўшы бег поезда, Васіль узяў трубку мікрафона. Але дыспетчар апярэдзіў яго: з рэпрадуктара пачуўся яго роўны голас:

— Паравоз 2369, адказвайце!

— Машыніст Артамонаў слухае! — стрымана сказаў у мікрафон Васіль.

— Дзе зараз знаходзіцеся?

— Падыходжу да станцыі Палядзічы. Бачу два жоўтых агні светафора. У чым справа, таварыш дыспетчар?

— Не хвалюйцеся, таварыш Артамонаў, і ўважліва слухайце. Вы ідзеце па імянному графіку і маеце права патрабаваць, каб вас не затрымлівалі. Але...— дыспетчар крыху ўзвысіў голас,— ёсць да вас просьба. Не загад, а просьба,— падкрэсліў ён.

— Слухаю...

Поезд усё прыцішвае бег. Радзей пыхкае пара. Павольней круцяцца колы. Паўлюк і Фёдар уважліва прыслухоўваюцца да рэпрадуктара.

— Ззаду вас ідзе маршрут з будаўнічымі матэрыяламі для Варшаўскага Палаца культуры і навукі. Састаў сфарміраваны датэрмінова. Машыніст Джусупбекаў вядзе яго па-скораснаму. Ці не дасцё вы згоду прапусціць гэты поезд уперадзе вас? Дарэчы, чыгуначнікі, якія фарміравалі састаў, далі яму назву «Варшаўскі экспрэс».

Фёдар і Паўлюк глядзяць на Васіля. Ён адчувае на сабе іх напружаныя позіркі. У Васіля ажно пацеркі поту выступілі на лбе.

— Я згодзен,— цвёрда гаворыць ён.

— Я яшчэ не ўсё сказаў,— перапыняе Васіля дыспетчар.— Майце на ўвазе, што, калі вы дасцё згоду і прыпыніцеся, каб прапусціць «Варшаўскі экспрэс», вам прыйдзецца стаяць у Палядзічах тры гадзіны: па графіку на перагоне праз дваццаць мінут пачнецца планавы рамонт пуці. Рух закрываем.

Павольна набліжаецца ўваходны светафор Палядзічаў. Ярка гараць яго жоўтыя агні. Здаецца, ніколі яшчэ жоўты колер не быў такі непрыемны!..

— Калі вы не згодны, я зараз жа загадаю адкрыць для вас светафор.— Голас у дыспетчара ўсё такі ж роўны, спакойны.

Два словы, толькі два словы: «не згодзен!» — і загарыцца такі родны, жаданы зялёны агеньчык, і тады мож-

на адпускаць тармазы, адкрываць рэгулятар і ляцець, ляцець наперад!

Але Васіль ціха сказаў:

— Згодзен...

## 4

Палядзічы — станцыя трэцяга класа. Небагата тут пуцей, не вельмі многа будынкаў. Па левы бок ад новенькага цаглянага вакзала стаіць некалькі ларкоў. Калі прыходзяць пасажырскія паязды, каля ларкоў бывае даволі шумна. У астатні ж час прадаўшчыцы заняты галоўным чынам тым, што вяжуць дзецям на зіму панчохі ды рукавіцы. Тут жа, недалёка ад ларкоў — цырульня. Ад цырульні ўздоўж перона цягнецца невысокі, з металічнай сеткі паркан. А далей — поле, маладыя, густа пасаджаныя елкі бягуць побач з пуцямі некуды ўдалячынь... Па правы бок ад вакзала і яшчэ менш пабудоў. Кідаецца ў вочы толькі ярка-блакітная камера хавання ручнога багажу.

Сонца схавалася за хмару, і цені паплылі па зямлі... Васіль абыякавым позіркам аглядае станцыю. Іх поезд стаіць на самым апошнім пуці. За поездам — чыстае поле...

З таго боку, адкуль прыйшоў іх поезд, нешта загуло. Гул усё мацнеў, вось паказаўся і поезд. «Гэта «Варшаўскі экспрэс» ідзе!» — здагадаўся Васіль. За лакаматывам цягнулася доўгая чарада платформ, нагружаных лесам. На некаторых з іх былі прымацаваны шчыты з надпісамі. Васіль паспеў адзін прачытаць: «Няхай жыве вечная дружба савецкага і польскага народаў!»

Не змяншаючы хуткасці, «Варшаўскі экспрэс» прамчаўся міма.

— Ну што ж, сваё абавязацельства мы выканалі,— прамовіў Фёдар.— А цяпер трэба стаяць, чакаць...

Фёдар палез з паравоза на зямлю.

...Усё, што трэба было зрабіць, каб ехаць далей, зрабілі: напоўнілі вадой тэндэр, агледзелі рухомы механізм, працерлі паклей дэталі. А што рабіць далей?.. Паўлюк пайшоў да ларкоў напіцца крэм-соды. Фёдар лёг непадалёк ад паравоза на траву і ўтаропіўся ў неба. Галоўны і старшы кандуктары падаліся разам з паязным майстрам да кладаўшчыка камеры хавання ручнога багажу «забі-

ваць казла». А Васіль... Каб яму зараз хто-небудзь прыдумаў занятак, ён быў бы так удзячны!

Час ідзе страшэнна марудна.

«У цырульню пайсці, ці што?» — з тугой падумаў Васіль. Памацаў рукой шчокі — галіцца было яшчэ рана. «Але ж пайду»,— рашыў ён і саскочыў з паравоза.

Цырульнікам была маладая гаваркая жанчына. Яна прыкметна ўзрадавалася яго прыходу,— відаць, наведвальнікаў тут было нямнога. Узбіваючы пену ў мыльніцы, жанчына бесперапынна гаварыла.

«От жа сакатуха!» — паморшчыўся, нібы ад зубнога болю, Артамонаў.

— Вас як пагаліць? — не заўважаючы недарэчнасці свайго пытання, пацікавілася жанчына.

— Моўчкі! — загадаў Васіль.

Жанчына змоўкла, відаць, пакрыўдзілася. Аднак пагаліла добра, і Васіль шчыра сказаў:

— Дзякую!

Зірнуў на гадзіннік і са злосцю сунуў яго ў кішэню.

«Пазваніць бы,— падумаў ён.— Але ж тут толькі чыгуначная сувязь, не дазвонішся...»

Каля паравоза на траве ляжаў Фёдар.

— Вугаль падкідваў у топку? — падышоўшы, запытаўся ў яго Васіль.

— А як жа! Толькі што...

Васіль лёг побач з сябрам, закурыў... Заплюшчыў вочы, каб стрымаць сваю нецярплівасць, хваляванне.

...Так і ляжаў, нерухомы, маўклівы, нават не пазіраючы больш на гадзіннік, пакуль раптам не пачуў голас Паўлюка.

— Глядзіце, дзяжурная ідзе! — радасна абвясціў Паўлюк.

Васіль ачнуўся ад забыцця, падняў галаву. На пероне відаць была постаць дзяжурнага па станцыі. Дзяўчына ішла да іх. «Можа, ужо можна ехаць?» — падумаў, захваляваўшыся, Васіль і пазірнуў на гадзіннік. Але ж да тэрміну заставалася яшчэ сорак мінут.

— Ну што, хлопцы, загараеце? — падышоўшы, жартаўліва спытала дзяўчына і коса зірнула на Паўлюка.— А я змянілася з дзяжурства. Пайду ў кіно глядзець «Мой скарб».

Васіль устаў, ляснуў каменьчыкам па рэйцы, злосна

наглядзеў па дзяўчыну, быццам у затрымцы поезда вінавата была яна.

— О, які вы нервовы! — засмяялася дзяўчына.— Супакойцеся, я пажартавала. Пуцевікі скончылі рамонт дарогі раней тэрміну. Зараз мой зменшчык адкрывае вам светафор.

— Падрыхтаваць машыну! — крыкнуў Васіль.

Паўлюк і Фёдар кінуліся да паравоза. Запрацаваў інжэктар, гонячы ваду з тэндэра ў кацёл, часцей запыхкала пара над трубой.

— Дзякую вам! — націскаючы руку дзяўчыне, сказаў Васіль.

Неўзабаве ўспыхнуў зялёны агеньчык выхаднога светафора. Паўлюк не стрымаўся, радасна выгукнуў сваё звычайнае:

— Э-гэ-гэ-э-й-й!..

Дзяжурная памахала паравознікам рукой. Поезд крануўся, пайшоў, набіраючы хуткасць.

Блакіт пацямнеў, над палямі плыў шэры вечаровы змрок. Васіль уключыў электрычнасць. Спераду паравоза бліснулі два яркія снапы святла. Загарэлася лямпачка і ў паравознай будцы.

«Ліза ўжо напэўна будзе спаць,— сумна падумаў Васіль, але адразу ж перадумаў:— Не, сёння яна доўга не засне. Які б ні быў зыход аперацыі, Ліза спаць не зможа...»

## 5

Нягледзячы на вялікую затрымку ў Палядзічах, яны ўсё ж управіліся да канца рэйса ўвайсці ў графік. Ляцелі так, што ажно іскры з-пад колаў сыпаліся. На ўсім далейшым шляху ім весела падміргвалі зялёныя агеньчыкі светафораў.

— Э-гэ-гэ-э-й-й!..— раз-пораз чуўся ў цемры голас Паўлюка.

Не зрабіўшы ніводнага прыпынку, поезд хвіліна ў хвіліну па раскладу падкаціў да перона роднай станцыі.

Іх сустракалі начальнік дэпо, сакратар партбюро, паравознікі. Гэта была не тое, каб афіцыйная, урачыстая сустрэча, а простае, сардэчнае віншаванне таварышаў па рабоце, сяброў.

...І вось яны ідуць па вуліцах ярка асветленага горада. Наперадзе — Васіль, за ім на паўкроку ззаду Фёдар і Паўлюк. Не знайшлося часу ні памыцца, ні пераапрануцца. Толькі Паўлюк здагадаўся падставіць твар пад кранік тэндэра і збольшага змыць са шчок чорныя плямы ад вугальнага пылу.

На хаду выціраючы пакляй рукі, Васіль усё прыскорвае крок. Мінулі Вакзальную вуліцу, Пясчаную, Камсамольскую. Выйшлі на Ленінскую. Тут ужо засталося недалёка. Два кварталы — і бальніца.

Цяжка дыхаючы ад хуткай хады, падышлі да вялізных, шчыльна зачыненых варот. З правага боку была прахадная будка. Васіль увайшоў першы. У будцы нікога не было.

— Шанцуе,— паўшэптам сказаў Паўлюк.

Раптам з двара прагучаў энергічны жаночы голас:

— Куды?..

Яны сумеліся. З цемры выйшла невысокага росту поўная жанчына ў ватоўцы і заступіла ім дарогу. Васіль пачаў тлумачыць.

— Нельга! — рашуча адрэзала жанчына.— Позна. Заўтра прыходзьце.

— Як гэта заўтра? — запярэчыў Фёдар.— Нам сёння трэба. Мы, ведаеце, адкуль прыехалі? Імчаліся, аж дым ішоў каромыслам!

— Нельга, нельга! — паўтарала жанчына, выпраўджваючы іх на вуліцу.— Ды і выгляд у вас, бацюхны!.. А ў нас у палатах чыстата, парадак... Нельга!

Паўлюк пачаў рабіць Васілю і Фёдару нейкія знакі, але, убачыўшы, што тыя не разумеюць яго, проста пацягнуў іх з будкі.

— Ды кіньце вы, хіба з ёю дагаворышся! — горача сказаў ён, цягнучы за сабой сяброў.— Калі б мужчына стаяў, то з ім мы б знайшлі агульную мову — забягайлаўкі ж яшчэ адчыненыя.

Адвёўшы іх на некалькі крокаў ад будкі, Паўлюк прапанаваў:

— Давайце зробім так: мы тут з Фёдарам забавім яе, а ты, Вася, адыдзі крыху, ды і махай цераз паркан. Пайшлі! — узяў ён за руку Фёдара.

Васіль, не раздумваючы, рашуча пайшоў уздоўж паркана. Ідучы, чуў, як Фёдар і Паўлюк наўмысна галасна спрачаліся з жанчынай, а тая моцна адказвала ім.

Паркан быў высокі, і, калі б не спартыўныя здольнасці Васіля, ён наўрад ці здолеў бы пералезці праз яго. За парканам на двары раслі дрэвы, і гэта было вельмі дарэчы — хаваючыся за імі, можна было непрыкметна дайсці да галоўнага корпуса.

Дзяжурным урачом таксама аказалася жанчына.

— Артамонава? Лізавета Артамонава? — запытала яна, акідваючы незадаволеным позіркам зашмальцаваны касцюм Васіля, і раптам усміхнулася.— Бачыць!

— Бачыць! — выгукнуў Васіль так голасна, што ўрач ажно ўздрыгнула.

— Цішэй, цішэй! — спалохана сказала яна, прыціскаючы палец да свайго рота.

А Васіль гатовы быў абняць і расцалаваць гэтую жанчыну, якая першая абвясціла яму такую радасць! Бачыць! Напэўна, ён і абняў бы яе, калі б быў не ў рабочым касцюме ды калі б чысцейшыя рукі...

— А ці можна... хоць адным вокам... а, доктар? — усхвалявана запытаўся ён і з такою мальбою паглядзеў на ўрача, што тая зноў усміхнулася.

— Можна,— сказала яна.— Нават двума вачыма. Яна ў палаце адна ляжыць. Адчыніце крыху дзверы і пагляздзіце.

Урач вынесла ў прыёмную халат, Васіль асцярожна апрануў яго, і яны пайшлі па доўгаму калідору. Тут было многа дзвярэй. Васіль ведаў, што Ліза знаходзіцца за самымі апошнімі, злева. Ён хутка апярэдзіў урача, падышоў да дзвярэй, адчыніў...

Ліза ляжала, паклаўшы рукі паверх коўдры, і глядзела на столь. Так, яна глядзела, бо калі пачула, што дзверы адчыніліся, хутка зірнула ў гэты бок.

Сустрэўшыся з яе позіркам, Васіль не стрымаўся і ўбег у палату. Урач нешта крыкнула яму, але ён не слухаў яе, падбег да ложка і, нагнуўшыся, прыпаў губамі да рукі Лізы...

— Які ты мурзаты, Вася! — зняможаная ад перажытага хвалявання, ціха сказала Ліза.— Ды ўстань ты, устань, вось жа крэсла стаіць.

Урач асцярожна зачыніла за сабой дзверы. Мусіць, і ў яе на душы было лёгка і светла.

— Хто гэта? — раптам запытала Ліза, паказваючы на акно.— Фёдар, так?

У акно, прыціснуўшыся носам да шкла, глядзеў Паў-

люк Бярозкін. Убачыўшы, што Ліза заўважыла яго. Паўлюк узрадаваўся, прывітальна махнуў ёй рукой.

— Не, гэта Паўлюк. Я цябе пазнаёмлю з ім.

«Мусіць, Фёдар адзін застаўся з вахцёршай»,— падумаў Васіль.

— А гэта дык ужо Фёдар,— зноў сказала Ліза.

Сапраўды, у акне з'явіўся Прасмак. Ён горача прыціскаў адной сваёй рукой другую, выказваючы гэтым, што жадаў бы з такой жа шчырасцю паціснуць рукі Лізы.

Урач увайшла і сказала, што хворай трэба даць спакою, больш у палаце быць нельга. Васіль незадаволена паглядзеў на дзверы, пераступіў з нагі на нагу.

— Вася,— ледзь чутна спытала Ліза,— а чаму ты запісаў мяне ў бальніцы на сваё прозвішча?

— А што, ці ж ты не згодна?

Лёгкая чырвань заліла Лізіны шчокі.

— Згодна...— аднымі вуснамі адказала яна.

...Мінула больш за тыдзень. Была нядзеля. Ліза выпісвалася з бальніцы. Па яе прыехалі ўсе трое — Васіль, Фёдар і Паўлюк. Усе ў светлых прыгожых касцюмах, а Паўлюк нават капялюш купіў — першы ў сваім жыцці. Капялюш быў крыху малаваты, Паўлюк адчуў гэта толькі далёка ад магазіна і, каб сябры не смяяліся, трымаў яго ў руках.

— Горача сёння,— гаварыў ён і абмахваў твар злашчасным капелюшом, хоць патрэбы ў гэтым ніякай не было. Заўсёды непаслухмяныя валасы Паўлюка сёння ляжалі на галаве гладка прычэсаныя — хлапец перавёў на іх цэлы флакон «Магноліі».

Ліза выйшла насустрач ім у белым плацці і ў такіх жа белых туфлях, несучы ў руках вялікі букет кветак — падарунак урача, які рабіў аперацыю. Калі хлопцы далучылі да гэтага букета свае кветкі, дзяўчына ўжо не змагла яго панесці. Усклалі гэты абавязак на Фёдара.

Сябры павялі Лізу да таксі, якое чакала іх, але Ліза запратэставала.

— Машына? Не, не! — адмахнулася яна.— Пойдзем пехатою. Гэта ж так прыемна — ісці па гораду. Так прыемна! — І шапнула Васілю: — Абавязкова агледзім тыя мясціны, дзе мы з табою бывалі!

Ідучы, Ліза ўвесь час пыталася:

— А гэта што?.. А гэта?.. А ў якім баку парк?.. А дзе тэатр?..

Выйшлі на галоўную вуліцу горада. На скрыжаванні раптам успыхнула вока вулічнага светафора.

— Ты чаго ўсміхаешся? — здзіўлена паглядзела на Васіля Ліза.

Васіль павярнуўся да Паўлюка.

— Паўлюк, што азначае зялёны агонь?

— Шлях свабодны! — адказаў Паўлюк.

...Яны ішлі, а зялёны агонь светафора рабіўся ўсё ярчэйшым і ярчэйшым, а наперадзе, на наступным скрыжаванні, запаліўся яшчэ адзін, а там яшчэ і яшчэ...

*1952*

# ЯК НАЗВАЛІ СТАНЦЫЮ

## 1

Поезд імчаўся вельмі хутка, і ўсё ж над ім па цьмяным небе неадступна шыбаваў маладзік. Я сачыў за маладзіком ужо некалькі хвілін, а ён усё не адставаў. Выходзіла, што поезд увесь час ішоў проста наперад, нікуды не зварочваючы.

— Дарожка, як страла...— прамовіў я і зірнуў на суседа па купэ.

— Зараз павернем направа,— азваўся сусед.

І сапраўды, маладзік раптам пачаў адставаць, а неўзабаве і зусім знік недзе за апошнім вагонам. Толькі зямля па-ранейшаму была заліта яго бледным святлом. За акном цягнуўся аднастайны, без канца і краю стэп. Зрэдку сустракаліся невялічкія дрэвы. Яны кідалі на зямлю дзіўныя ажурныя цені.

Трэба было вельмі добра ведаць дарогу, каб уночы так беспамылкова вызначыць нічым не прыкметны паварот. Я выказаў суседу сваё здзіўленне гэтай яго незвычайнай асведамлёнасцю.

— Ведаю,— няпэўна прамовіў ён і, памаўчаўшы, дадаў: — Як жа не ведаць...

«Негаваркі трапіў мне спадарожнік»,— падумаў я.

Нас у купэ было толькі двое. Сусед мой — чыгуначнік, на пагонах у яго бялела эмблема будаўніка. Увайшоўшы ў вагон, ён моўчкі сеў насупраць мяне, уткнуўся тварам у акно і сядзеў так вось ужо хвілін дваццаць, не варушачыся.

Што ён бачыў там, за акном? Я таксама паспрабаваў углядацца ў ноч, але нічога цікавага разгледзець не мог. Стэп, стэп, стэп... Сухая, патрэсканая ад гарачыні зямля...

Рэдкія дрэвы, з якіх амаль зусім асыпалася лісце. І гэты маладзік, што неадступна спяшаецца за поездам...

— Хутка будзе станцыя Светлая,— сказаў сусед.

— Вы, напэўна, тутэйшы? — запытаў я.

— Не, я здалёк, з Беларусі.

— Дык мы ж землякі! — узрадаваўся я.

— Няўжо? — ажывіўся сусед. Ён адвёў позірк ад акна, яго шэрыя, крыху прыжмураныя вочы з цікавасцю пачалі разглядаць мяне.— Вы ў Магілёве калі-небудзь былі?

Я адказаў, што добра ведаю Магілёў, даводзілася не раз бываць там.

— А Мінск? Як там наш Мінск? — Сусед захваляваўся, дастаў пачак папярос, пачаставаў мяне.

Мы разгаварыліся. Сусед быў не такі ўжо негаваркі чалавек, як здалося мне спачатку. Звалі яго Іван Сцяпанавіч Шаршэўскі. На выгляд яму было гадоў трыццаць, не больш. Потым, калі мы пазнаёміліся бліжэй, я са здзіўленнем даведаўся, што яму ўжо каля сарака. Маладзілі Івана Сцяпанавіча, мусіць, яго вясёлыя, жывыя вочы, свежы загарэлы твар. Гледзячы па Івана Сцяпанавіча, няцяжка было здагадацца, што большую частку свайго часу ён праводзіць на паветры. Таму, напэўна, і голас у яго быў глухаваты, нібы застуджаны.

Я пачаў ужо здагадвацца, чаму Шаршэўскі так добра ведае чыгунку, па якой мы едзем. «Ён, відаць, удзельнічаў у яе будаўніцтве»,— падумаў я.

А Іван Сцяпанавіч, нібы адгадаўшы мае думкі, сказаў:

— Я разведвальнік... Разведваў трасу для гэтай магістралі.

Ён гэта сказаў з гордасцю, і я падумаў: якая цікавая гэта, відаць, прафесія — разведвальнік чыгуначных шляхоў!

Поезд прастаяў у Светлай усяго дзве-тры хвіліны і пайшоў далей. Я спытаў, як называецца наступная станцыя.

— Як называецца? — перапытаў Іван Сцяпанавіч.— У яе вельмі добрая назва... Хочаце, я раскажу вам, як мы далі ёй імя?

Шаршэўскі зручней уладзіўся на лаўцы і, не спяшаючыся, пачаў расказваць.

## 2

— Памятаю, быў тады прыемны цёплы вечар. Наша невялікая разведвальная партыя размясцілася на адпачынак на тым самым месцы, да якога мы з вамі хутка пад'едзем. Але тады тут, вядома, яшчэ нічога не было, толькі вецер гуляў па стэпу, ды шакал час ад часу падаваў свой незадаволены голас...

Мы сядзелі ля кастра і так захапіліся размовай, што не заўважылі, як сцямнела. Сямён Харытонавіч, начальнік нашай партыі, падкінуў у агонь сухога галля, полымя рванулася ўгору, абдаўшы нас іскрамі, і тут мы ўспомнілі, што нам даўно трэба класціся спаць.

Але спаць не хацелася. Справа ў тым, што ў той дзень мы скончылі разведку трасы самага важнага ўчастка і выбралі месца для станцыі. Месца гэтае, між іншым, прапанавала наша радыстка Надзея Баляславаўна, якую ўсе мы звалі проста Надзея.

Дарэчы, ці заўважалі вы такую акалічнасць: сустракаюцца людзі, якіх у шаснаццаць ці там у дваццаць год завуць Паша або, скажам, Янка. Мінаюць гады, тыя самыя Паша ці Янка маюць па сорак, а яны — усё яшчэ Паша і Янка. А вось ёсць такія, якіх ужо ў дваццаць пяць ці ў трыццаць год нізавошта не назавеш Сцёпам ці Наташай, а абавязкова мусіш сказаць: Сцяпан Пятровіч... Наталля Вікенцьеўна...

У чым тут справа? А? Вы ніколі не думалі аб гэтым? Разважаць тут можна доўга, але самы просты адказ прыйдзе, бадай, тады, калі мы ўспомнім, што заўсёды, як гаворым пра такіх Пашу ці Янку, то абавязкова скажам так: «Наша Паша...», «наш Янка...»

Вось такой была і наша Надзея...

Але вернемся да нашага кастра. Тады мы, як я ўжо казаў, скончылі разведку трасы самага важнага ўчастка і выбралі месца для станцыі. Вядома, стаміліся за дзень, але як толькі Косця Селіванаў, самы малады з нас, распаліў касцёр, мы адразу ж забыліся на стомленасць, і, пакуль гатавалася ежа, сама па сабе пачалася размова аб нашай нялёгкай, але цікавай рабоце.

Вы ведаеце, што такое разведвальнікі новых чыгуначных шляхоў?.. Ага, крыху ведаеце. А ці не выпадала вам быць калі-небудзь у Варкуце?.. Не? І па Пячорскай чыгунцы не ездзілі?.. Гэта самая паўночная магістраль на зямлі.

Ёсць там, па гэтай чыгунцы, станцыя Пячора, і ёсць далей наступная станцыя — Сынья. Поезд ідзе з Пячоры ў Сынью гадзіны дзве. Але, каб пакласці на карту гэтыя шэсцьдзесят кіламетраў трасы, разведвальнікі патрацілі амаль два гады працы. І якой працы! Мне самому давялося прайсці гэты ўчастак пехатой дваццаць тры разы...

Дык вось, мы сядзелі тады ля кастра і ўспаміналі розныя цікавыя гісторыі, звязаныя з нашай работай. Усе мы любілі сваю справу, і кожны з нас меў многа чаго расказаць.

Успомніў і я што-кольвечы з васьмі гадоў свайго жыцця, праведзеных у Вяліказемельскай тундры, на разведцы Пячорскай магістралі. Прыйшоў я ў тундру зусім маладым хлопцам, нават барады яшчэ не галіў, а назад паехаў сталым чалавекам са значным працоўным і жыццёвым вопытам. Узяць хоць бы такое: у 1932 годзе, калі я з таварышамі збіраўся ў тундру, ніхто нават не мог расказаць нам, як дабірацца да гэтай самай Варкуты. Нават дарогі не ведалі ў той час да яе. Прыехалі мы ў Цюмень, пераселі там на параход. Плылі спачатку па рацэ Тура, потым па Таболу, Іртышу, Обі. Пасля высадзіў нас параход на бераг, а сам пайшоў назад. Не было далей дарогі, пачыналася тундра. Што ж, пайшлі пехатой. Цэлых два месяцы прадаўжалася наша вандраванне, пакуль дабраліся да Пячоры. Вось як яно было... Ну, а паехаў я адтуль у скорым поездзе, у спальным вагоне.

Прыемна, ведаеце, усведамляць, што па той самай зямлі, якая сотні тысяч год ляжала дзікай і некранутай, цяпер ходзяць скорыя паязды. Ну, а калі быць чэсным да канца, дык асабліва прыемна тое, што ў гэтым ёсць доля і тваёй працы.

У размове прымалі ўдзел амаль усе. Нават самы маўклівы з нас, Жумабай Казыбекаў, казах з-пад Чымкента, і той разгаварыўся. Жумабай прыехаў да нас з будаўніцтва магістралі Моінты — Чу, добра ведаў чыгунку і цікава расказаў аб ёй.

І толькі наша радыстка Надзея ўвесь вечар сядзела маўклівая, задуменная. Гэта была невысокая чорнавалосая жанчына з прывабнымі рысамі твару і вельмі сумнымі вачыма. На кожнага новага чалавека, які сустракаўся ёй упершыню, Надзея пазірала заўсёды неяк асабліва, як бы ацэньваючы яго. Уся яна была нейкая падцягнутая, строгая, па натуры спакойная і ўраўнаважаная. Надзея кары-

сталася ў нас славай чалавека, які добра ведае сваю справу. Нягледзячы на знешнюю замкнёнасць, яна была чулым і спагадлівым таварышам.

Усе мы ведалі сумную гісторыю яе жыцця.

Паходзіла Надзея Баляславаўна з сям'і беднага гродненскага чыгуначніка. У 1936 годзе, калі ёй споўнілася васемнаццаць, яна выйшла замуж за маладога інжынера-разведвальніка, які толькі што скончыў Варшаўскі чыгуначны інстытут. Маючы дыплом інжынера, муж яе вымушан быў пайсці працаваць дарожным майстрам, бо панская Польшча новых чыгунак не будавала. Праз паўгода пасля вяселля яе мужа звольнілі з работы за «нядобранадзейнасць».

— Хоць і не хацеў, а прыйдзецца ехаць у вясельнае падарожжа,— жартаваў ён. Тады ён яшчэ быў здольны на жарты.— Але сцеражыся мяне, мая добрая Надзея, я стаў нядобранадзейны.

Некалькі месяцаў ён быў беспрацоўны. Ездзіў шукаць шчасця ў Баранавічы, Брэст, Варшаву, але работы для беларуса нідзе не знаходзілася.

Тады яны падаліся ў Францыю. Але і Францыі таксама непатрэбны былі разведвальнікі чыгуначных шляхоў. Інжынеру прыйшлося стаць пуцявым рабочым, а Надзея, якая мела спецыяльнасць радысткі, з вялікімі цяжкасцямі атрымала месца прыбіральшчыцы ў табачным магазіне. «І такое шчасце выпадае ў нас не кожнаму інжынеру і не кожнай радыстцы»,— растлумачылі ім. Гэтае «шчасце», аднак, аказалася вельмі кароткім. Месяцы праз два муж Надзеі апынуўся на вуліцы. Ён працаваў потым кандуктарам трамвая, грузчыкам, афіцыянтам...

У 1937 годзе ён зноў стаў беспрацоўным, а неўзабаве страціла работу і Надзея. Згубіўшы ўсякую надзею знайсці хоць які-небудзь занятак у Францыі, яны паехалі шукаць шчасця далей, у Інданезію. Тут ім пашанцавала. Мужа Надзеі прызначылі малодшым кантралёрам у Натальскую акругу па востраў Суматра, а сама яна нарэшце атрымала пасаду радысткі. Ды толькі нядоўга прыйшлося папрацаваць ім і тут. Убачыўшы, якія нечалавечыя здзекі церпіць малайскае насельніцтва ад сваіх прыгняцальнікаў-галандцаў, яны не згадзіліся быць маўклівымі прыладамі каланіяльнай драпежніцкай палітыкі. Маладыя людзі рашылі адмовіцца ад сваіх пасад і шукаць шчасця ў новых месцах.

Якраз у гэты час адно з малайскіх плямёп — батакі — узняло паўстанне. Да батакаў далучыліся менангі і людзі іншых плямёп. Па ўсёй Натальскай акрузе загучаў баявы заклік: «Мэрдэка, мэрдэка!», што азначае «Свабода, свабода!» З далёкіх джунгляў, з гор ішлі людзі, збіраліся ў атрады, зліваліся ў вызваленчую армію. Надзея з мужам далучыліся да паўстанцаў. Яна перавязвала параненых, абслугоўвала рацыю, а ў цяжкія хвіліны бралася за зброю і поплеч з мужам змагалася за лепшую долю сваіх інданезійскіх братоў.

Аднойчы Надзея выканала цяжкае і адказнае заданне. Там у іх каля Гільсэна быў мост на дарозе, якая выкарыстоўвалася галандскімі войскамі як аперацыйная лінія ў часе правядзення карных экспедыцый. Надзея ўзарвала гэты мост. Пераправу цераз раку паўстанцы доўгі час трымалі пад сваім кантролем.

Але сілы былі няроўныя... Пад націскам войск паўстанцы вымушаны былі адысці ў горы. Акурат у гэты час Надзея захварэла на трапічную ліхаманку. Нейкая старая малайка засталася з ёю ў горнай вёсцы, а атрад пайшоў далей.

— Мы вернемся, чакай нас, мая Надзея! — гаварыў ёй муж, развітваючыся.— Надзея мая і з вялікай, і з малой літары...

Малайка выратавала яе. А калі маладая жанчына ачуняла, яна даведалася, што галандскія войскі жорстка задушылі паўстанне. Тысячы людзей былі закатаваны. Загінуў на шыбеніцы і яе муж...

Вясной 1939 года яна вярнулася на радзіму, у Гродна. Тут сустрэла яе яшчэ адна жудасная навіна: яе бацька, даведзены за адчаю доўгім беспрацоўем, скончыў жыццё самагубствам...

А неўзабаве Гродна, як і ўся Заходняя Беларусь, было вызвалена Савецкай Арміяй ад польскіх паноў, і над яе радзімай узышло сонца савецкага жыцця. Надзея рашыла прысвяціць сябе любімай справе, якой так і не здолеў аддацца яе муж. У той час якраз праводзілася разведка трасы для Пячорскай чыгункі. Можаце ўявіць сабе, з якой радасцю Надзея прыняла прапанову паехаць на Пячору.

Там я і пазнаёміўся з ёю. З таго часу нам якраз выпадала ўсюды працаваць разам, у адной разведвальнай партыі...

У той вечар, аб якім я расказваю, Надзея ўвесь час чамусьці сядзела моўчкі. Яе сумныя вочы задуменна глядзелі на агонь, які то згасаў, то зноў успыхваў яркім полымем. Аб чым яна думала?..

Было позна, трэба было класціся спаць. Раптам Жумабай успомніў, што мы ў гэты дзень яшчэ не слухалі радыё. Надзея ўключыла прыёмнік і пачала настройвацца. Пачулася музыка, потым урывак нечай гартаннай гаворкі, на змену ёй зноў загучала музыка, і зноў нехта загаварыў на незнаёмай чужой мове. Надзея круціла ручку прыёмніка, і радыёстанцыі хутка змянялі адна другую.

Вось стрэлка на шкале настройкі пасунулася яшчэ крыху, і раптам спакойна і велічна загучалі пазыўныя Масквы. Над ціхім стэпам паплыла мелодыя знаёмай і блізкай кожнаму савецкаму чалавеку песні «Широка страна моя родная».

— Гаворыць Масква! — урачыста абвясціў дыктар.— Перадаём апошнія паведамленні...

Вам ніколі не даводзілася слухаць «апошнія паведамленні» з Масквы, знаходзячыся дзе-небудзь, як кажуць, на краю зямлі, у далёкім глухім стэпе, або на Поўначы, або за мяжой нашай Радзімы? Не?.. Тады вам цяжка зразумець, якія гэта непаўторныя хвалюючыя хвіліны. Мне, напрыклад, у гэты час пачынае здавацца, што я ўзнімаюся некуды высока-высока, адкуль добра відаць уся наша неабсяжная краіна, і сэрца маё поўніцца радасцю і шчасцем.

Ну, вось, хоць чуваць было вельмі добра, мы ўсе міжвольна пасунуліся бліжэй да прыёмніка.

— Сёння калектыў рэйка-балачнага цэха металургічнага завода імя Пятроўскага,— гаварыў дыктар,— датэрмінова закончыў пракатку вялікай партыі рэек для пад'язных пуцей будоўляў пяцігодкі.

Жумабай весела падміргнуў нам:

— Гэтыя рэйкі і для нас прызначаюцца. Малайцы металургі!

Перадача прадаўжалася. Мы прагна лавілі кожнае слова, слухалі паведамленні аб работах на Куйбышэўскай і Сталінградскай гідраэлектрастанцыях, на Кахоўцы, аб усіх вялікіх справах савецкіх людзей. Потым пачалі перадаваць паведамленні з-за граніцы — аб падзеях у Карэі, аб руху прыхільнікаў міру ў Амерыцы, Англіі і іншых краінах, аб урадавым крызісе ў Францыі...

У канцы дыктар перадаў такое паведамленне:

— Новая хваля крывавага тэрору пракацілася па Інданезіі. У адказ на законныя патрабаванні карэннага насельніцтва краіны аб зніжэнні непасільных падаткаў галандскія ўлады пачалі жорсткую расправу з «вінаватымі ў замаху на знешнюю і ўнутраную бяспеку дзяржавы». Галандскія салдаты зруйнавалі на востраве Суматра некалькі вёсак і расстралялі сотні ні ў чым не вінаватых людзей. Злачынствы каланізатараў выклікалі глыбокае абурэнне сярод працоўных Інданезіі. У радзе гарадоў адбыліся шматлюдныя дэманстрацыі пратэсту. Маюць месца ўзброеныя сутычкі паміж галандскімі войскамі і насельніцтвам. Інданезійскія патрыёты ўзарвалі мост каля Гільсэна, які вядомы ў народзе пад назвай «Мост Надзеі». Гэты мост стаяў на дарозе, якая выкарыстоўвацца галандскімі войскамі як унутраная аперацыйная лінія ў часе правядзення карных экспедыцый...

Ці трэба гаварыць вам, якое ўражанне зрабіла гэтае паведамленне на нашу Надзею. Твар яе пабляднеў. Рука, што ляжала на ручцы настройкі прыёмніка, задрыжала. Надзея ўстала і моўчкі пайшла ад кастра некуды ў цёмны стэп.

Мы таксама былі моцна ўзрушаны. Імем нашай Надзеі названы мост у далёкай Інданезіі!.. Там ведаюць, памятаюць яе...

Перадача скончылася. З прыёмніка выляцеў і ўрачыста паплыў над стэпам перазвон крамлёўскіх курантаў.

— Яшчэ адзін дзень пражыты,— сказаў начальнік нашай партыі Сямён Харытонавіч.— Харошы дзень... Але, перш чым развітацца з ім, давайце вырашым усе разам адно пытанне.

Ён падняўся, агледзеў усіх нас.

— Месца для станцыі мы выбралі. Неблагое, здаецца, месца.

Полымя кастра асвятляла твар Сямёна Харытонавіча. Задуменна ён глядзеў удалячынь, і позірк яго быў такі, быццам ён бачыў ужо пралёгшыя цераз стэп чыгуначныя шляхі, будынкі станцыі, бачыў нават паязды, якія прыбывалі сюды, нагружаныя ўсялякім дабром.

— А цяпер давайце падумаем, як жа мы яе назавём?— спытаў Сямён Харытонавіч.— Якое дадзім ёй імя?

— Надзея! — адразу ж, не задумваючыся, выгукнуў Косця Селіванаў.

— Ай, джаксы *, ай, разумны хлопец! — усклікнуў Жумабай Казыбекаў.

Я паглядзеў на Надзею, якая ў гэты час якраз зноў падышла да кастра. Суму ў яе вачах я не бачыў. Яна ўся загарэлася ад шчасця...

## 3

Іван Сцяпанавіч Шаршэўскі замоўк і зноў прыпаў тварам да акна.

Поезд паволі замаруджваў ход. Міма нашага купэ прайшоў праваднік і абвясціў:

— Станцыя Надзея!

Мы выйшлі з вагона. Вакол была спакойная, нейкая зачараваная цішыня. Толькі аднастайнае пыхканне паравоза далятала да нашага слыху.

Пачынала днець.

На суседнім пуці стаяў таварны састаў, які прыбыў на станцыю раней за наш. На яго платформах стаялі велізарныя аўтамашыны. Да бартоў платформ былі прымацаваны шчыты, і я разгледзеў надпісы на іх: «Беларускія аўтамабілі — будоўлям пяцігодкі».

— Нашы зубры! — з гордасцю сказаў Шаршэўскі.

Да нас падыходзіла невысокая жанчына ў гэткім жа, як і ў Шаршэўскага, адзенні чыгуначніка. Іван Сцяпанавіч цёпла прывітаўся з ёю.

— Знаёмцеся,— сказаў ён мне.— Начальнік станцыі Надзея — Надзея Баляславаўна Шаршэўская.

Не, я таксама не бачыў суму ў вачах Надзеі Баляславаўны. А тое, што было ў іх... ці ж словамі можна расказаць пра гэта?..

*1952*

---

* Джаксы — па-казахску «добра».

# ТРОЕ

Ігар Чыбісаў амаль не ўяўляў сабе, як ён пачне вечарам размову з Кацяй. Бадай, лепш за ўсё было б адразу сказаць ёй усё — няхай ведае. А можа толькі намякнуць, а канчатковае прызнанне адкласці яшчэ дні на два, на тры?..

Не, для канчатковай гутаркі сёння якраз будзе самы зручны выпадак. Яны ўчора дамовіліся, што сёння ўвесь вечар правядуць разам. Спачатку пойдуць у кіно,— Каці вельмі хочаца паглядзець новы венгерскі фільм,— а пасля застануцца ў клубе патанцаваць. Праводзіць яе дамоў Ігару прыйдзецца, зразумела, аднаму, бо Сяргей Несцераў, яго друг і напарнік на паравозе, зменны машыніст, будзе ў гэты час у паездцы, далёка ад Бярэзічаў.

Успомніўшы Сяргея, Ігар нахмурыўся, але ненадоўга. Пра Сяргея нельга было думаць дрэнна. Яго ў дэпо ўсе любілі, ён быў добры таварыш. Ігара звязвала з Сяргеем даўняя дружба, якая пачалася яшчэ ў чыгуначным вучылішчы. Цяпер, калі абодва яны сталі машыністамі і працуюць на адным паравозе, дружба яшчэ больш умацавалася. Не пахіснулася яна і тады, калі Ігара прызначылі старшым машыністам паравоза і яму, у сувязі з яго новымі абавязкамі, іншы раз прыходзілася дакараць Сяргея за дробныя промахі.

Дружылі яны моцна, як дружаць людзі, звязаныя агульнымі інтарэсамі. Розныя па натуры, але аднолькава ўлюбёныя ў сваю справу, яны як бы дапаўнялі адзін другога. Ігар быў сталы, сур'ёзны, разважлівы, Сяргей жа, наадварот, жвавы, вясёлы, надзелены вострым пачуццём гумару. Сяргей часта гарачыўся, любіў спрачацца, і тады на дапамогу яму заўсёды прыходзіў разважлівы Ігар. Калі ж

здаралася, што Ігар па сваёй марудлівасці не мог прыняць хуткае рашэнне, сказаць рашучае слова, тут яго выручаў Сяргей. Ён у такіх выпадках ішоў напралом.

— Іх вадой не разальеш,— гаварылі пра Чыбісава і Несцерава паравознікі.

У мінулым годзе ў Бярэзічы, дзе працавалі сябры, прыехала пасля заканчэння тэхнікума маладая дзяўчына, дыспетчар Каця Сёмушкіна, і яны хутка пасябравалі. Невысокага росту, рухавая, з мяккім прыемным голасам, яна вельмі падабалася Ігару. Для ўсіх у дэпо Каця была таварышам Сёмушкінай, дыспетчарам заходняга круга Бярэзіцкага аддзялення чыгункі, а для Ігара і Сяргея — проста Кацяй. Калі ў паездцы быў Ігар — у кіно ці ў тэатр з Кацяй ішоў Сяргей; вяртаўся Ігар — і дзяўчына ахвотна праводзіла свабодны вечар з Ігарам. А калі выпадала, што яны абодва былі выхаднымі, яна запрашала іх у свой маленькі чысценькі пакойчык піць чай.

Ігар не заўважаў, каб Каця аддавала каму-небудзь з іх перавагу. З абодвума яна была аднолькава ветлівай, абодвух сустракала аднолькава гасцінна.

Былі, праўда, два выпадкі, калі Ігара паскрэбла па сэрцу сваім вострым кіпцюрком рэўнасць. Першы раз гэта здарылася ў Дзень чыгуначніка. Яны ездзілі тады за горад, у лес на гулянку. Так здарылася, што Ігар і Сяргей трапілі ў розныя аўтобусы. Ігар запрасіў Кацю сесці ў яго машыну, але Каця засмяялася і пабегла да машыны Сяргея. Ігар надзьмуўся і ўвесь дзень не размаўляў з ёю. Але вярталіся яны ўсе трое на адной машыне, усю дарогу Каця весела шчабятала, звяртаючыся часцей за ўсё да Ігара, і ў яго хутка пасвятлела на душы...

А ўчора зноў давялося перажыць некалькі непрыемных хвілін. Але пра тое, учарашняе, не хочацца нават успамінаць, тым больш, што скончылася ўсё зноў-такі добра: Каця запрасіла Ігара пайсці сёння разам у кіно.

Так, сёння трэба будзе сказаць Каці ўсё. Вось толькі як пачаць размову?..

...Хутка мчыцца поезд. Ігар пільна ўглядаецца ўдалячынь. Міма праплываюць палі, вёскі, хмызнякі. Уздоўж чыгуначнага насыпу вісяць на высокіх слупах правады. На іх важна расселіся гракі. Гракоў не палохае ні грукат поезда, ні прарэзлівы гудок паравоза; відаць, яны ўжо прывыклі да ўсяго гэтага і цяпер толькі абыякава пазіраюць навокал.

Неўзабаве будуць Бярэзічы, вунь ужо і светафор відзён. Ігар закрыў рэгулятар. Поезд дойдзе цяпер па інерцыі.

Рэйс заканчваецца ўдала. Цяжкавагавы састаў з лесам прайшоў участак з апярэджаннем графіка. У Бярэзічы ён прыйдзе на дваццаць мінут раней вызначанага часу. Там Ігара зменіць яго напарнік Сяргей.

Паравоз зойдзе на экіпіроўку, запасецца вадой, вугалем, змазкай і зноў пабяжыць з чарадой чырвоных вагонаў ці пузатых цыстэрн, ці да самага верху пагружаных доўгіх платформ.

Прагрукатаўшы на стрэлках, поезд замарудзіў ход і спыніўся. Счэпшчык адчапіў паравоз. Ігар пацягнуў за рычаг сігнала, над будкай пырхнула маленькае белае воблачка пары, і ў паветры пачуўся густы гудок. Паравоз крануўся з месца і пабег да вугальнага склада.

Сяргей падышоў да паравоза, свецячыся яснай адкрытай усмешкай. Ён быў ростам ніжэй за Ігара і паглядаў на сябра знізу ўверх. Ігару здавалася, што ўсміхаюцца не толькі пухлыя губы Сяргея, але і яго шэрыя вочы з густымі брывамі і нават доўгі, тонкі нос. Ды і ўвесь ён быў сёння нейкі радасны, нечым моцна ўсхваляваны, быццам на яго нечакана звалілася вялікае шчасце. Гэта кідалася ў вочы нават па вопратцы. У параўнанні з рабочай ватоўкай Ігара чорны кіцель і адпрасаваныя штаны Сяргея мелі амаль святочны выгляд. «Нібы не ў паездку сабраўся, а на гулянне!..» — падумаў Ігар.

— Ты што — імяніннік сёння? — запытаўся ён.

Сяргей засмяяўся.

— Не імяніннік, а жаніх,— скрозь смех адказаў ён.

«На заўтрашні сход намякае,— падумаў Ігар.— Рады, што выйшаў у пераможцы спаборніцтва».

Заўтра ў дэпо павінен быць сход аб выніках работы паравозных брыгад за апошні месяц. Сяргей, напэўна, выйдзе на першае месца. У яго самыя высокія паказчыкі. А сённяшняя паездка можа ўзняць яго яшчэ вышэй. Ігару прыйдзецца задаволіцца другім месцам.

«Што ж, на тое і спаборніцтва,— без ценю зайздрасці думаў Ігар, калі яны ішлі да дзяжурнага па дэпо, каб зрабіць адзнаку ў маршрутным лісце.— Чырвоны сцяг усё роўна застанецца на нашым паравозе».

У дзяжурцы высокі танклявы чалавек з чыста паголенай галавой надрываўся на селектару:

— Ну, дзе я вам вазьму паравоз, таварыш Сёмушкіна? Няма ў мяне паравоза!.. Прыйшла вось няцьдзесятвасьмёрка, дык яна з вугальным саставам пойдзе. А больш ніводнай машыны няма, хоць рэжце!..

— Непарадак, таварыш дзяжурны! — чуўся з рэпрадуктара абураны голас дыспетчара Каці Сёмушкінай.— Заўсёды ў вас гэтак. Дрэнна плануеце. Вы мне ўвесь графік ламаеце.

Каця прадаўжала «распякаць» дзяжурнага. І Ігар і Сяргей зразумелі, што здарылася: на станцыі падрыхтаваны да адпраўкі цяжкавагавы састаў, а весці яго няма каму, няма паравоза.

— За зрыў поезда вы будзеце адказваць! — сярдзіта сказала Каця, потым у рэпрадуктары нешта пстрыкнула, і ён заціх.

— Давайце я яго вазьму! — раптам прамовіў Сяргей.— І свой, і гэты.

Дзяжурны здзіўлена глянуў на Сяргея.

— Абодва павяду! — яшчэ раз паўтарыў Сяргей. З твару яго не сыходзіла ўсё тая ж задаволеная ўсмешка.

Ігар, які ўжо быў накіраваўся да выхада, спыніўся. Убачыўшы разгублены твар дзяжурнага, ён ледзь не рассмяяўся. Але тут было не да смеху.

Вядома, не было нічога асаблівага ў тым, што машыніст згаджаўся весці падвойны састаў. І Ігар і Сяргей, і другія машыністы нярэдка адпраўляліся з паяздамі двайной вагі. Але зараз гэта будзе не проста здвоены поезд. Абодва саставы цяжкавагавыя, у кожным амаль па паўтары вагавыя нормы, і эшалон будзе амаль што патроены супраць нормы. Тут патрэбна была не толькі звычайная спрактыкаванасць машыніста, але і тое асаблівае адчуванне ім машыны і састава, якое даецца ў выніку вялікай практыкі і ўмельства,— можна сказаць, патрэбен быў талент. Ігар ведаў, што Сяргей быў вельмі здольным машыністам, і ўсё ж, падумаўшы пра гарачнасць Сяргея, пастанавіў пагаварыць з сябрам.

«Не лішне будзе напомніць яму аб адказнасці гэтага рэйса»,— падумаў Ігар і падышоў да Сяргея. Той, нахіліўшыся над сталом дзяжурнага, чакаў адказу. Дзяжурны доўга маўчаў, абдумваў яго прапанову.

— Ці выцягнеш? — запытаў ён з трывогай.

— Сяргей! — Ігар нахмурыў бровы, хацеў папярэдзіць яго, што такі крок залішне смелы, але не паспеў.

— Выцягну! — рашуча сказаў Сяргей і папрасіў дзяжурнага: — Дайце мне пагаварыць з дыспетчарам.

Дзяжурны выклікаў Кацю.

— Слухаю! — адгукнулася тая з рэпрадуктара.

Дзяжурны пяўпэўнена прамовіў:

— Таварыш дыспетчар... Машыніст Несцераў згадзіўся весці здвоены поезд.

Каця маўчала.

Сяргей павярнуў да сябе мікрафон.

— Так, так, таварыш Сёмушкіна,— усхваляванa сказаў ён у мікрафон.— Павяду абодва паязды.

Каця ўсё яшчэ маўчала.

— Прашу даць мне зялёную вуліцу,— прадаўжаў Сяргей.— Правяду маршрут па ўсяму ўчастку без прыпынкаў.

— А вось гэтага рабіць не трэба,— сказала Каця.— З такім саставам да канцавога пункта вам не хопіць вады. У Чырвонай Альхоўцы абавязкова зрабіце прыпынак і набярыце вады. Зразумела?

Каця гаварыла голасам, які не дапускаў пярэчанняў, выразна і строга.

— Зразумела,— пахмура адказаў Сяргей.

Рэпрадуктар крыху памаўчаў, потым Каця гэтак жа выразна прадаўжала:

— Зялёную вуліцу я вам адчыню. Ад Чырвонай Альхоўкі да Губаеўкі можаце ехаць на самай высокай хуткасці. Майце толькі на ўвазе, што на ўчастку за Губаеўкай пуцевікі патрабуюць абмежавання хуткасці. Калі да Губаеўкі не ўкладзецеся ў графік, то далей ужо не нагоніце, бо пасля Губаеўкі трэба ехаць паціху...

— Так, так,— сказаў Сяргей, запісваючы нешта сабе ў кніжачку. Ігару здалося, што Сяргей няўважліва слухае Кацю.

— І яшчэ памятайце,— Каця ўзвысіла голас.— Калі да Губаеўкі не сэканоміце часу і прыйдзеце са спазненнем,— вы зломіце ўвесь графік. Рух паяздоў на ўчастку я планую з такім разлікам, што вы міпеце Губаеўку ў пятнаццаць гадзін дваццаць дзве мінуты. Вы мяне добра зразумелі, таварыш Несцераў?

— Зразумеў, Каця,— забыўшыся, што ён гаворыць з дыспетчарам, выпаліў Сяргей і, весела падміргнуўшы Ігару, пабег з дзяжуркі.

— Разыковы ў вас напарнік,— ні то ўхваляючы, ні то асуджаючы сказаў дзяжурны па дэпо.

Ігар прамаўчаў. Ён злаваўся па сябе, што не пагаварыў з Сяргеем.

Дома, лежачы на сваім вузенькім ложку, Ігар ніяк не мог заснуць. Трэба было добра адпачыць пасля паездкі, каб к вечару быць свежым, бадзёрым, але сон чамусьці не ішоў. Ігар доўга варочаўся з боку на бок, потым устаў, завесіў вокны коўдрай, зноў лёг.

А сон усё не ішоў.

Ігар у думках сачыў за поездам Сяргея. Зараз, думаў ён, Сяргей ужо, напэўна, прайшоў Чырвоную Альхоўку і ідзе на Губаеўку. Шлях свабодны!.. Шуруй топку, качагар, надымай пару! Але... ці хопіць у яго вады?

Хутка апрануўшыся, Ігар пайшоў у кантору аддзялення чыгункі. З несціхаючым пачуццём трывогі адчыніў ён дзверы дыспетчарскай. Падлога тут заслана дыванамі, столь і сцены абабіты мяккай блакітнай матэрыяй. На столі з цэнтра яна разыходзіцца ва ўсе бакі складкамі-праменнямі.

Каця сядзела за пультам — вялікім нахіленым сталом. Яе галава з пышнымі светлымі валасамі нізка схілілася над разасланым на пульце вялікім аркушам паперы. Гэта — графік руху паяздоў. Ён увесь спярэшчаны павуціннай рознакаляровых ліній. Кожная лінія адпавядае шляху поезда на ўчастку.

Каця размаўляла па селектару. Раз-пораз павяртаючы выклікальны ключ, яна дакарала некага за спазненне, ад некага патрабавала больш рашучых дзеянняў, некага хваліла.

Ігар паглядзеў з-за пляча Каці на графік. Лініі, лініі, лініі... Вось з канца ў канец ліста цягнецца сіняя, амаль прамая. Гэта Хвядос Кухарэнка, стары спрактыкаваны машыніст, вядзе састаў цыстэрнаў. Вось зламалася і замерла чорная: пехта (ці не Віталь Нупрэйчык?) стаіць над абгонам.

А вунь імкліва вырвалася ўперад двайная рыса, упрыгожаная чырвоным сцяжком.

У Ігара адлегла ад сэрца. Прамая, без звілін, шырокая лінія — гэта поезд Сяргея Несцерава. Ідзе ён дакладна па графіку, вызначанаму Кацяй.

«Але... што ж гэта такое? — раптам спахапіўся Ігар.— Чаму Сяргей не спыніўся ў Чырвонай Альхоўцы? На што ён разлічвае?..»

Ігар ведае — Сяргей зараз, напэўна, кожную хвіліну

пазірае на вадамернае шкло: колькі вады яшчэ засталося ў катле?..

Справа ад Каці ляжаць каляровыя алоўкі, і яна, прымаючы данясенні ад дзяжурных па станцыях, раз-пораз робіць гэтымі алоўкамі адзнакі на графіку. На ім з'яўляюцца ўсё новыя і новыя лініі. Яны паўзуць то прама, то ўніз, то ўгору, пераплятаюцца і зноў разыходзяцца ў розныя бакі. Графік упрыгожваецца ўсё новымі лічбамі, кружочкамі, сцяжкамі, крыжыкамі...

Ігар добра разбіраўся ў гэтым спляценні ліній, крыжыкаў, сцяжкоў, лічбаў. Ён бачыў, што становішча на ўчастку зараз напружанае, самая маленькая замінка дзе-небудзь у адным месцы адразу ж выкліча прастоі ў іншых месцах, і тады спыніцца, замрэ ўвесь ход гэтага складанага механізма.

Поезд Сяргея неўзабаве павінен быў падысці да Губаеўкі. Сяргею нельга там спыняцца, каб набраць вады, бо тады поезд парушыць графік руху другіх паяздоў. У іншы час можна было б ліквідаваць спазненне на наступным перагоне, але зараз павышаць хуткасць за Губаеўкай нельга. Каця папярэджвала: там небяспечны ўчастак...

«На што ж разлічвае Сяргей? — зноў падумаў Ігар.— Вады ж у яго наўрад ці хопіць, каб даехаць да канцавога пункта. А скончыцца вада — усё прапала. Спыняйся тады на перагоне, тушы паравоз, выклікай рэзерв. Ганьба на ўсю чыгунку!..»

Каця азірнулася, моўчкі, аднымі вачыма прывіталася з Ігарам і зноў узялася за аловак. Куды цяпер працягнецца двайная лінія?..

— Поезд машыніста Несцерава праехаў напраход,— далажыў па селектару дзяжурны па станцыі Губаеўка. Але далажыў ён чамусьці нерашуча, быццам нешта не дагаварваючы.

Аловак слізгануў па паперы, падоўжыў прамую, як страла, шырокую лінію. Каця выпрасталася, павярнулася да Ігара. Яе радасная ўсмешка была цяпер падобна на ўсмешку Сяргея, калі той прымаў паравоз ад Ігара.

— Цягне! — усміхнулася дзяўчына. Яе бровы высока ўзняліся над карымі вачыма, нібы збіраючыся ўспырхнуць і паляцець.— Цягне, бачыш,— ужо цішэй паўтарыла Каця.

— Невядома, на чым ён далей цягнуць будзе. Вада...

— На самалюбстве выцягне,— перапыніла Ігара Каця.

Ён заставаўся ў дыспетчарскай, пакуль двайная лінія на графіку не дайшла да канцавога пункта.

Каця заканчвала работу ў дзевяць гадзін. У кіно яны пайшлі на дзесяцігадзінны сеанс. Увесь час сядзелі моўчкі. Ігар усё рыхтаваўся да размовы з Кацяй. З чаго пачаць?.. Як падступіцца да такой справы?..

— Можа, не пойдзем на танцы? Позна ўжо,— прапанавала Каця.

— Не пойдзем,— згадзіўся Ігар.

Ігар так і не паспеў пачаць задуманай гаворкі, як Каця, узяўшы яго пад руку, раптам сказала:

— А ведаеш, Ігар,— я ж выходжу замуж... Ты што, чаго спыніўся?

Ігару ўспомніўся святочны выгляд Сяргея, яго радасная, задаволеная ўсмешка. «Дык вось яно што!.. Жаніх!..»

Адмовіўшыся ад запрашэння на чай і суха развітаўшыся з Кацяй, Ігар павольна пайшоў дадому.

Са станцыі пачуўся працяглы гудок. Гэты гудок Ігар мог бы адрозніць ад тысячы іншых — гудок роднага паравоза. Раней Ігар абавязкова пайшоў бы на кантрольны пост, распытаў Сяргея пра паездку, агледзеў машыну, дапамог Сяргею здаць яе трэцяму машыністу іх брыгады... Але на гэты раз ён хутка пакрочыў прэч ад станцыі.

Паравоз прагудзеў яшчэ раз, нібы развітваючыся з ім...

Нейкая непрыемная расслабленасць авалодала Ігарам. Незразумелая крыўда на некага балюча мучыла яго. І толькі назаўтра, прыняўшы машыну і ўзяўшыся за рэверс, ён зноў адчуў ранейшую ўпэўненасць і бадзёрасць. Работа як быццам утаймавала боль. Ён парашыў састаў з трактарамі для калгасаў заходніх абласцей правесці, апярэдзіўшы графік.

У Губаеўцы, калі Ігар набіраў ваду ў тэндэр, да паравоза падышоў Толя, васьмігадовы хлапчук, сын начальніка станцыі. Ён ведаў усіх машыністаў і лічыў сваім абавязкам пагутарыць з кожным.

— Доўга вы набіраеце,— важна, як дарослы, сказаў Толя.— Вось дзядзя Сярожа ўчора — ох, і хутка набраў!

— Як жа гэта ён набраў, калі ён тут і не спыняўся? Выдумляеш ты нешта, Толік! — кінуў зверху, з свайго акенца, Ігар.

— Нічога не выдумляю,— пакрыўдзіўся Толя.— Ён спыняўся. Толькі папрасіў тату не адзначаць прыпынак, во! А вы кажаце — выдумляю...

Ігар увесь сумеўся. Ён успомніў графік — той, што ляжаў учора на пульце ў дыспетчарскай. Успомніў роўную двайную лінію на гэтым графіку, якая азначала, што поезд Сяргея ішоў без прыпынкаў. Успомніў нерашучы голас дзяжурнага па станцыі Губаеўка.

«Значыць, гэта праўда? Сяргей ашукаў! Утаіў!.. Але для чаго?!»

Ігар зноў паспрабаваў прасачыць у думках шлях Сяргеевага поезда. Сяргей не спыніўся ў Чырвонай Альхоўцы, бо меркаваў, што яму хопіць вады аж да самага канца. Але, пад'язджаючы да Губаеўкі, ён зразумеў, што пралічыўся: за Губаеўкай ён зможа праехаць усяго толькі некалькі кіламетраў, а там вадамернае шкло пакажа недахоп вады ў катле. А на ўсім участку далей няма пунктаў, дзе б можна было набраць вады. Заставаўся адзін выхад — зрабіць прыпынак у Губаеўцы.

Гэта было, вядома, правільна. Машыністу без вады, як кажуць, і ні туды і ні сюды... Але навошта ж было ўтойваць, што ён зрабіў прыпынак? Навошта прасіць начальніка станцыі, каб той паведаміў дыспетчару, што поезд праехаў станцыю напраход? Навошта?..

Гэтага Ігар не разумеў.

Незразумелым было і другое: як Сяргей, страціўшы час у Губаеўцы для набору вады, усё ж не спазніўся і прыехаў у канцавы пункт па раскладу?.. За Губаеўкай перавышаць хуткасць было нельга, там нешта не ў парадку з пуцямі...

Ігар раптам адчуў, як у яго пахаладзела спіна.

«Вось яно што!.. Сяргей плюнуў на папярэджанне аб абмежаванні хуткасці і прамчаўся па небяспечнаму ўчастку з вецярком,— здагадаўся ён.— Неяк абышлося, але гэта ж выпадковасць. А калі б крушэнне?! І ўсё дзеля таго, каб заваяваць першынство!..»

Вярнуўшыся ў Бярэзічы, Ігар у час здачы паравоза сказаў Сяргею:

— Што, аварыйшчыкам рашыў стаць?

— Гэта чаму ж?

— Пасля Губаеўкі як ехаў?

Сяргей успыхнуў, адвярнуўся. Потым зноў паглядзеў на Ігара, але ўжо холадна, непрыязна.

— Шпіёніш?..

— Не... Але пакрываць твае выхадкі не збіраюся, хоць ты і сябар мне.

— Яшчэ што скажаш?

— А яшчэ скажу, што стаў ты, Сяргей, на слізкую дарожку. Ліхацтва да дабра не давядзе!

Сяргей узяўся за поручні, падняў нагу на прыступку лесвіцы.

— Проста ты зайздросціш мне,— прыжмурыўшы вочы, сказаў ён.

— Сяргей! — ускрыкнуў Ігар.

Але той ужо знік у паравознай будцы.

Аглушальна зароў гудок, са свістам вырвалася пара з-пад колаў, абдаўшы Ігара вадзяным пылам, і паравоз імкліва пабег па рэйках.

Ігар доўга глядзеў яму ўслед, аж пакуль ён не знік за павароткай...

Увесь дзень потым бачыў перад сабой Ігар гэтыя прыжмураныя вочы Сяргея. Думаў ён аб іх і ідучы на сход. Вельмі прыкра было, што не пагаварыў па-сяброўску з Сяргеем. Відаць, нейкія іншыя словы патрэбны былі тут. А якія?.. У Каці можа яны і знайшліся б, а ў яго іх няма...

... Вялікая, ярка ўпрыгожаная зала нядаўна пабудаванага клуба была поўна людзей. Шукаючы вачыма свабоднае месца, Ігар сустрэўся позіркам з Кацяй. Яна паклікала яго, паказваючы рукой на крэсла побач. Па абодва бакі ад Каці былі незанятыя месцы. У іх заўсёды было так — хто прыходзіў раней, займаў месцы для траіх.

«Яна яшчэ не ведае аб нашай спрэчцы,— падумаў Ігар, ідучы да Каці.— Калі б ведала, напэўна, не заняла б для мяне...»

— Сярожа па марожанае пайшоў. Ты яго не сустрэў?

— Не.

Дзяўчына зазірнула Ігару ў вочы.

— Якая кошка паміж вамі прабегла?

— Чорная, мусіць...

— Пытаюся сёння ў Сяргея: ты сказаў Ігару, што мы заўтра ў загс ідзём? І не збіраўся, кажа, абыдземся і без Ігара... Так нічога і не дабілася ад яго.

Ігар успомніў твар Каці, калі яна там, у дыспетчарскай, нанёсшы на графік шырокую двайную лінію, павярнулася да Ігара, шчаслівая і радасная.

— Ашукаў! — падумаў ён і не заўважыў, што сказаў гэта ўголас.

— Хто ашукаў? Каго? — здзіўлена спыталася Каця.

І тады, спяшаючыся і блытаючыся, ён пачаў расказваць Каці пра ўсё.

Каця слухала яго моўчкі.

У Ігара мільганула думка: «Навошта я ёй гавару гэта, ёй, Сяргеевай нявесце? Усё роўна не паверыць...» І ўсё ж ён прадаўжаў расказваць, нічога не ўтойваючы.

— Та-а-ак...— працягнула Каця, калі ён скончыў, і, нахмурыўшыся, апусціла галаву.

Падышоў Сяргей, трымаючы аберуч цэлы букет эскімо. Ён хутка прывітаўся з Ігарам, потым нахіліўся да Каці і нешта запытаўся ў яе. Але дзяўчына нічога не адказала.

Навокал запляскалі ў далоні.

Пачаўся сход.

Даклад рабіў начальнік дэпо. Ён гаварыў пра эканомію паравознікамі паліва, пра сярэднесутачныя прабегі лакаматываў, пра абарот іх. Гаворачы пра лепшых машыністаў, начальнік дэпо неаднаразова называў Чыбісава і Несцерава. Яны амаль ні ў чым не ўступалі адзін аднаму. Толькі цяжкавагавых паяздоў Сяргей правёў больш за Ігара. Дакладчык асабліва пахвальна адазваўся аб учарашнім рэйсе Сяргея.

Начальнік дэпо наогул добра ўмеў гаварыць прамовы, а сёння яму даводзілася паведамляць толькі аб дасягненнях, і таму ён быў асабліва красамоўны. Яму шумна апладзіравалі.

Яшчэ не сціхлі апладысменты, калі Каця паднялася са свайго месца і папрасіла слова. Яна не ўзышла на трыбуну, а стала каля яе, побач. Голас Каці гучаў глуха.

— У дакладзе многа гаварылася пра машыніста Несцерава... Ён добры работнік, усе гэта ведаюць. У мінулым месяцы ён на першым месцы быў. Па заслугах ён тады заняў гэтае месца. А вось зараз...— Яна перадыхнула і прадаўжала:— А вось зараз ён палічыў за лепшае ўтрымаць першае месца іншым шляхам.— І яна бязлітасна і цвёрда выказала ўсё, аб чым расказаў ёй Ігар.

Ігар ніколі яшчэ не бачыў такога бурнага сходу. Пасля Каці выступіла многа машыністаў. Сяргея ніхто не абараняў. Больш таго, некаторыя нават патрабавалі зняць яго з паравоза і перавесці на іншую работу.

Калі спрэчкі закончыліся, падняўся са свайго месца ў прэзідыуме начальнік дэпо. Усе прыціхлі, чакаючы, што ён скажа, які вынесе прысуд.

Раптам напружаную цішыню парушыў голас Ігара:

— Дазвольце задаць пытанне машыністу Несцераву.

— Калі ласка,— сказаў начальнік дэпо.

Ігар павярнуўся да Сяргея.

— Скажы нам, таварыш Несцераў, ці зразумеў ты сваю памылку?.. Ну, гавары, Сяргей!..

У зале зрабілася яшчэ цішэй. Чуваць было нават, як у суседнім пакойчыку, дзе займаўся гурток самадзейнасці, нехта ўпаўголаса напяваў «Адзінокую гармонь».

— Зразумеў! — не падымаючы вачэй, рашуча прагаварыў Сяргей.— Усё зразумеў, таварышы!

— Тады прашу пакінуць яго на паравозе,— звяртаючыся да начальніка дэпо, сказаў Ігар.— Пад маю адказнасць.

Каця ўдзячна паглядзела на Ігара.

...З клуба ўсе трое выйшлі моўчкі, занятыя кожны сваімі думкамі.

Са станцыі пачуўся знаёмы гудок.

— Сходзім, Ігар, паглядзім, як там наша машына,— прапанаваў Сяргей.

— Пайшлі! — згадзіўся Ігар.

У завулак уварваўся свежы вецер. Каця клапатліва папраўіла шалік на шыі Сяргея.

— Толькі не затрымлівайцеся,— накіроўваючыся да свайго дома, сказала яна,— бо калі прастыне чай — падаграваць не буду, халодны будзеце піць...

*1950*

# ЗМЕСТ

Выпадковы прыпынак . . . . . . . . . . . . . 5
Забыты вензель . . . . . . . . . . . . . . . 14
Канец белай магілы . . . . . . . . . . . . 36
Прызванне . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Ірына . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Асенні трамвай . . . . . . . . . . . . . . 61
Успамін на вяселлі . . . . . . . . . . . . 68
Сартавальная горка . . . . . . . . . . . . 78
Семсот дваццаты кіламетр . . . . . . . . . 87
Нараджэнне чалавека . . . . . . . . . . . 96
Мой сусед . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Самае важнае адкрыццё . . . . . . . . . . 115
Снежкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Дзяўчына і стэп . . . . . . . . . . . . . 136
Вячэрняя размова . . . . . . . . . . . . . 147
Аматары . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
Сучасная тэма . . . . . . . . . . . . . . 176
У незнаёмым горадзе . . . . . . . . . . . 185
Слота . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
Апладысменты . . . . . . . . . . . . . . 206
Помнік . . . . . . . . . . . . . . . . . 213
Сітуацыя . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Сакрэт . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
Не ашукай сябе . . . . . . . . . . . . . 242
Ландыш серабрысты . . . . . . . . . . . . 246
Госці . . . . . . . . . . . . . . . . . 259
Апошні вагон . . . . . . . . . . . . . . 269
Будзьце знаёмы . . . . . . . . . . . . . 276
Туманнай раніцай . . . . . . . . . . . . 283
Гаспадыня . . . . . . . . . . . . . . . 293
Тэлеграма . . . . . . . . . . . . . . . 305
Белы капялюшык . . . . . . . . . . . . . 312
Зялёныя агні . . . . . . . . . . . . . . 320
Як назвалі станцыю . . . . . . . . . . . 337
Трое . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346

*Евгений Петрович Василенок*

Избранные произведения в двух томах

ТОМ 1

На белорусском языке

Рэдактар Е. А. Пяршай. Афармленне Л. Я. Прагіна. Мастацкія рэдактары А. І. Труханава, Л. Я. Прагін. Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал. Карэктар Е. У. Дзмітрыенка.

ІБ № 46

АТ 10 552. Здадзена ў набор 9/IX 1976 г. Падп. да друку 11/II 1977 г. Тыраж 10 000 экз. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 19. Ул.-выд. арк. 19,38. Зак. 3556. Цана 1 руб. 48 кап.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Свярдлова, 4.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

**Васілёнак Я.**

В 19 Выбраныя творы ў 2-х тамах. Том 1. Апавяданні. Мн., «Маст. літ.», 1977.

360 с. 2 с. укл.

У першы том увайшлі лепшыя апавяданні пісьменніка, напісаныя ім на працягу ўсёй творчай дзейнасці. Большасць іх прысвечана жыццю чыгуначнікаў. Героі Я. Васілёнка — людзі мужныя, сціплыя, працавітыя.

В $\frac{70303\text{-}063}{М\ 302(05)\text{-}77}$ 93-77 Бел 2